Бібліятэка выбраных твораў

# Раяль з адламаным вечкам



Б
В
Т

Бібліятэка
выбраных
твораў

# Раяль з адламаным вечкам

Мінск
«Мастацкая
літаратура»
2016

УДК 821.161.3-32
ББК 84(4Беи)-44
Р28

Серыя заснавана ў 2016 годзе

Афармленне серыі
*Міхаіла Дайлідава*

Укладальніца
*Аксана Спрынчан*

**Выпуск выдання ажыццёўлены па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь**

**ISBN 978-985-02-1723-3**

© Спрынчан А. В., укладанне, 2016
© Афармленне. УП «Мастацкая літаратура», 2016

ВЯЧАСЛАЎ АДАМЧЫК

## Раяль з адламаным вечкам

Быў іншы свет, было маё дзяцінства. Было яно даўно — перамешанае вайною і страхам. Быў Камароў кут. Ён быў нічый, гэты доўгі клін поплаву — у мураве і дзяцеліне,— як была нічыя пабеленая знадворку хата з выдранымі вокнамі, з разабранаю падлогаю; закіданы каменнямі і ржавым жалезам калодзеж; старое раскрытае гумно; як быў нічый увесь гэты хутар на грудку пад высокаю ліпаю, што пахла мёдам і на якой была трухлявая калода без пчол. Гаспадара — старога адзінокага Камара — у цёплую ноч добрага лета нехта застрэліў, вывеўшы з хаты пад калодзеж. Казалі, што стары Камар быў некалі панам, быў злы, урэдны і зацкаваў сабакамі местачковага яўрэя, свайго арандатара; казалі, што ён прайграў у карты, разбазырыў сваю зямлю і ад даўнейшага фальварка застаўся ціхі, недагледжаны хутар. Цяпер мы тут пасвілі каровы і лазілі на гарышча па нейкія старыя, пісаныя па-чужому, запыленыя кнігі. Кнігі былі ў скураных вокладках, яны пахлі цвіллю і даўнасцю.

Іншы раз сюды, у Камароў кут, прыганялі кароў мяшчане, цыбатыя, у кароткіх майтках і ў жоўтых блішчастых касках, накрадзеных, напэўна, у местачковай пажарнай. Мы з імі біліся і адбіралі залатыя каскі.

З Камаровага кута мы хадзілі ў зялёныя местачковыя гароды рваць моркву і ламаць сырое тытунёвае лісце. Высушыўшы над агнём, лісце мы курылі, аж у вачах жаўцеў свет. Вадзіў нас туды Ясь Хрышчоны, за вочы — Семафор, доўгі, нясkладны, з доўгімі худымі рукамі, за ўсіх нас старэйшы, ужо кавалер, як сарамацілі яго мацяркі, калі ён біў каго з нас.

Хадзілі мы туды, покуль з жоўтага сланечніку, з разоры не выскачыў крываногі кудлаты хлопец год васямнаццаці — камендантаў сын, як потым дазналіся, і покуль не злавіў

самага меншага з нас — Лёніка. Нядужы, перапалоханы, Лёнік, зачапіўшыся за купіну, упаў, і яго, дабегшы, без жалю мясіў нагамі камендантаў сын. Лёнік потым недамагаў, кашляў, а мы ўжо бегалі на далёкія хутары аблатошваць чужыя няспелыя сады. Толькі адзін Язэпаў Казік пільнаваў сваіх кароў і не хадзіў нікуды. Ён, як і Ясь, быў старэйшы, меў нешта сталае, дарослае. І трымаўся ад нас воддаль і болей на адзіноце. Быў ён рослы, тонкі і нейкі зялёны, хваравіты з твару, але прыгожы. Нехта казаў, што была б дзеўка, ды певень запеў, як радзілася.

Іншы раз, хаваючыся ад нашых вачэй, Казік сядзеў з рабаватаю Гэлькаю. Гэлька — сірата-бежанка — служыла ў бяздзетнага багатыра Піліпа. Піліп казаў, што ўзяў яе за дачку,— гэта перад людзьмі, а за вочы біў і ноччу выпраўляў жаць чужую асаку для кароў і коней. Гэлька расказвала нам пра гэта і плакала.

Яна ўжо бралася на дзеўку: пад выцвілаю кофтаю ў яе значыліся вострыя грудзі, а мочкі распухлі ад праколатых для завушніц дзірак. І калі дзе назнарок Казік заседжваўся з Гэлькаю, мы ўсе смяяліся і казалі, што яны любяцца.

А злы, нядобры Семафор невядома чаму заступаўся за Гэльку і, калі не было Казіка, цішком хадзіў разам з ёю, і мы заўважалі, што ён рабіўся нейкі сур'ёзны і нават дабрэў з намі.

Але скора пра гэта Гэльчына каханне даведаўся Піліп, збіў Гэльку, а яго старая Тэкля хадзіла сварыцца да Казікавага бацькі і крычала на ўсю вуліцу: «А што будзе, калі яна прынясе ў прыполе? Ведама ж, сірата, хто яе пашкадуе?»

Гэлька болей не прыганяла ў Камароў кут. Цяпер яна пасвіла на Піліпавым полі — і мы бачылі, як кожны дзень яна выходзіла на грудок, сумна пазірала сюды, дзе былі мы, дзе быў Казік, і сумна спявала. Аднаго разу Казік не вытрымаў, папрасіўся, каб я папільнаваў яго каровы, і пайшоў на Піліпава поле.

Ды гэта Казікава каханне было скупое, нядоўгае. Раптоўна яно пачалося, раптоўна і абарвалася. Язэп забіў у хаце вокны, скінуў пажытак на воз і пераехаў у мястэч-

ка. Казалі, што Язэп баяўся, каб не вывезлі ў Нямеччыну, і пайшоў працаваць у нейкі тодт.

На свеце ішла вайна, была неразбярыха. Кожнае ночы з мястэчка, з нямецкага бункера, з глухое цішыні цяжка стукаў кулямёт. Цяпер ужо ў вёсцы спалі на падлозе і застаўляліся падушкамі — казалі, што кулі не праходзяць праз пер'е. Аднае ночы ў мястэчку нешта гарэла, а па нашай вуліцы ехалі конна партызаны — коні цяжка тупалі капытамі па зямлі. Мы з маці цалюткую ноч сядзелі каля акна.

Раніцаю з мястэчка горка і ўдушліва пахла нечым паленым, а на вуліцы перад нашым акном спынілася машына, поўная паліцыянтаў — у чорных шынялях, з шэрымі каўнярамі, з шэрымі закарвашамі. Паліцыянты саскоквалі з кузава, смешна распускаючы шынялі і прысядаючы, як бабы, і беглі ў другі канец вёскі, пэўна, да старасты.

Я яшчэ хацеў наказаць Хрышчонавым — яны жылі блізка, праз тры хаты,— але было позна: ужо на надворку плакала Семафорава маці, моцна, як па нябожчыку; ужо сюды гналі Семафора, перапалоханага, з чорнымі рубцамі па шчацэ, гналі яго бацьку без шапкі, у кажусе, у споднiх портках, і невядома чаму Дзям'яна-старасту, усяго акрываўленага, з расквашаным носам. Дзям'ян усё бажыўся і круціў галавою, што, дальбог, не ведае, хто памагаў партызанам рэзаць слупы. З носа ў яго капала кроў і цёмна застывала на пяску.

У той дзень з нашае вёскі забралі сямёра мужчын, і ўсе казалі, што іх павязуць у Нямеччыну і што разам з імі павязуць Семафора.

Спадала лета, ішоў ранні верасень. За Камаровым кутом на далёкіх, сівых ад асакі балотах збіраліся буслы, сумна клекаталі і на трэці дзень падняліся, доўга кружыліся, доўга набіралі вышыню, прападаючы з вачэй. Толькі шпакі цёмным косым крылом мільгалі на сінім небе, недзе спадаючы за грудком на поле. Ля дарогі на каленях стаялі бабы, ірвалі грэчку, стаўлялі ў кучкі.

Аднаго дня тае ціхае ранняе восені ў вёску прыйшла высокая пані ў чорным капялюшыку з вуалькаю на вочы,

з чорным саквояжыкам у руцэ, з напудраным носам і стала хадзіць па хатах, запісваючы дзяцей у местачковую школу.

У школу пайшлі толькі мы з Лёнікам.

Абое падстрыжаныя пад нажніцы ў рады, абое босыя, абое ў зрэбных портках, што ламаліся і трашчалі, як бляха, мы селі за першую лаўку, з дзівам і страхам чакаючы настаўніцу, а на нас, сабраўшыся, глядзелі местачковыя дзеці. Былі сярод іх далікатна прыбраныя, прычэсаныя і прыгожыя, як анёлы.

— А во! Паглядзіце, яго падстрыглі, як авечку,— нехта з іх стаў смяяцца і паказваць на Лёніка пальцам, і сталі смяяцца і паказваць на Лёніка пальцамі ўсе. А Лёнік, напалоханы, натапыраны, як верабей у жмені, нечакана стаў адбівацца і нечакана даў чубатаму хлопчыку кулаком па воку. Хлопчык з енкам адскочыў ад Лёніка. У клас прыбегла настаўніца — насцярожаная, перапалохана апусціўшы рукі, і я пазнаў тую самую пані з напудраным носам, што прыходзіла да нас у вёску. Яна стала вохкаць і крычаць на Лёніка і на таго чубатага хлопчыка. А калі крычала, вочы ў яе заплюшчваліся, а ў роце блішчаў залаты зуб.

Яна схапіла іх абаіх за вушы — са злосцю, аж паднімаючы ад падлогі, і павяла ў канцылярыю.

У клас Лёнік вярнуўся злы, насуплены, з чырвонымі вачыма, мусіць, ад крыўды і плачу.

Але потым настаўніца была добрая — шчырая з намі, нават прыгажэла, асабліва тады, калі прыходзіла на ўрок спеваў, калі садзілася за раяль, што стаяў у нас у класе і чорна блішчаў мяккім празрыстым лакам, паціху апускала лёгкія рукі на касцяныя белыя клавішы, паціху іграла і паціху зачынала самотным, адзінокім голасам:

Люблю наш край,
Старонку гэту,
Дзе я радзілася, расла,
Дзе першы раз спазнала шчасце,
Слязу нядолі праліла.

Ціха, задумаўшыся пра нешта сваё, далёкае, памагалі і мы. Вочы настаўніцы вільготна блішчалі. І, мусіць, тады яна нічога не помніла, не бачыла. Не бачыла, як аднаго разу ў клас зайшоў дырэктар школы, нізенькі, даўганосы. Зайшоў без стуку, не зачыніўшы за сабою дзверы.

Мы ўсе, засаромеўшыся, разгубіўшыся, сціхлі, настаўніца апомнілася, падняла вочы і ўбачыла дырэктара школы, убачыла высокага немца ў кароткіх ботах з шырокімі халяўкамі — ён ужо стаяў на парозе.

Немец пастараніўся, і ў клас зайшлі грузчыкі, сагнуўшыся, цяжка апусціўшы доўгія рукі.

Немец паказаў галавою на раяль — грузчыкі дружна ўзяліся, натужваючыся, чырванеючы, і, абіваючы ля дзвярэй тынк, вынеслі яго з класа.

Настаўніца падышла да акна і, нахіліўшыся, доўга глядзела на двор — там нехта крычаў, задыхаючыся ад натугі: «Раз-два — узялі, яшчэ раз», мусіць, паднімаючы раяль на машыну,— і плакала.

Гэта быў апошні наш урок спеваў і апошні дзень заняткаў у гэтай школе.

Назаўтра нас павялі ў пустую яўрэйскую хату, што стаяла на другім баку вуліцы, з вузенькім калідорчыкам, з кафельнымі грубкамі без дзверцаў, з аблупленымі шпалерамі на сценах. Тут мы і вучыліся цэлую зіму, на кожнай перамене выбягаючы паглядзець на рахманую сарну. Сарну гадавалі немцы, што стаялі ў нашай школе.

Цяпер будынак школы быў стракаты, у зялёных плямах. Каля варот стаяла паласатая будка, і там хадзіў вартавы ў доўгім белым кажусе, у плеценых саламяных чунях на ботах. Ён гаварыў па-польску, смеючыся, паказваў на мае і Лёнікавы лапці і клікаў некага фатаграфаваць нас.

На згоне зімы, калі раскіс і раздражджэў снег на дарогах, калі ў канавах пасталі лужыны, вялікія, як мора, з вялікімі хвалямі ад ветру, з шапкамі жоўтай пены пры беразе, калі на сухія чорныя пагоркі прыляцелі гракі — яны выдзёўбвалі з зямлі кароткіх белых чарвякоў, глыталі, давячыся, і потым крычалі на ўсё горла ад радасці,— у мястэчка невядома

адкуль набралася казакаў[1]. На казаках былі кубанкі з чырвоным верхам, з белымі стужкамі, з бліШчастымі кукардамі і шырокія чорныя буркі з высокімі вострымі плечукамі — здалёк казакі былі чорныя і страшныя, як чэрці.

Іх нагналі ў нашу вёску — па пяць, па шэсць чалавек у хату. У нас спачатку на зямлі, на саломе, а потым на палку, што зрабіў бацька, спала аж сем.

У Лёніка на пастоі быў адзін — чэркес з чырвоным башлыком за плячыма, з кароткім кінжалам пры баку.

Раз на свята на вуліцы чэркес танцаваў з кінжалам у зубах, і глядзець на гэтае дзіва бегала цэлая вёска.

Вычысціўшы коней і падмазаўшы колы, казакі ездзілі недзе пад Наваградак, у цёмныя далёкія лясы, як яны казалі — біць партызанаў, і вярталіся адтуль з поўнымі вазамі сена для сваіх коней і п’яныя. Дома яшчэ пілі, спявалі песні, свае, далёкія, тонка падсвістваючы і падцягваючы. А дробненькі вусаты Пятро, што часам шкадаваў мяне, калі быў цвярозы, і частаваў употай густым застылым мармеладам без хлеба, усё казаў, што і ў яго гэтакі сынок расце, пад п’яную руку дурэў: зрываў са сцяны вінтоўку, бег на вуліцу і, не цэлячыся, страляў у нашу бярэзіну. Па разу даваў страляць усім нам, а потым браў вінтоўку, ішоў у хату, але на парозе спыняўся і, жмурачы вочы, пытаў:

— А партызаны ў вас ёсць?

— Няма,— круціў хто-небудзь з нас галавою.

— Вы ўсе тут партызаны, усіх вас...— і трос вінтоўкаю.

Мы ўсе разбягаліся — казакаў баяліся ўсе. Маці мая вучыла мяне:

— Глядзі, не падсунь галавы — сёння ж ні на кога ўправы не знойдзеш.

І калі аднаго дня Лёнік прыйшоў да нас клікаць мяне ў школу, маці расплакалася і сказала:

— Куды ж вы, дзеткі, пойдзеце, гэтакае шаленства на свеце.

І мы не пайшлі.

---

[1] Так званыя казацкія сотні. Яны былі створаны гітлераўцамі з розных прыхвасняў і здраднікаў Радзімы для барацьбы з партызанамі.

У Вялікі пост, на Вербніцу, казакі спраўлялі вяселле. Замуж ішла Піліпава наймічка Гэлька, ішла за кульгавага з вялікім рубцом на галаве Цярэню, што стаяў у нас і вырабляў у нашым гумне шкуры на гужы і сёдлы, і ад яго заўсёды пахла моцным дзёгцем. Вяселле было тры дні і тры ночы і было б болей, каб п'яны Пятро не падняў страляніну і каб нехта не наказаў сотніку ў мястэчка і той не разагнаў вяселле.

Вяселле разышлося, а кульгавы Цярэня, хістаючыся і целяпаючы п'янаю галавою, пад руку вёў да нас Гэльку, а ззаду іх ішоў гарманіст і дробна перабіраў вясёлы марш.

Гэлька прыйшла ў нашу хату, як у сваю, поўнаю гаспадыняю і была разбітная і праворная і, нікога не саромеючыся, абнімала Цярэню.

Цяпер на Гэльцы была не тая плацянковая спадніца, зношаная, рэдзенькая, што ўся свіцілася, у якой яна ганяла ў поле, а новая паркалёвая сукенка ў вялікія чырвоныя кветкі, якую ёй прывёз недзе з карнай экспедыцыі Пятро і якая не сыходзілася на ёй, але ўсё ж харашыла Гэльку. Яна ўсё прычэсвалася, глядзелася ў люстэрка, і калі Цярэня ішоў у гумно вырабляць шкуры, а да яе падыходзіў Пятро, клаў руку ёй на плечы і нешта скоранька шаптаў, яна заходзілася ад рогату, закідаючы назад галаву.

А раз яе Цярэня біў, зашчапіўшыся ў гумне, і, пэўна, забіў бы, каб не збегліся казакі, не сарвалі дзверы, не абаранілі. Гэлька пасля гэтага стала нейкаю прыціхлаю, усё нешта думала пра сваё і болей маўчала. А Цярэня прыходзіў дадому п'яны, плакаў і рваў на сабе кашулю. Мы ўсе сыходзілі з хаты, а Гэлька хавалася ў стопцы. А раз ён паехаў на партызан, і Гэлька чакала яго, седзячы пры акне, і глядзела на двор — а на дварэ было хораша, было цёпла, чыстае неба, быў май, было светла, зелена, у нашым гародчыку цвіў бэз, недзе за ліштвою шчабяталі, вывеўшыся, нядужыя вераб'і, на плоце сядзеў мяккі шэры кот, не мігаючы, глядзеў угору. Гэльцы, мусіць, успамінаўся Казік,— і яна раз пыталася пра яго, закрываючыся фіранкаю, пэўна, каб я не бачыў, што яна плача.

З карнай экспедыцыі казакі не вярнуліся — у Камаровым куце мяшчанскія пастухі гаварылі нам, што скора прыйдуць нашы.

У мястэчку немцы нешта падрывалі, у нашай хаце звінелі шыбы, са столі адлушчваўся і падаў мел. Дзень пры дні з Наваградка ішлі машыны з завешанымі будамі, блізенька адна за адною — ім не было канца. З шашы на наш гарод за хату мякка каціўся белымі клубкамі пыл, блытаўся ў густым частаколе, едка асядаючы на крапіву і лопух. Стаяла на пагодзе. Млелі і купаліся ў гарачым пяску куры. На нашай бярэзіне на белых павуцінах гайдаліся зялёныя чарвякі, абрываліся, нячутна падалі на траву.

Млелі людзі ад гарачыні, іх гналі немцы недзе ў Наваградак выезджанаю дарогаю з боку шашы — там быў сыпкі пясок, ён сцякаў з колаў, як вада, калі ехала фурманка,— і немцы садзіліся на нашым узмежку, разуваліся, высыпалі пясок з чаравікаў і ішлі далей, пазнімаўшы з галавы і пазатыкаўшы за рамяні шэрыя пілоткі. А адзін хлопец невядома чаго аглядваўся на нашу хату — я стаяў у гародчыку — і раптам, убачыўшы мяне, спыніўся, замахаў рукою,— і я пазнаў Язэпавага Казіка. Усе пайшлі, а Казік усё стаяў, пакуль на яго не крыкнуў немец. Казік, не спяшаючыся, пабег даганяць усіх. За вёскаю, за крыжам яшчэ раз азірнуўся. Ён, мусіць, ведаў, што яго гоняць туды, дзе, як цяжкі і моцны гром, варочалася вайна.

Праз Камароў кут, наўпрасткі праз жыта, у мястэчка беглі бабы ў доўгіх шырокіх спадніцах, у белых кофтах, распусціўшы валасы, без хустак і неслі назад хто што — аконныя рамы, мяхі з нейкім пажыткам, вялікія блішчастыя банкі — гэта, казалі, з маргарынам.

У мястэчка пайшлі і мы. Там ужо не было немцаў. На вакзале ўвесь перон быў засыпаны раструшчаным шклом і навушнікамі, якія, мусіць, надзявалі немцы, каб не аглухнуць, калі падрывалі вадакачку,— цяпер там ляжалі адна на адной цэментавыя груды з голымі пакручанымі прэнтамі, вялікія, як валуны. У вакзале, у пустой і голай пачакальні,

дзе мы збіралі раскіданыя ружовыя білеты і нейкія квіткі з сінімі палоскамі наўскасяк, я ўбачыў раяль, той самы, з нашай школы, цяпер ужо з адламаным вечкам, з выбітымі клавішамі, а нехта, нябрыты, рыжы, з пераламаным брылём у шапцы, хадзіў па ім з нагамі і выкручваў у акне блішчастыя прабоі і зашчапіцы.

У Камароў кут мы неслі поўныя кішэні патронаў і цэлыя звязкі ружовых білетаў і гаварылі, што скора прыйдуць нашы, і радаваліся.

Назад у вёску з мястэчка перабраўся Язэп.

Назаўтра раненька, выганяючы ў поле, мы ўбачылі, як у мястэчка канаваю ля шашы пабег, прыгнуўшыся, немец без шапкі, мільгаючы босымі нагамі, убачылі, як па жыце каля грудкоў беглі нашы салдаты. З рэдкага хвойніку выехалі дзве машыны, нешта пацягнуўшы за сабою на грудкі, пэўна — гарматы,— і потым адтуль выстралілі — нізка на балотах, па алешніку двойчы пакацілася і адгукнулася рэха: нешта, як жывое, зашыпеўшы, паляцела ў мястэчка і там бухнула — усяго адзін раз. З хатаў выбеглі і сталі цікаваць бабы, не высоўваючыся з-за платоў, каб не застрэліла. З нашай хаты выбегла Гэлька і, падступаючыся на пальчыках, стала глядзець туды, дзе жытам беглі чырвонаармейцы, і стала крычаць: «Нашы ідуць, нашы ідуць!» А мы цэлаю плоймаю паляцелі ў канец вёскі — там паказаўся коннік, мусіць, першы разведчык.

Пад вечар у вёсцы было поўна войска. У нас за гумном, на картаплянішчы, стаялі прыхаваныя наламаным алешнікам гарматы.

На другі дзень праз вёску, упрогшыся ў передок, Язэп вёз Казіка — ужо нежывога, з запечанай ранаю вышэй брыва. Казік ляжаў на шырокіх дошках, прыбітых да перадка, абыякава адкінуўшы галаву і звесіўшы рукі, босы, і на вуліцу да Язэпа з усяго нашага канца ціхенька збягаліся бабы. Яны шморгалі насамі і ўсё нагіналіся да фартухоў і падалоў. А Язэп стаяў неяк перад усімі вінаваты, неяк усё адварочваючыся, каб не глядзець на Казіка. З-пад шапкі

бруднымі ро́гамі яму на вочы цёк пот. Ён выціраў яго рукою, неяк пачынаючы ад локця. І гаварыў — губы яго крывіліся і дрыжалі:

— Вунь каля Навасадаў... Ішоў хлопец дадому.

Толькі адна Гэлька не бегала глядзець Казіка, яна сядзела ў нас у хаце і глядзела праз акно, як разыходзіліся і плакалі бабы. Мая маці, вярнуўшыся, усё наракала на яе: «Гэта ж грэх, каб нябожчыка не паглядзець».

— Няхай, цётачка, я ўсё буду думаць, што ён жывы.— Гэлька ўсхліпнула і, закрыўшыся рукамі, выбегла з хаты ў сенцы і там плакала.

Назаўтра яна пайшла да Піліпа, мусіць, не чакаючы Цярэню.

На трэці дзень шашою недзе ў бок Навагрудка нашы салдаты — можа, адзін на сто — гналі палонных немцаў. Канчалася вайна — мы пляскалі на каменнях чорныя нямецкія крыжы і прыколвалі да шапак выразаныя з жоўтых кансервавых бляшанак зоркі. Я насіў вялікую зашытую з аднаго канца, каб не звальвалася з галавы, вылінялую на сонцы пілотку.

Неўзабаве дадому вярнуўся Ясь Хрышчоны. Вярнуўся нямоглы, худы і, казалі, хворы на трасцу. Ён быў ужо дарослы і, крышку ачуняўшы ад хваробы, пайшоў у сваты да Піліпавае наймічкі Гэлькі. Мусіць, нават мелася быць вяселле, але Гэлька раптам, нечакана-негадана, з'ехала з нашае вёскі. Неўзабаве невядома куды падаўся Ясь Хрышчоны. Казалі, што ён паехаў шукаць Гэльку.

Скончылася вайна, толькі не скончылася маё і Лёнікава дзяцінства: на восень мы зноў пайшлі ў мястэчковую школу, у тую самую, у якой некалі стаялі немцы. Школьны будынак пабялілі нанова, а паласатую будку, што была каля варот, нехта зацягнуў аж за прыбіральню. Спаганяючы злосць на фашыстаў, мы ламалі гэтую будку і адракаліся вучыць нямецкую мову. Мы яшчэ былі дзеці, але ў нашых вачах стаяла вайна. Мы яе бачылі малымі, каб разумець і ненавідзець дарослымі.

## Маці

Чалавеку заўсёды помніцца нешта нязвыклае. Некалі, едучы дадому, ужо за Наваградкам я ўбачыў зрэзаныя старыя бярэзіны — яны ляжалі каля шашы роўненька адна пры адной, так як яны і раслі, яшчэ з зялёным непрывялым веццем. Тут быў круты паварот — дарожнікі збіраліся выпраміць трохі і пашырыць шашу і зрэзалі гэтыя бярэзіны.

Але было нешта нязвыклае, што ты бачыш гэтыя старыя зялёныя дрэвы, тоўстыя ў камлях, ужо нежывыя, з нерухомым галлём, а там, дзе яны нядаўна стаялі, асталіся нізкія, яшчэ свежыя белаватыя пні, было нязвыкла, што тут, каля вёскі Шайбакова, змяніўся і неяк пагалеў свет.

Прайшло год пяць, але кожны раз, калі я еду дамоў і мінаю вёску Шайбакова, мне спамінаюцца гэтыя зрэзаныя бярэзіны — зялёныя, яшчэ не звялыя, што ляжалі ўпокат на зямлі, на сподзе душы зварухнецца той даўнейшы ачахлы боль.

Гэтак іншы раз мне спамянецца старая кабета, якую я стрэў у тралейбусе колькі год назад, калі я раптам убачу чый-небудзь нязвыклы, непрыгожы твар.

Забыўся, у якую гэта было пару, але пэўна ў раннюю зіму ці ў познюю восень, бо на кабеце сядзеў трохі выцвілы сіні бушлат з жоўтымі бляшанымі гузікамі, а на галаве была суконная хустка, закручаная тоўстым рагом кругом шыі.

Кабета сядзела згорбіўшыся на пярэднім сядзенні — тварам да ўсіх. Яна неяк нерухома і зацята глядзела сабе пад ногі, старыя яе рукі з набраклымі сінімі жыламі накрыж ляжалі на каленях, палец адзін у яе быў заверчаны белым лапікам, усё роўна як парэзаны сярпом на жніве. І яна шавяліла гэтым заверчаным у белы лапік парэзаным пальцам, як варушыць пальцам хворы чалавек, лежачы на Божай пасцелі і думаючы пра блізкую смерць.

Твар у кабеты быў сцяты ад нейкае злосці, спярэшчаны маршчынамі, чырванаваты з шырокім носам, і я, узіраючыся ў гэты твар, думаў, што яна многа і даўно п'е, пэўна, брыдка лаецца. У маёй душы рабілася нешта такое, як робіцца

з чалавекам тады, калі ён глядзіць у стары занядбаны калодзеж, забіты зверху, каб ніхто не ўваліўся, спарахнелымі дошкамі, і там блішчыць вада, але не той цёмнаю глыбокаю чысцінёю, а каламутнасцю; закіданая палкамі, зацярушаная брудам.

І пакуль я думаў гэтак пра кабету ў сінім злінялым бушлаце, у тоўстай суконнай хустцы, закручанай адным рогам кругом шыі, як там ужо стаяла кантралёр — маладое, занадта ўжо вёрткае і бойкае дзяўчо.

— Ваш талон,— спытала яна, працягнуўшы руку да кабеты, але ўзіраючыся не на яе, а некуды ў акно.

Кабета ці то не пачула, ці то не разабралася, што да яе гавораць, усё гэтаксама нерухома сядзела, угнуўшыся і варушачы заверчаным пальцам.

Маладое дзяўчо насупілася і спытала зноў, і ўжо цвёрда.

І мне, як і гэтай, мусіць, дзяўчаці, што раптам сцялася, пачало здавацца, што кабета скажа нешта нядобрае, злое, скажа хрыпаватым тоўстым голасам, якім, бывае, гавораць старыя мужчыны, курцы.

Кабета падняла свой чырвоны, сцяты як ад злосці, нязычлівы твар з шырокім носам, і я ўбачыў яе рудыя, трохі зеленаватыя выцвілыя вочы і здзівіўся, што яны былі такія самыя, як у маёй мацеры.

— А мае вы дзеткі, я ж давала гэтыя дваццаць капеек.

Голас у кабеты быў маладжавы, мяккі, сакоўны, і было нешта ласкавае, зычлівае ў гэтым голасе. І ён быў таксама падобны да голасу маёй мацеры.

З твару ў дзяўчаці збегла цвёрдасць, нейкае спалоханае дзіва блеснула ў яе вачах, дзяўчына адступілася ад кабеты і пайшла ўжо сюды, да нас. А недзе ззаду ў тралейбусе пачалі крычаць, што даўно ходзяць па руках нечыя талоны і чаму гэта ніхто не прызнаецца.

А мяне спярша, як і гэта вёрткае дзяўчо, узяло дзіва, а потым на сподзе душы заварушылася нейкая брыдкасць, схапіў нейкі сорам, я чуў бог ведае якую віну сам перад сабою за ўсё маё благое, што я думаў пра гэтую кабету.

Мне пара было выходзіць, я падняўся з сядзення, усё ўзіраючыся на кабету ў выцвілым сінім бушлаце з жоўтымі бляшанымі гузікамі, на яе твар, і мне пачало здавацца, што гэты непрыгожы, трохі пляскаты твар раптам змяніўся, бо мне помніўся ўсё яе голас, мяккі, ціхі, як голас у мае маці.

Я выйшаў з тралейбуса і сунуўся праз людскі вір на вуліцы. Не, тады, мусіць, была ранняя вясна, пагодны дзень, сонца, сухі, падсушаны вастраватым ветрам тратуар. Я думаў пра гэтую кабету, усё стараючыся ўгадаць — хто яна, і, невядома чаму, мне раптам здалося, што яна тая нешчаслівая маці, у якое з вайны не вярнуліся дзеці: іх даўно няма на свеце, а яна ўсё жыве, просячы ў Бога смерці.

Я перабіраў у памяці ўсё, што калі чуў ці ведаў пра маццярок.

І чым болей я думаў пра гэтую кабету, тым выразней бачыў, што з твару яна была падобна на маю маці, і галасам, і паставай, і гэтым заверчаным у белы лапік, як парэзаным на жніве, пальцам.

## Салодкія яблыкі

### I

«Старасту» — абструганую яловую палку з накарэлым на ёй цестам (мусіць, нехта мяшаў свінням і коням) — да Папялішыных прынёс стары Цурусь. Папялішыных якраз не было дома: на дзвярах вісеў замок — жалезнае конскае пута. Стары Цурусь пастаяў каля парога, аддыхаўся, паставіў палку каля вушака і пасунуўся дадому.

«Стараста», пасля таго як партызаны застрэлілі Івана Якімчыка, ішоў па вёсцы радоўкаю. Сёння адбыла адна хата за старасту, назаўтра другая.

На трэцім тыдні чарга дайшла да Папялішынай Марылі.

Марыля жыла адна з дзесяцігадовым Тонікам, які быў рыхтык колішні кравец, што шыў па хутарах кажухі, і крошкі падабраў, і гэтакі быў таўстагубы, і гэтак зацята глядзеў

спадылба, як яго прызнаны цэлаю вёскаю, але не запісаны ў метрыцы бацька. І нават насіў бацькаву мянушку — Паплісты. Мужа ў Марылі не было. Да вайны яна жыла пры братах, покуль тыя не пажаніліся і, аддзяліўшыся, не пакінулі на яе старую, растрэсеную, у адзін пашарак хату.

Закарэлую ў цеста яловую палку — знак, што гэтая хата сёння за старасту,— Марыля ўбачыла тады, калі вярнулася з поля даіць пад вечар карову. Яна скінула з плячэй дзяружку сырое бярозкі, перамешанае з свірэпаю, і, шукаючы пад падрубаю каля дзвярэй ключ, агледзела яловую палку. Гэту палку, яна добра помніць, прыносілі пад дзверы яшчэ «за польскім часам», калі ў вёсцы ўвялі варту.

— Які ж з мяне староста? — закрычала на ўвесь надворак Марыля, каб, мусіць, чулі і суседзі.— Хіба ж у вёсцы пазводзіліся мужчыны?

Яна ўзяла палку і пайшла шукаць свайго Тоніка, каб занёс «старасту» да Мартына Жолудзя, з якім яна ўжо нешта з год не гаварыла, пасварыўшыся за калодзеж.

Марыля выглянула за гумны і, нікога там не ўбачыўшы, пайшла ў канец вёскі на грудок, адкуль усе мацяркі клікалі сваіх дзяцей, калі трэба было палуднаваць і выганяць на пашу быдла. Папрыганяўшы на дзень, пастухі цэлаю плоймаю моклі ў рэчцы.

— Тонік, каб ты не даждаў, дадому ідзі,— гукнула Марыля і, засланяючыся рукою ад сонца, стала глядзець туды, пад алешнік, пад рэчку, дзе па беразе бегалі голыя, як бізуны, дзеці. Адыходзячыся аж да самых гародаў, яны набіралі разгон і скакалі, мусіць, у рэчку.

— Не чуе, недавярак,— сказала Марыля і гукнула яшчэ раз: — Тонік, каму я кажу, дадому ідзі!

Тонік якраз сядзеў пад берагам — адтуль была відаць яго вострая худая спіна — і, засунуўшы руку ў слізкія, пабрастаныя зялёнаю бадзягаю карчы, толькі чуў, як мякка біліся аб яго растапыраныя пальцы нямоцнымі хвастамі вёрткія плоткі. Тут іх заўсёды цэлую торбу набіраў Сямён Мокуць. У карчах былі глыбокія і патаемныя лёхі. Тонік падшыўся далей пад бераг і засунуў руку аж па самую паху.

Але там яго востра і моцна, як кляшчамі, схапіла за мезенец. «Выдра»,— спалохаўшыся, падумаў Тонік. Ён ведаў, што выдра вялася пад Сцяпанаваю алешынаю ў завоінцы ў карчах і, кажуць, нават паела ў некага шчанят. Тонік ірвануў руку назад і, збялелы, выскачыў з-пад берага: на мезенцы вісеў вялікі без аднае кляшні рак.

— А во Паплісты рака злавіў,— закрычалі на беразе.

Але рак пстрыкнуў хвастом, адарваўся ад пальца і ляпнуўся ў ваду. Тонік толькі бачыў, як ён вёртка шмыгануў назад пад бераг.

— Вот пусці мяне,— папрасіўся Мокуцеў Арсенік, што стаяў на беразе, увесь ссінелы, скорчыўшыся, і ў яго ад холаду дробна дрыжала барада.— Там мой бацька вунь колькі налавіў. Цябе ж усё роўна маці кліча дадому.

— Дзе? — спытаўся Тонік, вылазячы з рэчкі, бо ведаў, калі ён не паслухаецца, то маці будзе ісці сюды з абшморганаю лазіною, ад якое надта ж пячэ, калі сеануць па нагах.

— Ну, ідзі лаві,— сказаў Тонік і пачаў апранацца.

Бялявы, з выцвілымі валасамі і аблупленым чырвоным ад сонца носам Арсенік быў старэйшы за Тоніка, але надта рахманы і не вельмі разважлівы хлопец. Пазаўчора Тонік з двума Жолудзевымі, падмануўшы, адвялі яго ад дому і залезлі ў іхні, Мокуцеў, сад: там былі на адной яблыні хоць яшчэ маленькія, не раўнуючы, як арэхі, але ўжо саладкія яблыкі. Але яблык яны не нарвалі: з хаты выскачыў, расшпіляючы на бягу папружку, Арсенікаў бацька — Сямён Мокуць.

Ён злавіў большага Жолудзевага якраз на яблыні. Ён, Тонік, з меншымі прашыўшыся пад дрот, паспелі ўцячы. Праўда, Тонік зачапіўся за калючку і разлупіў на спіне новую, маці яшчэ і не мыла, паркалёвую кашулю. І пазаўчора яму добра ўляцела дома. Але Тонік болей пабойваўся Сямёна Мокуця. Што маці — яна паганяла наўкруг грубкі, і яму дасталося толькі попускам, калі ён, не паспеўшы адчыніць дзверы, уцякаў на двор. Але венік, які ён звязаў у полі з бярозавага вецця, быў яшчэ сыры і мяккі. Мужчыны, пэўна, б'юцца не так. Старэйшы Жолудзеў вунь: колькі плакаў, калі яго нашастаў па вушах Сямён Мокуць.

Тонік ішоў дадому са страхам, думаючы, як мінуць Арсенікаву хату, каб часам не нарвацца на яго бацьку. Ён ужо трэці дзень асцерагаўся Сямёна Мокуця. Летась ён гэтак выратаваўся ад Мартына Жолудзя, калі прыпасвіў яго авёс.

На вуліцы балазе нікога не было, але Мокуцеву хату Тонік мінуў подбегам.

На падворку, мусіць, ужо выкінуўшы карове траву, маці абівала аб плот дзяружку. На частаколе густа асядаў пыл.

— Ну чаго? — яшчэ з вуліцы спытаўся Тонік, усё ж пабойваючыся падыходзіць бліжэй да маці.

— Дзе ж гэта ходзіш, каб хто ведаў? — Марыля павесіла на плот дзяружку і ўзяла з прызбы доўгую палку.

Тонік адступіўся, ужо аглядаючыся, як шмыгануць назад на вуліцу.

— На, занясі да Жолудзяў. Вот прынеслі «старасту».— Яна шпурнула палку ў мураву пад плот.— Хіба ж няма мужчын? Каб іх ліха абстарасціла.

Тонік падняў палку і, стракочучы ёю па плоце, пабег да Жолудзяў. Сенцы ў Жолудзяў былі адчынены. Там немаведама што нарабілі куры. Яны паляцелі з крыкам на двор, паднімаючы вецер, калі Тонік увайшоў у сенцы. На абітых старою дзяружкаю дзвярах, з-пад якое пучкамі тырчала старая парудзелая салома, паднялася, бразнуўшы, жалезная клямка. Дзверы адчыніліся, і ў сенцы высунулася чорная калматая галава. Гэта быў сам Жолудзь — нябрыты, з апухлымі ад сну вачыма.

— «Старасту» вам прынёс,— замест «дзень добры» сказаў Тонік, апомніўшыся, што яго мама вучыла: як зойдзеш да каго ў хату — трэба найперш павітацца.

«Такое бяды, тут жа не хата, а сенцы»,— падумаў ён.

— А хіба ж вы былі за старасту? — спытаў Жолудзь, не выходзячы ў сенцы.

— Не,— пакруціў галавою Тонік.

— То чаму цераз хату? Раз усе, так усе,— сказаў Жолудзь, хаваючыся за дзверы.

Тонік выйшаў з сенцаў і папхнуў перад сабой палку, пакідаючы на Жолудзевым надворку неглыбокую баразну.

— Нашто ж прынёс дадому? — спытала праз акно маці, калі Тонік кінуў палку на прызбу.

— Ай, не бяруць! — моцна крыкнуў Тонік, каб, мусіць, чутна было ў хаце. Ён ірвануўся скарэй туды, пад рэчку, ён успомніў, што сёння ўсе хлопцы збіраліся ў Ельнік — грузкае з рудою вадой і рэдкімі лазнякамі балота, дзе кожны год у асацэ на купінах вяліся дзікія качкі і дзе ён, Тонік, летась выбраў з аднаго гнязда поўную шапку яец.

— Куды ж ты паляцеў? Гэта ж палуднаваць час,— пастукала ў раму маці, але Тонік ужо не чуў.

**2**

Кожны вечар, прыгнаўшы з поля, Тонік катаў па вуліцы рэхву. Старую ад рассохлага кола рэхву ён знайшоў на гарышчы. Рэхвы каталі ўсе, толькі ў Арсеніка быў вялікі ад жалезнай бочкі абруч. Арсенік апярэджваў усіх, але толькі на цвёрдай сцежцы, бо на пяску абруч загразаў і падаў. Але як далёка ён бег з таго грудка ў канцы вёскі, калі яны ўсе разам пускалі свае коткі пад рэчку. Арсенікаў абруч, падскокваючы і высякаючы аб каменні іскры, каціўся аж да самых гародаў, там яшчэ заварочваўся і падаў у самым Ельніку, у гразі. Тонікава рэхва не дакочвалася нават да загарадаў. Але сёння ён ледзь знайшоў яе ў высокай траве. А Арсенікаў абруч, як ні шукалі яны ўсе разам,— не знайшлі. Ён закаціўся недзе ў асаку. Праўда, нехта сказаў, што калі пачнуць касіць, то ён знойдзецца. Бо хто-небудзь, вытупіўшы касу аб жалеза, выкіне яго з сенажаці на дарогу. Але Арсенік не даў веры, ён застаўся шукаць свой абруч. Усе ж хлопцы паехалі дадому, бо ўжо добра сцямнела, а ён, Тонік, успомніў, што не загнаў яшчэ на седала курэй. Мама сказала, што вернецца зацемна. Падаіўшы нанач карову, яна пайшла на хутары, што над Азяранамі, пазычыць мукі — сёння ў іх нават не было чым падкалаціць шчавель. «Глядзі ж з агнём,— прыказала мама,— не запальвай, бо і газы так толькі на якую пільную патрэбу. А калі будуць страляць, то на печы не сядзі». Ды Тонік і сам ведаў, што

калі страляюць, то трэба хавацца за печ. Праз цэглу, казалі, нават не праходзіць снарад, а не то што куля. Куля нават не прайшла праз іхнюю сцяну, калі немцы стралялі па вёсцы. Яна засела ў трухлявай дзеравіне, і ён выкалупаў яе дроцікам. Але яму тады ніхто не паверыў, што куля не пройдзе праз сцяну. Тонік доўга насіў гэтую кулю ў кішэні, покуль яе не агледзела маці і не накрычала. «Няхай крые бог, гэта ж калекаю праз якое ліха застанешся. Ніколі не бяры». Ды ён, Тонік, не вельмі браў. Гэта большыя хлопцы. Сёння яны нават прынеслі вялікі снарад, не раўнуючы, як парася. Ён доўга ляжаў у агні, покуль узарваўся. Яны ўжо адбегліся аж пад самую вёску, як убачылі спачатку дым, а потым моцна, нібы гром, стрэліла — каровы паднялі вушы і сталі нюхаць вецер. Большыя хлопцы яшчэ вярнуліся паглядзець, што засталося ад агню і снарада. Іх, меншых, не пусцілі. Казалі, што снарад пракапаў вялікую, можа, на метраў сто, канаву.

Засынаючы на цёплай яшчэ пад анучамі печы (ён заўсёды, калі не было мамы, спаў на печы і ніколі не чуў, як яна пераносіла яго на ложак), Тонік думаў, як раніцаю ён пабяжыць на тое месца, дзе сёння яны клалі агонь. І яму ўжо снілася Лука, тое асадніцкае балота, куды прыганялі сваё быдла аж тры вёскі. І ён ужо бачыў, як у агні яшчэ ляжаў снарад, як усе ўцякалі, а толькі ён, Тонік, ніяк не мог варухнуць нагамі. І снарад узарваўся, і Тоніку раптам здалося невядома чаму, што ўзарваўся ў сенцах. Тонік адкрыў вочы — нехта моцна грукаў у дзверы.

«Пэўна, маці»,— думаў ён, ссоўваючыся з печы на лаўку, дзе стаяла вядро з вадою, на якім заўсёды дробненька звінеў вочап. Тонік выбег у сенцы. «Хто там?» — хацеў спытаць ён, як пыталіся ў яго заўсёды, калі ён прыходзіў да каго вечарам, але на надворку, яму здалося, гаварылі чужыя. Нечая рука адтуль ізноў моцна страсянула дзверы.

«Каб не стралялі!» — Тонік нават перастаў дыхаць.

— Стараста тут? — спытаўся знадворку нехта тоўстым голасам, і Тоніку здалося, што гэты «нехта» быў надта высокі, як Піліпаў Васька, па якім мераліся ў вёсцы, бо, убачыўшы каго рослага, казалі: «Вялікі, як Васька».

— Няўжо спяць? — загаварыў другі асіпла і тонка, мусіць, нізенькі.

— Мамы нямашака дома,— сказаў Тонік. Ён помніў, што мама наказвала не адчыняць нікому чужому — пастукае ды пойдзе.

— А дзе ж жыве староста? — спытаўся той самы тоўсты голас.

— У нас! — адказаў Тонік, нарэшце здагадаўшыся пра тую яловую палку, якую ён насіў да Жолудзяў і якая ляжала цяпер на прызбе, і пасмялеў.

— Дык адчыняй, чаго ты баішся,— здаецца, ужо добра сказаў той самы, мусіць, высокі.

Тонік намацаў у поцемках засаўку і, націскваючы плячом на дзверы, з грукатам яе адсунуў.

На двары іх было куды болей — ужо потым разгледзеўся Тонік, калі яны перасталі свяціць яму ў вочы ліхтарыкам,— і ўсе ў чорным, з аўтаматамі на грудзях, з нейкімі малаватымі на булаватых галовах пілоткамі.

«Паліцыянты… Яны хоць па-нашаму гавораць».

— Дык дзе ж той староста? — спытаўся асіплым, тоненькім голасам якраз самы высокі з іх, той, што свяціў у вочы ліхтарыкам.

— Наша сёння хата за старасту.

— Як?

— Да нас дайшла радоўка,— сказаў Тонік, ужо адчуваючы, што яго ці ад холаду, ці ад страху пачынае калаціць.

— Хрэн з ёю, з гэтаю радоўкаю! — загаварыў намнога ніжэйшы за таго большага, але тым самым тоўстым голасам.— Ты ведаеш, у каго ёсць коні?

— Ведаю,— сцішна адказаў Тонік, раптам успомніўшы, як ён ледзь не наскочыў сёння на Арсенікавага бацьку, Сямёна Мокуця, калі той вёў да рэчкі паіць каня.

— Ну, ідзі, пакажаш!

На вуліцы каля плота іх цямнела многа. Недзе гаварылі, чуваць было, і ў другім канцы вёскі. «Аблава»,— падумаў Тонік. Гэтакае было на згоне зімы, тады, калі нямецкія салдаты бамбілі Ліпава, што пад лесам, і ў іхняй вёсцы хацелі застрэліць Піліпавага Ваську, што скоса глянуў на немца.

— Во, у іх ёсць конь,— паказаў Тонік на Мокуцеву хату, калі большы мінуў Арсенікаву брамку.

— Хлопцы, ідзіце сюды,— спыніў высокі, пэўна, загадваючы тым, што стаялі, падпёршы плячыма частакол.

— А ў гэтай няма? — паказаў рукою меншы на Жолудзяў, убачыўшы, што Жолудзеву хату невядома чаму мінулі.

— Не,— сказаў Тонік, бо ведаў, што Марціну Жолудзю садзіў бульбу і вывозіў гной стары Піліп, што жыў у другім канцы вёскі.

— Конь у Хведаравых ёсць,— у Хведаравых быў пярэсты — чорны з белым — конь: ён кульгаў на адну нагу і кусаўся,— і ў Шакуна, што за імі,— яшчэ ўспомніў Тонік.

— А дзе гэтыя Хведаравыя? — пацікавіўся той высокі, як Піліпаў Васька.

— А вунь пад бярэзінаю.— У Хведаравых на надворку расла старая бяроза, і ўсе ў вёсцы казалі на гэтае месца «пад бярэзінаю».

— Скажы, а ў партызанах з вашай вёскі ёсць хто? — пацікавіўся раптам меншы.

У партызанах быў Верчын Сярожа. Ён нават прыходзіў дадому і танцаваў на вечарынцы з Жолудзеваю Волькаю, і ўсе гаварылі, што яны любяцца.

— У нас партызанаў няма,— сказаў тое самае Тонік, што гаварыў аднаго разу стары Піліп на вуліцы чырвонаму немцу; Тонік ніколі не бачыў, каб былі гэтакія чырвоныя, як жар — і валасы, і бровы,— людзі.

— Ну ладна, бяжы дадому,— махнуў рукою большы. І Тонік пабег. Мінаючы Мокуцяў, бачыў, што ў тых у хаце паліцыянты бліскалі ліхтарыкамі, і чуў, што гаварыў сам Мокуць: «Паночкі, ды я ж учора толькі ездзіў».

«Мне ўжо не будзе каго баяцца, калі Мокуця забяруць у абоз»,— радаваўся Тонік і тут жа ўспомніў, што дадому, пэўна, ужо вяртаецца маці — адна, гэтакаю цемнатою. І каб яе не застрэлілі — раптам спалохаўся ён. І ўжо дома не спаў, покуль яна не вярнулася з Азяранскіх хутароў, так і не пазычыўшы мукі.

## 3

На трэці дзень паявіўся Мокуцеў конь з хамутом і набедрыкамі, але без воза. Раніцаю яго ўбачылі пастухі: ён піў у рэчцы ваду, за ноч, мусіць, добра выеўшыся на чужых сенажацях.

Выйшаўшы на бераг на сухі пясок, конь укленчыў на пярэднія ногі, выцягнуўшы шыю, прылёг на бок і, брыкаючы нагамі, перавярнуўся на спіну. Потым, падняўшы худы азадак, конь устаў. Шырока расставіўшы ногі, страсянуў з сябе жоўты пясок, пакруціў галавою, фыркнуў і памалу пайшоў у вёску.

— А вунь ваш конь,— паказаў Арсеніку большы Жолудзеў.

Арсенік паправіў на плячы шлейку, выцер рукавом нос і пабег лавіць каня.

«А дзе ж Мокуць? — гледзячы ўслед Арсеніку, падумаў Тонік, і раптам яго апанаваў страх: — А што будзе, калі не вярнуўся? Гэта ж усе ведаюць, што я быў за старасту, і адразу падумаюць — удаў Мокуця».

Конь тым часам быў ужо ў вёсцы.

— Глядзі сюды! — штурхануў Тоніка большы Жолудзеў.— Хіба не бачыш, карова дзе?

Тонік аглянуўся: яго карова стаяла ў аўсе, якраз на сярэдзіне палетка. Вырываючы авёс з карэннямі, яна жавала толькі мяцёлкі.

Тонік выгнаў з аўса карову і пачаў зноў глядзець у бок вёскі. Арсенікава галава мільгала ўжо на вуліцы за частаколам.

«Ліха не возьме гэтага Мокуця»,— плюнуў нарэшце Тонік і пачаў мераць свой цень — ці не пара гнаць дадому.

— Яшчэ ранавата.— Махнуў рукою большы Жолудзеў і дастаў з кішэні складаны ножык.— Давай во лепей гуляць у ножыка.

Яны згулялі аж тры разы, але Арсеніка ўсё не было.

Тонік зноў пачаў мераць свой цень. Цяпер ён налічыў пяць ступняў: можна было гнаць дадому.

Каровы ўжо самі пацягнуліся на дарогу, пад рэчку, яны хацелі піць. Толькі авечкі, млеючы ад гарачыні, ляжалі пад алешынай. Тонік стрэльнуў пугай: авечкі нехаця падняліся і пабеглі, збіўшыся ў кучу і адпіраючы адна адну бокам.

— А дзе ж Арсенік? — услых спытаў Тонік.

— Дома, дзе ж. Нашто ён табе? Вот лепей глядзі за каровамі, а то твая ізноў павядзе ў авёс.— Большы Жолудзеў, мусіць, не думаў пра Арсеніка і яго бацьку.

«Няўжо не вярнуўся Мокуць?» — Тонік падкасаў штаны і палез у рэчку выганяць кароў.

Трымаючы ў руцэ кусок пасінелае бульбянае кашы, на вуліцы іх ужо чакаў Арсенік.

— Дай пакаштаваць,— папрасіў большы Жолудзеў.

Арсенік адламаў яму і Тоніку.

— Ну што, прыйшоў твой бацька? — спытаўся Тонік і крадком глянуў на Арсеніка.

— Не... можа, яшчэ прыйдзе,— сказаў Арсенік і зрабіўся раптам сцішны.

## 4

Папалуднаваўшы, Тонік выйшаў на вуліцу. Стаяла гарачыня. У гародчыках вяў бэз. Ля плота, параскрываўшы дзюбы, хадзілі куры, ім, пэўна, было млосна. Толькі адна матылька хіба не баялася гарачыні: яна ўсё вілася над вуліцаю, нізка, пры самай зямлі, нібы шукала, згубіўшы што.

«Мо схадзіць на рэчку?»

Тоніку было сумна.

На плоце каля свае хаты сядзеў Арсенік. Тонік падняў вочы і ўбачыў яго.

«Ён чакае бацьку»,— раптам падумалася Тоніку.

— Ідзі сюды! — клікнуў яго Арсенік.

Тонік нехаця падышоў.

— Хочаш, я табе гняздо пакажу? — хітра прыжмурыўся Арсенік.

— Дзе?

— Пад рэчкаю.

— Хадзем.

Вузенькаю сцежкаю, што бегла праз Цурусеў надворак і якою бабы з цэлае вёскі хадзілі паласкаць бялізну, яны пачалі спускацца да рэчкі. Сцежка шылася праз крапіву і лопух. На ёй валяліся бітае шкло і калючы дрот. Тонік ведаў — гэта накідаў стары Цурусь, каб не хадзілі яго пляцамі. Тонік помніць, як ён летась на гэтай сцежцы загнаў у нагу вялікую ржавую калючку. Нага потым нарывала. Ён некалькі начэй не спаў і доўга хадзіў на пальчыках.

— Глядзі, не наступі на шкло! — крыкнуў Тонік, спускаючыся ўслед за Арсенікам.

— Я ведаю,— адгукнуўся Арсенік ужо каля рэчкі.

Тонік не ўтрываў і пабег таксама.

Рэчка сёння была роўная з берагамі — недзе ў млыне адкрылі ўсе застаўкі. У карчах шумела і булькала вада. Пад навіслаю старою алешынаю кружылася жоўтая шапка пены. Каля берага цэлаю плоймаю стаялі вадзяныя камары.

— А дзе яны зімуюць? — спытаўся Тонік, сашморгваючы з алешыны лісце, каб разагнаць камароў.

— Не ведаю,— задумаўшыся, адказаў Арсенік.— Вот як прыйдзе мой бацька — спытаем.

Тоніку зноў зрабілася сумна. Ён спытаў:

— А дзе ж гняздо?

— Хадзем сюды.— Арсенік пашыўся ў альховыя кусты.

«А што будзе, калі ўсе дазнаюцца, што праз мяне не вярнуўся Арсенікаў бацька?» — Тоніку ўжо расхацелася глядзець тое гняздо.

— Вось! — крыкнуў з куста Арсенік.

«А можа, сказаць? Можа, будзе лепей?» — Тонік уздыхнуў і, заплюшчыўшы вочы, палез у куст на Арсенікаў голас. У кусце запахла горкаю ледзьмаю і сапрэлаю травой. Нешта моцна пеканула ў Тонікаву руку. Ён адкрыў вочы: крапіва. Яе тут было многа.

— Во, бачыш.— Арсенік падсунуўся да густога куста, што рос над самаю вадою.

На тонкім пруціку калыхалася звітае з аднаго конскага воласся шэрае гняздзечка. Голыя, у рэдкім пушку,

птушаняты нямогла паднялі сляпыя на тонкіх шыях галоўкі і раскрылі мокрыя чырвоныя раты. Галоўкі смешна хісталіся.

Недзе зусім блізка пырхала і ціўкала птушачка.

— Во, прынесла есці.— Тонік першы вылез з алешніку.— Уцякайма, а то адаб'ём ад гнязда птушку. Купацца пойдзем пад Сцяпанаву алешыну.

Арсенік зморшчыў аблуплены нос:

— Я нікуды не пайду.

— Чаму?

— Пайду гляну, мо вярнуўся бацька.

Арсенік падцягнуў на плячо з'ехаўшую шлейку і бокам, каб не апячыся ў крапіве, пачаў паднімацца тою самаю вузкаю сцежкаю ў вёску.

— А ведаеш, хто сказаў паліцыянтам, што ў вас ёсць конь? — крыкнуў Тонік, калі ён адышоўся.

— Ведаю,— аглянуўся Арсенік і сцішыў голас, мусіць, каб не было чутно ў вёсцы,— мама казала — Цурусь, ён усіх удае немцам.

— Я,— хацеў крыкнуць Тонік, але ў яго перахапіла дух.

**5**

Што немцы застрэлілі Арсенікавага бацьку, Тонік даназўся ў той самы дзень, як наказалі ў вёску. Гаварылі, што Арсенікаў бацька, забіўшы паліцаяя, перабягаў да партызан.

У той самы дзень было чуваць, як недзе на панадворку галасіла Арсенікава маці, Тонік нават баяўся паказвацца на вуліцу. Ён сядзеў у сваім гародчыку, паглядаючы праз частакол, што робіцца на вуліцы каля Мокуцяў. Але каля варот бачыў толькі вялікага чырвонага Мокуцевага пеўня. Певень, падняўшы галаву, кудахтаў, да яго, падлятаючы, з усіх надворкаў беглі куры.

У той самы дзень Тонік першы раз не пагнаў у грамаду. Ён знайшоў на гарышчы вяроўку, прывязаў яе карове за шлейку на шыі і павёў карову на ўзмежкі. На ўзмежках, ён ведаў, была нявыпасеная, па калена, трава.

Дадому ён прыгнаў позна, нават маці спыталася, чаму не разам з усімі. Яна ўжо чакала з даёнкаю каля хлява.

Тонік пастаяў пры маме, паслухаў, як недзе ў канцы вёскі крычаць і смяюцца дзеці, і пайшоў пад хату, думаючы, з кім ён сёння будзе забаўляцца, калі ўсе, напэўна, ведаюць, што праз яго немцы застрэлілі Арсенікавага бацьку.

Тонік прыпыніўся каля сенцаў, у хату не хацелася ісці. Ён высунуўся на вуліцу.

— Тонік! — блізка за спіною крыкнуў Арсенік, і Тонік аж падскочыў.— Чаго ты спалохаўся? — Арсенік быў увесь спацелы і задыханы.

— Я не...— ледзь вымавіў Тонік, адчуваючы, як у яго моцна дрыжыць і стукае сэрца.

— Хадзем да дзяцей.

— Не, я не пайду, я ўдаў твайго бацьку.— У Тоніка раптам пачала макрэць спіна.

— Што ты пляцеш.— Арсенік яшчэ ўсё цяжка дыхаў.— Бацьку майго ўдаў стары Цурусь.

— Не, гэта я, калі быў за старасту. Але ж я не ведаў, што яго застрэляць...— сказаў яшчэ Тонік, адступаючы на свой надворак.

...Ноччу Тонік захварэў. Ён пачаў стагнаць і кідацца ў сне. Марыля ссунулася з печы, памацала яго лобік — ён гарэў як агнём. Яна намачыла ручнік і прыклала Тоніку да галавы: хлопец крышку паспакайнеў. Усю ноч Марыля сядзела над ім і прыкладала да яго галавы мокры ручнік. Жар у Тоніка пачаў спадаць. Але раніцаю Марыля ўсё роўна палезла на гарышча за гарнікам, там у яе сохла яшчэ ад леташняга года некалькі каліў гэтага зелля, што памагае, як яна ведала, ад усіх хвароб.

## Дзікі голуб

Гэта было год дваццаць назад...

Але раскажу спярша, што было летась.

Я ехаў дадому, не — спярша ляцеў. Жаўтаваты «АН-2» (у аэрапорце, дзе грэліся на сонцы, нібы шчупакі каля плыткага берага, доўгія «ТУ», ён здаўся мне бог ведае якою старызнаю) доўга вісеў, што лёгкі камар, над чорнымі палеткамі

ўжо заaранага на зіму ржышча, над блішчастымі, вузенькімі і ў адных петлях рэчкамі — здаецца, наступі нагою — і запыніш, над маленькімі, хоць збяры ў жменю, вёскамі, над лесам: зверху выдавала — гэта не лес, а растрэсены мох. З моху курыўся сіні дымок, як тлела папяроса: недзе быў пажар.

Лес там-сям быў жаўтаваты — на асінах і бярэзінах чэзла лісце. Стаяла восень — чорствая, сухаватая,— ужо капалі картоплі. Каля Наваградка, калі самалёт пачаў зніжацца, даганяючы свой цень, кабеты з гародаў, абапёршыся на капачы, узіраліся на нас, мусіць, як на лялек у кругленькіх вокнах-ілюмінатарах.

Самалёт дагнаў свой цень, цвёрда стукнуўся, аж скрыпнуўшы ад злосці, і заскакаў па зялёным аблогу; траву гнуў, усё роўна як падлізваў, вецер ад прапелера.

Не верылася, што ўжо Наваградак: жоўтыя вяргіні млеюць ад цеснаты ў гародчыках і хіляцца на плот, чырванеюць буйныя яблыкі ў дробных садках, таўкатня каля аўтобуса на станцыі — і праз якое паўгадзіны ты будзеш дома. А кругом, як другое царства — старадаўняе, бо ў аўтобус зайшоў чалавек у суконным фрэнчы з кішэнькамі на грудзях, з прыклееным да губы білецікам, каб бачылі ўсе, і яму крычыць бялявая, шырокая ў крыжы кабета, ставячы на сядзенне кошык з капачамі:

— Міхалко, ці ж узёў мне білет?

Аж ёкае сэрца ад нейкае дзікаватае, нязвыклае радасці — гэта ўжо наша гутарка.

— Хібо не бачыш...

І доўга гуркоча, як нешта там у яго саржавела, і ніяк не заводзіцца аўтобус — круглы, кароценькі, з тонкаю рэйкаю на падлозе — мусіць, пасля рамонту. Я помню, такія аўтобусы хадзілі ў Мінску год пятнаццаць назад недзе ўсё на край горада — то на Грушаўскі пасёлак, то на цагельню.

— Садзіся, чаго стаіш,— сапе, не аддыхаўшыся, кабета і здымае з сядзення кошык з капачамі.

— На тым тыдні сядзеў, на гэтым пастаю,— разам з губою варушыцца ружовы білецік.

Шафёр, малады, няголены хлопец у стракатай кепцы, за доўгую блішчастую ручку зачыняе дзверцы — нарэшце паедзем: аўтобус дрыжыць, востра дзынкаюць шыбы; каля мяне адна «ўтоплена», і ніяк яе не падкруціш угору: зламалася ручка.

— Пачакай, браток, дочачка асталася тамака,— схамянуўся чалавек і чапіў шафёра за плячо.

— Цьфу, каб ты не даждоў разам з ёю! — Нагінае галаву і адварочваецца кабета.

Толькі цяпер я ўспомніў, што каля аўтобуса дробненька круцілася, усё хаваючыся за нечыя ногі, чорная сучачка.

Шафёр абярнуўся, падняў брыво і пацягнуў за доўгую ручку.

Чалавек зняў з губы білецік, высунуўся з аўтобуса і паклікаў:

— Мушка, цю-цю-на! Мушка...

Сучачка скочыла ў аўтобус і палахліва задрыжала, затрапяталася ў чалавека каля ног. Ён узяў яе на рукі і ўмасціўся на сядзенне каля дзверцаў — мы паехалі: застракацелі запыленыя платы, вішаннік у жоўта-чырванаватым уперамешку з зялёным лісці, вокны з белымі ліштвамі, і ў некага на падаконніку я ўбачыў памідоры. І нешта зашчымела ў грудзях: падумалася пра дом, пра памідоры, што некалі таксама спялілі на сонцы, на цёплым акне. Як гэта даўно было! Колькі ж я не жыву дома?! І ўжо як счужэла ўсё тут, і гутарка, і шаша, і мне было трохі нязвыкла, што няма бруку, а шарэе асфальт, дзе на трэшчынах заліты тлустаю смалою. Гэта адтуль, з дому, ідуць машыны і гудуць, як вялікія чмялі, мінаючыся з аўтобусам. І недзе туды бяжыць бензавоз — пад ім матляецца ланцужок, нібы пупавіна ў ягняці. Фыркае халодны вецер праз адчыненае акно і студзіць, нібы аблівае халоднаю вадою, маё плячо.

— Сцішылася, як дзіцятко,— кажа нейкая маладзіца ў плюшавым сачыку, прыглядаючыся да сучачкі.

А мне пачынае здавацца, што я недзе бачыў гэтую маладзіцу, гэты чырванаваты круглы твар і нават помню яе голас. Толькі дзе, калі? І не магу ўспомніць...

— Балазе знайшоў сабе забаўку,— усё скоса паглядае на свайго чалавека дзябёлая бялявая кабета з кошыкам і капачамі.

Чалавек адварочваецца, як не да яго гаворацць, і маўчыць. Сучачка дрэмле ў яго на каленях і раптам палахліва ўздрыгвае, адкрываючы вочы, і пільна глядзіць на маладзіцу ў плюшавым сачыку.

Я прыглядаюся да чалавека ў суконным фрэнчы: твар у яго дробны, худы і трохі васпаваты і нейкія хітрыя, быстрыя вочкі — і думаю, што ён рыхтык, як той Марцін Дзікуць з нашае вёскі, і, мусіць, гэтакі трохі махляр, і добры гультай, і такі самы бяскрыўдны.

Чалавек як чуе, што я думаю пра яго, і пільна азіраецца. Я адварочваюся да акна і гляджу на белавата-шэры апаласканы дажджамі папар, на цёмны, карычняваты лапік нявырванае грэчкі,— ужо кончыўся горад,— на балотца з маладою атаваю, на разасланы лён, дзе цэлаю плоймаю топчуцца гракі, на сароку, што ляціць пад нечую зводдаль шашы хату, і думаю, што я не люблю і гэтае пары, калі на сметнікі прылятае сарока — знак, што скора халады, а з памяці ўсё не сходзіць Марцін Дзікуць. Помню: рабаваты, чорны, з-пад шапкі вылезлі і вісяць на вушах касмылі. Згадалася яго смерць, страшная, нечалавечая смерць...

З ім у вёсцы ніхто інакш не вітаўся, як пытаў здалёк: «Марцін, сечку жнуць?» Найбольш смяяліся тады, калі збіралася многа мужчын перад святам у каго-небудзь на падворку і Марцін прыносіў сваю аблупленую, шчарбатую машынку, каб падстрыгаць усіх. Машынка, мусіць, ірвала валасы, бо хто-небудзь, седзячы на скрыпучым табурэце з хусткаю на плячах, спачатку моршчыўся, а потым крычаў: «Марцін, сечку жнуць... тваю матары, валасэ павырывоў!»

Гэта некалі яшчэ, мусіць, малым, Марцін пайшоў на сяло, а там у яго спыталі, што робяць маці з бацькам. «Сечку жнуць»,— сказаў Марцін (яны, мусіць, рэзалі сечку), і з таго дня за ім цягнуўся гэты хвост і кожны тузаў...

З Марціна смяяліся ўсе — і ён, папраўдзе, быў трохі нягеглы і негаспадарскі чалавек. Невядома дзеля чаго трымаў трое сабак. Зямля на Марцінавым хутары колькі год

ляжала аблогам, і на ёй ужо займаўся ядлавец, і рос сівец, і дзе-нідзе цвіла жоўтымі калівамі дзіванна — яна любіць песчугу і сонца. Кожнае вясны Марцін падпальваў сухую траву, нізка па зямлі бег агонь, сіні дым пах ядлаўцовымі ягадамі, як у царкве. Толькі каля самае хаты зеляне́ў загон позняга жыта і цвіла ліловым цветам картопля-варшаўка — рана, наша толькі ўсходзіла.

У Марціна не было ні гумна, ні хлява, а толькі хата: зялёнымі купінамі-пляйстрамі мох на страсе, старая шапка на калу каля коміна, каб салому не дралі вароны, кошык на шчыце для галубоў, але я не помню, каб яны там вяліся, два акны ў чатыры балонкі і на адной накрыж лучынкі, каб не вывалілася разбітае шкло. І каля хаты ніводнай прысадзіны, толькі гусценькія хвоечкі, што, пэўна, выраслі самі па сабе — адтуль кожны раз, падцягваючы порткі, выходзіў Марцін Дзікуць.

Я бачыў гэта раніцаю, калі прыганяў на сваё поле карову: у Заходняй Беларусі яшчэ не было калгасаў.

Наша «дзялка» — надзел поля ў паўтара гектара — была праз сценку — вузкую дарогу, што зарасла дзяцелінай, бо па ёй ездзілі толькі тады, калі вазілі з поля збожжа ці картоплі, і на якую, барануючы, сцягвалі пырнік.

На сценцы, трымаючы за вяроўку, пасвіла пярэстую маладую карову Марцінава дачка — мая равесніца — тонкае, няспелае дзяўчо, помню, кожны дзень у адной з чырвонымі вылінялымі кветкамі сукенцы. Карова чмыхала, круціла галавою — доўгай павуцінаю цягнулася на сонцы яе сліна — і лезла ў наш авёс. Меншы Марцінаў хлопчык у кароткіх portачках на шлейцы вазіў па сценцы нейкую старую, пагібаную, у белай вапне тачку — аб днішча церлася і вішчала кола.

Калі памерла Марцінава жонка — я не помню.

Дзікуцеў хутар быў вясёлым месцам: за хвоечкамі, дзе крута абрываўся бераг, цякла і рабіла свой заварот плыценькая рэчка; раніцаю, змялеўшы, вада перакочвалася па пяску, не займаючы нават купіны з расою, і калі глядзіш на іх у гэтую пару, здавалася, што нехта высунуў з рэчкі галаву і да яе ліпнуць доўгія валасы. Старая алешына з колам на вяршку (мусіць, зацягнуў Марцін для буслоў, але

на ім крычалі, аж давячыся, вароны) берагла гэты грудок ад паводкі.

За рэчкаю жаўцеў поплаў: улетку — ад курачае слепаты, увесну — ад пяску, што наносіла вадою. І нехта пасыпаў яго попелам, каб расла трава. Па пяску слаўся падбел, цвіў белымі чачоткамі, як у рабіны, крываўнік, і гнала ўгору асот — увосень ён быў што абсыпаны ватаю: вецер нёс адтуль на наша поле лёгкія парашуты. За нерухомымі купамі вербаў, за маладым алешнікам на другім і грудку бялелі атынкованыя местачковыя хаты, чуўся нізкі сыраваты грукат цягніка, раптоўны крык гусей і тоўсты голас рэпрадуктара, быдта гаварыў нехта высокі, велічынёю да неба.

І цяпер, бывае, пачуўшы далёкі голас з рэпрадуктара, я ўспамінаю поле, траву ў скалках расы, ад якое шчымелі і заходзіліся ногі, белыя атынкованыя домікі, што былі за маладым алешнікам, і Марцінаву хату.

У ёй я быў усяго раз — спамінаецца — улетку, як нажалі жыта, пазвозілі з поля снапы і браліся касіць гарох. На нашым іржышчы паднялася трава, а ў Марціна яшчэ ўсё стаяў зажаты загон — жыта, пэўна, пераспела і асыпалася.

Я пасвіў тады на ржышчы карову, пільнуючыся, каб яна не ўскочыла ў Войнаву канюшыну, што ўжо густа закучаравілася на пакошы маладою атаваю: на другі бок нашае «дзялкі» было поле Клемуса Войны.

Клемуса я пабойваўся, бо аднаго разу, калі мая карова сцягнула з яго мэндля сноп-шапку, невядома адкуль узяўся гаспадар, трымаючы ў руцэ бізун з чорнай плеценай ручкай і чырвонымі кутасамі. Я гэта ўбачыў потым, а спярша ўчуў, як нешта раптоўна, нібы лінулі кіпятку, апякло маю шыю, потым плячо — на ім нешта з тыдзень не сходзіла, наліваючыся, што жоўцю, сінявата-цёмная пісяга.

Клемуса Войну недалюблівалі ўсе: у часе вайны ён загадваў бэнээсаўскім[1] складам, куды немцы звозілі яўрэйскае рыззё, і, казалі, набраўся золата. Не ведаю, праўда гэта ці не, але што ён неяк адразу пасля вайны прынёс

---

[1] БНС — беларуская народная самапомач; нацыяналістычная арганізацыя, якая дзейнічала ў гады акупацыі.

дадому грамафон — помню: кожнае нядзелі Клемус Война адчыняў акно, закідваў на вяровачку край фіранкі і заводзіў грамафон — мы, дзеці, сабраўшыся на вуліцы, бачылі толькі карычневую трубу, падобную на вялікую засохлую кветку мальвы.

Седзячы на мяжы, я назіркам паглядаў на карову і пароў чмялёў — яны, вялікія, чорныя, з жоўтымі паскамі, ляцелі сюды і лезлі ў норку пад чубком сухаватае травы: пад мяжою было іхняе гняздо.

Я падняў галаву і ўбачыў: над мястэчкам стаяла цёмная хмара з папяловымі краямі — кругом зрабілася сцішана і жаўтавата, як на шарай гадзіне, і стаяла духата, як накінулі на цэлы свет радзюжку. Хмара, варочаючыся клубкамі, ішла сюды, procі ветру: над мястэчкам каля шашы ўставалі аж да неба жоўтыя косы пылу. Я ведаў, што папяловая хмара — на град. Раптам вецер сціх, зрабілася страшна — са сполаху цвыркнуў і нізка паляцеў над полем жаваранак. Косы жоўтага пылу пацягнуліся на поплаў, і нечакана дыхнула скразняком і холадам, аж палягчэла. Карова падняла галаву і стала трывожна нюхаць вецер. Рэдка, нібыта і не хацеў, пасыпаўся град. Буйныя, велічынёю з арэх, калівы граду зашасталі па сухім іржышчы, заскакалі па сцежцы, нібы хто кідаў іх, забаўляючыся.

Карова згорбіла спіну, закруціла галавою — па вушах яе, мусіць, сек град — і пабегла пад Марцінаву хату. Туды, пад хату, бегла і Дзікуцёва дачка — вецер сарваў з яе галавы і панёс па полі белую хустку.

Хмара ішла пры самай зямлі — там нешта шумела, гуло, як гарачыя камені ў дзежцы з вадою. Ужо не было відаць местачковых хат, алешніку на поплаве — там стаяла шэража жоўтая сцяна. Толькі два галубы, кідаючыся ў бакі, ляцелі туды, дзе яшчэ, як радасць, сярод цёмных хмар яснела неба.

Холадам у мяне па спіне прабег страх — я кінуўся пад Марцінаву хату, а за мною вецер каціў па ржышчы бярэма скошанага гароху.

А там, над мястэчкам, над поплавам грымела, раўло, нібы ламалася і падала на зямлю вялікімі крыгамі неба. Мне

зрабілася страшна: я ўспомніў — казала маці,— што калі на зямлю ўпадзе хмара, то на тым месцы паўстане мора.

Град пабольшаў. Ён моцна сек мне па костачках, па пятах, і раптам па галаве востра трупнула, і было чуваць, як адскочыла вялікая, з курынае яйцо, градзіна — я аж спатыкнуўся і адчуў, як на галаве пякучай гарачынёю наліваецца гуз.

Я дабег да Марцінавай хаты і стаў пад страху: па сцяне грукацеў, нібы перавярнулі воз з каменнямі, сіняваты, што выліты са шкла, град. За вуглом стагнаў, аціхаючы, нібы клаўся там спаць, а потым тоненька скавытаў, як што яго раздзірала вялікімі кіпцюрамі, і недзе ляцеў, бэрсаўся са страшэнным свістам вецер.

Карова, панурыўшыся, стаяла пад страхою і тулілася задам да сцяны — яе даставаў град.

У Марцінавых сенцах нешта шкраблося па дзвярах, дзынкала клямкай — мусіць, яе лапамі даставалі сабакі; і раптам дзверы адчыніліся, аж я струпянеў — з сенцаў выткнуў галаву Марцін Дзікуць:

— Ідзі ў хату, страшна ж аднаму?..

Адганяючы сабак, Марцін упусціў мяне ў сенцы. Паклаў на маю шыю сваю руку — яна была цеплаватая і шорсткая, як тарка,— і падштурхнуў у хату.

— Ідзі, ідзі, не бойся...

У хаце яшчэ стаяла сухаватая, напараная сонцам духата і было цемнавата. І з гэтай цемнаты, з ложка на мяне цікавалі Марцінавы дзеці — вочы іх сцішана блішчалі. На калодзе сярод хаты сядзеў Клемус Война — сагнуўшыся, раскарачыўшы высокія калені; босыя ногі яго былі шырокія, як лапці. Ён маўчком, не паднімаючы галавы, зірнуў на мяне, і ў яго апечанай, з белымі лішаямі руцэ я ўбачыў бізун — той самы, з плеценай ручкай і чырвонымі кутасамі.

— Гузоў не насадзіў, кажу, град? — спытаў Марцін, прымошчваючыся каленьмі на лаву і ўзіраючыся ў акно.

Я толькі цяпер учуў, як у мяне шчыміць, расце, сцягваючы на галаве скуру і, здаецца, паднімаючы шапку, гуз.

— Нічога, пакуль жаніцца — загаіцца! — сказаў Клемус Война і раскруціў доўгі бізун.— Тут во — без хлеба астанёмся. Малоціць, як цапамі, саб'е ўсё.

— Не грашы,— ціха сказаў Марцін і ссунуўся з лавы,— ты жыта нажаў.

— А ты што — лічыш чужое? — Война падняўся з калоды — цёмны, як хмара, высокі, аж дастаючы галавою да бэлькі.

Марцін стаяў каля яго дробненькі, быдта дзіця.

Востра і пякуча кальнула ў вочы маланка — недзе блізка, з ляскам, як у камень, стрэліў пярун, потым з грукатам пачало ламацца неба.

Марцін скоранька і тройчы перахрысціўся.

— Ты, брат, як маленькі...— зарагатаў, але адышоўся ад акна Клемус Война: зноў мільганула і, здаецца, зашыпела за акном маланка.

А па сцяне ўсё цвёрда грукацеў град.

На гарышчы нешта трашчала — ці не кроквы — і ў коміне грукалася юшка і жаласна, тоненька выў вецер — нібы хто залез на страху, усадзіў у комін галаву і страшыць.

Ужо замакрэлася над ложкам столь — пачалі налівацца і, расцягваючыся, падаць кроплі вады і потым тоненька задзынкалі — дзеці прынеслі і падставілі чыгунок.

Град зашоргаў па шкле — вецер павярнуў у вокны, хмара варочалася назад. Па рамах білі, як палкаю, і раптам, як незнарок, патрапілі па шкле — шыба напята лускнула,— на лаву, суха звонячы, пасыпалася шкло: нібы ў прорву хлынуў і холадам заліў хату вецер.

Марцін схапіў з ложка падушку і, трымаючы яе за адзін рог, падбег да акна і заткнуў шыбу.

Але град ужо радзеў, толькі са страхі густа, быццам хто, абмыўшы, яшчэ апалосквае яе, чуваць было, лілася вада.

На дварэ, калі мы выйшлі з хаты, стаяў белаваты і нерухомы, хоць ты разводзь яго рукамі, туман. Недзе рыкалі, нібы тапіліся ў ім, каровы. Мая стаяла каля Марцінавае хаты, тыцкаючыся пысаю ў град — нюхала. Яго нападала аж па костачкі, і ён шоргаў пад нагамі, як шоргае

сцукраваны напрадвесні снег. З граду вытыркаліся сцяблiны зламанае ў каленцах саломы — гэта там, дзе быў загон Марцінавага жыта.

Марцін у драўляных выдзеўбленых шлэбах с накарэлым на іх зеленаватым гноем пасунуўся да загона. За ім, абнюхваючы яго сляды, беглі сабакі. Марцін пастаяў перад жытам і, не скідаючы шапкі, моўчкі перахрысціўся.

— Хрысціцца, а святым духам жыць не будзе. Кавалак гультая. Цьфу! — Война плюнуў і адышоўся ад парога.— Усё тут аблатошыць, аб'есць, як вусень.

І Война пайшоў, гразнучы ў хрусткімградзе, і ўжо крыкнуў, каб чуў Марцін:

— Ого, ліха яго матары, пячэ як прыскам!

Ён пастаяў на адной назе, падгінаючы другую, як бусел, і сказаў яшчэ:

— Пайду гляну, што там робіцца ў мяне.

І пайшоў, схаваўся, як за якою сцяною, за туманам.

Я адагнаў ад сцяны карову. Яна падняла вушы і пабегла на дарогу, кіруючыся дадому — там яе чакала кожны раз радзюжка зелля.

— А куды ж ты? — аклікнуў мяне Марцін.— Крый бог, прастудзішся...— і падышоў да мяне, сунучы шлэбы: яны звальваліся ў яго з ног.— На, вазьмі, заўтра прынясеш.— Ён выступіўся з іх і адышоўся пад сцяну — там зелянела сухая трава.

Я ўсунуў ногі ў шлэбы, усё роўна што ў пячоркі — нагрэў Марцін.

З акна, уткнуўшыся ў шыбы і расплюшчыўшы насы, на мяне глядзелі яго дзеці, і да самае дарогі бег чорны, з жоўтымі кропкамі пад вачыма і тыцкаўся ў маю руку сабака, пакуль яго не паклікаў Марцін:

— Цю-цю, на, цю-цю, на...

— Баба, у руж'ё! — гукнуў чалавек у суконным фрэнчы.

Дзябёлая, шырокая ў крыжы кабета паднялася з месца і, чапляючыся капачом за сядзенні, вылезла з аўтобуса.

А я глядзеў на чалавека ў суконным фрэнчы — ён пусціў з рук сучачку, і яна дробна бегала па канаве — і думаў,

што ёсць на свеце дзіўнаватыя людзі, нездароўча чулыя да ўсяго і толькі, мусіць, нядбайныя да сябе.

Аўтобус тузануўся, з перабоямі і натугай загуў матор — мы паехалі; чалавек і кабета хаваліся з вачэй. Аўтобус выбраўся на грудок, мінаючы з боку шашы могілкі з трыма хвоечкамі — на камлях высока не было галля, нібы хто сашмаргнуў яго вялікаю рукою, пакінуўшы толькі макаўкі.

Шафёр скінуў газ, і аўтобус ціхенька, дзе часам падскокваючы на ямках і бразгаючы жалезным нутром, пакаціўся ў лагчыну і раптам затрубіў, сцішаючы ход: сярод шашы стаялі спутаныя коні, адзін на аднаго паклаўшы шыі. Было Кашалева — дадому асталося кіламетраў дванаццаць. На нечым хлеўчыку ляжалі доўгія і рабаватыя, як парасяты, гарбузы. На акне цвіў высокі, што куст, агеньчык — і нейкая чырвоная радасць была ад яго. Голы да пояса хлопец, што правіў ганак — прыбіваў з аднаго боку белую абструганую дошку,— аглянуўся, згледзеў коней і, кінуўшы сякеру, падбег да шашы, замахаў абедзвюма рукамі, як ганяючы курэй: коні, задзіраючы галовы і збіваючыся адзін на аднаго, сышлі ў канаву. І аўтобус зноў нехаця завуркатаў: зноў быў грудок, была відаць вёска, уся, як на далоні, і за ёю — пад цёмны, завешаны рэдзенькаю сінечаю лес — доўгія будынкі, кароўнікі ці стайні, над імі громаадводы з растапыранымі лапкамі на вяршку, як што шчупаюць угары, і над вёскаю, высока ў небе, пад белаватаю набрынялаю хмаркаю трапечуцца і ўсё вісяць на адным месцы два галубы. І мне зноў спамянулася тое лета, што было даўно, град, што пабіў на маладым алешніку кару — яна нават адстала на камлях з таго боку, адкуль ішла хмара. Спомніўся Марцінаў хутар і дзікі голуб...

Я знайшоў іх аж два. Назаўтра мы прыгналі каровы на местачковы поплаў — там хадзіў, звесіўшы крыло, падбіты ў град бусел. Адно вока ў яго было заплюшчана і ў крыві. У рукі ён не даваўся — біў, ляскаючы, дзюбай,— і местачковыя дзеці паролі яго доўгімі кіямі здалёк, аж мне зрабілася шкода, і я адышоўся, каб не бачыць, і натрапіў на гэтых галубоў. Яны ляжалі ў лагчынцы з вадою — адзін трохі на

купінцы, на сушэйшым. Я падняў абодвух: той, што ляжаў у вадзе, быў ужо спруцянелы і халодны — галава ў яго целяпалася; у другога на воку яшчэ моргала сінявата-белая плевачка — у ім яшчэ тлела цяпло. Я паклаў голуба ў шапку: ён высах, акрыяў і пачаў варушыцца. Местачковыя дзеці заглядалі ў маю шапку і казалі, што гэта іхні, з мястэчка. Але на поплаў прыйшоў Марцін праганяць дзяцей ад бусла, выняў у мяне з шапкі голуба, пагладзіў яго і спытаў:

— Можа, аддасі?..

Я маўчаў — аддаваць не хацелася.

— У мяне ёсцека клетка... Падлячу — тады забярэш.

Я не хацеў, але паверыў. І праўда, праз тыдняў колькі, прыгнаўшы на сваю дзялку карову, я ўбачыў, што Марцін, стоячы на надворку, махае рукою — кліча мяне.

Я падышоў пад хату. Да мяне кінуліся, віляючы хвастамі, яго сабакі. Марцін маргнуў вачыма, пайшоў у сені і вярнуўся адтуль, трымаючы абедзвюма рукамі голуба. Голуб круціў галавою, выцягваючы шыю — на ёй сіняватай чырванню пералівалася пер'е. У Марціна варушылася, дрыжала ад радасці ніжняя губа. Ён пагладзіў голуба і падняў яго на далоні — схіліўшы набок галаву, голуб глядзеў на зямлю, мусіць, яшчэ не верачы, што ён ужо вольны. Сабакі, высалапіўшы языкі, цікавалі то на голуба, то на Марціна. Голуб прыгнуўся, натужыўся і, здаецца, няўмысна, спадцішка залапатаў крыллямі і паляцеў — нізка, пры зямлі і неяк улукаткі, як малады, як не навучыўся лётаць. Сабакі кінуліся за ім, падскокваючы ўгору і дзеручы ад злосці зямлю.

Я глядзеў на шэры знак, што варушыўся, мільгаў, пераварочваючыся, над поплавам, над алешнікам пад мястэчкам, аж пачало ўсё кружыцца і мігцець у вачах. Знак растаў, расплыўся на шэрай хмарцы, і ў мяне нешта як адарвалася ў грудзях.

— Як усё любіць волю,— сказаў Марцін, тручы вочы: яму, мусіць, таксама заслязіла. Адышоўся пад хату, аглянуўся і спытаў яшчэ: — Шкада, нябось, га?

...Праз многа год, спамінаючы выпадкам гэтае далёкае лета, град, Марцінаў хутар, я заўсёды спамінаю гэты міг, гэтую хвілю, калі нізка над цемнавата-зялёным, аж да чарнаты алешнікам ляцеў дзікі голуб, трапятаўся, нібы паперка на ветры, прападаючы назаўсёды з вачэй.

Не ведаю чаму, але і сёння я выразна помню, як ляцеў дзікі голуб.

А тады я пайшоў пільнаваць карову, думаючы, чаму чалавек не ўмее лётаць. Малому ўсё хацелася зрабіцца птушкаю, каб гэтак высока і вольна лётаць над зямлёю; усё заманьвала вышыня, якой цяпер не зношу: душу агортвае адзінота, калі глядзіш на зямлю здалёк, і яна здаецца табе мурашнікам, а сам ты драбнюткай макавінкай у гэтым бясконцым абсягу.

Цяпер жа цягне бліжэй да зямлі, і знайшлася ўжо нейкая жаднасць цвярдзей і мацней чуць яе пад нагамі. Ужо бярэ радасць ад таго, што ступаеш на мякаць муравое травы, што бачыш воддаль дарогі корч дзікае грушы, чуеш, як шархаціць, капае са стрэх і точыцца ў пясок пасля дажджу вада — і, бог ведае, якую ты маеш ласку ўсяму, што ты жывеш, глядзіш на гэты свет і будзеш паміраць у ім, як наканована кожнаму. Вельмі ўвосень, калі выпадзе дзень прэлага сыраватага цяпла і стаіць нейкая празрыстая ціш і яснасць, калі пасля лянівага туману з раніцы — у поўдзень перад вачыма зазелянее жыта, тады надыходзіць гэтая жаднасць да зямлі і нейкая нядужая, саслабелая, як пасля хваробы, радасць стрэць ці ўбачыць даўнейшае...

За Кашалевам на грудках паказаўся лес: спярша з аднаго боку шашы — усё ельнік, пануры, цёмны, з цёплымі капцамі мурашніку пры беразе на сонцы, потым — малады, нерухомы, сіваваты хвойнік, далей і ніжай — прагаламі балотца з купінамі зрудзелае асакі, белы рэдзенькі бярэзнік, і далей цёмны гушчар — малады грабнік — галавы не ўваткнеш, а з ім — дубы, ясна-зялёныя, як учора распусціліся. І зноў зварухнулася ў памяці, як у такую пору ці, можа, трохі пазней, калі павыкопваюць картоплі, калі на стрэхах, на трэсках каля сметнікаў зашарэе з раніцы і цвёрда зашоргае

4. Зак. 1877

на траве пад нагамі марозік, хадзіў сюды, у кашалеўскі лес, збіраць жалуды, ужо набрынялыя, патрэсканыя, каторыя з расткамі пад лісцем на зямлі. Спомніўся іх грукат у мяшках на печы і нейкі гаркаваты, сухі, аж сцягвае ўсё ў роце, іхні смак. І цёмная і слізкаватая, што крухмал, іхняя мука...

Спамянулася тая восень, як мы з Марцінам Дзікуцем наабдзіралі з яловых пнёў паўнюткія, як паднесці, торбы сырое слізкаватае «губы», і не на трут для крэсіва, а на лякарства. Ад хворых на сухоты (у мястэчку быў тады шпіталь для інвалідаў вайны) Марцін дачуўся, што «грыбок», настоены на гарэлцы,— найлепшае лякарства ад сухотаў. І нехта дакляраваў, што купіць, дасць 50 рублёў за кілаграм (вядома, старымі грашыма), калі мы нарвём і прынясём гэты «грыбок» у шпіталь. Марцін падгаварыў мяне, і я пацягнуўся з ім сюды, у кашалеўскі лес. Помню, зранку церушыў, а да полудня разышоўся спорны дождж, і мы добра вымаклі, пакуль натрапілі з краю лесу на яловыя карчы. Наабіваўшы сырое «губы» і папалуднаваўшы,— я частаваў Марціна сухаватым, з цвёрдаю скуркаю, вылежалым за лета на гарышчы салам, кавалачак якога мне дала маці з сабою,— Марцін круціў папяросу з зеленаватага, высушанага на бляхах у печы тытуню і, абкусваючы край цвёрдае паперы, пытаўся:

— З пуд будзе? — ён наслініў паперку, прыгладзіў пальцам папяросу і, не ўстаючы з пня, трохі падняў ад зямлі сваю торбу.— І ў цябе на рублёў...

Марцін раптоўна змоўк, сцішыўся і, задзіраючы ўгору галаву, пачаў узірацца ў неба — над лесам крычаў крумкач — расцяжна, сцішна: крум-крум.

— Кажуць, калі гэтая пташка сядзе на чыю-небудзь страху, той памрэ.— Але махнуў рукою і пашыўся ў кішэнь па запалкі.— Ат, усе памром... А зрабілі мы з табою добра. Толькі глядзі — нікому не прагаварыся...

Я, вядома, прагаварыўся — ужо потым, як не было на свеце Марціна. Я і цяпер думаю, што чалавек чуе сваю смерць. Яшчэ і назаўтра ў Марцінавых вачах асталася нерухомасць і нейкая каламутная сцішанасць, як у глыбокай вадзе.

Мы насілі ў шпіталь прадаваць «губу». Я чакаў Марціна за крамаю, ашаляваным аполкамі домікам з жалезнымі прантамі ў вокнах і з завалаю на дзвярах, што стаялі напроці шпітальнае прахадное. Каля маіх ног ляжалі тыя дзве торбы з мокраю «губою». Праз якое паўгадзіны Марцін прывёў сюды хударлявага чалавека ў сіняй байкавай піжаме з шэрымі закарвашамі і ў пантофлях на босую нагу. Белыя, з сіняватамі жылкамі рукі чалавек трымаў у кішэньках.

Марцін развязаў торбу. Чалавек у байкавай піжаме прыжмурыўся, нагнуўся над торбаю і, выпростваючыся і закідаючы худою рукою назад валасы, спытаўся:

— Што ж вы прынеслі? Мне трэба во,— і выняў з кішэнькі лісток сухога, усё роўна як абадранага з каменя, лішаю — грыбок, што расце на дубах.

Голас у чалавека быў нядужы і сіплаваты.

Марцін узяў з рукі ў чалавека лісток, патрымаў на далоні, падносячы да носа і ўзіраючыся, потым плюнуў і штурхнуў босаю нагою торбу — з яе высыпаліся тоўстыя пляйстры яловае «губы».

— Каб чалавек ведаў... Мы і на гэтую нарасць кажам «грыб». А такі лішай, і праўда, расце на дрэве.

— Яго і нарвіце. Тут у нас купяць. Многім, кажуць, ён памагае.— Чалавек суха і нямоцна пакашляў, патаптаўся каля нас і пайшоў, сагнуўшыся і трымаючы рукі ў кішэньках.

Марцін паглядзеў яму ўслед, падняў сваю торбу, вытрасаючы яловую «губу».

— Доўга не паходзіць... Кажа, захварэў на сухоты на фронце. А мы на яго рубель пагналіся... Грэх, браце, грэх, таму і не пашанцавала. А ты схадзі, прынясі яму гэтага лякарства,— сказаў Марцін, аддаючы мне той сухенькі лісток лішая...

І я потым схадзіў, ужо разам з дзецьмі, і нарваў торбу гэтага лякарства: яно расло на дубах, вісела зеленаватымі карункамі на камлях, усё болей з таго боку, дзе няма сонца, і высока ад зямлі.

Марціна Дзікуця ўжо не было на свеце. Яго забілі ў той год, як выпаў град. Гаварылі, што Марцін капае чужыя картоплі, і ўсе бегалі прыцемкамі на поле. Аднаго вечара

я з маці пайшоў пільнаваць свае: там асталіся начаваць, прысыпаныя пырнікам і сухім картаплянікам, два мяхі накопанае мацераю картоплі; маці не дапрасілася ў вёсцы каня, а бацька не паспеў панасіць іх дадому — яшчэ завідна ён выпраўляўся ў мястэчка вартаваць склады.

Тая ноч была сыраватая, глухая, і нам з маці было страшна: казалі, знайшлася «чорная кошка» — у мястэчку раздзявалі людзей, абкрадалі сельпоўскія крамы і застрэлілі праз акно старшыню сельсавета — помню, рудога насатага чалавека ў зношаным кіцелі, з пацёртаю скураною сумкаю ў руцэ.

На поле мы выправіліся шараю гадзінай — у мястэчку ўжо загарэлася электрычнасць, і вострае, тоненькае, як трэшчыны на шкле, святло калола ў вочы. Мы спатыкаліся, абмацваючы нагамі цвярдзейшы грунт, тую неразʼезджаную, зарослую травою сценку, і палохаліся дзе якога ядлаўцовага куста — выдавала, што там стаіць чалавек ці бяжыць воўк, і трэба было прысядаць, нагінацца, каб пазнаць, што гэта.

Было сцішна, не аказваліся Марцінавыя сабакі. Хата, здаецца, урасла ў цемнату, на белаватым небе былі знаць толькі комін і шапка на кійку — нібы хто залез на страху і выцікоўвае нас. Толькі на Войнавым полі нешта тупала, шастаючы сухім картаплянікам. Тупат чуўся перагонамі, нібы хто бег, падаў і зноў бег. Раптам нешта як запішчала, нібы сава драла зайца, потым глуха енкнула, застагнала, што ў падушку, і сціхла.

Мы сядзелі на сваіх мяшках з картоплямі. Маці нават ссунула з галавы белую хустку, настаўляючы вуха ў той бок, адкуль быў гэты тупат, і ціха пытала:

— Там як што робіцца?

Тупат блізіўся сюды, да нас.

— Вунь пабег у нашыя картоплі! — зашаптала і прыгнулася маці. Мне ў грудзі вострым холадам кальнуў страх. У другім канцы поля было відаць, як нехта бег, лукаткамі і сагнуўшыся, і раптам упаў у нашым картаплянішчы.

— Дальбог, будзе капаць картоплі,— стрывожылася маці і выцягнула з-пад мяне капач — яна яго не брала дадому,

а пакідала кожны раз тут, на полі, прыхаваўшы сухім картаплянікам.

Я ціха сядзеў, баючыся нат зварухнуцца.

— Уставаймо, прагонім, наробім крыку... Во — чуеш — капае...

Там нешта цвёрда дзынкнула, як хто, папраўдзе, трапіў капачом у камень.

Маці паднялася з мяшка, насоўваючы на галаву белую хустку.

— Што ты капаеш! — крыкнула маці, але голас у яе захлынуўся, нібы яго таксама перахапіў страх. Яна, мякка гразнучы ў перакапанай зямлі, ступіла колькі крокаў туды, дзе ўпаў чалавек.

— І яшчэ не ўцякае, думае — не бачу! — голас яе задыхнуўся.

Я крадком пайшоў за мацераю, наступаючы дзе на сухі асот — ён вострай гарачынёю апякаў босыя ногі.

— Панадзіўся, як у сваё,— яшчэ раз крыкнула маці і аглянулася на мяне, мусіць, ужо баючыся злодзея сама.

А там як хто капашыўся, шастаў картаплянікам, поўз і стагнаў.

— Усё адно як стогне,— сказаў я.

— Няўжо? Няхай крые бог, што гэта? — Маці пачала адступацца, трымаючы нагатове капач.

І адтуль, здалося, нехта клікаў мацеру:

— Броня, Броня...

— Ці мне падалося, ці не: во як кліча мяне? — маці нібы сумелася.

У мяне, што ад холаду, шэрхла скура — уставалі валасы.

— Броня, памажы. Ідзі сюды, Броня,— голас быў нападобе Марцінаў.

— Мусіць, Дзікуць...

— Няўжо? — маці не то здзівілася, не то спалохалася.

У картоплях нехта варушыўся і поўз да нас. Я прысеў і ўбачыў нешта чорнае — пэўна, спіну: чалавек поўз ракам.

— Броня, родненькая, памажы!

— Ага, голас як Дзікуцеў.— Спатыкаючыся, маці падступалася туды, дзе стагнаў і варушыўся чалавек.

— Марцін, гэта ты? — маці нагнулася, узіраючыся здалёк, што робіцца там, у картоплях.

— Я, Броня, я... Памажы ўстаць.— У картоплях ракам стаяў Марцін Дзікуць, намагаючыся падняцца.

— Марцін, што ж гэта з табою? — Маці падступілася бліжэй, яшчэ ўсё не верачы, што гэта ён, Марцін Дзікуць.

— Знявечылі, забілі... Ой-й, Бронечка! — нібы яго парнулі чым вострым і глыбока, аж дастаўшы да сэрца, застагнаў Марцін і падняўся на ногі. Голас у яго быў глухі і хрыпеў.

— Ах, божачка, ды хто ж гэта цябе? — Маці падхапіла Марціна пад пахі.

— Войны, Бронечка,— ён хістаўся, як п'яны.— Яны недзе тутака, хіба, можа, уцяклі, як учулі, што ты крычыш.— Марцін быў без шапкі, валасы зліпліся, мусіць, ад крыві, і яна цякла чорнымі рагамі, заліваючы вока, толькі другое, непадбітае, злосна блішчала ў поцемку.

— На, хоць абапрэшся,— маці дала яму капач і ўзялася за яго руку вышэй локця.

Мы павялі яго пад хату. Яна злівалася з чарнатою поля. Там недзе ад злосці зайшліся і кінуліся сюды сабакі — і раптам сціхлі, пэўна, абнюхалі Дзікуця, і толькі чуваць было, як мякка скакалі і дыхалі, мусіць, высалапіўшы языкі. Потым замільгаў адзін, белы, і, яхкаючы, кінуўся Марціну на грудзі, закруціўся каля мяне, б'ючы хвастом па калашыне.

— Позна, Дружок! — загаварыў Марцін да сабакі, і той аж прылёг на пярэднія лапы.— Дзе ты быў раней? Во забілі мяне...

— І за што, Марцін? — голас у мацеры падабрэў.— Каб гэтак знявечыць. І за што, скажы...

— Чаму не, скажу. І ў цябе накапаў кошык картопель, во ўчора...

— Ды каб за кошык картопель?.. Божа!

— Пачакай, Броня, я прысяду, не магу ісці. Слабасць, цямнее ў вачах.— Ён сеў, ды нават не сеў, а неяк асунуўся на калені.— А ў Войны і кошыка не накапаў, я толькі ішоў цераз яго поле...— Марцін трохі падняў руку,— а ён во...

біў прэнтам па галаве. Ці дажыву да раніцы. Дзяцей шкада, як жа ж яны без мяне?..

— Каб, можа, да доктара? — Маці ўзяла яго пад пахі, зноў памагаючы ўстаць.

— Не, Броня, так ужо Бог даў. Ой,— ён застагнаў, сагнуўся і ўжо не ішоў, а цягнуў, як нежывы, ногі.— Дык куды ж сярод ночы па таго доктара? Яны мо толькі і пільнуюць, ці пойдзем мальдаваць. А дзяцей, Бронечка, шкада...

У Марцінавай хаце не было агню. Сляпою цемнатою блішчэлі вокны — дзеці, мусіць, спалі.

Каля хаты Марцін трохі выпрастаўся. Маці памагла яму падняцца на парог. Ён узяўся рукою за клямку і ўваліўся ў чорную прорву сяней.

— Я ўжо сам... Ідзі, Броня, дадому.— Ён нечым там грукнуў, мусіць, устаючы і шукаючы дзвярэй у хату.

...Цярэспаля мы беглі дадому. На ўсходзе між навалы хмар заяснелася неба — браўся ўсходзіць месяц. Весялела ноч. А на Марцінавым хутары пачалі брахаць сабакі, неяк усё гыркаючы, як там хто хадзіў і дражніўся. Зрабілася сцішна, і нуда брала за сэрца.

— Божачка, за што ж яны чалавека,— маці прыпынілася (яна, пэўна, усё думала пра Марціна) і ціха, нагінаючыся, гаварыла да мяне.

...Аўтобус я спыніў напроці вёскі. І ён зноў доўга вуркатаў, у маторы нешта скрыгала, як там церлася ржавае жалеза аб жалеза. А я адчуваў нейкую вінаватасць, што гэта праз мяне шафёр, той малады хлопец у стракатай шапцы, ніяк не можа ўключыць скорасць і недзе, мусіць, злуецца. У грудзях дрыжала, і трохі як слабелі, аднімаліся ногі — ці то з дарогі, ці то ад таго, што так скора і нечакана бачу сваю вёску — ужо як чужую і меншую. І зрабілася трохі непамысна, што зараз каго стрэну, а ён, вітаючыся, будзе трохі сарамяжыцца, як малое дзіця, чырванець, і будзе яму несамавіта перада мною, і мне самому зробіцца ніякавата, як бывае заўсёды, покуль не асвойтаешся з чалавекам. Я перамяніў у другую руку чамадан і борзда перайшоў чужыя надворкі — рады, што нікому не трапіў на вочы, і ўжо азірнуўся на

шашу — аўтобус ціхенька і ўпарта пасунуўся, як вялікі жук, і зад яго падкідала на ямках. Я трохі паспакайнеў, сцішыўся: знайшлася весялосць, што я дома, што бачу сваю хату: з гэтага боку ад шашы — сені, якія некалі рабілі з бацькам. Спомнілася, як ачэсвалі дзеравіны, а перад гэтым прывязвалі да цвічкоў вяровачку, бацька шмараваў яе мелам, а потым адцягваў — вяровачка, туга ляскаючы, біла па акоранай жаўтаватай дзеравіне, і на ёй аставаўся роўны белы шнарок. Было дзіўна, што помніцца гэты шнарок, і ўзялася радасць, што чую, як недзе на вуліцы за гушчаром бэзу хрыплавата і нядужа пяе малады певень — мусіць, ужо наш, што бачу, як каля нарога курыца дзяўбе гурок-насеннік, які, мусіць, прынесла з гародчыка.

У хаце быў бацька. Ён высунуўся з-за грубкі нейкі ўвесь зблажэлы, і я ўбачыў, што ён паменшаў і зрабіўся нейкі трохі сухі, што ў яго змянілася хада, калі ён ішоў да мяне вітацца, намацваючы нагамі падлогу, як ходзяць старыя, і неяк няўмела, растапырыўшы пальцы, падаў мне руку. І стала шкада, што старэе бацька.

— Вось трохі нездаровіцца, сынку.— Бацька прысеў на ўслоне каля стала, сагнуўшыся, упёршыся рукамі ў калені.— Нага ўсё баліць...

— А дзе ж маці? — спытаў я, распранаючыся і пачапіўшы плашч на вешалцы, што была, як і некалі, між вокнаў.

— Гэта ж пайшла адспёўваць нябожчыка. Памёр Война.

— Клемус?

— Ага... Гаварыў, не ідзі, не свянціся ўжо з гэтым набажэнствам... Так не, кажа, грэх... Пайшла.

Касцёла ў нас няма даўно, і мацеру клікалі адспёўваць нябожчыкаў. Яна брала з-пад бэлькі сшытую чорнымі ніткамі без аднае вокладкі кніжачку «набожэньств і песні» і нейкія старыя, з расхістанымі вушкамі акуляры — бог ведае, як яны знайшліся ў нас,— і ішла.

І было трохі нязвыкла, што маці яшчэ ходзіць адспёўваць нябожчыкаў, і адначасна дзіўна, што сціраецца след таго даўняга,— бо над сталом няма лямпы са шкляным магазынам, з паліванаю талеркаю-абажурам, у якой заўсёды

падскокваў жаўтавата-ясны язычок полымя, калі адчынялі ці зачынялі хату, прыстукнуўшы дзвярыма, а вісіць вялікая, мусіць, на сто ват, электрычная лямпачка, і на сцяне суха патрэсквае карычневая скрыначка-рэпрадуктар.

Потым зноў нагадалася даўнейшае, калі вярнулася маці і пачала трэсачкамі распальваць у печы, шоргаючы панівою па прыпечку, а потым засцілала стол вытканым «у каробачкі» абрусам, калі селі вячэраць і яна прыгубляла чарку, калацілася і пытала:

— Як жа ж людзі п'юць? Але праўду кажуць: кепска замуж, але йдуць, горка водка, але п'юць.

А ў хату, як і некалі, коса глядзела сонца, востры слупок адным ражком даставаў аж да ложка, а за акном, у гародчыку, на бэзе скакала шэра-карычневатая пташачка з жаўтаватым воллем, і сухі вецер варушыў на бярэзіне доўгае веццe, нібы хто браў яго спаднізу рукою і паднімаў угору.

— Як жа ж твае там? — Маці глядзіць на мяне, а я думаю, які ў яе ўжо зморшчаны твар і як ужо выцвілі і сталі жаўтлявымі вочы, і каля губ знайшліся шнары, толькі, здаецца, голас у яе трымаецца той самы. Дзіўна, але старэйшых людзей у вёсцы я пазнаваў здалёк не па твары, не па выглядзе, а па голасе.

— Чаму ж, я кажу, не прывёз? Няхай бы пабегалі тут. Большы як быў, во бабы на полі хвалілі.

— Во, зраўняла,— бацька смяецца, і мне трохі дзіўна, што ён ужо шчарбаты і трохі свішча,— яго — гарадскі, а тут што: ходзяць смаркатыя ды без портак.

— Як чыё і як да дзіцяці. Вунь Ладкаў, каб бачыў, які спрытны. У мястэчку ў клубе ўсё спявае. І да работы... Каня вунь сёння запрог, як Клемуса хавалі... Гэта ж ці чуў? — Маці зноў паварочваецца да мяне: — Клемус Война памёр.

— Чуў,— ківаю я галавою,— бацька гаварыў.

— Ды нейкаю наглаю смерцю... Пайшоў да ветру на сметнік і не ўстаў... Ёсцека Бог на свеце. Гэта ж, ці помніш, Дзікуця некалі забіў. Таго Дзікуця, што каля нашае дзялкі жыў, што сабак усё трымаў. Ці, можа, ты ўжо і забыўся...

— Чаму, мама, я забыўся,— кажу я, і мне спамінаецца, як пустую Дзікуцеву хату з забітымі вокнамі — дзяцей

ужо забралі ў дзетдом — пільнавалі сабакі. Яны ўсе трое сядзелі пры дарозе каля круглага каменя, соваючыся да кожнага, калі хто хацеў падысці пад хату. Двое пасля недзе прапалі ці сышлі — па ялавіне бегаў толькі адзін — белы, з перахлябленым худым азадкам. І я помню, як яго забілі. Ужо на маладое жыта пускалі авечкі — зямлю ўкаваў мароз, а Клемус Война прыганяў нават сваіх двое спутаных коней. І тады нечае ягня схапіў Марцінаў сабака. Дагналі яго каля хаты. Ды ён нікуды не ўцякаў, ён лёг каля круглага каменя, наставіўшы поўсць, шчэрыў зубы, гыркаў і падграбаў пярэднімі лапамі пад сябе ўжо нежывое ягня.

— Чаго гледзіце? — крыкнуў Война.— Ён шалёны,— і, азіраючыся кругом сябе, знайшоў вялікі, як падняць, камень.

Сабака прыціснуўся да зямлі, вочы яго закаціліся недзе пад лоб, але не ўцякаў.

— Бі, хлопцы! — Клемус размахнуўся і з-за вуха кінуў цяжкі камень — пацэліў сабаку ў спіну.

Сабака заскавытаў, выцягнуўся і папоўз, трымаючы ў зубах ягня.

— Не пускай, не давай уцячы! — крычаў Война.

Сабака падняўся на ногі, але нечы камень адскочыў ад яго галавы. Сабака ткнуўся мызаю ў зямлю і выпусціў ягня.

— Пераймай, не давай яму апомніцца,— Война скінуў з сябе доўгі кажух.— Жывушчы, але я яго ўбяру, быць не можа...

Сабаку перанялі за маладымі хвоечкамі — ён ужо цягнуў перабіты азадак, неяк усё гэльцаючы пярэднімі лапамі.

Война кінуўся пад хату і сарваў з акна дошку.

— У-у, я зараз... У мяне, брат, толькі дробненька з...іш і Богу душу аддасі.

Пастухі зарагаталі.

Сабака ўжо не поўз, а толькі неяк бокам круціўся на месцы — яго па галаве кантам дошкі біў Клемус Война. Мы, дзеці, адышліся — глядзелі здалёк. Война плюнуў, шпурнуў у хвоечкі дошку і падняў з зямлі кажух, накінуў сабе на адно плячо.

— Нічога, патрапечацца і дойдзе. А жывушчы, ядры яго палку...— Война рукавом выцер змакрэлы лоб.

Мы пайшлі пільнаваць авечкі, аглядаючыся ўсё на сабаку: ён, лежачы на спіне, трэпаў задняю нагою — даходзіў.

Назаўтра мы бачылі, як ён ляжаў недалёка ад тых самых хвоечак, уткнуўшыся акрываўленаю мызаю ў пясок і выцягнуўшы спруцянелыя ногі. На ім, як і на ягняці, шарэў мароз...

— Некаторага году хлопец яго прыязджаў,— маці зноў гаворыць пра Дзікуця.— Каб бачыў, які хлопец,— выкачаўся, выліняў... Тут усе дзеўкі за ім... Кажуць, вывучыўся на нейкага голага.

— Мо геолага?

— А ці ж я, сынок, ведаю.

— Каб жыў Дзікуць,— бацька ап'янеў, расчырванеўся, нібы паздаравеў, і яго сінія вочы заблішчалі, як у маладога,— то і хлопец гэтак хадзіў бы: адзін лапаць, адзін бот...

— Ты ўжо выдумляеш...

— Думаеш, маню. Каб не бачыў — сам веры не даў бы. Едзе на возе, звесіў ногі праз драбінкі — адна абута ў хадак, а другая ў бот,— бацька смяецца да мяне, і я бачу яго шчарбаты рот і зноў думаю, як ён скора састарэў.— А што, сынку, думаеш — за польскаю добра жылося?

І гутарка пайшла пра даўнейшае і пра тое, як жывуць цяпер.

А потым маці вадзіла мяне ў хлеў паказваць, якую яна купіла авечку — маладую, з чубам — і якая ў яе доўгая воўна.

Заходзіла сонца — хавалася, як тонкі грош у шчыліну, між хмар і выязджала зноў. А са страхі каля вугла спускаўся на невідушчай павуціне дагары нагамі вялікі павук. Над сцежкаю ад хлява да хаты таўклі камары мак. І мне пачало здавацца, што я нідзе не быў, што я кожан вечар бачыў, як гоняць з пашы каровы, як далёка ззаду за імі цягнуцца пастухі, як ціха сакочуць куры — просяцца на седала, збіраючыся каля парога, як скрыпяць вазы, шоргае аб камень кола і нукаюць на коней — возяць з поля картоплі.

Назаўтра была нядзеля, быў пагодны дзень з вастраватым ветрам. Толькі ў зацішку, дзе за вугламі прыгравала сонца, была астатняя, трохі пякучая яго ласка, як у немаладое кабеты. І я хадзіў у мястэчка — гэта таксама наш

даўнейшы звычай нядзеляю ці святам хадзіць у мястэчка, хадзіць так сабе, дзеля разамаітасці, дзеля весялосці — таптацца купкаю на рынку, стаяць і гаманіць ля крам.

Цяпер здавалася смешнаю і дзікаватаю гэтая весялосць, было ўжо дзіўна, што цяпер гэтаксама, як некалі, маладзіцы з вёсак мераюць, дастаўшы з кошыка, адломаным ад дзеркача дубчыкам чаравікі для дзяцей, а дзядзька, успёршыся на прылавак, панура глядзіць на хамуты — на ніжняй губе ў яго вісіць, прыклеіўшыся, папяроса, дым заходзіць у вока, і ён жмурыць яго.

На вуліцы каля плота стаялі кабеты: каля ног у іх валтузіліся ў мяшках парасяты — мусіць, уставалі на ногі і тыцкаліся лычамі, паднімаючы мяшок. П'яны чалавек з рудым, спечаным на сонцы тварам, з расхрыстанаю белай грудзінай крычаў маладым хлопцам, пэўна, са свае вёскі:

— Каму даць у морду?

— Усім, дзядзька. Пачынай па парадку,— азваўся баявейшы з іх.

І чалавек, падышоўшы да хлопцаў, стараўся абняць за плечы ўсіх.

Гэта быў таксама наш звычай. І гэтаксама, як і некалі, быў кірмашовы дзень: за высокім плотам з адламанымі дошкамі, са сцежкамі праз нечыя картоплі да гэтых дзірак стаяла некалькі вазоў, парапраганыя коні ў аглоблях, а на вазах цэбры са слівамі, скрынкі з грушамі, але іх мала хто купляў, людзі — адны кабеты — збіліся пад навесам, дзе прадавалася адзежа. Чырвонае маладое дзяўчо мерала зялёнае паліто.

— Дальбог, сядзіць як уліта.

— Як на яе і шылі...

— Дзіва што, каб за такія грошы не пашыць,— сказаў нейкі чалавек, і зноў у суконным фрэнчы і суконных галіфэ, падступаючыся на камень, каб бачыць, што там робіцца.

Бабы азірнуліся, і я ўчуў, як некаторая з іх сказала, ужо пра мяне:

— А во, Бронін прыехаў.

Мне зрабілася ніякавата, і я пайшоў і, здаецца, доўга чуў на спіне іх вострыя позіркі, пайшоў дадому — не ша-

шою, а сцежкаю, што адлучылася ад шашы пад рэчку. Сышоўшы на рудаватае выпасенае балотца з вяночкамі зялёнае травы, адчуў лёгкую радасць, што я адзін, што дыхае тугаваты востры ветрык і паднімае крылы пінжака, халодзіць грудзі і недзе пад пахамі цячэ за плечы, што раптоўна шуміць і раптоўна сціхае алешнік — яшчэ зялёны здалёк, а зблізку лісце ўсё ў дзірках і спаднізу карычняватае, і наападала яго многа, і яно суха шасціць пад нагамі.

А калі ўлягаўся вецер, было чуваць, як ціхенька плёскалася вада ў рэчцы, нібы там купалася маладое дзяўчо і баялася, каб хто яго не ўбачыў.

Я пайшоў берагам: на вадзе бліскала, пералівалася і сляпіла ў вочы разарванае сонца — рабаватыя палоскі-цені беглі па пяску на дне, і перакочваўся там-сям счарнелы альховы ліст-тапелец. Зялёнаю шапкаю водарасцяў выглядалі з рэчкі купіны. Пры беразе хісталася высокая, збэрсаная павуціннем мятліца і варушылася дзе падсохлая крапіва і карычняватае конскае шчаўе.

Я падышоў да грудка, дзе некалі стаяла Марцінава хата, і здзівіўся, што няма тае высокае старое алешыны, што рэчка падмыла груд — сярод вады ляжаў пень, тоўстымі счарнелымі карэннямі ўгору, каля яго віравала вада, круцілася, плавала жаўтаватая шапка шумавіння, лазовы дубчык матляўся і выводзіў на вадзе глыбокі равок — здавалася, корч плыў проці вады і цягнуў яго за сабою.

Я перайшоў кладкаю на другі бераг. Яна ледзьве ліпела: нехта клаў на ёй агонь — павыпальваў жэрдкі. На другім беразе цягнуліся каровы, шукалі лепшае травы, адмахваючыся галовамі ад куслівых асенніх мух. Адна, бязрогая, рабая, тупавата глядзела з высокага берага ў рэчку — мусіць, хацела піць.

І балотца каля грудка здалося мне чужым і голым — і я ўспомніў, што тут павысякалі малады алешнік: на купінах каля корчыкаў рос марны хвошч, сохлі кучкамі жаўтаватыя воўчыя грыбы на танюсенькіх ножках. Толькі адзінока сумаваў разложысты кусцік старое шыпшыны, і на ім чырванелі спелыя ягады.

Я падняўся на грудок, і нейкаю жальбою агарнула маю душу. Там, дзе некалі былі хвоечкі, цяпер маўкліва цямнеў сіваваты малады лясок, пасеяны год дзесяць назад, ужо не пры мне. Высока над ляском, і не было відаць дзе, драў горла крумкач — расцяжна і счакаўшы — крум-крум. А тут, дзе стаяла некалі хата, горбаю ляжала патрушчаная цэгла, між яе выбілася трава і паднялася ўжо высокая бярэзінка; каля круглага каменя пераспела і хісталася сухая крапіва, а там, дзе быў якраз покуць, цвіло ліловым цветам каліва смакатухі. Сярод двара, недалёка ад котлішча, зелянела таўставатая ліпка з адламаным вяршком — я ўжо і не помню, ці расла яна тут.

І мне зрабілася тужліва, што няма хаты, раптоўнага брэху сабак, старое алешыны — усяго таго, што было памяткаю малых год. Я заплюшчыў вочы і, здаецца, зноў убачыў Марцінаву хату, купіны зялёнага сыраватага моху на страсе, кошык на шчытку для галубоў і, здаецца, учуў, як зайшліся ад злосці і недзе з-за вугла пакаціліся да мяне сабакі. І неяк раптам ціха, нібы баючыся, іх паклікаў Марцін:

— Цю-цю, на-а, цю-цю, на-а.

Я адкрыў вочы, пастаяў яшчэ колькі і пайшоў.

Халаднаватасць вечара кралася на балота — цень ад мяне быў доўгі і доўгі цень ад алешніку. Недзе далёка на полі надрываўся і раптам глух трактар. За алешнікам, на шашы, з ляскам страляла машына, потым нізка і густа гула, нібы пад зямлёю. З гвалтам ляцелі, расцягнуўшыся, гракі — астатні крычаў, усё роўна як ікаў. Зашарахцела грамадка шпакоў, і даўгахвостая тоненькая пташачка цілілўкала, даганяючы іх.

Адсвечвалі чырванню вокны ў нашай вёсцы — там яснелі галасы, рыкала недзе ў гародах каля вёскі цяля.

Я агледзеўся на Марцінаву хату: сонца стаяла нізка — баба качаргой дастане — якраз над тым грудком, дзе была калісь Марцінава хата. На балоце, як хто накінуў вялікую сетку, блішчала танюсенькае павуцінне.

І мне зноў падалося, як недзе там, на грудку, Марцін клікаў сваіх сабак:

— Цю-цю, на-а, цю-цю, на-а!

Я, здаецца, выразна чуў яго голас.

## Кароль Нябожа

Летась на «рускага Пятра» (яго рэдка дзе цяпер святкуюць у нашым баку) малодшыя ў вёсцы бабы спраўлялі «велькую гарэлку» — пілі цэлым звяном, балазе кончылі палоць лён.

Пасля шчырага дажджу, полуднем, вецер сушыў купіны зялёнага моху на страсе і вымытую ўдзень даёнку на плоце. Толькі на вішні, перад акном, матляхала яшчэ сыраватымі рукавамі зношаная, з вырваным плячом, рубашка — страшыдла ад сарок і шпакоў — і на лічаннях капусты, што расла ў гародчыку і не бралася яшчэ ў галоўкі, дрыжала растопленым волавам тлустая вада.

Перад парогам у пустым карыце чубіліся біцца, натапырваючы мокрае пер'е, бясхвостыя пеўнікі, і на прыгуменні мыкала, закруціўшыся вяроўкаю за калок, пярэстае цяля.

Але ў хаце не чулі. П'яныя бабы ўставалі з цвёрдае лавы, адпіхалі жыватамі стол і выходзілі на сярэдзіну хаты. Пабраўшыся ў пары, шоргалі босымі нагамі па чорствым гліняным таку; па жоўтых сухаватых лытках матляліся чорныя паркалёвыя спадніцы, і ў вокны віўся клубкамі пыл — горкі, ад яго пяршыла ў роце. Толькі адна, каторая не мела пары, сядзела на покуце, выцінала языком польку і біла па стале счарнелаю дзеравянаю лыжкаю; на край ехалі шчарбатыя алюмініевыя відэльцы, а ў шклянцы калыхалася і, здаецца, аж курылася сівая, як туман, недапітая на палец самагонка.

Бабы прытупвалі сухімі патрэсканымі нагамі і падспеўвалі: «Цягнуў ногу на дарогу, як выцягнуў, так пайшоў». Хусткі ў іх з'язджалі на патыліцы, і было відаць, як трасліся дробныя, сабраныя з рэдкіх пасечаных валасоў іхнія куклы.

Змогшыся, бабы пападалі на ложак і там ужо аддыхваліся, падцягвалі на клубах спадніцы, убіралі за пояс кофты і папраўлялі валасы. Шчокі ў іх раз'ятрана гарэлі. Толькі тая, чарнявая, дробная ў твары, што сядзела на покуце і выцінала языком польку, была спакойная і, падсунуўшыся цяпер да акна, глядзела на двор: з вуліцы ў надворак заварочвала фурманка. Вялікі гняды конь з сытымі персямі

раптам тузануўся і стаў — зачапіўся задняю воссю за рог плота. На частаколіне заварушылася даёнка, і з перапуду, махнуўшы голымі крыллямі, ад карыта адскочылі цыбатыя кураняты.

— Ці не стары Кароль Нябожа прыехаў? — спытала чарнявая маладзіца, не азіраючыся на хату.

— Дзе? — Бабы пасхопліваліся з ложка і павіслі перад акном адна адной на плечы.

— Нос у яго велькі, дальбог, пачуў гарэлку,— сказала некаторая з тых, што глядзелі праз другое акно.

— Гэты нос і так ужо набраўся.

Конь пацягнуўся да травы, і на вочы яму пасыпалася скалмачаная, у шышках ад дзядоўніку, грыва. Зноў затрашчаў плот.

— Дальбог, загарадзь паломіць! — забедавала вялікая бялявая гаспадыня, кінулася ў сені і не зачыніла за сабою дзверы.

Счакаўшы, за ёю выбеглі ўсе. Узяўшыся за цуглі, бялявая заварочвала каня: воз крута вярнуўся набок, аб драбінку шоргала пярэдняе кола.

— Назад, назад трохі дай,— крычалі ад парога бабы,— бо, дальбог, выкінецца чалавек з воза.— І беглі брацца за дышаль, каб адцягнуць воз назад.

— Авой, гэта ж ён нежывы! — крыкнула адна і адскочыла ад воза.

Разапрэлыя бабы раптам звялі, працверазелі і сціхлі. На возе ў палукашку, прутка выцягнуўшы ногі, ляжаў з адкрытымі невідушчымі вачыма сухі і скамянелы ў твары Кароль Нябожа. Шапка ў яго з'ехала — вецер перабіраў сівыя валасы...

* * *

Караля ў той дзень бачылі ў мястэчку: было гэта пад дванаццаць — ён стаяў з возам каля пераезда. Мільгаючы зялёнымі вагонамі, прайшоў прыгарадны цягнік, але шлагбаума яшчэ не падымалі.

— То адчыняй, чаго стаяцьму! — крыкнуў з воза Кароль. Ён сядзеў на анучах, натрамбаваных пад самыя драбінкі; яго востры і загнуты да губы нос глядзеў з-пад салявога мяшка, насунутага на самыя вочы: разышоўся той самы дождж, што рабаціў гладкае каменне на шашы і крапіў палеглую ад пылу траву ў канаве.

«Пераездчык» усміхнуўся, не адкрываючы, а толькі расцягваючы губы, заткнуў за халяву скручаны жоўты флажок і пайшоў паднімаць шлагбаум; на канце брыля ў яго дрыжалі дажджавыя кроплі.

Недзе на станцыі аціхаў цягнікові шум, а тут, на пераездзе, яшчэ ляскалі мокрыя рэйкі. За чорным насмаленым дахам доўгага склада вяла ўставаў густы, хоць ты па ім качайся, белы дым. А тут пырскаў, шапацеў, як што шукаў, дождж. Блішчала мокрая бляшаная страха на пераезднай будцы. Цвіў зялёным лішаём на другі бок чыгункі нізкі плот.

Кароль думаў, што вот мокнуць анучы і, мажа, прыйдзецца варочацца дадому і што вот круціць — абы дождж — руку, а ён ад самае зімы ніяк не збярэцца да доктара.

— Эй, чаго заснуў! — ляпнуў дзвярыма «пераездчык» і схаваўся ў будцы.

Кароль тузануў за слізкія лейцы, конь уздрыгнуў мокраю скураю, натужыўся і пайшоў. На пераездзе падкінула і пачало трасці воз.

Мястэчка было мокрае, соннае: па гонце на стрэхах, па цёмным бэзе ў гародчыках холадна расіў дождж. Нізкія прысадзістыя яблыні хавалі ў сваім лісці дробныя, з курачае яйцо, яблыкі. За рогам высокага плота востра трашчаў і раптам глух нядужы матацыкл: там была аўтобусная станцыя — конь завярнуў туды; ён ведаў дарогу сам. Тут ціханька мок пусты, з адчыненымі дзверцамі аўтобус, а бабы сядзелі пад навесам і чакалі «свайго».

Прыпёршыся да слупка, стаяў мужчына з перавязаным вокам, на хустцы цямнела, запёкшыся, кроў.

— Ці не Восіп? — Кароль адхіліў ад вачэй салявы мяшок і пазнаў з свае вёскі колішняга брыгадзіра.— Хто ж гэта цябе так?

— Хто ж, як не свой! Швагер вунь...— Чалавек падняў галаву.— У бальніцу іду, хай спраўку дадуць.

— Ага...— Кароль скіраваў у вулачку між глухою сцяной хаты і драцяною загараддзю ў дзве столкі. За ёю ўжо цвіла ліловым, як вылінялым, цветам ранняя картопля.— Б'юць? А табе і не вадзіць. Думаў — век будзеш цараваць? Прыйшло і на цябе...— Кароль ужо гаварыў сам сабе.

Колы шоргалі па пяску, ён браўся на шыны і адвальваўся ў каляіны сырым цестам.

За картоплямі, за драцяною загараддзю на голым двообрышчы шэрхлі на дажджы козы: у аднае на шыі целяпалася качалка. Каза паднімала абедзве нагі разам і скакала да калючага дроту, у картоплі.

— Куды цябе нясе? — крыкнула і адлучылася ад шэрае сцяны блізкае хаты босая кабета без хусткі.

Кароль пазнаў дурнаватую Бортнікаву дачку — вярнулася хворая з Нямеччыны, так і не выздаравела. Бортнік памёр нагле на згоне зімы. Кароль так і застаўся вінен яму тры рублі — пазычыў яшчэ восенню.

— Тпру! — Кароль прыпыніўся і пачаў абмацваць на грудзях кішэньку — там меліся быць грошы.— «Трэба аддаць, аддаць хоць ёй. Чужога не спажывеш».

Прыпынілася і маладзіца. Яна была ў адной сукенцы на голае цела. У белых, роўных, як пруткі, валасах сядзеў грэбень. У руцэ яна трымала сукаваты, з сухое грушы, кіёк.

— Як жа цябе зваць? — абедзвюма рукамі Кароль зняў з галавы мяшок. За шыю пачаў церусіць халодны дождж.

— А ты не ведаеш, ці што? — Маладзіца калупала сукаватым кійком пясок.

— Ведаю, таму і хачу аддаць табе грошы. Некалі быў пазычыў у бацькі.— Кароль разгладжваў скамечаныя паперкі.

Маладзіца глянула спадылба і не падняла галавы.

— Мяне не вельмі купіш...

І пайшла, ступаючы шырока, па-мужчынску, і б'ючы грушавым кійком па калючым дроце: дрот звінеў, з яго пырскала вада.

— Но-о, каб на цябе воўк! — Кароль махнуў рукою, прыпаднімаючыся і шукаючы пад сабою пугу.— Вот зачапі такую. Но-о-о!

Кароль круціў над галавою лейцы. Конь туліў вушы, адварочваўся ад дажджу. Кароль скіраваў на цвёрдую, уезджаную машынамі вуліцу — яна спадала ў лагчынку, і конь пабег сам — напіралі калёсы.

Радзеў, перасціхаючы, дождж. На нечым коміне асіпла ад крыку мокрая варона. Кароль пазнаў страху Красоцкага — загадчыка базы «Утыльсыравіны». За абвіслаю на плот чарэшняю жаўцела шалёўкаю сухая з гэтага боку сцяна.

Кароль тузануў лейчыну — конь скіраваў на масток з круглякоў цераз канаву і стаў, упёршыся ў высокую з дошак браму. У двары гаўкнуў і зазвінеў дротам сабака. Кароль ссунуўся з воза, закруціў лейцы за шула і, прыгнуўшыся, знік за вузкімі веснікамі.

Сярод двара ў цабэрку з двума вушкамі мок фікус. У паліваную місу каля ганка цурком лілася са страхі вада. Сабака кінуўся з-пад буды, павіс на караткаватым ланцузе і захроп ад злосці — нашыйнік пераціскаў яму горла.

— І табе не брыдка? — Кароль патрос стусінавым пужальнем.— Жучок...

Сабака закруціўся на ланцугу, нехаця завіляў хвастом і пашыўся ў буду — аб дошкі за ім загрукацеў ланцуг.

У акне, што было на кухні, паказаўся кабецін твар і знік: Кароль убачыў жонку Красоцкага. Пашоргаў чаравікамі па драбінках, што ляжалі перад ганкам, і знарок загрукаў перад дзвярыма, каб было чутно ў хаце.

— Во, дзядзька Кароль прыехаў! — Прачыніўшы дзверы, кабета дзяржала адною рукою за клямку, другою трымала сабраныя за патыліцу валасы — ці не збіралася іх мыць. Рукі ў яе былі голыя аж да плячэй.

— То ідзіце ж у хату.— Кабета зняла з клямкі голую руку і пастаранілася.

— Не... Я тут з канём. Прывёз дабро. А дзе гаспадар? — спытаў Кароль, не заходзячы ў сенцы.

— Спіць. Улёгся, і каторая пара.

— Ат, такое бяды. То, можа, вы адамкняце хлеў? — спытаў Кароль, так і не пераступіўшы цераз парог. Рагі яго фуфайкі набрынялі вадою. Пад нагамі ўжо збіралася лужына.

— Чаму ж не, толькі акрыюся,— сказала яна і мільганулася за сцяну, недзе да вешалкі.

Ён пайшоў адчыняць браму.

— Хаця ж не едзьце — фікус возьдзека.

Ён зняў з прабоя зашчапіцу і аглянуўся на яе голас. Яна ўжо спускалася з ганка: у мужчынскім пінжаку з падкаснымі рукавамі, у белай хустцы, што гладка ляжала на галаве, завязаная недзе аж на патыліцы пад валасамі.

— Пачакайце, ці ж адна падымеце — гэтакі ценжар,— сказаў ён і тузануў да сябе дзверы — адчыніў браму.

Яна чакала яго: падвязвала, каб, мусіць, не раскалоўся, фікус. Сукня на ёй падцягнулася вышэй каленяў. Ён падышоў, пільна ўзіраючыся на яе яшчэ пруткія, цвёрдыя ногі, белыя пад каленьмі. Яму заўсёды падавалася, што яна была кругом як тая бежанка, хіба трохі нізшая.

Бежанку тую ён меў даўно, у другое ці першае лета пасля вайны. Была яна тады адных год з цяперашняю маладзіцаю — бралася пад сорак, была дзябёлая, толькі паўнейшая ў твары, вузшая ў клубах, такая ж русавая, і надта ж белае цела — можа, як і гэта.

Ён узяўся за другое вушка ў цабэрку з фікусам і адвярнуўся, каб не глядзець ёй у вочы: саромеўся, што пачало думацца старому пра ўсё брыдкае і маладое.

Яны маўчком панеслі фікус пад хату. На іх лілося са страхі, густа, як праз рэшата цэд, але дождж перасціх. На ясным небе за хлявом востра паднімала цёмны вяршок маладая высокая груша.

Міса каля ганка была поўная, як вока, кругом яе ўжо стаяла лужына, жоўтая, нібы з попелу луг, і ў пене. Маладзіца абмінула лужыну і пайшла да хлява, слізгаючыся па раскіслай гразі. Сабака высунуўся з будкі і скочыў лапамі ёй на ногі. Яна крыкнула на яго, адмахнуўшыся рукою,— на лытцы ў яе чарнела пісягаю гразь.

У адчынены хлеў Кароль уехаў з калясьмі. Пахла свежым гноем; у загарадзі рохкаў белы доўгі япрук і шоргаў спіною аб сцяну.

— Нябось, добрая скварка,— сказаў Кароль і павесіў торбу з сенам каню на шыю.

— Леташні быў, як лось, а гэты закажанеў, нічагутка не есць.— Маладзіца падняла з тока астаткі зелля, урэзанага картапляніку і макрыцы, і кінула за загарадзь.

Кароль згроб з воза мокрыя анучы і растрос па таку ў пустой старане, дзе ляжаў яго палукашак — пакінуў некаторы раз,— і сказаў:

— Гадаваў бо і я, але хто карміцьме?

— Узялі б якую, ці ж мала?

— Не ў маіх ужо гадох.— Ён падышоў да воза і набраў бярэма ануч.— А быў панаравіў адну.— Ён ізноў падумаў пра бежанку.

— А кажаце — стары...

— Не цяперака, а як бежанцы ехалі ў першы год пасля вайны,— сказаў ён ужо каля сцяны, дзе горбаю кінуў анучы. Вярнуўся да воза і сказаў яшчэ:— Маладая была, не раўнуючы, як вы цяпер,— і ўкалоў вачыма.

Маладзіца пачырванела і схавалася за каня — сышла з яго вачэй.

— І чаму ж, дзядзька...

— Дзеці асталіся тамака.

— Скуль жа яна?

— Недзе з-пад Варонежа, з сяла Ганны, казала.

— І многа дзяцей?

— Трое, казала.

— Удава хіба?

— Чаму ж? Не.— Ён прынес і ўклаў у воз лазовы палукашак.— Інвалід толькі.— І яму прыпомнілася, што бежанчын, казала, прыйшоў з вайны без абедзвюх рук.— Трудна ёй прыйшлося, ой, як трудна,— сказаў Кароль і пайшоў знімаць з каня торбу. Завязаў яе і кінуў у палукашак, каб было мякчэй сядзець у возе.— Аб'ездзіў паўсвету, а назбіраў во — гляньце — жменю,— ён паказаў на анучы і ўзяў каня за

вобруць каля мокрых, у зялёнай пене цугляў.— Цяпер парцянога нямашака, усё гэтая танюсенькая крамніна.

Ён даў каня назад — задзіраючы галаву і спатыкаючыся на парозе, аж асядаючы на воз, конь задам выйшаў з хлява.

Маладзіца зачыніла хлеў і пайшла наперадзе каня; каля ганка, каля місы нагнулася, узяла жменю вады і абмыла з лыткі гразь.

Кароль выехаў з надворка і спыніўся за мастком на вуліцы — зачыніць браму.

— Не мардуйцеся, я сама...— сказала маладзіца, ідучы да брамы.

— То добра,— крыкнуў Кароль, усаджваючыся ў палукашку на мяшок.— Скажыце свайму, што на днях прыеду.

— Ну ле, скажу.— Яна стаяла ў расчыненай браме. Пад нагамі ў яе, як нанава адскочыла, зелянела трава.

Кароль ад'ехаўся і агляну́ўся: яна яшчэ ўсё не ішла ў хату, каля чорнага плота была знаць яе белая хустка.

Свежаю шалёўкаю здалёк жаўцела сухая сцяна Красоцкавай хаты.

Стары Кароль думаў пра маладую Красоцкаву жонку і пра тое, што яна рыхтык тая бежанка.

Скрозь у хатах сохлі запацелыя вокны. На пустым дварышчы валтузіліся дзеці, білі нагамі мячык, што, мусіць, паляжаў на гарачай печы — бок у яго ўваліўся. Бортнікавай дачкі з козамі не было. І Каралю зноў успамяну́ліся тыя пазычаныя тры рублі. Падумаў, што грэх адзін — прапіць, і не скіраваў на дварышча, паехаў вуліцаю: так бліжэй было да сталоўкі.

Конь плюхаў па лужынах: вуліцаю з грудка яшчэ сачылася вада, у калдобіне, дзе яе назбіралася многа, круцілася пена і плавала леташняя салома. З каня ішла пара, ён яшчэ добра не высах.

Перад вачыма ў Караля ўстаў Бортнік.

Было шкада, што Бортніка нямашака на свеце,— як шкада дрэва, што расце пры дарозе і яго зрэжуць.

За дварышчам стаялі новыя хаты, і Кароль ужо не ведаў чые,— людзі будаваліся хто адкуль і хто як мог. Хаты былі

са шпуру, з новага і старога дзерава. На шэрай абмошанай сцяне з жоўтымі шуфлядамі ў вокнах яшчэ без рам былі знаць крэскі ад сіняе крэйды — нехта перавозіў і перасыпаў стары будынак.

Хаты стаўлялі ўжо і на тым месцы, дзе за польскім часам быў свіны рынак, а вайною вучыліся нямецкія салдаты: джаламі на ружжах блішчалі шырокія багнеты. У Караля тады аж адарвалася ўсё ў грудзях — ён ледзьве не насунуўся на гэтакі багнет. Перад ім стаяў немец, маладзенькі, і зубы белыя і роўныя, як не свае,— ён рагатаў, наставіўшы на Караля ружжо. Кароль ішоў глядзець Хоневу хату. Яна стаяла ў канцы свінога рынку: яшчэ новая, дзеравіна ў дзеравіну — адна смаліна.

Немец кіўнуў галавою — паказаў ісці назад, але Кароль не паспеў адысціся: ніжэй паясніцы ў мякаць упіўся і аж, здаецца, застаўся там сядзець багнет. Салдатня душылася ад смеху.

Рана гаілася доўга, бытта ўкусіў сабака. Кароль і прыкладваў яе дзіваннай — лякарствам ад шалёных сабак — зеллем, што расце на выгарах у лесе: жоўтыя кветкі на тоўстым стрымбулі і сівае, як у лопуха, лісце.

У Хоневу хату ён не перабраўся, хоць свае не меў — згарэла, як немцы палілі вёску. Жыў у мястэчку: пуставалі казённыя дамы.

Сюды да яго і прыходзіў Хоня. Прыцемкам адлучыўшыся ад купы, калі яўрэяў гналі ўжо з работы з тартака назад у «гету». Хоня і казаў тады Каралю, каб пераходзіў да яго ў хату: «Жыў буду — змірымся, памру — табе застанецца».

Твар у Хоні быў жоўты і як набрынялы — чалавек пух ад галаду. Кароль насыпаў яму торбу грэцкае мукі, але ад хаты адкаснуўся: баяўся немцаў. І цяпер яна стаяла як новая, на два канцы, з высокімі, у тры шыбы, вокнамі і накрытая бляхаю. Каля коміна ўжо завязвалася ржа — зімою тут грэўся і раставаў снег.

«Не свая, нікому не абыходзіць».— Кароль заварушыўся ў палукашку: пачала муляць торба і недзе казыталася салома. Кароль укленчыў, перавярнуў торбу на другі бок, сеў

на яе і зноў пачаў думаць пра Хоневу хату. Яна была яму як свая, і яго брала радасць, што Хоня нікому, а яму аддаваў гэтую хату. І ён нават убачыў, як жыў бы тут з бежанкаю і як яна цвёрда ступала б босымі нагамі па чырвонай падлозе. І Каралёвы думкі набеглі зноў на ўсё брыдкае і маладое. Сонца даймала праз фуфайку, нібы хто прыклаў да спіны нагрэтую і закручаную ў анучу цэглу. Кароль расшпіліўся, але фуфайкі не зняў. Прыпякала, і зноў як на дождж.

Кароль завярнуў у вузкую, двум вазам не абмінуцца, папярочку і выехаў на шашу.

Конь пайшоў барздзжэй. Тут быў асфальт, яшчэ мяккаваты і тлусты — днямі залілі. Вада збягалася на ім, бытта на патэльні. Бабы, што ўжо варочаліся дадому з пустымі бітонамі, закручанымі ў белыя радзюжкі за плячыма, ішлі сярэдзінаю шашы, ляпалі босымі нагамі па тлустай смале. Ногі ў іх запырскаліся аж да каленяў.

Кароль мінуў доўгі плот і спыніўся на другі бок вуліцы, каля белага дома з высокімі цэментовымі ўсходамі. Злез з воза, кінуў пад ногі каню сена, закруціў за частаколіну лейцы і падбег да цэментовага ганка.

Мажная дзяўчына ў белым, забруджаным на жываце фартуху, не знімаючы з прабоя рукі, выпусціла са сталоўкі дробнага, сабе па плячо, мужчыну.

— Абед, дзядзька,— сказала Каралю і грукнула дзвярыма.

— Во-во, паненачка, я ж на абед і прыйшоў.

— Чытайце, там напісана,— сказала яна ўжо з-за дзвярэй.

— Але пісаным не кормяць...— Кароль шлёгнуў пугай па высокай, збэрсанай каля плота траве і перайшоў вуліцу, у магазін.

Дзверы былі расчыненыя. З магазіна нясло духатою і селядцамі. Кароль зайшоў — астатнія з чаргі аглянуліся. Каля прылаўка цярпліва парыліся адны бабы, і ўсе, мусіць, па цукар — падаспелі ягады. Пярэднія выварочвалі і вытрасалі палатняныя торбы.

Кароль абвёў вачыма паліцы: на ніжняй стаялі адны чорныя бутэлькі.

— А свянцонае няма?

— Сёння і без яе не вытрываць, варыць, што ў печы,— азвалася не прадаўшчыца, а некаторая з чаргі.

— Толькі віно.

— І на памін душы?

— Я ж кажу — толькі віно! — крыкнула цераз баб прадаўшчыца.

Ён падняў вочы — на верхняй паліцы, пад столлю, над ходзікамі з зялёнымі шышкамі-гірамі, стаялі кірзавыя боты. Падумаў, што на восень трэба было б купіць.

— А там каля бальніцы ў «орсаўскім» яе колькі хочаш, я нат узяў,— голас нападобе быў як Восіпаў. Кароль скалануўся, бытта за пазуху кінулі жабу.— Я ж толькі адтуль,— гаварыў ён, Восіп, але Кароль не абярнуўся, глядзеў на паліцу.

— І няўжо будзеш судзіцца? — Кароль глянуў цераз плячо. Восіп ужо быў перабінтаваны, верхняя губа раздулася, як укусіла аса, на кончыку вуха лушчылася запечаная кроў — добра не абмылі.

— Казалі, год-два мецьме.

Кароль пайшоў уздоўж прылаўка, усё цікуючы на паліцы, знарок, каб не глядзець на Восіпа.

— То, можа, падвязеш? — Восіпаў голас засціг яго на парозе.

— Я ж толькі з дому,— ужо знадворку змахляваў Кароль і так і не абярнуўся, выйшаў з магазіна.

Конь падбіраў сена, пад возам грабліся куры. Кароль зняў з частаколіны лейцы і выкіраваў каня на сярэдзіну вуліцы.

За магазінам кончыўся асфальт, пайшоў брук — воз ляскаў і калаціўся, у Караля аж казытала ў вушах.

Пахла смаловым карчом — курыўся, як куча свежага гною каля хлява ўвосень, ссыпаны горбаю асфальт. Залівалі ходнікі, уздоўж плота было насыпана бітае каменне. Цыган, без рубашкі, у рукавіцах, спечаны на сонцы, стаяў на каленях і рассоўваў дошкаю чорную горбу. Другі — без шапкі, русавы, з завушніцай у вуху — сядзеў у цяньку пад плотам, трымаў між каленяў збанок, бразгаў у ім лыжкаю — палуднаваў.

5. Зак. 1877

«Нябось, і іх цягне на сваё...» — падумаў Кароль пра цыганоў і ўспомніў, як вайною стаялі іхнія абедзве пустыя хаты — акурат дзе цяпер сталоўка. Нехта павысаджаў у вокнах рамы і разбіраў столь: адтуль вісела, зачапіўшыся рукавом за цвік на гарышчы, старая адзежа. Здалёк выдавала, як хто павесіўся. Цыганскія хаты прадаваліся, і нат сходна, і нехта, мусіць, купіў, а ён, Кароль, рабіў сваю, хоць з маладнічыны — яшчэ стаяў гектар пасажнага жончынага лесу. Цягаў на плячах — конь быў потым: немцы кінулі каля вёскі кульгавую бельгійскую кабылу. Тады яшчэ быў дужы, хоць якое там было дзерава — жэрдкі. Але буду зляпіў, абы выбрацца з мястэчка. Немцы выганялі з казённых дамоў.

Ззаду затрубіў аўтобус, Кароль з'ехаў убок і забыўся, пра што думаў.

Аўтобус дыхнуў скразняком і, асядаючы на запырсканы зад, скіраваў на прыпынак. Там зафыркаў, стрэліў сінім дымком і сціх. Прывёз адных баб. Адкуль яны толькі браліся — сыпаліся праз двое дзвярэй, і канца не было.

Кароль пазнаў толькі адну, у чорным сачыку, у сіняй суконнай спадніцы з белым шляком — тарціярку[1], што некалі таварышкавала з жонкаю. Яшчэ вот жыве, а яго даўно зямлю парыць. Памерла недзе ў Польшчы, аж каля Лягніцы, летась, у такую пару — перад жнівом. Дачка дала «цілiграму», але ён так і не сабраўся: усё думалася — пакуль вырабіш той дакумент на выезд, пакуль даедзеш. Але адзін Бог рассудзіць. Дурны быў — на зямлю пагнаўся, браў старэйшую за сябе на дванаццаць год. А яна і тыцкала гэтай зямлёю. А потым, як прыйшлі нашы, усё баялася калгасаў. Ездзіла ў Гродна, вазіла нямецкую рудую паперку, што складвалася надвае і дзе была яе картачка і адціснуты ўмазаны ў чарніла палец. Гаварыла, што яна палячка. Хоць напісала на гэтай паперцы сама.

А тады, як ехалі людзі ў Польшчу, ён завёз яе сюды на вакзал, а сам з канём вярнуўся дадому. А куды ехаць — ад свайго не ўцячэш. Кажуць, добра там, дзе нас няма.

— Ну, кудэю ж ты едзеш?

---

[1] Непадстрыжаная манашка, багамолка.

Кароль падняў галаву: конь ішоў каля самага плота, знайшоў мякчэйшае сам — не наравіў брук.

Чалавек з новаю касою, абкручаны анучаю, сышоў з ходніка на сярэдзіну вуліцы. Кароль тузануў левую лейчыну, конь спатыкнуўся і збіўся з хады. Воз затросся на бруку. У Караля нешта павярнулася ў грудзях, парнула, што швайкаю, і не адпусціла. «Трэба паказацца дохтару»,— Кароль сагнуўся, прыціснуў рукамі грудзі і падкурчыў ногі. Трохі адлягло.

За пераездам кончыўся брук: па драбінках сек шротам сыры пясок. Воз перастала трасці — Каралю палепшала. Пах жвір з пустое вуліцы і аднекуль дым, моцны і горкі. Мусіць, недзе на вакзале тлеў вугаль. І гудзеў матавоз, як вецер у пустую бутэльку,— ціха, аж не чуваць, бо далекавата.

Кароль быў ужо ў канцы мястэчка.

Хаты стаялі на адзін бок вуліцы, і ў некага на надворку зеляцеў загон позняга жыта — выплываў толькі колас. Нехта сеяў ярыцу.

Вуліца звузела, як хто яе чым перавязаў. Мястэчка кончылася, толькі слупы пабеглі далей, сцэнкаю між аўсом і нізкім жоўтым лубінам.

Сцэнка ішла на груд. Было відаць хату — саламяны лоб страхі, як крылі даўней і не рабілі шчыта. Там недзе яхкаў сабака. Пачыналіся Ятранскія хутары — да вёскі была яшчэ добрая вярста. Крычала ўжо кнігаўка, падала ў адное месца над лубінам — за хатаю было балотца. Рыпелі гужы на аглоблях, як сухастоіна ў лесе, шоргала рэхва на задняй восі аб калодку, мякка ступаў конь, але Кароль не чуў — яму зноў спамянуўся Восіп. Тае пары, як ён, Кароль, стаў конюхам, а Восіп — брыгадзірам.

Кароль тады быў адзін на дзесяцёра коней і даглядаў не горш, як цяперашнія ўдвох — конюх з памочнікам. Тады ў Ятры і канюшні не было — коні стаялі ў Каралёвым гумне.

Зіма ў той год лягла на Пакровы. Пасля Каляд мароз стаяў, як звер, не адпускала нешта да самага Благавешчання. Коні пасля ночы стаялі ссівераўшы, што ссыпаныя снегам. Адзін і зайшоўся, маладзенькі: кашляў і чах даўно. Кароль

нат гарнікам[1] яго паіў. Казаў і Восіпу, каб выпатрабаваў з раёна ветэрынара — мо паглядзеў бы. Але Восіп усё мок у гарэлцы.

А тады прывёў старшыню з участковым і кажа: «Тарасавіч, не карміў, глядзеў толькі свайго». А гэты Тарасавіч быў старшынёю (цяпер недзе ў раён пераехаў), аднекуль з-пад Гомеля, ці што, і ўсё маўчаў, як гэта не да яго. Хоць папраўдзе Кароль «свайму» даваў больш: жарабок ад тае бельгійскай кабылы быў як гара, хіба ж яму дасі менш. Але тады злыдзень пад'юшчыў: як трымаў Кароль вобруць у руках, так і сперазаў Восіпу па галаве — на брыве ў таго нахапіўся гуз велічынёю з арэх.

Можа, судзілі б, ды ўважылі па гадах — знялі толькі з конюха. А жарабка прадалі сюды, да Красоцкага. Восіп не папусціўся. Дома стала не ўседзець. Балазе Красоцкаму трэба быў яшчэ адзін анучнік — падраіў і замовіў слова Бортнік. А на конюха Восіп прывёў свайго швагра з Літаварцаў. А цяпер б'ецца з ім — нешта не падзялілі. Яшчэ і ў турму аддасць — на руках мае спраўку.

У Караля зноў пацяжэла ў грудзях, у роце сушыла, млявіла ўсяго, як ад гарачыні. Сонца стаяла жоўтае, у смузе. Падпарвала — яшчэ раз на дождж. Сценка ішла картоплямі: у глыбокіх разорах гуслі, што кісель, лужыны.

Паказалася вёска — першыя на грудках хаты і цёмныя напроці сонца дрэвы. Было знаць жыта, белае перад вёскаю — падгарэла. У гародах, нагнуўшыся, стаялі бабы: палолі зелле, кожная ў сваім, але Кароль іх ужо недабачваў.

Сценка спусцілася з груда, і было відаць балотца: гнуліся ў адзін бок і густа блішчалі сівізною вербы. Вецер хіліў асаку, як хто вялікі па ёй качаўся.

Над сценкаю снавалі ластаўкі, кідаліся над Каралём угору і, здаецца, сціналіся ў камяк ад вострага піску.

Конь слізгаўся па кіслай гразі, гразь пухкала і цягнулася за капытамі, як выхаджанае цеста. Пачалася лагчынка.

Пад жыта было сушэй, ад пяску, што нанясло ўвесну; па ім займалася рэдкая, без соку, што ў картаплянай яме,

[1] Лекавая трава, купальнік.

трава. Пры жыце за калючым дротам нехта выйшаў пракос, прэла нерастрэсенае сена. У жыце яшчэ трымалася раса, зіхацела зеленаватай чырванню на падпаленых асцюках і сухаватым пер'і.

За атосы чапляліся каласы, сцябло пэнкала, аж звінела — каласы падляталі ўгору і падалі на каня. Конь туліў вушы і касіў галавою назад. Жыта стаяла лаваю — высокае, тоўстае ў сцябле, што троснік, хоць барану стаўляй. Дзе-нідзе палягло.

Кароль выцягнуў руку, злавіў саломіну, у кулаку астаўся колас — сашмаргнуўся. Колас пах блышчыцаю — мусіць, сядзела на ім. Кароль вылушчыў зерне, укінуў у рот і доўга лавіў на зуб. Зерне было мяккае і саладжавае — з малаком.

«Яшчэ не налілося, а тыдні два будзе спець. Яшчэ не скора жаць»,— падумаў Кароль, узіраючыся на жыта, далей ад балотца ўжо нізкае і рэдкае, зблізку жоўтае ад рамонку. Вецер хадзіў перагонамі, жыта шумела — паднімалася і аціхала. Варушыліся толькі каласы. Жыта было, як вада ў рэчцы: не слухаеш — не чуваць. І каля жыта рабілася свежа на душы, як каля вады.

На паўмежку ў рудым цвёрдым быльніку ляжаў камень. Ціха, як злодзей, з яго паплыў каршун, ляніва махнуў крыллямі. Згледзеўшы яго, недзе закрычала ўгары і завілася варона. Камень здаваўся такі самы стары, як і многа год назад; і стаяла на паўмежку пераспелая мятліца і пруткае сцябло быльніку — каля каменя адны чаранкі: нехта ламаў быльнік на венікі. А далей за каменем на паўмежку цвіла шыпшына — лінялі і асыпаліся кветкі. Гэтак, як і тады, калі Кароль меў тут на мяжы бежанку. І тады стаяла тут рэдкае, жоўтае ад румянку жыта, і вецер хадзіў перагонамі — жыта шастала, і яго было не чуваць, калі звыкнешся і не слухаеш. На шыпшыне ліняў і асыпаўся цвет — самая цёплая пара лета.

Недзе пад Варонежам тым годам стаяла суш: бежанцы ехалі ўсё сюды, за імі было не прабіцца. Кароль і сам не помніць, чаго быў тады на вакзале. Стаяў на пероне. Тады да Караля і падышла яна, босая, высакаватая, трымаючы

на голай руцэ сачык, у другой — цыратовую сумку, на якой лушчылася фарба. Адзежа на ёй была чыстая, як не ў бежанкі. Толькі па гутарцы Кароль пазнаў, што яна нетутэйшая, а прыгледзеўшыся, убачыў, што і тварам не гэтакая — круглейшая, і рот малы. І трохі жаўтлявая: у вачах чэз бляск. Казала, тры дні нічога не ела. Кароль завёў яе тады да Бортніка, накарміў, у вёску яны прыйшлі — хілілася на вечар. Але нанач яна не асталася.

— А можа, жыцьмем разам? — ён тады яе панаравіў, як не панаравіў нікога.

— Ніж ты не знойдзеш? — яна нават стала жартаваць і чапаць яго сама.

І Каралю зноў спамянулася ўсё брыдкае і маладое. І той надвячорак, і мяжа з цвёрдым быльнікам, і шэпт жыта, і зморaная здаровая яснасць, бытта абнавіўся свет пасля гэтага.

А шарай гадзінай ён запрог каня, скінуў на воз мех жытняе мукі, торбу ячнае шатраванкі і паехаў з ёю ў мястэчка — павёз на станцыю.

Тае ночы не спаў: перад вачыма стаяла мяжа з быльнікам і шастала высокае, як троснік, жыта. У хляве грукаў конь, і Кароль уставаў і ішоў глядзець, ці не падвярнуўся. Слухаў, як нізка шумеў, аціхаючы за мястэчкам, цягнік, думаў, што недзе там едзе яна, і варочаўся ў хату.

А потым нешта з год кожная маладзіца падавалася бежанкаю — Кароль аж стаў баяцца. З часам страх ачах і выветрыўся, як попел. А бежанка ўсё помнілася, помнілася жыта і мяжа ў цвёрдым быльніку. Перад вачыма варушыліся каласы, во гэтаксама — не ад ветру, а ад ценжару, і шапацелі, як мурашкі, калі зачэпіш іхняе гняздо.

Кароль прыслухаўся: у жыце круціўся віхор, угары вілася салома і чорная, ці не ад вароны, перына. Шастала і трашчала сцяблом жыта. Было чуваць, як ступаў па чорствым, прышэрхлым пяску конь, як церла аб ляску задняе кола, як скрыгатала дзе аб камень шына.

Тут былі крушні — іх назносілі тады, калі сеялі канюшыну, яшчэ да калгаса. Воз паднімала, ён хіліўся набок

і тросся, як на бруку. У Караля дрыжала ўсё ўсярэдзіне, займала дух.

І раптоўна ў грудзях нешта млосна заныла і пацяжэла ад гарачыні. Кароль прыхіліўся да драбінак — воз падкінула, адарвала ад зямлі і ціха панясло, нібы труну на плячах. Гарачыня і шум хлынулі Каралю ў галаву. Ён намогся ўстаць, але рука ўжо не знайшла драбінку, пальцы сашчаміліся, і рука ўпала на грудзі. У вачах закружыўся, пажаўцеў і змерк, як перад зацьменнем, свет. І Кароль недзе паляцеў, што ў глыбокую прорву. І там зноў як сталася яснасць, і Кароль зноў убачыў жыта, сваё жыта, што некалі сеяў на жончыным пасажным гектары пры лесе. З краю палетка стаяла бежанка, трымаючы ў руцэ серп. Яна зажынала жыта. Кароль памкнуўся да яе, але бежанка прапала: каля жыта нехта стаяў з касою. Чалавек пашастаў мянташкаю, навастрыў касу і зачаў пракос: жыхнула, упілася ў жыта каса, каласы страпянуліся, замільгалі і пацягнуліся за касою.

Нехта касіў жыта. Кароль аж анямеў. Хацеў крыкнуць, але голас перасеў у грудзях. Кароль пашукаў вачыма камень і з гарачкі не знайшоў, так і пабег з голымі рукамі — жыта бэрсалася і сплятала ногі.

«Апомніся, што ты робіш?» — крыкнуў Кароль і не пачуў свайго голасу. Касец падняў касу — мокрую, з травою,— размахнуўся і ўбіў вастрыё Каралю ў грудзі...

Кароль прутка выцягнуўся і застыў на возе.

Конь выйшаў з жыта, пастаяў на пясчанай дарозе, падумаў, што тут няма травы, і пайшоў у вёску. А жыта хвалявалася, адлівала яшчэ зялёнаю саломаю — па ім хадзіў вецер.

* * *

Караля пахавалі крэўныя, на трэці дзень, без дачкі: яна адбіла тэлеграму, што прыедзе праз тыдзень. Хавалі па полудні. Дзень той выдаўся сухі і ветраны — ужо сенавалі. За трунoю ішлі ўсе з вёскі бабы, якраз збіраліся варочаць сена, ішлі з граблямі; ніхто не плакаў, усе пыталіся,

ці мецьме Каралёва дачка права спрадаць яго хату, бо ён, кажуць, пакінуў тастамант, каб хату аддалі нейкай кабеце з-пад Варонежа, з сяла Ганны. Другія казалі, што стары здзяцінеў, бо яго дачка таксама завецца Ганна.

Труну вязлі калгасным канём, Каралёвага Красоцкі завёў у мястэчка. У той дзень ён наймаў анучніка — русавага маладога цыгана з завушніцай у вуху. Яны згоджваліся ў Красоцкага — жонка сышла з хаты і рвала на паўмежку траву.

Шэрх вечар — закацілася сонца. Толькі там, дзе яно нядаўна было, асталося яснае, спаднізу ліловае неба. Паднімала вушы і хавала нанач свой цвет картопля. Ад зямлі цягнула холадам — на траву садзілася раса. Праз дробнае лісце чарэшні прабівалася цёмная, але яшчэ, здаецца, гарачая чырвань буйных ягад.

Кралася ціш, лёгка, як босая. І раптам заржаў конь. Жонка Красоцкага пастаяла на паўмежку, паслухала, ці не падалося, і, трымаючы абедзвюма рукамі хвартух з травою, пайшла ў хлеў.

Конь, задраўшы галаву, стрыг вушамі. У злым воку яго блішчала святло, што цадзілася з дзвярэй. Ёй спамянуўся Кароль. Конь апусціў галаву — ён думаў ці хацеў таксама думаць пра Караля. У загарадзі азваўся япрук. Яна высыпала туды зелле і выйшла з хлява. З будкі загрукацеў ланцугом і скочыў на яе сабака — яна адмахнулася рукою. На ганку спынілася, паслухала, што робіцца ў хаце. У хляве заржаў конь, нямоцна, як да свайго гаспадара. Ёй стала сцішна — яна падумала, што, мусіць, так плача конь.

Ёй зноў спамянуўся Кароль.

## Хата

Мішка Галубец прадаваў хату. Купляў яе Самусь Дзедзіч — каваль з суседняе вёскі, што адмарозіў пальцы: некаторае зімы ішоў з запоін дадому і заснуў на ганку. Заснуў сярод ночы, а жонка, устаўшы, агледзела яго пад раніцу. Пальцы адцiралі, але адцерлі толькі два вялікія.

Цяпер Дзедзіч трымаў у куксах, прыціскаючы гэтымі двума пальцамі, жоўты складаны метр і прыкладваў яго да сцяны — мераў хату.

Мішка Галубец, без шапкі, у белай нейлонавай рубашцы, у модных, як носяць цяпер, з шырокім поясам і вузкаватых у сцёгнах штанах, і яго швагер — нізенькі, вастраносы, у даўгаватым, па калені, бушлаце,— стаялі сярод падворка, глядзелі, што робіць Дзедзіч, маўчком курылі.

На падворку сохла зацягнутая плесняю леташняя перапрэлая трава, і па ёй рэдзенькаю атаваю ўжо выпстрыкнула маладая. З-пад пляскатага каменя, што быў каля парога замест сходцаў, ачуняўшы, лезла крапіва — яе тут ніхто не таптаў: хата пуставала ад пазалеташняе зімы, як памерла Мішкава маці.

У гародчыку ляжаў, скруціўшыся адным канцом, адрэзаны ад слупа электрычны дрот. Там, на няўскопаных градах, звінелі сухімі галоўкамі стрымбулі высокіх кветак, што сяяліся самі па сабе і цвілі да позняе восені: па іх у гэтую пору лазілі дробныя маладыя чмялі. Каля плота пачынаў зелянець чорны куст агрэсту. Толькі прысадзістая яблыня была яшчэ голаю: на вяршку трапяталіся скручаныя ў трубку леташнія лісцікі і вісеў зморшчаны, гнілы яблык. Пад яблыняю граблася чужая курыца: вецер раздуваў у яе каля хваста пух. На частаколіне сядзеў верабей, трымаючы ў дзюбцы белую перыну.

Мішка глядзеў на вераб'я — яму спомнілася, што вераб'і кожнае вясны вяліся ў акне за ліштвою, і Мішку стала шкада вераб'інага гнязда, хаты, гародчыка з прысадзістаю яблыняю: падумалася, што ён астанецца, як чужы, у сваёй вёсцы, калі разбяруць хату. Яму нават убачылася, як будуць раскрываць страху, як будуць кідаць сюды, на падворак, счарнелую гонту, і будзе трохі нязвыкла, што відаць увесь комін, як што жывое і голае.

А здаецца, саўсім нядаўна якраз тут, дзе цяпер стаіць Мішка, ляжалі ачэсаныя дзеравіны, пад іх хаваліся белыя з чырвонымі вачыма ангорскія трусы, і Мішка выпорваў іх адтуль, а пасля стаяў зруб, Мішка разам з дзецьмі бегаў па бэльках — тады зваліўся Косця Палусін і зламаў сабе руку.

— Так, восем на дзесяць,— сказаў Самусь Дзедзіч, хаваючы ў кішэнь жоўты складаны метр.

— То, можа, паглядзімо ўсярэдзіне,— Мішкаў швагер адамкнуў дзверы.

— Таргаваць — не купляць, можна і пашчупаць,— сказаў Дзедзіч, заходзячы ў сені.

Мішка прытаптаў акурак і нехаця пасунуўся за мужчынамі.

У хаце пахла сухім гліняным токам і збуцвелаю саломаю,— за грубкаю стаяў стары драўляны ложак. Над ім вісела, адклеіўшыся, на адным ражку, вокладка ад польскага «Экрана», тая самая, што некалі, прыехаўшы з Кранштата, павесіў Мішка.

Дзедзіч падышоў бліжэй, прыжмурыўся, і ў яго адвісла ад цікавасці ніжняя губа.

— Ого, яе лытка, праўда, што нікому не гідка! — сказаў ён, усё ўзіраючыся на здымак: з яго на Дзедзіча глядзела, павярнуўшыся трохі бокам і прыкрываючы рукамі грудзі, голая, у чым маці радзіла, Брыжыт Бардо.

— От свет настаў! — Мішкаў швагер сарваў са сцяны вокладку.

— Кажаш, свет настаў, што ні палажы, ні пастаў? — Дзедзіч закруціўся на адным месцы, аглядаючы хату. У ёй было гола. У сцяне сядзелі цвікі, дзе некалі вісела рамка з картачкамі і цьмянае з падцёкамі люстэрка — Мішкава сястра пазабірала ўсё да сябе. Толькі ў покуці астаўся абраз і за ім пучок закуранага зелля з сухімі жоўтымі галоўкамі, мусіць, піжмы, і на акне стаяла бутэлька ад рому, які купляў Мішка знарок для маці — пакаштаваць, але яна выпіла паўчаркі, папярхнулася, сказала, што надта моцны, што забівае дух, і схавала сабе на лякарства, а потым прызналася, што націрала ромам ногі і ён вельмі ж добра памагаў ёй.

— Ну, як і дагаварыліся,— сказаў Дзедзіч, задраўшы галаву і гледзячы недзе на столь,— тры з палавінаю...

— Ланна,— махнуў рукою Мішка.

Швагер, схаваўшыся Дзедзічу за спіну, заплюшчыў вочы і закруціў галавою: не згаджайся!

Мішка знарок, быдта і не бачыў, што яму маргае швагер, адвярнуўся ў другі бок.

— Я табе скажу, хлопец,— загаварыў Дзедзіч, махаючы куксаю: адзін вялікі палец тырчаў на руцэ, усё роўна як сук на абсечаным камлі,— якая тут хата: падчапі на верацяно і растрасеш, як кудзелю.

— Ты ўжо, дзядзька, тань, але тавару не гань,— умяшаўся Мішкаў швагер.

— А болей ніхто і не дасць,— Дзедзіч піхнуў плячом дзверы, выходзячы з хаты,— дзерава маладое — год-два і струхлела, гэта не тое што смаліна, на якое і зносу нямашака.

Мішка выйшаў у сені, пастаяў, падумаў, што вот астатні раз стаіць у сваёй хаце, паглядзеў на цёмную дзірку ў столі, зняў з прабояў кароценькія драбінцы, прыставіў да сцяны і палез на гарышча.

— А ты лепшае не адзеў бы, каб пэцкацца ў пыл? — спытаўся, крыкнуўшы з падворка, швагер.

— Няхай паглядзіць. Чаго ты? Можа, і ў яго двайны шчыт, як у таго Мухі,— тоненька, як бабскім голасам, засмяяўся Самусь Дзедзіч.

З гарышча Мішка чуў, як Дзедзіч расказваў швагру пра нейкага Муху, што ў шчыце хаваў мануфактуру — было гэта вайною,— і ён, Дзедзіч, разбіраючы Мухаву хату немцам на дровы, прынёс сабе кавалак сукна аж на тры каптаны.

Праз малюсенькае, у адну абалону, акенца на гарышча свяціла сонца, у яго жаўтаватым слупку клубкамі віўся пыл — Мішка хадзіў па гарышчы, столь рыпела ў яго пад нагамі, і яму спомнілася, што яна гэтак рыпела заўсёды, калі хто хадзіў па гарышчы, і ў хату са столі парушыўся пясок.

На гарышчы ўсё было, як і некалі: пад латамі тарчэлі старыя капачы, лапатка з кароткім, рашчэпленым чаранком, чачотка сухіх рабін, тонкія, мусіць, ад нічальніц, арэхавыя пруты, каля коміна стаяла матчына прасніца, скрыначка з рашпілем, абцугамі і цалёвымі ржавымі цвікамі, і зялёны з абшморганымі ражкамі куфэрак, у які Мішка калісьці складваў свае кнігі. Мішка адчыніў вечка — зверху ляжаў задачнік па геаметрыі, і ён узяў яго ў рукі, пагартаў; на другі

бок жоўтае тонкае вокладкі ўбачыў свой роспіс — «Галубец». І Мішку зрабілася смешна, што ён гэтак распісваўся, спомніўся і здаўся смешным цяпер настаўнік матэматыкі, што замазваў чарнілам пазбіваныя ў туфлях перады і да самага цяпла насіў зімовую шапку, у ёй заўсёды стаяла і целяпалася «вуха»; спомнілася і яго мянушка — Грыц, якую яму далі дзеці: перад кожным словам настаўнік устаўляў «як грыцца». Спомнілася Мішку, як Грыц аднаго разу зайшоў да іх у хату — настаўнікаў тады пасылалі падпісваць людзей на пазыку.

Грыц пастаяў каля парога, сцягнуўшы з галавы сваю аблавухую шапку — у яго натапырыўся рэдзенькі чубок,— і спытаў, убачыўшы Мішку, ці не тут жыве бацька таго Галубца, што кепска вучыцца.

— Тутака,— сказала маці, раптам зачырванеўшыся і выціраючы аб хвартух закасаныя да локцяў рукі,— яна мыла бялізну: сярод хаты стаяла балея з напараным лугам, з балеі вілася цёплая, удушлівая пара.— Хто ж горай вучыцца, як не наш! Толькі бацькі ў яго нямашака, не прыйшоў з вайны...

Грыц абвёў вачыма хату і ўздыхнуў: жылі яны тады ў хлевушку. У адной, большай, палавіне стаяла карова, а ў другой, меншай, адгароджанай сцяною, з акенцам у чатыры абалонкі, жылі яны.

— Як грыцца, што тут скажаш...— Грыц папярхнуўся параю і высунуўся задам з хаты, нічога так і не сказаўшы пра пазыку. А ў школе злавіў Мішку за плячо, калі той дзеразаваўся на калідоры,— тады была мода граць у «жучка»,— адвёў ад купы і сказаў:

— На добрае цябе няма, а на благое ты скрозь першы,— голас у Грыца быў тоўсты.— Чаму не вучышся? Няўжо думаеш і звекаваць у тым хляве? Прыходзь да мяне дахаты — памагу.

Але Мішка не пайшоў, пасля восьмага класа перавёўся ў вячэрнюю. Навукі там не было. З урокаў Мішка бегаў у местачковую лазню пад вокны глядзець на маладых настаўніц — там нехта знарок сашкроб на шыбе фарбу. Адным

вокам, праз дзірачку велічынёю з грош, Мішка бачыў, як у жаўтаватай ад цьмянае лямпы пары мільгалі белым целам кабеты. Там стаяў гоман, піск, маладжавы смех, плёскалася, шумела некім вылітая вада, дзынкалі парожнія тазы — лазня гудзела, як увосень багаты і людны кірмаш. А Мішка ўсё цікаваў у той куток, дзе паходжвала спрытная, цвёрдая і круглатварая, як маладая рэпка, іхняя хімічка. Мішку было брыдка, сарамяжлівасць мяшалася з радасцю.

Ён ішоў дадому, а ў вачах усё стаяла яна, як стаіць сонца, нейкаю залаціста-зеленаватаю яснасцю, калі ты на яго глянуў.

А потым у Мішкі было ўжо другое: былі ў яго і дзяўчаты, і ён, здаецца, любіў іх, а помнілася ўсё яна, настаўніца.

Днём Мішка хадзіў на чыгуначную станцыю прызарабляць: насіў з вагонаў у склад скрынкі з гарэлкаю. Пасля работы загадчык базы наліваў грузчыкам з разбітых, без горлачка, бутэлек па паўшклянкі гарэлкі і выпісваў па дваццаць рублёў. Дадому Мішка вяртаўся «пад мухаю» і прыносіў скамечаныя ў спацелай руцэ грошы. Было не да вучобы. На другую восень Мішка ўзяў даведку за дзявяты клас і паехаў у мараходку.

— Ну, чаго ты там швэндаешся, як чорт па пекле! — крыкнуў з падворка швагер.

Мішка кінуў задачнік у куфэрак, падумаў, што трэба будзе сказаць сястры, каб пазабірала ўсё, і пачаў спускацца з гарышча.

Дзедзіч са шваграм пералазілі ўжо праз калючы дрот, якім быў адгароджаны ад вуліцы падворак.

Мішка замкнуў дзверы і выйшаў на вуліцу. Прыпарвала. Купкамі каля плота кучаравіўся малады сіваваты палын. За плотам у чужых гародчыках пукаўся, набрыняўшы, бэз. Пахла разварушаным смеццем — людзі падграбалі і мялі падворкі — і халоднаю чэрстваю зямлёю з перакапаных град: была поўня, сеялі расаду. На нечым акне ў скрыначцы густою шчоткаю зелянелі ўжо цемнаватыя памідоры. На частаколінах цвіў жоўты лішай і пах ужо плесняю і вясною.

Дзедзіч гаварыў швагру, што ў іхняй брыгадзе пасеялі авёс, а Мішка Галубец ішоў ззаду, слухаў, і яму прыпаміналася нейкае далёкае лета — як маці жала авёс і як ён насіў на поле скручаныя з жытняе саломы і вымачаныя ў вадзе перавяслы.

За вёскаю на полі ўжо акрыяла і зелянела маладое жыта. У лагчынцы яшчэ стаяла вада — здалёк выдавала, што ў зямлі адкрылася прорва. Над жытам вілася і кігікала кнігаўка, усё роўна як плакала па сваіх малых дзецях.

Шваграва хата была ў канцы вёскі. Ад хаты да балотца спускаўся садок, абгароджаны ў тры драціны. На балотцы за голым і сіняватым алешнікам цвіла слепата, і недзе там турчаў, як хто ў вуха, туркач — на цяпло. Каля парога сохла высыпаная з ямы картопля, стаяў кошык парэзанае ўжо на насенне.

На падворку было чуваць, як стракатала ў хаце швейная машына. У акне Мішка ўбачыў сястрын твар.

— Скора ж вы нешта? — спытала сястра, адчыніўшы дзверы і пастараніўшыся ад парога — першым у хату ішоў Самусь Дзедзіч.

— Доўга — умеючы...— сказаў швагер, распранаючыся і вешаючы на цвік салдацкі бушлат. На швагру была чырвоная ў белыя радкі паплінавая рубашка, тая самая, якую яшчэ аддаў яму Мішка, цяпер ужо з новым каўняром і ўточанымі рукавамі.

— Адзеўся б хоць,— сказала ціха сястра.— Нядзеля, каб гэтак хадзіць...

— Абыдзецца,— агрызнуўся швагер, убіраючы ў порткі чырвоную рубашку. Мішка ўбачыў, як у яго ад злосці пачало касіць правае вока, і Мішка падумаў, як сястра любіць яго, гэткага недалэнгага, малога, і як жыве з ім.

Сястра пачала ўпраўляцца каля стала. Мішка глядзеў на яе: сястра разбылася, твар папаўнеў, але быў маладжавы, толькі нейкая жаўтлявасць асталася ў ім: сястры, мусіць, яшчэ нездаровілася пасля родаў.

— А як жа ж Кася? — спытаў Мішка пра другую сястру, што завербавалася, як ён быў яшчэ малы.

— А ты добранькі, каб хоць бы напісаў ёй...

Сястра адчыніла пограб, спусцілася туды і дастала на падлогу графін падкрашанае чарніцамі самагонкі.

Мішка прыгадаў, што сястра Кася, прыехаўшы хаваць маці, расказвала, як муж ходзіць да нейкае правадніцы, п'е з ёю і, вярнуўшыся дадому, соваецца біцца.

— Няхай бы развялася...— сказаў Мішка, сам не ведаючы, добра ён радзіць ці не.

Сястра зачыніла пограб і паставіла графін на стол:

— Адна з дваіма дзяцьмі? Усё ж такі ён бацька ім...

— Такі ўжо з яго бацька! — зноў са злосцю загаварыў швагер, прыціскаючы да грудзей круглы бохан і наразаючы тоўстымі лустамі хлеб.

— Каб маці жыва была, то хоць дзяцей забрала б, а я ж хіба адна ці дам ім рады?

Спомніўшы пра маці, сястра зашморгала носам, скрывілася і, выціраючыся хвартухом, пабегла за перагародку.

— Вось абы-што, і — слёзы...— пакасіўся на занавескі ў дзвярах швагер, наліваючы чаркі.

Самусь Дзедзіч абхапіў абедзвюма куксамі сваю, выпіў і абцёр губы.

— Гарэлка не дзеўка, не саромеючыся п'ецца.

Дзедзіч махаў галавою, адкусваючы звялае сала, сківіцы ў яго варушыліся. Ён быў вясёлы і зноў жартаваў. Мішка глядзеў на яго і думаў, што папраўдзе мала ўзяў за хату.

Сястра вярнулася з-за перагародкі, трымаючы на руках дзіця.

— Не быў бы то мужчына... Чуе, нябось...— Яна сіняватaю тонкаю ў запясці рукою папраўляла, падсоўваючы на галаве ў дзіцяці белую шапачку з карункамі.

Сястра села на лаве пры Мішку і, калі Дзедзіч загаварыўся са шваграм, ціхенька спытала:

— А колькі ж ён дае за хату?

Мішка сказаў.

— Малавата нешта.— Сястра паднялася і адвярнулася, расшпіляючы кофту і даючы дзіцяці грудзей.

Швагер адсунуўся ад Дзедзіча, закурыў. Закурыў Мішка, і Дзедзіч папрасіў папяросу, і ўсе сталі курыць, гаворачы зноў пра хату, пра раннюю вясну, пра тое, што раскрылася зямля, бо некаторага дня грымела, але на голыя лясы — знак, што будзе неўрадлівае лета.

Дзедзіч устаў з-за стала,— скрывіўшы набок галаву, доўга нешта перабіраў у кішэні пад пінжаком, потым дастаў складзеныя напалам грошы — ліловыя, усе па дцаццаць пяць — і падаў Мішку:

— Гэта задатак. А з астатняю ратаю мо пачакаеш...

Мішка, насліміўшы пальцы, перакладаў грошы з аднае рукі ў другую — ніколі раней не лічыў столькі — і ўсунуў у заднюю кішэню.

— О, глядзі, а то знойдзеш...— пакруціў галавою швагер, калі Мішка выходзіў услед за Дзедзічам з хаты.

Каля раўка Дзедзіч спыніўся, падаў куксу, сціснуўшы Мішкаву руку адным пальцам:

— А ты нікога не слухай. Згодная цана. Лепшых купцоў на хату не знойдзеш.

Дзедзіч спусціўся ў равок — было чуваць, як прутка трашчаў у яго пад кірзавымі ботамі леташні быльнік — і пайшоў раўком на балота, мінаючы вёску, пэўна, на кладку. Ішоў ён, ківаючыся, шырока расстаўляючы ногі, і галава яго ў белай кепцы махалася ў такт хадзе, ішоў ён цвёрда, нібыта адзін заўладзеў усім.

Мішка яшчэ пастаяў, гледзячы ўслед Дзедзічу, прыпомніў, як некалі ў такую пору ў раўку раставаў мурзаты курган і снег шыпеў на сонцы, як карбід у вадзе, як на ім выступаў шэры папяловы шум і ён, Мішка, выгнаўшы на пашу авечкі, разуваўся і бегаў разам з дзецьмі праз гэты курган — снег прысакам пёк у босыя ногі.

Мішку аж закалаціла ад таго даўняга холаду, і ён вярнуўся ў хату, думаючы, што трэба было б паслаць сястры ў Калінінград грошы.

Швагер шаптаўся з сястрою за перагародкаю.

— Ой, пусці! — задыхалася яна, мусіць, выцярэбліваючыся з яго рук.— Нехта прыйшоў... Пусці!

— Я тут,— знарок моцна крыкнуў Мішка і паклікаў швагра.

Адлічыў яму грошай. Швагер зрабіўся вясёлы, сказаў, што, можа, яшчэ трэба было б па чарцы.

— Нашто заліваць вочы.— Выйшла з-за перагародкі сястра, загладжваючы пад хустку валасы.— Няхай на вечарынку схадзіў бы.— На твары ў яе гарэла ружовасць.

— А ў каго яна? — спытаўся Мішка.

— Казалі, у Аўдолі будзе.

Мішка апрануўся і яшчэ доўга сядзеў на лаве пры акне, глядзеў, як заходзіла за чорную хмару сонца — каціласл, нібы вялікае чырвонае кола ў глыбокую ваду. Тонкім скрылікам лёду высока на небе раставаў месяц, і здавалася, з яго вось-вось закапае вада. Сіняваты рэдзенькі змрок церусіўся на зямлю, і ў ім гінулі далёкія грудкі. На балоце за садам завязваўся і гусцеў нерухомы туман, алешнік стаяў у ім, нібы ў паводцы.

Мішка выйшаў на двор. З балота цягнула вільгаццю. На вострую маладую траву нанізвалася раса. Кракталі на балоце жабы. Чмыхаў недзе ў мястэчку паравоз, усё скарэй і скарэй набіраючы разгон. Нудна, як муха, б'ючыся ў шкло, за вёскаю гула машына.

Перабегшы равок, Мішка пайшоў вуліцаю, насцярожваючы вушы, ці не чуваць барабана, але сярод вёскі, якраз там, дзе была Аўдоліна хата, крычалі дзеці — таксама прымета, што ў вёсцы вечарынка. Яшчэ здалёк Мішка ўбачыў жоўтае глыбокае акно — у Аўдолі гарэла электрыка. Мішка прыпыніўся на падворку, заглядваючы ў хату, і ўвайшоў у адчыненыя сені. Стаў на парозе, угінаючы галаву, і паверх хустак — тут з прыходу ў хаце ціснуліся старыя бабы — убачыў: у кутку на лаве стаяла радыёла, на акне горбаю ляжалі пласцінкі. Нехта паставіў польку. Хлопцы пайшлі браць дзяўчат.

І Мішку зрабілся нязвыкла, што вечарынка пад радыёлу, што не сядзіць на лаве ў покуці музыкант, сагнуўшыся, паклаўшы на гармоню рукі, што няма барабана, таго старэнькага барабана з залатанаю з аднаго боку скураю, без аднае талеркі, па якім Мішка барабаніў. Ніхто лепш

за Мішку не ўмеў барабаніць. І калі Мішка прыходзіў на вечарынку пазней, хто-небудзь са старшых хлопцаў, што сядзеў ужо за барабанам, усё роўна клікаў яго — ківаў сабе за плячо галавою: ідзі сюды. І Мішка ішоў. Браў у руку выслізганую цырымбалку, ставіў між ног барабан і біў па тугой скуры, цырымбалка лёгка адскоквала.

Хто-небудзь з хлопцаў, ужо расчырванелы, у шапцы з брылем на патыліцу, п'янаваты, крычаў Мішку:

— Давай, Мішка! Давай!

І, абхапіўшы за плечы дзяўчыну і на міг спыніўшыся, тупаў з усяе моцы нагамі, аж прысядаў, і неяк крывіў набок галаву — слухаў, ці моцна грыміць падлога.

А цяпер было смешна, што соўгаліся маладыя хлопцы, як калекі, перастаўляючы ногі. І была пуставатая хата.

— Німа цяпер маладзёжы. Німа...— Міша пачуў у сябе за плячом голас і азірнуўся: каля яго стаяў Ладак Аўсянік — невысокі, булаваты мужчына. Ён сарамяжліва ўсміхаўся, усё торкаючы рукою і падсоўваючы вышэй на белы лоб пляскатую кепку.

— Во,— якія гэта хлопцы: націна.

Ладак быў самы дужы ў вёсцы чалавек — адзін за тоўсты камель паднімаў дзеравіну, а на вечарынках любіў разбараняць хлопцаў, насіў іх, п'яных, дадому або ўгаворваў у цемнаце каля плота. Але сам ніколі не біўся, быў ціхі і сарамяжлівы, як дзіця ў чужых.

— Раз'ехаліся ўсе, мала хто ў вёсцы астаўся,— Мішка хацеў патрапіць Ладаку.— А некалі сколькі было хлопцаў...

— Дзіва што! — Ладак зноў паторкаў кепку.

Мішку зрабілася шкада сябе, шкада Ладака, таго, што вечарынка без гармоні, што няма ў хаце п'яных, што ніхто не будзе біцца, што Ладаку не будзе каго разбараняць, угаворваць, валачы дадому, што няма тае весялосці, а нейкая туга, бо няма тых дзяўчат, што некалі спявалі — на лаве каля радыёлы сядзелі адныя маладзенькія, з вострымі тварыкамі, і, саромеючыся, паглядалі на Мішку. Толькі на ложку Мішка ўгледзеў Сабіну — састарэлую дзеўку з чырвоным носам. У яе, як і некалі, былі выкладзеныя высокімі

фалдамі жоўтыя кучаравыя валасы. Сабіна трымала на каленях малое год трох, мусіць, братава дзіця. Каля Сабіны сядзела нямая Яніна — яе тонкі вастраваты твар быў чысты і прыгожы, як дзіцячы, толькі нерухомы, скамянелы,— на ім стаілася пакутлівасць і таямніца. П'янаваты з чужое вёскі хлопец з прышпіленай, каб не чаплялася за ланцуг у веласіпедзе, калашыной падышоў да Яніны, пакланіўся, запрашаючы на танец. Тая зачырванелася, адвярнула галаву і замахала абедзвюма рукамі. Хлопец злавіў яе за руку, яна закрычала — гэты крык быў, як крык жураўля восенню, моцны і смутны, і на твары ў нямое застыла хворая пакута. Хлопец адчапіўся.

На другім ложку, што стаяў пры акне, з высокімі, падбітымі падушкамі, сядзеў руды з тонкім носам і падцятымі вострымі губамі Іван Рэдзька, што жыў яшчэ на хутары і рабіў сторажам у мястэчку на пераездзе; праз яго людзі куплялі шыфер на перавалачнай базе, вугаль, старыя шпалы на чыгуначнай станцыі. Рэдзька на гэтым абжыўся, і ў вёсцы яго не любілі. Нехта, пэўна знарок, пусціў пагалоску, што яго жонка Люба качалася ў лубіне з учотчыкам. Раз, напіўшыся, Рэдзька біў сваю маладую жонку качалкаю, і казалі, што звярэдзіў ёй спіну — жонка яго доўга хварэла.

Мішка глядзеў на Рэдзьку і ведаў, што той зараз падыдзе. І праўда, Рэдзька прыжмурыўся, востра цікуючы ў парог, падняўся з ложка і бокам прашыўся між баб.

— Мала, кажу, узяў за хату,— Рэдзька крыкнуў Мішку ў вуха, каб перакрычаць радыёлу — нехта ўключыў яе на ўсю моц.— Лічы, за бясцэнак аддаў.

Ён, відаць, чуў, колькі каштавала Дзедзічу хата.

У Мішкі заварушылася злосць на Рэдзьку, што той усё знае і лезе сляпцом у душу, на самога сябе, што не хватае адвагі паслаць яго к чортавай матары.

— Цяпер так — не ўварвеш...

Рэдзька гаварыў нешта, але Мішка адвярнуўся — падышлі хлопцы. Мішка іх помніў малымі, цяпер яны цвёрда і стала падавалі руку, пыталіся:

— Чаму не гуляеш? Ідзі, бяры каторую ды танцуй.

Выключылася радыёла, пласцінку не мянялі.

Бразгаючы кубкам аб край вядра, маладое дзяўчо, у даўгаватай, пэўна, мацерынай сукенцы, злівала хату.

Мішка выйшаў разам з хлопцамі курыць.

На захадзе чырванеў, завешаны рэдзенькімі хмаркамі, нізкі месяц — збіраўся сесці. Ад зямлі паднімалася, як прытаптаная кудзеля, радкаватая цемната. Дзеці бліскалі ліхтарыкамі туды, дзе хаваліся дзеўкі. Хлопцы пакрыквалі на малых ганарыстым, густым голасам.

Мішку было трохі нязвыкла і смешна, што тыя, каго ён ганяў з папружкаю сам, цяпер ужо пакрыкваюць цвёрдым голасам на другіх, і што ім недзе па дваццаць пяць, і што яны таксама сталыя.

— Можа, пойдзем разам з намі? — Хлопцы ўзялі Мішку пад рукі.— Ідзі пакаштуй нашае цукровае...

— Я тут во з Ладакам Аўсянікам збіраюся,— змахляваў Мішка і, адбіўшыся ад хлопцаў, пайшоў вуліцаю. І яму здалося, што ён, як і некалі, ідзе з вечарынкі дадому. Пад нагамі ў цемнаце шорстка шасцела леташняе перасохлае лісце. Густа, як у пустую бочку, на хутарах брахаў сабака. «Гуд-гуд-гуд...» — тры разы запар дудзеў, сціхаў і зноў дудзеў на нечым гумне ўдод, і Мішку спомнілася, як маці казала, што гэта спявае яўрэйская зязюлька. На балоце кракталі жабы, нібы там паднімалася, шыпела, лопаючыся вялікімі пухірамі, рошчына.

Наткнуўшыся на дрот, Мішка завярнуў у свой падворак. У цёмных вокнах адсвечваў смутны чырвоны месяц. І Мішку зноў падалося, што ён, як і даўней, стаіць сярод падворка і зараз пагрукае ў акно,— у хаце загарыцца агонь, рыпнуць дзверы, і маці спытае з сяней: «Міша, гэта ты?»

Нейкай глухатою і сцішанасцю маўчала хата. Мішка пастаяў, спомнілася яму, калі астатні год маці ўжо недамагала і ён вярнуўся з танкера, зволіўся з работы, каб даглядаць яе. Дзеля весялосці купіў транзістар, круціў яго ад ранку да вечара і незнарок патрапіў на аб'явы: пера-

давалі, што пры сельэлектрабудзе адкрыліся курсы і што туды прымаюць без прапіскі. Мішка тады сказаў маці.

— Што ж ты мецьмеш адзін сядзець,— згадзілася маці, але ў голасе была нейкая туга, не то па ім, не то па сабе.— Едзь ужо, калі хочацца, едзь...

І Мішка паехаў, а праз два месяцы быў на лініі, ставіў апоры, рабіў зазямленні, жыў у вагончыку, а найбольш кватараваў па вёсках.

Аднаго разу Мішка ўбачыў на сваёй полцы тэлеграму: «Памерла мама. Прыязджай. Тоня». Тэлеграму адбіла сястра, што была замужам тут, у вёсцы. Мішка прачытаў першае слова і здранцвеў, у вачах усё завалаклося нейкім туманам. Галаву сціснуў, як абручом, цемны боль. Нешта даўкае, сухое засела ў горле — і Мішка выбег з вагончыка, баючыся, што зараз заплача і ўсе ўбачаць. І Мішка, нават не адпрасіўшыся ў брыгадзіра, паехаў дадому. Ехаў прыгарадным поездам праз Баранавічы — не паспеў узяць білет на аўтобус. А поезд, здаецца, доўга стаяў на кожным паўстанку: Мішка глядзеў на пустыя платформы, прысыпаныя снегам, на чорныя рэйкі, што роўна блішчалі на сонцы, на чалавека з флажкамі ў похве, што вымятаў са стрэлак снег, на заінелыя цыстэрны ў тупіку, на белае поле, на пахіленыя шчыты ўздоўж чыгункі, на чорныя стрымбукі сухога быльніку, што тырчаў па белым снезе на адкосе, на жоўтае ў смузе сонца, на будкі каля пераездаў, на людзей, што тапталіся каля санак — конь перабіраў сена,— было ўсё звыклае на свеце, але Мішка чуў, што ў ім нечага недалягала, як недалягае маленькіх зморшчаных лісцікаў на маладой бярэзінцы ў голую раннюю вясну.

Мішка сядзеў як скамянелы, і яму ўсё не верылася, што маці ўжо нежывая, што яна ляжыць у труне, што ён не ўчуе яе голасу, не ўбачыць, як мільгне за акном яе выцвілая суконная хустка, што пра яе астанецца толькі памяць.

Дома быў Мішка толькі пад вечар. Нанач браўся туман, сіняваты, густы, як завараны крухмал. Капала са стрэх на раскіслы снег, моцна: «Шах-шах...» Здалёк не было відаць хат, а толькі агні ў вокнах, ружавата-сіняватыя, як праз

пару. І не было відаць здалёк людзей, а толькі чутна, што шахкае ў некага пад нагамі раздражджалы снег.

Мішка падышоў пад хату, яшчэ ўсё не верачы, што гэта праўда, што памерла маці, але яшчэ з вуліцы пачуў плач: «А мамачка! А родненькая! На каго ж ты нас пакінула?..» Мішка пазнаў Касін голас, і ў яго перасохла ў горле. Дзверы ў хату былі адчыненыя — там стаялі, сцішыўшыся, кабеты. З сяней Мішка ўбачыў спярша не маці, а свечку, жоўты язычок хіліўся ад скразняку. Маці ляжала ў труне, і твар у яе быў чужы. Са свечкі цёк воск на яе ўжо скурчаныя, нежывыя пальцы. На сцяне нехта завесіў люстэрка кужэльным з доўгімі кутасамі ручніком.

Хавалі маці назаўтра. Дзень быў сонечны, сіняваты ад мурзатага снегу. Ад сырасці пачарнеў плот і камлі ў дрэвах. Набрынялі вадою глыбокія сляды ў зляжалых курганах. У вадзе блішчала сонца і сляпіла вочы. У гародчыках у голым бэзе шчабяталі вераб'і і спускаліся на чорныя лапікі ўжо голае зямлі. Пад нагамі ў кабет шастаў снег — за труною ісці іх сабралася цэлая вёска. У мужчын вецер варушыў сівыя рэдкія валасы.

Мішку доўга помніўся гэты дзень, як хавалі маці, і гэтыя мужчыны з сухімі выбрытымі шчокамі, без шапак. І яму цяпер зноў убачылася, як неслі труну, як вецер варушыў выразанае зубкамі палатно на труне, як перабіраў у мужчын рэдкія сівыя валасы, убачыўся нежывы мацерын твар, складзеныя накрыж рукі і ў іх абразок.

Сыры холад стаў красціся Мішку за плечы. Мішка нагнуў рукою дрот, пераступіў яго і выйшаў на вуліцу. У вокнах чырванеў нізкі смутны месяц. Чорны позні вечар раптоўна будзіў востры дзіцячы крык — дзеці яшчэ таўкліся на вечарынцы. У хатах не было агню — у цёмных падворках шапацела порсткаю палахліваю саломаю сцішанасць. Толькі ў крайняй хаце свяцілася завешанае акно. Мусіць, не спала сестрынае дзіця.

Праз тыдзень кончыўся Мішкаў водпуск, праз тыдзень Самусь Дзедзіч прывёў чужых мужчын у пакамечаных кепках, з наточанымі сякеркамі за папругамі. Мужчыны пахадзілі

кругом хаты, зазначылі вянкі і палезлі на страху. Адзін з іх усеўся на самым чубку, як на кані, развесіўшы ногі, падважваў сякеркаю дранку, адрываў ад латаў і кідаў у гародчык. Дошчачкі падалі на прысадзістую яблыню.

Убіралася ў сілу вясна — цвіў куст агрэсту за плотам. Бабы, не акрыўшыся, з голымі рукамі, насілі на каромыслах ад калодзежа поўныя, як вока, вёдры. Адна з іх спынілася каля хаты, не ставячы на зямлю вёдры, загаварыла да мужчын — тыя зарагаталі на страсе. Яна засаромелася гэтага рогату, апусціла галаву і, гледзячы ў цёмныя, пустыя вокны, сказала сама сабе: «Вот і звяліся Галубцы ў нашай вёсцы...» — і пайшла сагнуўшыся,— вада бліскала ў вёдрах і выплёхвалася на дробную траву.

## Там, на хутары

Недзе з паўдарогі да іх прыбіўся сабака. Да рук ён не ішоў. Дзеці вытраслі яму з кішэняў сухія, перамешаныя разам з пяском, крошкі ад хлеба, ён паднімаў галаву, нюхаў і адбягаўся назад.

Дзяцей было двое. Большы, рабаваты, у вылінялай і зашытай ззаду, каб не звальвалася з галавы, пілотцы, меў год дзесяць, меншы — у кароткіх парточках на адной шлейцы — год шэсць.

Яна — худая, шчуплая грудзьмі, як няспелае дзяўчо,— вяла за вяроўку маладую сытую карову з адным скручаным рогам.

Яны ішлі на ўсход сонца. Белым шляком перад імі ляжала шаша, звужваючыся і прападаючы за глухім паваротам. Белаю ад пылу была трава ў канаве, белаю ад цвету была грэчка — з аднаго боку шашы, з другога — шастала пераспелымі каласамі і, мусі, асыпалася падгарэлае і таксама белаватае жыта; у ім асталіся глыбокія выезджаныя машынамі дарогі — жыта на іх не ўставала.

Белаватым было і выцвілае за дзень неба. Толькі на грудках млеў і здалёк выдаваў сіваватым малады хвойнік.

І зводдаль шашы над шэрым будынкам нечага хутара цямнела гушчынёю зялёнага лісця высокае дрэва.

Да хутара асталося яшчэ якое паўвярсты. Кабета спяшалася туды — смажыла, ёй хацелася піць, а там павінен быць калодзеж, і падаіць карову, і папрасіць хлеба, хоць дзецям,— да малака.

— А чаму ў каровы дзве нагі і яшчэ дзве? — раптам спытаў меншы, босы, як і ўсе яны: яго парэпаныя ногі былі тонкія, як цвікі.

— Бог даў.

— А чаму мне не даў?

Яна маўчала, яна думала пра тое, што блізка фронт, што ўчора з гарадка немцы пачалі вывозіць людзей, усіх начыста, што да дня над гарадком ляцелі нашы самалёты — нізка, як ляцяць з выраю пташкі,— знак, што скора будзе цяпло.

— Ну, чаму? — Хлопчык забег наперад і задраў галаву, каб глянуць ёй у вочы.

— А дзе ж яны ў цябе будуць расці?

Хлопчык змоўк. Ён, мусі, думаў: папраўдзе, дзе яны будуць расці?

Кабета абярнулася — большага нідзе не было відаць. Над шашою віхор круціў белы пыл, у канаве падлятала зжоўклая газета, нібы скакала вялікая жаба.

— Ах, божа, дзе ж ён? — неспадзявана яна аж крыкнула і спалохалася свайго крыку.

— Там, у тлубе...

— У якой трубе? Ну, стой! Чаго ты?..— Карова тузанула разам з вяроўкаю кабету, махнуўшы галавою назад.

— Вунь там,— хлопчык паказаў рукою туды, дзе на павароце абапал шашы бялелі цэментовыя слупкі — каля аднаго, пахіленага, стаяў той самы чорны сабака.

Напаследак яна ўцяміла, што там, пад шашою, на завароце, ёсць труба.

— Толічак, сынок, падбяжы, пакліч,— сказала яна, а ў самое аж схаладзела ў грудзях,— каб хаця не напароўся на што: цяперашнім светам недалёка да бяды.

Пляскаючы босымі нагамі па цвёрдай сцежцы з краю шашы, Толік пабег; вецер задзіраў даўно не стрыжаны яго чубок.

Яна глядзела яму ўслед, вецер слязіў яе зеленаватыя сухія вочы.

Гэтага, меншага, яна знайшла ўлетку сорак першага, як пачалася вайна. Выйшла з хаты палоць гарод і пачула, што за плотам, за кустом цёмнага язміну, нехта ікае. Падумала спярша, што падалося, але разгарнула куст і ўбачыла па другі бок рэдкага частакола яго: ён сядзеў у высокім горкім палыне — мурзаты, з набрынялым тварыкам — і ўжо не плакаў, змогся, толькі ікаў. Яму было тады гадкі тры. Ён прыблукаў сюды недзе з вакзала, адбіўшыся ад маці.

Яна завяла яго ў хату, абмыла спухлы ад плачу тварык і панесла на вакзал, схапіўшы за руку і свайго — баялася пакінуць аднаго дома.

На Мінск яшчэ адыходзіў астатні цягнік: за ім беглі, як звар'яцелыя, людзі, з тамбура, дзе начаплялася бог ведае колькі, нехта ўпаў і ўжо не падняўся, ляжаў на рэйках, бытта мяшок; на пероне заенчыла, абхапіўшы рукамі пукаты жывот, цяжарная маладзіца, яе падхапілі пад пахі і павялі ў вакзал.

Толікавай маці яна так і не знайшла. Паказала яго нават парадзісе — тая ляжала на шырокай лаве ў пустой пачакальні, ззелянелая ў твары, заплюшчыўшы вочы, губы ў яе запякліся, на карычняватым ілбе дробнаю расою выступіў пот. Старэнькая кабета трымала ўкручанае ў нейкія наспех парваныя анучы дзіця. Маладзіца расплюшчыла выцвілыя, невідушчыя вочы і заенчыла: «Ах, дзіцятка маё!» У яе была гарачка. Толік заплакаў, ад страху, вырабляючыся з рук.

З дзецьмі яна вярнулася дахаты. Назаўтра раненька, яшчэ толькі паказвала на дзень, у гарадок прыйшлі немцы. Толік застаўся ў яе.

Вяроўку зноў тузанула карова — над ёй віўся, як прывязаны за нітку, авадзень.

— Ну, стой! Чаго ты? — Кабета глядзела ўсё туды, на заваротак. Дзеці ўжо беглі назад: большы каціў перад

сабою скат — знайшоў, пэўна, у трубе. Скат падскокваў на ямках — шашы ніхто не раўняў і не правіў усю вайну. Высалапіўшы язык, канаваю за дзецьмі бег сабака. Тонкі азадак яго заносіла ўбок.

— Нашто гэта табе? — сказала яна большаму, калі ён падкаціў да яе стары ўжо, з'езджаны аж да белых нітак, скат.— Крый бог — міна!

— Якая міна... Апона ад самахода,— сказаў большы і пусціў з шашы скат: той пераскочыў канаву, зрабіўшы круг, упаў у грэчку: яна там яшчэ доўга варушылася.

— Ой, няма ў цябе яшчэ розуму,— сказала кабета хлопцу і ляпнула рукою па цёплай каровінай спіне — карова нехаця пайшла: было чуваць, як шэркаў у яе на жываце скарэлы пляйстрамі гной.

На шашу густа цягнуўся, як мёд за лыжкаю, пах цёплае грэчкі. Шчабяталі, перагаворваліся між сабою і садзіліся на тэлефонны дрот жаўтадзюбыя маладыя ластаўкі. У жыце гулі тэлефонныя слупы, як нечыя натруджаныя ногі. І нерухома ляжала белая і бясконцая шаша.

У канаве шарэла выгаралая на сонцы адзежа — здалёк выдавала, як хто ляжаў забіты.

— А во — нехта ляжыць! Можа, абыдзем? — сказала яна дзецям, заварочваючы ў грэчку карову. Яна цяпер баялася, што ізноў натрапіла на нябожчыка: каля гарадка раніцаю яна бачыла забітага хлопца, яшчэ саўсім маладога, год сямнаццаці — ён ляжаў у зеленаватым аўсе, раскінуўшы рукі, вышчарыўшы сцятыя белыя зубы — пэўна, канаў у муцы, бо моцна выкачаў каля сябе добры лапік аўса.

Яна зірнула на яго і аж здранцвела ад страху. А потым пачало ўсё думацца, што, можа, і яе муж ляжыць дзе вось гэтак забіты. Яго забралі перад самай вайною недзе пад Беласток.

— Гэта ж адзежа,— сказаў меншы, што бег паперадзе.

Падышоўшы бліжэй, яна ўбачыла старую, у касмылях зжоўклае ваты (як яе ўсё роўна павыскубалі сабакі) фуфайку.

— Дзякуй богу, што не чалавек.— Маладзіца выцерла локцем змакрэлы лоб і скіравала да хутара — туды

адлучылася ад шашы і пабегла наўскос праз жыта сцежка з глыбокімі выезджанымі каляінамі; на высокіх калівах мятліцы пааставалася рудаватая каламазь. Нехта ўжо зажынаў жыта: на рагу вузкага загона быў выкладзены з дзвюх жменяў і прысыпаны зямлёю крыж. З сырога мэндля куры здзёўбвалі нізкія каласы.

У браме стаяла, закрываючыся рукою ад сонца, гаспадыня, старая кабета з нейкаю выцвілаю анучаю на галаве — некалі, мусі, была суконная хустка.

На жардзяным плоце вяў пусты гарбузовы цвет.

— Дзень добры! — павіталася маладзіца і папусціла вяроўку — карова нагнулася да пераспелае, з рудаватымі галоўкамі дзяцеліны.

Старая адняла ад вачэй руку,— твар яе быў зрысаваны маршчынамі, каля ніжняй губы на барадаўцы закручваўся сівы волас,— і нічога не сказала.

— Ці можна ў вас напіцца? — спытала маладзіца, угледаючыся на падворак — там быў калодзеж: на накрыўцы стаяла бляшанае са шрубаю на вочапе вядро, прывязанае да корбы тэлефонным дротам.

Гаспадыня павярнула галаву, настаўляючы вуха, і напаследак азвалася:

— Дзеткі, а чаму ж не...— голас у яе быў шурпаты. Яна адчыніла брамку і пайшла пад хату. З-пад доўгае спадніцы мільгалі яе жоўта-зялёныя пяты.

— То чэрпайце, а я хіба конаўку прынясу,— сказала старая, адмыкаючы дзверы.

Карова чмыхнула, закруціла галавою і, вырваўшы з рук у маладзіцы вяроўку, пабегла да калодзежа. За пысаю ў яе цягнулася сліна, на дне карыта, што стаяла каля калодзежа, зеляпеў астатак цёплае вады.

Карова ткнулася пысаю ў карыта, і па горле ў яе пабеглі круглыя камякі.

— Ой, якая ты нецярплівая! — Маладзіца адкрыла накрыўку і пусціла ў халодную цемень вядро: мільгаючы выслізганаю жалезнаю ручкаю, загрукацела корба.

Маладзіца выкруціла вядро і паставіла на край трубы: у калодзеж, разліваючыся, пляскалася з халодным звонам вада. Маладзіца нагнулася і, трымаючы абедзвюма рукамі вядро, злавіла сухімі губамі яго халодны край. Вада цвёрдым холадам апякала грудзі. Смага счахла, толькі вострым болем шчымелі зубы.

Пад рукі прашыўся меншы.

— Хаця ж не давайце яму — прастудзіцца,— крычала з адчыненых сенцаў старая, трымаючы ў руцэ медную, пэўна, вытачаную са снараднае гільзы, конаўку: несла меншаму з хаты ваду.

Каля брамы стаяў і глядзеў сюды на іх чорны аблавухі сабака; страпянуўшыся, ляскаў зубамі — лавіў мух.

Большы піў з вядра. Карова, падняўшы галаву, заглядвала прагным вокам у калодзеж — тае вады, што была ў карыце, ёй не хапіла.

— А ці ж здалёк будзеце? — Старая выплюхнула з конаўкі недапітую меншым ваду.

— З горада я.

— А куды ж ідзяце?

— Да сястры ў Ахоны іду.

— Ой, не блізка шчэ! Па-старому — вёрст пятнаццаць ад нас.

— Ужо блізка. Ужо менш асталося.— Маладзіца выліла ў карыта ваду і паставіла на калодзежную накрыўку парожняе вядро.

Карова піла з карыта, трэпаючы ад злосці нагою — ганяла ад сябе мух і слепакоў.

Дзеці круціліся каля гародчыка: на камлі нізкай ужо абабранай вішні чырванаватай нарасцю кіпела цягучая смала.

— А во — жвачка,— крычаў меншы, чапляючыся на сухі патрэсканы частакол.

— Няма, дзеткі, вішань, няма. Надоечы немцы абабралі, панеслі і з галлём,— старая абярнулася да маладзіцы.— Хватаюць усё, як перад канцом. А ўчора, божа, колькі іх тутака шашою ехала!

— Уцякаюць, цётка. Фронт блізка. Скора прыйдуць нашыя.

— Дай божа, каб скончылася ўсё... Гэтулькі людзей пагінула.— Вочы ў старое заморгалі, наліваючыся слязьмі, і губы пачалі крывіцца.— Толькі мяне вот смерць не бярэ...

Старая адвярнулася і, выціраючыся рогам хусткі, сказала:

— Але чаго ж тут стаімо? Я шчаўя наварыла, можа, паснедалі б? Вы ж, напэўна, галодныя. Дый карову даіць пара, во гляньце — выменя налілося...

У хаце пахла чэрствым хлебам, даўняю духатою; роем звінелі мухі, біліся ў гарачыя шыбы. На прадпечным акне стаяла шкляная мухалоўка. На покуці за абразом сохла жменя зажатага жыта.

Той акрайчык, што мела з сабою, маладзіца раздзяліла дзецям яшчэ раніцою, як выходзілі з горада. Яны з'елі яго сухама, хоць яна казала, што падоіць карову і з малаком будзе дужэй.

Хлеб, мусіць, ляжаў на стале, накрыты ручніком — адтуль ішоў кіславата-зманлівы пах. Маладзіца ажно пракаўтнула слінку. Яна не ела з учарашняга дня. У горадзе быў голад: людзі яшчэ з вясны разбягаліся па вёсках, беручы з сабою ўсё лепшае з адзежы, каб выменяць на харчы. Яе ж ратавала карова — у тодаўцаў за літр малака можна было купіць хлеба ці канцэнтратаў. Але ўчора яны прыходзілі па карову, балазе тая была ў полі. Яна спалохалася, што карову ўсё роўна забяруць, і сёння раніцаю ўцякла з гарадка. Яна змахлявала старой, што ідзе да сястры,— саромелася сказаць, што жабруе.

— А муж дзе? — спытала старая, беручы з памялешніка вілачнік і падважваючы нешта ў печы.

— На вайне. Як забралі ў трыццаць дзявятым пад Беласток, дык нічога і не чуваць.

На прыпеку дзынкнула скаварада — запахла кіслым шчаўем.

— А мой яшчэ перад вайною памёр...— Гаспадыня дастала з-пад прыпека гліняную міску і падзьмухала ў яе.— А на мяне паслаў Бог кару...— Яна наліла ў міску шчаўя

і паставіла яе на стол, адкінуўшы абрус: пад ім ляжаў акрайчык хлеба з картоплямі — у мякішы былі відаць жаўтаватыя крышаны.

— Садзецеся, чаго ж вы...— Гаспадыня яшчэ вярнулася да прыпека і прынесла счарнелыя, драўляныя лыжкі і ножзломак без аднае тронкі.

Дзеці пачалі тузацца між сабою, перабіраючы лыжкі.

— І нікагутка ў вас болей няма? — Маладзіца прысела на лаву з краю стала.

— Ёсцека сын меншы,— гаспадыня ўздыхнула, азіраючыся, дзе гэта ёй сесці.— Двое было... Старэйшы не вярнуўся з фінскае, а гэты, грэх і казаць, у паліцыянты пайшоў. Можа, і за яго Бог карае. А вы ешча, ешча...— Яна прымасцілася на край ложка, адкінула падушку і падняла ванзэлак — паркалёвую з чырвонымі кветачкамі хустку.— На смерць хаваю...

Дзеці сёрбалі шчаўе, разліваючы з лыжак на стол — ад міскі цягнулася наплюханая дарога.

— А чаго ж вы мала ясце? Я падалью...— Гаспадыня паклала пад падушку клунак і паднялася з ложка.

— Досіць, досіць! Я і так не ведаю, як дзякаваць вам.

— То хоць дзяцей кармеце. Карову я падаю сваю і вашу.— Яна нагнулася пад прыпек, мусіць, шукаючы там даёнку, але раптам спомніла, што тая сохла недзе на двары.— Шукаю, а яна на плоце.— Старая ўзялася за клямку і ўжо сказала пра дзяцей: — Нябось, цяжка іх гадаваць... А павырастаюць... Праўду кажуць: малыя дзеці — малы клопат. А мой... Чаго яго пагнала ў гэтую паліцыю? Цяпер усё з нейкім злыднем прыязджае. А той да нашае маладзіцы прыстае. Некаторага дня напіўся і мужыка хацеў застрэліць. Гэта во, каб спала з ім пры мужыку.— Яна моўчкі пастаяла каля дзвярэй, думаючы пра нешта, і ціхенька выйшла з хаты.

Маладзіца азірнулася ў акно: за жытам на грудку ўставала белаватая хмарка, яна ўсё расцягвалася, і раптам, бліснуўшы вокнамі, паказалася тупаносая нямецкая машына. Пыл разбэрсанымі клубкамі каціўся назад — клубкі распаўзаліся, растаючы над жытам.

Маладзіца прыціснулася лбом да шкла.

Перад паваротам на хутар машына сцішыла ход і, як нешта жывое, страшнае, абнюхала сцежку і скіравала на яе.

Старая, засопшыся, з пустою даёнкаю вярнулася ў хату:

— Едуць сюды, няхай крые бог, немцы.

Дзеці кінуліся да акна. Каля брамы машына загула з перабоямі — у хаце задрыжалі сцены.

— Гэта ж не немцы, а бобікі,— сказаў большы, стоячы з каленьмі на лаве.

— Ціха ты! — штурханула яго маладзіца.

З машыны выскачыў сухарлявы, з кароценькімі натапыранымі валасамі паліцыянт — пілотка ў яго была засунута за рэмень — і адчыніў браму. Машына тузанулася і паехала на падворак, чмыхнула чорным дымам і стала ля калодзежа.

— Ах, божа, ці не Іван прыехаў! — жмурачыся, старая ўцікоўвалася ў акно.

З кабіны вылез яшчэ адзін — дзябёлы, чарнамазы.

Рот у маладзіцы раскрыўся, і твар застыў не то ад дзіва, не то ад страху. Няўжо гэта ён, яе муж? Маладзіца ўсё гэтак пільна глядзела на чарнамазага. Як ён змяніўся за тры гады — пастарэў, асунуўся, і яму саўсім не ідзе пілотка: у яго робіцца надта доўгім нос.

— Гляньце, гэта во той, што мужыка хацеў застрэліць,— скоранька зашаптала старая.

Маладзіца тарганулася на лаве і адсунулася ад акна:

— Няўжо ён?..

— Ці ж я, дзеткі, не ведаю.

Маладзіца як сама не свая паднялася з лавы, але ўчула, што слабеюць ногі і ўсё халадзее і дрыжыць у грудзях, і села. Няўжо гэта праўда? Няўжо ён служыць у паліцыі і страляе людзей?.. Няўжо праўда? Няўжо яна не здурэла?.. Яна заплюшчыла вочы і ўчула, як цяжкая гарачыня з шумам хлынула ў галаву. І ёй убачылася, як усе яны, у чорным, гналі пазаўчора людзей, гналі ў тыя вялікія ямы за вакзалам, дзе некалі капалі гліну... Яна якраз выйшла з хаты,— толькі зашарэла на дзень,— і, можа, з гадзіну прастаяла, стаіўшыся за плотам; у ямах пачалі глухавата, без ляску,

усё роўна як пад зямлёю, страляць, а потым нехта нема крычаў — і яна не вытрымала гэтага енку, уцякла ў хату.

Маладзіца зноў сабралася ўстаць з лавы: але нейкая здранцвеласць і слабасць навалiлiся на яе. Божа, як ён трапіў у паліцыю? Чаму ніколі не паказваўся дадому? Няўжо праўда, што ён прыстае да кабеты?.. Няўжо ён такі гадкі?.. Яму наўме другія, а яна, дурная, чакала яго дадому...

Першым у хату ўвайшоў сухарлявы — аглядаючы маладзіцу і дзяцей, паставіў на стол бутэльку, за горлачка выцягнуў з кішэні другую. Услед за ім, прыціскаючы да жывата кансервы, усунуўся чарнамазы і раптам прыстакнуў каля парога, сумеўшыся,— бляшанка кансерваў грукнулася на падлогу і пакацілася пад лаву.

— А ты чаго тут? — ён насупіўся і ледзьве пашавяліў губамі.

— Таго, чаго і ты.— Маладзіца глядзела недзе сабе пад ногі і не падняла галавы.

Ён хмыкнуў, крыва ўсміхнуўшыся, нагнуўся, каб падняць бляшанку кансерваў, і сказаў сухарляваму:

— Гэта ж во — мая жонка.

— Можа, і дзеці твае? — зарагатаў сухарлявы.

— Клопат вам — дзеці.— Старая падышла да стала і зграбла ў далонь крошкі.

— Тваё дзела — старана. Не кукуй! — Сухарлявы пакасіўся на маці і паставіў на стол другую бутэльку.

— Я ўжо адкукавала сваё... Пара і свой розум нажыць.— Старая тыцнулася да дзвярэй, але вярнулася, узяла даёнку і выйшла з хаты.

— Цётачка, я сама падаю,— маладзіца паднялася з лавы.

— А ты куды? — Чарнамазы вылажыў кансервы на стол і заступіў ёй дарогу.— І расказаць не хочаш, як жыла?..

— А хіба цябе абыходзіць,— маладзіца ўчула, што ў яе знайшлася сіла, мусіць, ад злосці.

— Во і сын, відаць, забыўся, што ў яго бацька ёсць? — Ён паверх яе галавы глядзеў на дзяцей.— А гэта чый яшчэ?

— Мой.

— Як?

— Знайшла.

— Можа, дзе якога жыдка?

— А табе што?

— Можа, прыйдзецца ўцякаць — нашто чужое дзіця...

Дзеці, стаіўшыся, глядзелі на яго, большы зыркаў спадылба і хаваў вочы — саромеўся: пэўна, пазнаваў бацьку.

— Куды і нашто мне ўцякаць? — спытала яна і падняла галаву: вочы ў яго былі чырванаватыя і асалавелыя, твар нездароўчы, азызлаваты. «Ён тут п'е, прыстае да другіх... І, можа, сёння ехаў да тае...» — падумалася ёй.

— А ты думаеш, мне даруюць? — Ад яго пахла едкім, усё роўна як авечым, потам і перагарам.

— Калі вінаваты, то не,— яна адвярнула ад яго галаву.

— Я ў пляну быў... Ды нават за тое, што я ў гэтай форме.

— Відаць, як цябе трымаюць, што нават дадому не прыходзіш...

— Не хацеў паказвацца.

— Вядома: тут можна вытвараць, што хочаш. Балазе чужыя людзі, не ведаюць...

— А ты хацела б, каб я жывы не астаўся?

— Вып'ем, га,— сухарлявы трымаў медную конаўку, разліваючы сабе на пальцы самагон.— Вып'ем, і ўсё праясніцца, як божы дзень.

— Садзіся за стол.— Чарнявы ўзяў яе за руку вышэй локця.

— Адчапіся! — Яна вырвала сваю руку.

Чарнявы выпіў і, хукаючы ў далонь, сказаў:

— Налі ёй.

— Я не хачу.

Сухарлявы наліў яшчэ конаўку. Яна адвярнулася. Чарнявы выпіў і не скрывіўся. І асалавеў — неяк скора: вочы ў яго наліліся каламутнасцю і заблішчалі. Ён абняў яе за плечы — ад яго зноў нясло гарэлкаю і нейкім едкім потам.

— Адыдзі, не чапіся! — Яна выкруцілася з яго рук.— Схадзі да тае вунь, што мужыка хацеў застрэліць.

— Туды далекавата. Сёння ты бліжэй,— ён зноў схапіў яе за руку.

7. Зак. 1877

— Не приставай! — Яна хацела вырваць руку, але не здужала.

— Ты глядзі, не падступіцца...— Твар у яго наліўся крывёю.— Вунь колькі байструкоў... А ты думаеш, я не ведаў? Ведаў, таму і не прыйшоў.

Яна ўспомніла, як аднаго разу стараста прывёў нанач нейкага валацугу. Намякаў сам: «Як жа ты адна, маладая, без мужыка? Нябось, збедавалася...» Яна тады плюнула яму ў твар. А потым ён прывёў валацугу. Той і прысунуўся на ложак, як толькі задрамалі дзеці. Але яна не спала — схапілася з пасцелі, трымаючы нагатове сякеру (паклала яе пад падушку, бо як чула, што, пэўна, спатрэбіцца). І ён адступіўся, вярнуўся на лаву, дзе ляжаў, і раптам захроп; прыкінуўся, што спіць, быдта нічога і не было. А раніцою гаварыў, што спаў як забіты, і дзякаваў усё...

Можа, і гэты таксама соваўся да другіх...

— Поскудзь ты! — сказала яна ўголас і пхнула яго ў грудзі.

Ён пахіснуўся, але ўстояў на нагах:

— Ну-ну, не давай волю рукам!

— А мамачка! — закрычаў меншы, ссоўваючыся з лавы.

Большы сядзеў, адвярнуўшыся, і румзаў.

— Ды што ж тут робіцца!..— Старая ўбегла ў хату, не зачыніўшы за сабою дзвярэй і выплюхваючы з даёнкі малако.

— Тваё дзела — старана! — крыкнуў сухарлявы, выціраючы рукавом губы — гарэлка блішчэла ў яго на барадзе.— Гэта — яго жонка.

— Пабойцеся Бога, што вы робіце, ды пры дзецях шчэ! — Яна схапіла чарнамазага за плячо.

Ён варухнуў плячом і скінуў яе руку.

— Не лезь! — ужо раз'юшыўшыся, крыкнуў бялявы і пхнуў, адстараняючы ўбок, маці: тая спатыкнулася, махнуўшы даёнкаю — на падлогу плюхнула і зашумела малако.

Чарнамазы схапіў маладзіцу пад пахі, адарваў ад падлогі і, чырванеючы, наліваючыся крывёю, пхнуў у сені. Яна яшчэ ўбачыла, як, пакаўзнуўшыся ў лужыне малака, упала старая, як з немым крыкам кінуліся да парога дзеці, як сухарлявы, пераняўшы іх, зачыняў дзверы.

— Не чапай! Поскудзь ты! — крыкнула яна ўжо яму, мужу, у сенях.

— То во — адгулялася. Цвёрдзенькая...— Ён засопся і выпусціў яе з рук.

— Не падыходзь! — сказала яна, схапіўшы капач, што стаяў якраз пры вушаку.

— Кінь, гавару.— Ён расставіў рукі, каб зноў злавіць яе.

— Не падыходзь! Дальбог, засяку! — Яна збялела, мяняючыся з твару, і выскачыла з сяней.

Ён выбег за ёю, задыхаючыся і расстаўляючы рукі, каб злавіць яе. З надворка яна скіравала на сцежку, ужо адчуваючы, што нейкая спакуса пад'юшчвае яе абярнуцца і секануць яму капачом па твары.

— Не лезь да мяне! А то праўда — засяку! — сказала яна не яму, а сабе, баючыся ўжо, што зробіць гэта.

Ён зарагатаў недзе блізка за спіною, і ад яго запахла гарэлкаю і нейкім едкім, як авечым, потам.

Яна абярнулася і ўбачыла яго застылы твар, яго каламутныя, налітыя крывёю вочы, і ёй зрабілася брыдка, што яна любіла яго, сніла і ўсё чакала дадому.

— Не чапіся! А то, дальбог, саграшу...— Яна спынілася і раптам спалохалася, што не ўтрывае, не саўладае з сабою і секане яму па гэтым азызлым твары — хай будзе, што будзе.

— Тут жа ўсё відаць... Ідзі туды, во... у жыта,— зашаптаў ён, забягаючы наперад.

«Ой, які ён гадкі! Ды яшчэ... у гэтай пілотцы!..» — падумала яна, адступаючыся. Але ён дагнаў яе, схапіў за плечы і, сцяўшы зубы і наліваючыся ў вачах крывёю, кінуў ніцма на зямлю.

— Пусці, злыдух! — застагнала яна, выкручваючыся з-пад яго, блытаючыся ў жыце і ўсё не выпускаючы капача.

— Нікуды не дзенешся!..— Ён аж захроп ад злосці, злавіўшы яе за руку, сціснуўшы, як жалезам, і сілком цягнучы да сябе.

— Пусці! — крыкнула яна, стаўшы на калені і паднімаючы капач.

Ён поўз да яе, угнуўшы галаву, засланяючыся рукою. Яна размахнулася, на нейкі міг падумаўшы: «Божа, што я раблю?», але салодкая, злая сіла павяла яе руку,— яна аж заплюшчыла вочы, пачуўшы трэск, гэтакі самы, як трашчыць бручка, калі секануць па ёй чым вострым.

Ён ціха і мякка, што мяшок, ткнуўся тварам у зямлю.

Яна падхапілася і выбегла з жыта. Каля брамы азірнулася: з жыта былі відаць толькі ногі.

Яна ўскочыла ў надворак. Каля плота ляжала карова, цяжка ўздыхаючы і жуючы жуйку. Сабака драмаў у цяньку каля бязносае нямецкае машыны. Яна паглядзела на гэтую доўгую чорную машыну, і яе ахапіў страх. Подбегам яна прайшла падворак і ўскочыла ў хату.

Паліцыянт, звесіўшы руку, спаў на ложку,— у ботах, но разутыя яго ногі ляжалі на біле. Перад покуцем, перад счарнелым абразом, дзе сохла жменя зажатага жыта, жагналася старая: «От вшэго злэго выбаў нас, пане! Од гжэху каждэго, од гневу твэго!..» Дзеці, натапыраныя, сцішаныя, глядзелі на яе. У большага на шчацэ блішчала, не засохшы яшчэ, буйная, што гарошына, сляза.

— Ідзём, дзеткі. Ідзём...— маладзіца схапіла меншага за руку.

На ложку захроп і перавярнуўся на другі бок сухарлявы паліцыянт, ногі яго з'ехалі з біла на радзюжку.

Старая азірнулася:

— А куды ж вы? — і, адставіўшы назад рукі, сагнуўшыся, нібы несла на сабе цяжар, пасунулася ўслед за маладзіцаю з хаты.

— Я забіла яго,— сказала маладзіца, адкручваючы з рог у каровы вяроўку. Рукі яе яшчэ ўсё дрыжалі.

— Няхай крые бог...— старая спатыкнулася і пляснула рукамі.— Няўжо?

— Вунь, на сцежцы,— сказала маладзіца, не гледзячы ў той бок і тузаючы вяроўкаю карову.

Старая задзірала галаву, жмурачы ад сонца адно вока і крывячы рот, і раптам жахнулася:

— Вой, дальбог, праўда!

Маладзіца вывела карову з надворка і, б'ючы яе рукою па шыі, завярнула ў жыта, каб абысці паліцыянта. Карова чмыхала, круціла галавою, хватаючы каласы. Дзеці беглі следам, бэрсаліся ў жыце, разводзячы яго рукамі — ім у твар секлі зярняты, што пырскалі з сухіх каласоў. Яны так і не бачылі, хто ляжаў на сцежцы.

— Ах, божачка, уцякайце! Сцеражыцеся хаця...— скрыжаваўшы худыя, скарчанелыя рукі, старая ўсё прыціскала іх да грудзей.— Яны ж цяпер нікога не пашкадуюць,— і яна падступалася туды, дзе ляжаў паліцыянт.— Ах, божачка, божачка! Можа, ён яшчэ жывы?..

Маладзіца вывела карову з жыта і азірнулася на хутар — за жытам, на сцежцы, было відаць, яшчэ ўсё стаяла старая,— і ёй пачало здавацца, што яна як і не заходзіла сюды, не стрэла мужа, п'янага, у гэтай паліцэйскай пілотцы, разбэшчанага, што дайшоў бог ведае да чаго, не было нічога: ні гэтага крыку дзяцей, ні капача, ні гэтага трэску, як трашчыць сырая бручка... А той муж, якога яна ўсё бачыла перад вачыма ўсе гэтыя тры гады, той, якога яна любіла і дзень пры дні чакала дадому, недзе жыве далёка ад яе, што ён гэтакі, як і ўсе людзі, і што яна думацьме пра яго і, пэўна, любіцьме.

— А дзе наш бацька? — спытаў меншы, забегшы наперад і задраўшы галаву, каб глянуць ёй у вочы.

— Там, на хутары...— сказаў большы.

— Дзеткі, наш бацька на вайне, на фронце,— сказала яна, і яе сухія, зеленаватыя вочы набеглі слязьмі.

— А я думаў...— і большы пасаромеўся сказаць, што ён думаў.

Яны зноў ішлі на ўсход сонца. Разасланым палатном перад імі ляжала шаша, звужваючыся і прападаючы за глухім паваротам. Неба там было ліловае, як акаліна на астылым жалезе: дзень хіліўся да вечара.

І за імі бег, невядома адкуль узяўшыся, той самы худы валачашчы сабака.

## Урок арыфметыкі

Празрысты верасень. Ранняя восень... Мне ўспамінаецца дарога з нашае вёскі ў мястэчка: зялёнае, крышку ліловае, яшчэ нядужае жыта на ўзгорках, маладыя сасняки за жытам, сыры пах скошанае атавы аднекуль з блізкіх балот, белыя хаты з краю мястэчка, чыгуначны пераезд, раптоўны свісток сцэпшчыка і цяжкае лязганне вагонаў каля станцыйных складоў, гоман людзей, што стаяць за хлебам, каля орсаўскага магазіна. І нарэшце школа: яе цынкавы дах праз рэдкія сосны здалёк блішчыць светлым нерухомым азярцом.

І мой пяты клас, што супаў з апошнім годам вайны.

...Кожнае раніцы, перад першым урокам, уся школа выстройвалася ў калідоры, і вучань з дзясятага класа, лысы і, мне здавалася, гэтакі самы стары, як усе настаўнікі, чытаў нам зводкі Саўінфармбюро. І я ўяўляў, як нашы салдаты лёгка бяруць гэтыя белыя з чырвонымі чарапічнымі дахамі нямецкія гарады, якія бачыў я на паштовых картках, што прысылаў недзе з фронту з Германіі да мае мамы яе брат — мой дзядзька.

Мне думалася, што вайна была неразборліваю і страшэнна цяжкаю толькі ў нас. Наша школа пахла лякарствам, і ля плота валяліся доўгія бінты, парудзелыя ад крыві,— казалі, што ў нашай школе размяшчаўся медсанбат,— і скрозь па ямах у смецці ржавелі пустыя кулямётныя ленты, падобныя на хрыбты нейкіх страшэнных вужакаў.

За школаю едкім, удушлівым гарам пахла свежае пажарышча, і ў тонкай сасне маладою цягучаю смалою заплываў незаржавелы асколак ад бомбы.

Напамінак пра вайну прыносілі ў нашу школу і настаўнікі: на іх было ўсё вайсковае — кірзавыя боты, зялёныя не перашытыя яшчэ галіфэ, кіцелі з петлямі ад нядаўніх пагонаў.

У фізрука на галаве тонкаю маладою скуркаю дыхала глыбокая рана. Ён расказваў нам, як хадзіў у тыл да немцаў браць «языка». Пра рану ў яго мы чамусьці не пыталіся.

Ды з мужчын, што выкладалі ў нашым класе, было ўсяго два: гэты самы фізрук — худы, высокі, адзеты ва ўсё ста-

рое, падношанае, у чаравіках з падранымі і сашчэпленымі медным дротам насамі, і дырэктар школы: казалі, татарын, нізкі, пругкі ў нагах, круты плячыма. Касаватыя вочкі яго млява блішчалі, калі ён уваходзіў у клас, туга падперазаны шырокаю папругаю паверх гімнасцёркі і накінуўшы наапашкі доўгі шынель. І калі ён зачыняў дзверы, шынель з яго падаў. Ён паднімаў шынель, кідаў яго на парту і садзіўся на парту сам, ставячы адну нагу на сядзенне.

Дырэктара мы не баяліся: адказвалі ўрок гісторыі заўсёды з месца і нават чыталі слова ў слова з падручніка, што ляжаў за спіною ў папярэдняга вучня, а пераростак Капейка з апошняе парты праз жалезную ручку страляў у нашыя патыліцы размоклым у роце хлебам.

Настаўніцы былі найбольш пажылыя. Яны туга закручвалі вакол шыяў цёплыя хусткі, як нашы мацяркі, і, як нашы мацяркі, насілі гэткія самыя прыпаленыя на галянішчах валёнкі. Толькі адна Часлава Карлаўна — маладзейшая за ўсіх, далікатная з твару, з прыгожым, дзіўным для мяне прозвішчам — Вератынская — прыходзіла ў школу кожны дзень па-новаму і хораша адзетая. Ласкава з намі віталася, нязвыкла кіўнуўшы галавою, лёгка і сцішна ўсміхнуўшыся куточкам вільготнага, як у дзіцяці, рота,— шчодрагустыя яе валасы свежа рассыпаліся, мякка адсвечваючы залацістай чырванню, і на вушах мігатліва калыхаліся цяжкія завушніцы.

У класе наставала цішыня, толькі за вокнамі тамліва шумелі і роўна пахістваліся блізкія сосны, і на апошняй парце, змарыўшыся за доўгі перапынак, густа адсопваўся Капейка.

Часлава Карлаўна бязгучна адстаўляла крэсла далей ад стала, абедзвюма рукамі туга прыгладжваючы каля ног спаднічку, садзілася, раскрывала журнал, правярала, ці ўсе ў класе, і ішла між партаў, праглядала нашыя сшыткі,— а выкладала яна арыфметыку,— коратка прыпыніўшыся каля кожнага з нас: на нашыя твары ад яе ружовага світара падала агністае святло, і мы на нейкі час дзіўна і нечакана радасна харашэлі.

А я кожны раз з нейкай шчымлівай затоенасцю чакаў гэтага агністага непякучага святла, ледзь улоўнага хмельна-прыемнага паху духоў, раптоўнай яе блізкасці, калі яна нагіналася нада мною, лёгка абапёршыся выразна белаю рукою аб маю парту, яе шчырага нямоцнага голасу, калі яна пра што-небудзь пыталася.

І кожны раз я ішоў за ёю назіркам, калі яна вярталася са школы, вярталася з сынам, крышку большым за мяне, што вучыўся ў сёмым класе і быў з твару гэтакі самы, як яна, і гэтак мякка хаваў пад густымі вейкамі свае вочы.

Я ішоў з адчуваннем свае незразумелае адзіноты, наіўнага шкадавання, што ў мяне не гэтакая прыгожая маладая мама, і, мусіць, не гэтакі прыгожы я сам, і не гэтак хораша адзеты, як сын Чаславы Карлаўны, і не маю гэтакае самае скуранное вайсковай сумкі, як мае ён, і столькі грошай, бо дае таму вусатаму салдату ў заячай шапцы, што вартуе за школаю склад, аж тры рублі, каб дазволіў стрэліць са свае вінтоўкі.

Дома мне мроілася школа, Часлава Карлаўна. З тамлівай радасцю я чакаў урока арыфметыкі, а калі ён прыходзіў, я сядзеў сцішаны ў сваіх думках, з нейкай патаемнаю асцярогаю ўглядаўся ў Чаславу Карлаўну. А яна стаяла ля дошкі, зрэдку адкідваючы з грудзей на шыю нячутна лёгкі шалік, спрытная, свабодная ў паставе. І мне думалася пра нязнаны празрысты свет, пра вялікі горад, куды я паеду, як вырасту, у той горад, дзе ўсе прыгожыя людзі, дзе ўсе хораша адзяюцца, смачна ядуць — булку з маслам,— як Кіра Фахрушава, што прыехала ў нашую школу недзе з Масквы. Вярнуся сюды хораша адзеты і нават з залатым зубам, як дырэктар школы, і мне падасць руку Часлава Карлаўна, як падае яна дырэктару школы, і загадкава засмяецца, як смяецца з ім, злёгку закідваючы назад галаву.

— Слухай, што я тлумачу,— сказала аднойчы Часлава Карлаўна,— і глядзі на дошку.

Я адчуў, як у мяне загарэліся шчокі. Мне здалося, што пра мае думкі ведае Часлава Карлаўна і ўсе вучні.

Зазваніў званок. Гэта званіў наш маўклівы вартаўнік, што заўсёды хадзіў, адкапыліўшы ніжнюю цяжкую губу, і знянацку біў нас памялом. Мы ўцякалі і толькі тады нарэшце прыгадвалі, што гэта за ўчарашняе выбітае акно.

Часлава Карлаўна ўзяла пад паху журнал і пайшла з класа: яе цяжкія завушніцы павольна калыхаліся. За ёю наперабой пацягнуліся дзеці.

На вялікім перапынку мы бегалі на таўкучку: яна была праз дзве вуліцы ад нашае школы. Там смачна пахлі смажаныя семечкі, якія прадавалі па дзве шклянкі на рубель, і нехта вялікі ў дзіравым паліто, з якога лезлі касмылі бруднае ваты, іграў у тры тузы. Каля яго заўсёды стаялі людзі і цэлаю плоймаю таўкліся мы. Тут, на таўкучцы, можна было даведацца і пра свой «лёс». Кожны чалавечы «лёс» быў у папяровым канверціку. Канверцікі ляжалі ў фанернай скрыначцы, якую трымала на каленях жанчына з цвёрдым абветраным тварам і без аднае рукі. Пад фуфайкай у жанчыны ціха драмала, мякка закрываючы вочы, марская свінка.

— Хто хоча ведаць свой лёс — адзін рубель, адзін рубель,— нямоцна крычала абветраная жанчына і гладзіла рукою рахманага звярка.

Кабеты з пустымі кашамі, што трымалі на руках, з бітонамі, што віселі ўжо без накрывак за плячыма, падыходзілі да абветранае жанчыны і клалі ў адстаўлены кішэнь фуфайкі памяты рубель.

Жанчына з абветраным тварам даставала з-пад фуфайкі марскую свінку і тыцкала яе вусатаю пыскаю ў белыя канверцікі. Свінка доўга прынюхвалася, доўга шукала чалавечы «лёс» і нарэшце цягнула яго. Кабета брала канверцік, адыходзілася, разгортвала і, шавелячы губамі, чытала. Да яе падбягалі другія і заглядвалі ў паперку.

Мне таксама хацелася ведаць пра свой лёс. Назаўтра я папрасіў у мамы рубель — на сшыткі — і пасля ўрокаў пайшоў на таўкучку.

Абветраная кабета трымала на каленях фанерную скрыначку, але ў ёй, здаецца, яшчэ болей ляжала чалавечых

8. Зак. 1877

«лёсаў». «Які тут мой?» — падумаў я і кінуў жанчыне ў пусты кішэнь свой мокры ад поту,— бо нёс, заціснуўшы ў руцэ, аж да школы,— рубель.

Свінка не прынюхваючыся выцягнула самую першую і блізкую ад яе паперку. Нікуды не адыходзячыся, я разгарнуў паперку, і перад маімі вачыма нейкай незразумелай радасцю замільгалі дзіўныя словы: «І спраўдзіцца воля твая, і прыйдзе шчасце тваё...»

І з памяці выплыў прыгожы твар Чаславы Карлаўны — я аж заплюшчыў вочы; твар хіснуўся, як у люстры вады, і згінуў. Нехта трымаў мяне за плячо. Я адкрыў вочы: перада мною стаяла Часлава Карлаўна; нехта ў вайсковай форме, немалады, хмуры, чырвоны ў твары, трымаў яе пад руку. У яго каля грудзей калыхаліся завушніцы Чаславы Карлаўны.

— Што ты тут робіш? Аддай мне гэтую паперку! — Часлава Карлаўна нахмурылася і прытупнула нагою.— І болей ніколі не хадзі сюды.

Я аддаў паперку, так і не дачытаўшы яе да канца.

Часлава Карлаўна згарнула паперку, зажмурылася і разарвала. Я пайшоў, думаючы, што там напісана болей. Услед за мною вецер нёс маленькія кавалачкі — яны круціліся і падалі людзям пад ногі. Я ўспомніў дзіўныя словы: «І спраўдзіцца воля твая, і прыйдзе шчасце тваё...» — і перад вачыма зноў стаяў прыгожы твар Чаславы Карлаўны, яе цяжкія завушніцы і хмуры муж.

Я ішоў у культмаг слухаць сіні патэфон, як ён спяваў пра цёмную ноч, пра свіст куль у гэтай ночы. Я любіў стаяць каля прылаўка і салодка сумаваць, уяўляючы недзе аднаго сябе ў гэтай страшэнна цёмнай ночы, а потым глядзець на доўгую чаргу, што хісталася, густа збіўшыся каля орсаўскага магазіна,— за хлебам. Хлеб прывозілі ў чырвонай скрыні на возе. Ён цёпла і свежа пах. Чарга тады раўнялася, расцягвалася яшчэ далей: пачыналіся таўканіна і крык каля дзвярэй. Я ішоў на чыгуначную станцыю: там спыняліся таварнякі, на платформах стаялі ўкрытыя брызентам «кацюшы», у доўгіх саставах везлі палонных немцаў,

прыходзіў пасажырскі цягнік: у вокны глядзелі незнаёмыя людзі, да тамбураў беглі местачковыя кабеты, несучы ў талерках вараную бульбу. На перон выходзілі пасажыры, чыталі на будынку вакзала назву станцыі і куплялі цёплую бульбу. Я глядзеў на цягнікі: яны ішлі ў далёкі свет, ля перона яшчэ доўга ўздрыгвалі і ляскалі рэйкі. Я вяртаўся дадому, думаючы пра белыя гарады, куды некалі паеду і я. Над дарогаю калыхаўся, мроіўся ранні верасень. Лятала павуцінне, чаплялася на ўзмежках за сухі быльнік і вострa блішчала. Нізка і шумна плылі цераз дарогу зрудзелыя пад восень шпакі. У мяккай сырасці млеў позні шэры дзень. Весялела маладое жыта па ўзгорках. Шчыльна цямнелі лясы за жытам. Пры лясах у лагчыне шарэла нашая вёска, жоўклі бярозы пад хатамі. І мне было дзіўна, што за сінімі лясамі не канчаецца свет, што недзе там стаяць другія вёскі, пад хатамі жоўкнуць бярозы, падае лісце на стрэхі і што недзе там, як і тут пры дарозе, жанчыны ў доўгіх спадніцах капаюць бульбу і гэтаксама стаяць, абапёршыся на капачы, каб адышла спіна. І гэтак цяжка скрыпяць нагружаныя белымі мяхамі вазы, натужваюцца коні, і на іх цмокаюць мужчыны і падштурхоўваюць плячом воз.

Недзе ў мяне за спіною на вечар хілілася сонца і дагарала ў вокнах крайніх хат нашай вёскі, а на грудку за вёскаю, там, дзе было нашае поле, дзе мая мама капала бульбу, мігцела шкельца. Да мяне цягнуліся і рваліся, ніклі і зноў, успыхнуўшы, туга трымцелі тонка-бліскучыя праменні.

Папалуднаваўшы дома, я ішоў на тыя грудкі памагаць маме падносіць кошыкі з бульбай і ссыпаць. Сонца ўжо не было — толькі там, за мястэчкам, дзе яно схавалася, светла чырванела неба. Выразна цямнела над мястэчкам высокая вадакачка. А пасля неба рабілася карычнева-фіялетавае. Мы з мамай сядзелі на мяшках і чакалі падводу.

— Будзе калгас, то ўсім будзе аднолькава...— казала мама, і цёмныя патрэсканыя рукі яе ляжалі на прыполе.— А то за калодзеж — адрабляй, за каня — адрабляй...

У нашай вёсцы ўжо гаварылі пра калгасы, і кожнае суботы ціхім чэрствым вечарам, спатыкаючыся ўпоцемку

на вуліцы, узбіваючыся на платы, па вёсцы хадзіў старшыня сельсавета і разам з ім, расслабіўшы цёплыя хусткі, настаўніцы з нашае школы.

Аднойчы ў нашую хату старшыня прыйшоў з дырэктарам школы і Чаславай Карлаўнай.

— А-а, стары знаёмы,— сказала Часлава Карлаўна, мусіць, з радасцю, што ўбачыла мяне. Я сядзеў за сталом — якраз адрабляў урокі.

Я засаромеўся і схаваў пад лаўку босыя ногі. Мама засаромелася таксама — пачырванела і пачала спешна прыбіраць у хаце.

— Нічога, нічога, хадзяйка...— Старшыня агледзеў нашу хату, і вочы яго спыніліся недзе на сцяне, на мамінай яшчэ дзявочай павялічанай фатаграфіі.— Ну, дык як нашчот калгаса, хадзяйка?..

— Як усе добрыя людзі, так і я.— Мама змахнула фартухом з услона.— Во садзіцеся... А я вам скажу, якая з мяне калгасніца... Няхай во багацейшыя — у іх коні ёсцека.

Настаўніца і дырэктар школы таксама разглядалі маміну фатаграфію — мама там яшчэ была прыгожая.

Часлава Карлаўна падышла да стала — лёгкім ветрам дыхнуў на мяне светлы пах яе духоў, і ў мяне, здаецца, закружылася галава.

— Ты рашыў задачу? Помні — яна з двума невядомымі.— Вочы ў яе былі цёмныя і ціха мільгалі.

— Ага...

Яна абняла мяне адною рукою, і на тонкім пярсцёнку ў яе бэзавым святлом мільгануў каменьчык. Я стаіўся ад нечаканага шчасця, з памяці зноў выплылі тыя дзіўныя словы: «І спраўдзіцца воля твая, і прыйдзе шчасце тваё...»

— А як з пастаўкаю? Нябось, слаба, га? — старшыня гаварыў ужо недзе з сенцаў.— Дык думай пра калгас, хадзяйка.

— Што ж... Я ўжо ні першая ні апошняя,— сказала мама, стоячы каля дзвярэй.

За старшынёю выйшла настаўніца. Дырэктар школы працягнуў з сенцаў руку. Часлава Карлаўна ўзялася за яе

і асцярожна ступіла за парог. У сенцах, мусіць, на нешта спатыкнулася — залілася смехам. Зарагатаў дырэктар школы, і яны доўга чамусьці шукалі клямку.

У той вечар маме не спалася: яна гаварыла пра вайну, пра калгасы, а я драмаў пад гэтую гаворку, успамінаючы цёмныя вочы Чаславы Карлаўны, яе прыгожы твар і тонкі пярсцёнак з бэзавым каменьчыкам. І ноччу яе сніў. Мы хадзілі з ёю за рэчку ў карычнева-сіняваты голы алешнік, што пах ветрам і сырым холадам шэрае восені, зграбаць лісце. Набіралі яго поўныя дзяружкі і неслі дадому на подсціл карове, як неслі з мамай, па гнуткай кладцы, праз чужыя падворкі,— і з дзяружкі ў Чаславы Карлаўны ўсё падала мне пад ногі зрудзелае альховае лісце. Я ішоў па гэтым лісці — яно чуйна і мякка шапацела пад нагамі. Назаўтра мне ўспамінаўся гэты сон. А Часлава Карлаўна ўвайшла ў клас па-новаму прыгожая, іншая, чым у той вечар,— у шэрай куртачцы з пазалочаным замочкам, у просценькай спадніцы, у гумовых бліскучых ботах, завязаўшы пад бараду выцвілую празрыстую касынку,— і выдавала зусім маладою, жваваю, як дзесяцікласніца.

— Дзеці, мы паедзем у лес,— сказала яна, і на шчоках у яе задрыжалі ямачкі.

Клас зашумеў, затупаў ад радасці нагамі.

— Мы будзем загатаўляць дровы.

На школьным двары, выстраіўшыся, ужо стаялі старшакласнікі — падпяразаныя піламі, з сякерамі ў руках. Сякеры блішчалі халодным і вострым лязом. Наш клас прыстроіўся самы апошні. Мы пайшлі на вакзал. Дзесяцікласнікі не ў лад, збіваючыся, зацягнулі песню.

Да нас падбегла Часлава Карлаўна і ўзмахнула белымі рукамі:

— Ну, памагайце і вы!

Але песня ў нас не выходзіла. Мы заспявалі толькі ў вагоне. Часлава Карлаўна адчыніла акно — у вагон хлынуў тугі вецер і закруціўся разам з салодкім паравозным дымам. Часлава Карлаўна нямоцна зажмурылася, мусіць, радасна прыслухоўваючыся, як па твары чутна плыў і плыў

вецер, як лёгка трапяталася над брывом, над вокам празрыстая пасма валасоў. Я ўсё глядзеў і глядзеў на яе.

З лесу варочаліся толькі мы — пяцікласнікі, старшыя класы засталіся начаваць. Мы ўсе пахлі дымам, смалою — мы сцягвалі і палілі галлё, і рукі ў мяне млява шчымелі і нылі. Каля мяне ў вагоне сядзела Часлава Карлаўна і таксама прыемна пахла сырым дымам, так, як пахла мая мама, калі паліла ў печы зялёным сасновым галлём.

Асалавелыя, маўклівыя, мы яшчэ цягнуліся з вакзала ў школу — па свае сумкі.

— А заўтра пойдзем яшчэ? — хітра пытала ўжо ў класе Часлава Карлаўна, і на шчоках у яе зноў выступілі непрыгожыя ямкі.

— Пойдзем,— як заўсёды, за ўсіх нас крыкнуў з апошняй парты Капейка.

— Толькі не забывайцеся пра арыфметыку. Ці ж усе рашылі задачу?

— Усе-е-э.

— А можа, хто хоча рашыць яшчэ адну? Я дам свой задачнік.

Усе маўчалі, бо ва ўсіх былі свае задачнікі, толькі я перапісваў умовы задач у Кіры Фахрушавай. Часлава Карлаўна глядзела на мяне і падышла да мае парты.

— На табе, Мечык.

Яна паклала задачнік на маю парту — я пачуў, як ён лёгка запах светлымі духамі.

Потым ён гэтаксама пах у нашай хаце — і, мне здавалася, у хаце зрабілася хораша, як бывае хораша перад Вялікаднем, калі ў нас пахлі свежыя яловыя лапкі, пазатыканыя пад бэльку, і сыры жоўты пясок, якім мама насыпала гліняны ток. Цэлы вечар я рашаў задачы, а мама ўпраўлялася з вячэраю — у печы патрэсквалі і стралялі на хату чырвонымі вугельчыкамі дровы.

— Будзе госць,— гаварыла мама і не баючыся брала пальцамі яшчэ не астылы, што пераліваўся чырвонасіняватым адлівам, вугельчык і кідала назад у печ.

І мне думалася, што гэтым госцем у нашай хаце будзе зноў Часлава Карлаўна, думалася пра тое, як мы заўтра

зноў будзем ехаць у лес, будзе калыхацца жоўты вагон і будзе насупраць мяне сядзець Часлава Карлаўна, а я буду глядзець на яе белы прыгожы твар, на завушніцы, што будуць лавіць сонца, што будзе коса свяціць у наш вагон, на плячо Чаславы Карлаўны.

Але назаўтра раніцаю рэдка і буйна пасыпаўся дождж, і ў школу ўсе прыйшлі мокрыя, невясёлыя, што ніхто нікуды не паедзе, і пасля званка чакалі Чаславу Карлаўну — меўся быць яе першы ўрок,— прыслухоўваючыся, як у вадасцёкавай трубе холадна, аж шэрхне скура, шуміць дажджавая вада і нудна крычыць на школьным двары мокрая варона.

У клас, прыпазніўшыся, увайшоў фізрук, паныла сказаў, што будзе фізкультура. Толькі перад апошнім урокам перапалоханая, здзічэлая Кіра Фахрушава прынесла ў клас нечаканую навіну: сёння ноччу ў лесе параніўся і, можа, памрэ сын Чаславы Карлаўны — ён укінуў у агонь снарад. Кіра сціснула каля грудзей худыя кулачкі і заплакала першая, за ёю мокра зашморгалі насамі ўсе дзяўчаткі. Хлопцы панура маўчалі. Мне чамусьці было шкада не сына Чаславы Карлаўны, а яе самую. У мяне ў нейкай дзіўнай асалодзе закружыліся, замільгалі нечаканыя думкі: некалі Часлава Карлаўна забудзецца, што ў яе быў сын, а я прыйду і скажу, што хачу быць у яе за сына. І яна спярша заплача, а потым засмяецца, абдыме, пацалуе мяне, павядзе дадому. І я стану жыць у хаце з белымі фіранкамі, з цёплай пафарбаванай падлогай, з мяккімі ходнікамі — у такой самай хаце, у якую я заходзіў аднойчы з мамаю, яшчэ пры немцах, калі мы насілі прадаваць у мястэчка малако. І мяне будзе наведваць мама. А Часлава Карлаўна будзе нячутна хадзіць па ходніках у блакітным доўгім халаце з бліскучымі кветкамі, і з-пад халата будуць відны чырвоныя пантофлі з пушыстым белым кутасікам, як у той пані, якой мы прадавалі малако. Толькі ж куды дзенецца немалады, хмуры муж Чаславы Карлаўны?

На другі дзень у нашым класе замест арыфметыкі была зноў фізкультура. Была яна і на трэці... Міналі дні — ужо ў нашай школе ўставілі падвойныя рамы, ужо мы з мамаю

на агародзе высеклі капусту, заклалі кастрыцаю падаконне, ужо раніцаю скрозь на стрэхах шарэў марозік, шэрхла і цвярдзела зямля на дарогах — усе чакалі зімы, і да нас прыйшла выкладаць арыфметыку хімічка з сёмага класа — Чаславы Карлаўны не было.

Ужо аднойчы за акном марудна сыпаўся густы снег — у класе стала цёмна. Мы ўсё прыўставалі і глядзелі ў акно і не маглі дачакаца перапынку. І беглі ўсе на двор, дзе ляжаў сыры снег і крохка хрумсцеў пад нагамі, дзе ўжо мільгалі снежкі і цяжка гупалі ў дашчаты ганак, пакуль нехта не рассадзіў акно, пакуль не выбег той самы пануры вартаўнік, перавярнуўшы ў руках памяло. А Часлава Карлаўна ўсё не прыходзіла ў школу.

Я стаў адчуваць адзіноту, сумную шэрасць апошніх дзён восені і нейкую невыразную тугу, што Часлава Карлаўна не прыйдзе ніколі, хоць хімічка казала, што Часлава Карлаўна хутка выздаравее, што з бальніцы ўжо выйшаў яе сын,— але мне невядома чаму не верылася, і я думаў, што Часлава Карлаўна ніколі не будзе ведаць, што я яе любіў і што яна для мяне была самаю прыгожаю на свеце. А можа, і добра, што яна не дазнаецца пра гэта і ёй не будзе сорамна, як бывае мне, калі я думаю пра яе і ад сораму аж заплюшчваю вочы. Але мне хораша ад гэтых думак, асабліва раніцай, калі я адкрываю вочы і раптам успамінаю яе — і гляджу ў яснае акно, уяўляючы новы дзень, блізкасць зімы, празрыстага марозу, зыркага, пякучага снегу, сініх ценеў на снезе і зноў яе — Чаславу Карлаўну.

У школу Часлава Карлаўна прыйшла на трэцім тыдні: ужо была зіма, за акном сцішна і роўна калыхаліся сосны, ахапкамі з галля сыпаўся пухкі снег, церушыўся на ветры, калюча мігцелі на сонцы драбнюткія сняжынкі, бязважка плылі ў нашыя вокны і прыставалі да шкла. А Часлава Карлаўна глядзела недзе туды за вокны на сінявата-ясны дзень, на косае, разарванае на лапікі сонца, што калыхалася на сцяне ля дошкі, і раптам сціхала і пачынала зноў гаварыць нямоцным, ціхім голасам, і ёй, мусіць, было цяжка.

На трэцім тыдні прыйшоў у школу яе сын. З забінтаванаю, падвязанаю леваю рукою ён хадзіў па калідоры, вочы ў яго раз'ятрана блішчалі, за ім цугам цягнуліся дзеці, а поруч з ім хадзіў Капейка, лісліва яму ўсміхаўся і адпіхаў дзяцей. А я патаемна ўсё цікаваў за ім, за сынам Чаславы Карлаўны, і невядома чаму стараніўся яго.

А раз я стаяў на ганку. Была раніца, было адлежна: са страхі мякка капала ў рыхлы снег празрыстая вада, на страсе недзе на коміне валтузіліся і крычалі галкі, біліся дзеці ў мокрыя снежкі, знарок прытворна, як дарослыя, пішчалі дзяўчаткі і, засланяючы твар локцямі, уцякалі ў школу. Іх гнаў сын Чаславы Карлаўны. Расчырванелы, задыханы, ён спыніўся на ганку, сцягнуў з галавы ўсю ў снезе вушанку з бліскучаю кукардаю, абабіў вушанку аб калена, набычыўся і спытаў у мяне:

— Ты чаго ўставіўся?..

Я, мусіць, зачырванеўся і пастараніўся, каб уступіць яму дарогу, але ён падставіў падножку, я слізгануўся і, ускінуўшы рукі, расцягнуўся тут жа на парозе.

Каля нас ужо сабраліся і рагаталі дзеці. Я ўстаў, адчуваючы нейкі раптоўны глухі звон у вушах, а ў вачах у мяне, мусіць, ужо дрыжалі слёзы.

— Стой! — Сын Чаславы Карлаўны дыхнуў адкрытым ротам мне ў твар.

Я пхнуў яго ў грудзі. Сын Чаславы Карлаўны хапіўся рукою за ашаляваны вугал ганка, хацеў яшчэ ўстояць на нагах, але аступіўся і неяк бокам, забінтаванаю падвязанаю рукою паляцеў з высокага ганка. З галавы ў яго звалілася і пакацілася аж пад капеж вайсковая вушанка з бліскучаю кукардаю.

Пачуўся раптоўны крык. Я ўбачыў, як з весніцаў ужо сюды, коўзаючыся на слізкай зледзянелай сцежцы, бегла Часлава Карлаўна.

Ад страху і нечаканасці ў мяне закацілася сэрца.

Сын Чаславы Карлаўны ўжо ўстаў і круціўся на адным месцы, шукаючы сваю шапку.

— Вось, сынок, вось.— Часлава Карлаўна падняла шапку, рукі ў яе дрыжалі.— Ты не пабіўся, не? Хто ж гэта цябе?

Яна стаяла белая, нейкая раптоўна збянтэжаная.

— Ён,— паказаў на мяне яе сын, не паднімаючы вачэй: яму, пэўна, было брыдка.

— Ну, хадзем, ты не лепшы...— Яна тузанула яго за руку і бокам прайшла каля мяне. Зусім блізка, моўчкі — за ёю віўся лёгкі і светлы пах духоў.

Я стаяў, адчуваючы нейкую невядомую для сябе віну, сорам, брыдкасць — усё разам.

Празвінеў званок. І гэтаксама мы чакалі Чаславу Карлаўну — а яна ўвайшла ў клас гэтаксама прыгожа і чыста адзетая, і гэтак павольна калыхаліся яе цяжкія завушніцы, лавілі каля пляча сонца, але яго не было.

— Даруйце, Часлава Карлаўна.— Я падняўся з лаўкі, трымаючы ў руках задачнік.

Вочы яе насцярожана глянулі на мяне, здзівіліся і зусім не мігалі. Яна падалася да мяне:

— Ну добра, Мечык,— збянтэжылася і залілася чырванню.

— Вось ваш задачнік. Дзякую...— Я апусціў вочы.

— Дзіўны ты...— У голасе была спагада і нейкая далёкасць.

«Няўжо вы не ведаеце, што я люблю вас. І сына вашага буду любіць. Усё, што вы хочаце»,— але я маўчаў.

Яна ўзяла белымі рукамі задачнік — на пальцы ў яе ясна мільгануў тонкі пярсцёнак.

Я сеў, і на мяне раптам нахлынула цяжкая крыўда, што яна ніколі не будзе ведаць пра гэта і, пэўна, не хоча — у яе ёсць свой клопат, сын, той хмуры муж, сталасць, а я яшчэ зусім малы.

На другі год яе не было ў нашай школе. Крыўда мая прайшла, застаўся сум, нейкі невыразны сум, як сум перад восенню па яснай вясне, па першым громе, празрыстым лістку і маладой пяшчотнай траве, ціхі сум, што ў наш клас ніколі болей не прыйдзе Часлава Карлаўна. І ў мяне яшчэ доўга тлела туга па ёй. Недзе ў старэйшых класах прайшла

і яна — у мяне было ўжо нешта другое, я вастрэй і больш стала думаў пра вялікія гарады.

І вось цяпер, праз дваццаць з нечым год, калі я бываю дома, дзе лячуся ўспамінам пра няблізкае і падхарошанае даўняе, да мяне зноў чамусьці прыходзіць радасная туга стрэцца з Чаславай Карлаўнай. Я ж бачыў далёкія гарады, нешта ў маім жыцці спраўдзілася, і я крышку давольны гэтым. Але, пэўна, і цяпер я не сказаў бы ёй пра тое, што я яе любіў, любіў з неразважнай, смешнай дзіцячай затоенасцю. Не сказаў бы. Бо мы заўсёды мала добрага гаворым другім, баючыся чужое радасці, і, мусіць, гэтак трацім сваю.

## Сонечны зайчык

Яна была старая, рыжая з кароткімі адмарожанымі вушамі і заўсёды сумнымі вачыма. Яшчэ змалку ёй прышчамілі галаў, і яна страціла голас і ўжо зусім не мяўкала, а толькі неяк бездапаможна і бязгучна разяўляла рот. Прыбілася яна сюды ў крайнюю з вёскі хату яшчэ нэндзным, выкачаным у сажу кацянём. Тут яна пражыла шэсць год, пастарэла і пачала аблазіць. Яе цяпер сталі гадзіцца, выганяць з хаты і біць чым папала — венікам, матузамі, іншы раз дык проста нагамі. Два разы яе зносілі з дому — першы раз не так далёка — у мястэчка, адкуль яна вярнулася ў той жа самы дзень, другі раз у горад — за сорак кіламетраў; дагадлівы гаспадар укінуў яе ў мяшок і павёз з сабою на кірмаш, як парася, але, вядома, не прадаваць, а проста вытрасці з мяшка, можа, часам і на чужы воз.

З горада яна прыйшла нешта праз месяц, прыйшла худая, зношаная і ледзь жывая, на ёй былі толькі скура ды косці. Але за восень яна выкачалася, акрыяла і, здаецца, памаладзела. Пасля першых прымаразкаў сталі калоць свіней і ў няўдалае гаспадыні можна было нават залезці ў непрычынены кубелец. На мышэй яна ўжо не мела ні пільнасці, ні спрыту. Дадому яна прыходзіла, каб напіцца вады, выграцца на печы. Але там, раскінуўшы рукі, граў

носам сам гаспадар, і яна толькі баязліва паглядала на яго пухлы кулак, што звісаў над пячурай. Далезці да вады было яшчэ горш. Вада стаяла ў вядры на калодзе ў памялешніку. Трэба было прымергавацца і скочыць, каб не забрашчаў вочап. Але вочап звычайна брашчаў, і вельмі моцна. І яе тут жа секлі вострыя і надта пякучыя матузы — гэта, вядома, гаспадыня, гаспадар дык проста біў яе сваім цвёрдым, як камень, кулаком. Біў ён не шкадуючы, моцна. Аднаго разу яна ледзь устала з зямлі і болей пабойвалася заходзіць у хату. Піць ваду бегала аж да завоінкі на балота, пад старую вярбу. Тут яе ўжо ніхто не ганяў. Толькі іншы раз дурная варона, згледзеўшы яе з старое высокае алешыны, падазрона крычала на ўсё горла. На гэты крык зляталіся другія і нават пачыналі кружыцца над завоінкай.

Зацішна было і на гарышчы, дзе яна цяпер жыла, сплючы на жменьцы нейкага старога і зусім перацёртага сена.

Сена было порсткае, калючае, пахла яно сухім даўнім пылам, як і пахла ўсё тут гарышча нечым старым, сатлелым, нават павуціннем, што вісела вялікімі дзіравымі сеткамі. У павуцінні быў комін, калаўротак, што валяўся тут бог ведае колькі, і ўся іншая гаспадарчая размаітасць — іржавы плуг, тачка, скрутак калючага дроту і нават нямецкая каска, у якой некалі гаспадар даваў курам есці.

У рэдкія пагодныя дні скупое на цяпло восені сюды, на гарышча, праз невялікае акенца глядзела прыемна ласкавае сонца. Роўны слупок, у якім, як нешта жывое, плаваў пыл, даставаў аж да сена. Яна жмурыла косыя вочы і салодка засынала.

Прачыналася тады, калі слупок, прарваўшы павуціннe, стаяў на нейкім старым без аднае ножкі ўслоне. На гэтым услоне, яна помніць, гаспадар заўсёды разбіраў вепрукоў, але яе тады выганялі з хаты. Гэты ўслон невядома нашто спатрэбіўся ізноў — і гаспадар прылез на гарышча.

— Ужо сюды прыйшла здыхаць! — раўнуў ён, убачыўшы яе, але на гэты раз ужо не біўся.

Узяў услон і пачаў хуценька спускацца з гарышча. Болей сюды ён не лазіў. Толькі, мусіць, калі выкапалі бульбу,

з сенцаў кінуў на гарышча дзіравы лазовы кошык. І на гарышчы на ўсю зіму стала ціха. Зімою тут было толькі сумна, адзінока і холадна. У завіруху на гарышчы, як жывы, спатыкаючыся ўпоцемку на нешта, хадзіў вецер, а ў вялікі мароз недзе стралялі вуглы — аж яна падскоквала ад страху. Зімою яна перабралася бліжэй да коміна на нейкую збітую ў лямец кудзелю. Кудзеля пахла некалішнім цёплым мышыным жытлом. Цяпер мышы тоненька папісквалі ў стопцы, мусіць, праядаючы мяшкі і сыта жыруючы. Колькі раз яна шукала туды дзірку і кожны раз злая і галодная варочалася на злямцаваную кудзелю.

Аднекуль з надворку вецер прынёс на гарышча пах свежага сала і кілбасаў. Смачна аблізваючыся і прынюхваючыся, яна спусцілася па вугле на двор і праз чужыя, занесеныя глыбокім снегам агароды пабегла на гэты пах. Быў ціхі вечар. Быў сіні месяц на чыстым небе. Нанач дужэў марозік: звонка патрэсквалі платы, недзе на вуліцы пад нечымі нагамі хрумсцеў снег. На свеце быў сакавік — першы месяц вясны. Кругом стаяла мяккая відната. Кругом было чыста, снежна і хораша.

Мінаючы нечы хлевушок, яна пачула, як сумную маладую песню мяўкаў кот. І ёй здалося, што ён быў малады. Яна прыпынілася, прыслухалася — ён, здаецца, быў тут блізка.

Абабегшы хлевушок, яна пільна глянула ў прачыненыя дзверы і ў цемнаце ўбачыла вялікія зялёныя вочы. Яна завярнула назад. У некага пад носам перабегшы вуліцу і падлазячы пад плот, аглянулася — ён бег за ёю. Чорны, вялікі, з белымі, як у боціках, лапкамі. Ужо не аглядваючыся, яна дабегла аж да свае хаты. Скокнуўшы на вугол, учула, як ён мяўкнуў недзе блізка.

Затоіўшыся на гарышчы, яна не ведала, што рабіць: ён ішоў сюды да яе, асцярожна, мякка, нібы на пальчыках, а потым убачыла яго вочы — яны гарэлі зялёна-залацістым агнём. Затоена-радасна яна адступіла назад...

Спадала зіма. Тугія вятры, напоеныя вільготным цяплом полудня, прынеслі адлігу. Цяжка гупаў, растаючы і спаўзаючы са стрэхаў, мокры снег. Радасна шумелі голыя дрэвы.

У зацішку ў гародчыках шчабяталі і чубіліся біцца вераб'і.

Прылёгшы за плотам, яна доўга і пільна сачыла за імі, а аднойчы, скокнуўшы на жывы ад вераб'інай гаманы бэз, адчула ў сабе нейкую незнаёмую цяжкасць. Гэтую цяжкасць яна адчувала цяпер штодня. І ўжо болей ляжала, грэючыся на прызбе, і ёй успамінаўся той чорны, з белымі лапкамі кот. Яго прынеслі сюды ў вёску аднекуль здалёк, і ён, мусіць, сышоў дадому. Яна не ведала цяпер, дзе і што з ім. Яна пільнавалася болей гарышча, на выпадак выклаўшы лазовы кошык кудзеллю і сенам. На гарышчы цяпер было цёпла, хораша, але ўсё ж гэтак адзінока. Сумна, але з нейкай прыхаванай, затоенай радасцю ў вачах чакала яна дзяцей.

Беглі дні, недзе далёка закаціўся першы гром. У гародчыку ля хаты бушаваў май. І на гарышчы густа і цёпла запахла арабінаю і бэзам. Недзе за ліштваю ў акне ціўкалі нядужыя і голыя вераб'і. Прыйшла гэтая няскорая, вымучаная пара і для яе. Прыйшла яна ў нядзелю раніцай — разам з першым сонечным зайчыкам, што праз акенца ў шчыце бліснуў сюды, на гарышча, і замільгацеў залатым кружком па запыленай лаце. А сярод дня невядома чаго сюды, на гарышча, падагнала гаспадара, падагнала якраз тады, калі ў лазовым кошыку ўжо нямогла верашчалі, просячы есці, чацвёра сляпых і ўсе як адно — кропля ў кроплю бацька — кацянят: чорненькіх, з белымі лапкамі. Яна ад шчасця мяўкнула, і ёй здалося, што першы раз у жыцці, напэўна, галасна. І, пэўна, першы раз гэты голас яе пачуў гаспадар. Прылезшы на гарышча, ён глянуў у кошык і гадка плюнуў:

— Каб ты выдахла разам з імі,— і, падняўшы кошык, адвярнуў галаву, каб не глядзець у яго.

Кацяняты заверашчалі. Яна жаласна, але бязгучна мяўкнула, і з жоўтых вачэй у яе, здаецца, пакаціліся слёзы. У кошыку ўсё гэтак нямогла, мусіць, просячы літасці і ратунку, пішчалі кацяняты. Не помнячы нічога, яна падскочыла і ўпілася вострымі кіпцюрамі ў тую руку, што трымала кошык. Гаспадар войкнуў і ўпусціў кошык. Але гэта было нядоўга, мусіць, толькі доўга яна ляжала ў сенях — ці не нагою яе

сюды збіў гаспадар. Калі яна прылезла на гарышча, тут ужо нікога не было — ні гаспадара, ні кацянят. Тут толькі стаяла млявая цішыня і недзе ў павуціне ўсё звінела і білася муха. Яна аблазіла ўсё гарышча, але кошыка нідзе не знайшла. Па сцяне яна спусцілася ў сені — напалоханыя куры, растапырыўшы крылле, з моцным крыкам паляцелі на двор. Нехта выбег з хаты, нехта кляў яе, але яна не чула, яна думала пра кацянят, яна шукала іх, вядома, не ведаючы, што гаспадар занёс іх пад старую вярбу ў завоінку. Яна абабегала хату, абшукала бэз, абхадзіла ўвесь гарод і нідзе не знайшла. Вярнулася зноў на гарышча. Яна яшчэ спадзявалася, што кацяняты недзе тут. Абабегшы ўсё гарышча, яна вылезла на двор. На дрывотні цяпер ужо валяўся той самы лазовы кошык: ад яго пахла нечым знаёмым, сваім — пахла кацянятамі. Ад шчасця і радасці ў яе пасвятлелі вочы. Але кошык быў пусты, з яго нават вытраслі кудзелю і сена. Яна доўга і без жаданае надзеі сядзела тут. І нават не зварухнулася, калі сюды, да баначкі з курынаю вадою, прыляцеў верабей і стаў мыцца, натапырыўшыся ад радасці. Весела цвіркнуўшы, чысты і давольны, ён паляцеў, так, пэўна, і не ведаючы, што быў на валаску ад смерці. А кошка ўсё сядзела, покуль вечарам, звонка стрэліўшы пугай, не сагнаў яе пастух.

Ноччу яна прыйшла сюды зноў. Кошык ізноў быў пусты, але ад яго пахла кацянятамі. Цяпер імі пахла ўсюды, ёй здалося, што яны нават недзе пішчалі. Яна пабегла на гэты піск аж у другі канец вёскі, туды, дзе з-за нечае страхі выкочваўся вялікі чырвоны месяц. Неба на ўсходзе аблівалася крывёю. Сумная і адзінокая, яна варочалася дадому, каля нечых веснікаў наткнуўшыся на сабаку. Добра, што поруч стаяла бярэзіна. Аблавухая, маленькая, пэўна, сучачка, аж драла ад злосці пясок, што не змагла дастаць гэтую старую аблезлую кошку. А тая, пэўна, праседзела б на бярэзіне да раніцы, каб не выйшаў гаспадар і не прытупнуў на сабаку.

Прыбегшы дахаты, першы раз яна не палезла на гарышча, першы раз гэтая хата здалася ёй чужою, і ўсё тут было іншае, перайначанае. З нейкім астатнім жалем глянуўшы на

пусты кошык, яна скіравала на сценку, што бегла за вёску ў поле, і пайшла гэтаю сценкаю невядома куды. Сумна бялела неба на ўсходзе, і недзе над полем усё звінеў і звінеў першы жаваранак. На маладой траве густа халадзела раса. Нізка над жоўтым папарам заплакала кнігаўка,— нехта, мусіць, так рана патрывожыў яе гняздо. За папарам зелянеў рэдкі малады лубін — увесь аж сівы ад расы,— у ім, пэўна, нешта рабілася. Падкраўшыся да лубіну, кошка пачула, як там нешта піскнула, зашапацела, заварушылася і раптам сціхла. Не зважаючы на расу, яна куляй кінулася туды. Кнігаўка, убачыўшы яе, пырхнула ўгору і закрычала яшчэ мацней. Пільна настрыўшы доўгія вушы, у разоры сядзела шэрае зайчаня, і, гледзячы на кошку адным вялікім і няхітрым вокам, не ведала ўжо, як і ратавацца. У жываце ў кошкі заварушыўся голад. Зайчаня, мусіць, крышку пасмялела, адышло ад страху і раптам скокнула, але зачапілася за сцяблінку лубіну і, смешна ўпаўшы, расцягнулася ў разоры. Гледзячы на гэтае нядужае і зусім дурненькае зайчаня, кошка ўспомніла сваіх кацянят, яны вось гэтакія нямоглыя і неакрыялыя, як гэтае зайчаня, успомніла той жаласны піск, калі ў лазовым кошыку іх падняў гаспадар. І ёй зрабілася шкада зайчаняці, яе ўжо адольвала тужлівая прага мацеры мець дзіця, выгадаваць хоць вось гэтае неразумнае зайчаня. А яно, ужо асвойтаўшыся, зусім не збіралася ўцякаць, яму проста па-дзіцячаму захацелася пазабаўляцца, і, падняўшы кароткі белы хвосцік, зноў скокнула. Яна, спалохаўшыся, што зайчаня ўцячэ, схапіла яго за карак далікатна, каб не задушыць. Але яно, баязліва піскнуўшы, стала трапятацца. Яна доўгаваждалася і начыста замучылася, покуль вынесла яго з лубіну: на сцежцы яна хацела перадыхнуць, але яно вырвалася зусім. Нават трохі раззлаваўшыся, прыціснула яго да зямлі і занадта ўжо балюча ўзялася зубамі за спіну. Зайчаня нема заверашчала.

— А во кошка зайчаня душыць! — крыкнулі недзе зусім блізка. Яна нават не ўбачыла, што гэта былі паляўнічыя, і нават не паспела апомніцца. Раптоўна грымнулі два запар стрэлы, моцна, як гром, аглушыўшы яе. Ёй здалося, што

ў зайчаняці між вушэй зачырванелася кроў, і раптам гэтая кроў стала чарнець: перад вачыма ў яе стаялі кацяняты, гэтакія вялікія, з белымі лапкамі, кропля ў кроплю бацька. Раптам усё знікла, раптам стала ціха. Але яна ўжо не чула гэтае цішыні. Недзе далёка над рэчкаю двойчы адгукнулася і мякка рассыпалася рэха. Недзе там кукавала зязюля, кукавала яна пра шчырую вясну і сваю вясёлую долю і, пэўна, не ведала і не гадала, што ў гэтую чыстую раніцу нехта плача па дзецях, і нехта памірае, страціўшы іх.

Усходзіла сонца. Пачынаўся новы дзень мук, жыцця і радасці.

ВАЛЯНЦІНА КОЎТУН

## Вядзьмар

Рэчка падковаю агінала палову Астравічаў. Потым крута, быццам спяшаючыся, падавалася ад вёскі ўбок, пятляла вузкаю стужкаю паміж даволі высокіх берагоў, парослых вербалозам і сухенькім сітнікам, і хутка знікала з вачэй.

Аднак з супроцьлеглага боку астравіцкія хаты падціскала даволі нізкая гразкая лугавіна, дзе не раслі нават вербы, а яшчэ далей, за няроўнаю сцяною карчоў і чароту, спрадвеку царавала дрыгвяністае балота.

Рэчка, ціхая і паслухмяная ўлетку, а зімою прыціснутая да дна важкім панцырам лёду, вясною быццам узрывалася. За некалькі дзён яна зносіла ў шэрую далячынь крыгі, набухала, хавала пад сабою сенажаці. Падымалася і балота, пагражаючы крайнім дварам, але хутка, хутчэй за рачную паводку, аціхала і адпаўзала ў сваё старое логава.

Астравічы ў такую пару і сапраўды нагадвалі востраў. Дробныя хаты з бухматымі шапкамі буслянак на саламяных патыліцах распаўзліся па жоўтым пясчаным гарбе, але вада ўсё ж залівала гароды і падступалася да хлявоў. Сонца часцяком разганяла нізкія хмары, і тады паводка пачынала сляпіць вочы. Людзі адразу весялелі. Усе ведалі, што паводцы, якой бы грознаю яна ні была, давядзецца адступіць. А сыдзе паводка, дык і рэчка паспакайнее, зробіцца ціхай і мелкай, што толькі вераб'ю, як кажуць, па калена...

Гэтай вясной астравічане ўзіраліся ў бясконцую, набрынялую вільгаццю прастору асабліва пільна. Людзі сачылі за паводкаю, і кожнаму здавалася, што разам з ёю сплыве з зямлі і ўся навалач, уся гэтая фашысцкая брыда. Рэчка, аднак, не хацела здавацца, у непагодны час уздрыгвала ўсім сваім вялізным непаслухмяным целам і кідала на сушу то зламаныя вёслы, то цэлыя бярэмы пачарнелага стажковага сена. Прыбівала да берага і тапельцаў.

Менавіта ў гэтакі трывожны час Стасю Іванчанку споўнілася сямнаццаць. Веснавы вецер з кожным днём мацнеў і цяплеў, каля плота гусцела маладая крапіўка. Начамі ў небе віселі зялёныя і шурпатыя, бы ягадзіны агрэсту, зоркі. Дарога да раённага цэнтра ад вёскі падсохла, асабліва там, дзе яе жоўты рукаў слаўся па хвойных пагорках. І ўсё часцей у вёску пачалі наведвацца паліцаі.

Вось і сёння яны прыехалі ў Астравічы. Двое няпрошаных гасцей сядзелі на фурманцы з такімі ўчарнелымі тварамі, быццам іх чорт з рукава выпусціў. Вяскоўцы здзіўлена перашэпталіся, пазнаўшы ў адным з іх свайго, астравіцкага.

Гэта быў Васіль Малашчыцкі. Ніхто нічога не ведаў пра яго з самага пачатку вайны. Ніхто не сустракаў яго ні ў суседніх вёсках, ні ў Негарэлым. Нават на пахаванні маці, якая памерла яшчэ на першым годзе вайны, перад Калядамі, Васіля не было. Мабыць, не ведаў пра бяду. Ягоны малодшы брат Язэп пасля матчынай смерці пабыў у Астравічах нядоўга. З'ехаў да цёткі ў суседні раён.

Якраз у той момант, калі фурманка праязджала каля іхняй хаты, Стась выйшаў на вуліцу. Колы раз-пораз ускоквалі ў каляіны, запоўненыя халоднай і вязкай граззю, і стралялі ў бакі калючымі пырскамі. Конь ужо выбіўся з сіл і браў дарогу рыўкамі.

Паліцаі кіраваліся, пэўна, да старасты, у самы канец вёскі. Адзін з іх, звесіўшы ногі ў заляпаных чоботах, сядзеў ззаду. Кола ўскочыла ў глыбокую яміну на дарозе, чалавека падкінула ўверх, бы на спружынах, і ён падняў галаву. Ягоны твар быў шэры, быццам пасыпаны попелам, але пільны позірк лязом разануў па хлопцу. Стась пазнаў яго адразу, і ногі, здавалася, прыкіпелі да зямлі. Ён ледзь парухаў імі, адвярнуўся ад падводы і пабег назад, у хату. Ускочыўшы ў сенцы, зачарпнуў вады глыбокімі, бы човен, прыгаршчамі проста з вядра, стаў піць. Потым прыціснуў успацелы лоб да халоднага вушака.

— Стасё, ты чаго? — здзівілася маці.

— Не бачыла хіба?

— А-а-а... Няхай іх багнюка бачыць! І гэты, вядзьмар наш, з імі... Паявіўся.

— Паявіўся, мама... Яшчэ як паявіўся!

Ён ведаў, што маці яшчэ ні разу не называла ні старога Малашчыцкага, дзядзьку Андрэя, ні яго сына Васіля ведзьмарамі. Праўда, у Астравічах мала хто мянціў пра гэта языком. Але плётка была жывучая і распаўзлася нават па суседніх вёсках, асабліва пасля той перадваеннай вясны, калі стары Малашчыцкі ўтапіўся ў багне.

Якраз тады Васіль працаваў на чыгунцы ў Негарэлым. Аднойчы ў суботу ён прыехаў дахаты памагчы пасадзіць бульбу. Вясна выдалася на ўцеху. Рака ўжо амаль аціхла, і яе жоўтыя берагі прапахлі п'янкім вербавым дымам і салодкай ліпкай лазой. Вясёлыя вятры высока ў небе круцілі сонечны флюгер, з другога боку ад ракі, за вёскаю, здрадліва раскашавала купчастае балота. Вочы адбіраў кураслеп. Адчайныя, схмялелыя ад навакольнага хараства хлапчукі пераскоквалі на балоце з купіны на купіну, стараючыся наблізіцца да сцяны карчоў і чароту, выпорваючы з травы качыныя гнёзды. Наядаліся яек так, што ў жыватах цэлы дзень ігралі чортавы цымбалы.

Бацькі дзягамі адвучвалі малых ад такіх паходаў, бо калі хто, не дай бог, трапіць у багну, то ніякі вецер не данясе ў вёску нават самыя моцныя крыкі.

У тых карчах, у тым страшным кураслепавым балоце і загінуў стары Малашчыцкі. Даведаўшыся, што Язэп, малодшы з сыноў, пайшоў па качыныя яйкі, кінуўся на балота. Праз якую гадзіну туды ж пабег і ўстрывожаны Васіль, але хутка вярнуўся, па вушы перапэцканы ў руды мул. Ледзь перастаўляючы ногі, ён цягнуў на плячах амаль непрытомнага брата. Збегшыся да двара Малашчыцкіх, людзі толькі ціха перашэптваліся, смялейшыя заходзілі ў хату. Васіль нікога не бачыў і нічога не чуў — нібыта акамянеў на лаве. А калі пачынаў смяяцца, то здавалася, што ягоны глухі смех падае на людзей цвёрдымі грудкамі высахлай гліны.

Ужо назаўтра суседка Малашчыцкіх, Паланея Піліпчук, лётала, як апечаная, па астравіцкіх хатах, расказваючы не-

вядома адкуль уведанае. Быццам у багну трапілі адразу двое, бацька і малодшы з сыноў. Васіль па загадзе бацькі спачатку падаў кій брату і, калі той выпаўз на цвёрдае, пачаў ратаваць бацьку. Але кій не вытрымаў цяжкага мужчынскага цела, трэснуў, і Васіль страціў раўнавагу. Калі ж ён падхапіўся на ногі, бацькі ўжо не было.

Менавіта ў тую вясну, настрашаная і агаломшаная смерцю на балоце, вёска ўсхадзілася ад размоў пра нейкую вядзьмарскую сілу Малашчыцкіх. Болей за ўсіх старалася набожная Паланея, усё трубіла пра перададзенае Васілю бацькава вядзьмарства, размахваючы перад астравіцкімі кабетамі доўгімі, як граблі, рукамі. Тыя толькі глыбей укопваліся ў прызбы і слухалі Паланеіны байкі са спалоханымі вачамі.

Дома Стась неяк загаварыў пра Паланею, але маці нечакана рэзка абарвала:

— Каб яе на вілах насіла, пасялуху... Ну, гляньце вы, і ў хаце роднай няма спакою. Лапухі развесіў, слухае... Кавалер! — І адвярнулася.— Брахня ўсё гэта!

Стась не адазваўся, здзіўлены пачутым.

Маці таксама памаўчала, пасля раптам падхапілася, падбегла да печы і пачала вымаць чыгун са свіною бульбаю. Але Стась сам выцягнуў бульбу і вывернуў яе ў цабэрак. Да столі белым слупам паднялася вільготная пара.

— Ды Андрэй Малашчыцкі ніколі рук не шкадаваў! Ці дзень, ці ноч, а ён гарбеў, як той вол! От жа трудзяга быў... Нігды не забуду! І такі, знаеш, праўдзівы быў. Што пра каго думае, тое і рэжа ў вочы... От так... А Паланеі — што? У яе свой інтэрас...— Маці ўзяла таўкач, схілілася над цабэркам і рашуча закончыла: — Прайдзісветка твая Паланея!

Чаму Паланея ягоная — Стась не разумеў, але пытаць не стаў. Выхапіў з-пад матчынага таўкача гладзенькую, як шарык, бульбіну, пачаў таропка лупіць яе і хукаць на апечаныя пальцы. Маці засмяялася — от яшчэ, як малы,— і неяк адразу палагаднела.

— Эх, Стасё, такое наша жыццё. А як цяпер помню... Вярнуўся Андрэй з фронту, у будзёнаўцы ды пры вусах.

Герой! Зімой, перад Калядамі, ці што... Такі, праўда, зранены, бы яго там заместа капусты шаткавалі...

Усміхнулася неяк сарамліва і сумна, як умеюць усміхацца толькі немаладыя вясковыя жанчыны. Паціснула плячамі і нахілілася над бульбаю.

— Піліпчукі тады багатыя былі. Андрэй, як пачалі камуну збіраць, з прыезджым нейкім зайшоў да іх. Насенне, кажуць, вымагаў. А як выходзілі, у сенцах нехта Андрэя па галаве абушком і цюкнуў. Думалі, капцы ўжо. Піліпчук сáма тады і збег, як у палонку праваліўся... От так было. А Паланея як асатанела. Ну, чыста змяя стала. Усё «вядзьмар» ды «вядзьмар». Пляце... А ты, дурань, паўтараеш!

Маці ўжо замяшала парсюку і з вядром пайшла ў хлеў, Стась жа моўчкі сядзеў і думаў. Нечакана ўспомніліся тыя доўгія зімовыя вечары маленства, калі хлапчукі збіраліся ў іхняй хаце і зашываліся на печ. Нехта з хлопцаў прыглушаным ад страху голасам расказваў пра раскапаныя магілы і таямнічыя здарэнні з мерцвякамі. Пасля такіх расказаў многія яшчэ доўга не асмельваліся выходзіць на вуліцу і ісці дахаты. Нават цяпер, праз гады, тыя байкі не хацелі забывацца. Яны толькі прыглухлі ў глыбіні памяці. І ўсё ж у нейкія моманты раптам ажывалі і зноў сціскалі сэрца страхам...

Стасевы думкі зноў перакінуліся да Паланеі — як смешна і ў той жа час пагрозліва яна размахвала сваімі доўгімі рукамі перад жанкамі і сіпела: «Вядзьмар... Што праўда, то праўда! Гэта ж, людцы мае, і сыну перадаў! А як жа, перадаў!»

Стась выйшаў у сенцы, узяў старое, вышчарбленае вясло і падаўся ў гарод. Вада затапіла яго амаль напалову. З правага боку месца было вышэйшае, і туды, калі яшчэ пра паводку і вераб'і не шапталі, ён прыкаціў старую калоду, прывязаў да яе выцягнуты на сухое човен. Калі пачалася сапраўдная вясна, паводка падмачыла толькі чорнае прасмоленае днішча.

Стась ссунуў човен на ваду і паціху павеславаў да старой кузні, што стаяла на вострым, бы горб, голым пагорку праз некалькі двароў адсюль. Тут паводка дзялілася на два рукавы: левы тапіў гарод астравіцкага старасты, пра-

вы — гарод каваля, які памёр яшчэ перад вайною. Недалёка ад пустой кавалёвай хаты і стаяла кузня. Пасля смерці гаспадара абедзве будыніны таксама нібыта памерлі. Нават сцены ўзяліся зялёнаю слізкаю бросняй.

Стась акуратна сеў на маленькую лавачку так, што качыны нос чоўна высока падняўся над вадою і дробныя хвалі рытмічна заплялскалі аб днішча. Было ветрана. Цёмныя, зеленаватыя, бы жабурынне, ліпкія хмары апускаліся ўсё ніжай. Часам вада падносіла да чоўна жмені ўчарнелага сена. І хоць у іх, Іванчанкаў, ужо даўно не было каровы, Стась асцярожна падымаў сена і чакаў, калі аццячэ вада, потым рассцілаў яго на днішчы сохнуць.

Ён асцярожна паклаў вясло і прыціх, утуліў галаву ў плечы, нібыта баяўся, што на яго вось-вось наваліцца хмара. Сядзеў і ўспамінаў...

Так, так... Гэта быў ён, Васіль Малашчыцкі. Гэта быў ён... Але чаму разам з паліцаем Грынем?

Пасля той жахлівай бацькавай смерці Васіль не прыязджаў у вёску цэлае лета. Нават Паланея прыціхла. Вёска таксама жыла сваімі, толькі ёй адной блізкімі і зразумелымі клопатамі — надыходзіла касавіца. Неяк пад вечар у хату да Іванчанкаў завітаў сусед, дзядзька Хвядос, прапанаваў Стасю паехаць разам з ім падводаю па косы ў Негарэлае. Хлопец з радасцю згадзіўся. А ўжо назаўтра ранічкаю маці Васіля Малашчыцкага, сівая — бабуля, і ўсё тут — цётка Ніна, прынесла Стасю палатняную торбачку з яйкамі і салам. Папрасіла перадаць сыну. Турбавалася толькі, ці здолее Стась знайсці яго ў тым тлумным Негарэлым.

— Не іголка! Знайду, цётка Ніна. Ён жа на станцыі працуе? Ну во! Было б чаго плакаць!

Але чым настойлівей Стась супакойваў Васілёву маці, тым сумней яна пазірала ў акно, падносячы да вялікіх, напоўненых слязамі вачэй ражок хусткі.

З выездам крыху прыпазніліся, сонца ўжо разлівала па дарозе жоўты алей першых промняў. Але конь ішоў лёгка, і праз гадзіны дзве колы загрукацелі па мястэчковай брукаванцы.

Пасля нізкіх драўляных дамкоў зажаўцелі хаця і невысокія, але акуратныя цагляныя будынкі. Крама, каля якой яны спыніліся, у суседстве з імі здалася хаткаю на курыных лапах. Каля яе ўжо стаяла некалькі фурманак з суседніх вёсак.

Унутры крамы было цесна. Мужчыны гучна, бы на кірмашы, перамаўляліся і выціралі ўспацелыя твары вялікімі далонямі. Было так горача — хоць ты дзверы з петляў здымай...

Косы выбіралі доўга. Стаўшы перад акном і выцягнуўшы наперад руку з касою, што ледзь не ўтыркалася вастрыём у шыбіну, дзядзька Хвядос доўга глядзеў, прыжмурыўшы адно вока, на бліскучае лязо, потым пстрыкаў па ім сваім моцным пазногцем, прыслухоўваючыся да тонкага металічнага звону. Стась толькі назіраў за ўсім...

Нарэшце купілі і косы, і чыгункі, і цвікі, уладкавалі набытае на возе. Дзядзька адразу ж павесялеў і прабубнеў у доўгі нос, што хоча паехаць да сваяка. Стась ледзь не зарагатаў, ведаючы, што ўсе дзядзькавы сваякі тут — у бліжэйшай піўной. Але і ў самога была пільная справа — знайсці Васіля Малашчыцкага. Дамовіліся сустрэцца тут жа, каля крамы.

Саромеючыся спыняць незнаёмых людзей, Стась наўгад пайшоў спачатку па шырокай вуліцы направа, потым звярнуў з яе ў першы ж брудны завулак. І ледзь не адразу ж перад ягонымі вачамі зашарэў высокі чыгуначны насып. З невялікай будкі на пераездзе смешна выкаціўся тоўсценькі жвавы дзяжурны, і Стась зразумеў, што станцыя недзе зусім блізка. Павярнуў да нейкіх доўгіх і чорных будынін без акон, каля якіх высіліся штабялі дошак. Паблізу іх, у тупіку, стаяла некалькі пашарпаных вагончыкаў.

Васіля ён угледзеў яшчэ здалёк: якраз выйшаў з дзвярэй прыгожанькага, як цацка, станцыйнага будынка — і ўзрадаваўся. Васіль, відаць, таксама зачапіў яго позіркам, бо адразу ж пабег насустрач.

Ледзь аддыхваючыся і паспяваючы адказваць на ягоныя пытанні, Стась з непрывычкі высока падымаў ногі, пераступаючы рэйкі. Нават не заўважыў, як падышлі да па-

равоза. А заўважыўшы яго, здзіўлена спыніўся. Так блізка бачыць гэты жалезны цуд яму давялося ўпершыню.

— Ну што, братка, харошыя ў нас жарабцы? — засмяяўся Васіль.

— І ты... Ты тэж ездзіш?

— Буду, братка, буду. А пакуль што гайкі толькі падкручваю. І гэта трэба, праўда?

Паравоз, як жывы, дыхнуў параю. У дзвярах, над Стасевай галавою, ужо стаяў машыніст, і на яго мурзатым і хітрым, як у цыгана, усмешлівым твары ажно блішчалі белыя зубы.

— Р-работнічак, давай лапу!

Машыніст быў яшчэ зусім малады, не старэйшы нават за Васіля.

— Давай, давай, не бойся...

Стась пачырванеў, таропка падаў яму руку і тут жа, нечакана хутка для самога сябе, апынуўся наверсе, унутры паравоза. На мурзатым твары машыніста ўсё яшчэ свяцілася вясёлая ўсмешка, і Стась паціху супакоіўся і пасмялеў. Душу перапаўняла новае шчымлівае пачуццё гордасці, нават здалося, што варта яму зараз добра агледзецца тут, пакруціць хоць бы вунь тое бліскучае колца — і вялікая разумная машына ажыве, задрыжыць, загрукоча коламі і панясецца па рэйках наперад. І гэтаму імкліваму руху не будзе ні канца ні краю.

— Ну як, зямляча, спадабалася? Узяло? — Васіль таксама падняўся наверх і засланіў сваімі шырокімі плячамі святло ў адчыненых дзвярах.— Можа, працаваць хочаш у нас? То прыходзь, пасаблю...

Але Стась маўчаў...

...У Астравічы вярталіся вечарам. Дзядзька Хвядос быў нападпітку і адразу ж, як толькі выехалі за райцэнтр, разлёгся збоку на саломе і заснуў.

Стась амаль не кратаў лейцамі, конь сам добра ведаў дарогу і спяшаўся. Пачала насядаць камарэча і даймаць так, што Стась часам падымаўся на ногі, махаючы навокал пінжачком. Дзядзька хроп з глыбокімі груднымі ўсхліпамі,

9. Зак. 1877

і па Стасевай спіне прабягалі непрыемныя мурашкі. Ведама, такім насішчам толькі пянькі ў лесе карчаваць!..

Цямнела. Рэдкія карчы каля дарогі праплывалі міма і таямніча, як жывыя, варушыліся. Гэта наганяла трывогу, і Стасю раптам захацелася крыкнуць на поўны голас. Жаданне было такім моцным, што здалося, быццам над чорнымі прорвамі блізкага балота, над гэтаю таямнічаю дарогаю сапраўды пралунаў крык. Ён разгайдаў туман, скруціў яго ў вільготныя клубкі і пагнаў па зямлі.

— Гу-а... Гу-а-а...

Не, гэта быў не проста голас, а звонкі паравозны гудок. Адкуль ён прыляцеў сюды? Стась не ведаў, але быў упэўнены, што гудок той ён сапраўды чуў.

— Стась... Стась! Заснуў ты там, ці што?

Стась уздрыгнуў ад нечаканасці, ледзь не выпусціўшы з рук вясло. І вярнуўся з успамінаў...

Човен адплыў ад кузні, і хвалі прыгналі яго ў гарод да старасты. Цяпер ён не гайдаўся, прыбіты да мулкага берага. Зусім блізка, ледзь не чэрпаючы чобатамі чорную тарфяную жыжку, стаяў Васіль Малашчыцкі.

— Бачу, курсіруеш тут па гародзе, як па канале... Не баішся?

— Гэта каго мне баяцца, можа, цябе?

— Я-то я... А вось як вунь каля таго калка выплыве якая бомба, што тады?

Васіль блазнаваў, і Стась не сцярпеў:

— Можа, і выплыве! Толькі яшчэ невядома, каму баяцца!

— Ну, калі ты такі смелы, то, можа, скажаш мне, ці гавораць у вёсцы пра... пра гэта...

Стась падняўся, каб адпіхнуцца ад гразкага берага, але пры апошніх словах Васіля насцярожыўся, перапытаў:

— Пра што гэта... гавораць?

— Пра што? Га, пра што! Станцыю ноччу бамбілі!

Рукі ў Стася зрабіліся гарачымі і сухімі, а вясло пацяжэла.

— Хто?

— Ды, пэўна ж, не немцы! — Васіль скрывіўся і задумаўся. Нарэшце спадылба глянуў на Стася, рашуча загадаў: — Вылазь, братка, з чоўна, пойдзеш са мною...

— Ага, тэж мне! Пайду! Гэта куды?

— Таго самага лётчыка шукаць, што станцыю бамбіў. Кажуць, ён на парашуце спусціўся. Толькі не тут, а недзе за ракою...

— Чаго ж вы сюды...

— А што? Усяк бывае. Во Грынь лавіць яго прыехаў. Аднак жа, як казаў мой дружок Лявон, дай божа сляпой курыцы чарвяка злавіць!

Стась налёг з усяе сілы на вясло, каб зрушыцца з месца, але Малашчыцкі нахіліўся і, схапіўшы човен за нос, так ірвануў яго да сябе, што Стась ледзь утрымаўся на нагах.

— Ты чаго прычапіўся?

— Пачакай, не крычы ты...

Васіль пацямнеў тварам і адразу ж здаўся нейкім хворым, загаварыў глуха і даверліва, нібыта без яго, Стася, яму сапраўды ніяк не ўправіцца.

— Ты думаеш, што і я ў бобіках хаджу... От што ты падумаў! А я да Грыня толькі па дарозе падсеў! Ішоў, каб хоць на хату сваю глянуць... На магілу матчыну...

— Дык ідзі і глядзі... Чаго стаіш?

— А ты не кіпі! Тэж герой! Я, папраўдзе, дык і сам не ведаў, што Грынь бобік!

Васіль памаўчаў, абдумваючы нешта сваё, потым паглядзеў на Стася калючым запытальным позіркам. Пасля пачаў ціха, з ранейшым даверам:

— Як учуў, што Грынь едзе таго лётчыка шукаць, то й падумаў сам сабе... А што, калі і праўда? А калі тут той лётчык? Га? От-то! Хто можа сказаць? Грынь-то не верыць, спакойна прыехаў, адзін, для адчэпнага... Астатніх за раку пагналі... Шукаюць... А я вось падумаў, што ўсё можа быць. Грынь дурны, калі што якое — бяды наробіць! От так, Стась! Так што схадзі ты са мной! Памажы! Ну, прашу!

— А людзі што падумаюць?

— Што падумаюць! Што падумаюць?! Няхай конь думае! А мне ніяк не ўправіцца! — Васіль, здаецца, страціў цярпенне, рашуча звузіў вочы: — Пойдзем, Стась!

І Стась згадзіўся.

Яны былі ўжо на балоце.

Стась бег за Васілём, Грынь адставаў. Жыў Грынь у Негарэлым, але Астравічы ведаў, як уласныя кішэні, бо перад вайною кожнае лета прыязджаў да сваёй цёткі Паланеі ў госці. Баючыся гарачага пяску, усё лета хадзіў у белых тапачках.

Цяпер гэта быў невысокі каржакаваты дзяцюк з тонкімі вуснамі і блакітнымі вачамі. Шчокі яго і нават невысокі лоб густа абсыпалі ружовыя прышчыкі.

Успомнілася, як Грынь аднойчы расказваў хлопцам пра вядзьмарства Малашчыцкіх, размахваючы гэтак жа, як цётка Паланея, рукамі і гэтак жа, як яна, паўтараючы: «Божа ж, мой божа, і не пакарае!» Нехта са старэйшых, падслухаўшы аднойчы тую балбатню, засмяяўся: «Гэта ж трэба, і словы Паланеіны рыхтык пазбіраў».

— Не, не магу, сэрца разарвецца,— прахрыпеў Грынь і апоўз на зямлю.

— Ладна, адпачнём,— згадзіўся Васіль.

Стась ляжаў на халоднай траве і папракаў сябе за тое, што ўступіў Васілю. Паўдня яны гойсаюць па балоце, як шалёныя сабакі, а ўсё дарэмна. Але, зрэшты, не ўтома мучыла яго, а пачуццё невядомасці, едкага сораму перад маці і вёскаю: яны ж нічога не ведаюць. Думаюць, напэўна, што Васіль таксама паліцай. І што ён, Стась, таксама з імі…

Стась пазіраў у сіняе глыбокае неба, адчуваючы разгарачанаю ўспацелаю спінаю свежы халадок вільготнай зямлі. І раптам падумаў, што ён зараз можа прастудзіцца, захварэць і памерці. Яго пакладуць у дамавіну і пад матчыны крыкі і плач закапаюць глыбока-глыбока. І тады ўсё добра скончыцца. Людзі скажуць… Стась падумаў, пра што могуць сказаць людзі, і стомлена, са стогнам павярнуўся на бок. Перад вачамі затрапяталі чырвоныя і чорныя мушкі. П’яніў рэзкі пах перагнілай балотнай травы і карэнняў. Але думка пра тое, што ён сёння, магчыма, памыліўся ў Васілю і, як сляпое кацяня, бездапаможна слухаецца яго, засела ў горле, як корак, і душыла, душыла…

У Васіля замест сэрца, здавалася, была помпа. Ён нават не прысеў. Недалёка ад месца іхняга прыстанку была тая самая ведзьмарова купіна.

«Няўжо і туды пойдзем?» — пахаладзеў нутром Стась, заўважыўшы, як Васіль уважліва абмацвае вачамі паласу карчоў, за якімі пачыналася дрыгва.

— Ну, хопіць, хлопцы, уставайце...

Сказаў так, нібыта яны былі на звычайнай рабоце, па касьбе. Што трэба, маўляў, падымацца ды брацца за косы...

Усе трое ўтыркалі ў здрадлівую зеляноту доўгія кійкі, каб неспадзеўкі не трапіць у гнілую дзірку. Чым бліжай падступаліся да страшнага месца, тым часцей з-пад купін вырывалася з бульканнем і шыпеннем іржавая вада. Ішлі моўчкі. І раптам адтуль, дзе чарнелі карчы, пачуўся крык. Клікаў на дапамогу, няйначай, той самы лётчык, бо хто з мясцовых пойдзе туды ў такую пару.

Крык паўтарыўся, і яны пабеглі, не зважаючы на тое, што купіны пад нагамі хадзілі, як на спружынах.

... Лётчык быў сярэдніх гадоў з тонкімі вусікамі і вузкімі шчылінамі вачэй.

— Папаўся,— плюнуў праз зубы Грынь і пачаў сцягваць з пляча вінтоўку.

— Ціха! — крыкнуў на яго Васіль, падступаючы да чорнай лапіны ўсё бліжай, падаў лётчыку кій. Але той зноў закрычаў, тузануўся з усяе сілы, ажно навокал яго закалыхалася шараватая, з бліскучай гладкаю паверхняю, балотная гразь, і тут жа праваліўся па самыя грудзі.

— Кій бяры!

На шырокім лётчыкавым твары варухнуліся пабялелыя вусны. Ён падняў руку, але цела апускалася ў студзяністую прорву ўсё глыбей. Васіль, не азірнуўшыся, загадаў хрыплым голасам:

— Давайце кіі!

Ён нахіліўся, паклаў кіі перад сабою, потым асцярожна, упіраючыся рукамі ў купіны, лёг на іх і пачаў павольна падсоўвацца да лётчыка.

Стась зразумеў, што адбываецца нешта нечаканае і небяспечнае, але таксама лёг на дрогкую зямлю, шукаючы каленямі цвярдзейшыя лапіны. Прайшла хвіліна. Дзве ці тры... Вось-вось павінна было здарыцца страшнае.

Васіль паспеў схапіць лётчыка за руку, калі той праваліўся ў багну па самыя плечы. Толькі адзін неасцярожны рух — і Васіль услед за лётчыкам мог усунуцца ў прорву. Трэба было нешта рабіць...

І тады Стась аберуч абхапіў Васіля за ногі, за чобаты, што чарнелі падэшвамі перад самым ягоным носам, і з усяе сілы тузануў іх да сябе. А потым гэтак жа неасцярожна і ўтрапёна, як ашалеўшы ад страху і злосці, пачаў адпаўзаць назад, цягнучы за сабою і Васіля...

Вырашылі ісці ў Каптонічы — да гэтай вёскі хоць і не так блізка, затое дарога была сушэйшая. Неслі лётчыка на плячах, па чарзе. На небе ўспыхнулі першыя зоркі, але ноч не спяшалася наступаць, было яшчэ даволі светла. І толькі балота, ужо за плячамі, ляжала чорнай нерухомай пустыняю.

Пачуўшы незнаёмых, каптоніцкія сабакі ажно заліліся тонкім брэхам. Грынь, мінаючы гароды, паціху кіраваўся да хаты тутэйшага старасты Якіма. Стукнуў у акно. Выскачыўшы на ганак і пазнаўшы гасцей, гаспадар толькі ляпнуў вялікімі рукамі па баках і здзіўлена пакруціў лысай і доўгай, бы гусінае яйка, галавою.

У хаце гарэла падвешаная да столі над сталом вялікая лямпа. Лётчыка пераапранулі ў сухое адзенне, звязалі на ўсякі выпадак рукі тонкаю вяроўчынаю. Бо так захацеў Грынь. Паселі, дзе хто мог. Васіль апусціўся на лаву каля стала змрочны, насуплены, засяроджаны. Стараста неяк па-дурному ўсміхаўся, але ні аб чым пакуль што не пытаў. Паставіў на стол пляшку гарэлкі і шклянкі, гліняную міску з агуркамі. Пачаў кроіць хлеб.

— Ну, вось што, хлопцы, нам тут,— Васіль абвёў насмешлівымі вачамі хату,— усім не ўлегчыся.

— Гэта чаму ж? — вяла запярэчыў Грынь.— Калі гэта людзям хаты не хапала?!

Не адказаўшы яму, Васіль перавёў позірк на старасту, кашлянуў у кулак.

— От, не заўважыў, ці ёсць у цябе лазня?

— Стаіць, а дзе ж ёй падзецца!.. Хаця халодная, страх!

— Нічога, ніякая халера яго,— Васіль кіўнуў у бок лётчыка,— не возьме. Варту паставім, каб не ўцёк.

— Гэта хто ж стаяць будзе? — з'едліва ўсміхнуўся Грынь.

— Каго пастаўлю, той і будзе!

— Ну, то сам і пастаіш! Начальнік мне знайшоўся... Кацiся адсюль, пакуль не позна. Я цябе наогул не клікаў!

Васіль нават галавы не павярнуў да Грыня, нібыта і сапраўды быў якім начальнікам, моўчкі разліў гарэлку ў шклянкі і адну з іх па-гаспадарску падаў старасту.

— На дарожку, весялей будзе... Пакуль светла яшчэ!

Стараста ахвотна выпіў, хруснуў агурком і глянуў на прысутных маленькімі, як у свінні, вочкамі.

— І дзе гэта вы яго злапалі?!

— У ведзьмаровай купіне! — зарагатаў Грынь, але, глянуўшы на Васіля, асекся.

— Ого, не дзіва! Сам гаспадар, пэўна, з таго пекла даставаў... Яму ж не ўпярвой! — смела блазнаваў стараста, цікуючы за Васілём. Бы дурным ілбом арэхі пляжыў.

— Штукар ты, бачу, Якім,— ціха прашаптаў Васіль, павярнуўшыся да яго.— Штукар... Ну, то бяры хутчэй каня запрагай ды шпар у Негарэлае. Можа, раніцаю ўжо і прыедуць.

— У Негарэлае? Ты што, з глузду з'ехаў?! Куды ж я, нанач гледзячы? Учудзіў... Гэта ж, можа, не на гулянку табе?!

— І я пра тое, што не на гулянку... А ты што, хочаш, каб нас тут усіх... партызаны...

— Жартуеш,— усё яшчэ не верыў стараста,— куды ж такою парою?! Ты што?! Якія партызаны?!

— А ты,— Васіль зірнуў на Грыня,— павартуй яго трохі ў лазні. А то й праўда, калі партызаны, то мы ўжо са Стасем як-небудзь паспеем... Драла даць! А вы ўжо сядзіце там сабе ціхенька, век не знойдуць. Вось так...

— Не паеду я, хоць рэж, не паеду! — стараста глядзеў на ўсіх злосным позіркам.

— Паедзеш як міленькі! — павярнуўся да яго Васіль.— От так! Спяшайся, а то зусім сцямнее.

— Вядзьмар ты пракляты. Вядзьмар! — прасіпеў гаспадар, але пярэчыць болей не стаў. Хістаючыся, пайшоў да дзвярэй.

— Але чаму б нам самім не завесці яго ў Негарэлае? — Грынь кіўнуў на лётчыка.

— А калі і праўда партызаны? — ускіпеў Васіль.— Куды на балоце ўцячэш? Усё сарвецца!

Ён моцна ўдарыў далонню па стале, бы адсек усе пытанні і вырашанае ім было адзіна правільным.

Стась толькі цяпер пачаў пераапранацца ў сухое. Усунуў рукі ў кароткія, вузкія рукавы сарочкі і падумаў пра старасту: «Бач ты, сам тоўсты, нібы сноп, а сарочка — як на дзіця. Зладзюга, удод смярдзючы!»

За ўвесь вечар Стась не мог выціснуць з сябе ні слова, нібыта ўсё, што адбывалася, яго ніяк не кранала. Нічога не мог зразумець. Хлопец, сеўшы за стол, падняў шклянку з гарэлкай, але хутка адсунуў яе ад сябе, бо ў горле ад першага ж глытка быццам закруціўся гарачы свердзел. Павячэраўшы трохі, прымасціўся на тапчане, вузкім і хісткім, бы кладка над раўчуком, з прыкрасцю думаючы пра тое, што Васіль яго проста падмануў, што ён таксама з імі... гэтымі... Але да канца верыць усё ж не хацелася.

Лётчык сядзеў на ўслончыку каля печы. Вочы, удзень чорныя, бы вугаль, пры бляклым святле газоўкі ці проста ад стомленасці і ўнутранага ўтрапення зрабіліся яшчэ вузейшыя і нейкія жоўтыя. Ён ужо зразумеў, у чые рукі трапіў. Зрэдку, калі за сталом пераходзілі на сварку, кідаў на прысутных вострыя насцярожаныя позіркі. Відно, слухаў усё ўважліва, бо, калі Грынь нехаця апрануўся і, клацнуўшы затворам, павесіў вінтоўку на плячо, сам падняўся з услончыка і павольна, апусціўшы галаву, пайшоў да дзвярэй. Следам за ім выйшаў і Васіль.

Хутка вярнуўшыся, Васіль падышоў да Стася, пакратаў яго за плячо. Але Стась не варухнуўся, нібыта ўжо спаў. Васіль патушыў лямпу і палез на печ. Было чутна, як ён там

варочаецца, мосціцца. Потым, здавалася, заснуў, і яго густое дыханне не давала Стасю спакою: «Каб ты задушыўся там, вядзьмак пракляты! Казаў адно, а выйшла вунь як! Дурань жа я!» Стась ледзь не плакаў ад пакутлівай роспачы, ляжаў і прыслухоўваўся да нарастаючай за вокнамі непагадзі. Шыбіны спачатку лёгенька пазвоньвалі, потым па іх забарабаніў дождж. Ударыў першы гром, пасля якога ўся хата напоўнілася грукатам. Здавалася, што над галавою была не саламяная, а гонтавая страха і па ёй гучна тупаў нехта ў вялізных чобатах. Толькі цяпер, упершыню за доўгі пачварны вечар, Стась успомніў пра маці. «А можа, уцячы адсюль?» Ад гэтай нечаканай думкі ён ажно падскочыў на тапчане. «А што, дарога — хоць каціся! Вось толькі лётчык... Як жа з ім? Як жа з лётчыкам?»

Дождж аціхаў. Хмара, мабыць, прайшла бокам, і ад далёкіх маланак вокны раз-пораз залівала няяркім блакітным святлом.

...Калі пачынала грымець, маці вешала на клямку старую анучу, правярала засланку ў печы. Вось цяпер яна, пэўна, села на лаву, прыціснула сухія, цвёрдыя кулачкі да грудзей, каб супакоіць растрывожанае сэрца.

Садзілася яна звычайна не каля самага акна, а трохі збоку, баючыся маланкавага святла. Ці, можа, зусім выйшла на ганак — стаіць пры адчыненых дзвярах і маўчыць. Стаіць адна-адненькая перад чорнаю сцяною дажджу. І моліцца за яго, за Стася.

Стась асцярожна, каб не зарыпеў тапчан, апусціў ногі і патупаў да дзвярэй. У куце на лаве намацаў драўлянае вядро з вадою. Нахіліўся і пачаў, ціха сёрбаючы, піць. Васіль, здаецца, прыціх. Але толькі на хвілінку. Яго хрыплае густое дыханне зноў пачало ўганяць у Стасеву патыліцу іголкі, ажно падступіла нудота. Стась яшчэ раз прыслухаўся, пасля нагнуўся, выцягнуў з-пад лавы абушок, які чамусьці прыкмеціў яшчэ звечара... Яго закалаціла як у ліхаманцы. Ціха адчыніў дзверы і выйшаў у сенцы. Пастаяў трохі, а праз хвіліну, паспеўшы азябнуць, рыўком кінуўся наперад. Наступаючы босымі нагамі на калючыя каменьчыкі,

10. Зак. 1877

скрыгатнуў зубамі, перасільваючы непрыемны страх, які з кожным крокам напаўняў сэрца. Вось яна, лазня...

Было яшчэ трошкі відна. Стась абмацаў мокрыя, шурпатыя сцены, зусім блізка падышоў да дзвярэй. Спыніўся. Стаяў, не ведаючы, што рабіць далей. І раптам дзверы зарыпелі і пачалі павольна адчыняцца. Нехта, пэўна, Грынь, каму ж яшчэ тут быць, спыніўся і вылаяўся. Стась адарваў ад сцяны анямелае плячо, падняў абушок. «Я толькі аглушу... Аглушу яго!» — падумаўшы так, ён рэзка кінуўся наперад, але, мусіць, ступіў на мокрую гліну, паслізнуўся і спінаю грымнуўся вобземлю.

Грынь заенчыў, як падстрэлены заяц, і адскочыў убок. Стась таксама падхапіўся на ногі, няўцямна кінуўся за лазню, але тут жа апамятаўся, крута павярнуў да хаты. Дзверы ў сенцы былі адчыненыя, і ўнутры, ударыўшыся аб драбіну, Стась прыціснуўся да яе рэбраў плячамі, заціх.

З хаты, быццам і не спаў зусім, выскачыў Васіль. Секанул промнем ліхтарыка па сенцах, так што Стась заплюшчыў вочы, выбег на вуліцу. «Не заўважыў!» — у Стася трывожна сціснулася сэрца, але раздумваць не было часу.

Кінуўшы пад лаву абушок, Стась сарваў са сцяны ручнік і пачаў ліхаманкава выціраць брудныя ногі. У сенцах затупалі. Стась кінуў ручнік да печы і як быў у мокрай халоднай вопратцы, так і ўпаў на тапчан, з галавою ўкруціўся ў радно. Усё цела, твар, нават валасы на галаве былі нібы абліты агнём. Рыпнулі дзверы, і ў хату ўваліліся Грынь з Васілём.

Запалілі газоўку. Васіль засмяяўся:

— На вось, герой, каўтні!

— Эх, не верыш ты мне... Дык я кажу табе, быў нехта!

— Ды хто там мог быць?.. У такую непагадзь! Кінь...

— Ат! — было чутна, як Грынь п'е гарэлку.— Няхай гэты падзяжурыць.

— Ды куды яму, сапліўцу... Пацярпі трохі, я замяню... Слухай, а Якім паехаў у Негарэлае?

— А як жа, паехаў.

— А што ж гэта я не чуў?

— Ды ў яго конь — у сястры, на другім канцы сяла...

— А, ну то добра... Гэта добра...

І тут Стась не вытрымаў і з усяе сілы чхнуў. Васіль засмяяўся, падышоў да тапчана і, садраўшы са Стасевай галавы радно, загадаў:

— Выпі!

Потым нахіліўся над ім і прашаптаў у самае вуха: «Нецярплівы ты, аднак... Эх, маладзён, ледзь не сарваў мне дзела...»

Васіль стаяў так, што сваім вялікім, шырокім целам засланяў Стася ад Грыневых вачэй. Стась прыўзняўся на локці, спалоханы, брудны, мокры, і адным духам выпіў шклянку гарэлкі; пякучая, як восеньская крапіва, вадкасць абдзерла вусны і горла. Зваліўся на падушку і зноў закрыўся з галавою. Ён ціха ляжаў пад смярдзючым радном, і мокрае цела паступова пачало саграваацца і моцна свярбець. Але не варушыўся. Ляжаў і пакутаваў. Думаў над Васілёвымі словамі. Толькі цяпер зразумеў, што той чакаў зручнага моманту, правяраў, ці сапраўды стараста паехаў у раён. Чакаў цемры. А ён, Стась, што падумаў... Дурань саплівы!..

Разам з гарэлкай у цела ўлілася сонная ўтома. Перад вачамі пачало трапятаць нешта чорнае, потым чырвонае, жоўтае, імкліва кружыцца, мяняць колеры. І ў гэтым мігатлівым трывожным сне выразна пачала акрэсліваацца вельмі знаёмая постаць. Яна павольна набліжалася, працягвала да яго рукі. «Мама... Мамачка...» Стась кінуўся да маці і — паляцеў.

Ён пачаў прачынацца, калі адчуў, што нехта падышоў і паклаў на ягоную галаву халодную руку. Хацеў падняць павекі, але перад вачамі загайдаўся белы туман. Зноў з'явілася чыясьці постаць. Не, гэта была ўжо не маці... Гэта быў лётчык! Лётчык бег яму насустрач, падымаючы вялізную сякеру. Стась памкнуўся ўцякаць, але не мог адарваць ног ад зямлі. Ён хацеў расказаць лётчыку пра ўсё, але язык не слухаўся. Тады Стась з усяе сілы рвануўся, ускрыкнуў і... расплюшчыў вочы. Стомлены, быццам і не спаў зусім, ён ляжаў на тапчане, не разумеючы, куды трапіў і што з ім

адбываецца. Сэрца шалёна калацілася. Хату ўжо запоўніла ранішняе святло. І тут ён успомніў увесь учарашні дзень і вечар, рэзка павярнуўся тварам да хаты...

Дзіва! Васіль Малашчыцкі ўжо быў на нагах і праз акно асцярожна пазіраў на вуліцу. Стась раптам заўважыў, што ягоныя чобаты заляпаны граззю. Ды і падлога ўся была затаптана бруднымі слядамі. Адразу ж кальнула здагадка, што Васіль, напэўна, не спаў усю ноч, недзе хаваў лётчыка. Можа, і ў Астравічах. А як жа Грынь? Дзе ён? Няўжо Васіль... Няўжо забіў яго?

— Эх ты, герой! — Васіль раптам павярнуўся да яго.— Як захроп, то я і дабудзіцца не мог. Сп'янеў, ці што?

Стась не ведаў, што адказаць, і Васіль зноў павярнуўся да акна.

— Во... Вылазяць ужо! Я ж думаў, што яшчэ й цябе паспею забраць. А я лётчыка, знаеш, ажно ў кузню даставіў... От так! Хай шукаюць!

Ён адвярнуўся ад акна і пачаў уважліва азірацца. Потым падбег да лавы, зграб з яе бруднае, яшчэ мокрае абмундзіраванне лётчыка, што так і праляжала тут усю ноч, чамусьці шпурнуў яго на печ.

Першым у хату зайшоў стараста Якім, за ім уваліўся Грынь, паціраючы на руках белыя палоскі — сляды ад вяроўкі.

Стараста насцярожана азірнуўся, нібыта чакаў убачыць у хаце лётчыка, але, працяўшы Стася злым позіркам, ссунуў бровы, ухмыльнуўся:

— Ладна! Разбірайцеся самі! А немцы во-во будуць!..

— Ты што, раней за іх паспеў? — здзівіўся Васіль.

— Ага, раней! Дурня знайшоў! Каб начамі лётаў! Ага... Пляменніка я паслаў, вот што. Яшчэ ранічкаю. Калі ты спаў тут!

— А я, можа, і не спаў.

— Бачу, падлюка! Усё бачу! Толькі мяне неча... Сам,— стараста павярнуўся да Грыня,— сам іх прывёў, сам і локці кусай! А мяне — неча!..

І моцна стукнуў за сабою дзвярамі.

— Ідзі-тка, Стась, адсюль. Ідзі-ідзі! Мы тут самі... разбяромся! — Васіль гаварыў гэта павольна, не зводзячы позірку з Грыня — пабялелага да сіняватых плям на шчоках, з шырока расплюшчанымі ад жаху вачамі.

— Ты чаго? Жоўтай гразі ў штаны напусціў?

— Не выхадзі! Страляць буду! Ах жа і гады...

Васіль ступіў наперад і стаў перад Грынем. Цяжка, гучна захрыпеў...

Грынь трымаў перад сабою вінтоўку, цэлячыся Васілю проста ў грудзі, і яго рукі трэсліся. Яшчэ раз віскатліва папярэдзіў:

— Не выхадзі! Стральну! Хай толькі парухаецца...

Стасю здалося, што ён пачуў не такое ўжо далёкае вуркатанне матораў. Немцы?..

— Ідзі, Стась! Ідзі, кажу...

— Няхай толькі... От хіба з табою разам! У пекла!

Вінтоўка ўпіралася ў самыя Васілёвы грудзі, і Стась застыў на месцы, нават баючыся варухнуцца. І раптам аж уздрыгнуў ад нечаканага гучнага рогату. Апамятаўшыся, не паверыў вачам. Васіль трымаўся аберуч за ствол вінтоўкі:

— Давай, давай, Грыня... Страляй! Ну што ж ты... не страляеш?

Грынь, здавалася, ужо нічога не бачыў сваімі белымі ад страху вачамі і толькі бясцямна енчыў:

— Вядзьмак пракляты! От і стрэлю! Вядзьмак!.. Толькі ступі! — Яго ўсяго калаціла.— Перадасць! Д'ябла свайго перадасць!

І гэтак жа часта, як некалі цётка Паланея, заміргаў мокрымі павекамі:

— Хай цябе суша!

Стась адвярнуўся. Злавіўшы слыхам недалёкае тарахценне нямецкіх матацыклаў, здзівіўся, што нічога не баіцца.

Грынь усё хліпаў носам. Сарваўся на плаксівы крык:

— Гэта ж перадасць...

Васіль рэзка, як захлынуўшыся, кашлянуў, з усяе сілы крутнуў вінтоўку ўверх і адразу ж вырваў яе з Грыневых рук.

## Лес

Насця, адзіная Раініна дачка, была самаю вабнаю дзяўчынаю ў вёсцы. Чорныя, бліскучыя валасы, быццам Насцю з маленства пагладжвалі па галаве, былі як намаляваныя вакол акуратнага смуглявага тварыку. Нейкае раптоўнае ўтрапенне раз-пораз прабягала па вішнёвых вуснах, якія Насця не-не дый пакусвала роўнымі зубамі. Асабліва прыгожымі, густымі і цёмнымі былі вейкі шырока расплюшчаных вачэй. Нават здавалася, што гэта птушыныя крыльцы падняліся ў лёгкім трапятанні і застылі. Насця і сама была падобная да птушкі, якой ужо так неспакойна-блізка да выраю.

Усе ў вёсцы чакалі Насцінага вяселля з калгасным шафёрам Косцем Лемяшом.

Будучы зяць Раіне падабаўся. І што быў светлачубым і прыветлівым з людзьмі, і што не жлукціў праклятую гарэлку, як большасць халасцякоў, гарланячы пасля на ўсю вёску нязменнае: «Скакаў казак цераз даліну...». Адным словам, дачка не прагадала. З такой радасці Раіна нават надумалася перасыпаць і падняць хату: сваю халупку з насупленаю саламянаю страхою, што ледзь выглядвала на вуліцу з-за нізкаватага лазовага плота. Трэба было замяніць трухлявы вянец, а можа, пераслаць нават падлогу, аб якую, здаецца, сам чорт вастрыў зубы.

Зрэшты, і Косцік, такі шчыра-вясёлы, такі заўсёды шустранькі, як мураш, таксама загарэўся гэтаю перабудоваю. І не дзіва. Як ні круці-вярці, а пасля вяселля жыць яму з Насцяю выпадала толькі ў Раіны. Хоць у прымакі ніколі не збіраўся, а дзецца не было куды. Стары Сымон Лямеш, як бугай, заўпарціўся, нават і слухаць не хацеў пра Насцю. Пра яе, Раініну, адзіначку... Раіна ўнурылася і перастала спаць начамі — усё думала. Ці не таму ён гэтак зацята стаіць на сваім, што ўсяго толькі год назад пахаваў сваю другую жонку? Напэўна, моцна маркоціцца... Аднак успомнілася Раіне і даўняе,— як яшчэ зусім малады ганарысты Сымон Лямеш вынес з яе хаты гарбуз! На вачах усяе вёскі... Але ж

калі тое, людцы мае, было? Ды і ці варта ўспамінаць цяпер колішняе?..

Косцік жартаваў, аднак усе бачылі, што незразумелая бацькава ўпартасць яго таксама насцярожыла. Раіне нават падалося, што хлопец узрадаваўся, калі яму нечакана, у сярэдзіне красавіка, прынеслі вайсковую павестку, якую меўся атрымаць толькі восенню.

З вяселлем вырашылі пачакаць да першага ж прыезду Косціка з арміі. Ды і бацька, можа, да таго часу ўсё ж памякчэе... Адно было само сабою зразумела, што рана ці позна, але гэтыя маладыя ўсё роўна павінны пабрацца. Надта ж харошая пара!..

Вяселле чакала, але хату Раіна рашыла паднаўляць. Выпісала трохі лесу, нагледзела добрых майстроў. Памочнік знайшоўся хутка — рыжы Сёмка, ці, як яго празвалі ў вёсцы, «залаты электрык», які ўжо цэлы месяц кватараваў у іх. Разам са сваім напарнікам, такім жа ўвішным, як і сам, хлопцам з суседняй вёскі, Сёмка праводзіў электрычнасць. У вёсцы яго любілі, амаль штодня саджалі да стала і частавалі. Раіна ўжо не помніла, хто менавіта накіраваў да яе гэтага рыжага Сёмку — ці нехта з сельсавета, ці нават сам старшыня калгаса. Спачатку адмаўлялася ад лішняга клопату, баялася, што гэтае кватаранства можа не спадабацца Лемяшам, асабліва бацьку. Але не мінула і тыдня, як Лемяшоў Косцік і «залаты электрык» пасябравалі і ледзь не абдымаліся пры сустрэчах.

Яшчэ да свайго адыходу ў армію Косцік дамовіўся з рыжым Сёмкам, што той паможа Раіне хоць бы перасыпаць і падняць яе старую халупу. І калі Раіна толькі загаварыла, што трэба прынесці з лесу дзве-тры ношкі моху, Сёмка адразу ж згадзіўся...

У той дзень, паснедаўшы хіба што млявым салодкім пазяханнем, усе трое — Раіна, Насця і рыжы Сёмка — выбраліся ні свет ні зара да Лагвянкі па мох. Спачатку папраставалі праз калгасны двор, потым, жартаўліва перамаўляючыся, заспяшаліся праз лугавіну, збіваючы дробную расу размашыстымі крокамі. Абмінуўшы могілкі, хутка ўвайшлі ў глухі

лес — навокал адразу ж пацямнела. Заўважыўшы крыху спалоханы Раінін позірк, Сёмка страсянуў вогненным чубам і засмяяўся. І Раіна ажно засаромелася свайго страху.

Лагвянскі лес быў хоць і немалады, але здаровы і моцны. Чабаровая замятуха была тут калючая, бы сплеценая з параскіданых паўсюль, сашчэпленых паміж сабою тонкіх спружынак. Раіне здавалася нават, што чабор, пасля таго як яна праходзіла па ім, порстка і звонка распрамляецца і патрэсквае. Гэтаксама патрэсквалі і каляныя, бы выразаныя нажніцамі з зялёнай бляхі, узорыстыя парасончыкі папаратніку. Усё навокал абуджалася і бушавала ранішнімі гукамі і пахамі. Дзяркатае парыпванне ствалоў, бясконцыя шоргаты, дрымотныя і рэзкія ўскрыкі ці свісты чуліся з усіх бакоў, нябачна абвіваліся вакол сасонак, разам з туманам падымаліся і выцягваліся з лесу ў неба праз зялёныя коміны паміж вяршалінамі.

Раіну ажно вадзіла ў бакі. Напэўна, ад таго, што дыханне забіў сваім гаркаватым пахам раннік-матачнік — такі яшчэ маладзенькі, з бліскучым, серабрыста апушаным варсінкамі, лісцем.

Старая сасна каля самай дарогі ўтаропіла ў Раіну чорную вачніцу круглага дупла: якраз тут і павінна было пачынацца мохавае балота. Раіна прыцішыла крокі і азірнулася. Намацаўшы вачамі нізкія кучаравыя карчы буякоў, узрадавалася, што знайшла патрэбную прыкмету, але тут жа спынілася. У нос раптам ударыла рэзкай церпкасцю — няйначай, недзе блізка, раскашуючы, паслала па зямлі сваё доўгае і вузкае, як навастранае з абодвух бакоў, лісце даволі рэдкая ў Лагвянскім лесе пахкая зуброўка.

Насця, якая ішла следам, таксама, відно, учула гэты рэзкі водар, бо засмяялася, крыкнула Раіне, што хутка вернецца. Тут жа сaступіла з дарогі і схавалася за рудавата-зялёнаю сцяною.

Рыжы Сёмка «аукнуў» да Насці, але адказу чакаць не стаў — пабег за ёю следам, за тыя самыя буяковыя карчы і дрэвы. Раіна раззлавалася, пачуўшы, што яны недзе блізка перамаўляюцца, папярэдзіла, каб доўга не бавіліся, і па-

шоргала праз папаратнік да Лагвянкі. Ішла не азіраючыся, раз-пораз нагіналася за позняй чарнікаю і задаволена смакавала яе церпкі сок. Лес пачаў радзець, і Раіна зразумела, што трэба ўзяць трошкі лявей.

Насця з Сёмкам усё яшчэ адставалі, Раіна прыпынілася, нягучна паклікала дачку, спадзеючыся, што тая недзе блізка. Але не, ніхто ёй не адказаў. Тады яна пачала клікаць Насцю ўсё грамчэй, перапаўняючыся раптоўным страхам, кінулася спачатку ў адзін бок, потым у другі, паляцела праз лес, не паспяваючы адхіляцца ад нізкіх калючых галінак. Аббегала амаль усё ўрочышча і дарэшты выбілася з сіл. І раптам спынілася, раздумалася, здагадалася... І толькі тады заплакала.

Насцю яна знайшла праз гадзіны дзве. Якраз каля самай кручы, пад якою ледзь бачным струменьчыкам паміж двух іклаў-камянюкаў выбульквала ціхая Лагвянка.

Прабіўшыся праз мохавае балотца, рачулка адваявала сабе ладную яміну з чорнаю вадою, абкіданую па куп'і берагоў вішнёва-карычневымі ніткамі журавін. Далей зноў рабілася маленькай і вузенькай. Нават самыя заядлыя ягадніцы баяліся совацца да той лагвянскай дзюркі, толькі здалёку абмацвалі вачамі журавінавы россып над саменькаю вадою, з жалем прыцмоквалі языкамі, але набліжацца не асмельваліся.

Насця сядзела пад кручаю, выцягнуўшы, як хлапчанё, перад сабою босыя ногі. Недзе, пэўна, згубіла боты. Добра, што яшчэ так цёпла, бы ўлетку.

Рыжага Сёмкі нідзе блізка не было відаць.

Раіна нават перахрысцілася, калі нечакана ўбачыла, што дачка ўся мокрая, як выцягнутая з бочкі. Сарвала з сябе старэнькі пінжачок, забегала вакол дачкі, не чуючы пад нагамі зямлі. Але Насця нават не заўважыла матчынай таўханіны і бегатні. Яе цёмныя, але нейкія пустыя, як выпітыя Лагвянкаю вочы, здавалася, ужо нічога перад сабою не бачылі. Праз нейкі час Раіна злосна запытала, што здарылася, але Насця пачала неяк нервова, ледзь не задыхаючыся, усхліпваць.

Раіна прыкусіла язык. Чакала, калі Насця, крыху адтаяўшы, раскажа ўсё сама.

І дачка расказала. Усё чыста. Як на споведзі. Расказала пра тое, што адбылося ў гэтым лесе паміж ёю і рыжым Сёмкам, «залатым электрыкам»... Не ўтаіла і таго, што хлопец пачаў заляцацца да яе адразу ж пасля ад'езду Косціка.

Раіна засіпела Насці абразы, потым пачала трэсці яе за плечы і праклінаць таго «паскуднага» кватаранта.

Нарэшце стомлена прысела каля дачкі і зашаптала, як сама сябе супакойваючы:

— Не тыя цяпер парадкі... Усё будзе як след... От падла! Ніч-чога! Жэніцца! Жэніцца, пранцы яго!..

Насця нават не парухалася.

Вяртацца дахаты трэба было вечарам, каб не было чужых вачэй. І Раіна, зрываючы раз'едзеную гразёю скуру па пальцах, пачала дзерці стары мох. Натаптаўшы ладную ношку, нават не заўважыла, якая яна цяпер цяжкая. Іншым разам і не ўсцягнула б такую на плечы. Але цяпер нават не адчула цяжару, які валакла на сваіх плячах з гэтага мохавага, амаль затопленага вячэрняй шэрасцю лесу.

Насця, як дамовіліся, павінна была вярнуцца дахаты толькі з прыцемкамі, і гэта таксама трывожыла, пякло душу.

Раіна стрымлівала як магла слёзы і горкую, што жоўць, прыкрую злосць на кватаранта. Ды і на Насцю таксама. Крыўда здавалася непрымірымай, але дзесьці на палове шляху цяжкая мохавая ношка ўсё ж так знясіліла, што Раіна быццам патухла ўнутры і супакоілася. Падумаўшы, вырашыла пагаварыць з рыжым Сёмкам без лаянкі і пагроз. Усё, што вытварылася ў лесе, ужо не бачылася Раіне такім безвыходна-жахлівым, якім здавалася раней. Але жаночая здагадлівасць і растрывожанае сэрца падказвалі ёй цяпер, што трэба спяшацца з апошняе сілы, ляцець, як на крылах. І Раіна ледзь не пабегла дахаты, сагнуўшыся пад праклятаю ношкаю, часта дыбаючы дрыжачымі ад стомы нагамі, нават не выціраючы са скроняў гарачы пот.

І ўсё ж не паспела. Як і баялася, як яна і здагадвалася, рыжага Сёмкі ў вёсцы ўжо не было...

Мінула некалькі месяцаў. Спачатку Раіна ўважліва сачыла за дачкою, але тая быццам скамянела. І Раіна зрабілася абыякаваю, усё часцей суцяшала сябе тым, што нічога страшнага на самой справе і не адбылося. Дасць бог, забудзецца.

Пачалася зіма, Раіна вярталася са свінарніка, дзе працавала, толькі позна ўвечары. Раніцаю таксама ўсхоплівалася з другімі пеўнямі і ляцела на калгасны двор. Не бачыла дачку цэлымі днямі.

Не бачыла Раіна і таго, што ведала ўжо амаль уся вёска,— яе Насця была цяжарная. Толькі яна, маці, хадзіла, як у дыме нейкага дзіўнага забыцця, у тумане, што засланіў ад яе ўсім бачную праўду. Потым, праз некалькі гадоў, Раіна ўспомніць пра гэта і здзівіцца сваёй незразумелай слепаце. Але гэта ўжо будзе пасля...

Перасохлы мох, прынесены восенню з балота, ляжаў сабе на гарышчы, і Раіна часцяком чула, як там да самай раніцы пішчаць мышы. У адну з такіх бяссонных начэй яна не вытрымала, паднялася, каб паглядзець, што робіцца ў хляве. Апошнім часам там гаспадарыла найбольш Насця. Запаліўшы ліхтар, выйшла з хаты і зарыпела валёнкамі па снезе да хлява. Штурхнула дзверы. Дзве авечкі-недаросткі, чорненькія і маленькія, як блошкі, адразу ж паціс履нуліся ў куток. За зіму яны нарасцілі сабе трохі воўначкі, але Раіна ў адной заўважыла каля вушэй невялічкія, бы прысыпаныя закарэлым попелам, лапінкі каросты. Занепакоілася: «Бяда!» Ад каросты, ды яшчэ ў такую пару, як бач выцягне ногі. Авечку трэба было зарэзаць. Ужо вярнуўшыся ў ложак і чуючы, што пасля двара пачынае імгненна засынаць, Раіна заклапочана падумала, каго ж паклікаць на дапамогу. І тут жа ўспомніла пра Сымона Лемяша — гэты зробіць усё як след.

На наступны дзень пасля абеду Раіна падмянілася на рабоце і пайшла са свінарніка раней. Не завярнуўшы дамоў, адразу падалася да Лемяшовай хаты.

Адчыніўшы дзверы, Раіна спачатку нічога не зразумела — адхіснулася назад, быццам ударылася аб нясцерпны кіслы дух і гаркату перагарэлага тлушчу. Пасля таропка,

гучна павіталася. Сымон нават не павярнуўся да яе, толькі скасіў вочы. Які ён скнара, Раіна чула ад суседзяў яшчэ раней, але тое, што ўбачыла цяпер, яе ўразіла. У хаце не было нават звычайнай лямпы.

На прыпечку замест яе стаяла вялікая бляшанка з растопленым тлушчам, запалены кнот быў умела прымацаваны зверху дроцікам. Жоўтыя водсветы ад агеньчыка мігцелі на сценах і століі, на бліскучых рэбрах вялізнага цэбра, пасярэбранага звонку густа выступіўшай соллю. З брудна-шэрай мяшанкі ў цэбры вытыркаліся краі скур. Сымон з няголенымі шчокамі і шараватымі вуснамі, нібыта іх таксама абсыпала шурпатая соль, выціраў потнае аблічча рукавом. З-пад вялікага, што камень, пукатага лба на Раіну раз-пораз зіркалі маленькія насцярожаныя вочы.

Усё было закопчана тлустым чадам, усё быццам плавала ў жоўта-шэрым тумане, перакрыўленае і перайначанае. І сам гаспадар у блішчастай, дарэшты выцертай скуранай камізэльцы паверх шарачковай сарочкі сядзеў пасярод хаты на шырокай лаве. Як на кані. Каленямі ён моцна прыціскаў да лавы размяклую аўчыну і абскрабаў яе касою. Сутулаватая Лемяшова постаць таксама прывідна пагойдвалася ў рудым тумане, і Раіна ажно спалохалася, хоць некалі ў маленстве сама бачыла, як яе бацька вырабляў скуры.

Сымон быў майстрам на ўсе рукі. Гатовыя аўчыны прадаваў, а са скур і сам умеў што зрабіць на ногі. Вяскоўцам за бульбу ці за тлушч рабіў найчасцей скураныя лапці.

Адступацца было неяк, і Раіна, пракашляўшыся ад задухі, ступіла бліжай да лавы. Ледзь не перавярнула маленькія начовачкі з карычневаю хвойнаю мукою, войкнула.

Сымон быццам ужо ведаў, дзеля чаго яна прыйшла, пэўна ж, сачыў, у каго ў вёсцы ёсць авечкі. Крэкчучы, выпрастаў спіну, паклаў уздоўж лавы касу з рудою поўсцю на лязе і нарэшце падняўся. Зацёклыя ногі, відно, яшчэ не слухаліся яго. Але праз хвілінку Сымон падышоў да прыпечка, па якім ляжаў самаробны нож з шырокім лязом, узяў і схаваў нож ва ўнутраную кішэню камізэлькі. Запаліўшы лучыну, пацягнуўся ў сенцы. Раіна бачыла перад сабою толькі шырокую Лемяшо-

ву спіну, спатыкнулася ў парозе. Ступіўшы ў сенцы, здзіўлена ўтаропіла вочы ў развешаныя на сцяне пад самаю драбінаю скуры. Намазаныя дзёгцем, яны блішчалі ў бляклым святле, як чорныя распятыя начніцы. Сымон, зноў моўчкі, палез на гарышча па рассохлай драбіне, трымаючы агеньчык над самаю галавою. Сапучы, усунуўся ў чорную прарэху гарышча, пачаў нечым там шаргатаць, нешта намацваць. Потым запытаў:

— Колькі будзеш?

Раіна адразу зразумела, што ён пытае пра авечкі, паспешліва адказала:

— Адненькую... Пакуль што.

Тады Сымон кінуў ёй зверху пару перавязаных матузкамі скураных лапцяў, і яны звонка ляпнуліся аб падлогу. Гэта, пэўна, была аплата за аўчыну. Раіна нават узрадавалася, што ўсё так добра ладзіцца.

Цямнела хутка, і яшчэ па дарозе яны вырашылі зрабіць усё пры святле, у сенцах. Каб не пашкодзіць скуру. Адправіўшы Сымона ў хату, Раіна адразу ж пабегла ў хлеўчук. Пераступіўшы праз невысокую загарадку, намацала рукамі тую самую, з пархатымі плямкамі каля вушэй авечачку, аддзяліла і прыціснула яе нагою да сцяны. Потым асцярожна, як немаўлятка, падняла авечачку на рукі і панесла ў хату.

Дзякуй богу, у хаце было цёпла і чыста прыбрана. Раіна падштурхнула авечачку ў куток пад лаву, кінулася вымаць з печы чыгун з вадою і раптам падумала з трывогаю, што стары Лямеш і Насця даволі доўга прабылі ў хаце адны. Аб чым гаварылі яны тут? А можа, спрачаліся, успамінаючы Косціка? А можа... Але ж не, не, з Насці цяпер, хоць забі, ні слова не выцягнеш пра тое лясное здарэнне. Тут не пажалішся, не паспавядаешся!

Спахапіўшыся, Раіна хуценька азірнулася. Спачатку на Сымона, потым на дачку. Насця стаяла каля печы ўся чырвоная, але чырвань яе неяк няроўна, як праз марлю кроў, праступала праз бледныя, пасіверáныя шчокі. Зноў, як тады ў лесе каля кручы, Насця пазірала перад сабою шырока

расплюшчанымі няўцямнымі вачамі. Нечакана для сябе Раіна заўважыла, якая яна поўная ды гладкая, і раптам ледзь не прысела ад здзіўлення. Утаропілася ў Насцю, не верачы, але жах не развейваўся. Так, дачка была цяжарная... Лямеш, напэўна, таксама паспеў усё ўбачыць і зразумець, бо рэзка падняўся з лавы, і тая адразу як бы прысвіснула, схаваў дрыготкімі рукамі прыгатаваны для авечкі нож ва ўнутраную кішэню камізэлькі і сказаў з нейкаю спакойнаю злосцю:

— Ну то вот што, «нявестачка»... Каб да маёй хаты — ні блізка! На пушачны выстрал... Паняла? Прыйдзе, і Косціку скажу... Набраўся сораму да вяселля, то няхай сам і гадуе... А я вам не дзед!

Лямеш уздыхнуў, пераводзячы дыханне, і дадаў з’едліва:

— Няўжо ж па-людску нельга было?

Насця яшчэ больш пачырванела і адвярнулася. Раіна раптам адчула, што яшчэ некалькі рэзкіх папрокаў — і дачка не вытрымае, прызнаецца, што Косцік невінаваты. Схаладзеўшы ад страху, яна падалася наперад, да Насці, але раззлаваны Лямеш ужо тупаў з хаты, гучна ўганяючы чобатамі ў падлогу сваю непрымірымую крыўду. Найперш на сына, які, з’ехаўшы, пакінуў па сабе такую памяць. Аднак жа і яго, бацьку, абняславіў на ўсё сяло.

...Ні горды Лямеш, ні атарапелая ад нечаканай бяды Раіна, ні цяжарная Насця яшчэ не ведалі, што наперадзе іх чакае самае страшнае і што толькі адна вясна аддзяляе ўсіх іх ад вайны.

Першы дзень вайны запомніўся Раіне цалкам ад раніцы да вечара. Праўда, не толькі таму, што вёску аглушыла страшная навіна. Была яшчэ адна прычына: якраз у той чэрвеньскі дзень і нарадзіўся ўнучак. Нарадзіўся вечарам, калі сонца ўжо садзілася за абліты крываваю ружовасцю лес. Была паводка. Сонца смаліла цэлы месяц, аднак вада не ападала. Старшыня калгаса яшчэ ўдзень паляцеў на маторцы праз неўтаймаваную раку ў суседнюю вёску, каб адтуль ужо дабрацца да райцэнтра. Можна было б і на

падводзе ці матацыкле — праскочыць лес і там, дзе рака амаль заўсёды была вузкая і неглыбокая, перамахнуць праз новенькі мост. Але казалі, што рака паднялася так высока, што нават схавала пад сабою мост.

Услед за старшынёю ў райцэнтр кінуліся ўсе, хто меў хоць які човен. Людзі не верылі, што і сапраўды настала бяда. Не хацелі верыць, баяліся пра тое і думаць. Да таго ж паводка пратрымалася так доўга, што ў многіх звяліся запасы солі, цукру, круп.

Раіна схапілася за галаву. Ёй бы таксама трэба было накупляць усялякіх прадуктаў, але дзе цяпер узяць цэлы човен? У сваім дно было дзіравае, што сіта. Да таго ж — пачалося ў Насці. Усю раніцу і амаль цэлы дзень дачка заходзілася ад стогнаў і крыку. Раіна мітусілася, супакойвала і яе, і сябе, маўляў, усё добра, усё так і павінна быць. Зрэшты, даставацца ў гарадскую бальніцу ўсё роўна няма на чым. Ды калі б цяпер які човен і знайшоўся, то як жа на ім Насцю везці? Кідаецца во, як у гарачцы, яшчэ, не дай бог, перакуліць човен...

Прыбегла старая Гэлька, потым суседка. Напалілі печ, заставілі яе чыгунамі з вадою. І самі, не вытрымаўшы Насціных крыкаў, узяліся за справу.

Жывенькі і здаровенькі хлопчык нарадзіўся пасля таго, як Насця толькі ціха стагнала, убіўшы ў столь балючы позірк. Старая Гэлька спалохалася, пачала ліць у рот парадзіхі зеленаватую смярдзючую настойку палыну. Але Насця толькі заплюшчыла вочы.

Першым з райцэнтра вярнуўся суседчын Андрэй, і Раіна стала ледзь не на каленях прасіць яго, каб зноў садзіўся ў човен і плыў па доктара. Набліжалася чорная, без месяца і зорак, ноч. Андрэй разважыў, што нават калі прыладзіць да чоўна ліхтар, то ўсё роўна нічога не ўбачыш. Вада — не дарога. І ўсё ж супакоіў Раіну, паабяцаў адплысці з самай раніцы, як толькі зашарэе.

Ледзь не кожныя паўгадзіны Раіна вылятала з хаты, узіраючыся ў цёмнае неба. Ніколі яшчэ ноч не здавалася ёй такою бясконцаю. Нарэшце пачало трохі святлець, і яна

рашылася пабудзіць Андрэя. Той, цяжка ўздыхаючы, але не гаворачы ні слова, адамкнуў човен і бразнуў аб днішча вяслом. Нарэшце, ускочыўшы ў човен, адпіхнуўся ад берага — і адразу ж знік у шэрым тумане. Чуліся толькі ўдары вясла аб драўляны борт. Затым і яны сціхлі. Раіна падлічыла, што дарога да райцэнтра ў паводку доўжыцца ўдвая і што Андрэй прывязе доктара толькі пасля абеду.

Так яно і сталася.

Немалады, нейкі вельмі ж тонкі і руды, як высушаны ўюн, доктар, відно, быў напалоханы ракою, але, глянуўшы на Насцю, адразу апрануў белы халат і пачаў мітусіцца каля яе, бясконца прыгаворваючы: «Аднак жа! Аднак жа...»

Трэба было хоць чым заняцца, і Раіна, ледзь стрымліваючы слёзы, вырашыла абмыць навародка, які ўжо недавольна пакрэктваў. Вада ў цэбры — сама праверыла яе локцем — была добрая, мякенькая.

Навародак ляжаў на яе, Раіным, ложку. Палатняныя пялёнкі ўжо намоклі, і Раіна злёгку ляпнула голенькага хлопчыка па ружовай пругкасці ніжай спіны. Потым зірнула на галоўку, змеціла над лобікам вогненна-рыжыя кучаравыя валаскі і аж здрыганулася ўся. Нібыта прачнулася, згадваючы нядаўна бачаны страшны сон. І той лес, дзе ўсё пачалося. І Насціну зуброўку... І тую кучаравую рыжую шавялюру Сёмкі — «залатога электрыка», які так ні разу і не аб'явіўся ў вёсцы.

Раіна ўжо не магла дыхаць.

Узяўшы навародка на рукі, яна сціснула зубы і раптам, не думаючы, апусціла яго ўсяго ў цэбар, амаль поўны вады. Патрымала... А навошта шкадаваць, скажыце? Як прыйшоў, так і пойдзе... Чаму яе Насця так пакутуе? З-за каго? З-за гэтага рыжага... Але праз імгненне, калі маленькае цельца нечакана моцна тарганулася ў яе руках, Раіна апрытомнела і ледзь не захлынулася ад жаласці, выхапіла малое з вады і хутка павярнула яго тварыкам уніз, націскаючы пальцамі на ўспучаны жывоцік. Малы каўкнуў, і Раіна ўзрадавалася, нібыта сама нарадзіла гэтага рыжага пузатага найдзёна, нібыта вось цяпер выратавала яго ад смерці, вырвала з не-

чых чужых і злых, а не ўласных рук. Азірнулася цішком на доктара, але той нічога не бачыў. Не адыходзіў ад Насці.

Насця памерла ноччу. Доктар, развітваючыся, пашкадаваў, што не мог дастацца раней, хоць бы перад абедам. Можа, паспеў бы памагчы...

Недзе праз тыдзень пасля таго, як Насцю занеслі на могілкі, Раіна раптам з горыччу падумала аб тым, што адной ёй выгадаваць унука будзе вельмі ж няпроста. Жыць было цяжка, і яна як ашалела каля свайго рыжага хлопчыка, якога назвала Уладзікам. Усхоплівалася ноччу нават на самы слабы піск, ні аб чым ні з кім не раілася. Нікому малога не давярала. Цяпер да яе заходзіла толькі старая Гэлька, але ўсё больш маўчала і ўздыхала. Быццам была ў нечым перад Раінаю вінаватая.

Калі ў вёску наехалі немцы, Раіна яшчэ больш пачала дрыжаць за малога. Нават у двор з ім вытыркалася вельмі рэдка, хваравіта ловячы на сабе варожыя, як здавалася ёй, насмешлівыя позіркі суседзяў. Разам з хлебнаю суслаю малы ахвотна смактаў тоненькія скрылікі сала, і Раіна кожны тыдзень перахоўвала апошні жоўты брусок.

Менавіта ў тую трывожную пару яна і пачула ад старой Гэлькі, што ўся вёска бацькам Уладзіка лічыць Косцю Лемяша. Спачатку адмахнулася — няхай сабе памянцяць языкамі. Зрэшты, а як інačай людзі павінны гаварыць, калі ўсе чакалі вяселля яе Насці з Косцікам?

Але потым Раіна разважыла, што не так усё гэта і добра. Бо як уваб'ецца што паганае ў галаву паліцаям, асабліва шаляпаватаму Гаўрылку, які зроду ненавідзеў усіх Лемяшоў, то хто тады заступіцца?..

Падумаўшы так, Раіна спалохалася яшчэ болей. І недарма...

Неяк вечарам да яе сапраўды ўвалілася двое паліцаяў. Той самы, каго асабліва баялася, таўстагубы Гаўрылка і яшчэ нейкі незнаёмы. Бухаючы ботамі па падлозе, абодва п'яна матлялі галовамі, як сляпыя коні. Асабліва звярыўся Гаўрылка. Тыцкаючы растапыранымі пальцамі ў вогненна-рыжую галоўку Уладзіка, ён доўга рагатаў і пытаўся,

дзе гэта ягоны бацька. Пасля, перавярнуўшы ў хаце ўсё ўверх дном, вывеў і ўпіхнуў Раіну ў пограб.

Аднак хутка і выпусціў. Яшчэ не верачы ў збавенне, як аслепшы, Раіна нават забыла, у які бок кінуцца. Таўстагубы Гаўрылка стаяў перад ёю, трымаючы ў руках новенькія боты, і па-ранейшаму брыдка рагатаў, потым вылаяўся і паплёўся з двара. Уляцеўшы ў хату, Раіна здзівілася, калі ўбачыла там старога Сымона Лемяша. Але нават не павіталася, адразу ж кінулася да асіплага ад крыку ўнука, прытуліла яго да грудзей. Стары Лямеш, відно, пакрыўдзіўся і незадаволены, не сказаўшы ні слова, бразнуў дзвярыма.

Толькі на наступны дзень Раіна даведалася, што гэта Сымон Лямеш і ўлагодзіў паліцаяў. Новымі ботамі і самагонам. Хацела пабегчы і падзякаваць, але раптам асунулася на лаву, умомант зразумеўшы самае галоўнае. Стары Сымон Лямеш таксама не сумняваецца ў тым, што Уладзік яго родны ўнук. Можа, каб ведаў, што ўсё не так, дык і не прыбег бы ратаваць, не слаўся б лістам перад Гаўрылкам! Яшчэ ніхто ў вёсцы не бачыў, каб Сымон Лямеш гнуў перад кім спіну. Хоць пілуй гэтага ўнурыстага крата, а слязы не даб'ешся. Тое ў вёсцы ведалі добра...

І ўсё ж аднойчы, недзе праз год, калі вайна ўжо закончылася, Раіна ўбачыла старога гордага Лемяша зусім іншым. Помніцца, была субота. Першая субота пасля таго, як прагналі немцаў. У вёсцы было сапраўднае свята. Але першым, каму тады прынеслі пахаронку, быў якраз Сымон. Ягоны Косцік, як аказалася, загінуў яшчэ ў самым пачатку вайны, пад Львовам...

Праз некалькі дзён гордага Лемяша цяжка было пазнаць. Страшна п'яны, ён хадзіў па ўсёй вёсцы, чапляючыся за платы, але стараўся не падаць, па-мядзведжы шырока расстаўляючы ногі. Ногі былі босыя і ажно бурачковыя.

Раіна адразу адчула небяспеку для сябе і Уладзіка. Затаілася. Але праз тыдзень Сымон перастаў піць як адрэзаў. І адразу ж прыйшоў да Раіны. Уваліўся ў хату раніцаю і, толькі павітаўшыся, сеў на лаву. Такі, здавалася, цвёр-

ды ўвесь, як выкаваны з жалеза, ажно на плячах патрэсквала сарочка. Сядзеў і доўга курыў, запаўняючы хату горкім тытунёвым смуродам. Чорныя вочкі з-пад навіслага лба бегалі па ўсёй хаце, утыркаючыся то ў чаlеснік, то ў падушкі на ложку. Раіна зразумела, што Сымон хацеў згледзець Уладзіка. Нібыта толькі цяпер, страціўшы сына, ён раптам перамяніўся натураю, памякчэў і пачаў ліхаманкава ўспамінаць тых, каго любіў некалі ягоны Косцік. Напэўна, Сымон Лямеш цяпер кідаўся ад адной згадкі да другой, намацваў хоць якія нітачкі, без якіх яму нельга было ўтрымацца ў жыцці, адолець страшнае гора. Зразумела Раіна яшчэ і тое, што цяпер самаю моцнаю жыццёваю нітачкаю стаў для Сымона Лемяша яе Уладзік.

Лямеш амаль не зважаў на Раіну. Сядзеў і чакаў, як у сябе дома, калі ж з'явіцца малы. Не пытаў, дзе ён, ці гуляе, ці спіць, а толькі чакаў.

І Раіна спалохалася. Здаецца, была ўжо гатовая да гэтай сустрэчы і ўсё абдумала. Яшчэ раней цвёрда вырашыла расказаць Сымону пра тое здарэнне з Насцяю ў лесе. Абы адчапіўся. Навошта тлуміць чалавеку галаву, калі Уладзік сапраўды не Косцікаў. Хоць крычы, хоць па зямлі качайся, а не Лемяшоў.

Не чакаючы, калі Сымон загаворыць, Раіна першаю кінулася ў наступ. Спачатку няўпэўнена, павольна цэдзячы словы, пачала свой расказ пра кватаранта, «залатога электрыка» Сёмку, потым пасмялела. І раптам нечакана для сябе самой успыхнула ад сораму. Раіну ахапіла такое адчуванне, быццам над яе душою пачало ўладарыць нешта вельмі моцнае, добрае, большае за яе ўласную крыўду. Яно не толькі заходзілася болем у Раініным сэрцы, але існавала цяпер усюды, было ўжо ў хаце, сапло сонным Уладзікам з печы, стукала са сцяны ходзікамі...

Стары Лямеш таксама маўчаў. Нарэшце, страціўшы надзею ўбачыць Уладзіка, выняў з кішэні ватоўкі і паклаў на стол загорнутыя ў газету грошы. Сказаў, што гэта для ўнука.

І Раіна чамусьці не абразілася, пашкадавала яго.

Якая ж яна дурная тады была. І з той жаласцю, і са сваім незразумелым маўчаннем. Быццам сама, па сваёй ахвоце, падзяліла ўнука на дваіх.

Прайшло некалькі гадоў. Уладзік, падрастаючы, усё мацней цягнуўся да Сымона. Раіна гэта бачыла і ажно задыхалася ад крыўды і рэўнасці. Сымон жа мякчэў перад малым, як воск, купляў у магазіне ўсё, на што той паказваў пальцам. Першы раз Раіна правучыла ўнука крапівою за новыя, купленыя дзедам сандалікі. Вунь, свае яшчэ добрыя. Як цяпер помніць, закінула той Лемяшоў падарунак на гарышча, але ўпарты малы ледзь не біўся з ёю. Дажылася! Хоць бяры да спаласуй дзягаю! Усё дзеда яму дай...

А дурны Лямеш пазнаваў у малым і сынавы вочы, і сынавы вусны, і нават быццам бы Косцікаў чубчык.

Уладзік быў ужо ў трэцім класе. Амаль кожны дзень, не дачакаўшыся ўнука са школы, Раіна бегла ў Лемяшоў двор і валакла яго адтуль дахаты, злосна сіпела. Яна нібыта не разумела, што гэтаю дурною лаянкаю толькі адваджвае ад сябе ўнука. Вечарам, перад сном, упарта ўбівала ў шалапутную рыжую галаву, што самая родная душа ў яго — гэта яна, яго баба... А такога дзеда, як дзед Сымон, ім і куры на сметніку выграбуць!

Але назаўтра Уладзік зноў тырчаў на Сымонавым двары.

І Раіна не вытрымала. Несучы неяк раніцаю вядро з вадою, раптам выпусціла яго з рук, павалілася прама ў выплюхнутую ваду.

Ашаломалася ўжо ў раённай бальніцы. Мацаючы позіркам нейкія бліскучыя трубачкі і шкляныя бомбачкі, Раіна некалькі дзён была як чужая сама сабе, сваім адчуваннем і сваёй памяці. Нібыта ад усяго пражытага жыцця ў яе застаўся толькі рэзкі, ні дыхнуць, боль у левым баку. Доктар і медсястра ўсміхаліся ёй, але неяк вінавата, перагаворваліся паміж сабою толькі не зразумелымі Раіне словамі. Калолі, паілі нечым горкім, абяцалі, што яна абавязкова паздаравее, калі не будзе так надрывацца і хваляваца.

Адна нянечка, такая ж, як і Раіна, вясковая кабета ў насунутай на вочы белай хустцы, бясконца ўздыхала і жалілася.

Бедавала, што за ўсе свае доўгія гады бальнічнай працы ніяк не прывыкне ні да хворых, ні да мёртвых. І што дзівіцца Раінінаму шчасцю... Гэта ж добра, маўляў, што хутка прывезлі ў бальніцу... А то б не выграблася!

Раіна пабачылася з унукам толькі праз два тыдні. Прывёз яго Сымон, ды і то на некалькі хвілін. Раіна ведала, што цяпер у бальніцы каранцін і ў палату нікога не пускаюць, але вінавацiла ва ўсім толькі Сымона. Не падумала аб тым, што ён і так, відно, доўга ўпрошваў сястру, каб прапусцілі...

Толькі цяпер, пазіраючы ўверх са свайго жалезнага ложка, яна заўважыла, які гэты Сымон высокі і яшчэ моцны. Дужы, што камель. На белай столі рэзка выдзяляліся яго чорныя, яшчэ не вельмі пасечаныя сівізною валасы, яго шырокія, што дзверы ў гумне, грудзі. Захацеў бы — як бач ажаніўся б. Любая маладая ўслед пабяжыць, каб толькі пальцам кіўнуў. Гэта ёй, Раіне, без унука — хоць жыўцом у труну! Не прадыхнуць.

Пасля выпіскі Раіну прывезлі дахаты на бальнічным «газіку». Яна выйшла знарок у самым пачатку вёскі. Мінуўшы цэлую вуліцу, завярнула ў Сымонаў двор і забрала Уладзіка.

За доўгія дні хваробы, спакутаваная толькі адною самаю важнаю сваёй думкаю пра ўнука, Раіна змянілася. Не тое каб агрубела і распалілася ў злосці, а проста пасмялела. Надумалася нарэшце адкрыць гордаму Лемяшу праўду. І яшчэ — сабраць апошнія сілы і хоць напаследак падняць хату. А то і праўда цёмна, нізка. Дзіва, што гэты рыжы верабей лётае да Сымона.

Яшчэ ні аб чым не пагаварыўшы са старшынёю калгаса, не папрасіўшы ні лесу, ні гонты для страхі, яна наважылася спачатку зрабіць лягчэйшую работу. Як некалі да вайны — надраць моху. Потым як-небудзь прывязе прычэп лесу і зоймецца вянцом.

Доўгі час Раіна не хадзіла ў Лагвянскі лес нават па ягады, жалілася суседкам на боль у крыжы. І ёй, вядома, верылі, бо радыкуліт дапякаў усіх жанок. Цяпер жа Раіна махнула рукою на ўсё: і на радыкуліт, і на крыж. Не мінула і тыдня пасля выхаду з бальніцы, як яна сама завяла Уладзіка да

Сымона на цэлы дзень і пайшла ў лес. Пайшла адна, знарок нікога не ўзяўшы ў кампанію.

Ужо даўно выгналі кароў, жанкі палолі соткі, і ніхто ісці з ёю не набіваўся.

Раіне пашанцавала: раніца выпала мяккая і чысценькая, пасля расы прыемна падсушаная сонцам. Лес таксама стаяў перад ёю высокі і празрысты. Раіну непакоіла толькі адно: ці знойдзе яна патрэбную мясціну? Бо была ж тут, дай бог памяць... Колькі ж гэта? Уладзіку якраз дванаццаць гадкоў... Вось і лічы, што ў гэтым лесе Раіна была яшчэ вунь калі... Разам з Насцяю... Гадоў трынаццаць назад!

Успомніўшы дачку, Раіна ледзь не задыхнулася. Горла забілі даўкія балючыя слёзы, ад якіх трэба было хоць крыху адпачыць і супакоіцца. Але расседжвацца не было калі. Нарэшце, асабліва не блудзячы, Раіна натрапіла на тыя самыя буякі, пасля якіх і пачыналася мохавае балота.

Яна адразу заўважыла, што ранейшыя мохавыя мясціны густа зараслі высокімі карчамі воўчых ягад. Над кожным з карчоў ядавіта-дрогкім шараватым воблачкам трымаўся туман, калыхаўся ўваччу. Усё балота хваравіта дыхала багуном. І буякі, і воўчыя ягады не даспелі і бела выблісквалі з рудаватых лісточкаў. Паміж замшэлымі купінамі ў дзіковых слядах стаяла гнілаватая вада.

Раіна так бы і не асмелілася прадрацца праз буяковую сетку, але сонца, падняўшыся высока, раптам вырвалася з-за воблака і ўдарыла па гэтай балотнай чэзласці, з усяе сілы сыпанула на шэрыя купіны жмені залатых падковак. Атрутны чад імгненна развеяўся, і з куп'я адразу ж вызірнулі ярка-чырвоныя і ружовыя, з фіялетавымі сярэдзінамі, сыраежкі, напінаючыся, усё пыжыліся парваць жылкі травы сваімі крохкімі шапачкамі.

Азірнуўшыся на ўсю гэтую раскошу, Раіна незадаволена хмыкнула. Тут моху і са свечкаю не знойдзеш. Па-буслінаму высока падымаючы ногі, яна паволі, асцерагаючыся ямін, накіравалася ў той бок, дзе павінна была працякаць Лагвянка. Нарэшце ўбачыла знаёмую кручу, такую ж лабастую, як і раней, але добра палыселую і пажаўцелую за

гэтыя гады, з новымі норамі. Раіна ведала, што за кручаю, ажно ўзлазячы ёй на самыя плечы, з таго боку разрастаецца малады здаровы сасоннік, але сама там ніколі не была.

Прыгледзеўшыся, узрадавалася таму, што Лагвянка не аддала нахабнаму кустоўю сваю глыбокую яміну, і вакол яе цяпер раскашавала чадная зелянота, аплеценая бляклымі нітачкамі журавін. Мох тут яшчэ не выдзерлі. Узрадаваная, Раіна падаткнула спадніцу, тут жа апусцілася на калені і пачала выбіраць і кідаць мох у разасланую паблізу посцілку. Справілася надзіва хутка, праз якую гадзіну, не болей. Натаптаную ношку перанесла ў сухое месца пад самаю кручаю. Потым прысела на цвёрды грудок і ўткнулася плячом у цёплую, што грубка, гліняную сцяну кручы. Ношка з мохам таксама нагрэлася і пачынала парыць.

Невядома адкуль, ці не з-за гэтай самай кручы, данеслася нясмелае, яшчэ ціхае салаўінае цёхканне. Раіна здзівілася і падумала, што ёй здалося. Але ў тое ж імгненне да першага поклічу дабавіўся цэлы птушыны хор, ажно заложыла вушы. Раіна хацела стаць на ногі, але не змагла, распешчаная пякучым сонцам. І раптам, быццам упершыню ў жыцці чуючы гэткае шалёнае, бязладнае птушынае ціўканне і шчоўканне, узрушаная ім, Раіна падумала, што ўсё ж калі гаварыць праўду, то нават цяпер яна хоча ўтаіць сама ад сябе самае важнае. Бо не толькі ж дзеля гэтага во моху яна так доўга перлася сюды па карчах і багне. Не толькі... І няма ўжо як і перад кім ёй таіцца, няма куды ўцякаць ад свайго штодзённага зацятага болю, ад гэтай перапоўненай чорнаю вадою Лагвянкі, што, здаецца, выцякае з-пад саменькага хворага Раінінага сэрца. У фіялетава-серабрыстай балотнай парнасці Раіне захацелася ўбачыць і нанова адчуць усё, што так даўно перашкаджае ёй спакойна і ціха жыць. І дзеля чаго яна прыйшла сюды, прыйшла, каб яшчэ раз успомніць і зразумець...

Як бы пачуўшы нечы таемны загад, Раіна задзерла галаву і ўбачыла проста над сабою, на самым версе кручы, кашчавую і бліскучую воўчую морду. Сэрца адразу ж моцна затахкала, Раіна ажно заплюшчыла вочы і з усяе сілы

ўціснулася плячом у цёплую гліну кручы. Раней, магчыма, яна па-сапраўднаму спалохалася б, але зараз толькі раззлавалася. Не, калі б не ўнукава ўпартасць, калі б не той настырны дурны Лямеш, ні за якія грошы не ўсунулася б яна ў гэтае праклятае ведзьміна логава! Што тут мудраваць — ёй адной хапіла б і старой хаты. Яшчэ і прывычней, спакайней!

Раіна аддыхалася і яшчэ раз зірнула ўверх — а ці не з'явіцца на кручы тая самая, не дай бог, ашалелая ваўчыца? Але там ужо нікога не было. Пэўна, здалася ёй тая шэрая зяпа над галавою...

А можа, здаліся, прысніліся Раіне і тыя лясныя чары, і далёкая, амаль забытая ўжо Насціна ўтрапёнасць, і налітае да краёў, слюдзяна-чорнае лагвянскае вока, якое ўжо трынаццаць год сочыць за Раінаю сваім дрымотным дзікім позіркам...

Але каб жа ды так! Каб жа хто сказаў Раіне, што ўсё мінулае і сапраўды прыбачылася, прыснілася, прытрызнілася! Каб жа...

Раіна стала на ногі, усцягнула на спіну мохавую гарачую ношку і, сагнуўшыся пад яе цяжарам, пабрыла цераз балота. Да чыстага лесу яна дасталася хутка, дыхаць было трошкі лягчэй. Але праз якія паўкіламетра млявасць і слабасць зноў разліліся па ўсім целе, перашкаджаючы ісці.

Ах, Уладзік, Уладзік... Малы яшчэ, а бач, паганец, падтачыў, бы крот, зямлю ў яе пад нагамі. Дзіця неразумнае. Што бачыць, што думае, пра тое і балбоча. «У дзеда Сымона лепш! Цяплей! А ў нас столя зусім нізка. А не светла... Нельга ўрокі вучыць...» Як хто яму нашэптвае, шчуру малому. Паддалася, дурніца, на гэтае мэканне, вось і прыся цяпер з гэтаю ношкаю, быццам у яе чорт ведае чаго накладзена. Аж плечы рве!

Здаецца, сам лес, паліты дурнап'янам багуну, усім сваім цяжарам цяпер наваліўся на Раініны плечы, і яна раз-пораз спалохана падымала галаву, пазіраючы ў блакітныя акенцы-прагалы паміж вяршалінамі дрэў. Падумала, што ў гэтым вялізным лесе яна стала дробненькаю мурашачкаю

ці пчолкаю, таму, напэўна, сосны і здаюцца такімі высокімі. Нябесныя акенцы ўверсе таксама былі недасягальныя, ажно кружылася галава, і думалася — як жа доўга трэба ляцець душы праз гэтыя прагалы да святога неба і да тых вунь пуховых бесклапотных аблачынак...

Лес не парадзеў, але зрабіўся святлейшым, таямніча гайдаў галлём і шоргаў калючымі сасновымі лапкамі па вялізнай ношцы.

Раіна нарэшце патрапіла на добрую, пасыпаную шышкавым пер'ем дарогу, узрадавалася. Цяпер можна было нават агледзецца навокал.

Раіна сапраўды глянула ўбок і раптам спалохана спынілася. Па высокай папаратнікавай траве зусім блізка шахнула быстрая, як страла, ваўчыца. Гэта была, напэўна, тая самая, з кручы. Значыць, сачыла, бегла следам. Няўжо і сапраўды ашалела? А мажа, проста палюе тут на якую-небудзь амярцвелую ад страху заечую костку для сваіх ваўчанят.

Падтрымліваючы ношку рукамі знізу, Раіна няўклюдна пабегла па слізкай ад сыраватага карэння дарозе, ловячы вуснамі салёныя слёзы. Урэшце, што яна хацела знайсці ў гэтым лесе, акрамя невыносна горкіх пякучых успамінаў? Страчанае здароўе? Дык яго ўжо нічым не дастанеш. А мажа, якое-небудзь прываротнае зелле, якое верне ёй унука? Каб любіў толькі сваю адзіную родную бабу і нікога іншага, каб бегаў за ёю, як гусяня! Каб ніколі больш не хваліў дзеда Сымона, каб...

Урэшце, гэта ж чаму яна, Раіна, павінна шкадаваць гордага Лемяша? У яе самой вунь нікога няма, нават далёкай радні, усіх па свеце раскідала... Калі б не Уладзік, была б — як палец. Сам жа Лямеш ад Уладзіка, яшчэ не пушчанага ў свет, адцураўся. Сам! А цяпер во што робіцца! Горш і не прыдумаеш...

Раіна ўсё бегла, спатыкаючыся аб карэнне, быццам баялася, што не паспее і што нехта назаўсёды звядзе і схавае ад яе адзінага ўнука, а тады шукай управу! Яна нават на імгненне паверыла ў тое, што ў вёсцы з Уладзікам без яе здарылася нешта благое. Паверыла і памкнулася бегчы

хутчэй, але раптам востры боль з левага пляча ўдарыў па ўсім целе, і здзіўленая Раіна вяла асунулася ўніз, сутаргавымі глыткамі хапаючы паветра. Яно, праўда, было цяпер густым і пякучым, як расплаўленая смала, ажно балелі вусны. Сцягнуўшы з плячэй ношку, Раіна асцярожна легла на дарогу. Якраз спінаю на вузлаватыя вяроўкі карэння.

Раіна ляжала доўга, быццам страціла прытомнасць. Над самаю галавою ледзь бачна варушыла галінамі старая вольха. Чырвоная, з доўгім цельцам мурашка поўзала па трымтлівым лісціку. Раіна замерла, з гідлівасцю падумала, што мурашка можа сарвацца і ўпасці проста ёй на твар...

Навокал стаяла таямнічая цішыня. Раіна чакала. Чакала доўга, аж пакуль не прыглух боль, і ўсё навокал адразу ж ажыло і пасвятлела.

Павольна, але ўсё больш упэўнена Раіна пачала знаходзіць у сабе тое галоўнае, дзеля чаго вось сёння, праз столькі гадоў пасля Насцінай смерці, вярнулася да маўклівай ляснов Лагвянкі. Гэтае галоўнае было нечакана простым і прынесла Раінінай душы толькі радасць. А ўсё ж добра, яшчэ як добра, што яна, Раіна, стрымалася, так і не сказаўшы нікому праўду пра Уладзіка. Як гэта добра!..

Зрэшты, ці патрэбны таму ж Сымону Лемяшу яе праўда і яе шалёная памяць? Што б ні здарылася з Раінаю, усё ў жыцці будзе так, як і было. Уладзік жа, дзякуй богу, не памрэ разам з ёю, а будзе жыць, яшчэ доўга-доўга расці, набірацца розуму. Няхай сабе і ў Лемяша.

Падумала Раіна і аб тым, што тая даваенная пякучая зуброўка болей не адступіцца і ўжо вельмі хутка дойме, дарве яе сэрца, дагоніць на паўдарозе сваім едка-салодкім хмельным чадам. Але няхай ужо толькі яе, Раіну, толькі яе адну...

Упіраючыся локцем у цвёрдую дарогу, яна асцярожна павярнулася на бок, села перад сваёй вялізнаю разлезлаю ношкаю і пачала развязваць яе. Потым стала на ногі і вываліла з посцілкі разапрэлы мох. І тут убачыла, што разам з ім на дарогу выпала шэранькае, ледзь жывое ваўчаня. Раіна ўсміхнулася, залюбаваўшыся яго чорненькай пыскай. І калі гэты ваўчок запоўз у ношку? Напэўна, яшчэ на балоце.

Бедная ваўчыца...

Ваўчаня тыцкалася ў далоні вільготным носікам і дрыжала. Але ваўчыца не паказвалася, чакала, відно, калі чалавек адступіцца. Раіна адчула, як з-за блізкіх карчоў за ёю цікуюць халодныя, зялёныя вочы вечнага лесу. У сэрца яшчэ раз, як швайкаю, кальнуў боль, але тут жа адступіў. Як нічога і не было. Праз Раіну, такую спакойную і прасветленую, праходзілі цяпер усе лясныя гукі і пахі, усярэдзіну, здаецца, плыў хмель сасновай жывіцы. Перакінуўшы цераз плячо посцілку з шызымі кудзеркамі моху, Раіна рушыла наперад, асцярожна пераступаючы карэнне. Потым, ужо блізка каля краю лесу, спынілася і азірнулася, як быццам усё яшчэ нешта шукала за сабою сумным позіркам.

А можа, яе, Раіну, паклікала ў гэты лес успамінаў даччына душа? Каб нарэшце паспавядацца і паспавядаць. І распытаць аб усім...

У Раініным лесе стаяла яшчэ недзе блізка тое пявучае дрэўца, на якім заселянела лістотаю, прыляцеўшы да родных людзей з далёкага краю, чыстая душа Косціка Лемяша, загінуўшага на вайне Сымонавага сына...

Дрэвы ўсё шчыльней абступалі Раіну. Пільна ўзіраліся ў яе пражытыя гады, у яе напоўненыя жыццём і смерцю вочы, у яе збалелае сэрца. Яны падступаліся бліжай і ўсё шапталі, шапталі нешта лагоднае і таямнічае, але сёння нарэшце ўсё ж разгаданае Раінаю.

Дрэвы цягнуліся ў вышыню. Да неба і памяці. І ўсё гэта былі яе, Раініны, і яшчэ нечыя дзеці. Яе і яшчэ нечыя ўнукі і праўнукі. Яе і яшчэ нечыя крыўды і праўды.

## Чужая

Здадзеную людзьмі бульбу прыёмшчык Раман Каравай буртаваў тут жа, каля калгаснага прыёмнага пункта. Хаця і немалады ўжо, але высокі і дужы, Раман быў да таго ж не брыдкі і з твару — тонкія сухія вусны і прамы нос на смуглявым худым твары, да якога хараша пасавалі коратка падстрыжаныя сівыя валасы.

Сёння, як на тое ліха, на пункт прыязджалі адны ўдовы і «пакідзюнкі», кабеты, разведзеныя з мужамі, і ўсім ім даводзілася памагаць. Найчасцей — самому разгружаць вазы.

Жанчыны адчувалі сябе перад Раманам вінаватымі і ўдзячнымі, аднолькава збедавана ўздыхалі і запрашалі на пачастунак: «Гэта ж у лаўку віно прывезлі... Зайшоў бы!» Нібыта ўсе раптам забылі, што ён, Раман, не бярэ ні кроплі.

Цяпер, калі дзень канчаўся, тыя запрашэнні надакучылі і раззлавалі: «Зайду! На святыя нігды! Хоць бы адна дадумалася грошы заплаціць...»

Некалькі бульбяных капцоў у рэдзенькім, яшчэ мігатлівым прыцемку холадна блішчалі сваімі пукатымі, прысыпанымі знізу жвірам і завершанымі саломаю, бакамі, гарбаціліся і цяпер здаліся Раману палеглымі на адпачынак, натомленымі коньмі. Часцяком налятаў калючы вецер, ад якога саламяныя грывы на капцах дыбіліся і суха шапацелі.

Ноч набліжалася па-восеньску хутка, і разам з яе халоднаю цемраю ў Раманаву душу запаўзала глухая незразумелая трывога. Трэба было ўжо збірацца дахаты — Раман праверыў замок на дзвярах пункта, міжволі зірнуў на капцы. Усё было ў парадку. На небе неяк раптоўна заблішчалі частыя нізкія зоркі, Раман яшчэ раз прыгледзеўся да вастраверхіх, як медныя вежы, капцоў і неяк глуха, ледзь не стогнучы, уздыхнуў: «А ўжо ж і нацягаўся, ліха яе матары!»

Нарэшце засунуў важкія, як налітыя волавам, рукі ў кішэні старога бушлата, рушыў напраскі да калгаснага кароўніка, за якім пачыналіся платы першых вясковых двароў. І тут жа, толькі ступіўшы некалькі крокаў, спыніўся: перад ім даволі выразна пачулася таропкае жаночае ноканне і хрыплаватае фырканне каня.

Настрой сапсаваўся зусім.

«У Вазнюка, напэўна, калёсы выпрасіла. Не рыпяць, ха-лера!»

Трэба было вяртацца і зноў адмыкаць дзверы...

Праз якую хвіліну ў няяркім святле запыленай лямпачкі і сапраўды паказаўся нізенькі Вазнюкоў конік. Раман звыкла абмацаў позіркам наладаваныя на возе мяхі з бульбаю: не меней як восем.

Каля воза подбегам тупала Анюта Байкава. У светлай хустцы і ў пругка-цеснаватай, быццам пашытай з бліскучага жылавіння, ватовачцы яна выглядала даволі зграбнай і не па гадах маладой.

— Царыца нябесная! Добра, што не пайшоў яшчэ, Раманка! Гэта ж я бульбу вязу...

— Бачу, што не капусту!

— А што, ты і капусту прымаеш?

— Ну, глядзіце на яе!

Сумеўшыся ад гэтай нечаканай злосці, жанчына здзіўлена падняла на Рамана свае вялікія, па-дзявочы цёмныя вочы. Паднесла маленькую далоньку да рота, нібыта хацела апраўдацца. Але раптам упарта, нават крыху крыўдліва, накапыліла вусны і яшчэ вышай узняла галаву. Нібыта гэта ён, прыёмшчык, быў вінаваты ў тым, што яна спазнілася са сваёю бульбаю.

І Раман ускіпеў: «Пані заморская! А от жа калі прывезла сярод ночы, то цярпі. Цярпі! Як сам нацярпеўся і намучыўся некалі. Бульбу сваю каравую прывезла...»

Ён думаў, што вось-вось выкажа ёй усё, што набалела ў душы і ўзрушылася цяпер, але замест гэтага, нечакана для сябе самога, махнуў рукою, падышоў да воза і падцягнуў бліжай самы верхні мех. Узваліўшы мех сабе на плечы і папраўляючы, Раман падкінуў яго так моцна, што ў кожнай бульбінкі, здаецца, ажно нешта ёкнула ўсярэдзіне. Раман таксама крактануў, павярнуўся і патупаў да вагаў няспешнымі шырокімі крокамі, быццам цягнуў разам з гэтым важкім мяшком свой уласны, амаль забыты і раптам вось цяпер нечакана вылузаны з душы, трывожнабалючы ўспамін...

Анюта ўсё яшчэ такая ж прыгожая... Бач, якая... Гэткая ж самая спраўная і ганарыстая маладзіца, якою была і тады, дваццаць пяць гадоў назад...

Раман усё ніжай згінаўся пад праклятым, як набітым каменнем, недзе ўжо чацвёртым па ліку бульбяным мяшком, жаласна і роспачна дзівіўся сваёй нечаканай пакорлівасці. На вочы пачала напльіваць салёная гарачыня, апякаючы скроні і шчокі...

Дваццаць пяць гадоў назад, якраз у чэрвені, Раман вярнуўся з фронту, жывы і здаровы. З медалём «За адвагу» і двума ордэнамі. Вярнуўся, як цяпер помніць, раніцаю. І доўга, як мёртвы, спаў. Здаецца, да самага вечара. Абудзіўшыся, адразу ж запытаў у маці пра Анюту... Пра каго ж яшчэ яму было пытаць? Вядома, пра Анюту...

Але маці быццам не пачула гэтага ягонага пытання, замітусілася, затузала ражкі хусткі і чамусьці пачала расказваць пра Сцяпана Байку. Маўляў, вярнуўся той з фронту з пустым рукавом — бяда бядою. А тут яшчэ, праз год, і зусім бабылём астаўся, гадуе цяпер дзвюх дачушак. Адна нічога, большанькая, затое другая — зусім грудное дзіця.

Раман набраўся цярпення і слухаў маці не перабіваючы — дойдзе ж яна да канца! Нарэшце дачакаўся. От яно што! Яго Анюта ў Сцяпана... У гэтага бязрукага...

Ён, вядома, не паверыў. Выйшаў з хаты ахалонуць, але не вытрымаў. Пабег, падстаўляючы грудзіну ў расхрыстанай гімнасцёрцы ўжо цвёрдаму вечароваму ветру, на другі канец сяла. Спяшаючыся, нават прамінуў Байкаў двор, крыху вярнуўся назад. Нарэшце спыніўся і так стукнуў кулаком у зялёную брамку, што тая ажно рыпнула. Гэтак жа, кулаком, з усяе сілы бухнуў і ў дзверы...

Сам Сцяпан моўчкі стаяў за сталом, каля акна, і пусты рукаў яго аж загайдаўся ад скразняку. Пасярод хаты вісела калыска, прывязаная вяроўчынаю, як пупавінай, да пабеленай столі. Анюта, убачыўшы Рамана, нахілілася над дзяўчынкаю, асцярожна выняла яе і ласкава прыціснула да грудзей. Як родную.

Раман глядзеў і не верыў сваім вачам. Бачыў, як на Анюцін лоб падаюць густыя светлыя валасы, з непаразуменнем і шчымліваю роспаччу ўзіраўся ў празрыстае ад стомленасці, яшчэ прыгажэйшае, чым раней, Анюціна аблічча.

Ён глядзеў на яе і — не пазнаваў. Не разумеў: як жа яна рашылася на двое чужых дзяцей і на гэтага бязрукага Сцяпана... Ды хоць бы хата была як хата, а то ж пограб нейкі! Галеча! Анюта нават не азірнулася на яго. Ну, што ж, не азірнулася дык не азірнулася. Значыць, так і трэба было!

Затое пазней, недзе праз гады чатыры, ужо застаўшыся ўдавою, Анюта стала іншай.

...Мяшок раптам саслізнуў з Раманавых плячэй і гупнуўся долу. Але ён толькі скрыгатнуў зубамі і павалок яго на вагі па зямлі.

Амаль як тады, у далёкую цёплую восень, калі Анюта папрасіла яго ссыпаць у лёх накапаную бульбу.

Пасля смерці Сцяпана яна ледзь зводзіла канцы з канцамі, шыла зімою з рукавоў старой ватоўкі буркі для старэйшай падчаркі. Меншай было яшчэ толькі гадоў пяць. Праўда, людзі казалі, што надта ж слабая яна і кволая, наўрад ці выжыве...

У той восеньскі пагодны дзень з самай раніцы Раман пачаў крыць сваю новую хату. Седзячы на латах, радасна ўдыхаў моцны сасновы пах, змешаны з саладкаватым балотным пахам чаратовых снапоў. Уздоўж кроквау, якраз наўкруг цёмных, як вавёрчыныя вочкі, згабляваных сучкоў, пацяклі празрыстыя, ліпкія і бліскучыя, што мёд, пацерачкі свежай смалы. Раман дакранаўся да іх пальцамі і адчуваў, як пасля кожнага дотыку яго душа напаўняецца тонкаю пявучаю радасцю.

Новую хату Раман ставіў разам з будучым цесцем, калгасным брыгадзірам, на самым крутым беразе рэчкі. Адсюль, з гэтага берага, усё наваколле бачылася Раману незвычайна бязмежным і прыгожым.

Хата была на ўсё сяло. Не тое што ў гэтай дурніцы, якая не дачакалася... Зрэшты, чым яго Манечка горшая? І ўдалая, і бацька во — брыгадзір! Не-не дый падкіне чаго...

Задумаўшыся, Раман і не заўважыў, як да будоўлі падышла сама Анюта, якраз пацягнуў да сябе чарацяны сноп. Але той раз'ехаўся і пагрозліва зашаргацеў пад самыя Анюціны ногі. Раман аж сумеўся ад нечаканасці, адчуў, што твар яго абліваецца, як у нейкага там блазнюка, гарачым сорамам. А яна гэтак шчодра ўсміхаецца, нават закрылася ад сонца рукою, пазіраючы знізу на Раманаву страху. Тоненькая і зграбная, уся як бы цягнулася да яго ўверх.

Раман думаў, што будзе з ёю па-мужчынску грубы і строгі. Але варта было Анюце папрасіць яго прыйсці і падсабіць па гаспадарцы, адразу ж згодна кіўнуў галавою. Нават не здзівіўся, што яна просіць дапамогі менавіта ў яго. У каго ж яшчэ?! Праўда, як толькі Анюта знікла з вачэй, ён астыў і пашкадаваў, што згадзіўся.

Ды і як гэта ён пойдзе амаль праз усю вёску на вачах у людзей? Ім — абы прычына, абы знак! Адразу ж заплешчуць языкамі. Не ўжо, няхай лепш пашукае іншага памагатага! Не разумеючы, што ж яго так гняце, Раман працаваў як шалёны. Вечарам, змучаны работаю і living рознымі думкамі, ледзьве злез са страхі і рашыў адразу ж ісці дахаты. Але ногі, толькі ступіўшы на зямлю, раптам перасталі слухацца яго і самі павярнулі ў той бок, дзе быў Анюцін двор. Раман ішоў моўчкі, рэзкімі кіўкамі галавы адказваючы на прывітанні вяскоўцаў.

Убачыўшы Рамана, Анюта неяк спалохана пагладзіла па галаве меншую з падчарак, Светку, гэтак жа даверліва, як раніцаю, заўсміхалася. Светка не па-дзіцячы насцярожана зірнула на Анюту, потым адвярнулася і патупала, шукаючы дзе б лацвей сесці. Была яна ў вялізным, пэўна, бацькавым, пінжаку, і над грубым каўняром ажно свяцілася саламяная галоўка. З шырокіх закасаных рукавоў вытыркаліся брудныя пальчыкі. Малая села на груд іржавага бульбоўніку і заціхла. Раман прыгледзеўся да маленькага, як бобінка, тварыку і рэзка адвярнуўся, не разумеючы, адкуль у яго такая раптоўная непрыязь да гэтай Анюцінай падчаркі. Думаў рознае, але не мог пабароць у сабе злосці, быццам усё благое і несправядлівае, што зрабіла з ім і Анютаю жыццё, вось цяпер увасобілася ў гэтым няшчасным дзіцяці. Прымушаў сябе пашкадаваць яе, гэтую кволую дзяўчынку, але дарэмна. Усё было яму чужое.

Пасля таго як насыпалі добры капец, Анюта паклікала Рамана на вячэру, спрытна падхапіла Светку на рукі («Бач ты, вялікую, а на руках цягае!» — падумаў Раман) і, падбіваючы на хаду вялізнымі, таксама, мусіць, яшчэ мужавымі, чаравікамі пазелянелыя бульбіны, амаль пабегла ў хату.

І Раман, як сляпы, патупаў услед за ёю, асцярожна, каб не набіць гузакоў, нагнуў у парозе галаву. Але ўсё роўна балюча выцяўся.

Яшчэ не было прамоўлена ні слова, але Раман адчуваў, што тое, даваеннае, не аджыло, а толькі стаілася, схавалася недзе ў самай глыбіні душы, чакаючы тае хвіліны, калі яны з Анютаю сыдуцца і разбяруцца ва ўсім...

Анюта нарэшце паўкладала дзяцей — старэйшую на печы, малую — на тапчане. Раман усё сядзеў за сталом, абхапіўшы галаву рукамі. Нейкая даўкая хваля жаласці да сябе самога і да Анюты выплывала з сярэдзіны, падступала да горла. Некалькі разоў перад вачамі ўспыхнулі яркія жоўтыя сцены новай хаты на высокім беразе, але нават яна, хата, цяпер здавалася недарэчнаю і непатрэбнаю. Усё было як у паўсне, і ён, седзячы за сталом, не мог павярнуць галавы, не мог азірнуцца, але чуў, як Анюта ходзіць каля ложка, уся імклівая, лёгкая, родная...

Апоўначы ён прачнуўся ад дзіцячага плачу. Анюта тут жа, як і не спала, саскочыла з драўлянага ложка, нахілілася над растрывожанаю нейкім страшным сном малою, пачала супакойваць яе лагодным шэптам. Такая начная тузаніна, відаць, была тут прывычная, і Раман незадаволена адвярнуўся.

Ноч прабівалася праз два маленькія акны месячным ззяннем. Сцены і крыжыкі вокнаў ледзь бачыліся ў жоўтым мораку, і Раман прыўзняўся на локці, прыгледзеўся. Яму раптам прымроілася, нібы яны з Анютаю ў двары і быццам яго Анюта нячутна ступае праз густы, засеяны крышталікамі расы туман, асцярожна расхінае рукамі кудлатыя цені прывіднага вербалозу. Ён жа — толькі пагойдваецца ўслед, хапаецца за доўгую сарочку, цягне ўніз, у сваё слюдзяное марыва. Раман крутнуў галавою і зноў упаў на падушку, як уцякаючы ад наслання. І раптам уздрыгнуў ад рэзкага, невыноснага плачу дзяўчынкі.

Стала цесна і душна, і ён пачаў сціху азірацца, нібыта хацеў разгледзець тое, чаго не ўбачыў раней, пры святле, зразумець, што ж перашкаджае яму быць тут па-сапраўднаму

12. Зак. 1877

шчаслівым. Лежачы, запэўніваў сябе, што не зможа пражыць без Анюты ні дня, а таму трэба быць цярплівым. З часам яны зладзяць добрую гаспадарку, паставяць новую хату. І ўсё ў іх будзе, будзе, будзе...

Але нешта моцнае, прыкрае ўпарта падмывала яго ўпэўненасць.

І раптам Раману здалося, што ён зразумеў усё. А зразумеў ён тое, што нават тады, калі рыхтаваўся да вяселля з брыгадзіравай Манечкай, увесь час толькі і чакаў гэтай гаворкі з Анютаю. Зразумеў, што павінен вырашыць усё цяпер жа па-мужчынску рашуча. Спачатку Раман пачаў распростваць плечы, стараўся ўвабраць у сябе паболей паветра, чуў, як пахруствае ўсярэдзіне, быццам там звонка рваліся сухія травінкі, і нарэшце растуліў зліплыя ад хвалявання вусны.

— Нашто яна табе, Анюта?

Анюта памаўчала трошкі, напэўна, думаючы над Рамановымі словамі, але так нічога і не ўцяміла, перапытала:

— Ты пра каго гэта, Раманя?

— А пра малую.— Ён ажно прыўзняўся на локці.— Яна табе хто? Старэйшая — няхай сабе. Хутка сем класаў кончыць. А з гэтай што? Чужая... Лепей у дзетдом, чым на нашых руках!

Раман хацеў яшчэ нешта сказаць, але па тым, як у хаце зрабілася ціха, нават дзеці не так гучна пасопвалі насамі, адчуў, што лепш памаўчаць. Адкінуў коўдру і асцярожна саскочыў з ложка, зарыпеў на ўсю хату масніцамі і пасунуўся да акна.

Празрысты стог месячнага прамення стаяў на двары такі вялізны і дрогкі, што вось вазьмі ды выйдзі, пакратай яго рукамі, і ён адразу зварухнецца з месца, прасочыцца праз плот і павольна паплыве праз усю вясковую вуліцу. Раман прыцісную далоні да халоднай шыбіны, як астуджваючы нечаканае ўзрушэнне, вяртаючыся да явы. Анюта таксама паднялася, накінула на плечы хустку і стала побач, узіраючыся ў зменены ноччу двор. Потым прыхінулася да Рамана плячом і ціха, з болем сказала:

— Яна не чужая мне, Раманя. Як жа я такую... Хворанькую... Невядома, як без маці...

— У дзетдоме вылечаць... Яшчэ лепш за цябе... А то, крый бог, што здарыцца, што тады? Га?.. Звінавацяць!

Ён стараўся гаварыць мякка, але Анюта ўсё роўна адчула ў ягоным голасе цвёрдасць.

— А што людзі скажуць?

— А што мне твае людзі? Што яны, карміць яе будуць? Паіць? Ага! Ты, знацца, добрай хочаш быць... Для чужых...

— Раманя, ну што ты?

— А я, знацца, звер?

— Раманя...

— Раманя, Раманя... Ты глянь, у гэтай жа нары не павернешся... Дзе жыць будзем?

— Як і ўсе... І яна з намі пабудзе... Не стопча падлогу...

— А бяднота якая! Хоць ты ў парахні калупайся!

— Чакай...

— Як сабе хочаш! — Раман ужо не мог спыніцца. Як не мог цяпер да канца зразумець і гэтую сваю злую рашучасць, і гэтую насцярожаную нецярплівасць да ўсяго, што Анюта бараніла.

— Як сабе хочаш... А я так сказаў: аддасі дзіця, усё добра будзе. Зусім не тое. І табе, і мне. Жыццё — не цукерка...

...Цяпер, згадаўшы тую гаворку, Раман упершыню здзівіўся, чаму тады ні пра яго блізкае вяселле з брыгадзіравай Манечкай, ні пра новую хату каля рэчкі Анюта нават не ўспомніла. Ды і ён таксама...

«Жыццё — не цукерка...» Ледзь варушачы вуснамі, Раман яшчэ раз паўтарыў амаль забытае «жыццё — не цукерка...» і азірнуўся. Убачыў, што Анюта ў прыцемках збірае з зямлі рассыпаную бульбу.

— Ды што ўжо тут, як гады свае збіраеш. Хто яе тут возьме, бульбу тваю... Сёння ўсё роўна вазіцца з ёй не буду. Позна.

— Я-то раней прыехала б... Ды во паштарка спазнілася. Пакуль пісьмо прынесла...

— Заўтра ўзважу, заўтра! От, гарыць!

Рамана ахоплівала нейкая ўпартасць, ён пачаў соваць рукамі па кішэнях, шукаючы ключы.

— Светка пісьмо прыслала...

— Ага, успомніла цяпер! А што я табе казаў? Успомніла. Век з чужою будзеш валаводзіцца, да смерці рукі не атрасеш!

— Ты не злуй, Раманя, не злуй... Нашто ўжо? Піша, мастыт у яе, ляжыць з дзіцяткам у бальніцы. Прыедзь, піша, мамка, памажы, а назад я цябе сама адпраўлю.

Раман абцёр шурпатаю далонню ўспацелы лоб, стараючыся не зважаць на яе жаласлівы голас, але Анюта не магла стрымацца:

— Думала, бульбу здам, грошы будуць. Усіх аббегала, пазычыла трохі. А туды ж білет, ва Уладзівасток гэты, дарагі такі...

— Я грошы за бульбу не даю.

— Як гэта, Раман, а як жа?

— А я толькі паперчыну выпісваю, а грошы ў праўленні даюць. І не кожны дзень, галубка.

Раман злавіў сябе на тым, што ён нібыта радуецца Анюцінай няўдачы, нават пачырванеў.

— Але як жа гэта? Я ж думала...

— Думала!

— Мне б толькі рублёў трыццаць. А там як-небудзь... Старэйшая што, у яе ўсё ладзіцца. А Светка, ластавачка мая... Яна ж...

Раман не мог больш чуць яе голасу, не мог бачыць гэты расчараваны твар. Выняў з кішэні кашалёк і стаў лічыць, хоць добра помніў, што там было роўна трыццаць рублёў. Сёння якраз з'ездзіў у горад і зняў з кніжкі, спадзяваўся, што сусед, які працаваў на складзе, нарэшце дастане даўно абяцанае каляровае шкло для веранды.

Грошы шалясцелі, як наэлектрызаваныя, рукі не слухаліся. Ды што тут лічыць?!.

Але ў самы апошні момант Раман чамусьці ўзяў з кашалька толькі дзве дзясяткі, ткнуў іх у худзенькія цвёрдыя далоні жанчыны. Пайшоў, нават не азірнуўся, далей ад сваіх

вагаў, ад падслепаватай, заплямленай мухамі электрычнай лямпачкі над імі, ад Анюцiных радасных падзяк.

Не помніў, па якой справе ён апынуўся ў цесцевай хаце, не помніў, чаго бег да крамы: зусім забыў, што ў такі позні час яна ўжо зачынена.

Ледзь стрымаўся, каб не зайсці да якой удавы на абяцаную вячэру...

І толькі пасля таго, як Раман цішком пракраўся ў Анюцін двор, ён пачаў супакойвацца. Стаяў, прыціснуўшыся плячом да хісткага плота, і пазіраў у няяркае аконнае святло хаты.

Ноч была незвычайная. Усё навокал павялічвалася трапяткою цемраю і падступалася да чалавека ўсё бліжай. Адно толькі яркія зоркі-ягадзінкі ў глыбокім небе ледзь трымаліся каля нябачных лісточкаў, парваныя воблакі бязладна плылі за сонную вёску, і ўяўлялася, што там, у недасяжнай вышыні, гайдае сваім бухматым голлем стары, пачарнелы лес. А паміж яркімі кропкамі, паблiскваючы зорнай пацярухай, то распростваліся, то зноў сціскаліся празрыстыя нябесныя змеі. З неба на зямлю капала густымі кроплямі начная таямнічасць, прабівала яе наскрозь, нават патрэсквала пругкая зямная абалонка. Раману здалося, што гэта яго душа, аплываючы ўніз, праходзіць праз зямную кару, напаўняецца такою салодкаю музыкаю. Ён трывожна ўслухоўваўся ў начныя шолахі. Нават не ў думках, а недзе ў патаемных сховах душы нараджалася адчайная гатоўнасць узяць вось і рашуча павярнуць усё сваё жыццё. І няхай будзе што будзе!

...«Добрую хату маю? А цяпер ва ўсіх добрыя хаты! Няма тут чаго нос дзерці...»

Раман махнуў рукою, нібы адганяючы ад сябе камарэчу, але свежая трэшчынка ў душы зашчымела зноў.

«Думай што хочаш, суцяшайся, але ж во пражыў век, як бабыль. Нават горш за бабыля. І не пажалішся нікому. Хіба аднаму сабе...»

Раман ажно ўздыхнуў.

«Век пражыў з Манечкай, ні на кога больш і вокам не кінуў, а сям'і няма. Хоць бы аднаго нарадзіла! Ялавіца!»

Застаялая мужчынская крыўда падымалася і захліствала горла. Але жаласць да самога сябе паціху замянялася злосцю.

«Падманвай, галубок, каго хочаш, толькі не сябе. З Манечкаю жыў, а пра Анюту думаў!.. А што работы было па горла, дык гэта не прычына, ва ўсіх работа! Першыя гады над новымі соткамі каля лесу біўся... А потым? Сарваўся, як з ланцуга, у Сібір, на заробкі! Сем гадоў! Не штука, ліха матары!.. Пра ўсіх, здавалася, забыў. І пра Манечку, і пра Анюту...»

Раман схамянуўся: «Няўжо і пра Анюту? Вядома, забыў. Калі б не трэба было прыехаць маці пахаваць, то зусім бы астаўся ў Сібіры... А што, работа ўсюды работа... А можа, проста схаваўся ад Анюты? Збег, як блазнюк? Каб не бачыць яе, не сустракацца ўсюды, нічога пра яе не чуць...»

Раман пастаяў яшчэ некалькі хвілін, потым выняў з кашалька тую апошнюю дзясятку, таропка, няўмела завязаў яе ў белую насоўку, каб не згубілася ў цемры, і паклаў на лавачку пад акном. Не разбіраючы дарогі, кінуўся з Анюцінага двара дахаты, слізгаючыся, як п'яны, на выбоінах. І толькі на ганку ўласнай хаты, пастаяўшы крыху, супакоіўся, пракашляўся і адчыніў дзверы...

— Ага, мы тут ледзь упраўляемся, а ён, ваўчыска, па чужых лагвах бадзяецца!

Суседка Волька, высокая і грудастая, весела згрызала аб тарку свежую вільготную моркву. І зусім нічога не паказвала на тое, што яна надта ж змучылася. Але Раман прамаўчаў.

Уся веранда была завалена ацярэбленым капусціннем, а на стале хрусткаю горкаю высіліся крамяныя качаны.

«От, халера, забыў, што сёння капусту шаткуем»,— прамільгнула ў Раманавай галаве. Не адказваючы на суседчыны кпіны, ён моўчкі ўзяў вялізны таўкач і адразу пачаў трамбаваць нашаткаванае. Бочка глуха забулькала, абдала яго рэзкім кменным духам і капусным сокам.

— Ого, якая капуста дабрэнная. Бач, як напілася за лета,— задаволена рагатнула жонка, яго Манечка, высокая і хударлявая. З-пад хусткі выбіліся рэдкія, нейкія бруд-

на-рыжаватыя валасы, да расчырванелай шчакі прыліпла ўжо высахлая капусная лапінка. Не разгледзеўшы, Раман падумаў, што гэта гліна ці яшчэ які бруд, і яму стала гідка. Быў стомлены, але біў і біў таўкачом у нутро бочкі і не разумеў, чаму свята шаткавання, такое светлае і радаснае з маленства, зрабілася цяжкім і нядобрым.

Абцярэбленыя верхнія лісты, яшчэ не прыбраныя, ляжалі на падлозе, пакрэсленыя цёмнымі нітачкамі-жылкамі. Раман баяўся наступаць на іх, каб не чуць звонкага хрусту. Зрэдку ён пазіраў на вясёлую суседку, потым пераводзіў позірк на Манечку, нібыта параўноўваў іх. І зноў, каторы ўжо раз, упэўніваўся, што ў жонкі нават тады, калі яна радавалася, такія адчайна сумныя вочы. Яны, гэтыя вочы, усё часцей здаваліся Раману цёмнымі норкамі, адкуль раз-пораз, бы палахлівыя звяркі, выглядвалі ці то расчараванне, ці злосць, ці звычайная самота. Ведама, бяздзетная жанчына...

Нарэшце Раман закончыў работу і пачаў адцягваць у кут веранды бочку, потым накрыў яе марляю. Волька маўчала, нібы праглынула свае зляжалыя жарты, пачала збірацца дахаты. У гэты момант Раман пачуў, як да іхняга двара пад'ехала машына. Праз хвіліну ў праёме адчыненых дзвярэй узнік Андрэй Канаплянік — без шапкі, у пацёртым пінжачку, з чорнымі і бліскучымі, бы намазанымі алеем, бровамі на такім жа бліскучым успацелым твары.

— Ну, суседзе, ідзі глянь! Во хлопцы шкло прывезлі... Чырвонае, аж гарыць!.. Ідзі, ідзі глянь!

Раман, узрадаваны, памкнуўся да дзвярэй, але ўспомніў, што ў яго няма грошай, і хрыплым ад расчаравання голасам запытаў:

— А за колькі?

— Ды драбяза! Я ж казаў... Трыццатку за ўсё кінь — і до! Ды ты ідзі глянь спярша...

— А што я там убачу? — Раман раздражнёна прыкусіў губу і махнуў рукою.— Слухай, Андрэй, а можа, заўтра... Ну... Шкло сёння вазьму, а грошы заўтра аддам... Ты разумееш, тут...

— Ты што, суседзе,— адразу ж пасумнеў Андрэй,— ды каб жа ім во цяпер грошы не былі патрэбны, то сталі б яны гэтае бразгоцце везці!

Андрэй злосна плюнуў. Манечка раптам ускінула галаву і запытала:

— Як жа гэта грошай няма? Ты ж у горад ездзіў.

— Ну і што? Ездзіў, ездзіў...

Раман не чакаў, што жонка загаворыць з ім так сярдзіта, ды яшчэ пры людзях.

— А ў цябе самой што, нічога ў панчосе не схавана?

— Сам ведаеш... Ні капейчыны...

— Ага, ведаю! Можна паверыць! Гэта мне ўсё аднаму, як дурню, трэба. Грошы — зарабі, шыферу — дай, веранду — зашклі!

Раман нешта хацеў яшчэ сказаць, але раптам як спатыкнуўся аб яе пякучы, амаль бясцямны позірк.

— Адчапіцеся вы ад мяне. Усе адчапіцеся! Сам жа па грошы злётаў! А куды дзеў? Куды?!

— Сам знаю, куды... Мая кніжка, хачу — бяру з яе, хачу — не!

— А хата чыя? Таксама твая?

— Хай яна згарыць, гэтая хата! Разам з табою!

Раман бачыў, як пабялела напалоханая Волька, як насупіў бровы сусед. Зразумеў, што перабраў, і прыкусіў губу. Абняўшы Манечку за плечы, суседка павяла яе з веранды, бразнуўшы дзвярамі. Мужчыны засталіся адны, закурылі. Адчувалася, што Андрэю няёмка, ён пакашліваў у кулак, нават пачаў апраўдвацца, быццам сам быў вінаваты ў тым, што ў Рамана няма грошай. Потым пашукаў і выняў з кішэні дваццаць рублёў.

— На, да заўтра... А дзясятка ж, можа, ёсць?

На вуліцы прасігналіла машына, пэўна, хлопцам надакучыла чакаць. Выскачыўшы з веранды, Раман крыкнуў Андрэю, каб той трохі пачакаў, паслізнуўся на нейкім мокрым лісце і ледзь не ўпаў. Але не спыніўся. Паляцеў да Анюцінай хаты.

...Брамка рэзка рыпнула ў цішыні, але Раман нават не звярнуў на гэта ўвагі. Спыніўся толькі каля лавачкі і адразу ж убачыў, што яго белай насоўкі з дзясяткаю не было.

Ён схапіў рукамі гэтую маленькую лавачку і пачаў з усяе сілы тузаць яе. Потым кінуўся на калені, абмацваючы навокал кожны лапік зямлі.

«Дзе ж яна, гэтая дзясятка праклятая? Няўжо не знайду?..»

Разнерваваны, ледзь не драпаў каляную ад начной сырасці траву анямелымі пальцамі.

«Можа, яна сама ўбачыла і ўзяла? А што, як хто іншы? Ідзі вось цяпер шукай, дурань... Прыйшоў, згледзеў і — нá табе! У кішэньку... Так табе і трэба, Каравай дурны! Эх, каб жа хлопцы не паехалі! Каб не паехалі... Столькі чакаў гэтае шкло!»

Раман то круціўся на месцы, то, хутка перастаўляючы калені, поўз наперад, ажно пакуль не ўткнуўся галавою ў цвёрдую штыкецііну.

І толькі тады спыніўся і — як прачнуўся. У вушах пачулася жаласлівае Анюціна: «Старэйшая што, у яе ўсё ладзіцца... А Светка...»

Зямля была халодная, і Раман ледзь падняўся на здранцвелыя ногі, зірнуў у глыбокае нямое неба: «Што ж гэта са мною? Навошта ж я так? А, каб ты згарэла!»

## Стары бубен

Пасля ночы выбоіна перад парогам была цёмная ад расы, вільготна блішчала, як пацуковая спінка. Пальма стомлена пацягнулася, незадаволена забурчала. Агрызнулася на свайго ненаежнага, мабыць, апошняга ўжо шчанюка, адштурхнула яго ад бліскучай вылізанай місы. Але ўпартае малое з пругкім хвосцікам злосна, віскатліва гаўкнула, балюча ўхапіла маці за абвіслае вуха вострымі цвічкамі зубоў.

Пальма была парудзелая ад старасці і, калі ляжала, была падобная на замшэлае пнішча. Ноччу тонкія кароткія лапы пачалі мерзнуць і касцянець, доўгі і шырокі лапаць носа патрэскаўся, пасівераў і так рассвярбеўся, што здавалася, на яго сыпанулі шурпатай, едкай солі.

Усё часцей, раніцаю, калі туман валюхаўся каля плота вялікім гусіным статкам, Пальма прачыналася ад ледзь чутных крокаў. Папраўдзе, гэта былі нават не крокі, а лёгкае, што і расы не збіць, пашоргванне па пругкай сцюдзёнасці травы, ледзь бачнае пагойдванне блакітнай вільгаці, таямніча-пагрозлівае шаптанне ў склычанай крапіве, колкім, бы шчэць на свіным карку, цыбульніку.

Ніхто, акрамя Пальмы, усяго гэтага не чуў і не заўважаў. Бо адна яна ведала, што кожную раніцу ўсё бліжэй і бліжэй да іхняга двара падступалася смерць. Але шукала яна не гаспадара Міхайлу, не гаспадыню Вольку, не іхняга Грынько. Гэта была яе, Пальміна, смерць, і, ахаладзелая ад жаху, сучка адразу прачыналася, бегла на ганак, падціснуўшы абскубены хвост, жаласліва скуголіла, рыпела надарваным за доўгія гады горлам, як той сухі, учарнелы журавель на суседняй вуліцы.

Так і стаяла, усё тулілася рабрыстым бокам да дзвярэй, аж покуль не выходзіла гаспадыня.

— Чаго ўжэ? — незадаволена пазірала яна на Пальму, потым шырока і млява распроствала плечы, таропка пазяхала, быццам нечакана раскусіла гарачую бульбіну, апякла рот і сутаргава хапала халаднаватае паветра.

Сёння сучцы прысніўся нейкі малады і смачны сон, і яна раптам праспала. Калі глянула на свет, не было ўжо ні туманнага статка, ні золкай крупчастай расы. Не прыходзіла і смерць, нібыта вырашыла даць сваёй будучай ахвяры адпачынак і кароткі спакой. Язык перасох, не асвежаны вільгаццю, не хацеў, нібы ўкрыты шурпатай карой, варочацца. Здавалася, што ў горла нехта сыпануў гарачага прысаку з пастушковага цяпельца. Падгінаючы лапы, Пальма пасунулася па двары, хацела пахлябаць з іржавай курынай бляшанкі, але тая нечакана перакулілася. Некалькі пякучых кропель пырснулі на нос, і яна злосна аблізнулася.

Пачула едкі тлусты пах, азірнулася на яго і ўбачыла на ганку гаспадара Міхайлу ў гумавых ботах, такіх шырачэзных і высокіх, што яны здаваліся двума калодзежамі. Гаспадар Міхайла і сапраўды быў магутны мужчына, яго галава як

бы падавалася наперад, загарэлы твар абвіла рудаватай дзеразою барада, а над вачамі звісалі выгаралыя на сонцы бровы. Але гаспадар быў добры, і Пальма адразу падалася да яго бліжэй, не зважаючы на шкіпінарны пах ад торбы цераз плячо. Ведала, што так Міхайла заўсёды збіраўся на забалочанае азярцо, узрадавалася і трушком падалася з двара, хоць гаспадар нават не кінуў на яе вокам.

Каля варотцаў іх дагнала Волька.

— На во, забыў арудзіе працы,— пакаціла яна званочкамі па грудзях свой вясёлы смех, лёгенька штурхнула мужа ў плячо, укінула ў торбу завостраны з двух бакоў і доўгі, бы аеравы ліст, нож.

Пальма больш не сумнявалася, што Міхайла ідзе за вёску, і, паспрытнелая ад радасці, пабегла наперад. Балотны чад ударыў у галаву, заканапаціў ноздры, і яна пачала чмыхаць, усё скрэбла лапаю нос, потым пасунулася па высокай траве, абдзіраючы ёю жывот, перасільваючы нервовыя дрыжыкі, што абкручвалі яе ўсю кусучым цвёрдым дротам.

Наперадзе нешта бліснула. Гэта была невялікая яміна з вадою. Пальма ведала, што тут неглыбока, але вельмі ж гразка. Над вялізным балотным саганом раптам паднялася, як пара з-пад паднятай засланкі, завірылася пакрапленымі клубкамі мошка. У левым баку, дзе была больш сухая мясціна, над куп'ём маленькімі галоўкамі цягнуўся ўверх кураслеп, як пагражаючы, пагойдваўся ад лёгкага ветрыку, няспынна цікаваў жоўтымі вочкамі за няпрошанымі гасцямі. Пальма пачула блізкую небяспеку, націснула, спыніўшыся, усім целам на пярэднія лапы, усунула морду ў траву і скавытнула. Прама пад носам сваёй металічнаю зяпаю блішчала пастка.

— А каб цябе пранцы, і тут пуста! — незадаволена ўздыхнуў гаспадар. Потым ён асцярожна падступіў да самай вады, і вялізны ярка-зялёны грудок пад яго нагамі адразу зачмякаў, клубкі злямчанай травы ўміналіся ў балота, потым павольна падымаліся, распростваючыся, нагадвалі вялізных растрывожаных слімакоў.

Пальма гідзілася, але дзецца не было куды, і яна ступала па гэтым жывым балоце, адчуваючы, што да лап, да жывата, да бакоў прыліпае мокрая брыда. А гразкая вада была ўжо блізка, густою кашаю абляпіла гаспадаровы боты, чалавек стаяў у гэтым чортавым кісялі па самыя калені. Ён падняў доўгі кій, дужымі рукамі ўткнуў яго ў ваду пад карчы, ушчаціненыя, пярэстыя, з паднятымі ўверх калматымі лапамі, і тыя адразу ж загайдаліся, зараўлі з патрывожанай глыбіні, пачалі скідаць з сябе скуру ліпкай лістоты. Здалося, што гаспадар уткнуў у балотнае пекла не звычайны кій, а распалены жалезны прут, і гразкая вада закіпела, выкінула з сябе пругкія галоўкі-бурбалкі з гнілым паветрам, завохкала і засіпела.

І адразу з-пад карчоў вёрткімі бліскучымі мячыкамі пакаціліся ў траву вялікія і маленькія вадзяныя пацукі — шчуры, замітусіліся, шукаючы паратунку. Пальма як звар'яцела. Яна кідалася на гэтыя жывыя балотныя барадаўкі і хапала іх зубамі за мяккія спінкі, як вялізная дужая маланка зігзагамі падскоквала над высокаю травою, даганяючы новую ахвяру, хрыпела і матляла галавою з акрываўленай пашчай.

Гаспадар ужо натаптаў шчурамі вялізную і брудную, бы аблітую жоўтым смальцам, торбу, але старая сучка ўсё не магла супакоіцца, бегала вакол яго, скавытала, грэбла лапамі куп'ё, быццам толькі цяпер, у нечаканым паляўнічым спрыце, адчула новыя здольнасці знаходзіць няўлоўныя і рэдкія пахі. Раптам спынілася, як падрэзаная, падціснула цяжкі ад налепленага глею хвост, падагнула лапы і павольна, адганяючы нечаканы страх, глыбока ўдыхаючы тонкі, яшчэ дасюль не чуты, але ўсё ж аднекуль знаёмы пах, падалася ад гаспадара, пакуль не ўбачыла маленькую сіратлівую і надзіва сухую палянку. Адсюль па версе навакольных траў дрогкаю вільготнаю нітачкаю да яе цягнуўся пах самога балотнага пана, валадара навакольнага краю. Гэты пах мог схапіць не ўсякі звер, а толькі той, хто хоць аднойчы быў напалоханы прывідам смерці. І адразу пачуўся яшчэ адзін пах — трошкі гаркаваты, востры, як іголка, пах

фіялетава-ружовай мацярдушкі, той самай травы, якая цудадзейна вяртала да жыцця. Сківіцы ад хвалявання адразу звяло, было цяжка жаваць, і Пальма толькі паварочвала морду ў розныя бакі, захоплівала траву пашчэрбленымі зубамі, глытала саланаватыя лісточкі цалкам, цяжка дыхала і залівала зямлю зялёнаю пеністаю слінаю. Яна абгрызла амаль усю палянку, потым пачала церціся аб зямлю рэбрамі і галавою, ледзь пераводзячы дух.

Склычаная, аблепленая балотнай тванню, яна вярнулася дамоў толькі вечарам. Гаспадар ужо аблупіў шчуроў, тонкімі цвічкамі прыбіў нацягнутыя шкуркі на жоўтую, гладка абгабляваную дошку, паклаў яе на прызбу. Шкуркі былі беленькія, з тонкімі павуцінкамі на ружаватых краях. Калі яны падсыхалі, то жаўцелі, рабіліся бліскучыя.

Пальма толькі глытнула перакіслага, як шчаўе, малака, падзівілася шчодрасці гаспадыні і, ледзь не падаючы ад стомы, павалаклася ў нагрэтую за дзень будку. Там лагодна лізнула ў цёплы носік свайго соннага шчанюка, што мяккім чарвячком скруціўся ў кутку, пачула, як дрогнуў яго нервовы жывоцік, і адразу заснула. Не чула нават, як сонны шчанюк падпоўз і прытуліўся да яе мяккай спінкай. Раніцаю наступнага дня, ужо другі раз, яна зноў прачнулася лёгка, нібыта нічога раней і не было. Балотны дух мацярдушкі наспружыніў мускулы цвёрдымі, як металічныя кружочкі, вузламі, наструніў лапы. Але нейкае трывожнае пачуццё вадзіла яе з аднаго канца двара ў другі, падціскала да хрыбта мех жывата, але ён зноў адвісаў, уцягваў у сябе салодкі пах рамонкавага лета.

Яна пабегла па вуліцы, рассякаючы пругкімі лапамі жвірысты пясок, нібыта шукала прычыну свайго неспакою, разнервавала суседскую квактуху, што вадзіла сваіх пісклявых дзьмухаўцоў, прынюхвалася і прыслухоўвалася, раздзімаючы пасечаныя ўчарашняю травою ноздры. Ужо хацела супакоіцца, але нечакана нашчацінілася ўся, агрызнулася на нешта нябачнае. А тое, нябачнае, але адчутае ўсім целам, ужо даганяла яе, прывідным шарам пакацілася па ўзбочыне дарогі, потым гарачым каменем упала на сабачую

спіну, здаецца, здзіраючы з яе вылінялую поўсць. Пальма прыгнулася, пачала атрасацца ад гэтага шалёнага, пякучага наслання і кінулася дахаты.

А там, у двары, стаяў гаспадар. Побач з ім аб нечым гаварыў сусед Сцяпан, высокі, лысы, з вялізным, бы яміна, ротам. Смяяўся, прытупваючы, разводзіў рукамі, як бы хацеў абняць вецер, драпаў сябе за шырокія грудзі вялізнымі і чорнымі, амаль да палавіны ўкрытымі карой пазногцяў пальцамі.

— Аддай ты мне сучку, Міня, чуеш?.. Сам ведаеш, які ў мяне клопат...

— Ат, Сцёпа, яна ж старая. Дзе ўжо ёй на бубен!

— Выдублю скуру, як з маладой будзе.

— А можа, пачакай... Хай ужо сама здохне!

— Ды не, не! Бубен саўсім дзіравы, во-во лопне. Мяняць рыхтык трэба...

Гаспадар злосна скубянуў сябе за бараду, зірнуў на Пальму хуткім і калючым, бы зазубец, позіркам, і сучцы здалося, што ён, гэты кароткі позірк, зачапіў яе недзе знізу, з-пад жывата, балюча падцягнуў уверх.

— Ты што, можа, з жывой здзіраць будзеш?

— Ну, ты гэта кінь! Я што, жывадзёр які? Ведама, заб'ю спачатку, аблуплю як след. Знаеш сам, як я гэта раблю. Во! Ні адной дзірачкі не будзе. А сучка ў цябе вялікая, скура — што трэба!

Пальма акамянела, утаропіла вочы ў вялізны Сцяпанаў рот, нібыта з гэтай чорнай бяззубай яміны вось-вось павінен быў выскачыць тлусты шчур. І яна нават прысела на задніх лапах, падрыхтавалася скочыць.

— Не, брацёнак, ты ўжо лепш пачакай. Неяк не па-людску гэта...

— Эт, дабранькі знайшоўся! — Сцяпан пакрыўджана крутнуў галавой і нехаця падаўся з двара.

Гаспадыня Волька, цягнучы свінням вядро з мяшанкаю, злосна чмыхнула, і Пальма адразу адчула, што яна нечым незадаволена.

Дзень пачаўся кепска. І Пальма хацела ўсім дагадзіць, выганяла з гарода суседскіх курэй, услужліва сустракала хрыплым брэхам усіх, хто заходзіў у двор, ляжала, піль-

нуючы, пад яблыняю, загружанаю да самага верху крамяным белым налівам. Але раз-пораз сэрца яе сціскалася, і сучка прыгінала галаву, адчуваючы на сабе насцярожаны позірк гаспадыні.

Калі з лугу вечарам прыгналі гусей, нават паспрабавала абараніць Грыньку ад ганарыстага задзірыстага гусака, захрыпела на яго, але гаспадыня нічога не зразумела і балюча выцяла яе па назе, пагнала, пакрыкваючы, гусей у хлеў. Пакрыўджаная, сучка моўчкі паскрэблася ў сваю будку і не вытыркалася адтуль да наступнай раніцы.

Яшчэ задоўга да сонца ў двары пачалося мітуслівае свята. Зазвінелі пустыя вёдры, аб дно бразгалі слоікі і бутэлькі з вадою. Гаспадыня збегала ў гарод, злазіла на гарышча. Пальма чула смачны пах сала і хлеба, усе цікавала за гаспадыняю. А Волька, бліскаючы локцямі, таропка завязвала хустку, абцярушвала ад сена пакамечаны пінжак на Міхайлу, а перад самай дарогай нацягнула на ногі маленькія боты. Адчайна пазяхаў без пары падняты Грынька, чухаў Пальму за вухам, і ад яго пахла цёплай вопраткай і свежым малаком.

Па ягады Пальму таксама не клікалі, але яна па старой завядзёнцы кінулася ўслед за людзьмі, бегла паўз дарогі, абрываючы з павуцiністай травы ліпкую расу, узбуджана-ціха скавытала. Спачатку ішлі па вузенькай сцежачцы ў жыце, падганяючы перад сабою Пальму перамовамі і смехам, потым праскочылі рэдкі малады хвойнік, наступаючы на хрусткую заечую капусту. Нарэшце ўсе трое ўзышлі на чыгунку, пашоргалі па шпалах. Было амаль цёмна, людзі шэптам перакідваліся словамі, быццам тут, на чыгунцы, і пасмяяцца ўжо нельга было, падганялі адно аднаго. Грынька ўсё адставаў, ківаў соннаю галавою. Гаспадыня, тузануўшы яго за рукаў, паказвала назад, гаварыла, што вунь там за імі бягуць ваўкі, ажно вочы свецяцца. Грынька і праўда прыспешваў хаду. Пальма таксама насцярожвалася, азіралася ў цёмную далячынь, утырканую яркімі кропкамі станцыйных агнёў, віляла хвастом, гатовая выканаць любы загад гаспадароў. Бегла за імі следам, падымаючы галаву ўверх, вышэй ад непрыемнага мазутнага паху рэек.

Наперадзе паказалася мужчынская постаць, і Пальма адразу пазнала Сцяпана, які нёс за спінаю стрэльбу. Яе кальнула ў грудзі, сціснула як абцугамі, забіла дыханне. Пальма з трывогаю слухала, як людзі павіталіся, перакінуліся некалькімі словамі і зноў пакрочылі наперад.

Сцяпан нібыта і не заўважыў Пальмы, ішоў, пераступаючы шпалы, наперадзе, і яго вялікая, укрытая пляскатай кепкай галава рытмічна пагойдвалася.

Ужо развіднела, калі ўсе ўступілі ў лес, камарэча едкай пацярухай адразу ж заторгалася над людскімі плячамі. Чарнічнік пачаўся адразу ж, і людзі павольна разыходзіліся ў розныя бакі, выбіраючы дзялянкі. Камарыная назола забівалася Пальме ў вушы, а яна, ратуючыся, шалёна насілася па чарнічніку, убівалася мордай у старыя пні, выграбала, фыркаючы, з нораў сухую зямлю, хмялеючы ад блізкага звярынага духу, брэхам клікала да сябе. Але ўсе збіралі ягады. Толькі Сцяпан пайшоў сваёй дарогай, растварыўся разам са сваёй стрэльбай за далёкімі дрэвамі.

Сасновы лес параскідваў свае бухматыя галіны, разаслаў уверсе вялізныя шэра-зялёныя апранахі, грэючы ў іх азяблыя за ноч ствалы, аб нечым доўга і працягла гудзеў, пазіраючы на гасцей залітымі смалою зрэнкамі, зеўраў пашчамі, гнаў уверх свае забранзавелыя целы. І здавалася, не людзі ішлі па гэтым прывідным ранішнім лесе, а ён павольна сунуўся за імі, выкідваў сабе і людзям на пацеху са сваіх высокіх дуплянак вавёрак і патрывожаных птушак.

Аб дно вёдраў забарабанілі першыя ягады, і Пальма адразу павесялела, зрэдку сашморгвала з галінак вялікія салодкія чарнічыны, лавіла ўсім целам, а не толькі слыхам, прыглушанае «ау», што далятала да яе як бы аднекуль зверху, з іглістых распушаных галін.

І раптам Пальма адчула, што навокал яе нешта змянілася, нават пацямнела і пацішэла, як закрытае зверху празрыстай плёнкай. Нібыта яна сама пачала страчваць слых і нюх, тое моцнае жывое адчуванне свету, асабліва блізкай небяспекі, якое дасюль яшчэ ніколі яе не падводзіла. Стала страшнавата. Пальма заскавытала, пабегла назад,

углыбіню, выбілася з высокага ягадніку, зашчамілася ў нешта густое і амаль непралазнае, сноўдалася, абдзіраючы бакі, паміж дрымучых старадрэвін, пакінутых звярамі нор і пнёў з вострымі і бруднымі ікламі.

Рэха амаль згубілася, і Пальма памкнулася назад. Нечакана з-пад лап выслізнула рабая гадзюка, заструменіла слюдзяным паскам па замшэлай зямлі. Пальма пачула перад сабой нешта жывое і непрыемнае, інстынктыўна падняла галаву, каб лепш бачыць, і, як падстрэленая, спалохана падскочыла каля вялікага ашчэранага пнішча, ад якога засталіся толькі трухлыя сценкі. Такое яна бачыла ўпершыню. Унутры пнішча, сплеценае ў жывы слізкі клубок, дрогка варушылася жоўтае гадаўё, злізвала з бакоў свайго логава сухі мох і ўцягвала яго ў свой пругкі студзень. Пальма падалася ўбок і зноў прыпынілася, застыла, як вялізны аблезлы груд. Прама над ёю, зачапіўшыся хвастамі за галіны мёртвай сасны, звісалі старыя гадзюкі, ледзь-ледзь паварочвалі маленькімі галоўкамі з бліскучымі шрацінкамі вачэй у розныя бакі, ціха, але грозна сіпелі. І нельга было зразумець, што тут адбываецца, што гэта за гадкае месца — ці проста гадзючы могільнік, ці гэта іхняе вяселле, ці звычайнае прыстанішча вялікай гадзючай сям'і. Пальма рынулася наперад, перад яе мордай падскочыла, звіўшыся ў пругкае кола, яшчэ адна гадзюка, праляцела ў паветры, але ўжо назад, пераскочыўшы Пальму, як бы адганяючы яе ад астатніх.

Анямелая ад нечаканага перапалоху, сучка памчалася праз гушчар, пераляцела праз яміну, кінулася на злом галавы далей з адзіным жаданнем хутчэй знайсці след сваіх гаспадароў. На бягу з апошніх сіл пераскочыла цераз вялізнае паваленае дрэва, але ніжняя, зачэпленая за нешта галіна раптам імгненна разагнулася і калюча хлёснула сучку па жываце. Але болю Пальма не адчула і, ні на хвіліну не прыпыняючыся, укацілася ў зялёны шоўк чарнічніку і пачала прагна прынюхвацца да чалавечых слядоў. Доўга блыталася, пакуль нарэшце знайшла, вылецела на паляну і радасна забрахала. На чыстым светлым месцы палуднавалі гаспадары.

— Ты дзе гэта швэндалася, гультайка? — зарагатаў Міхайла і кінуў Пальме кавалак нацёртага часнаком хлеба. Не зважаючы на непрыемны пах, яна адным махам праглынула пачастунак, легла каля абматаных зверху хусткамі вёдраў з ягадамі, усё хацела супакоіцца, але бакі раздуваліся ад перажытага і пабачанага, як кавальскія мяхі. Нарэшце пачула, як спіна пачала свярбець, усярэдзіне нарастала незразумелае пачуццё трывогі. Сучка міжволі азірнулася, шукаючы вачамі Сцяпана са стрэльбаю, але таго не было.

— Ты, гля, Волька, як яна, бедная, задыхалася.— Міхайла нагнуўся над сучкаю, асцярожна правёў па спіне лёгкай і гладзенькай, бы мянташка, зусім не мужчынскаю рукою.— Эге, дык жа, бачыш, чэрава нечым кальнула...

Нявесела, шкадуючы Пальму, Міхайла пацёр кулаком дзеразу барады і павольна, па-гаспадарску закурыў.

— Нічога,— уздыхнула Волька,— зажыве як на сабаку!

Пальма ўсё не магла прывыкнуць да тытунёвага, асабліва горкага ў лесе, паху, але так стамілася, што нават прылегла і выцягнула перад сабою худыя лапы, паклала на іх галаву і хацела на хвілінку задрамаць.

І раптам уся ўздрыгнула, пачуўшы ўсярэдзіне рэзкі пякучы боль, жаласна заскавытала і, падняўшыся, закруцілася на месцы, пачала ліхаманкава абнюхваць зямлю, на якой ляжала.

Але боль нечакана адпусціў Пальму, як нічога і не было. Гаспадары падняліся і пачалі збірацца дахаты.

Дарога з лесу была гладкая, шырокая, перарэзаная тоўстымі жыламі абдзёртых каранёў. Адкінуўшыся ад яе ў розныя бакі, парыпвалі, млелі, як старыя кабеты, закалыханыя цяплом сосны, хавалі ў сваіх галінах пухіркі гнёздаў, пахлі сухім ветрам і смалой, лагодзілі ногі ў папаратніку. Дарога, здавалася, таксама ціха парыпвала, дрымуча пацягвалася, потым распрамляла плечы, і стомленыя людзі ішлі па ёй вольна і акуратна.

Блізіўся канец лесу, паабапал дарогі закучаравіліся густыя алешынкі.

Пальма сступіла з дарогі, гулліва ўхапіла размяклы блін старога грыба, сціснула яго зубамі, драпнула зямлю заднімі

лапамі і радасна пабегла даганяць Грыньку, постаць якога мільгала між сасновых ствалоў недзе наперадзе.

І раптам Пальма спынілася, нават прысела на заднія лапы, быццам нешта пацягнула яе да зямлі. Усім пагарачэлым целам адчула невераемна моцны, злы позірк. У тое ж імгненне яе абвіслы паранены жывот зноў праняло пякучым болем. Пальма не варушылася, як адлітая з воску. Ад яе лап, ад паабдзіраных саскоў, ад самых, здаецца, кішак да спіны гідкаю хваляю падымаўся прыкры холад. Лапы падагнуліся, як перабітыя, і, здзіўленая ўсім, што з ёй робіцца, Пальма гупнулася грудзьмі на цвёрдую зямлю.

Жаласна захрыпела, убачыўшы Сцяпана, які са стрэльбаю ў руках падышоў да яе, нахіліўся, прыглядаючыся, як пазнаючы. Прамармытаў сабе пад нос:

— І дзе гэта падзерлася, дурніца?.. Нікуды цяпер не варта... Эх!

Злосна тупнуў нагою, але яшчэ раз агледзеў Пальму, паціснуў плячамі:

— Дурнічка... А можа, яшчэ што й выйдзе?..

Раздумваючы, ён падняў, але адразу апусціў стрэльбу, потым прыставіў яе да дрэва, дастаў пачак цыгарэт і закурыў.

Пальма зразумела, што страляць ён не будзе. Але радасці не адчувала. Яна так доўга думала пра Сцяпана і яго стрэльбу, што нават незаўважна для самой сябе захацела такой імгненнай смерці. Але, вядома, потым, калі-небудзь потым...

Сучка падняла галаву і бясцямна азірнулася. Лес напоўніўся густымі ценямі, у вачах раз-пораз мільгалі прывідныя, знаёмыя і незнаёмыя аблiччы.

Яна расцягнулася на вузенькай сцяжыне. Адчуванне холаду не знікла. Спіну пацягнула інеем, потым, здавалася, абсыпала мокрым непрыемным снегам. Лапы сутаргава камянелі, нібыта лета ўжо мінула і наступіла зіма. У халодным трызненні ёй уявіўся зусім яшчэ малы Грынька — у роўна прастрочаных бурках і маленькай зграбнай ватоўцы. Ён няўмела прывязаў Пальму да саначак з духмяным аснежаным сенам, потым пачаў кідаць перад ёю на лёд хлеб. Пальма ўсё бегла

і бегла да гэтага смачнага хлеба, цягнучы па замёрзлай рацэ нагружаныя саначкі. Кіравалася бліжэй да чарацінак, каб неяк учапіцца кіпцюрамі ў трэшчынкі, пакрыўджана сапла, але ўсё цягнула сваё зімовае сена. Там, дзе лёд быў зусім гладкі, яна безнадзейна слізгала па ім, баючыся ўдару ў заднія лапы, смешна дзерлася наперад. Неяк Грынька ўваліўся ў палонку каля самага берага, боўтаўся, як кацяня, у сцюдзёнай густой кашы, а яна, ухапіўшыся зубамі за каўнер мокрай ватоўкі, ляжала плазам на траскучым лёдзе, чакаючы людзей. А навокал ціха і горда стаяла зіма, раўнадушна пазірала на ўсё бельмамі вялікіх вачэй, патрэсквала тлустым лёдам і душыла пад ім амаль нежывых рыбін. Зіма працягнула да Пальмы свае доўгія белыя рукі, і сучка на кароткую хвіліну апрытомнела... І затрапятала нутром — ці то ад дзумкання вялізнай сіняй мухі, што круцілася каля самых вачэй, ці то ад далёкага густога крыку. Зіма трызнення адразу адсунулася за смольныя цёплыя дрэвы, лета шоргала гарачымі далонямі па высокім папаратніку, але холад усё роўна не хацеў выкочвацца з Пальмінага цела. Нехта, з другога канца лесу, усё клікаў сучку. Гэтае далёкае даўкае Вольчына «Пальма... Пальма...» неяк нехаця, глуха падала на Пальму, разлівалася па роце саланаватай вадкасцю. Сучка яшчэ раз паспрабавала залізаць ранку на жываце. Але язык як адзеравянеў. Пальма захрыпела, бо ёй раптам здалося, што зусім блізка гаюча пахне мацярдушка, кліча ў гушчар, далей ад таго шоргання і мармытання, ад тых самых, толькі ёю чутых крокаў, па якіх яшчэ каля гаспадаровага двара ў вёсцы Пальма пазнавала набліжэнне немінучага.

Пах мацярдушкі, здавалася, распіраў яе балючы цвёрды жывот, і Пальма зрабіла некалькі рыўкоў наперад, хмялеючы ад далёкага жаласлівага крыку гаспадыні.

Болю яна ўжо не чула. Растуліць шчэлепы таксама не магла. Цыгарэтны дым запаўзаў усярэдзіну і паколваў вантробы, як іголкі. Пальма толькі цяжка дыхала. Яе вечны сабачы страх, як расплаўлены тлушч, выцякаў з цела разам

з апошнімі сіламі. І разам з гэтым страхам у Пальмінай душы знікала жаданне глыбока ўдыхаць лета, бачыць і чуць...

Лес разгойдваў галінамі свой зялёны шум, але Пальма ўжо нічога не чула і не бачыла. Не бачыла і таго, як высока над зямлёю закруціліся і загрымелі сотні вялікіх, залацістых сонечных бубнаў. Толькі адзін Сцяпан, не зводзячы вачэй з аціхлай Пальмы, нарэшце дакурыў і кінуў на зямлю цыгарэту, затоптваючы ботам апошні агеньчык.

## Малінавае шчасце

На шырокім ілбе як аблітая воскам скура была так напята, што, здавалася, дзяўчыне было балюча. Вусны былі таксама бледныя. А вялікія, з ледзь бачнымі павекамі, вочы мяняліся колерам у залежнасці ад таго, на што Агрыпінка пазірала. Калі на дрэва — рабіліся зеленаватымі, калі на пясок — адлівалі жаўцізной.

І толькі валасы былі надзіва прыгожыя — цёмна-попельныя, густыя. Яны хваліста ападалі з высокага лба на скроні і асвяжалі бледнае, як выплаканае, аблічча, робячы яго непазнавальна-прываблівым. Агрыпінка была ўпэўнена, што гэтыя пышныя валасы робяць больш відочнымі яе касцістыя плечы і яшчэ — маленькі, але востры горбік на спіне. Таму заўсёды, нават у хаце, насіла хустку, глуха завязаную пад падбародкам.

Са сваёй першай сяброўкай Агрыпінка пасварылася яшчэ ў школе: не даравала злой абразлівай мянушкі. Наплакаўшыся, на колькі дзён зашылася на гарышча і піла толькі малако, што падымала для яе дарэшты змучаная маці. З таго часу яна стала яшчэ больш худзець і ўсё болей маўчаць, як набраўшы на ўсё жыццё ў рот вады. Прыахвоцілася да работы на нажной машынцы і праз некалькі гадоў стала абшываць амаль усё сяло.

Нягледзячы на калецтва, яна выцягнулася ў ладную дзеўку, аднак плечы былі ўсё роўна ненатуральна паднятыя ўверх і сукенка звісала з іх грубаю хламідаю. Як ні старалася

Агрыпінка, а не магла сама сабе пашыць нічога такога, што схавала б ад чужых вачэй яе вечны сорам. І ўсё часцей, сярод ночы, яна прачыналася ад нясцерпнага болю: на спіне, здаецца, вырастаў цэлы мурашнік. Варта было Агрыпінцы расплюшчыць вочы, як гэты мурашнік ажываў. Тысячы дробных мурашачак распаўзаліся і праціналі цела злоснымі пякучымі ўкусамі, што даставалі, здаецца, да самага сэрца.

Агрыпінка доўга ўмошчвалася на ложку як мага лацвей і сілілася заснуць, але нясцерпны сверб мучыў яе да самай раніцы. Яна ўсхоплівалася з калючага, як абсыпанага іглiцаю, ложка раней часу, бегла даіць карову, паліла ў печы. Нахекаўшыся, з радасцю садзілася ў сваім кутку за любімую швейную машынку — якраз перад самым акном...

Нарэшце падымалася сонца. Агрыпінка адрывалася ад работы і доўга, з нарастаючым у душы святлом, пазірала ў суседні двор, чакаючы, калі туды выбежыць яе любіміца — белагаловая дзяўчынка гадоў пяці. І праўда — яшчэ і не прачнуўшыся як след, з прыпухлымі пасля ночы вачанятамі, тоўсценькая малая адразу ж тэпала да плота і няўклюдна праціскалася праз дзірку ў ім. Спяшалася за пачастункам да Агрыпінкі, у якой заўсёды былі прыхаваны зліплыя падушачкі.

Запхнуўшы цукеркі за шчочкі, тут жа важна выходзіла з хаты. Агрыпінка ўздыхала, усміхалася і праз акно зноў сачыла за тым, як малая смешна праціскаецца праз вузенькую прарэху ў плоце, але ўжо назад. Напэўна, яна пры гэтым папісквае, пасопвае, цмокае языком...

Сённяшняя раніца пачалася для Агрыпінкі з другімі пеўнямі. Маці збіралася па маліны. Звечара знайшлі гумавыя боты і апаяскі для бідончыкаў, паставілі на лаву два эмаліраваныя вядры.

Агрыпінка ўстала як ні сярод ночы, баючыся, што маці з суседкаю ціхенька, не збудзіўшы яе, збягуць у лес. Дарога і праўда была нядблізкая.

Маці ў сваёй старэнькай хустцы, што навісала востраю дзюбаю над нізкім ілбом, тупала па ледзь бачнай сцяжыне

рыўкамі, як кулічок, пабразгвала вёдрамі, усунутымі адно ў другое. Суседка, наадварот, была па-мужчынску высокая, з крутымі плячамі, туга абцягнутымі вылінялым мужавым кіцелем. Але ішла лёгка і спрытна, як не чуючы цяжару ўласнага цела.

Доўга чакалі аўтобус і, здаецца, гэтак жа да нудоты доўга ехалі ў ім — трэсліся і гоцаліся на сядзеннях, ажно ёкала ў пячонках, па старым лесе. Аднак ехалі...

Калі аўтобус выкіраваў з калдобістай лясной дарогі на шырокі, засыпаны шчэбенем шлях, суседка папрасіла шафёра спыніцца. Па гэтай дарозе трэба было вяртацца крыху назад. Так і зрабілі. І тады толькі, перайшоўшы на другі бок дарогі, ягадніцы апынуліся на высокай кручы, што дыбілася над глыбокім кар'ерам. На дне яго, у яміне, стаяла дажджавая вада.

Доўга не думаючы, Агрыпінка рушыла ўніз па сыпучым жоўтым схіле, мякка вязнучы ботамі ў зляжалым жвіры. Праз хвіліну яна ўжо схілілася над вадою і дакранулася да яе дрогкай паверхні сваёй вялікай растапыранай пяцярнёю. Вадзяныя павучкі адразу ж заторгаліся ў супроцьлеглы бок. На дне, засыпаным пустымі перлавіцамі,— адкуль толькі тут і ўзяліся,— трымцелі прывідныя абрысы цёмнасініх воблакаў.

Вада была цёплая, калыхалася ў прыгаршчах жывым срэбрам, і Агрыпінка пырснула яе на свой разгарачаны твар. Прыплюшчыла ад задавальнення вочы, замерла. Грудзі роўна ўдыхалі густое летняе паветра, што набрала ў сябе і спёртага жвіровага духу, і парнасці ад разагрэтай дажджавой вады, і яшчэ нечага вельмі ж знаёмага з маленства. Гэта быў ці то рэзкі пах яшчэ неапераных птушыных цельцаў, ці то салодкі водар разамлелай грэчкі, такі хмельны і даўкі.

Праз хвіліну Агрыпінка пачала караскацца наверх, яшчэ глыбей вязнучы ў шарготкім буйным жвіры, але раптам у скроні пачало бухаць, перад вачамі мітусліва забегалі ружовыя вадзяныя павучкі. Здалося, што яе горбік адразу разбух, разросся, тарkануў цвёрдым коранем пад самыя грудзі і раптам загудзеў там, унутры, як важкі царкоўны

звон. Каб не паляцець уніз, Агрыпінка апусцілася на калені, паспеўшы схапіць працягнутую суседкай руку.

...Далей ісці было весялей і вальней — дарога пашырэла ажно ўдвая. Уперадзе забялеў бетонны мост над глыбокаю багністаю прорваю, ад якой і пачыналася тая самая, патрэбная ягадніцам, забалочаная нізіна, што была акружана маліннікам.

Ягадніцы асцярожна спусціліся з насыпу, павытрасалі з ботаў пясок і папрывязвалі да пояса бідончыкі. Па-буслінаму высока падымаючы ногі, зашоргалі адна за адной па ядавіта-зялёнай сакаўной траве — напрасткі да карчоў. Агрыпінка дыбала апошняю, апусціўшы галаву. Бачыла, як глыбокія суседчыны сляды на вузенькай сцежцы перад ёю імгненна зацягваюцца балотнай іржою. Таропка ступала ў гэтыя сляды...

Ягадніцы разышліся ў розныя бакі толькі ў малінніку. Ён быў надзіва рэдкі і заліты мелкаю, але чорнаю і нейкаю загуслаю вадою. Агрыпінка чула, як пад падэшвамі спружыняць размытыя тонкія карані. Яна ставіла вядро даволі блізка, каб не згубіць яго з вачэй. Потым узбіралася на сапрэлы грудок, дзе з высокім малінавым карчом пераплятаўся ляшчыннік, станавілася на цвёрдым як зручней і пачынала збіраць у бідончык вялікія, налітыя сокам ягадзіны. Яны пагойдваліся, здаецца, каля самага рота і ў гэтай гнілаватай задусе хмялілі такім вострым водарам, што Агрыпінка не стрымлівалася ад спакусы і раз-пораз лавіла іх вуснамі. Некаторыя былі такія спелыя, важкія, што ад неасцярожнага дотыку зрываліся з галіны і падалі ўніз, у брудную ваду.

Агрыпінка спяшалася ад аднаго карча да другога, адклікалася на матчын голас, баючыся заблудзіцца, зрэдку пазірала пад ногі, каб не наступіць на якую-небудзь балотную пачвару. Вядро паволі напаўнялася.

Захапіўшыся, Агрыпінка так і не пачула, як зусім блізка, патрэскваючы галінамі і гонячы пры хадзе з вады гнілыя бурбалкі, падышоў нехта чужы. А калі ўгледзела яго, вялікага, чорнавалосага, у салдацкай гімнасцёрцы, ажно прысела каля свайго малінавага куста і сцішылася. Здаецца,

і не дыхала. Трывожна назірала, як чорнавалосы, трымаючы перад сабою кепку з ягадамі, хутка набліжаецца і ўсміхаецца ёй яркімі тоўстымі вуснамі. Ад страху Агрыпінка падалася спачатку наперад, потым павярнулася і кінулася да свайго вядра. Схапіўшы яго, не азіраючыся, па-качынаму няўклюдна затупала ў гушчар. Нізкія галіны хвасталі яе па шчоках і вуснах, хустка за нешта зачапілася і спаўзла на плечы. Валасы адразу ж упалі на вочы, засланяючы святло. Спадніца намокла. Яна, напэўна, магла б ускочыць у багністае балота, калі б не спынілася перад гэтаю вялізнаю, што патэльня, жабаю — тоўстай, пакрытай ярка-жоўтымі плямамі і рудымі бародаўкамі. Жаба, здаецца, усё болей раздзімалася, утаропіўшы ў Агрыпінку лупатыя вочы, сядзела на сухім грудку і пагрозліва не рухалася з месца.

Агрыпінка нібыта апрытомнела і толькі цяпер пачула асіплы матчын голас. Крута павярнулася на яго і пабегла яшчэ шпарчэй.

Напалоханая яе маўчаннем, маці ледзь не кінулася з кулакамі, потым заўсхліпвала, заклявала востраю дзюбаю хусткі, праклінаючы і сябе, і гэтыя карчы. Дзіва дзіўнае, але Агрыпінка нічога не змагла ёй расказаць. Маці ўжоназбірала поўнае вядро, акуратна абматала яго зверху фартухом, каб не рассыпаць ягады, і цяпер чакала толькі суседку. Тая нарэшце таксама выйшла з поўным вядром, і ўсе трое паспешліва падаліся ў нізіну. Там, стоячы па калені ў траве, таропка з'елі хлеб з салам і выпілі яйкі. Цярэбячы новую сцежку, пайшлі да моста.

Агрыпінка яшчэ здалёк заўважыла таго самага чорнавалосага ў гімнасцёрцы. Ён надразаў тоўстую лазіну, пэўна, каб садраць лыка. Успомніла, што ў спешцы не завязала як трэба хустку, і цяпер леваю рукою, бо правая была занята вядром, прыгладжвала распушаныя, ажно гарачыя валасы, прыціскала іх да галавы. Адчувала, аднак, што тыя зусім не слухаюцца яе, нават пагойдваюцца пры хадзе.

Трава паспела за дзень падсохнуць, чэпка аблытвала халявы ботаў і патрэсквала. Паверсе наўкольнай ядавітай зеляноты трымцелі клубкі парнасці, высокае сонца залаціла ўжо далёкую трымтлівую паласу малінніку.

Агрыпінка ледзь паспявала за маці — галава кружылася, хмялела ад густых пахаў і сонечнага цяпла. Над нізінаю свяцілася глыбокае, як перавернутая дном уверх шклянка, зеленаватае неба. Цененькі звон мноства стракоз і мушак узлятаў уверх, да гэтага шклянога неба, але, здаецца, адбіваўся ад яго і зноў сыпаўся ўніз, на траву, нябачным шарготкім пяском. Проста пад ногі Агрыпінцы.

Чорнавалосы таксама ўбачыў ягаднiц, выпрастаўся і пачаў няспешна перавязваць лыка. Калі параўняліся, першы паздароўкаўся, шырока ўсміхнуўся, заблішчаў жаўтаватымі ад тытуню, вялікімі зубамі. Спыніўся позіркам на Агрыпінцы і нечакана падаўся наперад, як спатыкнуўшыся на гладкай дарозе. Усё не мог адарваць ад яе позірку, хаця глядзеў, здавалася, толькі на бровы і лоб.

«Не, гэта ён на валасы ўзіраецца. Каб ты згарэў, стажок пракляты».— Агрыпінка ўспыхнула і раптам, нечакана для сябе самой, са злоснаю рашучасцю павярнулася да хлопца спінаю. Але тут жа здзіўлена пачула каля сябе крокі чорнавалосага, краем вока ўбачыла, што ён нахіліўся і высыпаў у яе вядро поўную шапку малін. Агрыпінка ўбачыла патыліцу, яго тонкую шыю з вугальна-чорнымі, як у цыгана, крутымі кучаравінкамі валасоў і нават парудзелы ад поту каўнер. Заўсёды ненавідзела ўсё бруднае, але цяпер чамусьці гадлівасці не адчула. Нібыта і не ўцякала ад чорнавалосага ў малінніку, падумаўшы благое.

Праз некалькі хвілін жанчыны ўжо сядзелі на возе, да якога іх прывёў чорнавалосы.

— Вот гэта пашэнціла! Ото ж тэпалі б! — задаволена рагатала суседка, звесіўшы ўніз з драбін ногі. Ушчаміўшы паміж каленяў вядро, моцна трымала яго рукамі.— А ты сам жа, любчык, адкуль? — зацікавілася яна.

Чорнавалосы назваў суседнюю вёску.

— Я ж і кажу, што цябе нам Бог паслаў. Праўда, Агрыпінка?

Хутка яны ўжо ведалі, што чорнавалосага завуць Лёнем і што працуе ён у горадзе, майстрам па машынках у швейнай майстэрні.

Суседка шчодра частавала Лёню хлебам і салам, але той жартаўліва адмахваўся ад усяго, панокваў на каня і весела расказваў, што дзед паслаў яго так далёка таксама па маліны. А ён вось толькі лыка надраў.

— А хіба ж у вас дабра гэтага няма, любчык?

— Нічога... Тут, цёт, лыка лепшае! Дагаджу яму, і мёду дасць. Вы мёд любіце?

Суседка неяк нядобра, па-змоўніцку таўханула Агрыпінку локцем у бок. І раптам, як уздумаўшы пра самае галоўнае, запытала:

— Лёнічак, а ў гэтай... ну... у майстэрні вашай добра?

— А чаго, зарабляюць трохі.

— Слухай-но, што я прыдумала... Прыстрой ты, Лёнічак, Агрыпінку туды. Дальбог. Гэта ж залатая швачка! На ўсё сяло!

Агрыпінка пачула, як затузалася, зашапацела свежай саломаю насцярожаная, расчуленая маці.

Лёня зарагатаў, ляснуў лейцамі па кабыле, крыкнуўшы: «Эх, маліна-ягадка!» — і азірнуўся на Агрыпінку.

Але яна толькі ўткнулася плячом у матчыну спіну, як хаваючыся ад яго позірку за гэтаю надзейнаю сцяною. І застыла. Воз мякка пакалыхваўся ў бакі.

...Агрыпінка бачыла раніцу. Вёска яшчэ толькі паліла ў печах. Але вось ужо ярка заіскрылася сонца, залівhouseholdючы сваім празрыстым золатам двары. Агрыпінка сядзела за швейнаю машынкаю, з якой, здавалася, ужо зраслася, і пазірала ў акно. Тоўсценькая суседская дзяўчынка, чырванеючы ад натугі, прадзіралася на гэты бок праз дзірку ў плоце. Потым, стаўшы пад Агрыпінчыным акном, пачала падскокваць на месцы і зазіраць у хату. Чакаючы пачастунак, падняла ўверх ружовенькі тварык. Агрыпінка набрала жменю малін і працягнула руку праз акно, быццам яно было незашклёнае. І адхіснулася ад здзіўлення. Перад ёю стаяў Лёня. Ён шырока ўсміхаўся, браў ягады і кідаў, адну за адною, у рот, прыцмокваючы ад задавальнення. Потым, быццам спалохаўшыся нечага, пабег да плота і пачаў праціскацца праз яго вузкую прарэху, раздзіраючы на грудзях вылінялую гімнасцёрку.

Высокі плот адразу ж ажыў і заварушыўся, нахіляючыся ў розныя бакі. І тады Агрыпінка з жахам пачула, што Лёневы рэбры пачалі трашчаць. Як шалёная, яна падхапілася з крэсла і кінулася да акна. Упіраючыся ў падаконнік рукамі, прасунулася ў яго, але нечакана зашчамілася ў драўлянай раме, роспачна тарганулася і ледзь не закрычала ад болю.

Агрыпінцы здавалася, што цяпер яна трымае на сабе ўсю вялізную хату з саламянаю страхою і шырокаю буслянкаю на самым вільчыку. І не дыхнуць!

Хата хілілася ўсё ніжэй і пагрозліва трашчала. Тады Агрыпінка з усяе сілы рванулася наперад і паляцела праз акно ў двор. Але не звалілася на зямлю, а стала на ногі. І тут жа адчула ў сабе незвычайную палёгку. Нібыта яе горбік адарваўся ад спіны і застаўся ў хаце...

На гэтым Агрыпінка прачнулася. Яшчэ ў паўсне злізала з вуснаў цёплую рэдкую соль нацеклых слёз. Слухала, як побач усё яшчэ весела і няўтомна балбоча суседка, а воз раўнадушна шоргае коламі па сухой пясчанай дарозе.

Драўляная лесвіца зарыпела. Трымаючыся за яе хісткія парэнчы, Агрыпінка паволі паднялася на другі паверх. Вочы яшчэ не паспелі прывыкнуць да калідорнага прыцемку, але яна адразу ўбачыла фарбаваныя дзверы, пра якія пісаў Лёня... Так-так, ён напісаў маці праз два тыдні пасля той іхняй сустрэчы, паведаміў, што ўжо дамовіўся аб усім. І што Агрыпінцы трэба спяшацца з прыездам.

Агрыпінка ціха пастукала ў дзверы, пастаяла ў чаканні, але ніхто ёй не адказаў. Ну і што... Яна сама штурхнула гэтыя дзверы, счакала хвіліну і тады ўжо, схаладзеўшы ад хвалявання, ступіла на парог. І замерла: невялікая швейная майстэрня была надзіва светлаю і высокаю. Немаладая швачка за бліжэйшым сталом падняла ад работы вочы, з непрыхаванаю цікавасцю агледзела Агрыпінку з ног да галавы. Такая наўмысная, як здавалася Агрыпінцы, агідная людская ўвага заўсёды пераварочвала душу. Але цяпер Агрыпінка ўзяла сябе ў рукі, не забываючы, куды і за чым прыйшла, спакойна агледзелася.

Швейныя машынкі былі пастаўлены ў два рады. Над сталамі, да самай, здаецца, столі, тонкімі празрыстымі, што

шоўк, ніткамі нацягнуліся сонечныя промні. Блізка, хоць дакраніся да іх рукою. Агрыпінка ўсміхнулася, яшчэ вышай падняла галаву і павольна пайшла паміж гэтымі сонечнымі радамі. Машынкі адразу ж дружна застракаталі, швачкі заклапочана схіліліся над лёгкім белым паркалікам, і Агрыпінцы раптам здалося, што тут, вось у гэтай майстэрні, яна была ўжо і раней, што гэта яе даўняе, надзейнае прыстанішча, да якога яна ўрэшце вярнулася пасля доўгай цяжкай дарогі. Падумала, што яна правільна зрабіла, зняўшы хустку яшчэ ў пад'ездзе.

Падышоў Лёня — быў цяпер у строгім чорным пінжаку і блакітнай сарочцы. Кальнуў яе такім жа, як тады, на возе, пранізліва-вясёлым позіркам, падвёў да самай апошняй у радзе, самай старой і пашарпанай, нажной машынкі. Нахіліўся, быццам нешта хацеў сказаць, і раптам балюча прыкусіў зубамі краёчак яе вуха. Агрыпінка нават не паспела пачырванець ці зазлавацць, падумала толькі, што трэба будзе неяк астуджваць яго, але не сказала ні слова. Усё ж не прыняла ўсур'ёз тую дзіўную нечаканую Лёневу ўвагу.

Дзень пачаўся незвычайна. Яе суседка злева, жанчына гадоў сарака з нейкім шараватым, як заплямленым высахлаю лускою, тварам, усё ўздыхала і раз-пораз ківала галавою. Быццам суправажджала свае патаемныя думкі. Яны хутка пазнаёміліся, і Манюля растлумачыла, што шыюць у майстэрні якраз жаночыя кашулі і халаты і што Агрыпінцы пашэнціла на лёгкі заказ.

Спачатку Агрыпінка хацела прызнацца, што і больш складанай работы не баіцца, але пасаромелася. Каб не маўчаць, пачала расказваць пра маці і маліны, пра сваю вёску. Аднак ні слова — пра Лёню. Нібыта раней і не ведала яго. Сама сабе здзівілася, пасля раззлавалася. І да самага канца работы ні з кім больш не загаворвала.

...Наставала цёплая мяккая восень. Ужо каторы дзень Агрыпінка выбіралася з майстэрні самаю апошняю. Не спяшалася ў свой часовы прытулак — няўтульную кватэру, дзе жыла са сваімі дзецьмі і мужам стрыечная Агрыпінчына сястра Валя. Адчувалася, што за ветліваю сустрэчаю

і вясёлымі роспытамі-ўспамінамі: «А як там Стэпка дурная? Ці ўсё ходзіць зімою ў галёшах? А ці жывы Сымон?..» — хаваецца ў сястрынскай душы нездаволенасць нечаканым прыездам Агрыпінкі. Нават не захацела слухаць аб аплаце за жыллё, і ад гэтага Агрыпінцы было яшчэ цяжэй і няпэўней.

Усё часцей яе думкі цягнуліся да Лёні, хоць той чамусьці апошнім часам амаль не заходзіў у майстэрню. У кароткія хвіліны памяць вяртала малінавы п'янкі дзень, перад вачамі зноў чорна блішчалі кучаравінкі на Лёневай тонкай шыі і па-ранейшаму моцна і радасна хвалявалі.

Агрыпінцы было соладка ад таемнага прадчування, што вось-вось у яе жыцці павінна адбыцца нешта незвычайнае. Было страшна, ажно халадзела ўсярэдзіне, падоўгу хадзіць адной вузенькімі вулічкамі, бо здавалася, што ўвесь час за ёю нехта паціху крочыць, напэўна, Лёня. Узбуджаная, Агрыпінка ўрэшце спынялася і азіралася. Але ніхто яе не даганяў, ніхто не шукаў. І тады ў Агрыпінчынай душы, замест радасці, паціху нарастала прыкрае і глухое, нават злоснае раздражненне...

Неяк у пятніцу пасля работы Агрыпінка зусім размякла. Падумала сама пра сябе: «Што казляк пераспелы!» — і пачулася яшчэ болей хвораю. Павольна, хістаючыся ў бакі, сышла ўніз па рыпучай лесвіцы. Пастаяла трохі ў цёмным пад'ездзе, падумаўшы, выняла з новай, толькі ўчора купленай, гарадской сумачкі блакітную газавую хустку. Такіх прыгожых яна яшчэ не насіла і цяпер нібыта саромелася сама сябе. Рукі не слухаліся, ад напружання ажно закалола ў пальцы, але Агрыпінка ўсё ж налаўчылася і туга схапіла гэтаю новаю хусткаю капну густых валасоў. І крыху супакоілася.

Прысланіўшыся плячом да шорсткай аблупленай сцяны, Агрыпінка задумалася. У вушах усё яшчэ стаяў глухі шум перажытага рабочага дня, яе швейнай майстэрні: чулася ўперамешку то шапаценне паркалю, то металічнае скрыгатанне ручкі вялізнага праса, то роўнае ціўканне машынак...

«Калі так і далей пойдзе, стану лепшаю швачкаю. Далібог, стану!» Яе, Агрыпінку, ужо хвалілі, да яе ўсё часцей

падыходзілі за парадамі іншыя, нават старэйшыя гадамі, швачкі.

Агрыпінцы нечакана стала цяплей унутры, захацелася ўспомніць яшчэ што-небудзь прыемнае і добрае, каб хаця сёння не паказвацца ў сястры пякучаю крапівою. Але думкі нечакана павярнулі ў іншы бок: «Лёня!» У майстэрню ён так і не прыходзіў... Ужо цэлы месяц яго замяняў напарнік.

Тады навошта ёй, скажыце, гэтая майстэрня? Навошта лагодная, крыху асцярожная пахвальба суседак? А можа, яны ўсе яе проста шкадуюць? Ну, вядома, шкадуюць! Гэткую дурнічку... І Манюля шкадуе. Сочыць усё, сочыць... А чаго сочыць? Навошта...

Агрыпінка рэзка адчыніла дзверы пад'езда, зрабіла якія два-тры крокі за парог, але тут жа адхіснулася назад.

На вуліцы яе сустрэў буйны радкаваты дождж. Газавая хустка на галаве імгненна намокла, і ўсё ж вяртацца ў глухі смярдзючы пад'езд не хацелася. Так і стаяла...

З хусткі за шыю пакаціліся халодныя казытлівыя кроплі дажджу, потым прасачыліся праз каўнер блузкі на спіну, струменьчыкамі абцякаючы яе з абодвух бакоў. Агрыпінка павяла плячамі, проста так, не думаючы, глянула ўбок і раптам убачыла Лёню. Той нібыта чакаў яе позірку, рынуўся з месца, на хаду сарваў з сябе плашч. Дабегшы, накінуў яго Агрыпінцы проста на плечы. І нечакана гучна засмяяўся. Агрыпінка здзіўлена ўбачыла, як на яго вялікім падбародку смешна дрыжаць іскрыстыя дажджынкі, падняўшы вочы, сустрэлася з ягоным позіркам і таксама ўсміхнулася...

З таго часу Лёня праводзіў яе дахаты амаль кожны вечар. Доўга трымаў на лавачцы ў старым запушчаным парку паблізу дома, дзе яна кватаравала, цалаваў. Уткнуўшыся ў валасы, шаптаў салодка-хмельныя словы, якія потым сніліся Агрыпінцы ўсю ноч. На рабоце ў майстэрні Агрыпінка з усяе сілы налягала нагою на жалезную рамку пад машынкай, сачыла за роўным акуратным швом. Была шчаслівая. Але часам адрывала ад мігатлівай іголкі вочы, упіралася локцямі ў столік і надоўга задумвалася, нібыта хацела зразумець, адкуль жа хоць і рэдка, але ўсё ж заплывае ў душу

тая горкая, тая атрутная кропля роспачы, што ўмомант нішчыць яе крохкую нечаканую радасць. Схапіўшы на сабе цікаўныя позіркі суседак, зноў выпроствала плечы, змахвала з ілба валасы.

...У той вечар Лёня не хацеў развітвацца. Дом, дзе жыла сястра, быў двухпавярховы і ўвесь нейкі чорны. Спыніліся каля драўлянай лесвіцы, што ляпілася да сцяны са двара і канчалася наверсе маленькаю пляцоўкаю і дзвярамі, якія вялі адразу ў сястрынскую кватэру на другім паверсе. Агрыпінка начавала ў адным пакойчыку з Валінымі блізнятамі, вечарам клала іх у ложак, расказваючы адну і тую ж казку пра царэўну і ўдовінага сына. Успомніўшы пра гэта, падумаўшы, што дзеці ўсё яшчэ чакаюць яе і не спяць, Агрыпінка памкнулася дахаты, аднак Лёня не пусціў. Стаяў, прыціснуўшыся вуснамі да яе валасоў... І ўсё ўздыхаў.

Нехта зусім блізка і знарок гучна кашлянуў, груба ўдарыў кулаком аб драўляную парэнчу лесвіцы. Агрыпінка адскочыла ад Лёні, азірнулася. Па лесвіцы важка тупаў Валін Сцяпан, хістаючыся, ледзь адолеў некалькі прыступак. Лёня хмыкнуў, але Агрыпінка затуліла яму рот, баючыся п'янай Сцяпанавай лаянкі. Нарэшце ўверсе моцна стукнулі дзверы, ажно на плечы пасыпалася труха. Лёня чамусьці раззлаваўся, пачаў прасіць яе не ісці да сястры, клікаў да сябе. Сам ён кватараваў у Манюлі, меў невялікі пакой з асобным уваходам. Агрыпінка ведала, што Манюлін дом стаіць блізка каля вакзала і што ісці туды хвілін пятнаццаць, але не згадзілася.

Таропка развітаўшыся з Лёнем, амаль подбегам кінулася наверх. Не падняўшы галавы, слізганула праз залу ў спальню. Убачыўшы яе, блізняты зараўлі ў адзін голас, і Агрыпінка павалакла абодвух да ложка. Пачала распранаць і таропка расказваць старую казку. Да слыху даляталі брыдкія п'яныя словы, што сыпаліся на бедную Валіну галаву, але Агрыпінка старалася іх не чуць. Стомленыя дзеці ўжо засыналі, калі нешта цяжкае грымнула на падлогу, ажно задрыжаў увесь дом. Агрыпінка пачала таропка гладзіць па галоўках паўсонных хлопчыкаў. Супакойвала. Чула, як

Валя бегала па зале. Вось яна спынілася каля самых дзвярэй спальні, прыглушана заенчыла, паклікала на дапамогу. Агрыпінка павярнулася ад ложка да дзвярэй, нават падалася наперад. Але ў гэты момант дзверы адчыніліся, ледзь не паляцеўшы з завесаў. З распушчанымі, такімі ж густымі, як і ў Агрыпінкі, валасамі Валя прабегла некалькі крокаў і ўпала па падлогу перад ложкам з соннымі дзецьмі, закрыла галаву рукамі. Раз'юшаны Сцяпан стаяў у парозе і брыдка лаяўся.

Праз расчыненыя дзверы ў спальню лілося густое святло, і ў яго жоўтым сяйве Агрыпінка здавалася вельмі высокай і дужай. Стоячы перад Сцяпанам, усё хацела нешта сказаць яму, але не магла, горла сціснулі жалезныя абцугі. Тады яна падняла рукі з доўгімі пальцамі, быццам хацела дастаць да Сцяпанавага твару, а можа, і ўдарыць. Той быццам ацвярозеў, нават адступіў назад. І раптам загаварыў ціха, але рашуча:

— Ну што, ціхоня, у прыполе яшчэ не прынесла?! Гэ? Нічога, прынясеш! Я такіх, як ты, наскрозь... Пасмялела, бач?! Ціх-хо-ня!

І грымнуў нагою аб падлогу.

— Каб і духу заўтра не было!

Ужо не помнячы сябе, Агрыпінка кінулася на яго і адштурхнула ад дзвярэй, як непрытомная, вылецела з залы, прагрукатала па дрыготкай лесвіцы ўніз.

На вуліцы было надзіва цёмна і страшна, але яна кінулася прэч, усё яшчэ чуючы, як праз адчыненыя дзверы нясецца гадкая Сцяпанава лаянка.

...Ногі самі сабой прывялі яе ў старэнькі парк, на іхнюю з Лёнем лавачку. Пашкадавала, што не ўзяла жакецік, але дзе ўжо там было,— абхапіла сябе рукамі, каб хоць як сагрэцца. Нарэшце не вытрымала і зноў падхапілася на ногі і пабегла. Да Манюлінай хаты. Вось яна... Хутка ж дабегла! Вось і акно, якраз Лёнева.

Агрыпінка прыціснулася да шурпатай, яшчэ цёплай пасля дня сцяны і рашуча, ні аб чым не думаючы, стукнула кулачком у шыбіну. У пакоі было цёмна, але Лёня, мабыць,

14. Зак. 1877

яшчэ не заснуў. Таргануліся белыя фіранкі, адкрыўшы бледнае ў цемры, невыразнае аблічча. І Агрыпінка нібыта апамяталася, адразу адхінулася ўбок, дакараючы сябе за зробленае.

Аднак Лёня ўжо выскачыў на ганак. Яшчэ сонны, прабубнеў нешта, схапіў яе за рукі адразу ж, не распытваючы, пацягнуў у прапахлы тытунёвым дымам пакойчык. Усё называў яе «малінай-ягадкай», цалаваў, нібыта даўно не бачыў. Асцярожна пасадзіў на ложак, потым разуў. І Агрыпінка сама прылегла на мяккую падушку, закруцілася з галавою ў тонкую коўдру.

Заснула, здаецца, імгненна. Але сон быў нямоцны, у душы пераплялося ўсё трывожнае і радаснае, раптам пачалі сніцца заплаканыя Валіны блізняты.

Агрыпінка прачнулася і доўга не магла зразумець, дзе гэта яна...

Лёня ўсё яшчэ сядзеў на ложку, нізка нахіліўшы да яе галаву.

Яны жылі разам ужо амаль год. Неяк у нядзелю забегла Валя, прывяла сваіх блізнятак. Лёня кінуўся ў краму, а Валя ціхенька, як сама ў нечым вінаватая, пачала распытваць Агрыпінку аб тым ды сім, цікавілася, ці хутка будзе вяселле. Калі роспыты вывелі з цярпення, Агрыпінка коса, непрыязна паглядзела на сястру, быццам тая закранула самую балючую струнку ў душы. І Валя замахала рукамі, паўтараючы: «Ды што ўжо... Што там!.. Ці ж пячатка?..» Не дачакаўшыся Лёні, сабралася, таропка пацалавала Агрыпінку ў шчаку і рушыла з блізнятамі дахаты...

Лёню гэта пакрыўдзіла. Паставіўшы прынесеную бутэльку на стол і абхапіўшы галаву рукамі, ён сядзеў на пакуль што адзіным у іхнім пакойчыку крэсле і маўчаў. Потым глянуў на Агрыпінку пачырванелымі, стомленымі вачамі.

— То мо самі вып’ем? Яшчэ ж ні разу... Не адгулялі...

— Вып’ем, Лёнік. Толькі ты і за мяне, добра?

— Што за цябе?

— Выпі...

Лёня злосна змахнуў са стала пакамечаную газету і разліў віно ў шклянкі. Не падымаючы вачэй, працягнуў адну з іх Агрыпінцы. Яна сапраўды зрабіла два маленькія глыткі і паставіла недапітае на стол.

— Ну-ну, не прыкідвайся. Каб мая жонка ды не куляла...

Агрыпінка захмялела не столькі ад выпітага, колькі ад таго, што вось толькі цяпер, упершыню за гэтыя месяцы, ён нарэшце назваў яе жонкаю. Але адказала ціха, упарта:

— Не буду! Цяжарная я.

Ён спачатку нібыта не зразумеў нічога, хаця і перапытаў: «Як цяжарная? Як гэта?» Потым падняўся з-за стала і павярнуўся да Агрыпінкі, раскінуўшы рукі, нібыта хацеў абняць разам з ёю ўвесь маленькі пакойчык. Увесь ажно заззяў.

— А ты не маніш, маліна?

Агрыпінка сядзела на ложку і маўчала, не прыбіраючы навіслыя над самымі вачамі важкія валасы. Лёня адчуў гэтую Агрыпінчыну насцярожанасць, стаў перад ёю на калені. Потым сам падняў яе рукі і моцна прыціснуў далонямі да сваёй тонкай, з пружыністымі кучаравінкамі валасоў шыі. Заціх.

— Лёня, Лёня...— Агрыпінчын голас быў ахрыплы.

Лёня толькі ўздрыгнуў, крутнуўшы вялікаю галавою.

— Лёнічак, а я ўсё думаю...

— А ты нічога не думай!

— А я думаю ўсё, чуеш... Што, як народзіцца... Ну... З такой спінаю, як у мяне.

Лёня адразу адхіснуўся ад яе, як спалоханы. Скрывіў вусны.

— Як гэта? Ты што? Са спінаю... У цябе ж — іншае! Іншае... Сама казала, што з печы бахнулася! — Ён спачатку глуха, пакутліва ўздыхнуў, але тут жа злосна насупіўся: — От-т... Гэта я ўжо знаю... Гэта ты ўжо нешта з ім хочаш зрабіць... Знаю я вас усіх! Не смей!

— Лёнік, ну што ты! Як жа грэх такі?.. Ды мне, Лёнік, і позна ўжо.

— Як гэта позна? Чаму позна?

Лёня выкрыкнуў гэтае «Чаму позна?» з такою непрыхаванаю трывогаю, што Агрыпінка як апрытомнела.

— А позна! Чацвёрты месяц ужо... Жывое... Чуеш?

Сказала з нейкай злоснай рашучасцю, але адчула, што можа пакрыўдзіць яго, і ўсміхнулася. Да прыкрасці лісліва, быццам прасіла прабачэння. Лёня і праўда палагаднеў і таксама ўсміхнуўся, але неяк кісла, нібыта сілаю расцягваў вусны.

— Вось і добра, што позна. Не наробіш глупства якога, маліна-ягадка! — страсянуў чорным чубам.— Пакатаемся на саначках!

...Яна чакала яго цэлы тыдзень. Кожны раз ледзь стрымлівалася, каб не збегчы з работы дадому і не праверыць, а можа, Лёня ўжо там. Але замок быў на месцы, і Агрыпінка паварочвалася, не вымаючы з сумкі ключа. Спачатку ішла ў новы ўнівермаг, падоўгу прастойвала каля прылаўка з дзіцячымі цацкамі, потым пеша — да вакзала. Так — амаль да самай ночы. Пачало даймаць бяссонне, Агрыпінка доўга круцілася ў халодным абрыдлым ложку і слухала, ці не стукне хто ў шыбіну. Але Лёня знік. На другі ж дзень пасля таго, як даведаўся пра яе цяжарнасць. Раніцаю сказаў, што пойдзе на вакзал сустракаць свайго даўняга сябра-студэнта Валіка Самка. Правёўшы Агрыпінку з хаты да дарогі, усё не хацеў адпускаць яе ад сябе. Прызнаўся, што і сам хацеў бы паступіць у той кааператыўны тэхнікум. Памяўся крыху, патупаў на адным месцы. Потым крута павярнуўся і — пабег. Нават не развітаўся...

Агрыпінка не хацела ні з кім гаварыць пра яго, баялася што-небудзь распытваць нават у Манюлі і чакала, калі тая наважыцца сама. Разумела толькі, што з Лёнем нічога дрэннага не здарылася. Іначай бы пра тое ведалі ўсе. Жанчыны ў майстэрні адразу пацішэлі і толькі ўпотайкі, думаючы, што Агрыпінка нічога не заўважае, пільнавалі кожны яе крок.

У суботу пасля работы Агрыпінка ўпершыню за ўвесь час вярталася дахаты з Манюляю. Тая і праўда доўга адмоўчвацца не змагла і першая загаварыла пра Лёню. Зрэшты, расказала яна тое, што ведалі ўжо ўсе, акрамя Агрыпінкі.

Аказваецца, Лёня пайшоў у той дзень не на вакзал, а ў кантору, звольніўся і, нават не атрымаўшы разлік, паехаў. Кажуць, што ў Мінск. Да нейкага там сябра-студэнта.

Агрыпінка рэзка, як спатыкнуўшыся, спынілася і прыслухалася да сябе. Чакала, баялася, што пасля ўсяго пачутага яна можа ўпасці і памерці. Але сэрца заставалася спакойным, нават халодным. Нібыта ўсё, што зрабіў Лёня, было самаю звычайнаю і зразумелаю справаю.

Яна лёгка і глыбока, на ўсе грудзі, удыхнула даўкае паветра і заплюшчыла вочы. Манюля стаяла побач і таксама маўчала. І толькі, відно, заўважыўшы тыя дзве ўпартыя вялікія слязіны, якіх Агрыпінцы так і не ўдалося стрымаць моцна стуленымі павекамі, ціха сказала:

— А каб жа яны, дзіцятка маё, паатручваліся ўсе!

Агрыпінка як прачнулася ад Манюлінага голасу і шырока расплюшчыла вочы:

— Ды не кляніце вы, Манюля! Я ж сама яго адправіла... У каапэратыўны...— здзівілася яна гэтай сваёй нечаканай хлусні і ўжо раўнадушна працягвала: — Толькі вам за кватэру з палучкі аддам. Добра?

— От пра што яна думае... Ды якія тут грошы, дзеўка?!

— Мне б хоць да палучкі дацягнуць...

— А я табе сама дам, Агрыпінка... Колькі трэба, столькі і дам.

— Ну во, не я вам, а вы мне...

— Нічога! Я запаслівая. Во, цяпер жа зойдзем і возьмем. На ўсякі выпадак...

Вечарам Агрыпінка доўга піла з Манюляю гарбату, абдзіраючы рот цвёрдым баранкам. Потым пасунулася ў свой пакойчык, распранулася ў цемры і легла ў ложак. Паляжала хвілін дзесяць, пазіраючы ў бяльмо нізкай столі, і раптам паспешліва паднялася, шпурнуўшы да сцяны падушку, кінулася нацягваць на сябе блузку і спадніцу. Не слухаючы ніякіх унутраных пратэстаў, паклала ў сумку яшчэ адну кофту на дарогу і выбегла з хаты.

Праз паўгадзіны Агрыпінка была ўжо на вакзале. Узяла без чаргі білет на цягнік і чакала яшчэ гадзіны паўтары,

ходзячы па вузкім маленькім пероне. Нарэшце, калі цягнік падышоў, знайшла патрэбны вагон і цяжка, няўклюдна ўсцягнулася на падножку.

Вагон быў амаль пусты.

Агрыпінка села каля самага акна. Побач тут жа прымасцілася бабулька з грубым, як перавязаным удоўж і ўпоперак маршчынамі, тварам і адразу ж, быццам ведала Агрыпінку з маленства, пачала расказваць пра сваю хату, пра свайго разумнага дамаседа-катка, які толькі вясною ходзіць «партызаніць» у блізкі лес. Потым зарыпела пра грыбы. Як іх збіраць, як іх саліць, як іх есці.

Агрыпінка слухала старую напаўвуха і пазірала ў акно, стараючыся ні аб чым не думаць, але колы ўпарта выстуквалі толькі адно: «Лёня-Лёня... Лёня-Лёня...» Кантралёр правяраў білеты, праглядваючы іх на святло, нейкі хлопец з верхняй паліцы моцна, на ўвесь вагон, хроп і мармытаў. Яго тузалі за ногі, хлопец паварочваўся на другі бок і прыціхаў на хвіліну, потым зноў пачынаў сваё.

Колькі помніць сябе, Агрыпінка ніколі нічому не здзіўлялася. Нават таму, што бачыла і чула ўпершыню. Акрамя ўсяго, заўважыла ў сабе здольнасць адразу ж звыкацца з усім, нават самым чужым ёй. Нібыта перажывала перажытае, бачыла ўжо некалі бачанае, дазнавалася пра ўжо вядомае. Нібыта і жыццё сваё жыла ў другі раз. Некалі, даўно-даўно, яна ўжо ехала ў гэтым вагоне, з гэтымі, старымі і маладымі, людзьмі. Нават агні за акном, што расцвілі ўдалечыні прывіднымі чароўнымі кветкамі, таксама былі знаёмыя. Яна чула ўжо і шапялявае мармытанне бабулі, і жахлівы храп хлопца на верхняй паліцы. Усё гэта было ў яе далёкім маленстве, вось толькі паўтарылася нанова, абрасло мноствам новых дробязей.

Агрыпінцы пашанцавала. Гаманкая бабуля якраз ехала да свайго ўнука, які вучыўся ў тым жа кааператыўным тэхнікуме, дзе, калі верыць Лёню, вучыўся і ягоны таварыш. Разам з бабуляю яны знайшлі новенькі, з яшчэ непрыбраным друзам у двары, інтэрнат, разам пайшлі да камендантшы. Тая, пагартаўшы сваю кніжку, сказала Агрыпінцы,

што Валік Самок жыве на другім паверсе ў дзевяностым пакоі. Трэба было развітвацца, і старая, усхліпнуўшы, пацалавала Агрыпінку ў шчаку.

Першая ўдача ўзрадавала. Агрыпінка паднялася на другі паверх і крыху пастаяла каля акна ў канцы вузкага прыцемненага калідора. Нарэшце адшукала патрэбны нумар і пастукала ў дзверы. Пачулася маладое, бадзёрае: «Заходзьце». Агрыпінка падзівілася сваёй смеласці, але зайшла...

Лёні тут не было. У пакоі стаялі чатыры ложкі, засланыя аднолькавымі баваўнянымі коўдрамі, на якіх ляжалі белыя невялікія падушкі. Двое хлопцаў у шэрых пінжаках, адзін, праўда, вельмі ж худы і пласкагруды, сядзелі за сталом і цягалі відэльцамі проста з патэльні смажаную бульбу. На Агрыпінчына пытанне, ці жыве тут Валік Самок, кіўнулі згодна, запрасілі ў пакой і прапанавалі сесці на ложак. А калі захоча, дык і паляжаць можа, бо калі той Валік яшчэ прыйдзе. Агрыпінка і праўда скінула старэнькія сандалі і села на ложак. Выпрастала спіну. Пад грудзі падступіла такая нуда, што яна і сапраўды прылегла, удыхаючы з падушкі незнаёмы мужчынскі пах. Нечакана для сябе пачала драмаць. Аднак хутка насцярожылася, праз дрымоту пачуўшы, як адзін з хлопцаў, ці не той пласкагруды, міжволі прамовіў «маліна-ягадка». Узрадавалася, затузалася на ложку, але падняцца не было сілы. Яна ляжала з заплюшчанымі вачамі і не прапускала цяпер ні аднаго слова, як чакаючы, што хлопцы ўспомняць пра Лёню. Чула, як яны, пад'еўшы, кінулі ў тумбачку нямытыя відэльцы і патэльню. Нарэшце селі за стол, пачалі гартаць кніжкі. Чытаць, відно, не вельмі стараліся, бо ўсчыналі не зразумелыя ёй спрэчкі. Калі пачалі гаварыць пра дзяўчат, ледзь стрымалася, каб не засмяяцца, але пасаромелася. Хлопцы гаварылі ціха, але павольна і разважліва, падрабляючыся пад дарослых і сталых мужчын. Насцярожыў толькі той высокі, пласкагруды, які з самага пачатку прапанаваў ёй адпачыць. Цяпер ён ужо гарачыўся, даказваў свайму сябру, што ніякага сакрэту ў гэтай любоўнай справе няма. Паніжаў голас да непрыемнага піску і ўвесь час паўтараў Лёнева «маліна-ягадка».

— Я во што, маліна-ягадка... Я не як усе! Вы прыгожых выбіраеце. Каб па вуліцы азіраліся. Ну, і выбірайце! А я, маліна, не! Я шэранькіх люблю! На такіх ніхто не азіраецца... Ну і што?!

— Знайшоў, чым хваліцца!

— А чым ты пахвалішся? Мая просценькая сабе цану знае. А я ёй пару ласкавых скажу, Афрадзітай назаву, яна і гатова. А? Не прывыкла, значыць... А тады рабі з ёй што хочаш! Хоць у гаршку вары!

«Шэранькая, значыць?.. Просценькая? У гаршку, значыць... А калі яшчэ такая, як я?»

Упершыню за апошнія месяцы Агрыпінка раптам адчула, як на яе спіне пачаў разрастацца той балючы вялізны мурашнік, пра які яна ўжо амаль забыла. Забыла і супакоілася. Дарма!..

Агрыпінка ведала, што зараз падымецца і пойдзе адсюль, сілілася сабраць апошнія сілы.

І раптам раззлавалася. Зусім не на Лёню ці гэтых хлопцаў, а на сябе: як жа хутка прыняла яна напавер усю гэтую бязглуздзіцу?! І ўвогуле, ёй не трэба было сюды прыязджаць. Не трэба! Бо Лёня хутка вернецца і прыйдзе да яе, ці на кватэру, ці ў швейную майстэрню.

З ягоным вяртаннем пачнецца новае жыццё. І ўсё ў тым новым жыцці будзе добрым і шчаслівым. Бо інакш — нельга...

Змагаючы боль, Агрыпінка ледзьве ўсунула свае разбухлыя ногі ў цесныя сандалі, паднялася з ложка і павольна патупала да дзвярэй. Прыпынілася толькі на хвілінку, каб развітацца з хлопцамі. Спускаючыся па лесвіцы, пачула, як яе яшчэ ненароджанае, але жывое дзіця ўдарыла пад сэрца. Нібы паклікала ў дарогу.

Яна доўга ішла па вуліцы і мінула ўжо мост. Чула, як у душы нараджаецца яшчэ не знаёмае ёй, але моцнае пачуццё жаласці — да ўсяго і ўсіх. Кожнаю клетачкаю Агрыпінка стала адчуваць вялікі магутны чужы свет навокал сябе, які яна чамусьці вельмі шкадавала цяпер і які, здавалася, шкадаваў таксама і яе. Шкадаваў, але нічым не мог дапамагчы.

Па шырокай вуліцы насустрач Агрыпінцы спяшаліся маладыя і прыгожыя, як царыцы, дзяўчаты, штурхаліся, гле-

дзячы паверх натоўпу некуды далёка-далёка, у сваё, яшчэ няўведанае, малінавае шчасце.

Яна не асмельвалася запытаць у каго-небудзь з іх, якім аўтобусам можна дастацца на вакзал. Толькі затрымалася на хвілінку, калі здалося, што па другім баку вуліцы крочыць Лёня. Аднак жа не, хіба гэта Лёня?!

На ўсякі выпадак Агрыпінка ўсё ж адвярнулася, каб не дай бог ён таксама яе не заўважыў, і пакрочыла яшчэ хутчэй.

Лёгкі ветрык лашчыў збалелую спіну, выбіраў з цела стомленасць.

Агрыпінка адчула сябе здаравейшаю і ўжо не сыходзіла з роўнай дарогі, быццам напэўна ведала, што тая вядзе якраз на вакзал.

## Калінавая гронка залатая

Вольга здзівілася, калі ёй, амаль невядомай яшчэ мастачцы, прапанавалі афармляць гэтае новае маладзёжнае кафэ.

Пасля таго як усё было абгледжана і абмерана, адміністратар паставіў на дагаворы круглую пячатку, быццам павесіў першую падкоўку на прывідныя дзверы ў доўгачаканую ўдачу. Вольга заспяшалася дамоў. На вуліцы яна схавалася пад парасонам, аб які адразу ж гучна забарабанілі вялікія дажджыны.

І раптам убачыла Ігара Іванавіча. І адразу ж зразумела, па чыёй рэкамендацыі атрымала заказ.

Былы інстытуцкі выкладчык, не хаваючыся ад дажджу, стаяў каля самага кафэ ў сваім старым цёмна-карычневым касцюме. Вользе здалося, што намоклы цеснаваты пінжак на яго шырачэзных плячах-крушнях вось-вось лопне і распаўзецца па швах. Ігар Іванавіч стаяў задумлівы, з апушчанай галавою, нібыта яму было цяжка трымаць грыву сваіх непаслухмяных, ужо сівых валасоў.

Вольгу ён вылучыў з усёй групы на першых жа занятках. Кожны раз, узіраючыся ў яе новы малюнак, яшчэ

болей горбіўся і задаволена пакашліваў у вялізны квадратны кулак. Здзівіўся толькі аднойчы, на абароне дыпломных работ. Вольга сама тады не разумела, чаму ў яе ўзнік гэты, увогуле неўласцівы яе строгай манеры, сюжэт: у шырокую зімовую дарогу на першым плане свердзелам увінчваўся блакітнаваты вецер, а з глыбіні, з-пад самага мярэжлівага гарызонту ішоў хлопчык у расхрыстаным паліто, трымаючы перад сабою калінавую гронку.

Здаецца, ажно заблытаўшыся позіркам у насупленых густых бровах, Ігар Іванавіч выдыхнуў тады толькі адно: «Каліна не такая...» Але перарабляць малюнак у Вольгі ўжо не было часу.

...Па ўсім непагодным свеце шалелі восеньскія маршы, патокі дажджу залівалі асфальт. Вольга рашуча закрыла парасон і праз дождж, які ўсё ніяк не мог аціхнуць, пайшла насустрач Ігару Іванавічу.

Яны не сустракаліся амаль два гады пасля таго, як адразу ж пасля інстытута яна выйшла замуж за свайго аднакурсніка Сашу Радзівонава. Цяпер былы выкладчык нават не хаваў таго, што стаіць каля гэтага кафэ знарок. Чакае менавіта Вольгу.

— Рады... Рады...

Ігар Іванавіч з цяжкасцю шукаў словы, і па ягоным крыху васпаватым, як высечаным з каменю, твары імкліва скочваліся дажджыны. Сумеўшыся, ён нарэшце павітаўся, загаварыў таропка, не падымаючы галавы:

— У нас ёсць месца, Вольга... У аспірантуры. Лепшай кандыдатуры, на маю думку...

Вольга стомлена, але крыху скептычна хмыкнула, ацерла рукою мокры твар, і Ігар Іванавіч, заўважыўшы гэтую абыякавасць, адразу ж замаўчаў. Нібыта адчуў марнасць сваёй прапановы. Перавёў на іншае:

— Ну, як вы? Як ваш... Саша?

— Саша? Добра Саша... Разам, у выдавецтве, працуем...

Ігар Іванавіч замітусіўся, паспешліва ўсунуў у кішэню пінжака руку, выняў адтуль і падаў Вользе невялікую каробачку з цукеркамі. Гэта былі яе любімыя «Журавіны

ў цукры». Вольга ўзяла іх і схавала ад дажджу ў сумачку. Думала, аб чым жа далей гаварыць з Ігарам Іванавічам, якога яшчэ і цяпер, як некалі ў студэнцтве, саромелася і нават пабойвалася, і раптам адчула на сабе нечы пільны позірк. Азірнулася. Зусім блізка, на аўтобусным прыпынку, стаяў Саша. І спадылба пазіраў на Ігара Іванавіча. Вольга ад нечаканасці ажно адхіснулася назад, але тут жа ўзрадавалася, чакаючы, што Саша падыдзе да іх. Але той нават не павітаўся з былым выкладчыкам і кінуўся ў першы ж перапоўнены аўтобус...

Яна спыніла таксі, але прыехала дахаты ўсё роўна пазней за Сашу. На кухні паставіла чайнік і захінула вокны фіранкамі.

Заварыўшы чай, прыгатавала бутэрброды, выглянула, каб паклікаць Сашу вячэраць. Саша сядзеў на канапе і трымаў у руках адкрытую папку з паперамі. Гэта быў, мабыць, рукапіс той самай паэтэсы, якая ўчора хацела забраць работу ад Сашы, каб перадаць Вользе. Бачыце, ёй падабаецца, як Вольга працуе! Аб чым толькі людзі думаюць?.. Вольга, вядома, адмовілася, нават пасварылася з аўтаркай. Але адчувала сябе так, быццам па душы прапоўз нейкі агідны слімак. Сашу яна нічога не сказала, але той, мусіць, неяк дачуўся пра ўсё. Глянуўшы на нерухомы, напружаны Сашаў твар, Вольга хацела першаю загаварыць пра Ігара Іванавіча і кафэ. Але не асмелілася. Проста ўспомніла нядаўнюю ўспышку Сашавай рэўнасці. Прычын, здаецца, зусім і не было, яны гаварылі пра былых аднакурснікаў, і раптам Сашу быццам падмянілі: злосна, скептычна высмеяў колішнюю асаблівую ўвагу Ігара Іванавіча да Вольгі, нават пакпіў з яго захаплення Вользінымі работамі. Ён заўсёды быў самастойны і таленавіты, яе Саша, яшчэ ў інстытуце гарачыўся і задзірыста адмаўляў усё, чаму вучыў іх Ігар Іванавіч. А той проста не зважаў на гэта.

Праз некалькі месяцаў пасля вяселля, з нечаканай для сябе самой жаночай мудрасцю, Вольга змірылася з Сашавым максімалізмам. Урэшце, не гэта галоўнае.

Цяпер яна прынесла і паставіла на часопісны столік перад ім кубак з чаем, засмяялася прымірэнча.

— Саш...

Але ён, не падняўшы вачэй, выняў з папкі і кінуў на канапу рукапіс.

— Ну, гэта ж глупства, чуеш? Я сустрэла яго выпадкова... Мне... бачыш... прапанавалі афармляць гэтае кафэ... Як ты думаеш?

Саша ледзь не падскочыў на канапе, ажно рукапіс слізгануў на падлогу, кінуўся ў спальню і са стукам адчыніў шафу.

— А гэта?.. А гэта што?.. Колькі я магу цярпець?! Мне што, самому мыць? І прасаваць? — ён кідаў на падлогу свае сарочкі.

І Вольга не стрымалася.

— Прывыкай... І не крычы! Хутка я ўжо і праўда не змагу добра згінацца. Так што... Ты ж, думаю, таксама захочаш, каб дзіця было здаровенькае...

Саша стаяў перад раскіданымі, толькі заўчора вымытымі і адпрасаванымі сарочкамі, наліваўся чырванню і раптам, зразумеўшы сказанае Вольгаю, заплюшчыў вочы. Ахрыплым, але цвёрдым голасам адрэзаў:

— Ніколі!

...Яна, вядома, паддалася б настойлівым угаворам урача, калі б не тая, апошняя, гаворка з Сашам. Не вячэрняя, пра сарочкі, а ўжо ранішняя. Саша проста не верыў, што гэта будзе ягонае дзіця, і зноў скептычна бэсціў Ігара Іванавіча. Спачатку Вольга не магла нічога ўцяміць... Потым прыткнулася спінаю да сцяны, так-так,— каб утрымацца на нагах. Але сцяна зрабілася нечакана падатліваю, мяккай. Вольга адчула, што праходзіць праз тоўстую цэглу і вострыя рубцы абдзіраюць ёй спіну, плечы, грудзі. Парушынкаю яна паляцела ўніз з пяціпавярховай вышыні і павольна апусцілася на халодную восеньскую зямлю. Ляжала доўга, пазіраючы ў неба, і жоўтыя хмары плылі над ёю спакойна і важка. Недзе каля пераносся, расколваючы галаву, узнік рэзкі звон. Усё цела балела. На шчокі раптам пасыпалася сцюдзёная медзь апалай лістоты, і Вольга апрытомнела

і расплюшчыла вочы. Здзівілася, што яна не на вуліцы, а ў сваёй хаце, на канапе.

Бледны, як папера, Саша трымаў над ёю кубак з вадой. Зусім не выглядаў пераможцам, хоць Вольга ўжо ведала, што будзе рабіць...

Работа па афармленні кафэ была закончана праз паўгода.

У пятніцу, калі Вольга атрымала ганарар, Саша нечакана загарэўся паехаць у вёску, да Аколікаў, у якіх яшчэ ў студэнцтве жыў цэлы месяц.

Апошнім часам яна была ўражана рэзкаю зменаю ў мужавым характары. Нават жартавала, што гэтыя паўгода здаліся ёй мядовым месяцам.

Была вясна, вёска якраз сеяла і садзіла, але Сашу гэта не стрымлівала. Праз гадзіну яны ўжо былі на аўтобуснай станцыі за горадам. Але каля білетнай касы стаяла даўжэзная чарга. Узялі таксі...

Вользе было ніякавата і непрывычна вось так, з бухты-барахты заходзіць у незнаёмую хату, і яна ўсё хавалася за мужавы плечы.

— Ты глянь, Воль! Глянь... Гэта ж Данута. Тая самая, я расказваў.

Саша з бессаромнай цікавасцю разглядваў паўнацелую маладзіцу, што стаяла пасярод залы, збянтэжаная нечаканым з'яўленнем гасцей. Пасечаныя хімічнай завіўкай рыжаватыя валасы падсвечваліся яркімі кропелькамі завушніц, а на ружовых шчоках ігралі гарэзлівыя ямачкі.

Ледзь пазнаёміўшыся з Вольгаю, Данута шуснула ў кухню, зазвінела там лыжкамі і талеркамі.

— Яшчэ трохі, і засталі б маіх старых! Бо брыгадзір каня даў. А, каб цябе, палец парэзала...

— Мо памагчы? — паспешліва запыталася Вольга, але гаспадыня нібыта і не пачула яе.

— Дык во паехалі на соткі. Далёка ад вёскі...

— Ого! — Саша зазірнуў на кухню і ціха прысвіснуў.— Ды не старайся ўжо! — Уздыхнуў.— Ну, то як ты тут, Данута?

— Э, лепей за суседзяў! Маці-адзіночка!

— Ніякіх адзіночак не бывае! Не выдумляй...

— Бывае, бывае! Мой, сабака гарачы, як Светачку радзіла, то і дзе ногі ўзяліся?! Каб яго пранцы паелі! А дзед усю зіму праваляўся... Ты ж помніш, Саш, як ён піў? Цяперака не тое. Як у рукаў здароўечка выліў! А малая мая трохі прастудзілася...

Нягледзячы на ранні час, Данута заставіла стол талеркамі з акуратна парэзаным салам, салёнымі агуркамі, яечняй.

І прыгатавала хутка, і есці спяшалася.

— Эх, Саш, а помніш, як ты мяне на свінарнік праводзіў? — Данута асцярожна скасілася на Вольгу, відно, асцерагаючыся яе пакрыўдзіць. Але зноў дзёрзка махнула рукою:— Эх! А наш свінарнік быў тады далёка. Праз гаёк — добрых два кэмэ будзе. Чобаты стопчаш, пакуль туды і назад.

Саша хмыкнуў, павадзіў бліскучым відэльцам перад носам гаваркой гаспадыні.

— Во-во... І тады тое ж: «Я пайду першы за вёску, а потым ты...» Гэта саромеўся так. Быў жа, каб вы бачылі, Вольга, як гліст, тонкі, ледзь вецер не валяў! А я затое...— Данута захіхікала і шырока раскінула рукі: — Во якая была! Яшчэ гладчэйшая, чым цяпер. Жаніхамі, кажу, хату падмятала!

Данута зноў зірнула на маўклівую, але спакойную Вольгу. І прызналася менавіта ёй, Вользе:

— Не паверыце, закахалася я тады ў вашага Сашку... Саш? — зноў павесялела, штурхнула яго плячом.— Помніш Мацвеевіча? Цяпер завучам стаў! Далібог! А яго Настуля зноў носіць, ужо чацвёртага. Каб вы іх бачылі, Волечка! Сам малы, як апенька, галаваты такі, а яна — вышэй за антэну. То як ідуць дахаты, ён — наперадзе, а яна са сваім гарбузікам — праз крокаў сем,— хмыкнула Данута.— Мой таксама быў маленькі, як аловачак. А зайздросны — каб вы толькі ведалі! Усё хацеў загадчыкам фермы стаць. Каб я ў падначаленых была!

Дзверы ў спальню раптам зарыпелі, і на Вольгу здзіўлена глянула дзяўчынка гадоў трох-чатырох з шапачкаю жоўтых прамых валаскоў.

— Качолачка мая ўстала! Усю ночку, бедная, не спала. Такі кашаль, не дай бог...

Дзяўчынка і праўда была падобная на качолачку,— з поўнымі кароткімі ножкамі, круглым жывоцікам.

Саша зарагатаў і выскачыў з-за стала. Падняўшы малую на рукі, пачаў асцярожна вадзіць па яе пульхнай шчацэ сваім цвёрдым падбародкам. Дзяўчынка зазвінела ад задавальнення, але ўсё роўна адштурхоўвалася ад незнаёмага дзядзькі. Вольга ўбачыла Сашу такім упершыню, паднялася і павольна выйшла з хаты.

Саша, цягнучы невялікі мальберт, дагнаў яе амаль у канцы вуліцы. Зайшлі ў невялікую цагляную краму. Вольга прабегла вачамі па палічках і радасна прыкмеціла знаёмую каробачку «Журавін у цукры». Тут жа разлічылася з тоўстым прадаўцом, што нацягнуў на ватоўку чамусьці не белы, а сіні халат, але вяртацца толькі для таго, каб аддаць цукеркі Дануцінай малой, не хацелася. Паспеюць яшчэ...

Саша ўпэўнена крочыў па шырокай заезджанай дарозе да невялічкага ляска. Прыкінуўшы адлегласць да яго, Вольга падумала, што ісці давядзецца добрыя паўгадзіны.

У высокім небе праплывалі рэдкія белаватыя аблачынкі, і Вользе здалося, што адусюль, асабліва з боку бясконцага, па-веснавому чорнага поля, даносіцца трывожны глухаваты гул.

Каля самага лесу віднеўся трактар. Вольга няўмела пайшла па раллі, падкідваючы ўверх боцікамі грудкі зямлі, але спынілася на паўдарозе, загледзеўшыся на двух буслоў, што важна хадзілі недалёка ад трактара. Над разоранымі баразнамі падымалася зеленаватая пара, і дзве прывідныя птушыныя постаці нібыта і не ступалі, а мігатлівымі ценямі перамяшчаліся з аднаго месца на другое. То знікалі, то зноў бялелі ў хвалістай далечыні. І Вользе здавалася, што бусліныя цыбатыя ногі пры хадзе проста пераломваюцца... Яна заплюшчыла вочы, як адганяючы ад сябе прывіднае відовішча, а калі нарэшце асмелілася зноў азірнуцца, буслоў на ранейшым месцы ўжо не было. Дзве бліскучыя

раскрыленыя птушкі плылі над полем так нізка, што нагадвалі вялікія белыя крыжы.

Вольга забыла пра буслоў толькі ў лесе. Ён быў не такі маладзенькі, якім здаваўся здалёк, і яна ўзрадавалася акуратнай, як адглянцаванай сонечным прасам паляне з маладою травою.

Пасядзеўшы там, вярнулася на круты пагорак, што апускаў свой зялёны язык у яміну з вадою. Вада была брудная — з плямамі слізкага жабурыння.

Саша, развёўшы фарбы, адразу схапіўся за гэтую ваду, шырокімі мазкамі выводзіў на зялёным бурштынавыя палосы.

Вользе не шанцавала. Лясок, такі празрысты, заліты вадкім шклом густога паветра, стаяў перад ёю нерухомы і маўклівы. Яна прыціснулася плячамі да халоднага сасновага ствала і нечакана зразумела, што адсюль, з гэтага лесу, зіма яшчэ да канца не выцекла. Паміраючая зіма яшчэ выпускала нябачныя ледзяшы праз кару на ценевым баку дрэва, там жа, дзе грэла сонца, укамянела белымі жыламі і кроплямі старой пашэрхлай жывіцы.

І тады раптам ва ўяве запунсавела каліна, як далёкая, усё яшчэ нясправджаная мара. Вольга схапіла невялікую тонкую фанерку, якую Саша ўзяў на ўсякі выпадак, і, не разводзячы, выціснула на яе з цюбіка змейку бяліл... Ведала, што ягадзіны будуць залатыя, з прыхопленымі марозам скуркамі, толькі там, унутры кожнай пацерачкі, патрэбна чырвонае. Як зацвярдзелая, але гарачая кроў. Працавала хутка і напружана, ажно заныла спіна. Радасць, праўда, была кароткая. А ўсё — Саша...

Зірнуўшы на яе малюнак, ён скрывіўся і незадаволена, праз зубы, працадзіў:

— Ты ўсё не можаш яго забыць? О... Колькі можна так мазюкаць! Пазнаю дастойную вучаніцу батаніка-натураліста!

І ён каторы ўжо раз пачаў даводзіць, што Вользе пара пазбавіцца гэтай фатаграфічнай дакладнасці, папракаў, злаваўся, нібыта спрачаўся не з ёю, а з самім Ігарам Іванавічам.

Пакрыўджаная, яна маўчала. Хацела шпурнуць малюнак у бруднае зеленаватае жабурынне, але рукі не паслухаліся. Адчувала ў сабе толькі халодную абыякавасць.

Дахаты ішлі, асцярожна трымаючы ў руках свежыя малюнкі. Саша быў у чаравіках, стараўся абмінаць здрадлівыя гразкія грудкі, але, калі падышлі да хаты, ажно вылаяўся, здзіраючы з падэшваў аб парог чырвоную гліну.

Данута паставіла на лаву каля сцяны дзве пустыя бутэлькі, каб да іх можна было прыткнуць малюнкі, не пэцкаючы шпалераў на сцяне. І зноў зашчыравала на кухні. Там жа была і Светка.

Вольга адкрыла каробачку цукерак, зірнула на кухню і, нахіліўшыся, падала Светцы ласунак. Малая адразу ж набрала поўны рот кісленькіх дражэ і патупала ў залу.

— Запаслівая качолачка! — хмыкнуў Саша, стомлена пацягваючыся.

І ў гэты момант дзяўчынка ўбачыла малюнкі. Адразу выплюнула цукеркі проста на падлогу, здзіўлена схіліла набок ільняную галоўку.

— Агады! Мамка, агады...

Дзяўчынка павольна падышла да лавы і працягнула да Вользінай каліны шырока растапыраныя пальчыкі, нібыта хацела ўзяць адразу ўсю гронку ў жменю. Потым, здзіўленая, зірнула на сваю перапэцканую фарбаю руку, перавяла позірк на тое, што засталося на фанерыне ад калінавага агню, і, расчараваная, так гучна і няўцешна заплакала, што з кухні віхрам вылецела Данута.

Вольга выцірала хустачкай брудныя пальчыкі малой і сама ледзь стрымлівала слёзы. Але гэта былі слёзы радасці. І раптам здзіўлена пачула, як за спінаю нешта трашчыць, міжволі азірнулася. Саша з усяе сілы намагаўся паламаць фанеру з усім тым, што засталося ад яе калінавай гронкі. Яго бледны твар скрывіла агідная ўхмылка. Нібыта з-пад маскі зірнула зацятая, не зразумелая раней Вользе зайздрасць...

Аўтобус быў перапоўнены, але Вользе пашанцавала: яна села на задняе сядзенне каля акна. Пэўна, некага праводзілі ў армію, іграў гармонік, ахрыплыя мужчынскія галасы

на ўсе лады раілі нейкай дзяўчыне не плакаць і праз два гады дачакацца свайго салдата з войска. Каб не дыхаць на суседзяў тытунёвым перагарам, дзядок побач з Вольгаю ўсё затуляў рукою свой абсыпаны сівым шчаціннем рот. Потым забыў пра ўсё і пачаў хваліцца Вользе, што ягоны ўнук і афіцэрскія пагоны дастане, і на прыгожай дзеўцы жэніцца.

— От, каб такая, як ты!..

Крэкчучы, ён выцягнуў з кішэні круглае люстэрка і пачаў трымаць яго перад Вольгаю ў тоўстых рудых пальцах. Вольга пазірала ў люстэрка, ловячы там то свае вішнёвыя, моцна стуленыя вусны, то сінія, з вялікімі чорнымі зрэнкамі вочы, то лёгкія хвалі светлых валасоў. Люстэрка раз-пораз падскоквала, нібыта пасмейвалася з яе вачэй, вуснаў і валасоў, вясёлы дзядок нахвальваў унука-трактарыста, а бязладны аўтобусны хор усё прасіў нейкую дзяўчыну чакаць салдата два гады і не плакаць...

ІВАН МЕЛЕЖ

## У завіруху

*К. Чорнаму*

Лютавала завея. Угары над Засмужцам у вершалінах дрэваў глуха шумеў вецер і сыпаў на дарогу халодны пыл. Міма цёмнымі высокімі сценамі бясконца ішлі сосны, варушачы кашлатымі лапамі. Сціснутая соснамі з двух бакоў дарога безліч разоў паварочвалася, выпроствалася, і ўсюды, не перастаючы, вёў аднастайную сумную песню вецер:

— Ууу-ууу!

Засмужцу здавалася, што не будзе канца гэтаму лесу, гэтай дарозе. Па яго разліках, лес ужо даўно павінен быў скончыцца. Ён час ад часу з надзеяй падымаў галаву і паглядаў уперад, спадзеючыся ўбачыць поле, але там па-ранейшаму стаялі сосны.

Ён ішоў зморана, хістаючыся. Галава яго была звешана, і калі б Засмужац не падымаў яе, можна было б падумаць, што ён на хаду спіць. Снег пластам наляпіўся на яго шапку і плечы. Ззаду Засмужца, на повадзе, таксама звесіўшы галаву, неахвотна плёўся конь. Сядло на кані пабялела ад снегу: коннік, было відаць, даўно ішоў пешкі.

Здалёк, скрозь густы гул соснаў, прарваўся гук гарматнага выбуху — напамінак пра тое, што і ў гэтую ноч ішла вайна. Данесліся яшчэ некалькі выбухаў, потым стала ціха. Засмужац прыслухаўся — выбухі не паўтараліся.

Нечакана моцны парыў халоднага ветру шалёна кінуўся на Засмужца і штурхнуў назад так, што хлопец адразу спыніўся і адступіўся, каб устаяць. Конь падняў галаву, грыва на ім заварушылася. Засмужац вышэй нацягнуў каўнер шыняля і, калі расплюшчыў вочы, убачыў, што наперадзе між рэдкімі соснамі зашарэла. Гэта было поле.

Ісці стала халадней,— Засмужац то апускаў галаву, то адхіляў твар убок, каб схаваць яго ад ледзянога ветру.

Ледзь пачалося поле, ён спатыкнуўся і ўпаў у снег. Дарога абарвалася, далей яна была замецена тоўстай гурбай снегу. Засмужцу не хацелася падымацца з мяккай снежнай пярыны. Ён ціха, нерухома ляжаў, з асалодай адчуваючы, як у целе прыемна ные стома і цяпло, нібы пасля віна, разліваецца па яго руках, нагах, кружыць галаву. Хацелася спаць.

Засмужац не спаў другія суткі. На світанні ён ішоў па гэтай дарозе насустрач, у штаб арміі, з данясеннем ад камандзіра кавалерыйскай брыгады. Да штаба арміі было кіламетраў дваццаць ці крыху болей. Але ўсе дарогі і сцяжынкі былі так закіданы снегам што дабрацца да яго ўдалося толькі за шэсць гадзін, дашчэнту змучыўшы каня і сябе. У штабе затрымалі нядоўга, не далі спачыць. Відаць, пісьмо было важнае, бо праз паўгадзіны яму ўручылі новы пакет і загадалі неадкладна ехаць назад. Калі ён выязджаў з сяла, ад стомы і бяссонніцы адчуваў сябе змарнела. У давяршэнне да ўсяго звечара разлютавалася завіруха.

Засмужац з вялікім намаганнем прымусіў сябе падняцца і пайсці па цаліку. Ногі правальваліся да кален. Потым ён адразу схаваўся па пояс,— ногі згубілі пад пластам снегу цвёрды грунт... Засмужац збочыў правей і зноў з палёгкай адчуў дарогу.

Неўзабаве сумёт скончыўся, агаліўся цвёрды, вылізаны ветрам шлях. Ісці стала лепей, ногі здаваліся лягчэйшымі і высока падніміліся. Толькі трэба было сачыць, каб не папасці ў санную каляіну, бо там было слізка.

Затым дарога зноў схавалася. Засмужац зноў блытаў — то губляў дарогу, то намацваў яе нагамі, лез, выбіваючыся з сілы. Хутка ён так звёўся, што спыняўся праз якія-небудзь тры-чатыры крокі, каб перавесці дыханне. За ўсе свае васямнаццаць год ён яшчэ ні разу не быў такі стомлены. Урэшце, калі ісці далей не хапіла сілы, хлопец сеў на каня. Гэта было каля адзінокага дуба са зламанай вершалінай, які ён запрыкмеціў, калі ішоў яшчэ першы раз. Дуб быў стары і такі шырокі, магутны, што Засмужац тады мімаволі прыпыніўся і аж свіснуў ад захаплення.

Каштан ішоў болей упэўнена, нейкім унутраным пачуццём адгадваючы дарогу. Але ён быў таксама змораны, часта спыняўся, натужна сапучы, і кранаўся далей з тупой жывёльнай упартасцю. Ад стомы ён хістаўся ў бакі, спатыкаўся. Потым, збіраючы апошнія сілы, пачаў ісці скачкамі. Засмужац пашкадаваў яго, злез з сядла і павёў каня на повадзе.

Весці каня стала цяжэй. Засмужац зразу пашкадаваў, што праехаў на ім гэтыя некалькі сот крокаў. У пачатку шляху Каштан ледзь не наступаў на пяткі і дыхаў яму на шыю; цяпер конь ледзь плёўся за ім: ішоў на тугім повадзе. Засмужцу прыходзілася не толькі ісці самому, а і цягнуць каня. Каштан часта спатыкаўся. Повад балюча рваў руку.

Засмужац зноў згубіў дарогу і ніяк не мог адшукаць яе. Ён правальваўся па пояс на кожным кроку, часам амаль поўз. Але ўпарта гробся далей. У гэтым цяжкім шляху яго падмацоўвала думка пра тое, што ён робіць баявое заданне, што ад яго залежыць лёс, можа, тысяч людзей. Засмужац трымаўся за яе, як за ратунак, і, каб не выпусціць, упарта паўтараў сам сабе: «Дайсці. Што б ні было — дайсці... Данесці пакет... Там мяне чакаюць». Па меры таго, як расла стома, гэта думка рабілася аднастайнай, нібы ўціснуўся ў адно імкненне ўвесь сэнс яго цяперашняга жыцця. «Дайсці... Дайсці... Дайсці...»

Цяпер ён быў у нейкім забыцці ад нечалавечай стомы. Спатыкнуўшыся, ён упаў у снег і ляжаў колькі хвілін нерухома і маўкліва. Конь пастаяў крыху, пачакаў, потым занепакоіўся, шмаргануў повад раз, другі. Засмужац бяздумна павярнуўся, і ўбачыў над сабою храпу каня: галава каня здавалася незвычайна вялікай. Каштан пазіраў круглымі вачыма трывожна і нецярпліва. Гэты позірк вывеў Засмужца з забыцця.

Ён павольна падняўся і палез уперад.

Раптам Засмужац перад сабою — крыху ўбаку — убачыў агеньчык. Ён не паверыў, з трывогай падумаў, што гэта здалося. Засмужац працёр вочы, але агеньчык гарэў.

Ён мігцеў, дрыжаў, вясёлы агеньчык. Ва ўсім свеце быў ён толькі адзін, а кругом, як і раней, трубіла бура. Але чалавек ужо нічога не бачыў, толькі гэты маленькі агеньчык. Яго ратоўны бляск трапіў у грудзі, і Засмужцу зрабілася цёпла і хораша, нібы на такой адлегласці перадавалася яго цяпло. Ён быў упэўнены: агеньчык гэты — у яго вёсцы — яго мэта. Агеньчык быў такі блізкі, жаданы, мігцеў перад самымі вачыма, і Засмужац, грузнучы ў снезе, пабег проста туды. Ён болей не шукаў дарогі.

Перад вёскай яго аклікнулі патрулі. Засмужац узрадавана адказаў.

Калі ён ішоў да штаба, што быў пасярэдзіне вёскі, то ўбачыў некалькі дзіўных, чорных пустыроў. На адным з іх варушыўся, трапятаў агеньчык — гарэлі галавешкі. Дзенідзе, астываючы, воўчымі вачыма тлелі вугалькі. Завіруха круціла вакол іх пасмы снегу, хапалася закрыць сумную пустэчу халоднай беллю. На чарнаце пажарышчаў добра былі відны чыстыя лапіны замеці і языкі сумётаў.

Пасля таго, як Засмужац мінуў пажарышчы, да яго дайшла здагадка, што адзін з тых агеньчыкаў, напэўна, і свяціў яму. Весяліў і грэў у полі — агеньчык нечай бяды...

Перадаўшы пакет, Засмужац лёгкай хадой накіраваўся ў свой узвод. Завёў каня ў хлеў, у зацішку рассядлаў, падкінуў яму сена і ўвайшоў у хату.

У хаце прыемна пахла цёплым хлебам і напаленай печкай. Салдат весела прывітаўся з маладзіцай і доўга расшпільваў шынель. Замерзлыя пальцы не слухаліся. Жанчына, сумна сочачы за ім, паківала галавой.

— Дай дапамагу...

Яна лёгка сцягнула задубелы ад марозу шынель і ватоўку. Пад гімнасцёркай вызначыліся вострыя, неакрэплыя яшчэ плечы.

Ад нечаканага наплыву вясёласці Засмужац моцна абхапіў жанчыну за стан і прыцягнуў да сябе. Маладзіца нявесела паглядзела на яго стрыжаную галаву, на якой спераду смешна, па-дзіцячаму, тырчалі вожыкам серабрыстыя валаскі, паспрабавала вызваліцца.

— Пусці. А то мамцы тваёй напішу — наб'е,— паспрабавала яна пажартаваць.

— Кажы, кажы. Усё роўна не пушчу...

— От, на гэта сілы дык хапае! Пусці!

— Не пушчу!

Яму было весела, а чаму — ён і сам не ведаў. Засмужац па-дзіцячаму шырока засмяяўся і нечакана адпусціў яе. Усмешка, што цяпер не сыходзіла з ясна-ружовых шчок, з поўных лагодных губ, рабіла яго маладзейшым нават за васямнаццаць год. Цяпер цяжка было ўявіць, што зусім нядаўна гэты хлапчук з нечалавечай упартасцю прабіраўся праз завіруху.

Калі затым Засмужац сеў каля печкі, то адчуў сябе такім знябытым, што, здаецца, не змог бы скрануцца з месца. Але той вясёлы, радасны настрой, што невядома адкуль увайшоў у душу, заставаўся, хоць і крыху прыцішаны ад стомы. Ён з асалодай слухаў, як прыемна млее ўсё цела.

На хвіліну ён падумаў пра ўсё перажытае ў дарозе і сам здзівіўся, што столькі здолеў вытрымаць. Каб яшчэ раз прыйшлося, ён, здавалася яму, не зрабіў бы і паловы таго, што раней. Але ён ведаў, што на сягоння ўсё скончана, што болей не прыйдзецца. За акном лютавала завіруха, у коміне цягуча свістаў вецер — ууу-ууу! — але Засмужцу радасна было чуць гэтую музыку. Цяпер усё — і вецер, і холад былі далёка.

Маладзіца выняла з печкі чыгунок і паставіла на стол. Запахла бульбай. Засмужцу было радасна сачыць, як над чыгунком падымаецца пара.

— Садзіся, кіслы. Зусім раскіс... Мужчына называецца!

Яна ўсміхнулася. Засмужац здзівіўся, як гэта ён раней не заўважаў, што ў яе такая харошая і шчырая ўсмешка. І ямачкі на шчаках прыгожыя, калі яна смяецца. І голас такі мілагучны і лагодны.

Жанчына паставіла кубак з малаком, Засмужац сеў за стол і пачаў вячэраць. А тая слала на падлозе пасцель — прывабліва шалясцела сена...

У Засмужца непераможна зліпаліся павекі, звінела ў галаве. Думкі варушыліся ляніва, часамі іх бязладна перабівалі то малюнкі сну, то малюнкі замеці... Зламаны дуб. Каламутнае поле... Агеньчык мігае... Ён паспрабаваў адагнаць сон,— нейкая надакучлівая думка неадчэпна, як сляпень, круцілася ў галаве. Засмужцу вельмі хацелася злавіць яе, а яна ніяк не давалася. Хлопец пачаў перабіраць думкі і нарэшце патрапіў на тое, што хвалявала.

— Ага... Дзе Казлоў і Бондар?

Казлоў і Бондар былі салдатамі з яго ўзвода і таварышамі на гэтай кватэры.

— Той ноччу на світанні як пайшлі...— уздыхнула жанчына.— Паклікалі іх на самым світанні, пасля таго, як ты паехаў. Потым за сялом вельмі стралялі. І гарматы, і кулямёты. У акне шыбы ледзь не павылятаў. Проста страх — так стралялі. Многа, кажуць, немцаў паклалі... Ды ты спі, Мікола. Паспі, пасля будзеш пытаць...

— І пра іх нічога не чуваць?

— Нічога... А ты кладзіся спаць... Нічога. Толькі Арсеніха казала, што і нашых лягло там. У Арсеніхі камандзір у хаце стаяў. Як бо яго прозвішча?

— Кандраценя.

— Не інакш Кандраценя. То яго забілі. Яна плакала, як па сыне. І яшчэ багата загінула. А Грышку таго рудога бачыла раненага. Уся галава ў марлях. Пра Бондара і Казлова пыталася, дык — не, кажа, не бачыў... Скінь боты, я прасушу іх...

Яна памагла яму зняць боты. Слала на печы анучы, калі стукнулі ў сенцах дзверы. У хату увайшоў Казлоў. Адзін рукаў яго шыняля быў адрэзаны да локця. Рука да таго месца, дакуль адрэзаны рукаў, была забінтавана і вісела на марлевай касынцы.

— Што так гледзіцё? Не чакалі? А? Нечаканы госць!.. Здарова, салдат!.. Ну што, даплёўся?

— Выходзіць, даплёўся. І сам аж не спадзяваўся, што даграбуся. А дзе Бондар?

— Кепска з Бондарам... А Сіманава і Пятра забілі. Разведцы нашай дасталося больш за ўсіх. У нашым узводзе

ты ды я ды мы з табой — чатыры чалавекі засталіся, а то ўсе раненыя. Я таксама ледзь не згуляў у скрынку, у бога душу яго!.. Але і фрыцаў намалацілі — поле ўсё пачарнела ад трупаў. У такую пагоду палезлі. З імі гэтых дзіваў яшчэ не здаралася... Увогуле, заўтра, кажуць, трэба таксама чакаць...

Засмужац спытаў, хто застаўся жывы,— імя за імем назваў таварышаў. Казлоў адказаў, і перад Засмужцам паступова маляваўся ўпарты крывавы бой, што прайшоў мінулай ноччу. Бой гэты маляваўся яму нейкім нячутным, нерэальным. Засмужац ніяк не мог адчуць мёртвымі тых, якія ўжо не жылі. Усё ж ранейшы бесклапотна-радасны настрой, хоць і нялёгка, змяняўся трывогай і прадчуваннем недалёкага бою. Яшчэ разам з гэтым, як дамешак, было глухое пачуццё няёмкасці за сябе, за тое, што ён цягнуўся недзе ў тыле тады, як тут біліся насмерць.

— Фрыцам вельмі не падабаецца наш клін. Ім ён — што нож у сэрца. Наўрад ці астылі і цяпер... Але хай паспрабуюць! — пагрозліва прагаварыў Казлоў, здымаючы шынель.

Больш Засмужац нічога не чуў. Сон захапіў яго нечакана, адразу. Галава бяссільна ўпала на кулакі, пакладзеныя адзін на другі на стале.

Снілася — спакойна блішчыць Прыпяць. Засмужац узмахвае вёсламі. З вёслаў са звонам падаюць кроплі вады. А на карме, каля руля, сядзіць Галя, яго нявеста. Яна ў шаўковым белым плацці, на галаве вянок, што сплялі на лузе. Такая харошая, жаданая! Ён выпусціў вёслы з рук, пацягнуў Галю да сябе, каб пацалаваць, і нечакана пахаладзеў ад агіды. Гэта была не Галя, а немец. Той засмяяўся і выставіў губы для пацалунка. Раптам змяніўся з твару, нахмурыўся і штурхнуў Засмужца ў ваду. Смяротная стома скавала цела... Нехта схапіў яго, вывалак на бераг, валтузіў, каб вярнуць к жыццю. Засмужац чуў, як яго клічуць, і ніяк не мог падаць голасу.

Калі ён прачнуўся нарэшце, то ўбачыў, што сядзіць за сталом, а перад ім стаіць капітан, начальнік разведкі.

15. Зак .1877

Казлоў, з рукой на марлевай падвязцы, неспакойна ходзіць па хаце і курыць.

— Ну і спіце ж вы, Засмужац!

— Што?— не даўмеў ён.

— Спіце, кажу, моцна...

— Здарожыўся вельмі, таварыш капітан.

— Разумею... Але спаць больш не давядзецца. Трэба адвезці пакет у штаб арміі. Вельмі тэрмінова, неадкладна.

— Таварыш капітан...— папрасіўся Засмужац.

— Ведаю, што змарыўся.

— Я проста больш не магу.

— Спачуваю. Але некага паслаць.

— Пашліце каго... Ну, Бондара...

— Памёр... ад ран.

Пры апошніх словах капітана Засмужцу раптам прыгадалася нядаўняя размова з Казловым, забытая таму, што хлопец усё яшчэ быў у паўсне. Капітан кіўнуў галавою на лаўку. Толькі цяпер Засмужац убачыў за спіною капітана на лаўцы цела таварыша. Яго прынеслі, калі Засмужац спаў. Трывожна і вінавата падышоў Засмужац да Бондара.

Капітан ступіў убок, і святло лямпы, якое загароджвала яго спіна, упала на нябожчыка. Бондар ляжаў на лаўцы, выпрастаўшыся, да грудзей накрыты шынялём, заплямленым закарэлай крывёю.

Засмужац некалькі хвілін стаяў, як скамянелы, не маючы сілы адарваць позірк ад твару таварыша. Рысы таго былі скрыўлены болем, выраз перадсмяротнай пакуты так і застыў на пабялелых, моцна сціснутых тонкіх вуснах, у напаўадкрытых цёмных вачах Засмужца ўзрушыў не столькі выраз пакуты, колькі нечаканы выраз гневу, які не магла сцерці нават смерць. Засмужцу здалося раптам, што Бондар зараз ускочыць і закрычыць яму: «Што ты яшчэ можаш патрабаваць ад мяне?! Як ты смееш звальваць на мяне?! І як ты можаш адмаўляцца пасля мяне!»

Засмужац ад неспадзеўкі спалохана выпрастаўся, падцягнуўся, як ад сапраўднага вокрыку. Стома адступіла.

На яе месца прыйшлі туга ад сустрэчы са смерцю, страх і вінаватасць.

Ён быў мала знаёмы з Бондарам. Яны ўпершыню пазнаёміліся ўсяго некалькі дзён назад. Хадзілі разам перад цёмным начным полем, ахоўвалі свае зямлянкі, потым разам грэліся ў зямлянцы кіпенем з аднаго кацялка...

Ён толькі і ведаў, што Бондар — не раўня яму, вопытны, заслужаны разведчык, ваюе другі год. У іх узводзе разведкі ўсе паважалі Бондара; ён жа, Засмужац, навічок, крыху нават пабойваўся...

Цяпер, блізка стоячы перад загінуўшым, Засмужац упершыню адчуў, што нейкія невядомыя дасюль сувязі збліжаюць і моцна яднаюць іх. Тое, што яны ваявалі ў адным узводзе, што ў іх была адна мэта, адзін вораг, паўстала цяпер у новым, вострым, святле. Чалавек, якога ён мала ведаў, зрабіўся блізкі, як бы родны.

Побач з Засмужцам стаяла і плакала жанчына. У яго ж не было ні слёз, ні думак, усю яго істоту запаўняла адно вялікае пачуццё. У тым пачуцці неразрыўна спляталіся тужлівае адчуванне смерці, горыч віны і імкненне як-небудзь паправіцца.

Ён нічога не гаварыў, не кляўся. Тое, што ён перажываў, было такім вялікім, складаным і цяжкім, што словы нічога не значылі. Засмужцу хацелася дзейнічаць, страляць, а не гаварыць. Яго вялікае пачуццё патрабавала вялікага, гераічнага.

Капітан, нібы заўважыўшы забытае, нахіліўся да мёртвага, скрыжаваў яго рукі на грудзях. Потым моўчкі павярнуўся да Засмужца. Той адвёў позірк.

— Таварыш капітан, мне патрэбен другі конь... Каштан не можа ісці...

— Вам асядлалі Бондарава Звера.

Болей Засмужац не сказаў ні слова, абуўся, адзеўся і, не развітаўшыся, выйшаў з хаты.

У твар біў сцюдзёны вецер. Курэла. Засмужцу было лягчэй стаяць пад ледзянымі ўдарамі ветру. Падвялі каня. Засмужац узняўся ў сядло, нацягнуў повад.

— Ну, бывай,— сказаў капітан, аддаючы пакет.— Шчасліва даехаць.

— Шчасліва заставацца, таварыш капітан.

Конь хутка вынес яго за сяло. Зноў аклікнулі патрулі і, пазнаўшы, прапусцілі ў поле.

Ад бяссонніцы звінела ў галаве. «Спаў дрэнна і мала; мабыць, і гадзіны не паспаў,— падумаў ён.— Нават у сне не адчэпішся ад немцаў».

Хлопец сутаргава пазяхнуў, успомніўшы перарваны сон, але ўжо не шкадаваў, што ён так нечакана скончыўся.

Халодны вецер памагаў адганяць сон. Паплылі думкі. «Цяжка будзе,— падумаў ён, згадаўшы ўвесь шлях наперадзе.— Але — нічога,— падбадзёрыў ён сябе.— Вытрымаю. Усю сілу збяру, але вытрымаю... Хоць і цяжка будзе, а дайду...»

Застаяўшыся ў хляве, конь ішоў лёгка, праворна. Засмужац, задумаўшыся, не заўважыў, як апынуўся сярод поля. Тут схамянуўся і агледзеўся.

Агеньчыка ззаду не было — патух ці закрыла мітуслівая заслона завірухі.

Больш Засмужац не азіраўся. Уперадзе зноў ляжала далёкая цяжкая дарога. Не змаўкаючы, гула завіруха.

## Ноччу

Маша ўвайшла ў хату і пачала моўчкі распранацца. Развязала хустку, на якой блішчалі сняжынкі, скінула залубянелую ватоўку. Распраналася яна марудна — ад утомы, што роўным цёплым цяжарам наліла цела.

— Ад Сямёна нічога не было? — спытала яна, зірнуўшы на свякруху пільнымі, знарок спакойнымі вачыма. Хоць па твары старой бачыла, што не было.

— Нічога...— адказала свякруха.

Сум зноў балюча здушыў Машына сэрца. Толькі зараз было цяжэй, чым днём у лесе, але гэта быў той жа важкі

сум ад трывожных думак пра мужа, ад якога болей за два месяцы не прыходзіла пісьмаў. Гэты сум толькі часова адышоў у дарозе, калі жанчыны збіраліся ля яе воза і жартавалі.

Маша, расціраючы рукамі пунцовыя намёрзлыя шчокі, падышла да стала. Была яна невысокая, павольная і, відаць, дужая. Шарсцяны світар шчыльна аблягаў поўныя грудзі і круглыя плечы. Нерасчасаныя валасы былі прымяты і пераблытаны. За сталом сядзеў сын і чытаў, ён не звяртаў увагі на прыход маткі. Маша наблізілася да яго, пяшчотна пагладзіла любыя белыя валасы. («Зусім як у Сямёна»,— падумала яна.) Мікола, не адрываючыся ад кніжкі, нецярпліва крутнуў галавою. Ён не любіў, калі маці лашчыла, бо лічыў сябе ледзь не сталым мужчынам. Яму пайшоў дзясяты год.

— Якая кніга, Мікола?

— «Рускі характар».

— Цікавая?

— Угу,— адказаў сын, не ўзнімаючы вачэй ад кніжкі.

Маша зноў пагладзіла яго белую галоўку, затым адышла і села каля процілеглага ўскрайку стала. Свякруха — сухенькая, з худымі вострымі плячыма бабулька — паставіла на стол вячэру, падала ўсім лыжкі і села таксама.

— Кінь кнігу, Мікалай. Бяры лыжку ды вячэрай.

— Не хачу.

— Кінь, кажу,— строга загадала бабуля.

Мікола нічога не адказаў, як бы не чуў загаду, працягваў чытаць. Маці і бабуля пачалі вячэраць.

— Што ж гэта ты такая сумная, нявестачка? Змарнавалася, родная? Хіба жаночая справа — дровы вазіць? Гэта і мужчыну не ўсякаму пад сілу... Усё — жанкі... Ох, ліха...

Маша маўчала. Ад ласкавага, спагадлівага слова сэрца сціснулася яшчэ цяжэй. Словы не ішлі, думкі нібы застылі, нібы завалакліся змрокам.

— За Сямёна ты не бойся,— лагодным голасам гаманіла свякруха.— Будзе жывы, Мар'ечка. Вернецца. Я ўжо ведаю. Чаго толькі сябе зводзіць, у сухоты ўганяць...

— Не магу я. Так баюся, каб чаго з ім, крый божа, не сталася.

— А ты паплач, Мар'ечка. Паплач. Жаночая сляза, што вада, а паплачаш і — лягчэй. Лепш робіцца. Ты паплач.

— Нашто? Хіба слязьмі паможаш чаму?

Мікола дачытаў раздзел да канца, паглядзеўшы для памяці на нумар старонкі, закрыў кнігу і пачаў сёрбаць крупнік. Еў ён спачатку маўкліва і задуменна, пад уражаннем прачытанага.

— Мам,— раптам загаварыў ён.— Васеў бацька ўчора прыехаў з фронту. Прыйшоў вечарам, а яго не пазналі. Кажуць — наш чалавек на фронце. А я свайго бацьку адразу пазнаў бы, каб толькі прыйшоў... А потым пусцілі. А сягоння ён быў у нас у класе. У шынялі і з пагонамі. А на пагоне дзве зорачкі і адна пасачка. Я сам бачыў. Яго бацька лейтэнант, а Вася гаворыць, што ён скора будзе капітанам. А я сказаў, што ён спачатку павінен быць старшым лейтэнантам, а пасля — капітанам. Праўда, мама?

— Не ведаю.

— От, і заўсёды ты не ведаеш! А настаўніца наша, Ліда Іванаўна, усё ведае.

— На тое яна і настаўніца.

— Мама, а чаму ад нашага таты няма пісьмаў? Я так занудзіўся. Усім прыносяць, а нам няма. Ён ранены, мам. А?

— Што ты вярзеш, дурны? — уз'елася раптам бабуля.— Вось зараз як плясну лыжкай па галаве. Скажы толькі шчэ раз.

— Я ж праўду кажу,— упарта запярэчыў Мікола.— Калі б ён быў не ранены, то пісаў бы.

— Пагавары шчэ трошкі!

— Не пагражай. Я цябе не баюся,— смела адказаў Мікола, але на ўсякі выпадак падсунуўся бліжэй да маткі. Бабуля паглядзела на Машу. Тая сядзела сумная, з пачырванелымі вачыма, моцна сцяўшы журботныя губы.

— Мама, не крыўдзіцеся на Міколу. Што ён разумее?

— Я ўсё разумею. Ты заўсёды кажаш, што я малы. А Васеў бацька сказаў, што я ўжо вялікі.

Ніхто не папярэчыў яму, і рэшту вячэры сядзелі маўкліва. Калі павячэралі, Маша паслала ложак і лягла спаць. Побач прымасціўся Мікола, паклаўшы сваю белую галоўку на яе руку. Ён адразу заснуў, а Маша не магла.

У вачах, калі яна заплюшчыла іх, спачатку праходзілі задумлівыя, доўгія шэрагі танклявых аснежаных бяроз. Бель адбірала вочы. Потым бярозы валіліся, асыпаючы з веццяснег-пушок, чапляючыся, нібы спрабавалі ўтрымацца, за галіны сваіх сябровак; плыла бліскуча-бронзавая санная каляіна; скрыпелі сані і галёкалі звонкія жаночыя галасы, падганяючы коней.

Затым усё кудысьці знікла, і яна ўбачыла, як у пакой нячутна ўвайшоў Сямён. Ён быў такі ж, як і раней: рослы, шыракаплечы, з моцнай шыяй, з бялявым непакорным віхорам. Сямён ціха зачыніў дзверы і падышоў да яе. Ён прыйшоў з калгаснага сходу.

Сямён шчакой прыхінаецца да яе шчакі,— колецца, бо даўно не галіўся. «Работы шмат: старшыня калгаса»,— думае Маша. Як прыемна, як радасна з ім! Маша адчувае хвалююча-знаёмае цяпло яго твару, і шчаслівае пачуццё ўзнімаецца ўнутры. Яна ляжыць і не дыхае, не паварухнецца — так ёй хораша і лёгка!

І тады, у тую невыказна шчаслівую хвіліну, Маша мімаволі расплюшчвае вочы, і грудзі балюча сціскаюцца ад самоты. Яго няма! На печцы, як звычайна, не спіць, вохкае бабуля. Мікола аб нечым горача шэпча ў сне.

У акно пазірае белая месячная ноч. Пас мёртвага святла ляжыць на канапе, на стале, ручніком спадае на падлогу. Ноч застыла. Не чутно ні крокаў, ні галасоў, ні гукаў, нават мароз не трашчыць. Праз шыбы бачны кавалачак сіняга неба ў халодным раўнадушным бляску шматлікіх зорак. Нерухомая бясконцая ноч...

Цяжка ноччу. Колькі горкіх думак перадумана за доўгія зімовыя ночы. Усё ўспамянута, усё пераждадана, засталося толькі адно: туга — важкая, цягучая. Нічога няма цяжэй за яе. Днём можна забыцца, уцячы ад тугі, а цяпер яна тут, нібы каменем цісне грудзі.

Калі б хоць адно слова ад Сямёна. Толькі адно слова, што жывы, ну, і здаровы — і больш нічога. Тады ўсё стане інакшым. Цяжка жыць пры невядомасці... Горкую і балючую праўду, бадай, лягчэй перагараць, чым яе... Два месяцы і чатыры дні няма пісьмаў. Што з табою, любы? Ты пісаў, што баі былі моцныя. Мо паранілі? Ці захварэў?.. «Паплач, паплач — лягчэй будзе». А дзе тых слёз узяць? Няма слёз — усе высахлі. З той пары, як пайшоў Сямён, не заплакала ні разу...

Марудна і доўга плылі невясёлыя думкі.

Бачыць яна: чалавек ідзе па полі. Шынель яго расперазаны, наросхрыст. Вецер паднімае полы. Гэта ён, Сямён. Сямён ідзе дадому... Ну так, дадому, у водпуск... Падыходзіць да хаты. Падымае руку і стукае... Пачакаў крыху і зноў стукае. Маша прыслухалася — тоненька сакоча шыба. Сямён стукае, а Маша ляжыць і не можа зварухнуцца. Што гэта такое з ёю дзеецца? «І ноччу няма ад яго спакою»,— бурчыць на печы бабуля. Чаму яна такая няласкавая? Яна, пэўна, не ведае, што гэта Сямён стукае?

— Гэта ж Сямён! — чуе Маша праз дрымоту свой голас і прачынаецца. Дрыготкімі ад узрушанасці рукамі шукае спадніцу і не можа знайсці.

— Дзе той Сямён? Гэта ж твой брыгадзір, трасца яму, бяссоннаму.

Свякруха, крэкчучы і вохкаючы, марудна злазіць з печы, доўга ў прыцемках каля ложка шукае чаравікі, запальвае лямпу і нарэшце тупае ў сенцы. Бразгае засаўка.

— Няма на цябе ўгамону, бяссонны,— няласкава сустракае яна таго, хто ўвайшоў.

— Ціха, ціха. Я толькі на хвілінку.

— Спаць не дасць...

— А я не да вас. Спіце, калі ласка, на здароўе. Маша, выбачай, што патрывожыў позна... Заўтра зноў паедзеш у лес. І ўсе, хто сягоння былі. Што з табой? Ты хворая?..

— Нічога,— цяжка выціснула Маша.— Нічога. Сон прысніўся. Не глядзі... Я паеду...

Але чаму ў грудзях такая туга?

Брыгадзір — малады, цыбаты, без рукі хлопец, у паношаным франтавым шынялі з выгаралымі пятліцамі, занепакоена глядзеў на Машу. Яна вышэй нацягнула коўдру.

— Ну, бывайце!.. Чакай, от ліха! Ледзь не забыў!.. Тут табе, Маша, пісьмо — узяў на пошце... Другі дзень нашу.

— Пісьмо?!

Ён дастаў пакамечаны канверцік. Маша нецярпліва выхапіла яго з брыгадзіравых рук і прабегла вачыма надпіс. Почырк быў незнаёмы, хоць адрас стаяў ранейшы. «Пісьмо з часці»,— здагадалася яна. Хвіліну яна паглядала на канверт, не адважваючыся адкрыць, затым хутка разарвала яго і, нічога не гаворачы, упілася вачыма ў пісьмо. Яна зноў узрушылася, так моцна, што рука з пісьмом апусцілася ў знямозе.

Маша аддала пісьмо Максіму і папрасіла прачытаць. Ён узяў пісьмо, здзіўляючыся, што яна так абышлася — не радуецца і не сумуе.

Гэта былі друкаваныя на машынцы радкі. Максім стаў чытаць:

— «Ты, мабыць, ужо хвалюешся, думаеш, мабыць,— што такое зрабілася з тваім мужам, што ён так доўга не піша пра сваё жыццё, ці здаровы і таму падобнае. Дык от — паведамляю табе гэтым пісьмом, мая дарагая жонка, што я, як і раней, так і ў цяперашні час, жывы і ў асноўным здаровы, і ніякіх страхаў, якія ты магла па сваёй фантазіі прыдумаць, са мной не было і быць не магло. Усё ідзе нармальна. Толькі выйшла адна маленькая прыгода. Паколькі я служу старшыною, то я вёз тыдзень назад хлеб і застраў з машынаю ў полі, і прыйшлося мне там, у полі, ноч начаваць, а было холадна, і я трохі памарозіў два пальцы на правай руцэ. З прычыны чаго і друкуе гэтае пісьмо на пішучай машынцы наш пісар і мой друг старшы сержант Гонта. Так што ў мяне ўсё ў парадку, і наогул у нас парадак поўны, і адно мяне толькі непакоіць, як там у нас дома, як Мікалай-сынок, як мама, асабліва, канешне, як ты адна па гаспадарцы... і наогул, у маладым тваім... адзінокім жыцці...»

16. Зак. .1877

Максім спыніўся, не дачытаўшы пісьма. Ён збянтэжыўся,— Маша плакала. Хлопец паспрабаваў быў заспакоіць, але яна не адказала і заплакала мацней. Максім стаяў разгублены, не ведаў, што рабіць...

— Што ты стаіш, чорт бяссонны? Вады падай.

Ён з палёгкай кінуўся да вядра, прынёс корчык вады і працягнуў Машы. Але тая адвяла яго руку, лагодна загаварыла:

— Ты не трывожся, Максім. Гэта — так сабе... жаночыя слёзы. Чакала, чакала столькі, хвалявалася, пакутавала — і раптам, бачыш!.. Такая вестка!

— Сам не ведаю, як я забыў аддаць яго ўчора...

— А я — чаго ўжо толькі не падумала!.. То ж столькі часу — хоць бы знак які даў!..

Маша гаварыла, стрымліваючы слёзы, але на сэрцы яе было так лёгка і чыста, як лёгкія і чыстыя былі яе слёзы. Яна ўпершыню за многія дні ўсміхнулася.

— Столькі часу, хоць бы знак які! Нібы чула, што бяда нейкая!.. І от жа — пальцы два адмарозіў... Баліць, пэўна. І папакалеў, мабыць, за ноч тую... А, не дай бог, магло б і горай быць!

— Гэта нічога — пальцы!.. Зажывуць!.. Абы сам цэлы!

— Жывы, дзякуй богу!.. Толькі — чаго ж я плачу? Дурная! Ці не праўда, дурная? Трэба смяяцца, а ў мяне — слёзы!..

Бабуля, якая маўкліва паглядала на нявестку, моцна сцяўшы бяскроўныя вусны, раптам прамовіла задаволена:

— От і прыйшлі яны, тыя слёзы... Прыйшлі нарэшце.

## Такі кароткі водпуск

Шкада было кожнай хвіліны, што марна прападала, але ўсё, нібы знарок, ішло насуперак.

Спачатку доўга не ўдавалася знайсці цягнік, каб пад'ехаць паўсотні кіламетраў. Эшалоны, якія праходзілі і якія стаялі тут,— або ішлі ў другі бок, або няхутка павінны былі адпраў-

ляцца. Калі Васіль даведаўся, што на станцыю прыбыў новы састаў, які вось-вось пойдзе ў яго напрамку, ён адчуў сябе на сёмым небе. Добра, што з неба свайго бачыў зямлю: цягнік ужо крануўся, грымеў коламі па рэйках,— Васіль ледзь паспеў учапіцца за поручні.

Цягнік плёўся вельмі марудна. Ноч была страшэнна золкая, і пранізлівы вецер, што рваўся праз тамбур, дзе ён стаяў, прашываў наскрозь. Каб не адубець, даводзілася час ад часу саскокваць з падножкі і трусіць навыперадкі з вагонам. Але хлопец не зважаў на гэтыя нягоды, адчуваў сябе нават шчаслівым: як-ніяк усё-ткі едзе, набліжаецца!

На станцыях і раз'ездах было горш: цягнік рабіў доўгія супынкі. Машыніст, здавалася, не мінаў ні аднаго самага занядбанага раз'езда без таго, каб не пастаяць колькі хвілін. Пры гэтых супынках у Васіля кожны раз падымалася жаданне кінуць састаў і ісці аднаму, пешкі.

На нейкай станцыі састаў спыніўся надоўга, паравоз адчапілі; чыгуначнік сказаў сержанту, што далей цягнік пойдзе толькі праз тры гадзіны.

Васіль хутка абабег станцыю, цёмную, пустую, але навокал нічога не было, ні аднаго цягніка! Толькі ў тупіку бесклапотна сіпеў нейкі паравозік. Адчуваючы, што ўсё гіне, хлопец заспяшаўся туды. Гэта была адзіная надзея.

Паравозік быў, відаць, рабочы. У поясе святла, якое падала з будкі, стары чалавек у кароценькай ватоўцы і валёнках і худы падлетак грузілі дровы. Хлапчук, які працаваў у расшпіленай сарочцы, смыкнуўшы носам, паважна адказаў, што праз паўгадзіны паравоз пойдзе да таго гарадка, які патрэбен Васілю.

— Ну, калі так, то прымайце ў памочнікі! — весела сказаў Васіль.— Згодны?..

Ён падкасаў рукавы шыняля, з радасцю ўзяўся дапамагаць грузіць дровы.

Хутка дровы пагрузілі, і паравозік выбраўся на пуць. Васіль памагаў машыністу, паліў топку,— качагар з яго быў вельмі ўвішны і неспакойны.

— Куды гэта ты, хлопец, так спяшаешся? — запытаўся машыніст.

— У водпуск...

— А, вунь яно што! Хочацца хутчэй убачыцца?.. Але ты спакайней! Нікуды ён, водпуск гэты, не ўцячэ.

Хлопец выцер пот з твару.

— Хто ведае. У мяне такі водпуск, што можа і ўцячы...

Стары, бачачы нецярплівасць чалавека, не шкадаваў пары і выціскаў з паравозіка такую хуткасць, на якую той быў здатны.

Хвілін праз сорак паравозік спыніўся на станцыі, непадалёк ад якой у разбаўленай ранішняй сінечы мігацелі агеньчыкі гарадка. Забыўшы ў спеху развітацца, Васіль саскочыў на зямлю, азірнуўся — вакол не было ні адной постаці. Па бязлюдным пероне неспакойны вецер гнаў сухое лісце.

Адразу, як толькі Васіль ступіў на гэты перон, яго агарнула радаснае ўзрушэнне.

Ліда, яго любая Ліда, якую ён марыў пабачыць усе гэтыя гады, па якой столькі сумаваў, цяпер недалёка. Там, сярод тых агеньчыкаў у сінечы, адзін агеньчык пазірае з яе акна. Каторы?..

Па гэтым пероне Ліда, напэўна, не раз хадзіла,— можа, нават учора была... Раптам ён падумаў, што Ліда можа трапіцца кожную хвіліну насустрач, што яна можа спаткаць тут, на станцыі.

Ён зазірнуў у залу чакання і толькі пасля таго, як упэўніўся, што Ліды няма, падаўся са станцыі.

Да горада вяло шасэ, абсаджанае старымі разгалістымі асінамі. Васіль то ішоў, то пачынаў бегчы,— у сэрцы шчымлівым халадком варушыўся непакой: «Ці дома яна? А што, калі яе няма дома? Раптам паехала куды?»

«Трэба было б папярэдзіць аб прыездзе,— думаў Васіль.— Але як, калі да сённяшняй ночы я сам не ведаў, што удасца такое...»

Ужо добра ўднела, калі ён падыходзіў да моста, за якім пачынаўся гарадок. Вось той гарадок, які на фронт пасылаў

яму столькі лістоў, напісаных рукой Ліды. Да вайны хлопец і не ведаў, што недзе на Волзе існуе такі гарадок, а потым, калі ад Ліды з эвакуацыі прыйшлі першыя лісты, гэты гарадок зрабіўся самым любым кутком на зямлі. Сотні разоў Васіль пісаў на канвертах імя гэтага гарадка. Нарэшце выпала і пабачыць...

На вуліцы хлопцу напаткаліся дзяўчаты, што весела і заўзята, перабіваючы адна адну, гаманілі. Неспадзявана для Васіля дзяўчына, якая ішла ў сярэдзіне, аказалася знаёмаю. Яна таксама да вайны жыла ў Мінску — вучылася ў адным інстытуце з ім і Лідаю. Калі ён прыходзіў да Ліды, то яшчэ нярэдка бачыў іх з Галяю разам...

Ён узрадаваўся гэтай выпадковай сустрэчы, памкнуўся быў падысці да Галі, але адразу падумаў, што гэта затрымае яго, што прамарнуе час, і моўчкі мінуў.

Калі ён знайшоў вуліцу Чкалава, Лідзіну вуліцу, то яшчэ здалёк убачыў нямоцны, згалелы клён і драўляны дамок з парканам. «Яна ў тым доме,— здагадаўся хлопец.— Яна пісала, што на іх двары стаіць клён».

Ён пайшоў цішэй.

Упершыню за ўсю дарогу яму захацелася не спяшацца, прыпыніцца, пачакаць.

«Што гэта са мной: хвалююся, як хлапчук які... З непрывычкі»,— вытлумачыў ён.

Колькі яны не бачыліся!.. Якая кароткая была ростань той ноччу ў Мінску, у страхотным бляску пажараў! І якую разлуку прынесла яна!

Калі ён адчыніў фортку, маці Ліды секла дровы. Яна доўга, пільна ўглядвалася, не пазнаючы, потым здзіўлена і радасна ўскрыкнула:

— Васілёк?! Жывы і дужы!..

Мар'я Пятроўна выпусціла з рук сякеру, падышла да яго, пяшчотна абняла.

— А мае, Васілёк, два...— неспадзявана сумна сказала яна.— Мае...

Яна не скончыла,— апусціўшы галаву, ціха заплакала: Васіль ведаў, што ў яе на фронце загінулі два сыны.

Яе кволая, сагнутая горам постаць выклікала ў Васіля жаль і пяшчоту. Яму захацелася сказаць нешта ласкавае і добрае, каб суцешыць яе, але ён адно вінавата маўчаў.

Выцершы слёзы, маці запыталася, ці ўсе яго родныя засталіся жывыя пасля акупацыі.

— Ад бацькі няма нічога... А матка — жывая... і Верка, і Аленка... сястрычкі...— Ён нецярпліва азірнуўся.

— А дзе Ліда?

— Ліда спіць. Учора прыйшла, працаўніца, толькі ў дзве гадзіны ночы... Але што ж мы сталі? Заходзь у хату, Васілёк,— схамянулася старая.

Ён чакаў, што старая скажа, адкуль Ліда прыйшла так позна,— яму гэта вельмі рупіла ведаць,— але старая не гаварыла.

Яны ўвайшлі ў хату.

Васіль наблізіўся да дзвярэй у Лідзін пакой. Ён вельмі хваляваўся — некалькі хвілін не мог крануцца, стаяў, каб перавесці дыханне. Потым паправіў шапку і пастукаў.

— Хто там?

Васіль пачуў голас Ліды, але не адказаў, каб не выдаць хвалявання, і пастукаў яшчэ раз. Ліда паўтарыла запытанне.

— Час падымацца, соня,— сказаў ён, не пазнаючы свайго голасу.— Госці да цябе...

— Ой! — ускрыкнула Ліда і сціхла.

Мар'я Пятроўна выйшла ў кухню.

Праз некалькі хвілін Ліда адчыніла дзверы і папрасіла зайсці. Яна стаяла каля акна, папраўляючы вязаную кофтачку, пазіраючы насустрач яму крыху заспанымі, але неспакойнымі, як бы недаверлівымі, вачыма. Ліда здалася яму незвычайна прыгожай. Яна пасталела і пахарашэла за гэтыя гады. Яна была шмат прыгажэй, чым на картачцы, што прыслала на фронт.

Яны абое стаялі разгубленыя, не ведаючы, як павітацца. Васіль яшчэ ў дарозе думаў, як моцна сцісне яе ў абдымках, пацалуе, яна таксама, напэўна, рада была б, каб ён абняў. Але яны так доўга не бачыліся, так адвыклі ад пяшчот, так хваляваліся абое, што разгубіліся,— асцярожна пацiснулі адно аднаму рукі...

Ліда падала табурэтку, папрасіла сесці, села сама на ўскрай ложка.

— Як гэта ты?.. Так нечакана.

— Ты не чакала?— спытаўся ён з жартаўлівай крыўдай, каб схаваць няёмкасць.

— Не, не чакала,— адказала яна ў тон.

— Значыць... я дарэмна спяшаўся?

— Выходзіць, дарэмна...

Яна паглядзела з ледзь прыкметнай усмешкай, і ў чыстых, як вада ў лясных азёрах, яе вачах, што здаваліся цёмнымі ад густых веек, успыхнулі знаёмыя гарэзныя агеньчыкі.

Гаворка пайшла весела і лёгка. Васіль жартаўліва апавядаў пра свае прыгоды ў дарозе, Ліда смяялася. Так, жартамі, яны гаварылі яшчэ доўга, пакуль ад разгубленасці, што зрабіла доўгачаканая сустрэча, не засталося і следу.

Тады ён раптам пачаў адчуваць нездавальненне. «Гэта не тое, што павінна,— падумаў ён.— Трэба сказаць нешта значнае, вялікае і пачуць шчыры адказ, трэба, каб кожнае слова было асаблівае. Бо гэта гадзіна не звычайная, асаблівая». І вясёлая, але пустая гаманлівасць пакінула яго, усмешка на чырванашчокім твары згасла, а між густымі ўскінутымі брывамі з'явіўся нездавольны раўчачок.

Ён абарваў гаворку, сціх. Ліда, даўно заўважыўшы незразумелую змену ў яго настроі, паглядзела на яго са здзіўленнем.

Васіль загаварыў з тугой і шчырасцю:

— Калі б ты, Ліда, ведала, як я рады, што бачу цябе зноў... У мяне, ведаеш, нейкае дзіўнае жаданне: хочацца, не зводзячы вачэй, глядзець і глядзець на цябе... Нават, ведаеш, гаварыць не так хочацца. Праўда... Мне ўсё роўна як шчасце — бачыць цябе, твае вочы, твае рукі... І аж нібы не верыцца, што гэта ты! Дзіўна, праўда? Гэта, мусіць, ад таго, што я прывык думаць, што ты далёка-далёка.

Ліда, крыху збянтэжаная гэтай раптоўнай гарачай шчырасцю, не прамовіла ні слова, але з позірку яе ён зразумеў, што яна адчувае.

Так, і яна вельмі шчаслівая, што ён тут, і для яе ён самы любы чалавек, яна любіць, як і раней. Не, больш, як раней!.. Васіль не мог адарваць вачэй ад яе.

«Хай гэтыя гадзіны будуць без смутку. Хай думае, што іх яшчэ многа»,— недзе далёка засенню наплывае думка. Яна хутка сходзіць, нібы хмурынка ў ясным, бязвоблачным небе. І зноў — толькі вочы, блізка-блізка...

— Як хораша! — ціха прашаптала Ліда.

Яе рукі даверліва ляглі на яго плечы, ён абняў яе і сядзеў моўчкі, напоўнены адчуваннем яе блізкасці і бязмежнага шчасця.

Скончылася гэта нечакана. Яны, здаецца, забыліся на ўсё на свеце, калі з кухні пачуўся голас Марыі Пятроўны:

— Ліда, час снедаць.

Ліда хутка ўстала, кінула позірк на ручны гадзіннік.

— Ой, мне трэба бегчы.

— Куды?

— На працу.

— Якую працу? Ты працуеш?

— Працую, на авіяцыйным заводзе. Хутка месяц...

— А інстытут? Вучоба?

— І вучуся, і працую... Чаму ты такі... дзіўны? — занепакоена спыталася яна.

Ён задумаўся: «Сказаць ці не?» І пасля моманту развагі рашыў: «Не, няхай пазней».

— Пасля скажу. Я цябе правяду. Добра?

Да завода, што быў кіламетры за два, на ўскраіне горада, яны ішлі вельмі хутка. Падаў першы снег, весела мітусіліся ўвішныя сняжынкі, усцілалі перад імі шлях.

— І вучышся, і працуеш! Гэта ж цяжка...

— Цяжка. Раніцай і днём — на заводзе, увечары — з чатырох да дзесяці — заняткі. Потым — падрыхтоўка да заняткаў. Учора прыйшла за поўнач. Так кожны дзень...

Вуліца падымалася ўгору. Час бязлітасна лічыў хвіліны, Васіль парываўся загаварыць пра тое, цяжкае, і ўсё адкладваў.

— Я хацела спачатку папрасіцца на фронт,— сказала яна,— не магла я больш сядзець тут. Мне так хацелася

пайсці на фронт, Васілёк... Ды маці нельга было пакінуць адну. Гора зусім змагло яе. Бачыш, якая яна цяпер? Я адна яе падтрымлівала...

Каля заводскай брамы, на ўзгорку, яны спыніліся. Унізе ляжаў горад. Адсюль былі відаць стужкі яго вуліц, квадраты плошчаў, дахі бялелі некранутым снегам. Проста над горадам у мітуслівым прасцягу вісела нізкае, але вясёлае сонца.

— Ну, вяртайся. Адпачні, Васілёк, пасля дарогі. Маці там цябе ўладзіць... Я прыйду ў тры гадзіны. На заняткі — у такі дзень — не пайду. Будзем разам! Удваіх будзем! Удзень і ўвесь вечар!.. Як я рада, што ты прыехаў!..

Яна шчасліва засмяялася.

— А ты — нібы не рады! Зноў — хмурны! Нібы штосьці тоіш... Васіль!..

— Я хацеў сказаць, што мы... сёння... не сустрэнемся...

— Не сустрэнемся? Чаму?

— Мне трэба ісці на станцыю... Разумееш, Ліда, хутка павінен падысці мой эшалон... Мяне адпусцілі на дзесяць гадзін...

— Як гэта на дзесяць гадзін? Такі кароткі водпуск? — са здзіўленнем сказала яна.

— Я табе не хацеў гаварыць раней... Мне, Лідачка, пашанцавала. Праз вашу станцыю павінен прайсці эшалон нашага палка. Ён недалёка тут спыніўся на некалькі гадзін. Я папрасіўся, і мяне адпусцілі... На дзесяць гадзін. Каб праз дзесяць гадзін я чакаў іх тут, на станцыі...

— Толькі на дзесяць гадзін?..

— Ён скора павінен быць тут, на станцыі...

— Ну і няхай,— знарок весялей сказала яна,— чаго ж мы журымся? Мы яшчэ пабачымся! Ведаеш што,— я папрашу, каб мяне сягоння адпусцілі раней!..

Ён не ўзрадаваўся, вінавата схаваў позірк.

— Ліда, з тых дзесяці гадзін амаль восем пайшло на дарогу. Пакуль дабраўся — мінула восем гадзін...

— Восем!.. Значыць, толькі дзве!..

— Дзве.

— А я думала... А я хацела... увечар...

— Ліда, усё ж мы пабачыліся...

— На адзін міг!.. За тры гады!..

— Усё ж пабачыліся, Ліда... А што мала, то — калі на тое — хіба два гады было б досыць?

— На адзін міг!

Лідзе трэба было ісці, а яны марудзілі: здавалася, не хапала сілы, каб сказаць апошняе слова.

Васіль, каб супакоіць і яе, і сябе, гаварыў пра тое, што вайна хутка скончыцца, што яны сустрэнуцца зноў і ніколі болей не разлучацца. Разам заўсёды будуць.

Напаследак, ужо развітаўшыся, ён сказаў:

— Я, калі ехаў да цябе, баяўся, што не пераганю наш эшалон ці не застану цябе. Крыўдна было б. А так я шчаслівы... Цэлых дзве гадзіны!

## Адна

### I

На дзявяты дзень Аня зноў пераступіла парог хаты, у якой жыла сястра Арына.

У хаце нікога не было. Дзяўчына кінула на лаўку жакетку, стомлена прайшлася па пакоі. Дзе ж усе? Толькі яна падумала гэта, як у сенцах бразнула клямка і ўбегла ўстрывожаная бялявая Лорка, Арыніна дачушка.

— Цёця Аня! — узрадавана ўскрыкнула яна і кінулася да дзяўчыны. Лорка прыціснулася і хвіліну стаяла моўчкі, незнаёма сур'ёзная, нейкая пасталелая.— Ой, што тут было без вас,— раптам сумна прамовіла яна.

— А дзе мама?

— Мама на гародзе. Яна сказала — к нам нехта пайшоў, ідзі паглядзі, хто гэта... Табе трэба, каб яна прыйшла?

— Пакліч, Лорка.

Аня села на лаўку. Вось яна і дайшла да прыстанку. Скончыўся шлях, цяпер няма куды спяшацца, можна спачыць, даць спакой натруджаным нагам, падбітым доўгай

неспакойнай дарогай. Аня так спяшалася дайсці сюды, але цяпер, калі яна ўжо тут, у яе, як і раней, няма жаданага спакою. Чаму на сэрцы такая трывога?

«Ой, што тут было без вас»,— успомніліся ёй словы Лоркі.

За акном праплыла сумным ценем Арыніна постаць.

Сястра спаткала нявесела. Увайшла павольна, паставіла да сцяны капаніцу і моўчкі стала пасярод хаты, не вітаючыся, апусціўшы пачарнелыя ад зямлі рукі.

Калі Аня падышла да Арыны і ўзяла за плечы, вусны сястры задрыжалі, а ў кутках вачэй набеглі дзве светлыя празрыстыя кроплі.

— Што такое? — спалохана і разам з тым тонам, у якім чуўся загад, шапнула Аня.

— Маму нашу...

— Што?!

— Забілі маму. Няма мамы...— Сястра, прыпаўшы да Анінага пляча, горка, з адчаем, не стрымліваючыся больш, загаласіла.

У грудзях Ані зрабілася пуста, усе думкі, усе пачуцці адразу зніклі. Гэта была важкая балючая пустата.

«Маму нашу...»

Яна стаяла нерухома, і нерухомым, застылым быў яе твар, на якім застаўся той выраз спалоху, калі яна гаварыла: «Што такое?»

— Калі гэта было?

— У тую суботу...

Больш яна нічога не пыталася, а Арына сама нічога не стала расказваць.

Толькі пад вечар, калі сядзелі на ганку, сястра зноў загаварыла:

— Маму расстралялі, як толькі прыйшлі. І яшчэ васямнаццаць чалавек. Бацьку Андрэя Віткоўскага таксама. І пра цябе дапытваліся, не верылі, што ты пайшла... Вывелі іх за сяло — туды, дзе гліну летась капалі. Стары Віткоўскі дык самісці не мог, так яго збілі. Яго вялі пад рукі Марыся Краўчукова і Алена... А мама — худая, белая, як снег...

Іх паставілі каля ямы на глінішчы. Людзей сагналі з сяла, каб глядзелі ўсе...

— За што іх?

— За тое, што за сялом нехта забіў салдата...

Рот яе перасмыкнула сутарга. Яна колькі хвілін стрымлівала слёзы, прыкусіўшы балюча ніжнюю збялелую губу.

— Не магу далей...— прамовіла Арына.

Аня сядзела ціха. Яна спачатку нібы не заўважала ні таго, што сястра змоўкла, ні таго, што потым тая заплакала,— ніводная рыска не варухнулася на Аніным твары. Збітая і спустошаная страшэнным горам, яна сядзела бяздумная, увабраўшы галаву ў плечы, з затоенай трывогай чакала, што Арына скажа яшчэ.

Але Арына не гаварыла нічога. Толькі рыдала, горка, уголас, па-жаночы. І чым больш яна рыдала, тым цвярдзей, нецярплівей станавілася на душы ў Ані. Яна сухім голасам выціснула:

— Кажы... Што далей.

Гэта было не падобна на просьбу. Арына здзіўлена падняла галаву.

— Я хачу ўсё ведаць... Усё.

Выціраючы ражком хусткі вочы, хліпаючы, як дзіця, Арына стала расказваць.

— Яны ляжалі там тры дні... І наша мамка, Аня, таксама. Немцы забаранілі хаваць, прыгразіліся, што будуць страляць тых, хто паспрабуе ўзяць забітага... На чацвёрты дзень навалач гэтая паехала, і мы з Лоркай мамку прыбралі і занеслі на могілкі...

Аня слухала цяпер стрымана, з упартай, строгай уважлівасцю. Арына заўважыла, што Аня змянілася за гэтыя некалькі хвілін,— калі раней яна была разгубленая, то цяпер здавалася амаль спакойнай, нават праз меру спакойнай.

— От, цяпер я ведаю ўсё,— нібы з палёгкай, з ноткай нейкай пагрозы прагаварыла яна, калі Арына скончыла.— Як сваімі вачыма пабачыла...

І быццам для доказу, што гаворка пра няшчасце скончана, Аня стала апавядаць пра дзевяць дзён, што аддзялялі яе ад той помнай раніцы, калі яна развіталася з Арынай.

— Дайшла я з таварышкамі аж да Полацка... Там са мной яшчэ дзве настаўніцы было з нашай школы... А тады я сказала: не пайду далей на ўсход, хоць што!.. Каля лесу, бачу, танкі стаяць. Я адразу да танкістаў,— трапіла на трох, што сядзелі на траўцы і палуднавалі. Я да іх, пытаюся, дзе тут пагаварыць з камандзірам якім? Адзін адказвае: я — камандзір. Кажу, прымайце да сябе, хачу ваяваць... А яны пачалі жартаваць, падсмейвацца,— асабліва адзін — бялявы такі. «Вазьмі,— кажа,— лейтэнант... Канцэнтрат пшонны варыць». Эх, і загарэлася я, Арына,— як сказала некалькі добрых слоў, дык ён адразу прысмірнеў. «Ого! — пакруціў галавою ды да хлопцаў: — Гэта язычок!» — і паказаў, як знайсці камандзіра. А я на развітанне яму: «Не маеш права, дык не затрымліваў бы!» Прыйшла да камбата, камандзіра батальёна, маёра Бродкіна. Ён паслухаў, харошы такі чалавек, падумаў і кажа, што прымае — сястра ім патрэбна была. Далі мне, Арына, шынельку, сумку, і стала я — таварыш чырвонаармеец...

Яна раптам схілілася над каленам і дакранулася пальцамі да рудога, запыленага бінта, што абгартаў правую загарэлую лытку.

— Цябе ранілі, ці што?

— Ранілі,— прамовіла Аня такім тонам, што сястра не зразумела, жартуе яна ці сур'ёзна гаворыць.

Тугі, моцна сціснуты вузялок не развязваўся. Аня ўстала, увайшла ў хату, а ўслед падалася і Арына. У хаце Аня ўзяла са стала нож, разрэзала вузел і, прысеўшы на ўслон, пачала спрытна разгортваць зляжалую істужку бінта.

— От якая рана.

У яе руцэ Арына ўбачыла ўвагнутую шэрую кніжачку.

— Камсамольскі білет?

— Білет,— спакойна кіўнула Аня. Яна шурпатымі далонямі беражліва выпрастала і перагарнула вокладку. Прачытала павольна, з доўгімі паўзамі сваё прозвішча, імя, год нараджэння, час уступлення ў камсамол — май, 1940 год... — 14 мая 1940 года,— дадала яна сабе, памаўчала і перагарнула яшчэ старонку. Позірк прайшоў па некалькіх радках

узносаў. Апошні ўзнос і подпіс стаяў супроць радка — «чэрвень». Здавалася, яшчэ не высахла чарніла.

Усе іншыя клетачкі былі пустыя.

Апошні ўзнос. За гэты месяц яна ўжо не плаціла і за наступны, за жнівень, мусіць, не будзе...

Ніколі такой блізкай і дарагой не была для яе гэтая маленькая кніжачка з абрысам Леніна на вокладцы.

— Каля Глыбокага наткнуліся на праверку, нас пачалі абшукваць. Адзін — высокі і руды, да мяне — лап, лап — і выцягвае з кішэні білет. «О, Ленін! Чый это? Твой?» Я сказала, што мой. «Камсамолка?! Цябе за это надо — пук, пук, расстраляць!» А сам, паганы, узяўся за яго і хоча разарваць. Я хапіла за білет і вырвала: «Не трэба рваць,— кажу,— у мяне іншых дакументаў няма». «Куды ідзеш?» — пытаецца. «Дадому. Вучылася ў Віцебску, іду дадому. Не хацела адступаць». Гавару яму смела, голасна, упэўненая такая, аж дзіва. «А, это гут,— зарагатаў немец.— Ну, лядно, ідзі». Адпусціў мяне. Тады я адышла трохі, выняла білет з кішэні ды абкруціла бінтом... на назе...

— Адчайная ты! — прамовіла сястра, як бы з асуджэннем. Але Аня не заўважыла гэтага тону. Яна разгладзіла вокладку.

— Ну а больш не чапляліся?

— Чапляліся. Яшчэ чатыры разы траплялa да іх... Казала ўсё: дадому з Віцебска іду...

Як толькі змоўкла, адышла ад успамінаў, грудзі сціснуў глухі боль: «Мама, мама». Аня не магла звыкнуцца, згадзіцца з думкай, што маці, такой любай, лагоднай, клапатлівай, ужо няма.

Яны доўга маўчалі. Прыйшла Лорка, і Арына адразу паклала яе спаць.

— Дзе Віткоўскі, ты ведаеш? — шапнула Аня сястры, калі тая вярнулася да акна.

— Не ведаю. Але, мусіць, недалёка недзе. Кажуць, што ён у партызанах.

Аня стала тым жа шэптам распытвацца пра іншых таварышаў, з якімі не бачылася — ёй здавалася — страшэнна даўно, але Арына амаль нічога не магла сказаць ёй.

Усіх за нейкага паўмесяца вайна раскідала, развеяла па розных шляхах...

Як яно пойдзе, гэтае новае, незнаёмае жыццё? Што яно ёй прынясе?

## II

На наступны дзень яна пайшла з Арынай жаць.

Ах, якое дружнае, якое высокае жыта! Поўныя тугія каласы важка пагойдваюцца пад гарачым павевам ветру, пругка выгінаючы спелыя сцяблiны.

Толькі не радуе гэта багацце вачэй. Не ў час урадзіла жыта. Не ведалі людзі, кладучы зярняты ў старанна абробленую пульхную глебу, што іх праца можа прапасці марна, што буйныя каласы, якія вырастуць з тых зярнят, будуць не радасць выклікаць, а смутак, словы праклёну і нянавісці да варожай навалы.

Ах ты, жыта, жыта!

Аня закручвае перавясла, выпростваецца. Вакол поле — залатое бяскрайняе мора — перакатваецца хвалямі, шапоча. Упершыню яно тут красавалася загонамі, упераможку з палоскамі, якія таксама былі ўжо дзе-нідзе калгаснымі. Вясной уступіла ў калгас і Арына,— і вось давялося зноў вярнуцца на сваю палоску.

— Стамілася? — пытаецца Арына ў Ані.

— Не... Пасядзець хачу.

Яна садзіцца на сноп. Не горнецца ў Ані душа да гэтай працы, да цішыні. Арына жне павольна, не спыняючыся. А Аня думае пра танкістаў, пра камбата Бродкіна, што ляжыць у зямлі пад Полацкам. Хіба ж можа яна пасля ўсяго, што прайшло за гэтыя дні цераз сэрца, жыць так — жаць сабе жыта паціху.

Эх, чаго яна вярнулася сюды, чаму яна не пайшла далей на ўсход?.. Яна марыла тут знайсці справу, сапраўдную справу, а замест гэтага жне жыта.

Што ж, гэта — дзень-два, а потым яна знойдзе тую справу, быць не можа...

Потым у яе памяці паўстае вобраз маці. Яна бачыць сіняватыя матчыны вочы, сумныя і вільготныя, што пазіраюць на яе з пяшчотай. І Ані ў каторы раз успамінаецца апошняе развітанне — ясная, залітая сонцам раніца за сялом. Як яна, маці, журботна глядзела на Аню, нібы ведала, што больш не прыйдзецца спаткацца.

«Мама, мама!.. Любая, родная мама! Каго я так любіла, як цябе. І хто столькі радасці і горычы зрабіў табе, як я, твая неспакойная дачка. Даруй мне, мама!..»

І не заўважыла, як ажылі, наплылі, пайшлі ўспаміны, сёння асабліва шчымлівыя і горкія.

Эх вы, бесклапотныя дні дзяцінства, што адляцелі сном так рана. Матчыны пяшчоты — як вясновыя, ясныя праменьчыкі!..

Згадалася, як маці шыла новую сукеначку, калі яна, Аня, стала хадзіць у школу. Згадалася, як, вярнуўшыся дахаты, узбіралася на матчыны калені, пыталася:

— Мама, а чаму нас вучаць па-чужому гаварыць? Чаму там не гавораць так, як дома?

— Бо там... чужыя настаўнікі.

— А чаму там чужыя настаўнікі? Хіба ў нас сваіх няма?

— Ёсць і свае, дачушка. Толькі ім не дазваляюць вучыць...

Анька тулілася да роднага пляча, дапытвалася:

— А чаму не дазваляюць?

— Таму, што паны хочуць, каб тут былі іх парадкі... Каб усё па-іхняму.

— Ну і хай не дазваляюць. А ён бы ўзяў ды і ўсё роўна вучыў па-нашаму.

— Нельга, дачушка. Яго б пасадзілі ў турму... Або як... тату нашага...

Маці больш не гаварыла, моўчкі гладзіла белую галоўку дачкі. Пачынала моргаць вачыма, што станавіліся бліскучымі, закрывала іх, адварочвалася. Анька прыціскалася галоўкаю да матчыных грудзей і не дыхала.

Згадалася: маці век гаравала па яе, Аніным, бацьку. Аня сама не помніла яго; маці казала: у той час, калі яна, Анька, нарадзілася, бацькі не было дома, быў на вайне, і вярнуўся, калі ёй было паўгода. Агародамі, хаваючыся

падышоў да хаты, прынёс з сабою з роднай Чырвонай Арміі рускую вінтоўку, увечар змазаў яе, абгарнуў анучамі і схаваў у застрэшшы ў хляве.

Жыць ім было неспакойна: улада белай Польшчы, што запанавала нібы навек, не забыла, што бацька на фронце біўся супраць яе. Праз год наведаліся гайнёю — перакапалі, раскідалі ўсё ў хаце, на двары, у хляве, чагосьці шукаючы. Потым звязалі бацьку рукі за спіною і павялі, лаючыся, штурхаючы ў спіну карабінамі.

Назад бацька не вярнуўся...

Успомніла, як упершыню разлучылася з мамаю. Мама адвяла яе да Рыгора Лельчука, далёкага іх родзіча і першага багацея на ўсю вёску. Аньцы дазвалялі хадзіць у школу, увесь іншы час яна павінна была нянчыць дзіця гаспадара. Да заняткаў яна цяпер мала рыхтавалася, а часта і зусім прыходзіла непадрыхтаваная. Настаўнік лаяўся і гразіўся выкінуць яе са школы.

Дома злаваў Ляльчук,— яму не падабалася, што нянька, якая есць яго хлеб, ходзячы ў школу, марнуе час.

— Або школу пакінь, або ідзі ад мяне. Мне трэба няньку, а не дармаедку...— сказаў ён аднойчы.

Анька сабрала свае лахманы і вярнулася дамоў. Маці спаткала яе занепакоена. Паслухаўшы дачку, яна заплакала, а калі выплакалася, накінула на галаву хустку, пайшла да Рыгора. Вярнуўшыся, сказала:

— Трэба ісці назад, дачушка. Ён больш не будзе так, ён сказаў мне.

Правяла на ганак, прытуліла пяшчотна да грудзей і ўздыхнула.

Яна часта наведвалася. І кожны раз што-небудзь прынясе: ці сшытак, ці кніжку, ці гасцінец які. Сядзела ў каморцы, на ложку, дзе спала Аня, і ўсё пыталася, як яна вучыцца, ці не думае, не дай бог, кідаць школу, ды настаўляла:

— Вучыся, дачушка, вучаным усюды дарога... От, што я, невучоная?!

Тады з імі звычайна сядзела і Рыгорыха. Аня ведала, што Рыгорыха баялася, каб маці чаго не ўзяла ў яе. Анька чырванела ад сораму і абурэння: як яна можа думаць такое пра яе маму!..

Рыгорыха адрывала Аньку ад маці, прыдумляла знарок якую-небудзь работу...

«Эх, чаго гэта ўсё ўспамінаць»,— схамянулася Аня. Яна паволі перавязала хустку, устала са снапа, выпіла з гладышкі цёплай вады і падалася да сястры жаць...

Пасля полудня Аня пайшла ў лес, па ягады.

Хораша летам у лесе! Стаіць млосная, з густым пахам соснаў і ягад, цішыня. Не варушачыся, дрэмлюць зялёныя іголчастыя лапкі, як раса, блішчыць смала. На палянцы — чырвоныя россыпы суніц. Буйныя, як клубнічныя, галоўкі суніц усцілаюць яркім агнём зямлю.

Аня збірае ягаду за ягадай у вязаны лазовы кораб, час ад часу кладзе сунічку ў рот. «Тут можна набраць адразу поўны кораб,— падумала Аня.— Пэўна, ніхто і не быў тут».

Аня любіць і ведае лес. Ёй тут, у гэтым вялізным лесе, бадай, знаёмая кожная паляначка, кожная сцяжынка. Яна яшчэ малой, бывала, цэлымі днямі прападала ў лесе, заміраючы ад страху, хадзіла па цёмных сцежках, забіралася ў гушчары.

За дрэвамі ў цемры ёй маляваліся страшныя здані, ваўкі, мядзведзі, але неадольная сіла вабіла ў загадкавую глыбіню.

Далей, за палянкай, наігліцы і ў траве Аня заўважыла ўмяціны. Сляды ад ботаў. Аня знайшла на пясчанай лапінцы два ясныя адбіткі: дзяўчыне здалося, што невядомцы былі ў вайсковых ботах.

Ззаду хруснула. Яна азірнулася і ўбачыла высокага чалавека ў вайсковым адзенні з партупеяй цераз плячо, без шапкі. Бялявыя густыя валасы рэзка аддзяляліся на чырвоным загары шырокага лба.

Чалавек уважліва пазіраў на яе. Усміхнуўся.

— Добры дзень!

Падышоў, узяў ягад з кораба.

— Смачныя ягады! — пахваліў, неўпрыкметку ўсё прыглядваючыся да Ані.

— Бярыце яшчэ,— сказала Аня.

Вайсковы чалавек моўчкі ўзяў яшчэ жменю і стаў кідаць у рот. Чалавек быў няголены, і гэта надавала яму пажылы выгляд, насуперак маладому позірку вачэй.

Кінуўшы ў рот некалькі ягад, незаёмы прамовіў:

— Добрыя ягады. У нас, бадай, горшыя.

— Дзе гэта ў вас?

— Там,— чалавек махнуў рукою.— Далёка.

На баку яго ў кабуры ляжаў пісталет ТТ.

— Адкуль сама? — гледзячы ў вочы, проста, з прыяцельскай ноткай, нібы ён яе ведае, запытаўся чалавек.

— З Чапліч.

— З Чапліч?.. Далёка адсюль да іх?

— Кіламетры два.

Ён пацікавіўся, ці ёсць немцы ў сяле, дзе яны стаяць. Аня, расказаўшы пра гэта, запыталася:

— Туды ідзяце? — Яна махнула на ўсход.

Чалавек узяў суніц у руку, кінуў некалькі ў рот, кіўнуў галавою.

— Дзе тут лепш ісці на Полацк?

Аня адказала. Потым уласцівым ёй пачуццём адчуўшы, што гэты чалавек сапраўды свой, што яму патрэбна дапамога, яна без усякай перасцярогі адразу заявіла:

— Я магу вас правесці...

Чалавек, відаць, здзівіўся такому хуткаму рашэнню, але нічога не адказаў,— ён таксама рызыкаваў і не ведаў: верыць ці не верыць гэтай незнаёмай дзяўчыне, якая сама набіваецца ісці ў небяспечны шлях.

А дзяўчына, не даючы разважыць, меркавала ўжо спрытна:

— Вы тут застанецеся. Або не, лепей пройдзем бліжэй да сяла. Там ёсць адно глухое месца — ніхто не ўбачыць. А я пайду ў сяло, занясу ягады, скажу сястры, каб не чакала і не трывожылася. А ўвечары мы выйдзем, добра?

Аня, не чакаючы згоды, узяла кораб і павесіла на плячо. Яна не любіла марудзіць.

— А калі я цябе зараз завяду ў паліцыю? — чалавек узяў Аню за руку.— Можа, я правакатар?

— Вы — правакатар? Вы — лейтэнант, засталіся ў акружэнні. Тут недзе недалёка ад вас хаваюцца некалькі байцоў вашых.

Лейтэнант здзівіўся зноў, але стараўся не выдаць гэтага.

— Чаму вы так думаеце?

— Таму, што тут ёсць сляды не толькі вашы, і яшчэ — таму, што дрэнны той лейтэнант, які застаўся адзін... А вы, здаецца, не такі... А што вы мяне палохаеце — гаворыць аб тым, што вы не ўпэўнены. Не верыце мне... Не бойцеся, я не падвяду!

І чалавек згадзіўся. Гэтай бялявай, худзенькай дзяўчыне нельга было не верыць.

...Увечары, ледзь трохі сцямнела, Аня выйшла з сяла.

У лесе яна сустрэлася з лейтэнантам, з якім было пяцёра байцоў.

Усю ноч без супынку ішлі па сцежках, а то і проста па полі, мінаючы вёскі, варожыя паліцэйскія пасты. Калі добра развіднелася, яны былі ўжо на ўскрайку лесу, за невялікім мястэчкам, кіламетраў за трыццаць ад сяла.

— Дай руку, сястра,— сказаў адзін з байцоў.— Дзякуй табе... Жыць буду — не забуду.

Ён памаўчаў, відаць, яшчэ хацеў штосьці сказаць, але не сказаў нічога, а раптам сціснуў Аніну далонь так, што занылі пальцы.

Другім стаў развітвацца лейтэнант.

— Дзякую, Анна Іванаўна. І ад мяне, і ад усіх.

Аня перабіла яго:

— Нашто дзякаваць столькі? Хіба ж я магла інакш? Якая трэба яшчэ падзяка — толькі б дайшлі...

— Так, дайсці б. Далёка вельмі!

— Слухай, Анна Іванаўна,— загаварыў лейтэнант,— думаю, не памыляюся, што кажу гэта. У лесе за Паставамі я захаваў вінтоўкі. Людзі палеглі... А вінтоўкі я падабраў і закапаў. Патрэбны будуць, можа, каму-небудзь з нашых — аддай іх...

Ён выняў з кішэні лісток паперы.

— Тут напісана, як знайсці тое месца.

Ён даў паперку, зашпіліў кішэню і адразу прамовіў да сваіх:

— Пайшлі.

Яны хутка зніклі ў росных кустах. Ані, калі яна, трымаючы ў руцэ паперку, засталася адна, зрабілася раптам журботна, нібы рассталася з сябрамі.

Гадзіны дзве Аня перабыла ў лесе, што абуджаўся ад начной цішыні, а потым, як угрэла сонца, падалася назад. Яна адчувала сябе змарнелай. Бяссонная ноч і трыццацікіламетровы начны шлях даваліся ў знакі. Балелі ногі, і яна некалькі разоў садзілася адпачываць.

Дадому Аня дабралася толькі пад вечар.

**III**

Ішлі дзень за днём, аднастайныя, здавалася, незвычайна доўгія і пустыя. Аня ўсё таксама ж хадзіла на поле, на агарод, старалася дапамагчы Арыне, і ўсё таксама ж за ёй услед хадзіла адчуванне адзінокасці, адарванасці, спусцеласці і непакой аб тым, што трэба штосьці рабіць, штосьці рабіць для тых, што на фронце, для той вялікай справы, якая чакала яе.

Дзе хлопцы, дзе Андрэй? Вось каго б знайсці, вось хто б даў ёй справу...

Але ішлі дні,— хутка тыдзень будзе,— а яна не магла знайсці нікога і вымушана была сядзець, адна, адна...

І вось зноў знайшлася справа.

— Анечка,— усхвалявана зашаптала Арына,— у жыце тры чырвонаармейцы. Раненыя ляжаць... У сяло не паказваюцца — баяцца, што немцы расстраляюць іх...

— Дзе ў жыце?

— На нашым полі, каля трох бяроз.

— Ты нікому не казала пра гэта? — запыталася Аня.

— Нікому.

— Добра... І не кажы нікому.

«Памагчы ім»,— падумала Аня. Гэтая думка адразу захапіла дзяўчыну, якая не так занепакоілася, як узрадавалася, адчуўшы, што зноў з'явіўся раптам клопат.

— Мы іх перанясём да цябе ў хлеў, добра?

Яна пачне з гэтага... А там... а там будзе відаць, што рабіць...

Як толькі сцямнела, Аня накінула хустку і ціха выйшла з хаты. Услед за ёй стукнула клямкаю, выйшла Арына. «Пайду з табой,— прашаптала яна і, нібы апраўдваючыся, дадала: — Яны ж параненыя, трэба весці».

Мінулі хлеў, між жывога плота з кіяшніку і маку, што буялі на агародзе, выбраліся на прыгуменне. Каля цёмнай сцяны гумна Аня прыпынілася, прыслухалася.

За гумном — поле. Туды хадзіць ноччу забаронена. Стараста гаварыў, што на гэта ёсць строгі загад.

Ці не заўважылі іх? Не, не заўважылі, здаецца.

Ах, якая цішыня вакол. Няўжо ж толькі што змерклася! Калісьці (дзіўна, гэта ж было менш за месяц таму назад, а здаецца, даўно-даўно) у такі час сяло як бы абуджалася пасля дзённай цішыні. Вярнуўшыся з поля, хутка павячэраўшы, збіраліся дзяўчаты і хлопцы каля прызбаў. Усплёсквалі ў начным змроку звонкія маладыя галасы, час ад часу гамонку перабіваў вясёлы дружны рогат або раптоўны віск дзяўчыны...

— Пойдзем? — шэптам прамовіла Аня. Арына ціха адказала:

— Пойдзем.

Аня запыталася ў яе не таму, што вагалася — ісці або не ісці,— Арына ведала, што аб гэтым у сястры не магло быць нават думкі. Аня пыталася, ці не перадумала яна, Арына: Арына — не адна, у яе сям'я...

«Добра, што месяц яшчэ не ўзышоў,— супакоіла сябе Аня.— Трэба хутчэй спяшацца, каб не застаў ён».

Блізка, ледзь не з-пад ног, раптам, як стрэл, вырваўся пагрозны свіст. Арына трывожна прысела.

Лапочучы крыламі, у цемры штосьці праляцела.

— Гэта перапёлка,— сказала Аня.— Ах, каб ты!..

Яны ішлі разораю. Шапаткія каласы чапляліся за Аніны рукі, за адзенне, нібы прасіліся ўзяць з сабою. Але

Аня не заўважала гэтага, яна ўся была апанавана адным клопатам.

Цяпер недалёка. Цяпер хутка, каля трох бяроз.

— Стой, хто гэта?

Перад імі ў змроку ўстала цёмная постаць з вінтоўкай у руцэ.

— Сяргей? Гэта мы.

Чалавек адразу стаў лагоднейшы.

— А, сястра! А я думаў, што не прыйдзеш.

— Я ж казала — прыйду...

— Мала што казала. Рознае бывае...

Яны моўчкі слухалі тое, што гаварыла Аня. Сяргей першы адгукнуўся:

— Павел, Сцяпана панясу зараз я. Бяры гэтую...

Ён падаў Паўлу вінтоўку, узваліў з яго дапамогаю на плячо чалавека, які стагнаў і трызніў.

— Другі дзень так. Амаль непрытомны... Аслаб зусім,— сказаў Сяргей.

Павел дадаў нявесела:

— Плямы нейкія пайшлі па назе і па целе...

Яны падаліся ў вёску. Наперадзе — Аня, за ёй Сяргей са Сцяпанам, потым Арына і апошні — Павел.

Цяпер Ані чамусьці стала спакайней і весялей, Можа, таму, што разам ішлі байцы. А можа, таму, што цяпер яна непакоілася толькі пра іх.

Да прыгумення і цераз агарод перабіраліся па адным, прыгнуўшыся, асцярожна. Спыняліся раз-пораз, слухалі. Цішыня. Каля хлява Аня і Павел, пакінуўшы іншых, прыпалі да чорнай сцяны, яшчэ раз азірнуліся.

Цьмяна чарнелі поблізу купы дрэваў, высокіх, вастраверхіх, і нізкіх, раскідзістых, якія ціха, але неспакойна шумелі.

І вось яны ўсе ў хляве, на палацях, агорнутыя цемраю і духмяным, казытлівым пахам сена. Двое ляжаць, а Сяргей сядзіць поруч з Аняй. Арына пайшла ў хату, непакоячыся, ці не прачнулася Лорка.

— Сястра,— прашаптаў Сяргей,— як ты думаеш,— надоўга гэта ў яго, з нагой?

— Заўтра пагляджу рану, скажу.

— Эх, каб вылечыць хутчэй! Нельга цяпер нам сядзець...

— Што ж, ён застанецца пакуль.

— Нельга, сястра. Мы з ім на адным самалёце ляталі. Разам гарэлі... Пад Шаўлямі была такая справа... Ад немцаў, на зямлі, разам адбіліся. Там яму і пашкодзілі нагу. Я на сваіх плячах яго, можа, дзвесце кіламетраў нясу. Проста аж сам дзіўлюся, з чаго я такі цягавіты зрабіўся? Гэта ж не жарты — цэлы бамбардзіроўшчык, можна сказаць, на карку,— нявесела пажартаваў Сяргей.— Ён у нас быў чэмпіёнам па боксе ў часці — па цяжкай вазе.

Аня маўкліва слухала. Яна ўспамінала знаёмых сваіх танкістаў, маёра Бродкіна, гай пад Полацкам, каля якога вёў бой і згарэў апошні ў батальёне танк... І ёй было прыемна слухаць побач сіплы, крыху насмешлівы голас лётчыка,— гэта быў такі ж самы чалавек, як і тыя, з якімі яна спазнала горыч адступлення і боль страты. Яна адчувала сябе такой, якой была з танкістамі. Той жа звычны абавязак.

А галоўнае, справа — важная, патрэбная.

— Сястра, нашы далёка цяпер.

Ён так гаворыць, што не зразумееш, ці ён гэта проста кажа, ці пытае. Пытае, мусіць. Што яму адказаць? Сказаць праўду, што гітлераўцы ўжо за Полацкам, ці зманіць?

Не, такому нельга маніць.

— Далёка.

— Мусіць, ужо каля Полацка?

— Далей. Полацк у іх...

У хляве хутка пасвятлела, праз шчыліны прарэзаліся белыя вострыя нажы святла — узышоў месяц.

— Трэба ісці ў хату,— узнялася Аня.

— Сястра, прынясі махры... Смаліць нешта ў грудзях.

— Прынясу.

Яна прыадчыніла вароты — толькі б не зарыпелі. Выглянула ў шчыліну: нікога, цішыня. Праціснуўшыся, зачыніла хлеў, хвіліну пастаяла ў цені пад страхою. Цяпер можна ісці.

## IV

На наступны дзень Аня агледзела Сцяпанаву рану. Правая нага, на якой вышэй калена гнаілася рана, распухла і пакрылася фіялетавымі плямамі, біў моцны пах гніення; плямы былі ўжо і на бядры. Сцяпан трызніў.

«Гангрэна».

Яна зразумела, што цяпер позна ўжо лячыць, што яна бяссільна дапамагчы чым-небудзь, і ёй стала горка.

— Ён паправіцца? — трывожна шапнуў Сяргей, спасцярожліва зірнуўшы на Аню.

— Паправіцца...— Аня схамянулася, пачала хутка перавязваць рану.

Скончыўшы перавязку, яна стала адразу спускацца па лесвіцы ўніз, не гледзячы ні на кога, нічога не гаворачы нікому. Сяргей палез услед.

— Кепска?

— Кепска. Ніякай надзеі. Памрэ.

— І нічога нельга зрабіць?

Аня не адказала. Узяла пустое вядро і выйшла на двор.

Увесь гэты дзень яна была як бы прыглушаная. Некалькі разоў прыходзіла да хлопцаў, праведвала Сцяпана: яму станавілася ўсё горш і горш.

Увечары ён памёр.

Сяргей падняў таварыша на плячо, вынес яго ў поле, да тых жа трох бяроз, дзе яны ляжалі ўчора. Аня прынесла рыдлёўку.

Капалі зямлю і хавалі Сцяпана моўчкі. Павел амаль увесь час курыў.

— Ну вось, далей пойдзем? — сказаў раптам Сяргей Паўлу.

— Пойдзем. Чаго ж сядзець.

Яны не захацелі, каб Аня праводзіла: самі знойдуць, карта і компас ёсць.

Вярнуўшыся апоўначы ў хату, дзе чакала сястра, Аня, як ніколі раней, адчула сябе пакінутай і адзінокай.

17. Зак 1877

## V

Дні цягнуліся нудныя, доўгія. Яна хадзіла па-ранейшаму на поле, у лес, і ўсё чакала, чакала, марыла, што ўсё гэта зменіцца, што знойдзецца справа, сапраўдная справа.

Аднойчы пад вечар прыехала ў сяло варожая калона. Тры салдаты, гамонячы аб нечым, рагочучы, накіраваліся ў хату. Арына спалохана замерла. Адзін немец, высокі, з вострым падбародкам, загадаў даць вядро. Аня бачыла, як ён выйшаў на двор, выцягнуў вады са студні, стаў заліваць у машыну.

Калі ён вярнуўся, паставіў вядро на лаўку, Аня запыталася:

— Далёка фронт? — Заўважыўшы, што салдат не зразумеў яе, дадала: — Саветы, бальшавікі — далёка?

— Далёка...— адказаў за яго другі, маладзенькі, блакітнавокі, збіраючыся ісці.— Смаленск ёсць нямецкі, цяпер хутка Масква.

Ён стукнуў у грудзі.

— Будзем хутка там...

«Няўжо Смаленск ужо ўзялі? І на Маскву ідуць? Быць не можа»,— думала дзяўчына, сочачы, як яны ходзяць каля машын.

Хоць яна і не хацела верыць у гэта, ёй было трывожна. Да поўначы гаманіла Аня з Арынай, перабірала тое, што было, намагалася вызначыць, што будзе.

— Ты чакай. Бачыш, што робіцца,— супакойвала сястру, раіла ёй Арына.— Ты што, ты чалавек маленькі, дзяўчына... Што ты можаш зрабіць?

— Не магу я сядзець, Арына,— горача дыхала ў твар сястры Аня.

— А ты патрывай... Пара цяпер такая, што жыві ды аглядвайся. І галаву згубіць нядоўга. Яшчэ дзякуй богу, што не чапляюцца да цябе — усе ж ведаюць, што... настаўніца.

— Не магу я так! Не магу, ты разумееш?

Уранку Арына прыбегла ад суседкі і сказала ўстрывожана, што на дарозе каля Купін падарвалі машыну з гітлераўцамі, што дзевяць салдат забіта.

Аню гэта вестка ўсхвалявала па-свойму. Значыцца, ёсць людзі, што не марнуюць часу, не сядзяць так, як яна. Дзе яны, як іх знайсці?

Зноў нецярпліва, з надзеяю ўспомніла яна Андрэя Віткоўскага. Як з ім звязацца? Андрэй жыў раней з бацькам, але бацькі ўжо няма... Хто ж можа ведаць пра Андрэя? Цётка?

Вярнуўшыся ў прыцемках з поля, яна зайшла да Андрэевай цёткі.

— А хто ж яго ведае, дзе ён, вісельнік,— неспадзеўкі, злосна размахваючы рукамі, амаль закрычала цётка.— Ён і бацьку да згубы давёў.

— Не ведаеце? — не паверыла Аня: ёй здавалася, што старая лаецца няшчыра.

— От што! Калі табе жыццё надакучыла, то ты як сабе хочаш. А мяне не чапляй!

Аня пагаварыла яшчэ з адной жанчынай, муж якой калісьці сябраваў з Андрэем і, мусіць, недзе хаваўся тут,— жанчына таксама нібы не ведала нічога пра Віткоўскага. Некалькі разоў Аня хадзіла ў лес, дзе б маглі быць тыя, каго ёй так хацелася бачыць, але не знайшла нікога. Вяртаючыся аднойчы, яна наткнулася на гітлераўцаў,— добра, што несла ягады, не затрымалі яе, забралі ягады і пусцілі.

І вось, калі Аня ўжо амаль страціла веру ў тое, што хутка ўдасца знайсці сляды партызан, Андрэй аб'явіўся сам.

Вечарам, калі Аня, напаіўшы карову, выходзіла з хлява, яе хтосьці ціха гукнуў з цемры. Яна паставіла вядро, зайшла за рог хлява.

— Хто тут?

Яна пазнала хто — па голасе, але яшчэ не верыла,— вельмі ж доўга яна чакала! Перад ёй чарнела постаць, і хоць было цёмна, яна адчувала — яго постаць!

— Добры вечар, Аня,— проста сказаў ён.

Яна прывіталася. Столькі думала раней пра яго і ў думках столькі гаварыла яму, але тут тыя словы кудысьці вылецелі. Ён загаварыў першы: пачаў распытвацца, чаму яна вярнулася, дзе была гэты час, што рабіла.

— Я толькі ўчора даведаўся, што ты вярнулася.

— Кепска ж у цябе, відаць, разведка працуе.

Ён адказаў:

— У разведкі ёсць другія задачы...

— Вядома. Толькі штосьці вы так замаскіраваліся, што і не знайсці вас.

— Затое мы ўсіх, каго трэба, знаходзім... Але я прыйшоў не для таго, каб спрачацца. У мяне, Аня, ёсць справа. Важная справа. Зробіш?

Аня знарок памаўчала, як бы раздумваючы.

— Важная? Якая?

— Трэба пайсці ў горад, Аня... Мы хочам звязацца з нашымі людзьмі, што там працуюць. Яны табе раскажуць, як там справы... Мы ўсё не можам наладзіць сувязі... Ты зможаш пайсці?

— Добра,— сказала Аня.— Зраблю.

— Ты, Аня, улічы: зрабіць гэта не проста, задача твая небяспечная. Я табе дам тры адрасы, але ты будзь там асцярожна. Ёсць весткі: наладжвалі гэтыя дні аблавы. Можна наскочыць на засаду.

Аня слухала яго родны голас і адчувала не трывогу, а радасць, такую, якой яна не ведала з таго часу, як вярнулася.

— І калі можна — дастань, Анечка, медыкаментаў. Бінтоў, ёду, яшчэ чаго, што ўдасца. Да зарэзу трэба, разумееш?

Яна кіўнула галавой.

— Не падвядзеш? — Ён дадаў: — Не баішся?

Ён і раней быў задавака, а тут, калі яна апынулася ў такім становішчы, стаў яшчэ больш задзіраць нос. Падумаеш, калі ён партызан, калі ў яго вінтоўка, дык можна яму і крыўдзіць. «Не баішся?» Гэта яна збаіцца?

— Мог бы не гаварыць глупства. Скажы лепш — праўда, што немцы ў Смаленску?

— Не ведаю, Анечка. Газет і ў нас няма.

— Немец быў тут, выхваляўся, што занялі Смаленск, на Маскву ідуць... Я — чаго перадумала... а ты... эх ты!

— Не крыўдуй, Анечка, я так — к слову,— сказаў ён, нібы апраўдваючыся, і стаў шэптам дамаўляцца, дзе і калі яны спаткаюцца.

Калі ён пайшоў у цемру, Аня стаяла, глядзела ў яго бок,— доўга пасля таго, як ён знік з вачэй.

Яна адчувала, што ў яе жыцці толькі што адбылося тое вельмі важнае, якое яна чакала і аб якім яна марыла.

Скончыліся пошукі. Скончылася адзінокасць.

## Незнаёмы

У пакоі быў адзін Слава. Заклапочаны, вельмі сур'ёзны чалавек гадоў шасці, з малатком і абцугамі поўзаў вакол грузавічка, правіў машыну, што, відаць, сапсавалася. Грузавічок, змайстраваны з дошчачак, на бярозавых колцах, стаяў пасярэдзіне пакоя, на дарозе да канечнага пункта — кутка між печчу і дзвярыма. Хоць грузавік быў многа меншы за шафёра і хоць у кузаве ляжала толькі некалькі трэсачак ды старая шрубка, чалавек рабіў не на жарт — і стукаў малатком, і круціў колцы, і гуў.

Ці дзіва, што машына праз якую хвіліну гатова была зноў рушыць у дарогу, і яна б, вядома, рушыла, калі б у той момант не адбылася падзея, зусім нечаканая для Славы. Поўны клопатамі, шафёр не аддаў ніякай увагі таму, што ў кухню хтосьці ўвайшоў. Ён адарваў позірк ад грузавіка толькі тады, калі дзверы адчыніліся і на парозе нехта паявіўся, вядома, маці або бабуля. Ён гатоў быў ужо забыць грузавік, кінуцца паглядзець, што яны прынеслі,— але адразу ж асеў здзіўлены.

Чалавек быў незнаёмы, у вайсковым шынялі, з чамаданам у руцэ, са скураной сумкай на баку. Не паспеў Слава агледзець незнаёмага, як той дзіўна тузануўся, крыкнуў страшна: «Слава!» Выпусціў чамадан, хутка ступіў насустрач, схапіў яго, ускінуў на дужых руках і прыціснуў да шыняля так, што ў малога ледзь не зайшлося сэрца. Праз хвіліну незнаёмы зноў паглядзеў на Славу страшна і раптам, колючыся, пачаў прагна цалаваць шурпатымі губамі — лоб, шчокі, шыю.

Гэта было хоць і непрыемным, але такім дзіўным, неспадзяваным, што Слава адно моўчкі трываў, не мог апамятацца.

— Слаўка... Сыночак...— вымавіў вайсковы хрыпла, так, нібы яму балела.

Слава момант яшчэ патрываў пад позіркам, ад якога было нядобра, боязна, рукамі ўпёрся ў чужы няголены твар, паспрабаваў вызваліцца.

— Чаго ты, сынок?

— Так...— Чорныя пукатыя вочы малога былі строгія, нават непрыхільныя, але незнаёмы не паслухаўся, не расчапіў рук.

— Пагана табе?

— Пусці!

— Чаму?

— Так...

Незнаёмы лагодна, як бы тлумачачы, сказаў:

— Я ж твой бацька...

Малы нібы не чуў, зноў паспрабаваў вырвацца.

— Бацька — разумееш?

— Пусці! — не разумеў, не жадаў разумець, ірваўся яшчэ мацней Слава.

Незнаёмы хацеў усміхнуцца, але ўсмешка выйшла такая, быццам ён скрывіўся.

— Ну што ж...

Ён паставіў Славу на падлогу, адпусціў. Малы адразу, як звярок, што пачуў волю, шыбануў у куток, дзе быў ложак, прыціснуўся, дзікавата азірнуўся.

Незнаёмы не бег услед, не збіраўся, здаецца, зноў хапаць яго, але Слава, у якім быў яшчэ такі жывы ўспамін пра грозны палон, сачыў нямірна, недаверліва, гатоў быў у любы момант нырнуць пад ложак.

Вайсковы агледзеўся, нібы чагосьці шукаў і не знаходзіў.

— А мама дзе? На занятках?

Малы адказаў не адразу, быццам баяўся, што, калі скажа, трапіць зноў у якую-небудзь бяду.

— Пайшла ў магазін...

— Хутка вернецца?

— Хутка...

— А баба Анісся дзе?

— Па перац пайшла...

— Пазычыць?

— Ага...

Незнаёмы зноў агледзеўся, але ўжо не шукаючы нікога, а так, як бы перад ім было незнаёмае месца. Ён нібы хацеў штосьці ўспомніць і не мог, і стаў задуменны, сумны.

— Што ж, хоць ты і не прызнаешся,— сказаў ён усё з той жа задуменнасцю,— я ўсё-ткі буду як дома...

Ён зняў цераз галаву сумку, паклаў на лаву, пачаў расшпільваць шынель, і Слава ўбачыў, як на гімнасцёрцы штосьці весела бліснула. Гэта былі ордэны, і калі б Слава не страшыўся так незнаёмага, ён, вядома, падышоў бы, паглядзеў бліжэй на іх, пакратаў бы. Але яму было боязна, і нават калі ён глядзеў на іх здалёк, то не забываў, што трэба быць напагатове.

— Чакай! — схамянуўся, павесялеў незнаёмы.— Ледзь не забыў!

Ён падбег да чамадана, адамкнуў, выхапіў адтуль дзіўную чырвоную дошчачку ці скрыначку. Зірнуўшы на Славу, ён першы момант намерыўся быў аддаць яе тут жа, але перадумаў, важны, як бы зараз хацеў быў адкрыць штосьці тайнае і вельмі цікавае, паднёс скрыначку да рота. І адбылося, праўда, дзіва — скрыначка зайграла! Зайграла, як гармонік!

Слава на хвіліну забыўся аб усім на свеце, толькі глядзеў на скрыначку, толькі слухаў.

— Падабаецца? — сказаў незнаёмы і працягнуў цудоўную скрынку Славе.— Гэта табе!.. Губны гармонік!..

Слава мімаволі падаўся ўзяць гэты цуд, але, ступіўшы крок-другі,— спыніўся. Не тое, каб не верыў ён, што цуд гэты дастанецца-такі яму, а страх нейкі, асцярога зноў узялі яго.

— Бяры! Не сумнявайся! Табе належыць!

Незнаёмы сам падышоў, даў у руку скрынку. Слава ўзяў яе, але ні адным знакам не паказаў, што ў яго што-небудзь

змянілася да ваеннага. Нават нібы і не вельмі ўзрадаваўся падарунку, вярнуўшыся зноў у куток, разглядаў ён скрыначку са здзіўленнем і недавер'ем, як бы яна была і не яго. Нават паспрабаваць, ці ў яго зайграе таксама, як у вайсковага, не наважыўся.

І ўсё ж, хоць у Славы і не было якой-небудзь прыхільнасці да незнаёмага, ён, гэты вайсковы, не здаваўся ўжо такім страшным.

Перад ім было як бы трохі ніякавата за сваю непадступнасць, з ім хацелася, хоць і з асцярогай, пагаварыць.

Слава памаўчаў, памаўчаў і заявіў:

— Мой тата — у Чырвонай Арміі...

— Ну, правільна,— ахвотна, з надзеяй адказаў незнаёмы,— я быў у арміі!

— А раней, калі вайна яшчэ не скончылася, ваяваў на фронце...

— Правільна, і на фронце ваяваў! — І, мабыць, таму, што Слава на гэтым рашыў і спыніцца пакуль, вайсковы загаварыў лагодна, нібы тлумачачы: — А цяпер мяне звольнілі з арміі, каб я зноў працаваў настаўнікам. Разумееш?.. Вось я і прыехаў дамоў... Казала мама, што я... што бацька прыедзе?

— Казала,— кіўнуў галавою Слава, не гледзячы ўсё ж на таго, хто ўпарта зваў сябе бацькам.

Слава, было відна, не ведаў, што рабіць. Пасля развагі ён падышоў да камода, на якім стаялі дзве фатаграфічныя карткі, зняў іх і не вельмі каб смела наблізіўся да вайсковага.

— Вось гэта — тата...

Вайсковы ўзяў картку, узрадаваўся:

— Ну, правільна! Я і ёсць сам сабою! Не падабаюся хіба?

Слава і не запярэчыў, і не згадзіўся, ухіліўся адказваць, падаў другую картку:

— А гэта мама. І я тут, на руках... І тата...— Калі вайсковы стаў, хвалюючыся, глядзець на картку, Слава дадаў: — Я тады, кажа мама, пешкі пад стол хадзіў...

— Гэта мы былі такія... да вайны... Я, мама, ты...

— Я тады з бацькам на рэчку хадзіў купацца.

— Ты тады і хадзіць не ўмеў, выдумшчык...

Вайсковы хацеў быў зноў узяць яго, але Слава ўраз адступіўся і стаў наводдаль. Было відаць, што ён зноў падрыхтаваўся да небяспекі і не папусціцца нічым, каб ўратаваць сваю волю.

— Ты чакаў бацьку, Слава?

— Чакаў...

— Ну вось. А такі няветлівы!..

Слава не сказаў нічога. Ці чакаў ён тату? Чакаў, яшчэ як чакаў! Але той бацька быў не такі, пра таго гаварыла маці, той быў заўсёды недзе далёка. І яшчэ на картцы... А гэты быў побач, страшна глядзеў на яго, усё хацеў ухапіць, незнаёмы, небяспечны. Зусім не падобны на таго, якога Слава любіў...

У гэты час у кухні стукнулі дзверы, пачуліся хуткія крокі. Не паспеў Слава сказаць, што гэта мама, як маці ўляцела ў пакой, зірнула на вайсковага і нібы акамянела. Адкрыла рот, хапіла паветра, каб нешта крыкнуць, але не здолела вымавіць ні слова. Дзіўная была мама.

Чалавек, нічога не гаворачы, кінуўся да яе, схапіў у абдымкі і пацалаваў у вусны. Хустка з матчынай галавы ссунулася на шыю, чорныя бліскучыя валасы рассыпаліся, ускалмаціліся, але маці ні на што не звяртала ўвагі.

Потым яна прыціснулася галавой да грудзей вайсковага, а той то пяшчотна гладзіў рукою яе, то цалаваў валасы. Слава сачыў са здзіўленнем і непакоем, упершыню даводзілася бачыць, што мама цалуе не яго, а незнаёмага чалавека.

— Сяргей,— нарэшце ціха прамовіла маці, узняўшы галаву і вясёлымі вачыма пазіраючы на вайсковага. Яна зноў пацалавала яго. Пасля маці нечакана адразу засмяялася і заплакала, але Сяргей не супакойваў, а толькі пазіраў на яе і радасна ўсміхаўся.

— Сяргей... хіба ж можна... так доўга... Вочы прагледзела,— сказала маці са слязамі на вачах.— Ой, колькі я чакала цябе! Іду адкуль-небудзь дадому і кожны раз думаю,

што ты, можа, ужо даўно дома сядзіш. Пачую які стук і думаю — гэта ты стукаеш...

Маці выцерла слёзы, адышла ад Сяргея і абняла сына.

— Бачыш, які вялікі Расціслаў вырас! Ён таксама чакаў.

— Дзе там чакаў! Каб чакаў, то спаткаў бы інакш.

— Кожны дзень пытаўся, ці хутка бацька вернецца.

— Вось табе на! А прыйшоў, дык выганяе з хаты,— з хітраватай усмешкай сказаў Сяргей.— Не, кажа, ты не мой бацька, ты чужы. Ідзі, кажа, адсюль.

— Не прызнае? — засмяялася мама.

— Ніяк не хоча прызнаваць.

— Шафёр ты мой дарагі! — пацалавала маці Слаўку і лёгка штурхнула да вайсковага.— Гэта твой тата. Той, пра якога я табе гаварыла... Ён цяпер заўсёды будзе з намі.

Бачачы, як радуецца незнаёмаму бацьку маці, Слава пачаў абыходзіцца з ім больш ветліва. Ён згадзіўся падысці да бацькі, даў сябе ўзяць на рукі і нават не хаваў шчочкі ад пацалунку, хоць бацькава барада і цяпер балюча калолася. Ён адно не мог уцяміць, чаму маці з ахвотай цалуе такую калючую бараду, і быў задаволены, калі бацька пусціў яго.

Хутка прыбегла бабка Анiся. Яна, як убачыла Сяргея, дык пачала і ахаць, і охаць ад радасці, што зяць вярнуўся, называла яго і саколікам, і рыбкаю, і золатцам. А Слаўкава маці паглядзела на іх і зноў пачала плакаць.

— Трэба ж нечым пачаставаць госціка-саколіка,— схамянулася раптам бабка Анiся і дробнымі, частымі крокамі падалася на кухню. Даўгі бабчын андарак ледзь не цягнуўся па падлозе.

Бацька распрануўся, зняў гімнасцёрку, пагаліў бараду. Калі ён прыйшоў на кухню, маці прынесла начоўкі і цёплай вадою пачала мыць яму галаву. Вада ў начоўках зрабілася чорнаю, нібы там разбавілі фарбу.

— Глядзі, якая вада цёмная стала, неахайны ты,— засмяялася маці, быццам радавалася, што вада такая чорная. Сяргей, не ўзнімаючы галавы, адказаў:

— Дзіва што чорная! З самага Дрэздэна не мыў. Закурыўся, як чорт у пекле.

Бацька пайшоў з кухні і, выціраючы галаву ручніком, у сарочцы зноў хадзіў па пакоі і разглядаў карткі на сцяне, сшыткі на стале, кнігі. Усё яму хацелася пакратаць сваімі пальцамі, патрымаць у сваіх руках. Павесіўшы ручнік, ён падышоў да Славы.

— Ну дык як, прызнаеш цяпер мяне?.. Устрымліваешся? Ты бачыш, маці, не хоча прызнаваць!.. Ну што ж, будзем нейтралітэт захоўваць. Усё-ткі нейтралітэт лепш, чым варожасць...

Ён узяў Славу на рукі.

— Эх, а хлапчына які вялікі вырас за гэтыя чатыры гады, маці! Сапраўдны мужчына!

— Мужчына, канешне...

— І нацярпецца давялося як даросламу...

— Ды ўжо ж хапіла... За адны тыя два гады, што я ў партызанах была, чаго толькі не пабачыў: і холаду, і голаду, і ў блакадзе гібеў. Бывала, спалі на сырой зямлі ў холад. Як толькі ён і выжыў. Усяго паспытаў... Толькі вось бацькавай ласкі не бачыў...

— А за што табе ордэн далі? — нечакана перабіў Слава матчыну гаворку. Яго вельмі цікавілі гэтыя два бліскучыя ордэны, якія ён бачыў на бацькавай гімнасцёрцы, што ляжала цяпер на ложку.— За смеласць?

— За смеласць,— адказаў бацька.

— А Васеў бацька за смеласць атрымаў медаль. Толькі ён называецца «За отвагу». Ты таксама танк гранатай падбіў?

Бацька сказаў, што ён камандаваў артылерыйскай батарэяй і што батарэя падбіла сем танкаў.

— Ого-го! Аж сем танкаў! — матнуў галавой Слаўка.— «Тыграў»?

— І «тыгр» быў адзін. І «пантэру» прадзіравілі.

— І «пантэру»? Ты, значыць, яшчэ смялейшы за Васевага бацьку?!

Слава з пашанай паглядзеў на таго, каго звалі бацькам. Цяпер Слава ўжо не баяўся яго, ён, аказваецца, зусім не страшны, з ім нават цікава. І які ён смелы, аказваецца!

— А колькі ты разоў быў ранены?

— Два.

— А Васеў бацька пяць разоў,— не схаваў неспадзяванай зайздрасці Слава.

Пазней — на дварэ ўжо быў вечар — пачалі сыходзіцца людзі. Ніколі яшчэ не збіралася за ўсе гады Слаўкавага жыцця столькі людзей у гэтую хату. Было многа знаёмых і незнаёмых, суседзі былі, настаўнікі, бацькавы таварышы, партызаны, з якімі маці разам ваявала. Прыйшоў кульгавы Апанас — вартаўнік, з дручком, які паставіў у кутку, каля дзвярэй. Усе вельмі радаваліся таму, што Сяргей Антонавіч вярнуўся ў родны кут, віншавалі яго і абдымалі. Сэрца Расціслава Сяргеевіча пры гэтых знаках пашаны перапаўнялася пачуццём гонару за свайго бацьку. Вось ён які любімы і паважаны чалавек!

Потым гасцей пасадзілі за стол. Маці ўстала і падняла поўную чарку, і ўсе таксама ўсталі.

— Вып'ем першую чарку за сустрэчу!.. Каб жыць без ростані доўга і шчасліва! Каб не расставацца ніколі!

— Добра сказала. Малайчына, Марыйка! — Бацька ўстаў і чокнуўся з ёй, а потым з усімі гасцямі.

— Значыцца, каб жыць без ростані і шчасліва!

Усе выпілі і селі на месца.

«Як добра, што вярнуўся тата!» — падумаў Слава. Упершыню паглядзеў ён на бацьку вачыма, якія ззялі ад шчасця і захаплення...

Раптам ён тузануў маці за рукаў і ціха, тонам змоўшчыка, каб ніхто не чуў, зашаптаў:

— Ма-ам! Дык гэта праўда... наш тата? Чэснае слова?

— Чэснае слова — твой...

— Добры ў нас тата!.. Праўда?

— Праўда,— згадзілася маці, чамусьці весела засмяялася і пацалавала ў лоб.— Добры!

## Таварышы

### I

— Больш ніхто не хоча выступіць? Ніхто... Тады будзем галасаваць. Ёсць адна прапанова — абвясціць вымову. Хто за яе — падыміце рукі...— Гаўрыльчык, які быў за старшыню сходу, стоячы за сталом, абвёў позіркам пяцярых чалавек, што сядзелі ў пакоі.— Усе. Апусціце рукі. Аднагалосна... Абвяшчаем вымову...

Хвіліну была неспакойная цішыня. Хтосьці варухнуўся, важка зарыпела крэсла.

Гаўрыльчык узяў са стала лісток, на якім быў напісан парадак сходу, каб прачытаць другое пытанне,— Баклан падняўся і павольна пайшоў да дзвярэй.

— Ты куды? — пачуў ён ужо за спіною голас Гаўрыльчыка.

— Пакурыць...

Баклан стараўся ісці спакойна і ўпэўнена, як чалавек, які не зважае на тое, што пра яго гавораць, ведае сабе цану. Вайсковыя хромавыя боты яго стукалі цвёрда і моцна, і ўсе, хто быў на сходзе, павярнуліся на гэты стук і сачылі ўслед.

Бразнуўшы дзвярыма, ён апынуўся ў цёмным калідоры сам-насам. Спыніўся, закурыў, але, разы са два пацягнуўшы, кінуў папяросу на падлогу і наском бота расцёр. Мімаволі падумаў, што хоць і хацеў здавацца на сходзе спакойным, усё-такі хваляваўся, пераживаў. Прыкра было адчуваць, што іншыя заўважылі ўсё гэта, і ён цяпер лаяў сябе ў думках.

З пакоя даходзіў роўны, сіплы, нібы прастуджаны, голас Зубца, парторга. Баклан абыякава прыслухаўся — гаворыць пра зімовыя нарыхтоўкі лесу для данбаскіх шахт.

Прыгадаліся апошнія словы Гаўрыльчыка, якімі той закончыў абмеркаванне яго, Бакланавай, справаздачы: «абвясціць вымову...» «Абвясціць вымову...» Баклан аж хмыкнуў: гэтыя словы здаваліся ў дачыненні да яго такімі дзіўнымі, недарэчнымі. «Вымову — мне?!.»

Ён хвіліну пастаяў нерухома, нібы чакаў адказу на сваю думку, потым, не дачакаўшыся, выйшаў на двор.

Жоўтае святло з акна падала на змятую, мокрую з цьмяным, масленым водбліскам траву, падымалася на завостраныя штакеціны агарожы. Ідучы праз двор, Баклан на міг азірнуўся на акно і ўбачыў у ім рослую, з тонкай шыяй, з вузкімі віслымі плячыма, постаць Зубца.

Гэтая вымова — галоўным чынам праз Зубца, які ўжо даўно настойваў, каб паставілі Бакланаву справаздачу, а цяпер, на гэтым сходзе, выступаючы першым, кідаў калючымі словамі: «адарваўся ад жыцця», «зазнаўся»... «заспакоіўся»...

У іх даўно былі нелады, у Баклана з Зубцом. Зубец даўно ўжо чапляўся да яго,назаляў бясконцымі размовамі, папрокамі. «Дабіўся свайго! Павярнуў усіх, як хацеў!.. — падумаў са злосцю Баклан і дадаў з пагардай: — Герой тылу!» Ён, праўда, тут жа ўспомніў, што Зубец таксама ваяваў недзе на фронце, але адразу ж падтрымаў сябе: як ён там ваяваў — нікому невядома. Нешта ж дзіўна не любіць ён гаварыць пра гэта. Відаць, ваяка быў такі — лепш не ўспамінаць... «Герой тылу!..»

Баклан даволі далёка адышоў ад канцылярыі, калі схамянуўся, падумаў, што час вярнуцца на сход.

Аднак вяртацца не хацелася, і ён паволі пабрыў дахаты.

Дома была маці, старая маўклівая жанчына, з уважлівымі чорнымі вачыма,— яна вязала сыну з белай шэрсці шкарпэткі на зіму. Старая чулым мацярынскім позіркам адразу заўважыла, што сын нечым занепакоены.

— Што з табою, Вася?

Васіль,— каб не дапытвалася,— буркнуў як мог абыякава: нічога...

Ён падышоў да стала і, рассеяна пазіраючы на свае фотакарткі, што ў некалькі радоў ільсніліся на сцяне, думаў узрушана.

Кепская ў людзей памяць. Ці даўно Баклан зняў з гэтага шырокага афіцэрскага пояса, які ён і цяпер носіць, трафейны «вальтэр», ці даўно куляліся пад адхон ваго-

ны апошняга нямецкага эшалона, спушчанага Бакланам,— а вось сёння яго папракаюць ужо за тое, што ён носіцца са сваімі партызанскімі заслугамі.

Ён адчуў сябе пакрыўджаным і адзінокім і ад душы пашкадаваў, што поруч няма таварышаў з тых незабыўных дзён.

Позірк Васіля мімаволі спыніўся на фотакартцы, дзе ён быў зняты з камандзірам атрада. Кавалевіч сядзіць, прытуліўшыся шырокай спіною да таўшчэзнага камля, а ён, праслаўлены падрыўнік, на кукішках паказвае штосьці на карце, дакладвае пра вынікі аперацыі на «жалезцы».

Баклан раптам прыгадаў, што не бачыўся з Кавалевічам вось ужо два гады, ад таго, як партызаны разышліся па калгасах, па розных установах выконваць новыя, мірныя заданні. Воблік камандзіра, Івана Савіча, паўстаў перад ім так яскрава, нібы толькі ўчора яны рассталіся.

Баклану захацелася раскрыць перад ім свае думкі, падзяліцца сваёю крыўдаю. Хто, як не Кавалевіч, зразумее і ацэніць усё па-сапраўднаму?

Ён дастаў з палявой сумкі, што вісела на сцяне, як памятка былых дзён, лісток паперы, сеў за стол насупраць маці і пачаў адразу хутка пісаць — ламаным няроўным почыркам: «Пісьмо ад вядомага табе падрыўніка Баклана...»

Аловак у цвёрдай яго руцэ не пісаў, а выціскаў на паперы рэзкія, адрывістыя літары. «Сэрца» алоўка некалькі разоў крышылася. Баклан нагадваў тыя слаўныя дні, калі з Кавалевічам біў гітлераўцаў, скардзіўся, што некаторыя хутка забылі людзей, якія зламалі хрыбет фашысцкаму звеwork, што яго, камандзіра-падрыўніка, тут заціраюць... У гэтым месцы «сэрца» алоўка зламалася. Баклан завастрыў аловак і стаў пісаць далей.

Увесь ліст — чатыры старонкі са сшытка — ён напісаў адным дыханнем. Ліст быў гарачы, бязладны; адна думка перабівала другую.

Напісаўшы, Баклан адчуў прыемную палёгку, быццам радкі ліста забралі ўвесь цяжар, што зваліўся на сэрца пасля сходу. Вымова... Няхай — вымова. Ці варта яму вельмі

непакоіцца праз гэта. Тыя, хто даў яму спагнанне,— людзі звычайныя, не выдатныя нічым, нераўня яму...

Назаўтра ўранку ён занёс ліст на пошту.

...Калі Баклан вярнуўся, то неспадзявана стаў разважаць — ці трэба было пра ўсё пісаць Кавалевічу.

Яго пачало тачыць сумненне: а можа, Кавалевіч таксама забыўся? Столькі часу прайшло. Так усё змянілася. Новая праца, новыя таварышы... Гэта было б горка — расчаравацца ў камандзіру, бо Баклан вельмі верыў яму.

Праходзілі дзень за днём, а адказу на ліст не было. Ён так чакаў вестку ад камандзіра атрада, што кожны дзень пасля абеду, калі звычайна прывозілі газеты і лісты, хадзіў на пошту.

— Нешта вы зачасцілі да нас, Пятровіч,— заўважыў аднойчы загадчык аддзялення, старэнькі беленькі чалавечак.— Можа, які-небудзь важны цыркуляр чакаеце?

— Цыркуляр, Майсеевіч!..— іранічна прамовіў старшыня і таямніча на вуха шапнуў старому: — Дзяўчына ў мяне ў горадзе ёсць... Абяцала пісаць і — хоць бы слова!..

— А, вер ты цяпер дзяўчатам!..

Тым часам у гэтыя дні Баклана ўсё больш апаноўвала няўпэўненасць, невядомая яму раней.

Ён пачынаў у глыбіні душы адчуваць, што, як ні прыкра, трэба прызнацца, што ён памыліўся, што мае рацыю не ён, а іншыя — якія галасавалі за вымову.

Сумненне пачало змяняцца непакоем. Цяпер Васіль стаў часам пабойвацца прыезду Кавалевіча.

Кавалевіч яшчэ, чаго добрага, дадасць да ўсяго. Партыйнага сходу, скажа, не паслухаўся. Распусціўся... Забыў пра абавязак перад камсамолам, перад партыяй...

Цяпер, пасля сходу, бачылі, ён стаў нейкі стрыманы, паглыблены ў сябе. Пачаў больш прыглядацца да жыцця ў калгасе. Праверыў, як трымаюць у свірне насенне, і выявіў у ім многа вільгаці. Ну і дасталося кладаўшчыку ад старшыні: доўга будзе помніць, нядбалец. Некалькі дзён пасля гэтага Баклан зноў заходзіў сюды, сачыў, як ідзе прасушка. Выклікаў да сябе ў канцылярыю ўсіх людзей, якія мала хадзілі на працу, гаварыў з кожным...

Часам, аднак, непакой адыходзіў. Да яго вярталася ранейшая ўпэўненасць і бесклапотнасць. «Не, Кавалевіч — не Зубцу раўня...— думаў ён.— Кавалевіч разумее, што да чаго...»

Аднойчы, так і не дачакаўшыся ліста, Баклан запрог каня і паехаў на Прыпяць да знаёмага рыбака, куды ён любіў часта наязджаць і раней. Васіль вельмі любіў, як сам казаў, «ласавацца рыбкаю»,— бывала, цэлымі тыднямі прападаў з рыбакамі на ціхіх прыпяцкіх водах. Прыемна, спакойна на рацэ, асабліва калі багаты ўлоў, але не менш падабаліся Васілю вечары на беразе — вясёлы агонь, на якім булькоча-кіпіць у катле юшка...

Пад вечар у той самы дзень прыехаў Кавалевіч... Яго сустракаў Гаўрыльчык, Бакланаў намеснік.

## II

Як толькі пачало займацца на дзень, Кавалевіч прахапіўся. Першае, што ён пачуў,— недзе непадалёк аб дрэва бразнулі вядром, услед за гэтым працягла зарыпеў журавель. Кавалевіч адкінуў коўдру, пачаў апранацца. Можна было б яшчэ спаць: ноччу яны з Гаўрыльчыкам доўга гаварылі і разышліся толькі а чацвёртай гадзіне. Да таго ж спяшацца сёння няма куды — ён прыехаў у госці. Але Кавалевіч ведаў, што заснуць больш не зможа, гэта быў той час, у які ён заўсёды падымаўся. Кавалевіч у змроку вобмацкам знайшоў боты, хутка абуўся і выйшаў у другі пакой, дзе спаў Гаўрыльчык.

Таго ў хаце ўжо не было. Арына, Гаўрыльчыкава жонка, завіхалася пры печы, у якой лютавала прагнае полымя. Яна якраз, пазіраючы ў печ, ставіла на вілках чыгун, накрыты скавародкаю. Паставіўшы чыгун, яна кісцю рукі выцерла лоб і лагодна прывіталася з госцем. Гэта была невысокая, але дужая, маладая жанчына, вельмі спакойная і павольная. На яе пухлых пяшчотных шчочках, каля кірпатага носіка, пунцавелі ад спёкі, якая патыхала з печы, два кругі. Арына сказала, што Рыгор ужо гадзіну, напэўна, як на калгасным двары.

— Па сена людзей, бачыце, трэба паслаць. Дык Рыгорка падаўся, непакоіцца, каб якой замінкі часам не было...— Яна вілкаю прыгарнула жар да чыгунка, уздыхнула.— Ой, гора мне з ім... Цэлыя дні, бывае, не загляне ў хату...

Арына падала госцю мыла ў мыльніцы з зялёнай пластмасы, стала паліваць з мядзянай конаўкі на вялікія бледныя рукі госця. Пры гэтым, не сціхаючы, увесь час гаманіла.

—...Ну што б яму — рабіў бы за сябе, і хопіць. Гэта ж столькі людзей у калгасе, столькі клопату ў кожнага. Хіба за ўсякім дагледзіш? Дык не ж, ён да ўсяго мае дачыненне. Усюды сваё слова ўставіць!.. Баклану мала клопату... бывае... дык ён і за яго, за старшыню, стараецца... А як жа, ён, бачыце, намеснік.

Разлатыя чорныя бровы Кавалевіча насцярожана падняліся — зараз яшчэ што-небудзь скажа пра Баклана. Не, усё пра адно, пра Рыгорку свайго...

— Баклан — што ж, выходзіць, не глядзіць? — запытаўся, здавалася, абыякава Кавалевіч, далонню сціраючы з шырокага зямлістага твару ваду.

Яна адказала не адразу. Вынесла з пакоя, дзе спаў Кавалевіч, чысты з вышыванымі пеўнікамі ручнік, падала госцю. Потым махнула рукою...

— Кепска, скажу я вам, калі тваім начальнікам заслужаны чалавек. Яму хочацца то на Прыпяць, то ў горад ехаць,— ліха яго ведае, чаго захочацца чалавеку на выгодзе! — а калі што трэба, то ты рабі, Рыгорка... Прыедзе хто з райза ці з эмтээса — усе да Рыгоркі.

Яна падалася была да печы, але раптам спынілася і, павярнуўшы да Кавалевіча поўны, круглашчокі твар, бліснуўшы весела вачыма, дадала:

— Тут у нас пра яго, пра Баклана, жартуючы, кажуць: харошы старшыня — трынаццаць нямецкіх эшалонаў спусціў!

Яна засмяялася так шчыра і прастадушна, што Кавалевіч таксама ўсміхнуўся. Цяпер яна пачала зноў гаспадарыць пры печы. Рабіла яна, як і гаварыла, павольна, без мітусні.

Кавалевіч вярнуўся ў свой пакой. На дварэ цяпер сінеў негусты ранішні змрок, і ў вулічным акне былі відаць голыя

кусты бэзу, што курчыліся ад вільгаці і сцюжы, і чорныя, як бы сатлелыя, сцяблiны кветак. Да Кавалевiча вярнуліся неспакойныя думкі пра Баклана.

Словы Арыны не былі для яго нечаканыя. Ён ужо ведаў пра партыйны сход, на якім слухалі справаздачу старшыні, пра адносіны старшыні да парторга,— аб гэтым яму расказаў учора Гаўрыльчык. Праўда, Рыгор гаварыў пра Баклана неахвотна і ўсяляк імкнуўся абысці гэтую прыкрую тэму. Часцей за ўсё ён адгаворваўся двума словамі — «сышоў з рэек». Аднак Кавалевіч і з тых вестак ужо добра ўяўляў сабе паводзіны Баклана, і яны выклікалі ў ім трывогу.

Баклан калісьці быў камандзірам падрыўной камсамольскай групы. Партызанскім атрадам «Смерць фашызму», у які ўваходзіла гэтая падрыўная група, камандаваў Кавалевіч. Камандзіру атрада прыйшоўся даспадобы малады начальнік падрыўнікоў за адвагу і рашучасць. Ніхто іншы, а камандзір атрада — Кавалевіч — вызначаў Баклана да ўзнагарод, Кавалевіч жа паручыўся за камсамольца-падрыўніка, калі той уступаў у партыю.

Месяцы чатыры назад Баклан стаў старшынёй калгаса. Ён у той час прыехаў з Мінска, з курсаў, на якіх правучыўся амаль год. Кавалевіч аб выбранні Баклана даведаўся на адной з абласных нарад ад сакратара райкама,— ён сказаў, што лепшага старшыні і жадаць не трэба, бо яго падрыўнік быў, акрамя ўсяго, добрым арганізатарам. І вось — нá табе...

Неўзабаве Кавалевіч пачуў, што ў суседні пакой, бразнуўшы клямкаю, нехта ўвайшоў. Дзверы між пакоямі былі зачынены, і хто ўвайшоў, яму не было відаць, аднак ён пазнаў крокі Гаўрыльчыка. Гаўрыльчык хутка прабег праз пакой да печы, дзе поркалася Арына. «Зачакалася, мусіць, перапёлачка? Не?! Ой, няпраўда: не паверу... Я замаркоціўся без цябе...» —дайшло да Кавалевіча. Арына лагодна папракнула: «Маўчы, пасаромеўся б чужога чалавека — там жа ўсё чуваць». «Чуваць! Што там чуваць... баязліўка ты мая!» — каб пацешыцца над Арынінай асцярогай, знарок

мацней загаварыў Рыгор. Арына, мусіць, закрыла яму рот. Кавалевіч, чуючы ўсё гэта, не мог стрымаць усмешкі.

Потым Рыгор прыадчыніў дзверы ў Кавалевічаў пакой:

— Можна да вас?

— Заходзь.

На маладым абветраным твары Гаўрыльчыка асабліва выдзяляліся цікаўныя карыя вочы, падобныя на два спелыя жалуды. Ён быў апрануты ў суконны пінжак, з-пад якога віднелася вышываная чырвоная манішка; сінія армейскія штаны былі запраўлены ў кароткія, з шырокімі халявамі, старыя боты.

— Ну, накіраваў людзей па сена,— сказаў ён павольна, з выразам заклапочанага нечым чалавека.— Сёння адправілі сем падвод. Паехалі далёка, аж у Церамоскае. Адсюль кіламетраў сем, мусіць, будзе... Што гэта вы так рана ўсхапіліся, Іван Савіч?

Куточкі строгіх, рэзка акрэсленых вуснаў госця ледзь прыкметна задрыжалі ад затоенай усмешкі: гэта перад ім той самы гарэзны хлопец, які толькі што жартаваў з жонкаю. Паважнеў, нахмурыўся...

— Ты ж яшчэ раней устаў,— адказаў Іван Савіч.

— Раней то раней. Але мне нельга спаць, Іван Савіч, я на рабоце. У мяне клопаты. Тут, здаецца, рад паспаць бы яшчэ гадзінку, дык думкі розныя раскатурхаюць да часу. Падымаюць самі. Як кажуць: каму прырупіць — вочы пралупіць. А вы — госць, птушка вольная, прыехалі ў адпачынак, пагуляць, дык гуляйце.

«З майго атрада»,— падумаў мімаволі Кавалевіч. Ён раптам заўважыў, што з учарашняга дня, з сустрэчы, стаў неяк асабліва ганарыцца тым, што Гаўрыльчык з яго атрада. Баклан і Гаўрыльчык былі ў адной групе, першы — камандзірам, а другі — байцом. Гаўрыльчык таксама лічыўся ў атрадзе някепскім падрыўніком, хоць і не было ў яго паводзінах такой кідкай адвагі і шумлівасці, як у яго камандзіра. Ён усё рабіў ціха, проста, нічым не вылучаючыся з дзясяткаў другіх, такіх жа малапрыкметных людзей...

Арына паклікала снедаць. Кавалевіч прыпыніў Рыгора.

— Баклан яшчэ не прыехаў?

Па тым, як Кавалевіч запытаў, Гаўрыльчык здагадаўся, што той нецярпліва чакае Баклана.

— Не... няма,— вінавата адказаў Рыгор, нібы ён быў вінен, што Баклан не прыехаў.

Пасля снедання пайшлі на поле паглядзець, ці добра ідзе малацьба. Кавалевіч прыехаў сюды не толькі для таго, каб пабачыцца з Бакланам,— яму таксама хацелася даведацца, як жывуць яго таварышы-партызаны, як цяпер выглядаюць мясціны нядаўніх баёў.

Быў хмурны асенні дзень. Здавалася, што збіраўся дождж,— паветра было насычана вільгаццю; нізка плылі кашлатыя цёмныя хмары. Поле пласталася голае, аднастайна-пустое, але цяпер гэта не кідалася так у вочы, як адразу пасля жніва,— надышоў лістапад. Уводдалі чарнела шырокая лапіна ворыва.

Малатарня стаяла сярод поля, каля дзвюх сціртаў. Адна з іх, стромкая і высокая, накрытая саломаю, была яшчэ не распачата, а другую ўжо больш чым напалову змалацілі. На ёй завіхалася некалькі жанчын, падаючы снапы да малатарні.

Людзі, што працавалі на зямлі, пабачыўшы каля малатарні Гаўрыльчыка і Івана Савіча, прывіталіся. Жанчыны, якія стаялі на сцірце, крычалі штосьці вясёлае, прыветнае, але Кавалевіч не мог разабраць ні аднаго слова, бо замінаў гул трактара і стукат малатарні. Былога камандзіра тут добра ведалі — у яго атрадзе было многа калгаснікаў з гэтай вёскі.

Малатарня ні на хвіліну не спынялася. Сноп за снопам глытала прагная зяпа машыны, людзі ледзьве ўпраўляліся накарміць гэтую ненажэру — усё падавалі ды падавалі. Сочачы за калгаснікамі, што спрытна ўвіхаліся каля малатарні, Кавалевіч нібы набіраўся новых сіл, адчуваў сябе маладзейшым і дужэйшым. Трывожныя думы пра Баклана непрыкметна развеяліся.

Адначасна Кавалевіч з цікавасцю назіраў за намеснікам. Гаўрыльчык, хоць і быў вельмі рады, што Кавалевіч задаволены тым, як працуюць пры малатарні, не выказваў гэтага.

На людзях Гаўрыльчык знарок марудзіў, стрымліваў прыродную жвавасць, якая толькі зрэдку авалодвала ім, стараўся паказаць сябе сталым і разважлівым чалавекам. З выгляду непрыкметны і прастадушны, з наіўным позіркам адкрытых вачэй, ён падпарадкоўваў усіх спакойнай упэўненасцю і развагай, якія прыходзяць толькі з гадамі і вопытам.

«Як ён пасталеў!» — не адзін раз падумаў Іван Савіч, назіраючы задаволена за былым падрыўніком. Ён памятаў, якім быў Гаўрыльчык у атрадзе, і ўсё не мог звыкнуцца, што з таго зялёнага хлопца вырас такі чалавек.

## III

Непрыкметна гадзіна за гадзінаю прамінула паўдня. За гэты час яны пабылі на полі, каля Чорнага лесу — праверылі, як трактарыст арэ ржышча... Кавалевіч да ўсяго ўважліва прыглядаўся, нібы ён быў не госцем, а гаспадаром.

Спачатку з раніцы Іван Савіч шкадаваў, што не застаў старшыні дома. Аднак новае знаёмства з Гаўрыльчыкам, той светлы працавіты настрой, які перадаўся яму ад калгаснікаў і не пакідаў увесь час,— усё гэта нечакана ператварыла яго вымушанае, здавалася б, непрыемнае чаканне ў радасць. Ён так захапіўся тымі праявамі, якія бачыў навокал, што непрыкметна для сябе амаль забыўся пра Баклана.

Толькі раз, калі абодва ішлі з іржышча, Іван Савіч ні з таго ні з сяго запытаў:

— Дык як вы жывяце з Бакланам цяпер... пасля вымовы?

— Як жывём?!. Вядома. Пакрыўдзіўся ён. Амаль перастаў са мной гаварыць. А я — што, хіба я што злое меў да яго? — сказаў Гаўрыльчык, нібы апраўдваючыся.— Мне і самому, паверыце, шкада яго,— я ж ведаю, хто такі Баклан...

— Пакрыўдзіўся, значыцца?..— адгукнуўся дзіўна Кавалевіч.— І на цябе пакрыўдзіўся...

Пад вечар Рыгор павёў Кавалевіча да зруба, каля якога цесляры збівалі кроквы. Зруб быў складзены, відаць, зусім нядаўна: жоўтыя ачэсаныя бярвенні яшчэ не паспелі ні пацямнець, ні патрэскацца. Дзе-нідзе на іх выступілі

светлыя, клейкія, падобныя на парэчкі, бурштынавыя пацеркі смалы.

Заставалася паставіць кроквы, накрыць хату ды зрабіць, як кажуць будаўнікі, «сталярку» — вушакі, рамы, дзверы.

— Для Кацярыны будуем,— сказаў Рыгор.— Помніце, у Марцінавай роце быў Гаравец Васіль — то яе чалавек... Загінуў, калі мы бралі Балачанскі гарнізон...

Пад нагамі весела трашчалі свежыя, яшчэ вільготныя, трэскі. Каля сталюгі некалькі цесляроў, нагнуўшыся і расставіўшы ногі, цясалі бярвенні. У паветры стаяў моцны, казытлівы пах смалы. Каля цесляроў хадзіў белагаловы хлопчык гадоў дванаццаці — ён збіраў у кошык трэскі. Напэўна, маці прасіла прынесці, каб падпальваць дровы ў печцы...

У гэты час непадалёк пачулася пералівістае конскае ржанне, непаспешлівае, лянівае пастукванне колаў.

— Баклан едзе,— прамовіў Рыгор, прыслухоўваючыся.— Звер, Бакланаў конь, іржэ... Эх, якая галасістая жывёліна, што свісток паравозны!..

Гаўрыльчык не памыліўся. Сапраўды, праз хвіліну-другую з-за зруба выехала новая лёгкая каламажка з шыракаплечым чалавекам у вайсковай вопратцы, які прыгорблена сядзеў на драбінцы, звесіўшы ногі.

— Баклан! — паклікаў Рыгор.

Баклан спыніў каня. Саскочыў з драбінак, зачапіў лейцы за абгарэлы слупок ад агародчыка, уцалелы пасля пажару, і, сцябаючы па хромавай халяве пугаўём, неахвотна, уразвалку пайшоў да намесніка. Ён абыякава акінуў позіркам сваю гімнасцёрку, адкалупіў камячок гразі, што закарэў на рукаве.

Толькі падыходзячы да намесніка, падняў вочы:

— Савіч?!

Баклан адразу перамяніўся. Куды падзелася абыякавасць,— парывіста кінуўся да Кавалевіча, на ўсю сілу сціснуў яго ў абдымку.

— Ну, мядзведзь! Рэбры паломіш! — застагнаў, усміхаючыся, Іван Савіч.— Хто ж гэта так бесцырымонна з гасцямі абыходзіцца? Гэтак і задушыць, чаго добрага, нядоўга!..

— Так табе і трэба! — не выпускаў Баклан былога камандзіра з абдымку.— Будзеш ведаць, як наведвацца раз у два гады...

Шэрыя смелыя вочы, амаль бязбровы, пакрыты густым чарнаватым загарам твар. Крутыя ўпартыя сківіцы са шрамам... Няўжо гэта не той самы Васіль, якога ён ведаў і любіў у атрадзе?

Баклан адышоў, падазваў да сябе хлопца-цесляра, штосьці паціху сказаў яму. Хлопец уткнуў сякеру ў бервяно і, падаўшыся да калёс, адчапіў лейцы; неспакойны конь крануўся, выгінаючы дужую шаўкавістую шыю.

Баклан вярнуўся да госця.

— Ах, каб ты быў, Іван Савіч, няладны! Я ж столькі часу цябе чакаў! І хоць бы адно слова ў адказ! Я ўжо быў падумаў, што і зусім не адкажаш. Зазнаўся, думаю... Пабачыў цябе побач з Гаўрыльчыкам — і не пазнаў: не інакш начальства з раёна. Я тут у пашане, можна сказаць... яны да мяне часценька заглядаюць...

Ён зарагатаў. У Кавалевіча мільганула думка — Баклан таксама змяніўся за гэтыя два гады. Праўда, ён не мог сказаць, што гэта за перамена такая...

Баклан па-прыяцельску абняў камандзіра:

— Як гэта ты добра зрабіў, што прыехаў! Самым дарагім госцем будзеш!.. За тое, што пачатак атрымаўся такі няўдалы, не крыўдуй: не ведаў, што прыедзеш... Ну, але мы гэту хібу зараз паправім! Правільна, Рыгор?.. Дарэчы, Іван Савіч, нашто нам час марнаваць,— хадзем, свежай рыбкай пачастую, толькі што вось прывёз... А рыбка сёння — пальцы абліжаш!.. Згодзен?

Кавалевіч кіўнуў галавою ў знак згоды:

— Добра. Толькі, Васіль, пачакай хвіліну. Мы з Рыгорам у хату сабраліся зайсці.

Яму хацелася агледзець хату ўсярэдзіне — як прыгнаны адно да другога бярвенні, дзе будуць пастаўлены грубка і печка, ці сагрэюць яны хату. Іван Савіч меў звычку — усё бачыць сваімі вачыма. Тым больш ён не мог быць абыякавым цяпер,— перад ім была хата, якую будавалі для сям'і яго баявога таварыша.

— Як тут у цябе, Васіль, з цэглай: для печы і грубкі? Ёсць? — запытаўся Іван Савіч у старшыні, калі яны пераступілі дубовую падваліну пад прарэзам дзвярэй.— Трэба б паспець да халадоў скончыць.

Ці ёсць цэгла, Баклан не ведаў. Яго выручыў Рыгор, які сказаў, што цэглы цяпер у калгасе няма, бо тая, якую раней атрымалі з завода, ужо разышлася.

— Заўтра паеду ў выканкам. Папрашу даць яшчэ...— заўважыўшы, што Кавалевіч нездаволены такім няпэўным адказам — «папрашу», паправіўся: — Адным словам, цэгла будзе.

— Так бы і сказаў адразу!

Іван Савіч ведаў: цэгла будзе. Рыгор прамовіў гэтыя словы такім тонам, што нельга было не паверыць.

Калі яны выйшлі з хаты, цесляры, цягнучы за доўгую вяроўку, падымалі на зруб першыя кроквы. Вяроўка паволі паўзла па верхнім бервяне, нібы па блоку. Кавалевіч хвіліну зацікаўлена пазіраў на цесляроў, потым, як бы схамянуўшыся, папляваў на рукі і сам узяўся каля аднаго хлопца за вяроўку. Гаўрыльчык, а за ім і Баклан далучыліся да яго. Тры таварышы і цесляры дружна пацягнулі вяроўку. Людзі, што працавалі ўгары на зрубе, паставілі крокву і прымацавалі ніжнія, з выразамі, канцы яе да верхніх бярвенняў. Кавалевіч ужо доўгі час не працаваў у калгасе, і цяпер, у гэтыя хвіліны, адчуваў сябе радасна, па-святочнаму.

Калі паставілі пяць крокваў, стары, з ружоваю лысінай і падстрыжанай бародкай, цясляр весела крыкнуў:

— Мо няхай астынуць сякеры?.. Годзе, хлопчыкі, перакурым хвіліну...

Седзячы ўгары на верхнім бервяне зруба, ён скруціў з абрыўка газеты цыгарку. Дастаючы з кішэні гімнасцёркі карабок з запалкамі, папрасіў Гаўрыльчыка:

— Цвікоў бы вялікіх, таварыш намеснік! Цвікі канчаюцца! Бачыце, кроквы дроцікамі пачалі збіваць...— Ён выняў з кішэні падобны на цвік абсечак тоўстага дроту.

— Ведаю, дзядзька Пятро. Заўтра ў раён еду — буду стукаць там. А пакуль — дроцікамі трэба. Сам ведаеш,

цвікоў столькі расходзіцца, што хоць ты завод у нашым сяле адчыняй!..

Цясляр засмяяўся, кіўнуў у знак згоды галавой:

— Правільна сказаў — цэлы завод трэба!..

«І гэты да Гаўрыльчыка,— заўважыў Кавалевіч,— а не да Баклана...»

Яму здавалася, што дзядзька Пятро запытаўся ў намесніка невыпадкова.

## IV

Пайшлі да Баклана ўтрох. Адсюль хата яго стаяла недалёка, на ўскраі сяла.

Іх спаткала на ганку Васілёва маці, прыветлівая жанчына са светлымі, ледзь прыкметнымі, як у сына, брывамі. На галаве ў яе была новая пярэстая хустка з махаркамі. Старая чакала гасцей,— дачуўшыся ад хлопца, які прывёз рыбу, што прыехаў сынаў камандзір, яна пачала адразу смажыць і пражыць, напякла цэлую гару дранікаў.

Пакуль збіралі на стол, Кавалевіч разглядаў фотакарткі, што віселі над сталом. Карткі амаль усе былі новыя, пасляваенныя. Некалькі маленькіх захавалася і з партызанскага часу: гэтыя памятыя і невыразныя,— відаць было, рабіў неспрактыкаваны чалавек. На адной картцы, устаўленай у рамку вішнёвага колеру, пад шкло, Кавалевіч убачыў сябе: ён, седзячы пры камлі, слухае партызана, які на кукішках нешта паказвае на памятым лісце паперы. Партызан зняты са спіны, але па абрысах постаці не цяжка пазнаць, што гэта Баклан.

Побач другі здымак, таксама ў рамцы, але на ім зняты Баклан адзін. На грудзях бялеюць ордэны і медалі. Картка зроблена пасля вайны, можа, пасля атрымання апошняга ордэна. Вось яшчэ два такія самыя здымкі, толькі што без рамак; яны пажоўклі. А вось тут Баклан зняты ў адных штанах, закасаных вышэй кален,— ён стаіць у вадзе і, весела ўсміхаючыся, трымае за галаву вялізнага шчупака. Шчупак бездапаможна расчыніў востры драпежны рот,— напэўна,

калі здымалі, ён быў яшчэ жывы. На другой сцяне — здымкі з газет. «Уся біяграфія ілюстравана»,— падумаў мімаволі Іван Савіч.

Баклан дастаў са скрыні дзве літровыя пляшкі. Паставіў на стол, падміргнуў таварышам:

— Хопіць гаручага?.. Усё роўна як чуў, што госці прыедуць, прызапасіў.

Ён задаволена акінуў вачыма стол. Кавалевіч не можа пакрыўдзіцца, што сустрэў яго не так, як трэба. Вось хіба нядобра, што не спаткаў адразу. Але ж ён не ведаў, што камандзір прыедзе; а каб ведаў, то падводу нават паслаў бы насустрач, на станцыю.

Перш выпілі за спатканне, потым за Бакланаву маці. Трэці тост паднялі за атрад «Смерць фашызму». Бакланава маці, якая таксама выпіла чарку за спатканне, устала, пакінула таварышаў адных.

— Ноч. Сцюжа... Месяц, як знарок, каб ён быў няладны...— пачаў Баклан,— а ты дзяжурыш дзе-небудзь каля «жалезкі», цікуеш. Падабраўся да рэек, хутчэй разгроб шчэбень, падставіў шашачку, адбег... І вось, паравоз — чы-чычах, чы-чы-чах... Вагоны адзін за адным ляцяць — гарматы, заваёўнікі. На ўсход спяшаюцца, па «сусветную прастору»... І раптам — г-га-ах! Усё к чорту, адразу! Р-работка!

Баклан, ахмялелы ад гарэлкі, ад успамінаў, не гаварыў, а грымеў — «г-га-ах», «р-ра-а-ботка». Ён ад узрушання прыўзняўся, на грудзях, нібы ў пацверджанне яго слоў, зырка бліснулі два ордэны і тры медаля.

Цяпер, калі Баклан зноў убачыў перад сабою былога камандзіра атрада, калі з такой хвалюючай яркасцю ажыло былое, трывожныя думкі і няўпэўненасць пакінулі яго. У іхніх адносінах, здалося яму, нічога не змянілася: Кавалевіч быў такі, як і раней, блізкі, «свой». Да Баклана зноў вярнуліся звыклыя прыемныя думкі, якія адна за адной пачалі знікаць пасля партыйнага сходу. Тая слава, якой Баклан ганарыўся, цяпер зноў заззяла ў яго вачах, засланіла сабой усё іншае.

Падрыўніка захапілі ўспаміны. Ён стаў прыгадваць баі, паходы на «жалезку».

Аднак Кавалевіч, які, бывала, сам любіў успомніць і пагаварыць пра «тыя дні», на гэты раз слухаў успаміны абыякава. У яго быў сёння багаты новымі, яркімі ўражаннямі дзень, яго думкі ўвесь час кружыліся вакол таго, што ён бачыў на ржышчы, каля малатарні, каля зруба. Думкі гэтыя не давалі спакою, нецярпліва біліся вонкі.

Гаўрыльчык здагадваўся, аб чым хочацца гаварыць госцю, і спрабаваў змяніць гаворку, але Баклан не заўважаў нічога. Ён у другі раз стаў апавядаць пра тое, як падарваў мост на Тур'і, па якім праходзіла захопленая ворагам чыгунка.

— Досыць ужо, Васіль, пра гэта... Мы ж ведаем усё і самі...— перапыніў нарэшце Іван Савіч старшыню.— Ды і чаго тым хваліцца столькі!

Ён падумаў, што гаварыць так таварышу, з якім даўно не бачыліся, нядобра, але не хацеў крывіць душой. Баклан ад нечаканасці асекся, не адразу знайшоўся, што сказаць.

— Новым пахваліцца? — прамовіў ён пасля.— Чым жа пахваліцца? От ліпькоў, бачыце, прывёз з Прыпяці... Сам налавіў, сваімі рукамі! — паспрабаваў Васіль звесці гаворку на жарт.

Кавалевіч ад гэтага жарту спахмурнеў.

— Ліпькоў, кажаш, з Прыпяці прывёз? Сам сваімі рукамі налавіў? Што ж, ліпькі смачныя — не ганю. За ліпькі, Васіль, дзякую!..

Ён змоўк. Баклан толькі цяпер заўважыў, што Кавалевіч нібы чымсьці незадаволены. «Відаць, я вельмі выстаўляў аднаго сябе»,— вытлумачыў па-свойму Баклан і рашыў паправіць памылку.

Ён наліў шклянку, устаў:

— Я хачу, Рыгор, сказаць яшчэ адно слова. Гэта слова, вядома, пра нашага Івана Савіча... Хоць перад намі зараз сядзіць цывільны чалавек, мы не забылі, якім быў Іван Савіч у лесе. Помніш, Рыгор? Вядома, помніш. І ўсе мы помнім, кім быў для ўсіх нас у тую пару Іван Савіч. Ён быў і бацькам, і камандзірам. Ён нас з табой зрабіў салдатамі... Адным словам, вып'ем за нашага камандзіра!

— Не хачу.— Кавалевіч адсунуў ад сябе шклянку.— Не хачу... Я не камандзір...

Можа, другім разам ён і не пярэчыў бы супроць таго, каб памянуць добрым словам сваю камандзірскую славу, але цяпер гэты тост яму не спадабаўся. Кавалевічу здалося, нібы яго пакрыўдзілі.

Стала ціха. Баклан апусціў шклянку, недаўменна паглядзеў на Кавалевіча. Іван Савіч, каб выправіць няёмкае становішча, прапанаваў свой тост — за жыццё, кіпучае, імклівае, поўнае працы і змагання! Яны выпілі.

Аднак размова ўжо не ладзілася. Усе зрабіліся маўклівыя, кожны думаў пра штосьці сваё. Баклан, які раней быў такі гаваркі, самаўпэўнены, цяпер, адчуваючы Кавалевічаву непрыхільнасць, не знаходзіў слоў для размовы.

«Кепска неяк атрымалася»,— думаў з тугою Баклан. Ён вельмі даражыў сяброўствам з камандзірам. У гэты час Іван Савіч быў яму асабліва дарагі, таму што Баклан адасобіўся ад іншых сяброў. Знешне, праўда, нічога нібы і не змянілася: гаварылі, віталіся, але блізкасці ранейшай не было. Баклан час ад часу адчуваў сябе адзінокім.

— Ведаю, Васіль, што табе няма чым цяпер пахваліцца, акрамя лінькоў,— прагаварыў Кавалевіч стрымана.— На спачын, казалі мне, падаўся...

Кавалевіч устаў, узрушана прайшоўся па пакойчыку, крыху сутулаваты, але ўсё ж стройны, па-вайсковаму падцягнуты.

— Няўжо заслугі твае закрылі перад табой увесь свет? — сказаў ён, падышоўшы да стала і гледзячы цёмнымі, уважліва-дапытлівымі вачыма на Баклана; той неспакойна паварухнуўся, выпрастаўся, адвёў позірк убок.— Адзін чалавек сказаў мне пра цябе, што ты які быў у атрадзе, такі і цяпер... Нічога, адным словам, не змянілася. Нібы і праўда — усё ў табе ранейшае, партызанскае... Але мне здаецца — той чалавек памыліўся. Ты змяніўся, Васіль, вельмі змяніўся! Душа нібы стала іншая.

— Ты памыляешся, Савіч,— пакрыўджана перабіў Баклан.

— Памыляюся? Калі б жа памыляўся! Ты сам — нібы той лінь. Тлусты нейкі, сыты... Глядзіш толькі ў сваю душу. Сябе аднаго бачыш...

«З чаго гэта ён так змяніўся?.. А можа...— Кавалевіч зірнуў на Баклана ўважліва і недаверліва, нібы хочучы праверыць раптоўную прыкрую здагадку.— Можа, ён і не мяняўся?» Няўжо Кавалевіч проста не бачыў, не заўважаў гэтага?!

— Скажы, ты і ваяваў толькі для таго, каб... мець заслугі?

Бакланаў твар пабялеў, лілаваты шрам на ніжняй упартай сківіцы, здалося, зрабіўся сіні. Ён рэзка падняўся.

— Не жартуй гэтым, Савіч... Прашу як таварыша!.. Ты добра ведаеш, за што я кроў праліваў...

Кавалевіч, пачуўшы гэты ціхі, напружаны шэпт, паспакайнеў.

— Я так і думаў, што не для заслуг... Ты, здаецца, проста пасля заблудзіўся,— зрок папсаваўся ад бляску славы. Ці можа галава закружылася ад хвалебнага шуму...

Ён сеў поруч з Бакланам, прамовіў па-сяброўску, са спачуваннем:

— Паслухай, Васіль, і падумай добра — пакуль не позна. Я табе скажу рэч, пра якую, магчыма, мне і не трэба было б гаварыць. Але сёння я скажу. Я, калі ехаў сюды, заходзіў у райкам. Там была размова і пра цябе... Ёсць у іх скаргі ад калгаснікаў на цябе... Скажу праўду, у райкаме была такая думка — сабраць калгасны сход і вырашыць, ці не час табе вызваліць месца для іншага старшыні. Я заступіўся, параіў — трэба пачакаць, паспрабаваць выправіць справу з тваім удзелам... Цяпер — твае слова. Памятай, што сказаць яго яшчэ не позна, але хутка можа стаць — позна...

Яшчэ быў вечар, калі Кавалевіч і Гаўрыльчык падняліся. Іван Савіч зняў з цвічка сваё паношанае драпавае паліто, надзеў яго, узяў кепку ў рукі. Баклан стаяў сярод хаты, панура сачыў за таварышамі.

— Ты не крыўдуй, Васіль, што сапсаваў табе вечар. Характар мой знаеш — не люблю крывіць душою...

Кавалевіч падышоў да Баклана, пацісну ў на развітанне руку.

— Не думаў я, што пабачу цябе такога... Як жа гэта ты, Васіль?..

Баклан не знайшоў, што сказаць.

Не апранаючыся, правёў іх на ганак. Кавалевіч і Гаўрыльчык моўчкі сышлі па ступеньках, падаліся па вуліцы. Васіль, абапершыся плячом аб слупок ганка, бяздумна сачыў, як цемра спакваля хавае дзве постаці.

«Пайшлі... Пайшлі...» А ён два гады чакаў гэтай сустрэчы...

Аднекуль з поля — чуў і не чуў Васіль — вецер даносіў аднастайнае гуркатанне трактара... Раптам унізаўся гарэзны і задорны дзявочы голас — нібы знарок:

Палюбіла трактарыста,
Ён красівы і прасты.
Называе мяне мілай
І клянецца — халасты.

Вецер сцябаў парывістымі ўдарамі, холад забіраўся ўсё глыбей. Ноч была сцюдзёная, а Васіль нават шыняля не накінуў на плечы. Але вяртацца ў хату не хацелася.

Пасля таго, як Кавалевіч і Гаўрыльчык вярнуліся ад Баклана, яны яшчэ доўга сядзелі і гаварылі.

У абодвух пасля сустрэчы з Бакланам быў узбуджаны, гаваркі настрой і вострае адчуванне блізкасці. «Нібы і не расставаліся ніколі»,— падумаў Іван Савіч, заўважыўшы, што Гаўрыльчык разумее яго з паўслова.

— Дзякую табе, Рыгор. Павадзіў ты мяне, пацешыў... Радасна мне было... Так радасна, як у Лапатаўцы, калі атрад прымаў першы самалёт з Вялікай зямлі, памятаеш?

— Ну чаму ж, помню... Вы тады спазніліся на аэрадром. Нам тры разы прысылалі тэлеграмы — сустракайце. Мы выходзілі, а яго не было... Ён прыляцеў, калі мы ўжо не спадзяваліся...

— Не забыў. Сёння ў мяне такі ж радасны дзень. Багата вы зрабілі.

— Зрабілі тое-сёе,— сказаў Рыгор.

— Зрабілі. Не марна зямлю тапталі. Не прыйдзецца чырванець за гэтыя два гады. Як і за тыя, за партызанскія...

Кавалевіч падумаў, што Гаўрыльчык правільна разумее жыццё, і яму стала спакайней. Ён адхінуўся на спінку крэсла, рукою адвёў пасму валасоў, што ўпала на шырокі круты лоб; каля рота лягла строгая глыбокая складка.

— Так, кіснуць у нас можа толькі той, хто адарваўся ад жыцця... Жыццё наша ні хвіліны не стаіць...

— Яно не дасць спыніцца...

Рыгор памаўчаў, загаварыў з пашанай:

— А вы за гэтыя два гады, Іван Савіч, вельмі пасівелі. Гэта ж ужо, не крыўдуючы, паўгалавы пабялела.

У Кавалевіча раней былі густыя чорныя валасы, цяпер белыя і чорныя ніткі ўсюды пераблыталіся, а скроні, дзе кучараваліся падстрыжаныя валасы, быццам хапіў іней.

— Клопат, брат... Такі клопат.— Іван Савіч усміхнуўся, пажартаваў: — Не годы малайца гнуць — клопат!..

Увесь гэты час, пасля вайны, Кавалевіч жыў неспакойным, імклівым жыццём.

Ён працаваў у абкаме партыі загадчыкам прамысловага аддзела. Аддзел быў цяжкі, гарачы. Вобласць да вайны лічылася адной з першых у Беларусі па развіцці прамысловасці. Цяпер усе заводы былі разбураны, іх трэба было аднаўляць як хутчэй, а спецыялістаў — кожнага па імені ведаў — і дзясятай часткі не было таго, што трэба. З будаўнічымі матэрыяламі таксама — кожная цагліна на ўліку.

Але будаваць трэба было, будаваць, не зважаючы ні на што. З рання да позняй ночы жыў ён гэтым — на нарадах, на будаўнічых пляцоўках, на прадпрыемствах, што ажывалі так марудна, так цяжка. Колькі б ён ні рабіў, у яго не выходзіла з галавы думка, што робіць ён усё ж мала, не столькі, колькі трэба, і ён як бы падганяў сябе.

А вось Баклан спяшацца і не думаў. Не думае...

Значыцца, праўда. Тое, у што яму не хацелася верыць, праўда: Баклан адступіўся. Ашукаў. Забыўся пра ўсё навокал — на таварышаў, з якімі ваяваў, на людзей, якія яму верылі...

## V

Баклан таксама не спаў. Ён сядзеў за сталом, падпёршы галаву рукамі, і абыякава, няцямна пазіраў перад сабою. На стале каля яго стаялі талеркі з недаедзенай закускай і тры гранёныя шклянкі з недапітай гарэлкай.

На душы ў Васіля было трывожна і прыкра. У галаве ні адной думкі. Пуста. Толькі бязладнымі ўрыўкамі ўспаміны — падрабязнасці сустрэчы з Кавалевічам, словы былога свайго камандзіра.

«Лінькоў, кажаш, з Прыпяці прывёз?.. Лінькі смачныя — іх не ганю...» І нашто Васілю здалося пра гэтыя лінькі не ў час вякнуць?!

«Не думаў я, што пабачу цябе такога».

— Не думаў?! Ну і няхай! — Васіль раптам ускочыў, сарваў з цвіка шынель і, на хаду накінуўшы на плечы, бразнуў дзвярыма.

Маці ўстрывожана выйшла з суседняга пакоя, выбегла следам за ім у сенцы.

— Куды ты, Вася?

Ён не абазваўся.

На двары ў твар Васіля ўдарыў золкі вецер. Ён кінуў валасы на лоб, на вочы.

«Калі ішоў на кулі, тады добры быў,— думаў Васіль,— а цяпер — па лінькі ездзіш».

Вецер, які хвалямі налятаў збоку, то намерваўся сарваць шынель з плеч, то доўгім крысом біў па ботах, замінаў нагам.

Баклан ступаў не разбіраючы дарогі. Куды ішоў — не думаў. Ці не ўсё роўна яму цяпер — куды ісці?

Ён абражаны, пакінуты сябрамі, адзінокі.

Быў у яго адзін таварыш, самы любімы, самы справядлівы — Кавалевіч. Цяпер і той пакінуў. А ён, Васіль, на яго так спадзяваўся, верыў яму. Ашукаў Іван Савіч! Што ж, Васіль перажыве і гэтае расчараванне. Перажыве! Хоць нялёгка, відаць, будзе, але ён вытрымае і на гэты раз. Ён не хлюпік які-небудзь!

19. Зак. 1877

Непрыемная рэч — здрада сябра, але, калі так здарылася, яна не спалохае яго...

Ён лічыў сябе несправядліва пакрыўджаным, і гэта прыдавала яму спачатку, пакуль крыўда была балючай, моц і ўпэўненасць. Але крыўда пачала паступова як бы гаснуць.

Ён трохі паспакайнеў. Адкідваючы рукою валасы назад, ён ахвотна падстаўляў галаву дужым павевам свежага ветру. Некаторы час Васіль ішоў, ні аб чым не думаючы, аддаўшыся толькі адчуванню чыстага халаднаватага ветру. Яму прыемна было спрачацца з ветрам — папраўляць валасы, утрымліваць на плячах шынель, які вось-вось мог сарвацца...

У такі час, калі на душы было лёгка, а ў галаве ясна, ён успомніў словы Кавалевіча:

— Як жа гэта ты?

Яму так ясна прыгадаліся гэтыя словы, што ён пачуў Кавалевічаў голас. Той голас, хоць і строгі, быў спагадлівы, прыязны. Боль і таварыская крыўда чуліся ў ім. Ён апаліў сэрца. Васіль убачыў вочы — строгія, дапытлівыя — і спыніўся...

У ім нечакана з'явілася няўпэўненасць. Цяпер ужо дужаліся крыўда на Кавалевіча і жорсткая праўда тых слоў. Баклан быў самалюбівы і таму не ўмеў лёгка прызнаваць праўду за другім чалавекам.

Задумаўшыся, ён пабрыў па вуліцы,— у хатах дзе-ніздзе свяціліся агні. У адным акне фіранку не зацягнулі, і з вуліцы было відаць, як стрыжаны бялявы хлопчык чытае кнігу. Маці і дзве дзяўчынкі слухалі хлопчыка. Баклан прайшоў паўз акно, нічога не заўважыўшы.

«Праўда — як жа гэта я?»

Упершыню за два гады ён азірнуўся назад, стаў пераглядаць тое, што рабіў. Улетку сорак чацвёртага года разам з атрадам ён вярнуўся ў вызвалены раён. Тады яго выбралі старшынёй сельсавета; былы падрыўнік амаль нічога не рабіў на сваёй пасадзе, толькі выступаў з дакладамі ды ўспамінамі аб партызанах. Сельсавет быў адсталы, але старшыню гэта не трывожыла. У райвыканкаме, шануючы яго заслугі, таксама абміналі гаварыць на гэтую прыкрую тэму.

Потым, каб паставіць старшынёй іншага чалавека, Баклана паслалі на курсы.

Ён спачатку пакрыўдзіўся, але, прыехаўшы на курсы, хутка ўсё забыў. На курсах было нават лепш — ён быў паважаным чалавекам і пры гэтым не меў асаблівага клопату.

Яго заўсёды выбіралі ў прэзідыум; з музея прыходзілі людзі, якія запісвалі ўспаміны; аднойчы заявіўся да яго мастак маляваць партрэт.

І нарэшце апошняе — тры месяцы таму назад яго прыслалі сюды, у гэты калгас. Старшыні пашанцавала на добрага намесніка, і ён, Баклан, па прывычцы і далей жыў бесклапотна — часта ездзіў гуляць у горад, лавіць рыбу на Прыпяць.

Яму было прыкра, няёмка ў гэтую восеньскую ноч, калі ён пачаў перабіраць свае ўчынкі за апошнія два гады. Ён здзівіўся, што не заўважаў усяго гэтага раней.

З вуліцы Васіль павярнуў на выган, адтуль праз калгасны сад зноў прыйшоў у сяло, ужо з процілеглага боку. Ён сам не ведаў, як апынуўся каля Гаўрыльчыкавай хаты. Можа, яго прывабіў агеньчык, бо гэты агеньчык свяціўся цяпер адзін на ўсё сяло. Была поўнач. Хаты стаялі чорныя і маўклівыя.

У пакоі сядзелі Кавалевіч і Рыгор. Баклана пацягнула да іх. Ён ступіў да ганка, але спыніўся. Упершыню за ўсе гады іх знаёмства задумаўся, як будзе паводзіць сябе з імі, што гаварыць.

Ён пастаяў крыху і рашыў не заходзіць. Не чакаюць яго. Ды і позна.

Усе ж яму хацелася пабыць з імі, паслухаць іх. Чаму яны яшчэ не спяць? Пра што яны гавораць? Ці не пра яго?..

Васіль бачыў: Кавалевіч устаў, узрушана прайшоў па пакойчыку, схаваўся за акном. Ён тут жа зноў вярнуўся да стала, спіною загарадзіў святло. Кончыкі валасоў на яго галаве ад святла былі залацістыя.

Баклан адступіўся ад акна.

Ён пайшоў па вуліцы — непаспешліва і, здавалася, зусім спакойна. Куды яму было спяшацца?

Васіль спыніўся каля нейкага агародчыка. Абапершыся спіною аб штакеціны, доўга стаяў нерухомы і маўклівы. Збоку магло здацца, што ён спіць.

Яго абудзіў вясёлы дзявочы рогат. Потым высокі жаночы голас бесклапотна заспяваў:

Я дзяўчынка маладая,
Мне ўсяго сямнаццаць лет.
Палюбіла брыгадзіра
За яго аўтарытэт...

«Чаго ёй так весела?» — з непрыхільнасцю падумаў Васіль. Ён пазайздросціў, што не можа так весела засмяяцца...

Васіль схамянуўся, адчуў, што замёрз, паварушыў плячыма ад холаду, зірнуў у неба. Там цямнелі ледзь прыкметныя абрысы хмар. Толькі каля гарызонта адзінока свяцілася зорка, але ад яе бляску Васілю стала халадней.

«Памыліўся... Хіба гэта памылка?»

Трэба было некуды ісці. Ён з намаганнем адштурхнуўся ад шурпатых, вымаклых штакецін і пабрыў прывычным кірункам дахаты.

Неўзабаве, аднак, спыніўся, пастаяў нерухома трохі, нібы раздумваючы. Ісці дамоў не хацелася.

Вецер нечакана данёс прыцішаны далечынёю гул трактара. Васілю і раней быў чутны гэты гул, але тады ён не даходзіў, не ўзрушаў, бо хлопца поўнілі неспакойныя думкі.

Цяпер Васіль стаў услухоўвацца ў гул, як у добрую, блізкую душы музыку. Ён стаяў і слухаў хвіліну, другую. Потым раптам рашуча павярнуў назад, праз вузкую вулачку хутка шырокімі крокамі пайшоў у поле, на бадзёры гул, што абуджаў цішыню.

Ён яшчэ не думаў, не ведаў, чаго туды ідзе... Сяло засталося ззаду ў неглыбокай лагчынцы. Справа, непадалёк, як нейкія дзіўныя жывёлы, чарнелі дрэвы — сад. У полі па ахутаным змрокам іржышчы хадзіў стыглы неспакойны вецер, намагаўся сарваць шынель.

Гуркатанне трактара набліжалася. Вось ужо відаць, як у яркім зарыве святла весела завіхаюцца постаці.

Васілю зрабілася лягчэй. У сэрцы засвяцілася штосьці яснае, светлае, падобнае на зарыва каля малатарні.

Калі Баклан падышоў блізка, малатарня спынілася. «Што там?» — занепакоіўся Васіль і паскорыў крок.

Малатарня стаяла. Каля яе, акружаны людзьмі, юнак у шарсцяным світары з закасанымі рукавамі, які быў машыністам, выцягваў шылам з разарванага паса абрыўкі ўшывальніка. Убачыўшы Баклана, людзі расступіліся, далі яму дарогу.

— Ушывальнік ад паса парваўся...— сказаў машыніст апраўдваючыся.

— Ну а запасных ушывальнікаў хіба няма?

— Няма...

Баклан заўважыў на сабе некалькі здзіўленых позіркаў — не прывыклі тут бачыць яго.

— Чаму няма? Ты што — не ведаў, што можа парвацца?

— От, чорт!.. Казаў жа... Няма... У МТС няма!

— Яны ўжо другі раз у яго рвуцца,— сярдзіта ўставіў нехта з жанчын.

Пасылаць за ўшывальнікам у сяло — значыць марнаваць час. Шкада часу. Але што рабіць?

Баклан неспадзявана расшпіліў свой партызанскі пояс, працягнуў машыністу. Той, не цямячы, запытальна зірнуў на старшыню.

— Рабі ўшывальнік.

Машыніст паглядзеў на пояс, пакруціў яго ў руках, любуючыся добрай глянцавіта-бліскучай скурай, зіхатлівай афіцэрскай пражкай. Ці не жартуе старшыня, аддаючы на глум такую добрую рэч? Але па позірку Баклана было відаць, што ён не жартуе і што трэба спяшацца...

Хутка пас быў сшыты. Людзі разышліся, сталі на свае месцы. Трактарыст уключыў прывадное кола «ХТЗ».

Пас крануўся, пасунуўся да малатарні, спачатку лена, павольна, пругка пакалыхваючыся, а затым — усё хутчэй, хутчэй. Падавальшчык падаў у барабан развязаны сноп.

Барабан перастаў ляскатаць, зашумеў басам, натужна, старанна, цяжка. Людзі, што стаялі на сцірце і каля барабана, пачалі спрытна завіхацца. Баклан з няведамай даўно цікаўнасцю сачыў за іх хуткімі ўмелымі рукамі, адчуваючы, як імклівы тэмп гэтага жыцця захапляе, зава6лівае яго. Васілю захацелася таксама падняцца на сцірту, якая пахне сухой саломай, стаць поруч з гэтымі спрытнымі людзьмі.

Ён скінуў з плеч шынель. Хвілінай пазней Васіль стаяў ужо на сцірце, падаючы сноп, і зачэпліва, з усмешачкай, крычаў штосьці жанчыне-суседцы.

Малатарня не спынялася, яна прасіла ўсё новых і новых снапоў. І Васіль ахвотна падаваў.

Потым Баклана бачылі каля вагі, дзе ён правяраў запісы вагаўшчыка, каля вазоў, што адвозілі поўныя важкія мяхі ў свіран, каля машыніста...

Быў ён яшчэ на ржышчы каля Чорнага лесу — правяраў, як трактары аруць уначы.

Неба на ўсходзе непрыкметна набракла пунцовай чырванню, і навокал шырока расчыніліся ціхія, па-ранішняму чыстыя далягляды. Паветра стала празрыстае і марознае. Ён адчуваў сябе вельмі зmoраным, бо даўно не рабіў гэтак.

На сэрцы было па-ранейшаму неспакойна і прыкра.

З усіх думак, што прайшлі ў ім тут, у полі, яму асабліва запомнілася адна: «Калі ты чалавек заслужаны, то старайся быць уперадзе». Яна здавалася яму найбольш важнай і справядлівай.

Нараджаўся дзень. Ён прыносіў Баклану новыя клопаты. Трэба было ісці на двор — накіраваць на ссыпны пункт фурманкі з бульбай. Трэба было... Старшыня яшчэ не ўяўляў усяго, што менавіта трэба зрабіць яму за гэты дзень, бо не ведаў, што рабілі ў калгасе ўчора.

З-за далёкага поля выглянула сонца. На ржышчы ад першых праменняў заблішчала раса, пераліваючыся вясёлкавымі колерамі. Баклан, стомлены і задумлівы, ішоў праз поле, падмінаючы ботамі вільготную пожню. У пераблытаных валасах яго тырчалі саломінкі. Шынель на ім, як звычайна, быў унакідку.

Уваходзячы ў сяло, каля калгаснага двара, старшыня ўбачыў знаёмую, крыху сутулаватую постаць Кавалевіча, які разам з Гаўрыльчыкам ішоў у поле. Баклан занепакоіўся, мімаволі прыкрыў шынялём ордэны.

— Як гэта ты паспеў нас апярэдзіць? — здзівіўся Гаўрыльчык.— Даўно ўстаў?

— Устаў,— усміхнуўся сам сабе Баклан.— Ды не, нядаўна... Можна сказаць, толькі што...

Яны прывіталіся.

Кавалевіч кіўнуў галавой у бок сяла.

— Ну, хлопцы ў вас! — у яго з партызанскага атрада засталася звычка называць усіх мужчын хлопцамі.

Баклан зірнуў туды і за ніклымі голымі яблынямі, каля высокай бярозы, што схіліла задуменна на бок вяршалінку, убачыў зруб Кацярынінай хаты. Наверсе стаялі ўжо ўсе кроквы і да паловы, да папярэчын, быў прыбіты радамі паплёт.

Калі яны разышліся, Васіль у другі раз кінуў позірк у бок зруба. Свежаацёсаныя бярвенні, як бронзавыя, блішчалі ў праменнях сонца...

## На рацэ

Мы сядзелі ўтраіх на беразе ракі: бялявы, па-юнацку зграбны лейтэнант з чамаданам і рэчавым мяшком, пажылая калгасніца з плеценым кошыкам і я.

Лейтэнант меў ад сілы гады дваццаць чатыры, а нашай спадарожніцы можна было даць, здавалася, і ўсіх сорак пяць, калі не больш. На ёй была акуратна пашытая і выпрасаваная шавіётавая жакетка, з-пад якой выглядвала чырвоная ў палоску кофтачка. На галаве жанчыны цвіла яркімі кветкамі святочна-новенькая хустка; над абветраным смуглаватым ілбом віднеліся кранутыя сівізной цёмна-русыя валасы.

На пясчаным беразе ракі — навокал нас — было ціха. За намі ляжалі складзеныя ў штабель папяровыя мяшкі з суперфасфатам, вялікая скрынка, у шчылінах якой можна

было бачыць металічныя часткі нейкай машыны; на скрынцы чарнелі надпісы: «верх», «ніз», «не кантаваць». Каля мяшкоў і скрынкі сядзеў, спакойна пакурваючы, дзед у пацёртым да хромавага бляску кажушку,— відаць, вартаўнік. У тым баку метраў праз пяцьдзясят, на ўзгорку, жаўцеў будынак канторы прыстані, дзе памяшчалася каса, жылі начальнік прыстані і вартаўнік.

Быў ясны, халаднаваты дзень вясны. Паводка ўжо сышла, але Прыпяць разлівалася яшчэ значна шырэй, як летам. У лазняку, пры якім мы ўладзіліся на мурожнай лапінцы, спусціўшы ногі ў пясчаную ямку, віднеліся падсохлыя палосы зляжалага ілу і рознага намытага бруду, якія сведчылі, што нядаўна тут плёскалася рака. Другі бераг — нізкі, балацяны — у многіх мясцінах быў яшчэ схаваны вадою, якая блішчала глыбокімі залівамі і цэлымі азёрамі.

Выгляд шырокай ракі, яснага і празрыстага вясновага прастору весяліў вочы.

Мы чакалі парахода, што затрымаўся недзе каля Пінска.

Жанчына, паправіўшы марлю на кашолцы, якую яна трымала на каленях, пацікавілася, адкуль лейтэнант родам і куды едзе. Лейтэнант адказаў, што едзе з Далёкага Усходу дамоў, у адпачынак.

— У мяне сынок таксама ў арміі, у Германіі. Служыць другі год,— паведаміла яна вайсковаму, памаўчаўшы хвіліну.— За шафёра, на машыне, працуе. Піша, што жывецца яму там у арміі добра — і кормяць добра, і адзяваюць, і навучыўся ён многаму... Толькі я вось трывожуся надта за яго: неспакойна становіцца ў гэтай Заходняй Германіі...

Яна пацікавілася, куды я еду; я сказаў, што еду па справе — па меліярацыі — у Каржоўку.

— А, то добра... толькі вы гэта не да нас, а ў суседні раён. Я — з «Новага Палесся», можа, чулі? Завуць мяне Васіліна Карпаўна, Крэнь па прозвішчы.

Яна зноў перавяла позірк на лейтэнанта, уздыхнуўшы, запыталася, ці ваяваў ён.

— А як жа. Амаль з сорак першага... Спачатку тут, у партызанах,— мне толькі пятнаццаць стукнула, калі я прыйшоў у лес. А потым — і ў арміі: вызваляў, будучы ў чыне сяр-

жанта і старшага сяржанта, гарады Катовіцы і Прагу. Гэта пасля ўжо я трапіў на Далёкі Усход.

— Такі малады, а ўжо ваяваў,— уздыхнула жанчына.

— Ну што ж, хіба я адзін такі?

Ніхто лейтэнанту на гэтую выказаную філасофскім тонам сентэнцыю не адказаў. Васіліна Карпаўна з-пад далоні невялікімі, глыбока запалымі вачыма глядзела ўніз на ваду, на якой хмурылася рабацінне, што ціха падбягала да берага.

Мы нейкі час маўчалі. Цішыня, рачная пространь, пустата чакання — усё гэта наводзіла на роздум, а скупыя шчырыя словы трывогі нашай знаёмай пра свайго сына стваралі настрой інтымнай блізкасці між нас, асаблівай чуласці. Я адчуваў, што Васіліну Карпаўну хвалююць нейкія свае думкі, чакаў, што яна хутка даверыць нам іх, падзеліцца з намі... І праўда, яна неўзабаве загаварыла.

— Пагана — калі ў маладыя гады чалавек жыве цяжка... А я і зусім не ведала, што такое маладосць. Нібы адабралі ў мяне маладосць...

Лейтэнант, паправіўшы накінуты на плечы шынель, на пале якога ён сядзеў, зацікаўлена зірнуў на яе:

— Як гэта адабралі?

— А так, адабралі... Бо чым мне яе ўспомніць? Прайшла — і добрага знаку не пакінула. Вось так, як цень ад хмары ў полі ці на балоце — бачылі? — прабяжыць і прападзе за лесам, і нічога пасля сябе не пакіне.

— Ну што-небудзь жа засталося ў памяці?

— Засталося. Толькі больш такога, што і ўспамінаць не хочацца...

— А ўсё-ткі помніцца і добрае?

— Ну вось, помню, як Кандрат — чалавек, значыцца, мой — прыязджаў сватаць. Мне тады і сямнаццаці поўных не было... Помню, праўда. На вяселлі пасадзілі нас на дзяжу,— а тую дзяжу раней накрылі вывернутым кажухом...

— Каб былі, значыцца, багатыя і шчаслівыя?!

— Выдумалі, невядома для чаго. Усё — цемната людская...

Гаварыла яна ціха, расцягваючы словы, і крыху аднастайна, нібы думала ўголас,— у яе гаворцы адчувалася

20. Зак. 1877

ўраўнаважанасць чалавека, які многа бачыў у жыцці. Хоць жанчына здавалася з першага позірку крыху абыякавай, усё ж, прыслухаўшыся, лёгка было заўважыць, што яна ўвесь час стрымана хвалюецца — то непакоіцца, то спачувае; гэта ажыўляла яе сіняватыя, запалыя, але дзіўна ясныя, маладыя вочы, прыдавала ім нечаканае хараство і прывабнасць.

— Выйшла, значыцца, я замуж, стала гаспадыняй. Гаспадыняй — гэта так, толькі к слову сказаць. Якая там гаспадарка?! Зямлі два моргі, хатка — трухля адна — проста дзівішся, як яна яшчэ стаіць... Біліся як рыба аб лёд. Кандрат мой усю вясну аж да самай прыборкі хадзіў па людзях, ставіў хаты. Часам і плыты ганяў тут на Піне ды Прыпяці. Бывала, і вымакне, і папакалее — да костачак... Ад таго ўсё ламала ў яго ногі. Жартачкі...

Я пазіраў на раку, на сонечных зайчыкаў, што пераліваліся, зіхацелі справа, стараўся ўявіць цёмную дажджлівую ноч і плыты і не мог. «Чаму яна гаворыць пра мужа, нібы яго цяпер няма?» — праплыло ў мяне ў галаве, але я змаўчаў.

— Ды і вам, відаць, не лягчэй было? — прамовіў лейтэнант.— Як мужу, так і жонцы...

— Ну, мусіць жа... Я таксама прырабляла. Ткала коўдры... У нас і цяпер часам кажуць, што ў мяне — залатыя рукі. Гэта ад той пары... От не буду хваліцца, але як вытку пеўняў ці кветкі — дык не інакш жывыя. Удалая на руку была! Бывала, суседзі прыходзілі падзівіцца: «Ото ж коўдра,— хваляць,— як фабрычная!..» — Яна ўздыхнула: — Коўдры гэтыя, дарожкі прадавалі на хлеб...

— Невясёлая гісторыя...— зноў адгукнуўся лейтэнант. Ён слухаў вельмі чула, час ад часу ўстаўляў свае заўвагі, выказваў свой настрой, неспакойна папраўляючы на плячах шынель, пазіраючы на мяне, нібы шукаў падтрымкі. Ён быў з тых людзей, што любяць і ўмеюць слухаць.

— Дзень у дзень, дзень у дзень адно і тое ж — хата, поле, кросны. Як заваражаная!.. А калі што і было прыкметнае, то толькі крыўда. Многа было яе. Многа! Усякі, каму хацелася, мог пакрыўдзіць!..

Век не забуду аднаго дня. Дваццаць з лішкам год мінула, а і цяпер, як прыпомніш, паверыце, кіпіць усё нутро. То ж арыштавалі тады Пятра — брата майго. Нейкі нелюдзь выказаў, што Пятро, значыцца,— бальшавік. Наскочыла паліцыя, зрабіла вобыск, лістоўкі там супроць паноў, ці што, знайшла,— і павялі ў пастарунак!

Я, як толькі даведалася, што ён у Нялюбічах у пастарунку, адразу — хлеба ў торбу ды хутчэй туды.

Прыбегла задыханая,— паліцыянты не пускаюць! Як я ні прасіла, ні маліла,— не пусцілі. Адзін яшчэ,— помню, выкшталцоны такі, хванабэрысты, з казырком да самых вачэй,— стаў падсмейвацца з мяне: «хлопка», бачыце, «быдла», «яму нічога не трэба — і так здэхне».

А я, скажу, хоць і цёмная была, і ў падранай кофце, але — гордая. Нікому я не даравала здзеку з сябе!

Лейтэнант з павагай і нават захапленнем паглядзеў на яе і задаволена прамовіў:

— Вось і ў мяне маці такая!

— Загарэлася я. Аж рукі дрыжаць. «Хутчэй ты сам здохнеш», кажу. Ён адразу падскочыў, як аса яго ўкусіла, пачырванеў: «Цо-о! Псякрэў, бальшавічка! Што ты кажаш, псякосць?!» Падбег да мяне і выцяў кулаком. А я ўсё роўна не магу змаўчаць яму. У мяне яшчэ большая злосць на яго. «Тое, што чуў... Усе вы хутка здохнеце!» Тут і іншыя наляцелі, як звяры, сталі біць. А я ўсё сваё крычу: «Здохнеце... Здохнеце!» Спачатку крычала, а потым ужо і гаварыць не магу. Жартачкі. Так збілі — у роце поўна крыві.

Адцягнулі мяне ад пастарунка і кінулі каля плота. Я, можа, там, каля плота, і зайшлася б. Ды толькі людзі наказалі Кандрату. Запрог ён каня — прыехаў па мяне... Палажыў на сена. А я ляжу ды ўсё хрыплю: «Здохнеце!.. Усе вы, нелюдзі!..»

З той пары, прыкмячаю, пачала я нядужаць. Штосьці такое пашкодзілася ўнутры. Дыхаць стала неяк цяжка, нібы паветра не хапае. І хрыпіць усярэдзіне... Адным словам, не магла ўжо я ачуняць... Праўда, і каб лячыцца па-людску, то не лячылася. У бальніцы за адны суткі трэба было аддаць сем злотых. Каб месяц паляжаць, дык і кароўкі не хопіць.

А яна ж адна... Ну, і калі хварэць? Паляжыш крыху, аддыхаешся і, абы толькі хадзіць здолеў,— адразу за працу.

Яна памаўчала задуменна, потым, прывычным рухам выцершы далонню сухія губы, прамовіла з вінаватай усмешкай:

— Мусіць, сум на вас толькі нагнала?

— Ну што ж, з песні слоў не выкідваць,— адказаў лейтэнант.— Якая доля, такія і словы... Ды і мая маці не багата шчаслівейшая была...

Ён, напэўна, стаў бы расказваць пра сваю маці, але я перабіў яго.

— А што ж з вашым братам?

— З братам? Ды судзілі. На восем год засудзілі. Сядзеў ён у Гродні, і ў Бярозе быў, аж да самага верасня... Сем год і восем месяцаў! Толькі чатыры месяцы і не даседзеў...

— Гэта не ён у Гракаве, у райкаме? — пацікавіўся я.

— Ён, Пятро,— прамовіла Васіліна Карпаўна.— З мінулай восені там... Раней дык ён у Бродах у эмтээсе быў, а летась выбралі ў райкам...

Ён, Пятро, яшчэ пры Польшчы ведаў, як мы будзем жыць, калі вызвалімся. Ведама, камуніст... А я была, што асенняя ноч. Вы думаеце, я заўсёды была такая, як цяпер?.. Калі ў нас арганізаваўся калгас, думаеце, я адразу пайшла? Не. Кандрат намерыўся быў падаць заяву, дык я так на яго насела. «Ты што,— кажу,— распетрыць дабро хочаш? Дзяцей сіратамі па свеце пусціць? Не пайду і табе не дазволю. Не дазволю!» І ўламала яго. Жартачкі. Што ж яму было рабіць са мной?

— Сямейная баталія. Спроба наступаць і — рашучае контрнаступленне!.. Штосьці падобнае было і ў маіх, карціна знаёмая,— сказаў мне лейтэнант.

— Баялася яго, калгаса.

— А чаго ж яго баяцца?

— Сама не ведаю... Усё, думаю, было б добра, каб не ён. І зямлі досыць, і конь, і кароўка — усё, што трэба...

Нацярпеўся, харошыя вы мае, са мной Кандрат. І так ён падыходзіў да мяне і гэтак — нічога не дапамагае. Я такая, што, пакуль сваімі вачыма не ўбачу, не паверу. А калі не паверыла,— то ніхто не прымусіць мяне рабіць не па-мойму.

— Ну і што ж, доўга не верылі вы? — запытаўся я.

— Паверыла я толькі на другі год. Уступілі мы ў калгас... Ды позна паверыла! Прыйшлі ў нашы Вербавічы немцы, не адны прыйшлі, а прывялі яшчэ — каб яму немач! — графа Хвастовіча, які ўцёк у верасні.

А яшчэ праз год паліцаі схапілі Кандрата. Уламаліся ў хату ўвечары, перакапалі ўсё ў сенцах, на гары, на двары. Збілі яго — страх успомніць — і павалаклі. Дапытваліся, куды прыходзяць партызаны, толькі нічога не дапыталіся. Потым Кандрата перагналі ў Броды... А там — і след яго прапаў...

— І што — нічога невядома пра яго?

— Як і не было чалавека...

— Эх, гáды. Колькі людзей перавялі! У нас у сяле сямнаццаць чалавек расстралялі ў сорак другім,— сказаў лейтэнант да мяне.— Нейкая падлюга выдала...

— Гаравала я дужа па ім. Доўга ўбівалася. Толькі горам бядзе не паможаш. А трэба жыць — за дзяцьмі глядзець, на мне ж яны засталіся. Добра хоць, што пачалі патроху падрастаць, з большымі — і клопат іншы...

Паразумнела, праўду сказаць, за вайну. І, калі германцаў прагналі і ў нас зноў калгас арганізаваўся, я адразу пайшла. Чула: з такой чарадой, як у мяне, без людзей не агарацца...

Пазалетась — от так на прадвесні — выбралі мяне на сходзе за брыгадзіра. Жартачкі сказаць: брыгадзір! Вы — людзі бывалыя і, мусіць, да ўвагі прызвычаеныя, вам, можа, і смешна: брыгадзір, падумаеш, начальства!

— А што ж, на ўсякай пасадзе знойдзецца клопату.

— Я дык чаго тады перажыла — расказаць не раскажаш. І радасна: от і мне, учарашняй «хамцы», вераць, даручаюць такую справу. Радасна было і — страшна: божа, як я спраўлюся з ёю, я ж ніколі не ведала нічога, акрамя сваёй хаты ды поля свайго. «Не,— кажу я,— за ласку дзякую, але не згодна. Дарэмна выбіраеце мяне. Не спраўлюся». «Справішся. Дзе адна не здолееш, дапаможам»,— зашумелі людзі. «Гэта і добра, што ты сумняваешся,— крыкнула аднекуль з кутка Адар'я, суседка мая,— значыцца, да справы сур'ёзна будзеш брацца!»

Угаварылі. Дамоў я ішла ў клопаце. У галаве назолаю розныя трывожныя думкі. Як прыйшла дадому, бачу — не засну, дый годзе.

Прыбрала ўсё са стала пасля вячэры, паслала настольнік. Надзейку, дачку, адправіла спаць, а сама прыкруціла кнот у лямпе і села каля стала. А на сэрцы, як і раней,— і сонца, і хмары. У хаце ціха, толькі ходзікі на сцяне — ціктак, цік-так, а я сяджу і думаю, думаю, што буду рабіць. Можа, да поўначы прасedзела так... От як я прыняла сваё брыгадзірства!

Пра тое, як я працавала, не буду казаць. Асабліва багата клопату было летась — з тым аўсом, што на Мокрым, на тарфяніку. І славы, і клопату. Пустазелля — адкуль яно толькі бралася? Ну проста забівала поле! Зноў жа, колькі турбот, каб авёс не палёг. Жартачкі... На балоце глеба далікатная — ёй трэба асобы догляд...

— Далікатная... Гэта точна! — пацвердзіў тонам знаўцы лейтэнант.

— Бывала, з галавы тое Мокрае не выкінеш. Іншы раз і няма чаго ісці ў поле, а цябе цягне — проста так, як да дзіцяці, каб праведаць: як ты, маўляў, тут без мяне?

Часта прыязджаў таварыш Хмялеўскі, сакратар наш. Ці то едзе з райкама ў нашы Вербавічы, ці то проста па тракце куды-небудзь едзе, у які калгас ці сельсавет, абавязкова спыніць сваю «Пабеду» і зойдзе на Мокрае. Не праміне... цікавіўся вельмі.

Многаму мне давялося павучыцца з тым Мокрым. Ляжала балота век перад вачыма, мазоліла вочы,— а як прыйшлося да справы, то аказалася, што я нічога пра яго не ведаю. У балотнай глебы свае капрызы. Тут бы мне і ўзяцца за навуку пра балота, а я паспадзявалася на практыку сваю ранейшую, падумала старой дарожкай ісці.

Цераз гэтую навуку далася я ў знакі аграному спачатку. На нажах, проста сказаць, былі. Ох і злаваў тады на мяне Сцяпан Ігнатавіч, агараном наш!.. Аднойчы нават «сляпой» абазваў, ей-богу, так і сказаў — «сляпая»...

— А ў вас, аказваецца, характар востры!

— Я часта спрачаюся больш цераз гонар, абы не паступіцца. Такая прывычка: вось і ведаю, што не мая праўда, а ўсё роўна не здаюся! Бы сябе зганьбіць баюся, ці што... Так і са Сцяпанам Ігнатавічам — спрачаюся, а пасля падумаю, падумаю, ды і раблю, як ён кажа...

Жартачкі: кніжкі пачала чытаць. Хай не думае, што я неразумная баба! Заўважылі мае жанкі, што я гэта чытаю, і нават жартам празвалі — «балотны прафесар». Так мяне цяпер часта завуць, асабліва Адар'я, насмешніца, тая ледзь што — «балотны прафесар»!

— Так і называе? Балотны прафесар? — лейтэнант засмяяўся.— Прыдумала ж!

— Яна прыдумае. Язык у яе — лёгкі на выдумку ўсякую!.. От жа разгаварылася,— схамянулася Васіліна Карпаўна.— Другі раз слова не выцягнеш, а тут, як само льецца. Ну, ды ўжо, калі пачала, давяду да канца... І жыта было добрае, і ячмень удаўся, а авёс, што на Мокрым, на спрадвечным балоце, дык на дзіва людзям.

У мяне яшчэ і цяпер снапок таго аўса хаваецца для гасцей: часта прыходзяць з навакольных сёл, ды і здалёку прыязджаюць,— паказваю, бо ёсць такія, што на слова не верацъ. А чаго тут не верыць! Быццам ужо рэдкасць гэтакая?.. На Бабруйшчыне, чытала я, яшчэ лепшы авёс вырасцілі... Будзеце ненарокам у Вербавічах,— сказала яна раптам да лейтэнанта, потым да мяне,— і вас таксама запрашаю: калі ёсць цікавасць, заходзьце паглядзець... Наш авёс цяпер ёсць і ў Мінску, у інстытуце...

У гэты час з-за пясчанага, з крутым берагам, мыска паволі выплыў невялікі светла афарбаваны параход, што шумна біў пліцамі па вадзе. Лейтэнант, надзеўшы шынель і зашпільваючы яго, стаў разважаць, ці ўдасца яму да вечара дабрацца да вёскі, да якой ад ракі было яшчэ не менш за пятнаццаць кіламетраў. Ён з неспакоем паглядзеў на чамадан, перавязаны двума плеценымі рамянямі, на салдацкі рэчавы мяшок. З такім багажом ісці пехатой будзе нялёгка!

— От, не люблю ў дарозе з рэчамі цягацца. Гэта толькі таму, што ў адпачынак еду: падарункі маме, ды браценікам,

і сястрычцы... А так — толькі рэчавы мяшок: закінуў за плечы — і гатоў!..

— А маці і не ведае, мусіць, што вы едзеце! От жа будзе шчасце, як убачыць!..— твар Васіліны Карпаўны засвяціўся добрай матчынай усмешкай.

Мне падумалася: якая яна, напэўна, клапатлівая аб сваіх дзецях і як добра разумее чужую радасць.

Лейтэнант пайшоў да касы браць на ўсіх білеты, і мы на беразе засталіся ўдваіх. Васіліна Карпаўна паставіла кашолку да ног, абаперлася аб калені локцямі; цяпер яна ўвесь час маўчала, думала аб нечым сваім, згорбіўшыся і пазіраючы нязводна ўніз, на залацістую, варухлівую каёмку берага. Твар яе, нерухомы, з маршчынкамі, нібы застыў, скамянеў і здаваўся значна старэйшы, як раней.

Прыстань, дасюль маўклівая і пустая, хутка ажывала. Каля касы вырасла непрыкметна чарга чалавек з дваццаць. Да берага падышоў грузавік з белым надпісам на кузаве «пошта»,— ён спыніўся поблізу, чакаючы парахода; потым падляцеў, падскокваючы, ківаючыся з боку на бок, нізенькі «Масквіч». Да месца пасадкі два мужчыны сталі падносіць нейкія бочкі.

Параход, які перастаў дыміць і малаціць пліцамі па вадзе, ярка бялеючы свежай фарбай кают і поручняў, падыходзіў да берага ціха, падуладны толькі рулю. На гладкі пясок пачалі, плёскаючы, пенячыся, даганяючы адна адну, кідацца, паўзці бруднаватыя хвалі.

...Васіліна Карпаўна ўзяла кашолку і павольна, спакойна ўзышла па хісткіх сходнях, што, выгнуўшыся, віслі над каёмкай берага і паспакайнелай вадою. Я дапамог лейтэнанту занесці на палубу яго мяшок.

Параход захрыпеў, пасля загуў прарэзліва: два хлапчукі-матросы паспешліва сцягнулі сходні на палубу, і мы пачалі адыходзіць ад берага. Параход выйшаў на сярэдзіну ракі. Абапал ціха паплылі берагі: злева — нізкі, зялёны, з балотным хмызняком і шырокімі разлівамі вады; справа, за прыбярэжнай касой, віднелася невысокая града з дрэвамі і вёскай наводдаль.

— Тут большае, можа, і не ў тым брыгадзірстве. Не ў казцы, а ў прыказцы справа. Я інакш бачыць сябе стала. Адар'я нават раз пасмяялася: задавацца, кажа, я стала... І з маіх убораў пасмейваецца. Я от,— можа, і няёмка казаць,— Васіліна Карпаўна крыху збянтэжана ўсміхнулася,— стала больш глядзець за сабой, прыбірацца нешта пачала. Гады ў мяне немаладыя, дзеці выраслі, а я — што гэта са мной?

Бывала, божа мой, ходзіш задрыпаная, абарваная, у латаным зрэб'і і — быццам так і трэба. Ці не ўсё роўна! А цяпер часам хочацца ў люстэрка паглядзець!

Люблю я прыбрацца ды прайсціся ў святочны дзень пад руку з Надзейкай, з меншанькай маёй. Яна ў мяне ружовенькая, высокая ды здаровая — проста мак цвіце. Сямнаццаты гадок пайшоў. У свята — ведама што: людзі сабіраюцца каля хат, на прызбах, на лавачках,— падыдзем, пагаворым пра тое-сёе ды далей. Я часта раблю выгляд, нібы ў краму ідзём, а папраўдзе для таго, каб людзям паказацца: «Глядзіце, маўляў, на мяне, шчаслівую, радую, любуйцеся, якую я прыгажуню-дачку выгадавала!»

Яна ў мяне вучыцца ў дзявятым. Ахвоту вялікую да вучобы мае, асабліва батаніку любіць. Летась усё хадзіла ў лес ці на балота, кветкі-траўкі розныя збірала ды на паперу засушвала. Гербарый называецца... І якія толькі ёсць у нас расліны — усё яна ведае, ды не проста, а па-вучонаму... От, скончыць школу, у Мінск пашлю, на вучоную вучыцца. Няхай ідзе ў людзі!..

Васіліна Карпаўна дастала з кашолкі некалькі кніжак, перавязаных шпагатам, і сказала:

— Вось вязу Надзейцы і сабе — пра каноплі. Сёлета каноплі на асушаным балоце будзем сеяць...— Хвіліну разважыўшы, дадала: — Купіла яшчэ крэпдэшыну ў магазіне. Надзейцы на плацце — з кветачкамі сінімі, і сабе шоўку — чырвоны з белым гарошкам...

— У вас — двое, цётка Васіліна?

— Пяцёра выгадавала. Тры сыны і дзве дачкі. Другая донька — Ганна — у Глінішчах за рахункаводам... А сыны — адзін пры мне, працуе за лесніка. Жаніўся той восенню,

у Вербавічах жа, каля лесу, жыве. Хата яго стаіць от так наводдаль сяла. А другі — Пятро — той на агранома вывучыўся, толькі ў тым годзе тэхнікум скончыў, робіць аж пад Полацкам. А серадольшы — той у арміі, надоечы пісаў — шафёрам служыць.

Баліць у мяне — от кажу — сэрца за яго. Пра іншых меншы клопат, а пра гэтага, бывае, цэлыя ночы думаю. І лістоў вельмі чакаю ад яго. Бывае, пройдзе тыдзень, а ад яго — ні слоўца, дык я быццам сама не свая...

Жартачкі: што яны, амерыканцы, круцяць там, у Заходняй Нямеччыне! Зноў фашыстаў прыграваюць, кулямёты ды мінамёты даюць. Толькі што адно такое ліхалецце пераажылі, дык яны новае рыхтуюць. Мала ім гора людскога ды слёз!.. І пра што там думаюць маткі тых амерыканскіх салдатаў? Ці ім не шкада сваіх дзяцей? Чаго яны маўчаць?..

Эх, не даюць пажыць спакойна! Тут у нас, на сёлах, такія справы ідуць — такія справы... Самы час настаў для людскога жыцця ў нас, а там...

Васіліна Карпаўна сціхла, узрушаная трывогай за шчасце сваёй сям'і, за многіх такіх, як сама. Я з нейкай асаблівай павагай пазіраў на яе, гэтую, на першы позірк, непрыкметную жанчыну.

Насустрач нам шырокімі вільготнымі хвалямі плыў вецер, які абвяваў, халадзіў твар і шыю. Васіліна Карпаўна расшпіліла жакетку.

— Слухаю вас, і даўно карціць спытацца,— скажыце, колькі вам год? — прамовіў я і дадаў, што яна здаецца нейкай маладой душою.

— Я і сама чую гэта... І хто б думаў, што можа яно так стацца... Што... гады сыдуць з плеч! У песні вось спяваюць: «А маладосць не вернецца, не вернецца назад». А яна як бы вяртаецца!

І жанкі мае не раз дзівіліся з мяне. Аднойчы Адар'я мне сказала: «Адкуль у цябе, Васіліна, столькі руху? Ты такая непаседлівая, такая заўзятая. Ну, праўда, заўзятая!.. Мусіць, каб не ты, то ў нас нічога з балотам і не атрымалася б. А з табою — лёгка... Ты, не ўрокам кажучы, як маладая!»

Васіліна Карпаўна засмяялася сарамяжа вачыма, у якіх і вясёлы жарт, і лёгкая іронія з сябе. Я, пазіраючы на яе, перастаў заўважаць і яе маршчыны на твары, і сівізну ў валасах, пасму якіх варушыў пругкі веснавы вецер. Але ўсмешка хутка растала на яе твары,— жанчына загаварыла сур'ёзна і задуменна:

— Маладая! Столькі пражыўшы... Хіба ж гэта ўсё? — голас яе прыціх і задрыжаў.— Я ж, можа, толькі вось цяпер жыць пачала як мае быць. Па-чалавечаму пачала жыць... Дзетак у людзі вывела. Я, можа, толькі цяпер — пры нашай уладзе, дзякуй ёй! — паспытала, што яно такое, жаночая доля...

Васіліна Карпаўна зноў памаўчала.

— Доля... Запозна трошкі ты, маладосць мая, пачала вяртацца. Эх, каб гадоў на дзесяць раней прыйшла! Ужо ж пажыла б я!.. Ну, ды — годзе! Не ўсё яшчэ мінулася. Не ўсё!

Яна стала глядзець наперад, у шырокую, усхваляваную ветрам прасторнасць ракі, куды спакойна, важка ішоў параход.

ПАВЕЛ МІСЬКО

## Вераб'іная ноч

Машына, пакінуўшы за сабою воблака пылу, знікла ў прысадах. Я ўскінуў на руку плашч і пайшоў да белага дома на ўскрайку вёскі. Там я збіраўся знайсці начлег.

Змяркалася. На захадзе крыху пагрымвала, за далёкімі хмарамі ўспыхвалі бліскавіцы.

Я ішоў і думаў пра гэты белы дом, пра цётку Броню, якая была там за санітарку. Мабыць, сядзіць недзе ў сваёй бакоўцы-кухні, бясконца падагравае на электрычнай плітцы вялікі эмаліраваны чайнік — на ўсякі выпадак, п'е мо дзясятую конаўку чаю і курыць. Курыць і думае — прывязуць каго-небудзь ці не? І ў каторы раз бядуе сама сабе:

— Гэта ж трэба — пустуе такая будыніна! Эх, каб мне маладыя гады...

Мы з цёткай Броняй даўнія знаёмыя. Некалі я ўжо начаваў у гэтым радзільным доме. Не ў самім доме, канечне, а ў невялікай прыбудоўцы да яго, дзе пасялялі прыезджых. Помню, прывёў мяне сюды старшыня — чырванашчокі таўсцяк і доўга рагатаў над маім канфузам.

І праўда, чаго толькі не пабачыш у час камандзіровак, у якія сітуацыі не трапіш!

Цётка Броня тады дамывала ганак, павязаўшы паверх белага халата чорны фартух. Яна паказала локцем на лаўку пад акном і хрыпла кінула:

— Пасядзі.

Як скончыла сваю работу, гэтак жа каратка загадала:

— Заходзь. Курыш?

Я пакруціў галавою. З вышыні ганка яна змерыла мяне позіркам, быццам ацэньвала маю мужчынскую годнасць.

Потым частавала мяне чаем і расказвала вясковыя навіны. Голас у яе грубы, мужчынскі. І рухі размашыстыя, мужчынскія. Дастаючы запалкі ці папяросы з-пад чорнага фартуха, яна адкідвала яго ўбок, як салдат крысо шыняля.

Цяпер я глядзеў на двор радзільнага дома і з задавальненнем адзначаў перамены. Вузенькая дарожка да самага ганка была высыпана жоўтым пяском і выкладзена бетоннымі плітамі. Абапал дарожкі за нізкімі, як курыцы пераступіць, парканчыкамі пазіралі з градак сінія, фіялетавыя, жоўтыя браткі.

Цётка Броня зусім не здзівілася майму прыходу, быццам мы бачыліся ўсяго гадзіну назад. Проста адчыніла дзверы і з парога спытала:

— Зноў прыехаў?

— Ага. Тэрміновае заданне...

Цётка Броня наліла мне ў вялізную місу-тазік сцюдзёнай вады — памыцца з дарогі. Потым запрасіла за стол. А сама ўсё грукала мужчынскімі ботамі ад пліты да стала, падлівала мне і сабе чаю, расказвала, хто за гэты час з кім ажаніўся, хто ў каго нарадзіўся.

Я неўпрыкметку разглядаў яе худы, жаўтлявы твар. Каля губ яшчэ больш паглыбіліся маршчыны, попельныя валасы, што выбіваліся з-пад белай касынкі, яшчэ больш пасівелі. Старэе цётка Броня... А яна тым часам гаварыла:

— Перасталі зусім нашы раджаць... Няўжо зноў будзе вайна, і людзі баяцца? Па радыё ўсё пра бомбы, пра атам... От зразу пасля вайны харашыня была... Папрыходзілі людзі дадому... Дзяцей насыпалі, як гароху...

Твар цёткі Броні маладзее, нібы падсвечваецца знутры нейкім цёплым, утульным агеньчыкам. Яна задумліва глядзіць у мой бок, але, мусіць, не бачыць ні мяне, ні гэтага пакоя. Вочы яе харошыя, светла-рудыя, пад колер дажджавой вады, што капае з саламянай страхі. Раптам яны цямнеюць, твар нервова перасмыкаецца. Яна закрывае яго рукою і ўстае з-за стала, ідзе да пліты і там доўга, без патрэбы перастаўляе з месца на месца чайнік. Потым паварочваецца да мяне — на твары зноў спакой і грубаватая прастата.

— Хадзем, пакажу ложак...

На двары ўжо ваўсю гуляла бліскавіца, і сінія ўспышкі асвятлялі палату так, што можна было збіраць іголкі.

Цётка Броня адчыніла дзверы ў бакоўку, паказала на ложак і сказала:

— Калі будзе душна, адчыні ў калідор дзверы.

І пайшла, грукаючы ботамі.

За дарогу мяне, мабыць, добра натрэсла. Не спалася.

Я прыслухоўваўся да шуму за акном. Мне ўяўлялася, нібы там самазвалы згружаюць каменне. Спачатку яно грукатала на цвёрдую дарогу. Потым нібы на падлогу... А вось пад удары трапілі лісты жалеза. Апошні камень — відаць, пудовік — бомкнуў так, што ледзь не выскачылі шыбы з вокнаў. Быццам па гэтым сігнале пасыпаўся на зямлю пясок — дружна, роўна. Маланкі не пераставалі ўспыхваць трывожным, сляпучым бляскам.

Я ляжаў, абдумваў план заўтрашняй гутаркі са старшынёй, каб чаго не забыць. А то потым сядзеш пісаць, цаплап — не хапае фактаў. Спахопішся, ды позна будзе...

Пад роўны шум ліўня ўрэшце я заснуў.

Колькі праспаў — не ведаю. Мусіць, дождж даўно скончыўся і я паспеў прывыкнуць да цішыні, бо прахапіўся ад грукату. Нехта малаціў у знадворныя дзверы.

— Ц-цётка Броня! Ц-цётка!..— чуўся крыху заікасты ці то ад страху, ці то ад хвалявання хлапечы голас.

— Цішэй ты! — шыкнула на яго санітарка.— Тут людзі з дарогі, адпачываюць...— Яна выйшла на ганак і зачыніла за сабою дзверы. Але ўсё было добра чуваць.

— Жонка раджае!

— Усе жонкі, Федзя, павінны раджаць.

— Дык няма ж Алены Пятроўны! Кажуць, павезлі да брыгадзіршы ў Падліпцы...

— Ведаю. Ты ж сам шафёр, запрагай машыну і едзь па Алену Пятроўну... А я тваю Шуру адна прывяду, тут недалёчка...

На ганку затупалі, і ўсё сціхла.

Я паварочаўся з боку на бок і адчуў, што будзе не да сну. У сэрцы заварушыўся нейкі неспакой. Устаў, пахадзіў трохі сюды-туды па пакоі, натыкаючыся на ложкі. Потым пайшоў

на кухню і ўключыў плітку, на якой стаяў яшчэ цёплы чайнік. Вярнуўся назад, намацаў адзенне. Выйшаў на двор.

Неба ўжо крыху ачысцілася ад хмар, сям-там праглядвалі зоркі. Дыхалася глыбока, ажно кружылася галава. Недзе ад сцяны патыхала моцным, густым пахам мацыёлы.

У вёсцы брахалі патрывожаныя сабакі.

Неспакой мой нарастаў. Можа, гэта закрадвалася трывога за незнаёмую мне Шуру? Дзе той Федзя? Ці выехаў у тыя Падліпцы? І ўжо зусім недарэчныя думкі лезлі ў галаву — а раптам усе машыны папсаваліся?

З боку вуліцы пачулася таропкая хада, шорах і нібы стогн ці войканне. Я кінуўся туды.

— Ідзі спаць! — адпіхнула мяне рукою санітарка і загрукала ботамі па цэментавых плітах. Шура ішла побач з ёю і нібы зямлі не краналася.

— А я думала, галубка, што табе яшчэ рана... Ажно, дзякуй богу... Так і ў Фёклы, што за Алесем Некрашом, было — на два тыдні раней. І яшчэ які здаровы хлопец удаўся!

Вялікі псіхолаг, аказваецца, гэтая цётка Броня...

Я не знаходзіў сабе месца. Каб прабавіць час, то выходзіў на вуліцу, то набліжаўся да ганка. Бачыў, як снавала з кухні ў палату цётка Броня, нешта насіла.

Урэшце пад'ехаў, расплёскваючы лужыны, грузавік. З аднаго боку кабіны вываліўся Федзя, пакульгаў у мой бок, з другога лёгка выпырхнула Алена Пятроўна. Я ведаў яе яшчэ па сваім першым прыездзе сюды і цяпер адразу пазнаў. Яна дробненька пратупала абцасікамі да ганка.

Каля мяне абазваўся Федзя, і я ўздрыгнуў. Хлопец быў чамусьці толькі ў майцы і штанах, абуты ў адзін бот — другі трымаў у руках.

Я ўсміхнуўся і паказаў на лаўку пад акном:

— Хадзем прысядзем.

Федзя слухаецца мяне. Прысеўшы, паспешліва закурвае. Я таксама прашу прысмаліць.

— Мазалі? — кіўнуў на яго босую нагу.

— Што? — не зразумеў хлопец.

— Ну — бот чаго ў руках носіш?

— Які? Ах, гэты... Каб яго пярун... Забыў зусім! Ведаеш, як стала з жонкай нядобра рабіцца, я за боты і абувацца. Адну абуў, а другая не лезе. Памацаў, а там малаток ушчэмлены. Мабыць, брат меншы пастараўся. Патузаў-патузаў, ды так і пабег...

Федзя засоўвае руку ў халяву і... зусім лёгка дастае малаток.

— Ах, каб яго пярун! — І стаў абувацца.

Мы дымім папяросамі.

— Як вы думаеце — не памрэ? — пытаецца Федзя і пільна ўглядаецца мне ў твар.

— Ды што ты! — аўтарытэтна заяўляю я.— Цяпер ад гэтага не паміраюць.

— Яна ў мяне баязлівая...

З дому якраз чуецца прарэзлівы крык. Федзя глядзіць на мяне спалоханымі вачыма і ўскоквае, як падмецены. Кідаецца на ганак, адтуль — у калідорчык. Але там чуецца бас цёткі Броні, а неўзабаве і сам Федзя ледзь не потырч ляціць па прыступках назад.

Я саджу яго зноў на лаўку, накідваю на плечы свой пінжак. Мне чамусьці робіцца смешна, я зусім супакойваюся, але нічога не кажу. У нейкім здранцвенні маўчыць і Федзя.

І вось на ганак выходзіць Алена Пятроўна. Паліто накінута наапашкі. Весела цокаюць па прыступках абцасікі. Кінула шаферу:

— Віншую — дачка... Паехалі!

Федзя стаў бацькам... Падумаць толькі — хвіліну назад сядзеў каля мяне проста Федзя, бялявы, з вострымі хлапчукоўскімі плячыма чалавек, і раптам ён становіцца бацькам, нібы адразу падымаецца на некалькі рангаў вышэй.

І хіба ўсе бацькі бываюць вар'ятамі? Бо чаго яму накідваць мне на галаву мой жа пінжак і галёкаць:

— Дачка! Дачка!

Ужо з кабіны Федзя крычыць мне:

— Мы зноў у Падліпцы! Брыгадзіршу забярэм...

Я застаюся адзін. Цётка Броня ўсё тупае, клапоціцца. Выскачыла на двор, набрала ў калодзежы вады. І тады ўжо заглянула на хвіліну да мяне, прысела.

— Добрая дачка ў Федзькі... Тры кіло трыста...

Яна ўздыхае і прагна прыкурвае. А я думаю аб дзіўнай пары ў жыцці чалавека, калі ўсе яго вартасці вымяраюцца толькі кілаграмамі.

Пад раніцу, як пачало ўжо сінець неба, а ў садзе ля крайняй сялібы прачнуліся і зацвінькалі птушкі, Федзя прывёз брыгадзіршу з сынам і Алену Пятроўну.

Але і пасля гэтага было не да сну. З суседняй вёскі прывезлі на фурманцы яшчэ адну парадзіху. Як казала мне потым, зноў прысеўшы на лаўку, цётка Броня, дзяўчына і разочку не войкнула, не застагнала. Толькі губы кусала — бледныя, бледныя... І быццам бы не рада нават свайму дзіцяці...

Цётка Броня нарвала з грады росных братак і панесла ў палату. Вярнулася зноў да мяне,

— Дала ёй кветкі і жартую: нейкі хлопец на веласіпедзе прывёз. Падхапілася, рыбка, вочы загарэліся... А потым абвяла, кінула іх на тумбачку, адвярнулася да сцяны...

Памаўчала трохі, уздыхнула:

— Ох-ха-ха... Ну, хіба ж можна так убівацца? Грэх забіць чалавека, а нарадзіць...

Я нічога не гавару, а толькі слухаю.

— Дзвюх дзяўчынак сёння прыдбалі і аднаго хлопца...— задуменна гаворыць цётка Броня.— Кажуць: дзяўчынкі — на мір...

Яна зноў уздыхае.

Я ўспамінаю, што мне трэба лавіць старшыню калгаса, дзякую за начлег і развітваюся. Яна ўсміхаецца ў адказ:

— Вераб'іная ноч у нас з табою была...

Ля веснiц мяне спыняе Федзя. Мурзаты, што камінар: нешта не ладзілася з маторам.

— Вы ўжо ідзяце? Счакайце хвілінку — падкіну да канторы.

Ён дастае з-пад сядзення анучку і выцірае рукі. І нечакана гаворыць:

— Эх, напісалі б вы пра цётку Броню... В-ведаеце, што гэта за чалавек? — Ён заікаецца, не знаходзіць, што сказаць, і махае ў адчаі рукой: — Немцы яе дзяцей спалілі... Разам з дзедам... Яна да сваякоў якраз хадзіла тады, таму і ацалела.

Я азіраюся на цётку Броню. Яна сядзіць на лаўцы пад акном, паклаўшы на калені рукі і падставіўшы сонцу твар. Мусіць, задрамала.

## Не поле перайсці

Той год доўга не было снегу. Пад вясну ж, нібы спахапіўшыся, увабралася ў сілу зіма. Пад раніцу прыціскаў мароз, круціла завіруха. Але пракідаліся і сонечныя, нібы святочныя дні, ціхія, зорна-месячныя ночы. Кожны дзень Яўген Мікалаевіч праседжваў каля акна доўгія гадзіны. У добрае надвор'е адчыняў нават фортку і, захутаўшыся цяплей, падсоўваўся бліжэй да яе. Усё глядзеў на вуліцу. І маўчаў: абзавецца раз ці два за дзень да жонкі, выцісне слова — другое — і ўсё. Уздыхне Вольга Андрэеўна, паставіць яду на стол і зноў схаваецца на кухню, кусаючы ў горнасці і крыўдзе губы. Яўген Мікалаевіч, бывае, забудзецца і сашчыкае, з'есць нішчымны хлеб. А ў дні, калі Вользе Андрэеўне трэба было ісці на работу ў бальніцу, мог і не ўспомніць пра яду, не крануць нічога цэлы дзень.

Ён быў увесь у мінулым...

Заставаўся адзін — і гэтае мінулае абступала, навальвалася нясцерпным цяжарам. Заціснуты ў сэрцы, прыглушаны боль рос, запаўняў усю істоту, спазмамі падступаў да горла, душыў... Ірваў тады каўнер, гайсаў на мыліцах па кватэры. «Алёшка... Што ты нарабіў, Алёшка?!»

На двары ўсё нагадвала яго — Алёшку, Аляксея Пракопавіча. Маленькімі галінкамі ківаюць крохкія клёнікі —

голенькія, бездапаможныя... Вясной, калі іх садзілі, Аляксей Пракопавіч стараўся больш за ўсіх: і камандаваў, і ямкі капаў, і дарожкі разбіваў. Тады нават Яўген Мікалаевіч не вытрымаў, выйшаў на вуліцу. Курыў з мужчынамі, трымаў дрэўцы, калі прысыпалі зямлёй і прытоптвалі карані.

Цяпер скверык спаласован ва ўсіх напрамках сцежкамі. На іх, коўзкіх, не затрымліваецца снег. Людзі стараюцца хадзіць паўз бок, усё больш і больш абтоптваючы цалік. Вунь ля таго разгалістага дрэўца Аляксей Пракопавіч заўсёды спыняўся. Грузны для сваіх няпоўных пяцідзесяці гадоў паварочваўся да акна, адшукваў вачыма яго, Яўгена Мікалаевіча, усміхаўся, падымаў кулак — трымайся, стары! — і крочыў да аўтобуса.

А то бачыў Яўген Мікалаевіч, як выбягалі на двор сыны Аляксея Пракопавіча: вытрэсваць палавікі. Тузане большы, Юра, і меншы, Паўлік, не можа ўстаяць — брык! Пацеха... Тузане меншы, а той хоць бы што. Нездарма служыў на флоце. Рагочуць абодва, чыста дзеці малыя.

Як сваімі сынамі, цешыўся імі Яўген Мікалаевіч. Яны заўсёды былі разам. Юра — каржакаваты, у флоцкім адзенні, і Паўлік — тоненькі і, здаецца, нават вышэйшы, таксама ў флоцкіх, братавых штанах. У кіно — разам, у магазін — разам. Няхай трэба купіць якое кіло цукру ці буханку хлеба, усё роўна ідуць удвух. І ўсё нешта расказваюць адзін аднаму, смяюцца... Вельмі рэдка такая дружба паміж братамі.

А Аляксея Пракопавіча ўжо няма. І гэта — праўда. Неверагодная, недарэчная ў сваёй жудаснай беззваротнасці.

«Уставай! Уставай! Ту-ру, ту-ру!» — прарэзліва прагучаў за акном піянерскі сігнал. Непадалёку ад акна спыніліся і пачалі спрачацца, каму чарга трубнуць, хлапчукі.

Яўген Мікалаевіч апускаецца ў крэсла-каляску. Хапаецца за галаву, заціскае вушы. О, гэтыя трубы...

За акном тады рыдала медзь. А ён з немым лямантам у грудзях кідаўся па кватэры, як кідаецца ў гарачцы цяжка хворы чалавек.— Пайду... Канечне, выйду!.. Два словы ўсяго... Бывай, скажу... І даруй, скажу...

Ступаў колькі крокаў да дзвярэй і... круціў галавою:

— Не магу! Жывы ты, Алёшка. Жывы!!! Не хачу цябе бачыць інакшым... Не хачу!

Усё, што адбываецца за акном, гэта проста нейкі бязглузды спектакль!.. Ха! Ха! Яны, там, за акном, не ведаюць, што Аляксей Пракопавіч жывы! Гэта ж яго голас чуе Яўген Мікалаевіч:

— Давай будзем, як салдат з салдатам... Як мужчыны, урэшце...

— Давай.

— Што табе далі гэтыя цырымоніі з аперацыямі? Гавары.

— Але ж я не чурбаком-абрубкам хачу быць! Не кавалкам жывога мяса... Ды што ты разумееш, гарадчук! Ты, можа, ні разу ў жыцці і босы не хадзіў!.. А я і сёння чую, як пячэ ў падэшву росная трава!

— Дапусцім, я такі бот, што і, праўда, нічога такога не разумею. Але — ты мне глядзі ў вочы — што табе далі гэтыя дзевяць аперацый? Хіба ў цябе сталі здаровымі ногі? А мо проста калекцыю асколкаў збіраеш? Бранчаць вось у каробцы... А ты палічыў, колькі ўжо гадоў прайшло пасля вайны? Каляска... Мыліцы... І псіхам стаў. А жыццё ідзе! Працуюць жа людзі, карысць прыносяць. І бязрукія ёсць сярод іх, і бязногія...

— Перастань... Удару!

— Прабач... І пакінь, калі ласка, мыліцу. Або бі ўжо, але слухай. Мы ж дамовіліся: як мужчыны... Дык каму патрэбна твая хворая нага? Табе? Жонцы? А можа, мне ці яшчэ каму? Маўчыш...

Якой страшнай можа быць шчырасць друга! І як часам не хапае ў нас сілы цаніць яе, асабліва гэтую — страшную...

Дасюль усё неяк выкручваўся, сотні агаворак прыдумваў, пераконваў сябе, што рабіў гэтыя гады правільна. А перад бязлітаснымі словамі сябра ўсё нікла, рассыпалася. Далікатны Аляксей Пракопавіч! Ён так і не сказаў яму тады ў вочы: «Шкурнікам ты стаў, паважаны Яўген Мікалаевіч! Сябелюбцам і шкурнікам — думаеш толькі пра сябе...» Вось пра што тады ішла гаворка, а не пра тую няшчасную нагу.

А ён жа нагаварыў тады Аляксею Пракопавічу ў гарачцы і злосці чорт ведае чаго!

— Лёгка табе павучаць... У вайну толькі драпанула...— загнуў на руцэ адзін палец.— Пасля вайны ад'еўся на звыштэрміновай — два! Пенсію цяпер аграбаеш, дай божа,— тры! На тваім месцы я таксама хадзіў бы для прыліку на работу. Яшчэ і іншых павучаў бы!

Аляксей Пракопавіч неяк дзіўна ўдыхнуў паветра. Нібы не хапала яго. І пачаў уставаць — бокам... Падаўся да дзвярэй. І ўжо адтуль выдыхнуў:

— Эх... ты!..

І выйшаў.

— Аляксей Пракопавіч! — Ірвануўся за ім. Забразгалі, пасыпаліся на падлогу шахматы, хрупнуў пад нагою «кароль».— Я пагарачыўся! Аляксей Пракопавіч, мы ж дамовіліся — па шчырасці...

Стукнулі, як адрэзалі, дзверы.

І хто ж яго ведаў, што Алёшка ўжо даўно быў смяртэльна хворы. І нікому ні слова: ні сям'і, ні яму. Як выйшаў у адстаўку, і дня дома не прабыў. Пайшоў працаваць. Не дзеля заробку — грошай хапала з пенсіі. Проста не мог чалавек без людзей, без работы. І памёр на рабоце: проста за сталом сканаў...

На другі дзень іх сваркі...

А можа, нічога гэтага і не здарылася б, каб ён затрымаў яго тады, папрасіў прабачэння. Дык не ж, Яўген Мікалаевіч рабіў усё якраз наадварот.

— Ну і ідзі! Падумаеш...— гайсаў з адной мыліцай па пакоі, трушчыў шахматныя фігуры. Спатыкнуўся аб другую мыліцу, схапіў яе і — храп аб калена!

— Жэнечка, што з табою? — вярнулася якраз з работы жонка.

І заўсёды вось так — нячутна, у самы непадыходзячы момант.

— А ты чаго? Выйдзі!!! — затрос абломкамі.

— Жэня, а на мяне за што? — сказала жалліва так, з ціхім дакорам. Прайшла, не гледзячы на яго, зачынілася на кухні.

І праўда, за што ён тады вызверыўся на яе? Хіба не яна аддавала яму ўсё сваё жыццё? Да драбніцы, да крупіначкі...

За другім бы жыла, як чалавек... Дзяцей бы дазволіла мецць сабе...

Так, усё гэта так! Але ж яму ад гэтага не лягчэй! Яму ўжо невыноснымі сталі і клопаты яе, і ўздыхі, і пакорлівыя, поўныя любві і спагады вочы... Усё! Можа, у грудзях за гэтыя гады перагарэла ўсё на вугаль...

Яўген Мікалаевіч падымаецца з каляскі. Стук-рып, стук-рып... Няма спакою мыліцам.

А на добрае, то поўзаць бы табе на каленях перад ёю... Рукі, ногі цалаваць...

Яўгена Мікалаевіча зноў цягне да акна. Хлапчукі зайшлі ўжо ў канец квартала, іхняе «ту-ру!» ледзь чуваць. Шыбы здаюцца гарачымі, яны ніяк не студзяць лоб...

У той дзень, калі хавалі Аляксея Пракопавіча, амаль увесь скверык быў запоўнены людзьмі. На тратуары — у чырвані і ёлках — чакала машына. Плакала, галасіла музыка. Вясёлае зіхценне новенькага аркестра так супярэчыла моманту, так рэзала сэрца, што хацелася ў шаленстве крышыць, таптаць гэтыя інструменты нагамі...

Двое хлопцаў падавалі на машыну вазоны. Дзяўчына акуратна расстаўляла гаршчочкі з кветкамі абапал доўгага, ледзь не на ўвесь кузаў, нізенькага пастамента, каля чырвонага салдацкага абеліска з зоркай.

«Юра і Паўлік... І Тамара, Юрава нявеста...» — пазнаў Яўген Мікалаевіч.

Так, апошні час Юра стаў хадзіць з дзяўчынай, а не з Паўлікам. Вось з гэтай самай Тамарай з суседняга дома. Белатварай, з цёмнымі, доўгімі косамі... Хадзілі амаль штовечар, браліся за рукі, размахвалі. Як перажываў братаву здраду Паўлік, як пакутаваў і раўнаваў! Нават Юравы штаны перастаў насіць. Аляксей Пракопавіч гаварыў, што рыхтуюцца спраўляць вяселле.

І тут — на табе...

Няўцямна глядзеў Яўген Мікалаевіч, як ставілі на машыну труну з нябожчыкам, як праз увесь квартал выстраіліся людзі. У руках — падушачкі з ардэнамі, і вянкі, вянкі...

І толькі як завуркатала машына і паціху пасунулася наперад, а малы барабан рассыпаў дроб, колкі холад прабег па спіне: «Ды як гэта? Ужо?!»

Так! — енкнулі ў роспачы талеркі, а барабан загрукаў, як мёрзлыя груды па труне...

— Я ж не развітаўся... Стойце! — ірвануўся праз увесь пакой.— Алё-о-ша-а! — крыкнуў нема, хрыпла. Заблытаўся ў дарожцы мыліцай — прэч яе! — Алёша, дружа мой...— Нясцерпны боль працяў навылёт мозг.— Алёш...

І ўпаў без памяці. Пластам на ўвесь калідорчык...

Пасля пахавання Аляксея Пракопавіча пайшоў ужо другі месяц. І якраз столькі часу прайшло з таго дня, правільней — начы, калі «хуткая дапамога» павезла Яўгена Мікалаевіча на аперацыйны стол. На дзясятую, апошнюю аперацыю...

Другі месяц... А ён, як і раней, то на мыліцах, то на калясцы. Праўда, кульця зажывала добра, хірург хваліў. Толькі не зажывала, не рубцавалася сардэчная рана: «Алёшка... Што ты нарабіў, Алёшка?»

К вечару вецер заціх. Яўген Мікалаевіч падцягнуў крэсла бліжэй да форткі, зноў надоўга ўсеўся ў яго. Слухаў, як парыпвае, нібы капуста, снег пад нагамі людзей, як звіняць галасы неўгамоннай дзятвы.

Па тратуары прагульвалася пара. Яўген Мікалаевіч ведаў іх. Гэта акцёры-пенсіянеры. Мужчына далікатна і грацыёзна падтрымліваў пад руку жанчыну. Яна трымала на павадку маленькага, з рукавіцу, сабачку...

Пад акном загаварылі. Галасы маладыя, знерваваныя.

— Не маўчы... Чаму ты ўсё маўчыш? — настойваў жаночы голас.

— А што?

— Ну — мы ж распісацца дамовіліся... Вяселле...

— Не трэба зараз пра гэта.

Пачулася ўсхліпванне — прыдушанае, сутаргавае.

— Перастань, чуеш!

— У нас... У нас... будзе маленькі...

Упала дрогкая цішыня. Мужчына шумна ўздыхнуў.

— Можа, яшчэ абыдзецца... Можа, здалося...

— Праўда, Юра...

Зноў уздых і цяжкае рыпенне снегу пад нагамі.

Яўген Мікалаевіч зачыніў мыліцай фортку: як быццам спецыяльна сеў, каб падслухоўваць чужыя тайны. І толькі калі ад акна пайшлі двое, пазнаў — Алёшаў хлопец... І Тамара. Нешта кальнула ў сэрца. Памяць паслужліва ўзнавіла размову слова ў слова. «Дык Юра — нягоднік? Алёшкаў сын здольны ашукаць?» — Яўген Мікалаевіч спалохаўся ўласных думак. А сэрца забілася ў грудзях гулка, трывожна, балюча, і гэтае біццё ўсё нарастала. «Не можа быць... Ён не такі... Не можа быць!»

А сам, таго не заўважаючы, ужо рухаўся па пакоі, штосьці намацваў, штосьці шукаў у цемры — з асцярогаю і разлікам лунаціка. Ён не помніў, як апрануў паліто, як выйшаў на вуліцу.

Снег пад мыліцамі не рыпеў, а ўскрыкваў — віскатліва, з енкам. Яўген Мікалаевіч кідаў уперад цела рыўкамі, укладваючы ў кожны кідок усю сілу саслабелых за доўгія гады мышц.

Не, ён не дапусціць... Юра не можа быць нягоднікам...

За домам Юры і Тамары не было. Ён аббег суседні дом, зазірнуў у пад'езды — пуста. З тым жа імпэтам праскочыў вуліцамі вакол квартала — няма...

Стаў на ганку свайго дома, слухаў, як бухае сэрца ў грудзях, як млява трымцяць саслабелыя рукі, нага. А як пацішэла сэрца, пачало дыхацца раўней — і думаць пачаў больш цвяроза. «Ну чаго я выскачыў? Што я гаварыў бы яму ці ёй, каб і сустрэў? Яны ж яшчэ самі не пагаварылі толкам... Не абдумалі ўсяго... І адкуль я ўзяў, што ён нягоднік?» І ўсё ж стаяў, не маючы сілы прымусіць сябе вярнуцца ў кватэру.

— Жэня, ты?! Божа мой...— пачуўся ля яго здзіўлены, усхваляваны голас жонкі.

Ён даўся завесці сябе дадому, як маленькі. Вольга Андрэеўна пасадзіла яго на канапу, зняла тапачку і доўга расцірала нагу — спрытна, ласкава, далікатна.

А ён сядзеў у здранцвенні і ўсё думаў, нават не заўважаючы гэтых турбот, яе самую. Ён быў думкамі на заснежаных вуліцах, там, куды яго настойліва клікала жыццё. Ён нібы выглядаў адну пару з усіх маладых пар. Бацькоўскае, нязнанае раней пачуццё запаўняла яго.

## Амяла на бярозе

Як падхапілася з цёмнага Харытоніха, дык яшчэ і не прысела, не прылегла. Ухадзілася па гаспадарцы, падмяла, папрыбірала. Як прачнуўся і выйшаў з тае хаты прымак — дзябёлы мужчына з заспаным, ацеслівым тварам — паставіла яму яечню-сядунку. З'есць і з хлебам, не да блінцоў ёй сёння.

А ў самой ні расінкі, ні макавага зярняці ў роце не было яшчэ. Начыста забыла, што пара ўжо і ёй душу чымнебудзь пажывіць. Таўклася з кутка ў куток, з пакоя ў пакой, то беручы што, то апускаючы рукі ў нерашучасці і бездапаможнасці. Што ж гэта яшчэ думала ўзяць? Ну што? Забыла! Чарната ў галаве, чысты правал...

Харытоніха пакутліва моршчыць маленькі і цёмны, нібы закураны тварык, вядзе няўцямна вачыма па сценах. Нібы з туману выплылі, зацямнелі дзве плямы. Ага, партрэты... Нікому яны тут не патрэбны, адно замінаць будуць... Падцягнула ўслончык, узлезла з каленцамі, а потым, пахістваючыся, выпрасталася. Склала пад грудзьмі рукі, задумалася, узіраючыся.

Злева — Харытонаў партрэт, па правую руку — яе. У драўляных чорных рамках. Мо за год да Харытонавай смерці парабілі іх з нейкіх старых, малюсенькіх і пажоўклых картак. Не памятала, калі і здымаліся на іх. «Згадзяцца! — сказаў тады нейкі заезджы партач.— Такія зробім — ахнеце!» Схаваў картачкі ў вялікі, як рэзгіны, партфель і пацягся ў суседнюю хату. Мо і не рашыліся б пераздымаць тыя картачкі, але ж людзі рабілі. Паказваў чужыя, гатовыя ўжо — харошыя, вялікія. Ды, галоўнае, што грошай чалавек напярод не браў. Не ашукаў — праз месяц прывёз. І як тут было не

ахнуць: Харытона толькі па вусах і пазнала. Сядзеў ён пры гальштуку, у цёмным гарнітуры. Божачкі, ён жа ніколі гэтага не насіў... І такі гладкі быў, чысты з выгляду — як жаніх. Ёй жа прымалявалі шырокенькую белую палярыну з кутасамі-бубачкамі на грудзях. Спачатку нязвыкла было, а потым і Харытон, і яна ўпадабалі свой новы выгляд. І можа, якраз за тое, што заказчыкі, якія прыносілі што пашыць, бачылі іх на сцяне інакшымі, чым яны былі ў жыцці,— больш прывабнымі, лагоднымі. Такімі, што можна даверыць ім не толькі адзежу.

Як тут прыступіцца да таго вузельчыка... Харытоніха асцярожна бярэцца за матузок, і ён нават не пэнкнуў, а неяк паціху разлезся ў руках. Іржа пераела. І каб не падхапіла партрэт, то кульнуўся б на падлогу. Пакашляла ад пылу, працерла Харытона рукавом, паклала на стол. Узялася за свой — цвік лёгка выцягнуўся з тынку і застаўся матляцца на почапцы.

Заадно і Багародзіцу з Дзіцяткам. Бачыш ты, як усохла амяла... Харытон неяк падабраў пад бярозаю кусцік, за абраз засунуў. Каленчатыя галінкі з тоўстымі лісцямі зжоўклі і сталі крохкімі. А-яй, колькі пылу на ручніку... Як замуж за Харытона ішла, дык нябожчыца-маці благаслаўляла тым абразом, у пасаг дала.

А гэта ж зноў замуж збіраецца. На старасці гадоў, у чужое сяло за рыжага каваля-ўдаўца Сямёна Кухарчыка. Маецца той над паўдня прыехаць па яе, па куфар...

На добрае, дык патрэбен ёй другі замуж, як дзірка ў мосце. Але ж дзе дзецца? Дзе? Засіліцца хіба ці ў Хлынаўку галавою... Дык жа страшна грэх на душу браць, чарцей цешыць. І без гэтага людзям гаворкі на цэлы год будзе... Ім жа языкі не завяжаш...

Харытоніха злазіць з услончыка, з натугай адчыняе куфар, падпірае цяжкае века кіёчкам. Хіба сюды і партрэты пакласці... Куфар амаль пусты, толькі на дне тонкі сувойчык палатна, дзве посцілкі, некалькі хустак, старамодныя чаравікі з высокімі, ледзь не да калень, халяўкамі. Ляжыць і расшыты гаруснымі ніткамі паўкажушак, крамная спадні-

ца і кофта — «на смерць». Было чаго і больш у куфры, але спрадала, як не хапіла ў Харытона запасаў мураванку закончыць. У доўгім прыскрынку ўсялякая драбяза валяецца: вянок яшчэ з вяселля, падшлюбны пярсцёнак у анучцы, сапсаваны нутраны замок з дзіўным звонам, пачаты пачак нафталіну. Асобна ў газеціне загорнуты грошы — «кацярынкі», аркушы «керанак», складзеныя ў восем столак і нават не парэзаныя, польскія злотыя, патроху савецкіх грошай старых выпускаў, нямецкія маркі з мікалаеўскай і гэтай вайны. Харытон раз дахапіўся да іх, на сметнік павыкідаў. Дык адтуль сабрала — от хай ляжаць, есці ж не просяць, месца не пралежаць. Ці мала што можа быць... Хіба цяпер выкінуць іх? Асабліва вось гэтыя, нямецкія... Цэлыя скруткі марак...

Узяла адзін у руку, другі. І ўжо знік з вачэй і куфар, і тое, што ў куфры. І быццам не ў хаце яна, а на высыпанцы, што на Баранавічы бяжыць, у руках налыгач, побач карова пыльны дзяцельнік скубе.

Сонца агнём смаліць, на ўсходзе пагрымвае. Хацелася б, каб на дождж гэта, на навальніцу. Ды не бура насоўваецца, а фронт, не гром то, а гарматы... А можа, і бокам пранясе навальніцу, пашкадуе Свят Госпадзь, як у пачатку вайны? Праскочыў жа тады немец на ўсход, абмінуў іх — не ведалі, у які дзень нават. Ведама — не было паблізу бітых дарог...

Але пад паўдня запыліла на ўсходзе, пакаціліся адна за адной машыны і фурманкі — з немцамі, скрынкамі, мяшкамі. На некаторых вазах былі нават жанкі і дзеці, у перадках размахвалі бічамі мужчыны з цёмнымі, скамянелымі ад злосці і страху тварамі.

Харытоніха спачатку адвяла карову на палявую дарогу, падалей ад гэтай завярухі, і ўсё вагалася — вяртацца ў вёску ці не. Карова ж яшчэ галодная. Але тым, што перлі без аглядкі на захад, было не да яе, і жанчына пасмялела, зноў прывяла карову на ўзбочыну гасцінца. «Ат, што яны мне зробяць... Як Харытон казаў: не чапай нічога і не бойся нікога...» — І яна нават стала рваць сям-там між збажыны

жменямі канюшыну і папарніцу, падкідваць пад мысу карове — мо пад'есць хутчэй.

Неўпрыкметку прайшла яна за каровай да самай даліны. Прыпусціла ўнізе ў нечую сенажаць — хай ухопіць трохі, усё роўна вайна... І тут на горцы, на самым пуку, дзе яна была з гадзіну назад, узнялася раптам вялікая хмара пылу — бязладна імчала чарада машын. І толькі выкацілі на самы лоб, як нешта заекатала ў небе, пачуліся ўсплёскі, шалясценне, нібы хто моцнай, злубянелай палатнінай затрос. Сярод машын бухнула ўгару зямлёю і агнём, засвірчэла. Упала Харытоніха ў роў і галаву рукамі затуліла: «Свят... свят... свят!» Зямля ўскалыхнулася яшчэ некалькі разоў, камякі шлопалі ў пыл зусім блізка ад яе. Ляжала, пакуль не аціхла ўсё.

На горцы пад адхонам гарэла адна машына. Другая валялася побач дагары коламі. Цягнула паленым мясам. У бок ад дарогі, да грыўкі сеянага лесу, уцякала па жыце пяцёра немцаў — адно галовы і плечы мільгалі. Непадалёку ад машын пераступаў з нагі на нагу вывернуты ў аглоблях задам наперад гняды конь. У рове мітусіліся і люта крычалі адно на другога жанчына і мужчына ў чорным мундзіры. Чалавек у чорным падскочыў да задранай угору храпы каня, хуценька распрог, абярнуў воз назад на колы, ударамі бота пад жывот загнаў каня зноў у аглоблі. Жанчына тым часам кідала з рова ў воз рэчы. Потым палезла наверх сама.

«А божачкі мае... От дурная баба, яшчэ галавою налажу... І чаго мяне няшчасце пагнала сёння...» — Харытоніха, цяжка дыхаючы, цягла за сабою карову. Праскочыць бы хутчэй гэта страшнае месца, а там і паваротак да вёскі, там блізка... Хутчэй!.. І нічога не чуць, не бачыць...

Карова, пачуўшы кроў, зарыкала дурным, вантробным голасам, вырвала з рук вяроўку і паперла краем жыта дадому. Прабегла трохі за ёю Харытоніха, зяпаючы ротам, і махнула рукою — хай яна ўдушыцца...

Міма пралескацеў той воз. Конь зрываўся на нейкі кволы, мітуслівы галоп, прыціскаў азадак да адной аглоблі, хаваючы ад гарапніка абдзёрты бок. Харытоніха зжахну-

лася: шкура матлялася, як кавалак анучы, а ў пыл падалі, робячыся гарошынамі гразі, кроплі крыві...

Збоку дарогі, ля рова штосьці бялела. «Няйначай клунак згубілі тыя...» Харытоніха скіравала туды — не прападаць жа дабру. І толькі нагнулася — гарачыня ўдарыла ў галаву, умлелі рукі і ногі. То быў не клунак, а дзяўчынка гадоў двух ці трох. Увесь ніз белай сукенкі — у крыві. «Божачкі, і чаго мяне ліха прывяло сюды... Хай бы хто іншы знайшоў...» Няўцямна падняла нейкі тоўсты скрутак паперак. «Грошы! Нямецкія маркі!.. Ды поўна ж!» Зводдаль ляжаў яшчэ пачак грошай, нават абклееннны крыж-накрыж паперкамі. Трымцячымі рукамі засунула іх за пазуху. І ў гэты час дзіця застагнала, паклікала: «Мама!» У Харытоніхі шэрхнула холадам скура на спіне, затрэсліся яшчэ больш рукі. Яна разгублена агледзелася па баках, нібы шукаючы ратунку, дапамогі. Але ціха было на дарозе, толькі патрэскваў агонь — дагарала перакуленая машына.

І тады ўзялася здзіраць сукенку і трусікі з цела дзяўчынкі — паспешліва, ледзь не трацячы прытомнасць ад страху і млоснасці. Рана была адна — на правым клубе, але вялікая, ірваная. Шмат, мусіць, крыві страціла... Астаткамі сукенкі сяк-так укруціла нагу, потым загарнула вялае цельца ў хустку і подбежкам, не чуючы ног пад сабою, прыпусцілася ў сяло.

«І што за людзі есць, а... Гэта ж роднае дзіця кінуць!» — таўклося ў галаве сумятліва, гарачліва. І адчувала Харытоніха, якператомлена б'ецца, ледзь не выскачыць сэрца, як затапляюць яго хвалі нейкага харошага, нязнанага раней пачуцця. Жанчыну ахапіў жаль да гэтай слабенькай істоты, у якой ледзь тлела іскрынка жыцця. «Божачкі, хаця б не сканала...» Харытоніха пачала думаць, што ўсё гэта нездарма адбылося, Свят Гасподзь, пэўна, кіраваў яе туды з самага ранку. Значыць, так Богу ўгодна, значыць, ён хоча, каб і ў іх хаце зазвінеў дзіцячы галасок...

— Аёсь, утроба! Не пойдзе на вуліцу, а ўсё ля парога гырчыць, гатовенькага чакае... У-у, каб на цябе воўк! — пачулася на двары. Віскнула свіння, дзынкнуў веласіпедны званок.

Харытоніха схамянулася, грукнула вечкам куфра. «Насцечка з работы вярнулася... Насцечка!» І адразу неяк замітусілася палахліва, быццам заспелі за чымсьці нядобрым, што робяць тайком ад чужых вачэй. Пайшла, прыгнуўшыся, з чыстай палавіны ў пярэднюю, пачала даставаць з палка за печчу сваю пасцель. Склала дзяружку, якой накрывалася, паклала наверх пляскатую, у старэнькай, выцвілай навалачцы падушку. Сяннік... Яго трэба было б вытрасці ў хлеў, выбіць пыл...

— Яшчэ не выбралася? — з’явілася на парозе Насцечка.

— Ото будзе Сямён... Ото будзе...— паспешліва адказала Харытоніха, падбіваючы кулаком падушку.

Прайшла Насцечка, накульгваючы на правую нагу, зазірнула ў чыстую палавіну хаты, крутнулася, падалася на двор. Скачаўшы, узяла ў ахапак сяннік, выйшла за ёю і Харытоніха.

— Ні зялінкі свінчаці няма, ні беднай... Сама то нябось не раз ужо садзілася жэрці...— чуўся з-за хлява, з агарода роўны, звяглівы голас Насцечкі. Яна абломвала бурачнік.

Харытоніха маўчала. Лепш змаўчаць і цяпер, як рабіла гэта і раней. І тады, калі прывяла Насцечка ў хату прымака Піліпа Куксу, і да гэтага, як жывы Харытон быў. Гняла, тушыла ў сэрцы ўсё...

Вярнулася ў хату, дастала з куфра новую, самую прыгожую посцілку, разаслала на ложку. Трэба завязаць у яе падушкі. Людзі на вяселлі заўсёды іх так вязуць — у асобным клунку, на версе куфра. Набухторыла сваю пляскатую, паклала на ніз, узяла яшчэ адну з другога ложка — у прыданае колісь маці дала... Пяць Насцечцы застанецца...

За спіною пачуліся хуткія, няроўныя крокі.

— Гаспадарыць тут, гаспадарыць! — Насцечка вырвала з рук Харытоніхі падушку, шпурнула на ложак, а пляскатую гупнула на падлогу.— Хопіць табе і гэтай!

І насыпка, і навалачка лопнулі паўз рубец. Харытоніха стала лавіць і запіхваць пер’е назад у падушку. А Насцечка падскочыла яшчэ да куфра, перагрэбла ўсё, настармачыла, злосна грымнула вечкам і пакульгала з хаты.

Не бачачы з-за слёз свету, Харытоніха калола іголкай пальцы, зашывала падушку. Завязала яе, аднюсенькую, у невялічкі вузельчык, паклала на куфар і падалася на двор. У хаце было ўдушліва, не хапала чым дыхаць. Хіба дождж пад вечар збярэцца?

Сядзіба іх была наводшыбе, сяло пачыналася толькі за аселіцай. Ад двара і да аселіцы рос сад. Харытон пасадзіў яго ў сорак першым, накраўшы маладзенькіх дрэўцаў з беспрытульнага калгаснага саду. Зараз пад яблынямі, ігрушамі нічога, акрамя чэзлай травы і малачаю, не расло, дрэвы спляліся галінамі. І хоць сад займаў ладны кавалак зямлі, да гэтага ніхто не чапляўся. Наадварот, як прымак пайшоў на работу ў калгас, дык яшчэ прырэзалі пяць сотак на бульбу.

Харытоніха брыла між дрэў, адхіляючы галіны, нічога не заўважаючы вакол сябе. Прыслухоўвалася, як штосьці смокча ў грудзях, як шчымяць, не могучы больш плакаць, вочы.

Вярнулася зноў на двор, пастаяла крыху, падалася на вуліцу, паўзіралася ў адзін бок, у другі — няма Сямёна Кухарчыка... Паўдня ўжо, а яго не відно. Нядобрая, кажуць, прыкмета, калі жаніх позніцца на вяселле...

Прысела на лаўку пад старою бярозаю, задумалася. Над галавою звісалі пасмы даўжэзных і тонкіх, як ніткі, галінак. Але больш было ўчарнелых, абламаных сукоў, кашамі сядзела амяла. Круглы год зелянела, не брала ліха і зімою. Прысмакталася так, што не адарвеш. Нейкае насланнё дый годзе — на ўсім сяле няма гэтай пошасці, а тут... Каб, здаецца, паскідаў гэтыя гнёзды, дык уздыхнула б дрэва вальней, перастала б трухлявець на корані, глядзіш, яшчэ і новыя парасткі пусціла б...

А можа, лепей было б спілаваць гэтую бярозу, спаліць дачыста, пакуль не перайшла зараза на маладыя прысады?

Харытоніха ўздыхае. «Ах, Насцечка, Насцечка... І хто ж мог падумаць, што яна прынясе столькі пакут? І адкуль гэта ўзялося ў яе, ад каго набралася? Здаецца ж, так глядзелі яе... Нібы ягадка расла, налівалася. Апраналі, як ляльку. Харытон дык вельмі любіў яе, ночы напралёт праседжваў над шытвом, усё стараўся больш зарабіць.

Прачнецца, бывала, Харытоніха пасля трэціх пеўняў, а гаспадар усё гарбее над машынаю, грукоча. На рудой ад тытуню ніжняй губе недакурак прысох. Устае ў печы паліць, а Харытон усё яшчэ слепіць вочы.

Бо і то праўда: у аднаго няўмекі рукі не баляць. А Харытон Марымуха быў ого майстар! З усёй ваколіцы сыпаліся заказы. І хто сказаў, што з прыбытку галава не баліць! Няпраўда, ой як баліць. Калі маеш трохі, ёсць за што рукі зацяць, дык хочацца мець яшчэ больш. «А хто сабе не прыяе, хай таму рука ўные». Добра трэба пашавяліць мазгамі, каб да рубля капейка ліпла. І шавялілі. Карову пасвіла сама. Прыводзіла яе дамоў, абвешаную мяшкамі з травой. Сушыла, запасалася на зіму. І масліца, і смятанку, і сырчыкі — усё на базар насіла. А як наставаў сезон яблыкаў, то карова была на Насцечцы,— бывала, што і ў школу не хадзіла месяц ці два. А сама куды толькі не трапляла з яблыкамі!

— Мамка, не едзь нікуды далёка! — не раз прасіла Насцечка.— Я з-за гэтай каровы свету не бачу!

— Сціхні, дурніца! Блізка рубель ляжыць, а далей — два. Дык чаму б не ўхапіць два?

І Насцечка сціхала, задумвалася, цвёрда спаўняла наказ Харытоніхі: не будзь салодкім — праглынуць, не будзь і горкім — праплююць. Не лезла вельмі навука ёй у галаву. Толькі раз узялася было ў ахвоту вучыцца, калі ў піянеры запісалася. Помніць Харытоніха — палаяла тады яе за гэтае «піванерства».

— Усе ўступаюць, а мне нельга? — заплакала Насцечка.

— Чаму ж не... Калі так ужо настаюць, то будзь... Толькі каб я цябе не бачыла ў гэтай чырвонай анучы.

І хавала Насцечка гальштук у сумку, як толькі заварочвала за вугал школы. Перастала смяяцца, пачала грубіць...

— Мама, настаўніца гаворыць, што ніякага Бога няма, а ты мяне маліцца прымушаеш! — кінула раз Насцечка ў злосці.

— Настаўніцы ты больш верыш, чым мне? Ёй грошы за гэта плацяць, каб так казала. І хіба рукі паадсыхаюць, калі перахрысцішся лішні раз?

Схуднела дзяўчынка страшэнна, прахопвацца стала па начах. Вадзіла да Суклюты пярэпалах качаць, паленым воласам падкурвала, зёлкамі паіла — не памаглося. Сумная была, вялая. А то загарыцца раптам, зыркне спадылба, не раўнуючы, як той воўк. Адзін Свят Гасподзь ведае, што яна ў галаве трымала.

Прыбягаюць аднойчы дзяўчаткі.

— А мы да Насцечкі!.. Дзе яна?

— Як дзе? У школе яшчэ, мілыя...

— Ой!..— спалохана войкнула самая меншая і ажно рот рукою затуліла.

У Харытоніхі зазыбалася пад нагамі зямля.

— А што?..— ухапілася рукою за стол.

— Цётачка, яна пабегла даўно са школы... Вось яе кніжкі і паліто. Пасмяяліся хлопцы, што яе знайшлі ў рове, што яна паліцайка, дык...

— А дзіцятка маё-о-о! А залацінка ты мая-а-а-а! — загаласіла Харытоніха.— А які гэта звер цябе падкусіў, каму ты замінала-а? Можа, ты дзе ўтапілася-а-а!

У той дзень і яна з Харытонам, і школьнікі ўсе хаты перабралі, усе ваколіцы аббегалі, па беразе Хлынаўкі лёталі, у лесе хадзілі-гукалі... Як скрозь зямлю правалілася!

Харытоніху, знямоглую, сплаканую, позна ноччу прывялі людзі дахаты. Харытон хадзіў яшчэ ў калгасную кантору, каб пазваніць міліцыі, расказаць пра ўсё... А вяртаўся, дык заглянуў у хлеў — карова з паўдня была някормленая і нядоеная. Там і знайшоў Насцечку. Прытуліўшыся, як да печы, да цёплага бока жывёлы, яна спала, уздрыгваючы і ўсхліпваючы. Як зайшоў чалавек з ёю на руках у хату, ледзь не ўпала жанчына з перапуду.

Поўзала на каленях перад ёю, рукі-ногі цалавала, перапрошвала... Хіба ж можна было сердавацць на іх за такі падман? Хіба ёй кепска жылося?! Хіба не глядзелі яе мудрэй, чым хто родную дачку? А ў якую капеечку, каб падлічыў, абышлося ўсё гэта! Але ж не будзеш лічыць, хіба яны нехрысці якія...

Так і не закончыла Насцечка сёмага класа. Гадоў тры аціралася пры доме. Але не атрымалася з яе памочніцы

і ў хаце. Усяго мо і работы мела, што мух з двара на вуліцу ганяць. Якіх толькі капрызаў яе не выконвалі, як не ўлешчвалі — бы ліхой скуле наравілі. А паспрабуй скажы што не ў масць, дык кошкай у вочы кідаецца:

— Сціхніце! Усё на свеце падман, ашуканства...

Чым далей, тым усё больш ішло наперакасяк.

— Нашто мяне падбіралі? Чаму я не здохла ў рове, як сабака? Чаго мне цяпер калекаю мучыцца, каму я трэба?

Як толькі яна не здзекавалася з іх, як не камандавала...

Гарачымі вугельчыкамі падаюць слёзы на складзеныя ў прыполе рукі. Харытоніха выцірае вочы. Вунь ужо прымак на абед валачэцца... На чыгунцы яго Насцечка падхапіла, як уладкавалася на пераезд паласатую жэрдку падымаць. Тузае чалавека, як хоча. А гэта ўжо не вол, калі яго каровы б'юць... Сквалыга няшчасны: на мураванку паквапіўся, з гурту выбраў курту... Хітрая штучка і Насця: бачыць, што ў калгасе сталі людзі добра палучаць, шмат прывілей калгаснікі маюць, дык прымусіла туды Піліпа хадзіць.

«А божачкі... Што ж гэта я? Як села, дык і прыкіпела... Трэба ж ісці мо што рабіць...» — парупілася яна і нават з лаўкі паднялася. І тут жа адчула, што не зможа больш нічога крануць у гэтым доме нават пальцам. Каб не трапіць на вочы Насцечцы і зяцю, зноў прайшла ў сад. Схавацца б трохі і ад людскіх вачэй...

Пакідала грудамі на курэй, шумнула на хлапчукоў, што падскоквалі за плотам і выкрыквалі: «Харытоніха жэніцца! Харытоніха жэніцца!»

«Адрэзаная скібка... Лішняя ў сваім доме...» — Горкая, як палын, усмешка крывіць губы жанчыне.

— Тр-р! Вазьмі, Коля, лейцы...— пачулася ля двара. Зарыпелі вароты — нязвыкла рэзка, раскаціста: ніколі амаль не адчыняліся.— Вярні сюды... На сябе ляйчыну, а то ў слуп! Эт, калгаснік з цябе!

«Сямён прыехаў! — спахапілася Харытоніха.— І сына з сабою ўзяў...» Яна пайшла да іх, адчуваючы, як слабеюць рукі і ногі, як робіцца млосна ў грудзях. Залішне перахвалявалася. Думала ўжо, што толькі для смеху пасватаўся...

— Ну, здарова была, Юзэфа! — ступіў ёй насустрач Сямён, усміхнуўся, руку працягнуў. Рыжыя валасы выбіваліся з-пад шапкі-скуранкі, а вусы, здаецца, аж ззялі на сонцы чырванню. Харытоніха здзівілася свайму імю — адвыкла ад яго. Дома ніхто і не ўспамінаў пра яго, а на людзях была Харытоніха — і ўсё...

Пацалавала Колю ў лоб, адправіла ў сад назбіраць ігруш.

— Гэта ж камбайн сапсаваўся...— пачаў апраўдвацца за спазненне Кухарчык.— А сонца, бачыш, як смаліць — грэх, каб тэхніка прастойвала ў такі час.

— Ды я нічога...— квола ўсміхнулася Харытоніха.

— А ў цябе ўсё гатова? Я малога сюды захапіў — адбівацца пачаў ад рук без жаночага вока...— нібы не знаходзіў пра што гаварыць Сямён.— Зоні, старэйшай дачцэ напісаў... Пад'едзе з мужам увосень пагасціць, тады ўжо і вечарынку справім. А цяпер, я ж кажу, няма калі ў гулі пускацца.

— Добра, Сямёнка, я ж нічога...

Сямён абышоў воз, пастукаў нагою па ступіцах, перачапіў вышэй атосу на адной аглоблі, стаў папраўляць салому ў возе. А яна ў неразуменні глядзела на ўсё гэта, намагаючыся у памяці ўхапіцца за нейкую думку, а тая ўцякала, выслізвала, як вужака. «Адаб'ецца ад рук без жаночага вока... Адаб'ецца... Без жаночага вока...» Ёй зрабілася страшна. Страшна ад таго, што яна, мабыць, не апраўдае давер Кухарчыка, падвядзе яго. «Хай бы лепш не было гэтага хлапчука... Хай бы не было...»

— Як тут у вас — не пабіў у калгасе збажыны град? У нас дык трошкі захапіў з краю... Мо гектараў два змалаціў... А жыта было, жыта!

— Не ведаю, Сямёнка, дальбог... Яблыкі ў нас трохі папсаваў... Плямы чорныя паробяцца, не будзе ўжо той цаны...— Яна змоўкла, сама адчуўшы, што не гэта цікавіць Кухарчыка: яно дробязнае, мізэрнае...

Чужыя клопаты чужога чалавека... З гэтага дня ён павінен стаць ёй родным і блізкім, яго клопаты будуць і яе клопатамі.

А ці стануць?

Як пуста ў душы, якая зняможанасць... Няма чаго і ўспомніць, а жыццё, можна сказаць, пражыта... «Ды якое ж гэта было жыццё, божачкі мае...» У жыцця была недзе іншая дарога, а яна таўклася на ўзбочыне, як тая карова...

— Ну што — пойдзем?

Пайшлі ў хату. Краем вока заўважыла Харытоніха, як адхіснуўся ад шыбы твар Насцечкі.

Сямён даў цераз парог «Дзень добры!», працягнуў руку Піліпу, а потым Насцечцы. Тая сунула свае ў ваду, быццам мыла пасуду, і толькі кіўнула ў адказ.

— Падсоб чалавеку! — коратка загадала яна Піліпу.

Кукса рыўком, вельмі ахвотна ўстаў з-за стала, ухапіўся з другога боку куфра. Харытоніха ўзяла клунак з падушкай.

— Казаў жа: не трэба ніякага барахла браць, усё ў мяне ёсць. Дык не ж, па-свойму...— гаварыў дакорліва, адступаючы з куфрам у сенцы, Кухарчык.

— То бывайце здаровы! — сказаў Куксу Кухарчык, як куфар паставілі на воз.

— Едзьце з Богам,— адказаў той і не вытрымаў, ухмыльнуўся на ўвесь шырокі, што рэшата, твар.

Паселі спераду воза, паспускаўшы ногі да конскага хваста. Харытоніха ўзяла на калені Колю. Яна адчувала сябе няёмка, быццам пад сотняй вачэй адразу, баялася варухнуць галавою і толькі кідала касыя позіркі па баках і на Сямёна. Што чакае яе з гэтым чалавекам?

На павароце з двара куфар зыбнуўся, клунак з падушкай з'ехаў у пыл.

— Дай ключ! — саскочыў Сямён з воза, рашуча працягнуў да яе руку.

Харытоніха сцялася ў камячок, падала ключ, жаласліва заміргала. Ад Сямёна нібы праменілася нейкая ўладарная сіла, не падпарадкавацца якой проста было немагчыма.

Сыта, задаволена гэкнуў куфар, глынуўшы клунак. Сямён аббіў рукі ад пылу.

Каб на іх ліха... Зноў слёзы. Азірнулася па баках — ці бачылі людзі, што зрабіў Сямён? У грудзях забалела так, нібы адтуль пачалі нешта выдзіраць з карэннем.

Над белымі фіранкамі крайняга акна ўгадваліся два бледныя, нібы ў зданяў, твары: то цікавалі за імі Насцечка з Піліпам.

На момант боль прытупіўся, нібы адлягло, сэрца захліснула цёплая, пяшчотная хваля — як тады, калі несла дадому параненую дзяўчынку. Варухнулася хваля і знікла без следу, як марныя мроі пра шчасце, якога яна так і не прычакала ў гэтай камяніцы.

— Но-о, ідзеш, як спутаны!

Харытоніха ўздрыгнула. Кухарчык круціў лейцамі і кідаў на Юзэфу быстрыя, быццам прыцэньваўся, позіркі.

Жанчына раптам успомніла, што сёння яшчэ нічога ў рот не брала. Пад лыжачкай засмактала, заныла ад голаду, як у хворай, што пайшла на папраўку.

## Гусі мае, лебедзі...

*Светлай памяці маці — Ганны Лукінічны*

Ісці малаціць да снедання маці не будзіла мяне. Паглядзела на маю руку і не будзіла. Раскатурхала толькі ў той хаце, другім пакоі, хлопцаў, Антона і Змітра, зноў вярнулася на кухню, паціху выцягла кудзельніцу з-пад маёй рукі — мы ляжалі на палку пад адной коўдрай, Сярожа ад сцяны,— і акрыла мяне лепш, па самы падбародак. Падчэкнула калыску — заварушылася якраз Таня — і таропка адышла да печы, зноў заскрыгатала жалезнаю качаргою. І мне здалося, што я бачу, як клубкамі завіваецца ў печы попельны пыл, як патрэсквае лучына, сіпяць, ападаючы ў цэбар з памыямі, скурчаныя, крохкія вугалі. А вочы мае ніяк не хочуць глядзець, расплюшчвацца...

Я чую яшчэ, як моўчкі шворацца на печы Антон і Змітрок, як мнуць у руках анучы, каб былі мякчэйшыя, як крэкчуць потым, седзячы на палку,— нагортваюць іх на ногі, абуваюцца ў шытыя, у палоскі, валёнкі з салдацкага шыняля і пакленыя з аўтамабільнай камеры бахілы. Палок уздрыгвае, трасецца разам са мною і Сярожам...

Пазяхаюць хлопцы, не выспаліся, бегалі яшчэ ўчора на вячоркі, хоць і казаў на іх бацька: «Кавалеры смаркатыя... Клаліся б лепш аддыхаць. Зноў будзеце казаць, што кроў ідзе з носа...» Кавалеры яны ці не кавалеры, я не ведаю. Мне здаецца, што яны вельмі нават вялікія — сямнаццаць гадоў і пятнаццаць, не тое што мне — адзінаццаць.

Урэшце хлопцы бяруць ліхтар, і дзверы за імі ляпаюць. І тут, нібы спахапіўшыся, чуецца з той хаты татаў голас:

— Ганна, о Ганна... Пайшлі?

— Пайшлі... Ляжы ты, ляжы...

— Гэта ж я забыў сказаць... Каля акна ў аборы... страха ліхая... Зацякае там... Хай бы адтуль спачатку выбралі снапы. Бо пацяплее — парасце жыта...

— Не парасце... Не будзе чаму расці: коп тры засталося.

— А Міша што — ляжыць?

— Ляжыць... Рука, як таўкач.

— Дурань дурны... Хай бы не браў так папраўдзе... Не прыпускаў... А мо ён вялікі цэп браў? Не той, што я яму зрабіў...

— Але! Хіба ён падыме мужчынскі... Лоб бічом расквасіць. Ляжы ты, не надрывай сэрца.

— Спраўней утрох малаціць... Хоць маленькая, а помач...

Бацька асцярожна, перарывіста ўздыхае і тут жа закашліваецца, стогне — глуха, сцяўшы зубы.

Маці нешта паспешліва ставіць у вілачнік, яно падае, аж страляе аб падлогу, бяжыць да бацькі.

— Ну, што ты? Ну што? Мо памагчы павярнуцца?

— Н-не... Ум-м-м... Ты ідзі... Глядзі там сваё... Дай толькі, мо што чысцейшае ёсць... Скарэў ручнік...

Мама яшчэ раз прабягае сюд-туд, на хаду пагушквае калыску і зноў падступае да печы. Я воч не расплюшчваю, а ўсё роўна нібы пагойдваецца перад позіркам не то полымя лучыны, не то скрываўлены бацькаў ручнік. У таты часам ідзе яшчэ ротам кроў, асабліва калі закашляецца.

Дровы — яліна і вольха. Яловыя трашчаць, нібы хто ўвесь час падсыпае на агонь солі... Не, гэта страляюць... Захліпаецца, строчыць ад чыгуначнага пераезда кулямёт. Немцы

пускаюць трасіркі веерам, над самымі стрэхамі, каб было горш страшна — адпужваюць партызан. «Усмаляць, каб яны галовамі налажылі...» — гаворыць нехта... Іржуць, ляцяць па вуліцы, з хаты чуваць, коні, рыпяць палазы... Божухна, зноў той самы сон-ява... Каторы раз адзін і той жа сон!..

Бухаюць стрэлы, нема ржэ, як чалавек крычыць, конь. Нібы топіцца жывёліна... Наш Гнедка, замулены, з разбітымі капытамі, змэнджаны... Партызаны кінулі замест кабылыжаробкі. Вылечылі мы, выняньчылі яго... Во, зноў грукат і крык... Во... Але ў нашай хаце ўжо: усе таўкуцца, снуюць пасярод хаты — вялізныя, да столі, незразумела страшныя. А можа, гэта толькі цені хістаюцца па сценах? Ад смалякоў цені... Гараць на прыпечку смалякі... «Ма-а...» — цягне заплаканы, мурзаты Сярожа за маміну спадніцу. Верашчыць, надрываецца на руках у мамы Таня. «Мікалайка, дзетак пашкадуй! — нажом рэжа матчын лямант. Яна ўсё заходзіць, заступае з дзіцем наперад старасту Кураку.— Мікалайка... Мы ж табе дагаджалі!.. Мы ж табе наравілі!..» Курак хістаецца то ўлева, то ўправа, са шчарбатага рота вырываецца смярдзючы самагонны дух. «Я, бр'ят ты мой, сказаў — і ўсё! Адыдзі!» — адгрэбае маму з дзіцем руляй пісталета ўбок. Я адрываю Сярожу ад мамы, падсаджваю на лаву, за стол, лезу сам — каб не стапталі. «А я сказаў: не паеду і не павязу! — адмаўляецца бацька.— Восьмая гадзіна: зловяць немцы за сялом — на месцы рошаць!» — «Я табе галаўней за немцаў! Вязі ў Пасрэднікі! Мой загад!..» — «Запрагу, едзь сам, калі не знайшоў лепшага каня. Хай ты бокам...» — бацька прачыняе дзверы ў сенцы, ступае цераз парог. «Верамейка!..» — матчын ускрык. У парозе агонь і гром... «А-а...» — слаба ўскрыквае, нібы задыхнуўшыся, бацька і хіліцца ўперад, скрабе пальцамі па дзвярах. Дзверы адчыняюцца больш, стукаюць аб лесвіцу — стаіць за дзвярыма лесвіца на вышкі лезці. Цела бацькава падае глуха, без стуку. «А-а-а! — немым голасам крычу і я.— А-а-а!!!» Кідаюся з лавы, лячу ў сенцы, следам за ўсімі — у крык, у галашэнне...

І прахопваюся...

— Ціха, сынок, ціха...— сціскае мяне маці аберуч, садзіць на пасцелі, накрывае ногі да калень.— Ціха, сынок, Сярожку разбудзіш... Цьфу! Цьфу!..— цалуе яна мяне ў вочы і сплёўвае.— Цьфу! Куды ноч, туды і сон... Мо табе даць вады каўтнуць?

— Курак у сенцах! Курак! — вырываюся я, трасуся.

— Няма Курака... Ну што ты, дурненькі... Ты прыляж яшчэ, прыляж...— маці гладзіць па галаве, па плячах, па спіне, і я чую, як прыліпае ад поту сарочка. Рукі ў мамы дрыжаць, яна не ведае, што гаварыць: — Можа, табе пад галаву вышэй падкласці? А мо блінчык з'ясі, ото гатовы будзе?

Я зашываюся пад коўдру з галавою. Крокаў маці не чуваць, стаіць, мабыць, прыціснуўшы да грудзей рукі, глядзіць на мяне.

— Ох-ха... Што ён там, Ганна? — стогне бацька.

— Ляжы... Заснуў бы і ты, Верамейка... Не ведаеш — што?

Я задыхаюся, высоўваю галаву з-пад кудзельніцы. Сон ужо да мяне не ідзе. Я нават баюся заснуць, каб зноў не прыснілася, не паўтарылася...

Лучына тоўстая, з абалоні, гарыць неахвотна і цьмяна, урэшце зусім тухне. Мама не запальвае другое, абірае бульбу амаль што наманы. Невясёлае полымя з печы слаба асвятляе яе смаглы твар, і яна здаецца мне чырванаскурай індыянкай.

У печы, мабыць, таксама тухне, бо маці пачынае варушыць агаркі качаргою і лаяцца: «Каб вас агонь высмаліў... Спалнулі смалякі, а вольха закурала, распарылася і ляжыць...» Выгрэбвае некалькі вугалькоў, адшчэпвае ад лучыны вострую, як вязальны пруток, трэску, знанава выдзьмухвае агонь. Зноў запальвае лучыну, запальвае смалякі. У печы весялее, лепш свеціць ужо і лучына. Маці зноў хапаецца за нож.

Я не люблю лучыны... Няма лепш, як газа ёсць. Але яе нідзе не дастаць — ні за маркі, ні за савецкія грошы. У нас яшчэ ёсць нейкая кропля, заліта ў ліхтар. Без ліхтара — якая цёмначы малацьба?

Некаторыя палілі ў газоўках і бензін, насыпалі ў яго солі, надзявалі на трубачку з кнотам кружок з сырое бульбы.

Тады не так хапаецца ў сярэдзіну гарэць. У цёткі Матрэны, суседкі, якая жыве цераз аселіцу, налівала дачка Волька бензін у лямпу. Пыхнула — і ёй на грудзі! Пакуль здагадаліся коўдрай яе захутаць, бегала крычучы па хаце... Паенчыла да вечара і сканала...

Я люблю, як гараць на прыпечку смалякі. Іх тата нашчамаў, яшчэ летам — выгінастыя, скурчаныя ў тры пагібелі, то ружова-сінія ад смалы, то цёмна-вішнёвыя. Пахнуць моцна, як шкіпінар, якім мне націралі бакі ад хваробы. Гараць зырка, з кожнага язычка полымя прадуцца чорныя, аж масляністыя ніткі дыму. Падстаў далонь — і сажу тады не адмыць, так закурае. Агонь бярэцца па смаляках весела, аж кіпіць, выступае смала, лопаюцца пухіркі.

Мала ў каго ёсць смалякі, а ў нас ёсць. У Востраве расстараліся летам. У нас было каму — бацька і двое вялікіх хлопцаў. Потым немцы ўжо не пускалі з падводамі цераз пераезд, не пускалі ў лес: каля самага Вострава назаўтра, як мы там былі, спалілі партызаны чыгуначны мост. А як палілі? Воз саломы аднекуль прывезлі, утахцілі пад бярвенні...

Як здабывалі карчы, і я быў у Востраве. Кожны пень-корч выстуквалі абухом. Калі звонка адгукваецца, не чапалі. Не абгніў, значыць, не сагнала ў асяродак смалу. Шукалі толькі тыя, што зверху струхлявелі, паддаваліся абуху. Знайшоўшы, бацька пляваў на рукі, браўся за рыдлёўку. Антон і Зміцрок выцярэбвалі вакол крушыннік, усякі падлесак, каб не замінаў. Корч адкопвалі наўкруга, перасякалі бакавыя карані, калі далёка лішне адыходзілі, падважвалі бярвенцам-рублём. Горш, калі ў карчы быў яшчэ і корань-стаўбун. Яго не адкопвалі і не перасякалі. Ліха яго адкапае — ідзе на метры два ці больш углыбкі. Проста накідвалі на корч пятлю з ланцуга, прасоўвалі рубель. За другі канец рубля хапаліся ўсе, бліжэй да карча — я, налягалі грудзьмі. «Р-рэз! Ну-к яшчэ — р-рэ-эз!» У глыбіні пад карчом нешта ўздрыгвала і крэкала, я нават нагамі чуў, узляталі з зямлі фантанчыкі пяску. Адразу рубель паддаваўся лягчэй, мы паскаралі хаду, ледзь не беглі... Усё! Гатоў!.. Астаецца толькі выважыць. І корч выважвалі, выцягвалі наверх.

Корань-стаўбун, моцны яшчэ, ядраны, звіло ажно ў жгут, а самы кончык — нібы хто аджаваў.

Раз тупацелі наўкруга за рублём, а з-пад яго — пстрык дубчык. Я заенчыў і звіўся... Бацька са страхам адарваў маю руку ад вока — і ўздыхнуў на ўвесь лес. Цэла вока, не выняў ражном, не выцекла... Так і прыехаў я на карчах, затуліўшы вока далоняй, завязаць не знайшлося чым, і ўсю дарогу па шчацэ цяклі брудныя слёзы. Анчарык, фельчар, нечым змазваў вока, бо бялок набег крывёю. Сказаў, каб тыдзень насіў павязку-хустку.

Мала ў каго ёсць смалякі, і да нас сходзяцца суседкі на попрадкі. Папрадухі садзяцца наўкруга каля прыпечка. Відната, цеплыня... Калі яшчэ ёсць месцейка, то плішчуся і я са сваёй прасніцай і кудзеляю-асмычынамі. Я таксама праду — на мяхі. Лепшага мне не давярае мама. Цёткі і дзяўкі хваляць мяне не нахваляць: «От якая ў цябе праллля добрая, Ганна. А то бедавала, што дзеўкі няма!» — «Не вадзі, хлопча, такія доўгія ніткі, накручвай ужо!» —«Скора, кужаль будзе прасці...» — «Глядзіце, паўручайкі ўжо...» — «А хіба даўней, пры дурным Мікалаі, не пралі хлопцы? Пралі! А што ж рабіць, калі трэба адзецца, трэба споднее, трэба верхняе. Дзяцей чарада, і ўсе хлопцы...» — «Піліпаўка дзяцей адзяе. Да Каляд самыя доўгія вечары. А як дзень пабольшае — нітка пакарочае...» — «Бывала, усю зіму, увесь пост — сем тыдняў — ткуць. Адале ўжо прыбіраюць к Вялікадню, выціраюць пыл... Вельмі ж ад кроснаў пылу многа» — «Ахвоту Міша мае да гэтага. Большыя папробавалі і кінулі, а ён і прасці навучыўся, і панчохі вязаць. Толькі петлі заціскае, панчоха як лубяная робіцца»,— гэта ўжо мама гаворыць.

Мне не ўседзець — і ад сораму, і ад гордасці. Я спрабую пасукнуць верацяно, як цёткі,— між двух далоняў. Каб свістала і ныла, як у цёткі Матрэны, у якое згарэла ад лямпы Волька. Або вуркатала, нібы кот на печы, як у Сямёрчыкавых Гэлі. У іх вялізная хата-развалюха, былая карчма. Там яшчэ можна жыць у двух пакойчыках. У адным жыве цётка Гэля, а ў другім — жыла сваячка Тоня. Але цётка Гэля нават не лічыла яе за сваячку. У Тоні быў свой ход, і да яе хадзілі

піць немцы з пераезда. І нахадзілі: усе пачалі казаць, што Тоня стала «тоўстая». Дык палезла яна раз на вышкі бялізну знімаць — і шморг пятлю на шыю! Бачыў я назаўтра, пасля пахавання, як хістаўся ў Сямёрчыкавых на двары Тонін немец. Джвэгнуў аб падмурак бутэльку, шпурнуў у стары калодзеж карабін і пабрыў назад. І ўсё ўстрасаў, узмахваў рукамі, нібы выказваўся перад кім з трыбуны.

А верацяно ў Варвары Пракопавых цененька звініць і спявае... Яе мужа-прыпісніка — Парфёнава Івана — вылавілі з Пагарэлага балота. Схапілі яго летам паліцэйскія і павезлі з сабою. Няма чалавека і няма. А на трэці дзень нехта каня пасвіў каля балота і ўбачыў... Застрэлілі, кажуць, у патыліцу, знянацку. Як ляжаў дома, усе суседзі хадзілі навяшчаць. І я хадзіў з мамаю. У яго вока і палову шчакі заклалі ватаю і яшчэ на шыі, пад барадою, заткнулі ватаю дзірачку. Цётка Варвара сядзела на табурэтцы каля труны, склаўшы на прыполе рукі. Не плакаў ніхто. Уздыхалі толькі доўгімі-доўгімі ўздыхамі і зноў маўчалі, як камяні. Толькі Матрэна папытала, ці ведае Варвара, як напісаць і куды пра гэтую смерць, каб дарэмна не чакалі, не спадзяваліся. Недзе ж бацька ёсць, маці... А Варвара сказала, што не ведае добра, адкуль яе Парфёнаў Іван —ці то з Казані, ці то з Разані. І цёткі дружна ўздыхалі зноў: «О божа, божа...»

Не, я, мабыць, ніколі не навучыўся б прасці, як нашы суседкі. Не ўмею далонямі пасукваць верацяно. Я толькі кручу трыма пальцамі, пстрыкаю — дрыг, дрыг, дрыг. Ажно рука выломваецца ў кісці, нямее. У мяне і не разгонішся пасукнуць, раскруціць. У мяне такія каўтлякі ў кудзелі, што не расскубеш дзесяццю пальцамі, трэба выдзіраць зубамі і выплёўваць. У жанчын ніводнай кастрычынкі няма на фартухах, а ў мяне на штанах хоць жменяю грабі. У іх кужаль аж блішчыць, валаконца да валаконца, няйначай пасля грэбня яшчэ і шчоткай са свіной шчаціны расчэсвалі. У мяне ж кудзеля шорсткая, што драцяная. На маё прадзіва не напасешся сліны. На левай руцэ пальцы бела-раскіслыя, пабабіліся ў зморшчкі і шчымяць. Прыпраў, сцёр ніткаю

скуру, сочыцца сукравіца. Я і пайшоў учора малаціць з хлопцамі, бо не мог узяцца за нітку...

Каб не прасці, а звіваць ручайкі ў клубкі, то можна было б надзець на пальцы скураныя мяшэчкі. Бацька раней, як садзіўся віць клубкі, такія мяшэчкі надзяваў. Праўда, на пальцы правай рукі, а не левай. А потым зганіў сваё прыстасаванне, зрабіў вірок. Гэта такая кароценькая, як тронак у нажы, палачка, на канцах зарэзы, нібы хацелі з двух бакоў рабіць свісткі і перадумалі. Тата прапаліў дзірачкі дротам у пішчыках гэтых «свісткоў»,— і ўсё, вірок гатовы. Уцягвай у тыя дзірачкі нітку і ві хоць цэлы дзень, пальцаў, каб і хацеў, не парэжаш.

Смыляць пальцы на левай руцэ, апухла правая, пячэ... А-а, гэта Сярожа забаўляецца: выкрасаў агню і тыцкае запаленым кнотам то ў адну, то ў другую... Мама, адгані ты яго, дай шлепака! Ababраў долю над хворым... Прасці замінае... Ой, не, я не буду прасці, я не дзеўка. Я лепш малаціць пайду, я ж мужчына... Вось толькі адпачну дзянёк — і пайду. Ага... Хоць дзянёчак... «Прадзі, сынок, прадзі... Хто ж мне паможа, як не ты? Ты толькі пярэдых рабі, не старайся так...» — угаворвае мама. Ага... Я адпачну, а тады ўжо зноў... На мех ці на дзяругу. «А ты маж, маж скоранька, а то астынуць...— мамін голас.— Нажом настружы тоненька, стружкі скарэй растануць...»

Кудзелю настругаць? Кудзеля растане? А-а, гэта, каб не было так шорстка...

Ой, як баліць, як стукае ў ілбе. «Мама, ды адбяры ты ў Сярожы крэмень з крэсівам! Ён не па крэмені б’е, а па галаве мне...»

Баліць галава, стукае ў скронях, як тады...

Да бацькавага ранення гэта было яшчэ. Мы, хлопцы, усе спалі ў той хаце, па двое: я і Антон, Сярожа і Змітрок. На двух самаробных ложках... Паўз тыльную сцяну, за грубкаю — я і Антон, паўз вулічнае акно — яны. Але ў той вечар ні Антона, ні Змітра не было — не ведаю, дзе яны прападалі. Каб Сярожа адзін не скаціўся, мама згарнула і паклала з краю кажух. Я хутка тады заснуў, як у прорву праваліўся.

Клыпнуў вачыма ўжо на руках бацькі, як з мяне рвала, вывaрочвала вантробы, і зноў абвіс без памяці. І от дзіва: Сярожу тады ніколечкі не зашкодзіла, нібы пакаўтаў увесь чад ад тых смалякоў я адзін. Каб не пачулі з кухні, што застагнаў, мяне ўжо і на свеце не было б — не прачнуўся б нават...

«Ад чаду самая лёгкая смерць...» — сказала тады мама. І загадала тату павыкідаць з грубкі тыя смалякі: і так добра гарaць, без сушкі.

Палок затрослся, і я зноў прачнуўся. Хтосьці лёг з краю, прыціснуў мне руку. Я штурхнуў яго ў бок: «Мядзведзь касалапы!..» А-а, Змітрок прылёг... Моўчкі, не адрываючы галавы ад падушкі, пасоўваецца ён на самы край. На пераносіцы ў яго мокрая анучка, ён увесь час чапае яе пальцамі, нібы хоча прыклеіць навек.

— Зноў? — саджуся я. Мне робіцца шкада Змітра.

— Зноў...— сціскае брат зубы.

Я гляджу то на яго, то на Антона за сталом. Уплятае Антон блінцы за абедзве шчакі, Антон маладзейшы за Змітра, а здароўшы, падужае яго. Антон смуглейшы з твару, як мама, шырэйшы ў плячах. А Змітрок і белы, і слабейшы. Анчарык прыходзіў да бацькі перавязку рабіць, то пыталі ў яго, чаму ў Змітрака ідзе ды ідзе кроў. «Падкарміць яго трэба добра... Падзяржыце яго на цялячай пячонцы, на яйках, масле... Вітамінаў яму, зяляніны якое, то і паправіцца. У яго малакроўе...» — сказаў ён. А лякарства ад малакроўя ніякага не даў. У яго вельмі мала лякарстваў, а бінтоў зусім няма. На павязкі тату мама рэжа стужкі з палатна. Ляжыць у хаце сувойчык, яго не выносяць нават у куфар.

Ніяк не магу дакумекаць: чаму ў чалавека мала крыві, а яна ў яго яшчэ і тая выцякае? Льецца і льецца... Каб пячонкай пакарміў Змітра, то ўраз паправіўся б, гэта я разумею. Ого, пячонка! Я нават забыў ужо яе смак. У нас ёсць карова, але яшчэ не ацялілася. Калі ацеліцца — падгадуем цяля, і тады будзе Змітру пячонка. Хацелі немцы забраць карову, ды збракавалі. Паглядзелі на чэрава — адвісла да самай зямлі — і не ўзялі. «Шлехт, шлехт!» — гергеталі.

Замест каровы пакідалі ў кузаў, як мячыкі, трох авечак. Добра, што чацвёртую за дзень да гэтага Антон са Змітром зарэзалі сабе, а так бы сядзелі на нішчымніцы. Я не бачыў, як рэзалі гэтую авечку, бачыў толькі, як заскоквалі ў хату з-пад паветкі то адзін, то другі — бледныя, задыханыя. Змітру ажно млосна было. «Што далей рабіць? А потым што?» — усё дапытваліся ў бацькі. І тата кожны раз уздыхаў і крывіўся, як ад болю, але гаварыў — што... Цяпер на печы, на жэрдачцы, сохне вывернутая сіняватая, у пражылках аўчына. Яна няроўная: там, дзе былі ногі, быццам і цяпер тырчаць ногі, толькі ўжо шкураныя. Акрайкі шкуры з ног не блакітныя, а ружовыя, тоўстыя,— яны разапятыя лучынкамі, каб хутчэй сохлі.

Курэй у нас даўно няма. Адкуль тым яйкам быць? Гадавалі яшчэ япручка-падсвінка, дык уваліліся раз двое паліцэйскіх, збіралі правіянт на навагоднюю гулянку. Адзін сеў на лаву і асавеў, усё пляваў паміж ног на падлогу, ікаючы і ўстрэпваючы галавою. А другі, Нагайчык з Пасрэднік, прыстаў да бацькі: «А ну, паказвай, якая ў цябе жыўнасць...» Павёў бацька яго ў хлеў. «Во, парася... Карміць яшчэ ды карміць...» — здалёк махнуў рукою, не падыходзячы да катуха. «Нічаво, папаша, па-маёму — харош і гэтат. Парасяцінка — гутэн абенд!» — і чырк, запаліў запалку. Адною рукою свеціць, а другою карабін да пляча падымае. А са столі, з жэрдак, саломіны звісаюць. «Пачакай, я пасвячу, а то яшчэ ўсмаліш, каб цябе...» — «Нічаво, мы людзі асцярожныя, зра людзей не абідзім...» — і бабахнуў япручку паміж вушэй...

...Антон ужо скончыў есці блінцы. Намазаў яшчэ адзін, панёс бацьку.

— Ну, мо палепшала? — падышла да Змітра маці.— Уставай, хіба, памаленьку, а то пастынуць, зноў разагравайся з імі... А ты адзявайся, не сядзі, як суслік! — павысіла на мяне голас.

Глыбока-глыбока ў матчыных вачах і застарэлы смутак, і бляск трывогі. У рэзкіх складачках, што залеглі каля губ, упартая, адчайная зацятасць, горнасць і жаллівасць.

Выходзіць з тае хаты Антон. Ад блінца адламаны маленькі, як на два разы ўкусіць, кавалачак.

— Што ж ён не... Верамей, чаму ж ты не еў? — хуценька ідзе ў тую хату маці.— Мо мала памазаў Антоша, я падмажу больш. І цыбулькай пахне, і лістам. Трошкі недасаль, але ж нічога не паробіш...

— Не каўтаецца... Баліць жывот нешта... Ты б мне чаго рэдзенькага дала.

— Ото булёнчык будзе гатоў... Ён не зашкодзіць. Міша з'есць блінца і збегае да Канаплёвых. У іх, здаецца, карова ацялілася. Папросіць паўлітру якую... І табе будзе забяліць, і Тані.

— Колькі яны змалацілі да снедання? Будзе адзін пасад?

— Ага, цэлы пасад... Кулёў толькі не вытрэсвалі.

— Хай бы хоць акалот рабілі... Мо вышкрабуся як, то тады б перабілі яшчэ раз.

— Не турбуйся, добра яны робяць усё, акуратна. Я ўчора заходзіла па амеці, бачыла. І кулі робяць — не тоўстыя, сярэднія такія... Ну, ляжы...

— Вялікія ніхто не кажа рабіць...

Я ем блінец хутка. Смачны, хоць і жытні. Пшаніцы ў нас мала было пасеяна, і тая папсавалася ў снапах. Бацька, як агледзеў быў гэта, ажно ўчарнеў: «Гаспадар называецца, да чаго дапусціўся!» Мука з тае пшаніцы нейкая шэражаўтая, блінца ніяк не спячэш — падгарае. А ўсярэдзіне клей — ні пажаваць, ні языком павярнуць, так прыстае да паднябення.

Як перараблялі калгасную абору-кароўнік у гумно — хаваць збожжа, то і нам выдзелілі ўчастак ад слупа да слупа. Але не пад гумно рабілася будыніна — цэпам не ўзмахнеш добра, замінаюць бэлькі. І папала нам якраз ліхая страха. Засыпалі дзіркі і кастрыцаю, і лісцем, прыкладвалі камянямі, а ўсё роўна вецер выдзімаў, разносіў. Тут бы саломы кулявое зацягнуць, даць поднаў, але за цяплом не было яшчэ чаго зацягваць, а цяпер няма каму лезці. З першага ж ураджаю, леташняга, як падзялілі калгасныя пасевы, усю салому парэзалі на паранку карове — стараліся дадзяржаць да вясны, каб не аблегла.

Я так і не бачыў, ці снедала мама, ці не — хадзіў па малако. А прыйшоў, то ў хаце ўжо стаяла сноўніца, і хлопцы прывязвалі яе за верхнюю жэрдку да бэлек — адзін на кухні, а другі ў той хаце. Прынеслі сноўніцу ад Фядосевых бабы, дасталі з-пад страхі, з тыльнага боку будынка. Каму трэба — самі бяруць, самі ставяць на месца. Ніхто не памятае, колькі гадоў гэтай сноўніцы. І жэрдкі, і стаякі з паўбіванымі ў іх калкамі патрэскаліся, яны сівыя, ажно сшалушваецца зверху драўніна, дзе-нідзе на іх зялёная кара-лішаі. Даўжэзная сноўніца, дзесяць маіх вялікіх крокаў. Адзін стаяк прыстроілі на табурэтку каля печы, другі — на лаву пры вулічнай сцяне ў той хаце. Дзверы, каб не заміналі, расчынілі насцеж, на абедзве палавінкі.

— Гэта... Трэба было пазнімаць іх з завесаў, адставіць убок...— надумаўся сказаць бацька. Ён крыху павярнуў галаву і паглядвае, як бы спадылба, на хату.

— Ат! І так добра будзе,— адмахваецца мама. Яна хуценька працірае сноўніцу анучаю.— Добра прывязвайце, бо гэты Балось нявелеўскі яшчэ скіне.

Гаварыла яна Антону і Змітру, а зіркала на Сярожу: той шчамляўся на ніжнюю жэрдку сноўніцы, задзіраў ногі, як на турнік. Ніхто ў нас не ведаў, што вытвараў, якімі штукарствамі і калі праславіўся той Балось з Нявелевіч, не ведалі нават добра, дзе тая вёска. Але такая прымаўка жыла.

— Во, во, паглядзіце, людзі добрыя, што ён дарабляе... Ах ты, рыштанюга! — маці хвасянула яго анучаю па штанах, і Сярожа ажно зацёкся з рогату, нырнуў на той бок сноўніцы.

— Не дастанеш! Не дастанеш!

— Дастану! Як вазьму мурзатую чапляю, то вытаўку нос!

«Балось нявелеўскі» ўжо забыў пра сноўніцу, пачаў з разгону кідацца да бацькавай пасцелі, лопаць рукамі па коўдры. Бацька засцярожліва выстаўляў здаравейшую руку — ці сябе абараняў, ці баяўся, каб не выцяўся Сярожа.

— Не ўпадзі, сынок, не ўпадзі... А вы не марудзьце, хлопцы, не марудзьце... Вечарам адпачняце... Вясною горш

не хацецьмецца малаціць... Дый мышы памалоцяць... Без хлеба астанемся...

Хлопцы саскокваюць на падлогу — гоп! гоп! Прывязалі сноўніцу добра, каб і табурэтку прыняў, то вісела б.

— Ото-то... Яшчэ прывяжуць кольцы і пойдуць,— гаворыць маці.

Кольцы зверху, пад столлю, абавязкова патрэбны. Не прапусціш туды ніткі — будуць блытацца пад нагамі, замінаць. У нас на столі і ўпоперак бэлек вісіць на белых чарапках чорны дрот. У два рады, на кожны рад свае чаропкі. Самі драты белыя, алюмініевыя, але схаваныя спачатку ў гумовую абалонку, а тады ўжо аплецены чорнымі прасмоленымі ніткамі. Праз дзірку ў сцяне драты вядуць у тую хату, зноў чапляюцца за столь і праз сцяну выходзяць на вуліцу. І ў кухоннай, і ў вулічнай сцяне дзіркі пракручвалі вялізнымі свердламі, уставілі ў іх фарфоравыя, загнутыя ўгару, як люлькі, трубкі. У гэтыя трубкі і прапушчаны драты. Усяго ў два ці тры заможныя калгасы правялі да вайны электрыку. Нават загаралася колькі разоў. Гаворкі было ў баб, шуму! Усё не маглі надзівіцца, адкуль бярэцца ў лямпачцы агонь.

Цяпер тыя драты без патрэбы. Антон быў завінуўся каля іх, адзін нават адарваў, хацеў на нешта ўпатрэбіць, дык бацька накрычаў на яго... «Замінае ён табе? Спраўны вельмі... Хай вісіць!»

Цяпер Антон стаіць на заслоне на дыбачках і прывязвае да дроту кольца. Мухі драты вельмі заседзелі, я нават уяўляю, якія яны кастравыя. Стаім з Сярожам, задраўшы бароды, глядзім... Адно кольца — звяно з ланцуга, другое — старая банька з касы. Банька — гэта нібы веліканскі жалезны пярсцёнак, без яго і без «затылка» — кліночка, выструганага з кончыка каровінага рога, не «запражэш» касу, не будзеш касіць. Я ведаю гэта — касіў... І магу яшчэ сказаць, што няма цяжэйшай работы. Цяглiцы-мышцы напінаюцца, як струны, а жывот бы хто рве, раздзірае на кавалкі...

Бацька, мабыць, згледзеў праз расчыненыя дзверы, што Антон прывязаў.

— У банькі краі гострыя... Нітку будуць калмаціць, ірваць. Пашукай што гладчэйшае...

Антон уздыхае і чухае патыліцу. А я з Сярожам вобсас кідаемся да прыстолка, шукаем самы сапраўдны пярсцёнак. У нас была латунная трубка, дык Змітрок парэзаў яе напілкам на кольцы, раскаваў, надзеўшы на швайку, каб былі большыя, зачысціў, адшліфаваў. Такімі «залатымі» пярсцёнкамі ён абдзяліў усіх дзяўчат, адзін пакінуў сабе.

Урэшце ўсё пароблена. Змітрок устае з пасцелі — зноў быў прылёг,— хлопцы апранаюць кажушкі і ідуць малаціць.

Сярожа адразу ўголас:

— І я хачу малаціць! Я хачу мышак паглядзець!

— Сціхні, малацьбіт! Во, бачыш, якая ў мяне рука? — соўгаю яму пад нос култыху, і ён тут жа сціхае.

— Холадна, сынок, на вуліцы: мароз; снег па пояс... Улезеш у гуру, то і не вылезеш... Будзе лета, будзе цёпленька, тады хіба...— мама гаворыць гэта, сагнуўшыся над калыскай, расшпіліўшы матроску: яна корміць Таню.— От зараз пачнем снаваць кросны, а ты будзеш мне памагаць з Мішам... Міша памаленьку злазіць на вышкі, дастане той кош, што каля коміна, там чатыры клубкі павінны быць.

— Я хачу круціць сукала! Я хачу цэўкі сукаць! — зноў завёўся Сярожа.

Таня перастала смактаць, павярнула галаву, паглядзела з-пад мамы на Сярожу, усміхаецца на ўвесь рот. Уверсе ў яе два зубы, а ўнізе чатыры. Мала! Скора год дзеўцы, а ў яе ўсяго шэсць зубоў, і не ходзіць яшчэ. Толькі ў стойцы стаіць і ў хадуне бегае.

— Ну яшчэ трошкі, ну яшчэ, а то няма калі...— Мама паводзіць ёй саском па губах, і Таня смяецца яшчэ больш.— Ну, бяры тады другую... Міша, ты не забыў, што я табе казала? Той кош, што каля коміна...

На вышкі залезці не страшна, я ўзбіраюся мігам. Знаходжу кош, сукала з цэўкамі. Простае гэта прыстасаванне — сукала. Тата кросны зрабіў, ткацкі варштат — не раўня гэтаму сукалу. Дзве стойкі над цяжкім карытцам, выдзеўбаным з палавінкі чурбачка, на стойках валік з махавіком-колам,

з валіка тырчыць востры шпень, насаджваць цэўкі. Вось табе і сукала... Яго можна так раскруціць, асабліва нагою — гудзе проста! Галоўнае тады, каб роўненька надзета была цэўка, туга трымаў нітку. Бо калі нітка слаба, нашамшурана, мама такіх не любіць — ніткі спадаюць кольцамі, блытаюцца.

Прасунуў хворую руку да локця пад лучок каша і пад валік сукала. Цяжка, ажно ў бакі водзіць. Але нічога — галоўнае, што ёсць чым трымацца за папярэчкі лесвіцы, свабодная здаровая рука...

Яшчэ ў сенцах пачуў, што Таня і Сярожа крычаць на ўсё горла. Паставіла мама Таню ў стойку і сунула ёй лыжку пагуляць. А Сярожу спадабалася, давай адбіраць.

Абое крычаць, кожны цягне сабе.

— Ну, што вы там? О госпадухна...— стогне тата ў тым пакоі.

— Не вяжыся да яе, сатана! — сварыцца мама на Сярожу.

«Сатана» ўбачыў у маіх руках сукала і адразу перастаў цікавіцца лыжкаю. А яна была ўсё-такі цікавая: бліскучая, нібы з чорнай касці вытачана і вышліфавана. Берагі рудыя, нізенькія, абгрызеныя. І самае галоўнае, што ў дне пракручаны ўпоперак дзве дзірачкі. Лыжцы гэтай, маленькай, зручнай, мо сто гадоў. Мама яе прынесла калісь ад сваёй бабы. Дала тая на абжытак на новым месцы: «Будзеш снавацьі мяне ўспамінаць».

Клубкі тым часам адыходзяць з марозу, і ад іх патыхае свежасцю, нібы ўскочыла ў хату з марозу кошка.

— Ты хоць паіла карову? Бо забегаешся і забудзеш...— успомніў тата яшчэ адну работу.

— Паіла, паіла... Прыдумаўся калі! З хаты пойла насіла.

— Не трэба даваць халодную, з калодзежа... І ў хлеў насі, не выпускай... А то пакаўзнецца на лёдзе...

— Ляжы ты, ляжы.

Са спальні чуецца: «Ох-ха!» Маці выцірае ў стойцы лужынку, сварыцца на Таню:

— Не плюхай нагамі! Макрахвостка ты! — падымае стойку на палок, падалей ад краю. Колькі мінут пабыла малая

доле, а ўжо ссінелі ногі ад холаду, як хто вадзяным чарнілам пафарбаваў.

Сярожа то ракам, то на каленях поўзае за сукалам.

— Пах! Па-пах! Ратуйцеся, людзі! — сукала ў яго не то кулямёт, не то самалёт.

— Ну, так...— мама злічыла, колькі ў стойках сноўніцы калкоў.— Па восем, шаснаццаць усяго...

Зважыла два самыя большыя клубкі, падбіваючы кручок бязмена пад латкі.

— Не будзе на шаснаццаць губак. Трэба хоць на чатырнаццаць, і то мо дапрасці прыйдзецца.

— А калкоў не шаснаццаць, а сямнаццаць,— паказваю я на сямнаццаты, убіты ў ніжнюю жэрдку за якога паўметра ад правага краю.

— Той не ў лік... Там чыны кладуцца.

Што такое «чыны», я не дапытваў. Усё роўна не зразумею з аднаго разу: алгебра! Ведаю толькі, што ніткі кладуцца то зверху таго калка, то знізу.

Мама парабіла з ануч «абаранкі» — класці клубкі, каб не скочваліся з заслона, а я тым часам залез на стол і зацягнуў нітку з аднаго клубка ў адно кольца, а з другога — у другое.

— Ад акна на хату зацягвай, а не наадварот,— паспела паправіць мама. І калі толькі яна скмеціла, што я не так раблю!

Урэшце яна забірае ў Тані дзіравую лыжку, дае ёй узамен цэўку, зацягвае ў дзірачкі ніткі і звязвае іх з другога боку лыжкі. Атрымалася нібы пятля.

— Ну, Божа, памажы...— чапляе яна пятлю за самы першы справа калок. Вядзе лыжкаю пад нізам таго, што ў «чынах», подбежкам шыбуе да першага знізу ў левай стойцы, на кухні ўжо, тады да другога калка ў той хаце, потым да другога на кухні... І памчалася маці, і памчалася, шлёпаючы босымі нагамі,— ад калка да калка, направа — налева, направа — налева, усё вышэй і вышэй задзіраючы лыжку з ніткамі... Па адным калку не дабралася да верху і пачала снаваць уніз. Даснавала да таго, што ў «чынах», і паклала ўжо нітку зверху на яго. Так і будзе тут увесь час класціся: зверху — знізу, зверху — знізу...

Я сяджу на Сярожавай калодачцы каля заслона і сачу за клубкамі. Сыдзе латка — трэба будзе спрытна падхапіць клубок, пакруціць так, каб мама не спыняла сваю хадзьбу. Мітусяцца перад вачыма наўкруга ніткі, нібы віры ў вадзе ці пыльныя віхуры на дарозе, меншаюць, нібы растаюць, латкі...

Сярожа кінуў забаўляцца з сукалам, учапіўся маме за спадніцу, хуценька зашоргаў па падлозе робленымі з вяровачак і падшытымі шкуратом лапцікамі.

— Мама, ты ў Слуцак ідзеш? І я хачу ў Слуцак...

— Ну, давай, давай, хадок. Толькі не чапіся так моцна, а то пакоціш мяне... І наперад не забягай, бо стапчу!

— Сярожа, ты б не замінаў маме... Яна і так набегаецца за дзень... Пазабаўляў бы Таню, ты ж вялікі ўжо хлопец... А то хныкае там адна...— не ўтрываў бацька.

І раптам маму нібы тузанулі, ажно лыжка з рук выпала, а каля мяне глуха загрукала. Я зірк — а клубка аднаго няма, пакаціўся ажно пад мыцельнік.

— Ах, ліха тваёй матары! Куды ж ты глядзіш? Лезь цяпер, зацягвай...

Я кладу клубок зноў на «абаранак», так, каб ішла ўжо новая латка, адмотваю ад клубка пабольш ніткі, лезу на стол закідаць у кольца. Мама звязвае парваную нітку, накручвае абедзве на калок і ідзе шукаць анучы — абувацца. Цвёрда па падлозе хадзіць босаму і аб парог можна пацэліць пальцамі.

— Папробуй тыя лапці, што Антону сплёў...— раіць бацька.— І лёгка, і мякка... А то падбой пад пяткамі будзе... Сaромееццa, кавалер, насіць, лепш, думае, у бахілах прэць...

Бацька закашляўся, затуліў рот ручніком.

— Вой, табе хоць кол на галаве чашы! Як маленькі ўсё роўна... Сказаў Анчарык, каб маўчаў, дык і маўчы. А то сыдзеш кроўю ўвесь...

Мама абулася хутка, анучы крыж-накрыж на ўсю лытку спаласавала аборкамі. Я паўдня разбіраўся б і блытаўся ў тых вяроўках.

— Нешта ж не ідзе Анчарык... Учора ў такую пару канчаў перавязваць...— уздыхае бацька.

Сярожа зноў чапляецца за маміну спадніцу, і мама не вытрымлівае, з сілай адрывае ад сябе яго руку: — Не замінай, знайдзі сабе забаўку. А то я так за тыдзень не кончу!

— У-у-у...— пакрыўджана цягне Сярожа і паволі ідзе да бацькі, нагінаецца пад сноўніцу, стукаецца аб яе галавою.

— Ну, хадзі, ну, хадзі...— гаворыць яму бацька, гладзіць рукою па патыліцы, а Сярожа горка плача, уткнуўшыся носам тату ў бок.— Раскажу я табе... Пра глячка раскажу, казку...

Хныча Таня — пакідала цэўкі, рассусліла хлебную скарынку і растаптала яе нагамі. Просіцца на рукі... Але куды я яе вазьму, калі нават з клубкамі не справіцца — не слухаецца правая рука. Зноў запазніўся быў павярнуць клубок, зноў чуць не парвалася нітка, а клубок, ужо левы, злавіў на ляту. Я бяру кавалак ніткі, вызбіраю, дзе якія валяюцца ў прыстолку гузікі, нанізваю іх, як пацеркі. Няхай пазабаўляецца, авось памаўчыць.

— Дзед з бабаю жалі пад лесам...— пачынае тата казку. Ён мо ніводнае не ведае і гэтую ад мамы навучыўся.— Пшаніцу жалі... Ну, а глячок з вадою... пад куст паставілі... Каб не награваўся, значыць...— цяжка задыхаў тата і змоўк.

Я гэтую казку ведаю на памяць, магу і не слухаць. Я гляджу, як лёгка і спрытна завінаецца каля сноўніцы маці, гляджу на яе лапці, і мне здаецца, што яна прычапурылася, як на свята,— так хораша ёй у іх.

У мяне на нагах таксама някепскі абутак— «бітыя» валёнкі. Не шытыя ў палоску, як у хлопцаў, а «бітыя». На валёнках не бахілы, як у Антона і Змітра, а крамныя літыя галошы. Ім гадоў сем, не менш, яшчэ некалі Змітру куплялі. Спрабаваў потым і Антон іх абуваць, але панасіў мала. Яго нага расла вельмі хутка і зараз нават большая, чым у Змітра. Цяпер галошы мае. Нічога, што і адзін, і другі сшытыя збоку, ад падэшвы даверху, ніткамі, шво — нібы яловая лапка. Нічога, што ў левым галошы выдрана ў пальцах клінокфортка і праз яе відаць анучка. Я ж па вадзе ў іх не бегаю, а па сухім і такія добра.

— Ну, а баба забыла глячок заткнуць... Вецер і гудзе ў яго... Гу-у-у... Кхы, кхы-кхы... Гу-у-у!..

...А як тата мне валёнкі валіў, дык дзіва проста. Я ніколі б да гэтага не дадумаўся. Разаслаў вялікую анучу, новую, на яе паклаў пласт воўны. Было крыху кароткай, з авечых ног воўны... Дык разаслаў — нібы выклаў з воўны валёнак... Вялізазны, як на сваю нагу... На воўну паклаў скрыўленую, як нага ў ступаку, і згорнутую, каб таўсцей было, анучу, зноў закрыў пластом воўны. Ну, а наверх загарнуў рагі той вялікай ніжняй анучы. І давай жвакаць, камячыць усё гэта рукамі... Доўга-доўга валіў тыя валёнкі...

— Лісічка ляжала пад кустом... Слухала, слухала, як гудзе глячок... «Перастань!» — крычыць. А ён усё роўна — «Гу-у!» А-кхы, кхы, кхы... О, божа мой... Тады яна ўзяла палку ды як шпурне ў яго...

— Не так! — закрычаў Сярожа.— Не так... Яна сказала: «Перастань, бо ўтаплю!»

— Ну во... Ты лепш ведаеш за мяне...

Сярожа ўжо сам расказвае тату, як панесла ліса тапіць глячок, а почапку не зняла з шыі («Ха-ха-ха, во, дурная!»), дык глячок і яе зацягнуў у ваду.

А я ўсё думаю пра свае валёнкі. Бацька мяў, мяў тады загорнутую воўну, а потым раскрыў — валёнак! Прыгожы, рудаваты... І лёгкі, мяккі... Я адразу яго ўссунуў на нагу і пабег па хаце. Малаваты, упіраюцца пальцы. Але нічога — добры! Бацька гэтак і другі валіў, разгарнуў — а ён велікаваты! Нават у галош нельга было засунуць. «Ах, так?!» — сказаў тата, зноў закруціў яго ў анучы, нават кулакамі лупіў. А ён так і не паменшаў, здаецца. «Дык ты гэтак?!» — зноў сказаў тата і запёр яго ў галош сілком, зморшчыўшы яму носік. У левы галош, у нос, я анучку забіў, і ўсё роўна надзяецца і скідаецца вельмі лёгка. А правы скідаць баюся — хто яго тады засуне?

Каб хутчэй паправіўся бацька, ён бы яшчэ не такія адмастачыў валёнкі. Ён у нас што хочаш можа зрабіць. Жорны? Калі ласка, цяпер у іх ходзяць малоць многія суседзі. Кросны змайстраваў, ніты і бёрды — на тонкае палатно і на посцілкі, мяхі — у дзесяць, дванаццаць і чатырнаццаць пасмаў. Зрабіў ён і станочак, які замест чалавека можа

трымаць ручайкі, і станок, на якім можна верацёны тачыць. Такарны станок такі просты, што, здаецца, я і сам яго змог бы змайстраваць. Устаўляй у стойкі кляновы чурбанчык-палку, пакручвай гэтую палку такою штуковінаю, нібы лук з цецівою, толькі не вяроўка замест цецівы, а моцны рамень, другою рукою прыстаўляй да чурбачка долата. Ляцяць стружкі на ўсю кухню, вераценца атрымліваецца прыгожае, гладкае, зграбнае. Вытачыць яго тата і не вымае са станка, а бярэ кавалачак лучыны, падрэзвае яго долатам, як нажом, каб было роўна і тонка на канцы. Прыстаўляе да верацяна — круць, круць, круць... І ўецца дым, выпальваюцца чорныя палоскі. Тры палоскі выпаліць на самым пуку верацяна, дзве вышэй і адну каля кончыка, дзе верацяно пасукваюць далонямі. Яшчэ адну лінію на «пятцы», на самым рубчыку — чырк! Калі ласка, бяры і прадзі...

Калі я залішне ахаю ад бацькавага ўмельства, ён кідае: «Добра ўсё ўмець, ды не ўсё рабіць» або «Навучыць гора кашу шылам есці!»

Во, зусім раскрычалася Таня... Я гляджу на латкі клубкоў — не, не скора яшчэ сыдуць. Хуценька нагінаюся пад сноўніцу, караскаюся на печ, шукаю Таніны панчошкі і кабацік. Кабацік адзеў, зашпіліў — лячу да клубка. Паспеў! Павярнуў клубок — і зноў пад сноўніцу, да Тані. Уссунуў адну панчошку, другую, падвязаў матузкамі — лячу да другога клубка. Паспеў! І ўжо спакойна вяртаюся, забіраю Таню, усаджваюся на калодачку. Здаецца, і апухлая рука не так ужо баліць — даў ёй дыхту, разрабілася. Ёю можна ўжо крыху варушыць у кісці. Таня рвецца з рук да Сярожы: той гудзе на ўсё горла і раскручвае сукала.

Мама раптам перастае снаваць. Што здарылася? А-а, глядзіць, ці не наблытала. Наснавалася ўжо крыху на калках, мо трэць Танінай жменькі будзе. Маці бярэ ніткі каля самага калка, прыўзнімае — добра! Каля другога, трэцяга... Добра! Усе гэтак перабрала, няма «нацэпніцы». А бывае так, што снуе, бярэцца па калках угору, а тады забудзе, куды ішла, і давай уніз. Калі рана спахопіцца, то можна адснаваць, толькі каб хто ўдваіх паспяваў навіваць назад на клубкі ніткі.

А калі не скора выявіцца блытаніна, тады большая валакіта. Адрэзвай ніткі, шукай той паварот, што зрабіўся не там, дзе трэба, разрывай, прывязвай і дасноўвай, чаго не даснавала. Вяртайся на тое самае месца і зноў прывязвайся. А тады ўжо прывязвайся там, дзе абрэзваў, і снуй далей. Шэсць вузлоў адразу! Калі частае бёрда, то на гэтым месцы не раз ніткі парвуцца і потым.

— Ой, не магу...— стогне бацька і заве паціху маці.— Ідзі, хіба, Ганна, сюды...

Маці нават забывае закруціць за калок, замацаваць ніткі, каб не расслабляліся, ідзе да бацькавага ложка. Яны пра нешта шэпчуцца.

— Дурненькі... Пяты ж дзень, гэта не жартачкі: от паглядзіш, як палягчае... Малым не сорамна, а ты цяпер горш за малога... Міша! — павышае мама голас.— Забірай Сярожу і марш усе на печ.

Я пакуль што не разумею, чаго яна нас гоніць, але даю Сярожу шлепака і заганяю на чарэнь. Лезу з Таняю сам. Уцяміў толькі тады, як з печы мама дастала цёплую ваду, як узяла з паліцы чорную спрынцоўку, падхапіла за вушка тазік, прычыніла за сабою адну палавінку дзвярэй — тую, што не прыціснута сноўніцаю.

— Што мама будзе рабіць? — тузае мяне за рукі, за вушы Сярожа.— Я хачу пагуляць з тым мячыкам!

— Нічога, нічога... Хочаш казку?.. Слухай лепш казку...

— А чаго ты плачаш? Мама, Міша плача!

— Ціха ты!.. Жыў-быў... Жылі-былі дзед і баба... І была ў іх курачка...

Губы не слухалі мяне — распаўзаліся, як жывыя. Я прыкусваў верхнюю, прысмоктваў яе, чуючы салёны смак слёз, а яна ўсё вылузвалася з-пад зубоў, дрыжала. Таня паўзіралася ў мяне спалоханымі вочкамі і давай хліпаць. Я прытуліў яе да сябе, і яна пачала ціскаць мяне за шыю халоднымі ручкамі, паказваць, як моцна шкадуе.

— Нанесла курачка яечак — поўны падпечак...

— Тата памрэ? — раптам гаворыць Сярожа. Казку ён не слухае.

23. Зак. .1877

Я трэснуў яму па патыліцы, і ён адразу зашыўся ў куток, за вянок цыбулі, пачаў чмыхаць носам.

Ох-ха... Няхай бы я лепш пайшоў малаціць. Малаціць весялей, там ведай адно — стукай ды стукай. Рука пабалела б і сціхла. І хлопцам было б спраўнёй малаціць. Як бацька быў здаровы, то спрабавалі і ўчатырох. Учатырох атрымліваецца так здорава,— як у малатарні: тах-тах-тах-тах! Удары сыплюцца адзін за адным, гэта не нейкае бах-бах, а тады зноў, як паспаўшы,— бах-бах!.. Калі ўчатырох малоціш, дык снапы падскокваюць пад ударамі без перапынку, як жывыя. Дажджом сыплюцца, шалпочуць, як мышы, зярняты — і нізка пад нагамі, і высока пырскаюць, на падбітыя роўненька гузыры снапоў у застаронку. Калі снапы ў пасадзе пaverачалі ўжо, зерне не шапаціць. Вялікі шык ударыць па перавясле так, каб яно лопнула, а сноп распырхнуўся і сам разаслаўся на прост. За ім другі сноп, трэці... Кончыцца рад — і другі пачынай патрашыць. Па распушчаных снапах праходзімся толькі па разе: салома аж курыць пад бічамі, нібы яе задзірае, скубе, трасе і не можа ўзняць нейкі віхор...

* * *

Анчарык прыходзіць позна, калі гадзіннік (вісіць каля дзвярэй у тую хату — старасвецкі, у чорнай, з'едзенай шашалем скрынцы, аздобленай точанымі цацкамі) б'е адзінаццаць.

Спачатку мы пачулі, як нехта няўмела тпрукаў на каня — недзе на вуліцы, ледзь чутна, як потым стукаў у сенцах, абіваючы з ног снег. А зайшоў Анчарык, то і настаўлены каўнер доўгага паліто, і кучомка, і бачкі валасы каля засунутых да палавіны пад шапку вушэй, і нават маленькія бровы пабялелі ад інею. Вузенькія вочы на амаль мангольскім твары слязіліся, невялікія, прыпухлыя і абшурпацелыя на марозе губы здзеравянела-непаслухмяна крывіліся. За Анчарыкам на кухню ўкаціліся вялізныя белыя клубкі холаду, стала зімна, як у сенцах.

— Здрастуйця! Змёрз — тпру не магу сказаць... Ну, як вам тут начавалася? — паставіў Анчарык на стол сваю кантовую, нібы адрэзаны кавалак бэлькі, сумку. Абскуб з броваў і бачкаў іней, паліто і шапку пачапіў на вялізны крук у сцяне на такія крукі на слупах навінчвалі белыя ізалятары, дык бацька папрасіў у электрыкаў два.

Мама якраз шоргала лапцямі ў яго бок, павіталася і толькі махнула рукою — «Не пытай, чалавеча...»

Фельчар падышоў да печы, пахукаў на рукі, сунуў іх недзе ў комін, зазірнуў на печ і падміргнуў Сярожу. Той не паддаваўся на яго міргі і глядзеў падазрона. Анчарык гмыкнуў, паляпаў сябе па кішэнях, намацаў у адной малесенькую белую таблетку сахарыну, працягнуў яму. Мама адразу накінулася на Сярожу: «Што трэба дзядзьку сказаць? І не каўтай гэты сахарын, бо атруцішся: паўвядра вады можна будзе насаладзіць...» Таня брашчала на печы авечым пухіром з гарохам і не паказвалася.

— Гэта ж у Пасрэдніку Курак вазіў...— адышоў ад печы Анчарык, расціраючы рукі.— Чуць не злавілі яго гэтай ноччу партызаны, у сястры там начаваў. Прапоўз па лёхах на вышках ажно ў хлеў, а там прадраў страху і скокнуў у гуру. А дружка яго, Нагайчыка, добра стукнулі... Глядзеў я — наўрад ці вышкрабецца. Не прыходзіць да памяці...

— А-а, не вадзіць гэтаму крывасмоку губатаму!..— сказала мама.— Мо ўвесь сельсавет ператрос ды перакалаціў.

— І назад з Кураком ехаў? — падаў голас бацька.

— Ага. Злез ён у канцы... Па хатах нечага швэндаецца...

— Гары мо шукае, горла заліць...— сказала маці.

— Гэта ж у суседзяў маіх Курак каня схапіў, у Філімонавых. Загадаў, каб я ўжо сам завёў гаспадарам...

— Не таго ўпалявалі...— уздыхнуў тата і змоўк.

— Ну, рыхтуйцеся, дзядзька. Здаецца, ужо адагрэўся...— Анчарык стаў корпацца ў сваёй сумцы, а потым панёс яе ў тую хату.

Мама закруціла ніткі на калок, і лыжка каўзанулася па нітках уніз. Пайшла раздзяваць бацьку.

Добра, што ў нашым сяле ёсць хоць які фельчар!

На другі дзень вайны, як мітынгавалі мужчыны каля сельсавета, гразілі разбіць германца, у вялікую калону мабілізаваных сталі і Анчарык з акушэркай цёткай Кацяй. Каця — высокая, тоўстая, вельмі ласкавая. Для кожнай сям'і яна была бабкай, і ўсе лічылі яе сваячкай. Як убачылі жанчыны, што і яна збіраецца ісці на вайну, зараўлі ў адзін голас. «Не плачце, бабанькі, не плачце! Мы яшчэ разам пагуляем на радзінах!» Але не суцешыла цётка Каця, а яшчэ больш развярэдзіла душы жанчынам — загаласілі і пачалі прыгаворваць, як па нябожчыцы.

Акушэрка вярнулася са Слуцка ў той жа вечар — адправіў ваенкамат назад. Анчарык жа — праз некалькі дзён, абшарпаны, змізарнелы. Казаў, што перанялі іх немцы, адрэзалі... І яшчэ некалькі мужчын вярнулася... А многія не прыйшлі: паспелі абмундзіраваць іх, паспела забраць навабранцаў нейкая часць.

— Ум-м-м...— чуецца стогн бацькі, і я бягу глядзець, як робяць яму перавязку. На Сярожу намахаў кулаком — каб з печы ні кроку, глядзеў Таню.

З таты ўжо раскруцілі павязку. Ён ляжыць на левым баку, голы па пояс. Скура ў яго белая, не такая смаглая, як у мамы. Твар схуднеў, нават завастрыўся, парадзелі коратка падстрыжаныя вусы. А як пабялела за гэтыя дні шчотка яго барады!

— Пацярпіце, дзядзька... Самае страшнае ўжо ззаду...— гаварыў яму Анчарык. Голас у яго такі, нібы ён старэйшы за бацьку, а не наадварот.— Ззаду ўжо ўвесь страх, кажу вам... Тэмпература паменшала... Рану зацягвае нават хутчэй, чым трэба...— У руках у яго бліснуў доўгі металёвы пруток.— Пацярпіце, зараз будзе балець, не тузайцеся...

Тата ўсё-такі ўздрыгнуў, застагнаў праз зубы. Ды дзіва што ўздрыгнеш — Анчарык стаў ледзь не жывасілам раздзіраць рану-дзірачку, запіхваць у яе сваю жалязяку. Рана была ззаду правага пляча і крыху ніжэй, там, дзе пачыналася лапатка.

— Іч, пад якім вуглом садануў... Якраз напрамую да сэрца...— гэтыя словы Анчарык гаворыць кожны раз, калі пачы-

нае пхаць у рану жалязяку. Выняў шпень, папрасіў бацьку, каб варухнуў плячом, і стаў пацiскаць пальцамі вакол раны. З дзірачкі пацякла густая сукравіца з кроўю.— Цудоўна, дзядзька... Нагнаення ў лёгкіх няма, тэмпература паменшала... А рану мы зараз прамыем, прачысцім... Так што будзеце насіць гэтую кулю пад сэрцам. На памяць... А магло ж быць горш! Каб не зблізку стрэліў, набрала куля разгон, то...

— Дзіва што зблізку!.. Цераз парог... У сваёй жа хаце...— гэта чамусьці вельмі рэзала сэрца бацьку, і мне здалося, што ён усхліпнуў і тут жа прыдушыў плач.— За нямашто!..

— Каб ён не даждаў заўтрашняга дня...— шаптала мама, падаючы Анчарыку свежую палатняную стужку.

— Не будзем больш завязваць, зробім інакш...— Анчарык у нешта памачаў кавалачак марлі, сунуўшы ў рудую бутэлечку, потым праскроб, прачысціў рану чым найглыбей і яшчэ раз змазаў вакол дзірачкі, толькі ўжо бясколерным, як вада, вельмі пахучым.— Няма кепскага без добрага: прымусілі лячыць немцаў з пераезда і паліцаяў, дык хоць сякіх-такіх медыкаментаў далі. А так бы, калі спатрэбілася б, хоць аднымі малітвамі...

Урэшце ён зрабіў з марлі і ваткі невялікую латку, змазаў рудою мазюкаю і прыляпіў на рану. Зверху заклеіў палоскамі стужкі-ліпучкі. І пачаў збіраць свой чамадан...

Мама памагала тату надзяваць сарочку і гаварыла:

— Не ведаем, як вам і аддзячыць... Прадуктаў няма асаблівых, а гэтыя маркі, даруйце, хоць у адхожа месца... За дзесяць марак запалкавы карабок солі не купіш...

— Нічога, цётка, не трэба. Вы лепш параненага глядзіце... Яму трэба харчы добрыя.

— Каб жа ён хоць прымаў усё... А то з'есць чаго кіслага ці грубага — бяда...

— Дык, кажаце, каб не даждаў Курак заўтрашняга дня...— у Анчарыка быў пахмуры твар. І мама быстра зірнула на яго, сумеўшыся: ці не лішне яна пляскала пры ім языком? Немцаў жа лечыць, паліцэйскіх... Але Анчарык не глядзеў на яе, пайшоў на кухню, нешта выняў з чамадана, загорнутае ў палатняную анучку і падобнае на тоўсты апрэснік, паклаў

на акно.— Наложыць галавою... Не цяпер, то ў чацвер... Нідзе не ўхаваецца, у народзе — не ў лесе. За кожным яго крокам людзі сочаць...

Анчарык хуценька паўскідаў на сябе кучомку і паліто, падхапіў чамадан і махнуўся за дзверы.

Сярожа зляцеў з печы ў імгненне вока, падскочыў да акна. На самы край чарэні прыпаўзла Таня, зірнула яму ўслед.

— Бухнеш! — памахаў я на яе, і малая трошкі падалася назад, як рак у нару.

— Масла!!! — залямантаваў Сярожа, разгарнуўшы Анчарыкаў «апрэснік», і памчаў з ім у тую хату.— Масла!!! Мама, я хачу скібку! Хачу скібку з маслам!

Мне таксама захацелася хлеба з маслам. Ажно ў жываце «зарыпела»...

— Сціхні, бо замест скібкі заробіш фартуха! — прыгразіла маці і адабрала з яго рук кружок. Адляпіла краёчак палатніны, панюхала жоўты злёпак, пастругнула кіпцем ад сябе — тоненька, пасмакавала.— Трошкі елкасць чутна... Ну і Анчарык!.. Хоць бяры ды даганяй яго...

— Елкае, то сабакам выкінь...— бацька коратка зірнуў на масла і адвярнуўся да сцяны.— Не хапала яшчэ Нагайчыкавы недаедкі даядаць.

Мама паклала жоўта-белы кружок на лаву каля стаяка сноўніцы, схапіла лыжку, моўчкі прайшлася да печы і толькі тады пачала гаварыць. Адрывіста, як са злосці:

— Гэта невядома, хто яму даў. Можа, яшчэ да другога каго заязджаў... Хіба мала цяперашнім светам хворых?.. Міша! Дзе ты швэндаешся, чуць зноў не парвала нітку!

Я кінуўся да заслона, хуценька павярнуў клубок, палез на печ па Таню — надакучыла азірацца на яе. Хацеў паставіць зноў у стойку — дык ого! То растапырыць ногі, то падцісне і вісне, крэкча — не хоча, каб запіхвалі туды. Дзявуля... Гэта дык разумее, вучыць не трэба, а каб скарэй самой вучыцца хадзіць...

Шкада, калі тое масла Нагайчыкава, калі Анчарыку далі яго за перавязку паліцэйскага. Такое масла і я не хачу есці. Толькі Сярожа нічога не разумее, цягне сваё: «Скі-і-ібку з маслам! Скі-ібку!»

— І што, калі Нагайчыкавы далі тое масла Анчарыку? — гаварыла маці, не прыпыняючы хады.— Раз далі яму, то ўжо яго, а не Нагайчыкава. Ён і распарадзіўся ім, як сам схацеў...— угаворвала мама не то сябе, не то бацьку.

Тата ўздыхнуў на ўсю хату і не закашляўся.

— Рабі як знаеш... Ты — маці.

— Так бы і сказаў... Папакруціўся б цэлы дзень з такою прорваю, то знаў бы.

— Хле-е-е...

—Сціхні, каб табе!..— прытупнула на Сярожу маці.— За год з вамі не паснуеш. А калі яно ткацца будзе — Бог-Бацька ведае...

І ўсё-такі зноў закруціла ніткі за калок, забрала з лавы масла і надышла да стала на кухні. Ніткі, што ішлі з клубкоў угору, адхіліла ад твару ўбок. Адрэзала тры няроўныя скібкі і памазала іх маслам: не так памазала, як накрышыла масляных крошак, наклала слоем. Масла было мёрзлае...

— Глядзі, каб і яна трохі ела, памагай ёй...— сказала мне маці, раздаючы скібкі, і Таня адразу заскакала паміж маіх каленяў, прытупваючы пяткамі, нібы і яна нешта разумела.— Можа, і табе, Верамей, памазаць?

— Не хачу! — як адрэзаў бацька.

— Як сабе хочаш...— маці зноў узялася за снаванне.

Сярожа еў, задаволена мурлыкаў, размахваў нагамі, усеўшыся на заслон. Таня тупацела панчошкамі па падлозе, прысядала — мае калені не давалі ёй зыбацца ў бакі. Яна паспявала хапаць рукамі за скібку, пляскаць маслянымі рукамі мне па шчоках, лавіць ніткі, што мітусіліся перад вачыма. Урэшце і гэта ёй надакучыла, пачала цягнуцца рукамі да маці.

— Ну, што, дзіцятка маё, што, гарушчае? Яшчэ ж табе і спаць ранавата... Эх-ха!..— мама падхапіла Таню на левую руку, пацалавала. Праваю лыжкі не выпусціла, прайшла з дзіцем некалькі разоў каля сноўніцы і хутка засаплася.

— Што ты хоць робіш? Ты б яшчэ завязала яе ў хустку, як цыганкі носяць...— абурыўся бацька.

— Ага... Каб у хустку ды за плечы, то можна было б і хадзіць...

— Я смяюся, а яна агакае... Кхы, кхы... Прывучы на руках насіць, то яна табе і быту не дасць.

— Хоць так, хоць сяк, хоць упрысядку... О-хо-хо, няшчасніца ты мая, як не ў пару ты з'явілася на свет...

— Памаўчы, Ганна... Хто ж гэта ліхую долю ведаў?

Таня ўжо не хныкала і не плакала, яна неяк кехкала, адхіляла маме матроску на грудзях і заглядвала за пазуху: «На, на, на!» Гэта ў яе — «Дай, дай, дай!»

Маці прытуліла руку да грудзей.

— Пустыя, маё дзіцятка. Але на, пацягай трохі, мо заснеш...

Пакуль мама вісела над калыскаю, я ўзяў лыжку, разгледзеў, куды весці, і пачаў снаваць — за адзін калок зачапіў, за другі, пайшоў да трэцяга. Сярожа адразу падскочыў да мяне:

— І я хачу! Дай мне!

Як я хадзіў адзін, маці глядзела і маўчала, а прыстаў Сярожа, яна адразу засварылася:

— Пакіньце абодва, гэта не забаўкі. Наблытаеце, тады з хаты павыганяю.

І тут у сенцах нехта злёгку патупаў нагамі. Толькі ўзяўся за клямку, а я пазнаў ужо, што чужы чалавек. Я ведаю, як адчыняюць хату мама, тата, Змітрок і Антон. Кожны пасвойму, але пазнаеш заўсёды. А цяпер зайшла Матрэна — тая суседка, што жыве за аселіцай. Яна нізенькая, не вышэй за мяне, тварык — як у дзіцяці. Яна яшчэ і ў парозе пастукала ножкамі, а ўжо тады паздароўкалася.

— О, якія ў цябе, Ганна, памочнікі растуць: і прадуць, і снуюць. А кросны паставіш, то і ткаць навучацца... Дай жа я, мае дзеткі, прайду колькі разоў. А ты вазьмі лепш во што...— і яна адхіліла крысо кажушка, запусціла руку ў падаткнуты мяшэчкам фартух, нечым зашамацела.

Макаўкі! Тры вялізныя, сухія, як костка, макаўкі... Хто не ведае, што гэта за смаката!

— А «дзякуй» дзе? Кот з'еў? — напомніла маці.

Але Сярожа нічога не сказаў, ён хуценька надкусіў макаўку і вытрас увесь мак у рот — за адзін раз! Жаваў, ледзь

варочаючы языком, і цэліўся, каб яшчэ і Таніну забраць, але я не даў. Сваю ж я перавярнуў, акуратненька адрэзаў нажом ніз. Атрымалася вечка і гаршчок. Выбіў з гаршка мак у рот, аддаў пусты гуляць Сярожу.

— Ну, як ты тут, суседухна, качаешся? — папытала Матрэна ў таты і адразу патупала ад яго да печы, вярнулася зноў у тую хату, дадала: — Я думала, ужо корпаешся ў падпаветцы — прачынена.

— Ат, маўчы ты...— уздыхнуў бацька.— Пачаставаў так, што пяты дзень п'яны, галавы не падняць.

— Што на свеце робіцца, што робіцца...

Трах! — падскочыў клубок, паляцеў пад прыпечак. Добра, што хоць не парвалася нітка — напялася толькі, ажно крутнула Матрэну на месцы. Пакуль я лавіў і клаў на заслон клубок, яна глядзела на мяне і гаварыла:

— Скок, як зайчык... Скок! — і нецярпліва пераступала нагамі.— «Нацэпніцы», не тут кажучы, не было?

— Не,— сказала мама.— Але нядоўга і нарабіць — не снаванне, а гора.

— У цябе на губку і хунта не пойдзе — тонка спрадзена, хораша...— хваліла Матрэна і часценька тупала ўздоўж сноўніцы.— Помню, мая маці такіх ужо талек навыводзіць... Шаснаццаць пасмаў, а праз пярсцёнак пралезе. Лёталі па сёлах, не маглі ніяк бёрда тонкага дабраць.

— А ты мо паткала ўжо сваё?

— Ткуць дзяўкі, стараюцца...

— Сярожа, ідзі сядзь на палок, пакалыхвай нагою. Таня дрэмле ўжо, скора засне...— Мама падлезла пад сноўніцу, пайшла насустрач Матрэне.— То дай ужо, хіба, я... Дзякуй, што і так прабегла колькі разоў.

— Ат, якая там помач... На мінутку заскочыла...— яна адхіліла крысо кажушка зноў, дастала з падаткнутага фартуха яшчэ і шклянку з кавалкамі жоўтага, у крупкі мёду.— На, суседка, на лякарства...— Яна адляпіла кавалачак шпалеры, якім была прыкрыта шклянка, панюхала, зноў заляпіла.— Здаецца, ліпавы...

— Дзе ж ты яго ўзяла? У вас жа немцы параздзіралі вуллі, як тыя мядзведзі.

24. Зак. 1877

— Ухавала леташняга... Пакінула трохі на канун, а гэты, думаю, занясу вам. Як спатрэбіш — вярні шкляначку... Гола цяпер з пасудаю... Жывым, думаю, мёд лепш патрэбны, чым... А не...

І Матрэнін твар імгненна ўмыўся слязьмі, нібы хто абліў яго вадою.

Знямогла, ледзь не вобмацкам абсунулася на заслон побач з клубкамі, закрыла твар рукамі і загаласіла:

— А дачушка ж мая-я-я! А мая ж ты руплівіца-а-а! А як жа ты ўсё старалася рабіць, памага-а-аць! А ні ручкі твае, ні ножкі не таміліся-я-я! «А ма-амка ж мая, мамка!..— прасіла ты.— А можа, яшчэ ёсць што зрабіць!..»

Не магу я такое слухаць і трываць, у мяне самога адразу сыплюцца слёзы. Уцякаю з калодачкі, утыкаюся тварам у акно, узіраюся праз незамёрзлую плямку на вуліцу. Курыць там мяцеліца, насыпала ўжо гуру вышэй плота.

— Сціхні, Матрэна...— сказала маці, падышла да шафаўкі на сцяне ў мыцельніку, схавала мёд на самую высокую паліцу.— Не крой сабе сэрца без нажа... Не вернеш — ні крыкам, ні слязьмі...— і вярнулася зноў да сноўніцы, узяла лыжку і пусцілася ў дарогу.— Сама ж кажаш, што жывых трэба глядзець... У цябе пяцера, у мяне пяцера, ды Верамей яшчэ такі... Жывых як бы выхаваць, дагледзець.

Матрэна перастала галасіць, толькі ўсё хліпала носам, і я вярнуўся на сваё месца. Цётка не выцірала твару, а старанна папраўляла клубкі, хоць іх не трэба было яшчэ чапаць.

Урэшце паднялася, уздыхнула горна, на ўсе грудзі, зашпіліла на кажушку ніжнюю бірульку-палачку, прышытую замест гузіка, цярнула далонямі па шчоках.

— Пасядзела б крыху... Гэта колькі па тваёй Вольцы ўжо? Паўгода? — гаварыла маці, абы каб што гаварыць.

— Якое ж паўгода... Шасціны, шэсць нядзель...— Матрэна пацерла вочы пальцамі, нібы даставала парушынкі.

— Хаця ж, праўда, снег ужо ляжаў... О Госпадзі... Працяглося, як паўгода. І аднаго дня не пражыць, не перачакаць...

— То заставайцеся здаровы...— застукала Матрэна клямкаю.

— Хадзі з богам! Дзякуем, што пераведала...— разам сказалі бацька і маці.

— Няма за што... Гэтулькі назаляем вам з жорнамі... І кош Верамей неяк даваў...

Ступала Матрэна ў сенцы і ўсё яшчэ нешта гаварыла сама сабе, уздыхала.

Некаторы час быў чуваць толькі лёгкі шолах нітак, шоргат маміных лапцяў аб падлогу. Спала ўжо Таня, сядзеў на палку прыціхлы Сярожа. Нават мёду не клянчыў: ведаў, што не дадуць.

— Во так і сядзіце ціха, хай паспіць...— як бы усцешылася маці.

— А ты казку раскажаш? Пра Іванку-сынка...— папрасіў Сярожа.

— Раскажы, мам...— прашу і я.

Усе маміны казкі я ведаю на памяць. Вечароў тры будзе расказваць, і ўсё новыя, доўгія. А як парасказвае, тады адмахнецца лагодна: «Усе... Не приставай...» А мне адстаць не проста. «Ты спачатку пачні!..» — прашу я. Ведаю ўжо кожнае маміна слова, а ўсё роўна буду глядзець у рот. Як прала, дык і я садзіўся на яе прасніцу побач, не баючыся, што зацерушу вока. І слухаў, слухаў, заміраючы сэрцам, забываючыся дыхаць... Цяпер такою назолаю стаў Сярожа, а некалі Антона змяніў я.

І мама расказвае пра Іванку-сынка, як лавіў ён рыбку «сырэнькую-бяленькую», а маці прыносіла яму на раку «смажаную-вараную». Гукала яна Іванку, карміла, а ведзьма сядзела пад кустом і ўсё бачыла і чула.

Пад'еў Іванка і кажа: «Мама, я яшчэ трошкі палаўлю!» — «Ну, ідзі, палаві,— мама гаворыць.— Толькі асцярожна, у ваду не зваліся. І глядзі, каб ведзьма не схапіла».

Паплыў Іванка, пайшла мама дадому.

А ведзьма падкралася бліжэй да берага і закрычала тоўстым голасам: «Івуонко, суно-ок, прынёсло-о я чогуно-ок!»

Пачуў Іванка, яшчэ не адплыў далёка, і гаворыць: «Чую, чую! Гэта не мамчын голас, гэта ты, ведзьмішча-сцервішча!»

Эх, завыла, закачалася па кустах ведзьма!

Пайшла ў кузню да кавалёў. «Кавалі, кавалі, скуйце мне такі галасок, як у Іванкавае мамы!» — «Добра!» — гавораць кавалі. Пакацілі яе, выцяглі абцугамі язык, паклалі на кавадла... І давай перыць пудовымі малатамі! Давалі ўжо, давалі, білі-білі... Іскры з языка сыплюцца, гром грыміць, як усё роўна з гармат страляюць. Круціцца ведзьма, як вужака, крычыць немым голасам: «Аво-я-ёй! Аво-я-ёй!»

...Сярожа рагоча, аж галаву закідвае, размахвае нагамі.

— У-у, гадкая ведзьма!

— Ціха, а то не буду расказваць! — грозіць мама.

І Сярожа пераварочваецца жыватом уніз, саскоўзвае з палка, паднырвае пад сноўніцу і ўсаджваецца каля клубкоў на заслоне. Якраз на тым месцы, дзе сядзела цётка Матрэна.

У бацькі на твары, здаецца, таксама ўсмешка...

— Кажы далей! Кажы далей! — пасуквае ад нецярпення нагамі Сярожа.

— Ага... Вырвалася ведзьма ад іх, памчала на рэчку і давай пішчаць: «Івя-янькя-я, сінёк, плінясля я цігунё-ёк...» А Іванка ёй: «Чую, чую! Гэта не мамчын голас. Гэта ты, ведзьмішча-сцервішча!»

Заскавытала ад злосці ведзьма, зямлю дзярэ кіпцюрамі, хапае дзярны зубамі. Зноў паперла да кавалёў: «Скуйце такі голас, як у Іванкавае мамы!» А кавалі нагнулі яе ў каршэнь, выцяглі язык абцугамі, паклалі на кавадла і давай малаціць: раз па языку — раз па носе, раз па языку — раз па носе... Адцяглі ёй нос на паўметра, бяжыць-спатыкаецца, за карчы чапляецца.

Дабегла да рэчкі і крычыць:

Іванка-сынок, прынясла я чыгунок,
Прыплыві к беражку, я стаю на пяску,
Дай мне рыбкі сырэнькае-бяленькае,
А я табе — смажанае-варанае...

Якраз як у Іванкавае мамы голас зрабіўся!

Пачуў Іванка, зарадаваўся і спявае. Галасочак — як сярэбраны званочак:

Іду-плыву, мамцы рыбкі нясу,
Сырэнькае-бяленькае,
А ты мне дай смажанае-варанае...

Падплыў. «Я тут, мамка, дзе ты?» А ведзьма выскачыла з-за куста — хапець! І пацягла ў цёмны лес, за далёкія моры, за высокія горы. Бяжыць — зямля дрыжыць, усядно як ад бомбаў, хмары на зямлю падаюць, маланкі поплаў, як сохамі, дзяруць...

...І тут, праўда, нешта кляцнула, грукнула, расчыніліся дзверы. І я, і Сярожа ўздрыгнулі ад нечаканасці...

На парозе стаяла Варвара Пракопавых. Твар выцягнуты, углядаецца спалохана ў маму, рукі, каб не так дрыжалі, пад фартух сунула. Ды дзіва што задрыжыш: прыбегла ў адным кабаце-безрукаўцы. Ён хоць і цёплы, з подбіўкай, але не кажух. На галаве вязаная чорная хустка, на нагах — вялізныя, растаптаныя кірзавыя боты, мо яшчэ Парфёнава Івана. І твар, і ўсё на твары ў цёткі такое вялікае, што можна выкраіць два такія твары, як у Матрэны.

— Дзень добры!.. Не спіць Верамей? — голас у яе нейкі таямнічы, як у змоўшчыцы.

— Не, здаецца. Праходзь, не стой у парозе, як старчыха.

Варвара прагрукала далей, у дзвярах у тую хату размінулася з мамай, стаўшы бачком.

— Ой, дзядзюхна, мне трэба вам нешта сказаць... Толькі вам асмелілася... Загані, хіба, Ганна, дзяцей на печ... Бо не дай бог чаго, то і мяне туды адправяць, куды і Парфёнава.

— А ну — шморг да тараканоў! — паказала мама Сярожу і мне на запечак.

Сярожа адразу зацягнуў : «У-у, казку не дагаварыла...» Палез у запечак — спачатку пад сноўніцу, а потым яшчэ і пад калыску, хоць яе можна было абысці. Мама тут жа прыгразіла яму: «Разбудзі толькі, разбудзі!»

— А ты сядзі, хіба, не маленькі ўжо. Толькі рот на замку каб быў: нічога не ведаеш, не чуў і не бачыў.

Я сеў назад на калодачку. Варвара з крэктам падлезла пад сноўніцу ў той хаце, схавалася за грубку і прымасцілася там недзе, на ложку.

— Ой, не ведаю, з чаго і пачынаць... Прыносіць раз Іван аднекуль «кошку», цёмначы ўжо... Адагнуў гвозд, збіў яе малатком з шаста, прывязвае вяроўку. «Што ты,— кажу,— надумаўся? Мо вядро ўтапіў у чужым калодзежы? Хаця ж не, стаіць унё...» — «Ага, вядро,— гаворыць,— толькі не я, а Хрысціна Гарбатавых... Абяцаў памагчы ёй дастаць...» — «Дык нашто з шаста здзёр? — пытаю.— З шастом жа лепш укіруеш...»

Ну, пагаварылі так і забылі, спаць палеглі... А ўночы р-рып дзверы! Я і прахапілася: «Хто там? Што такое?» — сеў голас са страху, адцягнуць не магу. «Спі, спі, гэта я... Карова, здалося, загрукала, хадзіў глядзець». А сам з-пад апранахі шморг тую вяроўку з «кошкаю», кідзець на печ — пасушыць.

Ноч месячная была, я ўсё бачыла. «Кладзіся,— кажу,— а то багатыя ноч разбяруць».

І раніцаю нешта ён вельмі доўга карову глядзеў... А я зірнула, устаўшы, на тую вяроўку — ажно зялёная ўся ад плесні і ціны, тухлым яйкам, гнілоццем смярдзіць. Такую вяроўчыну згнюсіў!

Цётка Варвара пачала гаварыць пошапкам, і я навастрыў слых:

— Няма ўсё Івана... Наліла я ў начоўкі вады, ўсыпала попелу і давай тую вяроўку шчоткаю адціраць. Мыю і думаю сабе: хіба ў Хрысціны такі калодзеж? У яе калодзежы крыніца б’е, вада — што крышталь... А тут няйначай як у закінутым якім боўтаўся.

Паклала я зноў тую вяроўку сушыцца. І чуе маё сэрца, што тут нешта не тое. Але не насмельваюся ў вочы папытаць — строгі быў Парфёнаў... І закарцела мне да Сямёрчыкавых схадзіць. Солі, думаю, пазычу пайду...

Два разы прайшлася каля іх калодзежа... Надаставана каля яго ўсяго ўсякага — лому жалезнага, абручоў, старое кола ад воза, вядро сплюшчанае... У гразі ўсё, у твані... І такі самы пах ад хламу...

І яшчэ горш пачало мяне падазрэнне распіраць: ці не ён тут кешкаўся? І шкада яго зрабілася — гэта ж мо цэлую ноч мучыўся!

«Кошку» ён узбіў назад на шост, занёс. А праз два дні бобікі гэтыя і схапілі яго...

Варвара на момант змоўкла, зычна трубнула носам — мусіць, першы раз абраніла па Іване слёзы.

— А сёння скубу гэта, грабу з кутка салому на сечку, чую — падчапіла нешта граблямі. Выгрэбаю доўгі скрутак...— цётка зцоў зашаптала, прыціснула голас так, што некаторыя словы выляталі са свістам.— Разгарнула... А там вінтоўка! Вычышчана, льняным алеем змазана — я нюхала...

— Доўгая вінтоўка ці кароткая? — таксама шэптам папытаў бацька.

— Не, не зусім доўгая... Во... Во такая, мо з метру.

— Падобна, што карабін. У таго немца, што кінуў у калодзеж, таксама карабін быў.

— А той немец, я чула, і не немец, а тальянец.

— Італьянец?

— Ага, ага — так, здаецца...

— А ты не прыгледзелася, ручка ў затворы як служыць у карабіне — убок тырчыць ці загнута ўніз? Каб не бельгійскі хоць быў...

— Чорт яго прыглядаўся, дзе там той затор і куды там што загнута.

— А дзе ты дзела карабін?

— Дзе, дзе... Загрэбла зноў у салому. І адразу к вам... Што мне цяпер рабіць, Верамейка, дзе дзецца? Знойдуць немцы — заб'юць.

— Задачу... задала...— Бацька пакашляў.

— Мо каб уночы перанёс ды ў ваш калодзеж — шчабоўк! Тут жа блізка, цераз вуліцу...

— Але! Зварыла галава... Ваду сапсуеш.

— Вой, я цяпер баяцьмуся адна ў хаце быць...

— Трэба начным гасцям аддаць... Мо скора завітаюць.

— Вой, у мяне сэрца разарвецца да таго часу! Мо немцам занесці, на пераезд? Скажу — так і так...

— Але! Яшчэ што надумай... Будуць яны разбірацца.

— А божухна, во гора на маю галаву! Хай бы ўжо ішоў з гэтаю гарматаю Парфёнаў у партызаны, то мо ацалеў бы і сам, і нада мною сякера не вісела б.

— От што... Калі ўжо прыйшла, то слухай. Прыйдзе да цябе мой хлопец позна... Пастукае тры разы... Яму аддасі. Мы самі ўжо расхлёбаемся з гэтаю гарматаю. Толькі... ведаеш? Калі звязаліся адной вяровачкай, то...

— О, Верамейка! Язык пракаўтну, чым каму... Я яшчэ пажыць хачу!.. То бывайце здаровы ўжо...— Цётка Варвара выйшла з-за грубкі, крэхчучы, пралезла пад сноўніцай і порстка пагрукала ботамі да дзвярэй.

Як толькі за ёю бразнула клямка, мама сказала:

— А пра сябе ты падумаў? А пра дзяцей ты падумаў? — голас яе задрыжаў.— Мала нам усяго-ўсякага? Цяпер, калі што, пад корань усіх вынішчаць!..

— Падумаў... Мне ж толькі і астаецца — ляжаць ды думаць.

Каля мяне з'явіўся Сярожа. Ніхто не заўважыў, калі ён злез з печы.

— Мама, а як ён бегаў? — тузануў ён маці за спадніцу.

— Хто?

— Ну, той кот з вяроўкаю, пра якога цётка расказвала.

— Які кот? З якою вяроўкаю? Ты што — сасніў там, седзячы?

— У-у-у...— завёў Сярожа пакрыўджана.

— Слухайце лепш казку... Пра што я там казала ўжо?

— Як ведзьма бегла з Іванкам,— падказаў я, адцягваючы Сярожу ад маміных ног. І ён зноў усеўся на заслон, падрыхтаваўся слухаць.

— Ну — прынесла яна Іванку дадому. І гаворыць сваёй дачцэ Алёнцы: «От табе Іванка... Спячы, пакуль я па лесе пагуляю». І пайшла сама...

Алёнка напаліла печ, як на хлеб. Узяла лапату, што хлеб саджаць, і гаворыць Іванку: «Кладзіся!» Што ж рабіць, кругом замкі-запоры, не ўцячэш. Лёг Іванка і звесіў ножку з лапаты. «Не так!» — крычыць Алёнка. Ён зноў лёг, ужо ручку звесіў. «Не так!!!» — крычыць, як не лопаецца, Алёнка. «Калі ж я не ведаю — як... Ты пакажы мне»,— гаворыць Іванка. «У-у, мужыцкае мяса...» — скрыгіча яна зубамі. Легла на лапату праменька, рукі і ногі выцягнула: «От як трэба!»

А Іванка шусь яе ў печ! І засланкаю засланіў... Тады трах лапатаю па акне! Скок сам на двор... А там явар стаяў — высокі-высокі, дык ён на той явар і залез, схаваўся ў галлі.

А тут і ведзьма вярнулася. Зайшла ў хату, пасмыкала носам. «Ах, як смачна Іванка пахне!» Выцягла з печы Алёнку, наелася, напілася, выйшла пад явар і качаецца, жывот пагладжвае: «Пакачуся, павалюся, Іванкавага мяса наеўшыся, Іванкавае крыві напіўшыся». А ён з явара, не вытрываў: «Алёнчынага мяса наеўшыся, Алёнчынай крыві напіўшыся!» Падняла ведзьма галаў — а там Іванка! Ух, зараўла, завыла, пачала грызці зубамі той явар — усе зубы паламала. Схапіла сякеру і давай секчы...

А Іванка бачыць: ляціць чарада гусей — высока-высока... Ён і просіць іх:

Гусі мае, лебедзі,
Скіньце мне па пярцу,
Я з вамі палячу!
У майго бацькі жыта —
карыта,
Возера вады,
Будзе з вас піць і есці
На чатыры гады!

Кінулі гусі па пярцу. Увабраўся Іванка ў пер'ейка па пояс. Сячэ ведзьма, завіхаецца. А Іванка прыгаворвае: «Не ў явар, да ў камень — бабух, сякерка! Не ў явар, да ў камень — бабух, сякерка!»

Ляціць другая чарада гусей, ужо ніжэй крыху. Іванка зноў просіць:

Гусі мае, лебедзі,
Скіньце мне па пярцу,
Я з вамі палячу!
У майго бацькі жыта —
карыта,
Возера вады,
Будзе з вас піць і есці
На чатыры гады!

І гэтыя гуські скінулі па пярцу. Іванка ўжо ўвабраўся па грудзі ў пер'ейка і прыгаворвае: «Не ў явар, да ў камень — бабух, сякерка! Не ў явар, да ў камень — бабух, сякерка!» А ведзьма ўсё сячэ, завіхаецца, смярдзючай слінай пырскае...

Ляціць трэцяя чарада гусей, зусім нізенька...

...Зноў нехта прайшоў пад акном, прасунуліся па столі ў другі бок цені. Так мы і не даслухалі, як хруснуў, зламаўшыся, явар, як падхапілі Іванку рукі-крылы, як паляцеў ён з лебедзямі на вольную волю... Але паляцеў, мы гэта добра помнім!

Дзверы ў сенцах не грукнулі, а толькі прарэзліва рыпнулі і засталіся, мабыць, расчыненыя насцеж. Хатнія дзверы таксама рванулі так, што яны ажно стукнуліся аб лесвіцу, адскочылі назад. Адпіхнуўшы іх яшчэ раз, на парог стаў Курак. Адразу раскінуў рукі, схапіўся за вушакі — яго зыбнула назад. З-пад ног павалілі ў хату белыя воблакі холаду.

— Зачыняць трэба, дзеці хворыя...— сказала маці і павяла ніткаю проста на Курака, нагнулася яму пад руку і злавіла клямку.

Курак і сёння быў п'яны. Назбіраўся, як жаба гразі, пакуль да нас дайшоў. Але сёння, здаецца, не быў такі наглы, нібы падцяў крыху хвост.

— Бр'ят ты мой...— упёрся яшчэ мацней у вушакі, адштурхнуўся, ступіў два крокі наперад.— Ёсць указ: ісці шашу расчышчаць... З лапатамі.

— А хто ў нас пойдзе? Угробіў гаспадара, дзеці са скуры лузаюцца, каб хлеба нарабіць...— маці не прыпыніла хадзьбу ні на хвіліну, на Курака не глядзела.

— Як пасля такога... вочы тут можна паказваць?..— захрыпеў, задыхаючыся, бацька, прыўзняўся над падушкай на здаравейшай руцэ, нечага шукаючы вачыма.— Мала табе ўсяго гэтага? Дабіваць прыйшоў? Страляй!.. На-а!..— ірвануў сарочку на грудзях — і апаў зноў на падушку, затуліў рот ручніком.

— Бр'ят ты мой... З мяне трэбуюць — і я трэбую! Каб старшыя ў чатырнаццаць нуль-нуль былі на шашы каля

Міхайлаўкі... Не пойдуць — пінайце на сябе! Або шаша, або фацерлянда... Спіскі, у Германію ехаць, сказалі саставіць...

Курак павярнуўся, грукнуў ботам у дзверы, таўхануў плечуком — ажно звалілася на падлогу шапка — не то летняя, не то зімовая, з казырком, як у кепкі. Падымаў і бліснуў лысінаю з доўгімі і рэдкімі, наліплымі валасамі. І толькі пасля гэтага ўспомніў, што ёсць клямка, хапіўся за яе аберуч...

А ў хаце нібы астаўся сабачы холад, што прынёс Курак, і гэты холад скаваў усіх. Мама ішла паўз сноўніцу паволі-паволі і не бачыла, куды клала ніткі. Не да «нацэпніцы» было. Кінула раптам лыжку, і яна пагушкнулася, праехала па нітках. Як у сне падышла пад парог, узяла мятлу, пастаяла з ёю, нібы забыла, што збіралася рабіць. Потым марудна згрэбла ў кучку большыя камякі снегу, што пакінуў Курак, укінула ў цэбар, лужынкі зацерла анучай. Выйшла яшчэ зачыніць сенцы, а вярнулася ў хату, то сказала:

— Бяжы, хіба, Міша, па хлопцаў... Хай кідаюць на чом стаяць... Трэба ж наравіць гэтай ліхой скуле...

Я падхапіўся адразу.

— Як ты хутка распарадзілася...— часта задыхаў бацька.— А можа, там адразу загоняць у машыны і... Хіба ж не было, што ашуквалі...

— Дык што-о — жыўцом у зямлю лезці?! — вырваўся з матчыных грудзей стогн.

— Хай ідзе ён, усё роўна абедаць трэба,— бацька задыхаў ужо раўней.— А сама па суседзях прабяжы... Папытай, хто яшчэ пойдзе... Старыя ці маладыя...

* * *

Хлопцы не дамалацілі пасад. Я згроб распушчаныя снапы ў кучу, палавіў крыху салому і большыя каласы, а тады перавярнуў граблі стаўпцом уніз, ссунуў жыта ў кучу. Перавозіў я яго доўга, насыпаючы па пуду, па паўтара. Больш насыпаўшы, не мог даць рады — і не падняць, і санкі па снезе не вывалачы. Бацька не хацеў, каб на таку заставалася

збожжа. Усякія людзі ёсць... Сноп мо і не падымецца рука перакінуць на свой торп, а гатовага, намалочанага, могуць і набраць.

Калі я прыехаў з аборы апошні раз і паставіў пад лаву ліхтар, маці ўсё яшчэ тупала каля сноўніцы. Але што гэта было за снаванне — не разганіся, увесь час азірайся на клубкі. Памочнік жа з Сярожы ніякі — чацвёрты год хлапчуку. Добра, што надумаўся з Таняй пагуляць, усё дурэў з ёю на палку, куляўся і дапытваў у мамы:

— Ты зайшла ўжо ў Слуцак ці не?

— Зайшла, зайшла... Нават назад вярнулася,— адказвала мама.

— А што ты нам з Таняю прынесла?

— А што я табе, сыночак, прынясу? — пытаннем адказала маці і ўздыхнула. Не вытрывала, падышла да паліцы, дастала шклянку з мёдам. Намазала скібкі і яму, і Тані — тоненька, мядовая плёнка ажно свіцілася.

— Ах, які харошы Слуцак! — Сярожа скакаў ужо з печы на палок, робячы грому на ўсю хату.

Ніколі яшчэ такога не было ў нас: ноч, а сноўніца ў хаце. Усё памалей і памалей ходзіць маці. Да Слуцка пятнаццаць кіламетраў, значыць — прайшла яна трыццаць, а «дарога» яшчэ не канчаецца. Добра, што клубкі ўжо невялікія, па кулаку, навітыя ўмітусь. Круцяцца, падскокваюць — адзін у рэшаце, другі — у форме, што парабіў бацька з бляхі пячы хлеб.

Маці ходзіць паўз сноўніцу ў нейкім одуме. Маўчыць і бацька. Я падумаў спачатку, што ён спіць, а прыслухаўся — не, уздыхае паціху, нешта думае. На прыпечку палаюць смалякі, але ў тую хату водбліскі даходзяць мала. Можна адно згледзець, што бацька трымаецца здаравейшай рукою за лоб, прыкрыў трошкі вочы.

Як сеў я на лаву, дык не мог і варухнуцца, як хто скаваў. Цяжкімі здаваліся рукі і ногі, балеў жывот. Есці я хацеў страшна, але маці не ўспамінала яшчэ пра вячэру: чакалі Змітра з Антонам. Яна ўжо некалькі разоў кідала сnavаць і бегала да суседзяў — ці вярнуліся з шашы? Не, ніхто

не вярнуўся... І ў мяне халадзела ў грудзях: а што, калі з хлопцамі нешта здарылася?

Змітрок з Антонам прыйшлі позна — трымаў немец да самага цёмнага. А ісці не блізка — пяць кіламетраў. Перлі так, што спіны змакрэлі, спяшаліся, каб да сямі пераскочыць цераз пераезд.

Хлопцы доўга адсопваліся, з плячэй вярнула пара, нібы стаяла за імі па чыгунку з бульбай. У Змітра адна ноздра заткнута кавалачкам анучы — мусіць, адарваў, скінуўшы валёнак. Цяпер ён адкупорыў нос і ціха пачмыхваў — пойдзе кроў ці не? І ўрэшце выкінуў чырвонае заткла ў сметнік.

У хлопцаў было што расказаць.

— І заўтра загадаў немец прыходзіць... У дзевяць раніцы.

— Конь у немца — як слон, а хвосцік у каня — як пэндзаль, што печ бяліць... Раз'язджаў у санках сюд-туд, указанні даваў.

— Ой, адубеў зусім, седзячы!.. Злез, а ногі і рукі як карчы. «Ком-ком!» — на цётку Прыбыткаву. Мармыча нешта, паказвае сабе на штаны. Яна круціць галавою: «Не разумею, пан»,— трасецца. А той як закрычыць, затупае нагамі! Дык цётка і давай штаны яму расшпільваць, даставаць... Кругом людзі, а ён...

Толькі я адзін чмыхнуў: ну як жа! Скарчанеў немец, што рады не мог даць штанам. А мама і тата ніколечкі не ўсміхаліся. Бацька, намаўчаўшыся, сказаў:

— Людзі кругом... Каб жа мы былі для яго людзі... Што быдла бясхвостае, што мы... Чаго ж быдла саромецца?

— Прыбытчыха плакала пасля...— дабавіў Антон цішэй, як бы спалохана.— Цешылі яе там жанчыны, а яна аж заходзілася...

А яшчэ адну навіну Змітрок сказаў:

— Дайшоў Нагайчык той, што партызаны падстрэлілі... Хлопцы пасрэдніцкія гаварылі.

Вячэралі моўчкі. Бацьку прыўзнялі крыху, прыперлі спіною да падушкі, і ён першы раз еў сам. Леваю рукою еў,

а праваю падтрымліваў на каленях гліняную міску. Дзеравяная лыжка глуха шкрабала па баках міскі, па дне. На вячэру быў суп з фасоляю — чуць цёплы, зрудзелы ад доўгага стаяння ў печы.

Маці жавала Тані, трымала яе на каленях. Пакуль сабралася па трэцюю лыжку, то ўжо нечага было і чэрпаць. Дабаўлялі гуркамі з хлебам, а Змітрок набраў сабе ў жоўтую конаўку, што зрабіў тата са снараднай гільзы, расолу і казаў, што з расолам нават смачней — больш соль чутна.

Елі і маўчалі. Як яно будзе заўтра? Ці не чакае хлопцаў на шашы пастка? Ці не падгоняць грузавікі і... У тую нядзелю, расказваюць, на базары ў Слуцку была аблава. Абкружылі, дык мала хто і вылузаўся... З аднаго заходу налавілі на палавіну эшалона моладзі.

А я думаў пра кросны: праз дзён два мама абавязкова іх паставіць. Сёння яна хоць кончыцца, а даснуе. Палічыць у «чынах», колькі ўжо ёсць, і даснуе. Яна будзе лічыць пасвойму, я памятаю з лёташняга. Ніткі ў яе ўжо будуць не ніткі, а чысленкі. Дзесяць разоў па тры чысленкі — пасма... Колькі ж у яе атрымаецца пасмаў? Дзесяць? Дванаццаць? Каб жа хоць не вузкае было палатно, а то не выйдзе шырокая полка на спіну ў сарочку, давядзецца сточваць. Засмяюць тады людзі...

Потым пачне знімаць аснову — зверху, ад правага калка, дзе ніткі паварочваюць і ідуць уніз. З першага калка так проста не сцягнеш, трэба выбіваць яго. Пакуль мама будзе плесці пляцёнку, я буду перабягаць ад калка да калка, прыціскаць аснову — каб не аслаблялася па ўсёй сноўніцы, а ішло парадкам. Мне падабаецца, як паволі і хораша робіць гэтую работу мама: прасуне ў тоўстую, з соцень нітак, пятлю руку, схопіць тоўсты жгут, бы якога ўдава за горла, пройме-працягне, робячы новую пятлю. А тады ў гэтую новую пятлю нырае левая рука — хап! А тады правая, у самую новую пятлю — цап! І так да канца, да самых «чыноў»...

Назаўтра гэтую пляцёнку будуць абліваць кіпнем, распускаць і перыць на заслоне, пляскаць пранікам. І з нітак бу-

дуць ляцець ва ўсе бакі пырскі, і маміны рукі з падкасанымі рукавамі пакрыюцца малюпасенькімі рабацінкамі, а пад заслон будзе цадзіцца ў ночвы рудая вада. А тады развесяць над печчу на прутах, толькі ўжо не як пляцёнку, а нібы вялікія маткі. Калі ціхае надвор'е, няма ветру і марозу, то сушаць на двары. Калі вецер — нельга, бо зноў раскалмацяцца ніткі. А іх жа столькі пляскалі, каб былі гладчэйшыя! Потым, як высахне аснова, яе будуць вытузваць, каб параўнаваць крыху ніткі, падцягнуць тыя, што зблыталіся, заехалі бог ведае куды. Летась, як толькі кончылі тузаць, тата адразу палез на вышкі па кросны. Знёс — і нам адразу стала цікава: такая навіна ў хаце!

Навіваць на навой аснову — вялікая навука. Але якую толькі навуку не праходзілі, чаго не ўспаміналі з таго, што ішло яшчэ ад матак і бабак! Гэта была нібы адна вялікая навука — выжыць. Выжыць, устояць, што б ні звальвалася на твае плечы за час ліхалецця...

— ...Нешта акно зачырванела... Паглядзіце, недзе гарыць! — устрывожыўся ў той хаце бацька.

Вокны былі чырвоныя ўсе, не толькі ў спальні...

Мы апрануліся як папала, выскачылі на двор. Невядома было, куды глядзець. Усё неба крывавіла чырванню... Снег ружавеў, нібы яго заслалі пафарбаваным палатном. І гэтая чырвань, і гэтая ружовасць не трымцелі, не пераліваліся. Я ніколі не бачыў палярнага ззяння. Можа, яно бывае і такім?

Страшна вылі па ўсім сяле, бы хто іх душыў, сабакі...

— Мінск зноў гарыць...— прашаптаў Змітрок.

— Не, тады, у сорак першым, свяціла толькі ў адным баку...— прашаптала мама.

Тады, як гарэў Мінск, то і я бачыў. Больш за сто кіламетраў, а зарыва заняло паўнеба. Самы цэнтр яго быў крыху правей, чым на поўнач...

— Знаменне нябеснае...— падышла да нашага двара Варвара Пракопавых.— Мусіць, зацягнецца яшчэ вайна... А мо на голад... Помніш, Ганна, як у мікалаеўскую вайну рыба з дажджом падала? І такі голад потым быў, такі голад...

— Якой толькі няма на чалавека напасці...— уздыхнула горка мама.

І раптам ззянне прапала, як і не было. Закалола ў вочы чарната, абарвалася і жудаснае выццё, толькі адзін малады сабака-падбрэхіч усё яшчэ дзяўкаў з падвывам...

— От, скажы ты... Каб хто сказаў цяпер, то і не паверыў бы...— перахрысцілася Варвара і пайшла дадому.

І мы таксама моўчкі пасунуліся ў хату, дзівячыся, як дружна высыпалі дробныя, як іголкаю ткнуць, але яркія на марозе зоркі.

Канчаліся яшчэ адны суткі другое ваеннае зімы.

Трывожным сном засынала вёска...

## Сітус інверсус

Праўду кажуць: увосень пагода на рабым кані едзе.

То дождж, то сонца, то вецер. Думалі, што бабінага лета так і не прычакаюць. Але ўрэшце разлагодзілася, сціхла, выяснілa — і паляцела павуціна. Вязе хто атаву, сена — тырчаць наверсе вілы не вілы, а дзіўная антэна: за тронкам цягнуцца «сучкаватыя» белыя ніткі, нібы прала няўмелая праля.

Аднойчы захаладала, зрабілася ядрана. Падмарозіла на сухую зямлю, і яна падшэрхла зверху, пачала сыпацца, як чэрствы мякіш, і, здаецца, нават запахла «зайчыкавым хлебам». Закружылі-залуналі, пачалі гуляць у лавіткі-даганялкі першыя сняжынкі. Не снег — «матылькі»... Ні хмурынкі не згледзіш на небе, а сняжынкі ўзнікаюць з нічога, трымцяць, як блакітнае мроіва, і зрэдзь, высверкамі на сонцы — бліснь, бліснь, бліснь... Насела варухлівага пуху пальцаў на чатыры, а дол усё роўна прасвечваецца. Ідзеш — і пух распырхваецца з-пад ног, завісае дрымотна ў паветры. Тупнеш — а для яго ўжо як немаведама што: выбух, канец свету...

Першы прымаразак — як першы званок з нябеснай канцылярыі. Падпужаў людзей толькі крыху.

Потым вецер павярнуўся з Байнёва, з цёплага боку. Нахмарыла і задажджыла надоўга. І лік дням згубілі, а дождж ідзе ды ідзе без адхлання: то імжыць, то цярушыць, як на грыбы, то лупцуе, што пугамі. Зямля здаволілася піць, набрыняла, раскісла, бы ў рошчыну «перахаўкнулі» вады. Па вуліцы без ботаў-гумовак і кроку не ступіш. А то і боты не памагаюць. Дзед Хвядось, ліхенькі ўжо стары, на печы б толькі сядзець, надумаўся памагчы сваім у «норме» буракі церабіць. Не ішоў поплавам, а няшчасце ўзбіла яго на грэблю, дзе бульдозер за пагодаю навярнуў свежае зямлі з глеем. Уліп Хвядось, як муха ў патаку: ногі вылузваюцца з ботаў, а каб вырваць гумоўкі — сілы не хапае. Нарабіў крыку, набеглі з балота бабы — Тарасіха і яшчэ жанкі, выбавілі з рогатам старога. Каб памарудзілі, то ўсмактала б Хвядося да калень.

Людзі прыстасаваліся: дождж дажджом, а выбіраць буракі трэба. Першая выйшла ў дождж Тарасіха. Зрабіла сабе на галаву накідку-капюшон з новага, у кветкі, плёнчатага настольніка. Склала рог на рог, падраўняла, каб пруг супаў, правяла па самым краечку гарачым прасам — «зварыла». Навальнага дажджу не было, і яна пабрыла на балота. Чорт яго перачакае, работы ж хоць захлыніся...

У каго сем'і, тым лягчэй. Гэта толькі лічацца буракі на жанчынэ, а і гаспадар памагае, і дзеці — падкопваюць, ірвуць, падносяць. І раней, яшчэ на поліве, на прарыўцы, жанкі ніколі па адной не сядзелі.

Тарасіха ж адна, як былінка ў полі. Ёй, каб не адстаць, трэба за траіх круціцца: Мікітун жа намераў поўную норму, шэсцьдзясят сотак. Магла і зусім не браць — пенсіянерка ўжо, адпрацавала сваё. Але характар дурны, характар спакою не дае, гараваць прымушае. Як ёсць яшчэ здароўе, дык грэх сядзець дома. Дый Мікітун, «выпраўляючы праізвосцвеннага ўчастка», расплакаўся вясною: «Семдзесят сем пенсіянераў! За што на мяне такая кара Гасподня?! З кім жа праізвосцвеннае заданне спалняць?»

Як першы раз уселася ў дождж каля кучы нарваных буракоў, нікагенька больш не было. Яна знарок колькі разоў

азірала тарфянік ад грэблі і аж да самай Калюгі, да чыгуначнага насыпу: ні душы! «Распанелі, трасца вашай матары...— злавала Тарасіха немаведама на каго.— Панаядаліся, каб вас...» Нават на «ўласці» яна гневалася: нашто было так адразу даваць мужыку вялікія заробкі? Нябось, як не было пенсій, не было грашовай аплаты, лепш у іх калгасе хадзілі на работу. «Дальбог!.. А гэта ж...»

І назаўтра, і напаслязаўтра сядзела яна адна, як глыба бліскучага лёду ў дажджовым тумане. І толькі на чацвёрты дзень сям-там павыходзілі на тарфянік бабы: хто ўскінуў башлыком мяшок на галаву, хто цырату на плечы. Мікітун, дурны, даўмеўся нават парэзаць на кавалкі плёнку — не ўсю скарыстаў на сенаж, параздаваў жанчынам. То плакаўся, што не дастаць, а гэта разбагацеў вельмі — парэзаў. Гаспадар!..

Дажыліся! Мяшка не знойдуць ускінуць на галаву ці якога старога плашча. Скора ж вельмі звялі тыя мяшкі... «Усё куплёнае падавай, крамнае... Крам не набудуешся, як папрэ кожны па гатовае...»

Тарасіха бярэцца за заслончык, рыўком вырывае яго з торфу, падыходзіць, сагнуўшыся, не адрываючы ад спадніцы, на два крокі бліжэй да буракоў, зноў апускаецца ножкамі заслончыка на дол. Зноў уся ў сваіх думках...

«А калі ўжо няма меха, накруці на галаву старых хустак, усцягні якія падраныя порткі, каб не было холадна ў калені. Падапрані пад куфайку джэмпераў, кофтаў, фартух падвяжы — не прамокнеш за дзень. Калі нацягнецца вельмі вадою — на печ ускінь, другое апранай. Хапае ж гэтых куфаек у кожнага — і старых, і новых... У старых самы раз у гразі кешкацца... Які тут можа быць сорам? От як буракі зазімуюць, от гэта будзе сорам...»

Адны старэйшыя выйшлі ў дождж на тарфянік, адны бабы... Сердабольныя дужа... «Ах, ах, яшчэ прастудзішся — прамокнеш... Ах, ах, рукі парэпаюцца на сіверы...» Самі ж дачок не пусцілі... «Патакайце, трасца вашай... Патакайце на сваю галаву... Нарасло смаркатай тылігенцыі;

скончыць восем груп ці дзесяць, не паступіць нікуды, а нос ужо ад простай работы верне. Толькі і знаюць, што ўборы, целявізары, дрындушкі... Хлебам не кармі, а дай пагуляць. Гэта ж калі я была ў тым клубе? Ну але, як з Ільюшынага вяселля ішлі... Алёлячкі, што там толькі не выраблялі, хоць святых выносъ... Каленькі выломваюць, азадкамі круцяць... І ўсё дулі адзін аднаму даюць. Не танцы, а... Цьфу, брыдка глядзець!»

Тарасіха ўстае і чуе, што дождж ужо не лапаціць па яе бліскучай накідцы. Плёнка размякла, абляпіла кожную складачку адзежы. Дажджынкі не разбіваюцца на драбнюткія пырскі, а з лёту прыліпаюць да плёнкі, паўзуць да краёў і зрываюцца дадолу.

Тарасіха выдзірае з чорнае тарфяное гушчэчы заслончык, аж цмокае пад ножкамі. Ва ўсе чатыры кантовыя ямкі мутна, як дзёгаць, паблісквaючы, набягае вада. І дрэнаж, скажы ты, не памагае... А думалі, што дрэнаж — дык будзеш хоць бокам каціцца ў любую халепу. Спачатку, праўда што, смактаў як не ў сябе. Вунь дзе вуліца, за паўвярсты, а ўсе калодзежы былі паперасыхалі. У раён нават скардзіліся на такое асушэнне... А што з тых скаргаў? Далі праз сельсавет цэменту, нарабілі па трубе, па дзве, паглыбілі калодзежы. А цяпер поўныя, як вока, і вада стала нясмачная ў іх — нацякло верхаводдзя.

Хваравіта націснуўшы на сярэдзіну далоняй, Тарасіха разгінаецца больш, дрыгае, нібы атрэпвае, адною нагою, другою: здранцвелі, «мурашкі точаць».

Каля новай кучы буракоў яна не проста ставіць заслончык, а спачатку збірае і падкладвае пад ножкі корчыкі, каб не так урэзваліся, і цяжка апускаецца — гэпае. Валачэ з кучы за крохкую мокрую націну самы большы бурак — нібы адпілаваны вяршок тэлефоннага слупа, ставіць яго перад сабою лісцем угору.

Сакаўное якое бацвінне... І бучное, цёмнае. Каб не трэба было ўбіраць, то да самай зімы раслі б. Тарасіха спачатку абрывае гнілыя лісты — рудыя, звадзянелыя. Потым

абірае тыя, што пасохлі, абвіслі ўніз, як тытунёвыя. Цяпер, у дождж, яны як мокрыя вяровачкі ці дратва з бурымі пучкамі на кончыках. Абрэзвае нажом гразь і карэньчыкі-махры, а тады ўжо ўзбамбэрвае бурак на калена, на цыратовы фартух. Шкрэб-шкрэб — у адным жалабку, шкрэб — у другім, з таго боку. Чырк — ляціць націна ўлева. Тарасіха бярэ бурак аберуч — слізкі, важкі, халодны — што камень. «Трасца яго матары... Пэўна, паўпуда зацягне... Параслі як перад канцом свету...» Бурак ляціць направа, чвякае аб зямлю — разлятаюцца пырскі. Нагінаецца па другі...

Гэта ж, каб даўней хто сказаў, што тут будуць араць, буракі сеяць, «кузюльку» («во яшчэ бручку выдумалі: адну парэж карове — паўцэбра»), дык вочы заплявала б... Хіба не было так, што едзеш на кані, а лапці задзіраеш на грыву, каб не замачыць? Было!.. А сена як на ночвах сплаўлялі, то і маладзейшыя помняць.

Нашкодзіў дождж... Ні машынаю, ні трактарам не ўз'едзеш цяпер. На поплаў — груд, што цягнецца вузкім схілам паўз калгасніцкія агароды, толькі і падходзяць машыны. Там цупка, але бывае, што і там буксуюць, як прашмаруюць дзярон. Прыйдзецца возам траляваць туды: конь хоць і грузне, але бярэ з усіх жыл, з паўвозіка, глядзіш, і вывезе. Так людзі надумалі, так і ёй трэба будзе...

Некаторыя ўжо канчаюць, а ў каго і чвэртка нормы асталася. Падагнала добра і яна сваю за гэтыя дні. Затое не здала амаль нічога. Дзве трактарныя скрыні, у пачатку яшчэ недзе, як завёз Ільюша, дык ад таго — ні бурачка. Ляжаць шнурком кучы, нават бацвіннем не прыкрытыя — выбеліліся на дажджы буракі, нібы ім пабелкаю пазначылі лысіны. Чатыры тоны і дзвесце трыццаць кіло было ў тых дзвюх скрынях. А колькі яшчэ будзе? Людзі ўжо больш чым па дваццаць тон паздавалі, летась у некаторых з усёй нормы менш выйшла. Азалоцяцца, цукрам засыплюцца...

Грук! — ляціць направа новы бурак. Няўдала кінула: стукнуўся аб другія, лопнуў, аж свіснуў сокам. «Асцярожней трэ-

ба, асцярожней... Хай іх халера пабярэ... Рукі не дадзержваюць такі ценжар...»

За спіною, у тым баку, дзе сяло, чуецца лёгкі кашаль, і Тарасіха паволі, непаваротліва аглядаецца туды. Маня ідзе, Ільюшава маладзіца. Цёпла адзелася, як у норму...

Тарасіха саскрэбвала з пальцаў гразь і чакала, пакуль тая падыдзе. У твар старой імжыла холадна і густа, здаецца, і вецер пабольшаў. Шэрае неба з цёмнымі камякамі сухмаркаў, расцягнутых і пакамлычаных, як калісь кудзеля каля грэбеня, сунулася і сунулася з-за сяла, то зусім закасоўваючы хаты і дрэвы пацярухаю дажджынак, ажно расплывалася ўсё бруднымі плямамі, то давала прасветлінку, і тады будынкі і прысады праступалі цямней, нібы набліжаліся.

— Што — мо памагаць ідзеш?

Тарасіха пытала як бы незадаволена, з насміхам: сабралася калі! Але Маня бачыла, што вочы яе пад навіссю шчэцістых, як у мужчыны, броваў глядзяць не строга, больш расплюшчана. А гэта ўжо многа для Тарасіхі!

— Ага... Дзень добры вам! Да заўтрашняга абеду буду свабодная, а там ужо заступлю на дзяжурства. Кахы! Кыгы!

— Цяплей трэба было апранацца. Пырхаеш, як тая аўца, што няма.

— А мне цёпла! Хочацца ж, каб павярнуцца было як.

— Стаяць будзеш, няма другога заслончыка.

— Я пастаю, пастаю... Неўвярэдная.

Тарасіха нагнулася па бурак, а разгіналася, то правяла вачыма па Мані з ног да галавы. Гумовыя боты, лыжныя штаны, куфайка... Добра апранулася. На галаве от толькі немаведама што... Быццам дзве хусткі, а лоб выставіла, хоць парасят бі. Кудзеркаў навыпускала... Верхняя хустка вялікая, стрэшкай, рагі скрыжоўваюцца на грудзях і ідуць пад пахі. На спіне тоўсты вузел-зашмарг.

Тарасіха глядзіць, як Маня ўчапілася белымі зубкамі ў прыхаванае лязо складанчыка, хоча адпрастаць, і пакіўвае незадаволена:

— Цацку ўзяла, а не нож... Трэба было які крэпкі зломак узяць. Гостры...

— Нічога... Ільюша ехаў — даў. Зусім забылася, без нажа пайшла. Бр-р, якія настылыя і слізкія буракі — як жабы...

— Абцерпішся. Гэта зразу толькі халодныя.

«Далікатная вельмі стала!.. Як быццам буракі горшыя за чалавечыя паследкі... А пайшла ж у бальніцу санітаркай, прыбірае... Амаль дзеўкаю будучы!» — Тарасіха ўздыхнула дакорліва, але папытала пакуль што пра другое:

— Дзе вы цяпер — у Ільюшавых бацькоў ці ў тваіх?

— У Ільюшавых... З месяц яшчэ пабудзем, а тады пярэйдзем. Мае ж зусім адны, і хата — абозня. А ў яго і хата меншая, і брат яшчэ ёсць. Дарослы...

— Аг-га... Няхай і так. Мне то што? Вам відней...

Памаўчалі, пільна заняўшыся працай. Маня неўзабачкі ўзіралася ў твар бабы Тарасіхі — азызлаваты ўжо крыху. Лоб да броваў павязаны самаю ніжняю хусткаю, і твар без ілба выдаваў занадта шырокім і смешным. Тарбаватыя шчокі ажно панапіналіся, туга падцятыя ад вушэй другою хусткаю. Нос — нібы ўстаўленая тырчком паміж наскллых шчок насенная бульбінка «аршаўка». Губы тоўстыя, на верхняй некалькі маршчын зверху ўніз, нібы ў зборачкі пачала збірацца, і нешта цямнее там, нібы ў хлапчука-падлетка пушок.

— Ну — і доўга ты будзеш у той бальніцы аціраццa? — не сцерпела-такі Тарасіха і закрахтала, нагінаючыся па бурак.— Знайшла работу! Улегла, як у лебяду на чужых градах!

— Хто яго ведае... Ільюша настае, каб паступала куды вучыцца.

— Дык і паступай! Ты ж не зломак, не горшая, чым тыя дрындухі... Людзі нейк умудраюцца вучыцца, нават дома седзячы. А магла б і не дома — не старая яшчэ.

— Хто яго ведае...

— Убілася чорт ведае куды! Я пенсіянерка, старая ўжо, а і то калом не зажанеш у тую бальніцу. Хоць там мо і лягчэй...

— Ёсць і старыя ў нас санітаркі.

— То хай бы старыя і рабілі. Яны ўсяго наглядзеліся за свой век: і хворых, і мёртвых. Ім і прыбіраць не так гідка.

— У нас жа ёсць яшчэ і нянечкі, калі што... Ды я не пайшла б туды — Ільюша ўсё...

— Ільюша... А ў цябе галава на плячах ёсць? Яго слухай, а свой розум май. Хоць і нябож ён мне, а ты дасюль, можна сказаць, толькі суседкай была, а я табе так скажу: вецер у галаве ў хлопца. Які з яго гаспадар? Бачыла раз каля свірна — мяшкі з жытам падвёз... Дык, сукін сын, не развязвае завязкі, а нажом — шах, шах! «Ах ты,— кажу,— такую тваю... Ты іх прывязваў, што рэжаш? Напасецца на такіх калгас усяго?» Скора яму, бачыш, трэба... А гэта ўжо не глядзі, калі чалавек кепства робіць і не задумваецца — не будзе з яго людзей...

— Малады быў яшчэ, дурны...

— Не відаць, каб вельмі паразумнеў пасля таго. Ажаніцца ў кожнага розуму хопіць. Дзела няхітрае... Бяры яго ў рукі, маладзіца, бо нагаруешся. І чарку любіць...

— Пасля вяселля не выпіваў, здаецца... Ён добры: вазіў буракі ў Слуцак — нясе мне ў слоіку залатых рыбак! Дзве... Малесенькія, як кіпцікі... Чырвоныя, а хвасты чорныя. Дзіва!

— Во-во! Я і кажу: дзіця горкае. Яму б яшчэ з цацкамі гуляць.

Маня не стала паўтараць, што Ільюша ёй прывёз рыбак, а не сабе. Ёй! Жаніхі нявестам, сама бачыла ў кіно, кветкі дораць, а ён — рыбак. Пацеха!.. Ды з Тарасіхаю не вельмі паспрачаешся. Яна ў вочы можа табе такое пекануць — хоць стой, хоць падай! Ніколі «далікатных» слоў не выбірае. Не глядзіць, ці мужчыны перад ёю, ці дзяўкі. Усе пра гэта ў сяле ведаюць, але ж без гэтага і Тарасіха была б не Тарасіха.

— Хіба такія да вайны былі трактарысты? — уздыхае старая, нібы шкадуючы таго часу.— Кожны калі не герой, то атлёт, арол! Мой такі быў аторва — гарэла ўсё ў руках...

Не сказала толькі Тарасіха, што яе «арол» быў ніжэйшы за яе і шчуплейшы разы ў два. Верабей!.. Не сказала, што і чарку Тэрас любіў, а не толькі работу, і часам перабіраў

меру. Прыносіла тады яна яго пад пахаю дадому, як хлапчука якога... З фінляндскае не прыйшоў яе Тэрас... Не даў Бог з ім дзяцей, адна і вякуе.

— І мяне навучыў на трактары рабіць. Сядзе ён есці, а я і ару, і сею. «Націк» ён зваў свой трактар...

— Вы... былі трактарысткаю?!

— А што — не падобна хіба Тарасіха на трактарыстку?

— Чаму ж не...— збянтэжылася Маня, закашлялася.

Тарасіха паўслухоўвалася ў яе кашаль.

— Добра ўжо бухукаеш, языка не ўкладаеш... Выграцца табе трэба, прапацець. Заскочыш вечарам, дам ліпавага цвету. На Купалу збірала... Заварыш, як чай, пакіпіць мінут пяць. Нанач паўшклянкі вып'еш, укрыешся...

— Учора, мабыць, проймаю мяне ахапіла. Калідор мыла, дзверы парасчыняла.

— У вас, у маладых, усё як не ў людзей. Зробіце што, а тады ўжо думаеце: «Ах, не гэтак! Ах, не так!»

Тарасіха перастала чысціць бурак. Калахмаціны броў паспрабавалі залезці на хустку і раз, і другі.

— Што гэта ты?.. Выбелілася, як палатно.

Маня, угнуўшыся, трымалася рукою за грудзі і разпораз сплёўвала сліну.

— Нядобра нешта стала... Ліст гнілы сарвала, а ён як засмярдзіць...

— Падыхай ротам моцна... Хаця не — прастудзішся горш. Пахаладала нешта... Пахадзі сюды-туды... Каля трэцяй кучы рыдлёўка прыхавана, пакапай трохі буракоў. Мо лепш упадобаеш, чым церабіць.

Маня, ураз·знясілеўшы, ледзь перастаўляючы ногі, пайшла па рыдлёўку, а Тарасіха глядзела ёй у спіну, на тоўсты вузел хусткі на сярэдзіне, падцінала вусны: «Нешта ж табе ранавата завіло пад грудзьмі. Месяца яшчэ няма як пажаніўшыся...» А наўздагон пакрычала:

— Толькі бяры на поўны штых і не падважвай рэзка! Крохкія вельмі, кончыкі ў бураках абломваюцца. Падварушы ды за націну цягні!

Няма яшчэ ў калгасе камбайнаў буракі ўбіраць. Тыя гады спрабавалі бульбакапалку прыстасоўваць, конным плугам падворваць. А сёлета сунуўся Мікітун сваёй «механізацыяй» — прагналі бабы зусім. Адрэзваюцца буракі амаль на трэць.

* * *

— От табе і паранілася... А каб ты апухла нечага! Вопусцень!.. Калода!..— лаяла сама сябе Тарасіха назаўтра раніцаю.— От ужо даў Бог завалу! З усяго свету сыскаў!

Рашчыніла яна ўчора звечара хлеб, паставіла дзяжу на чарэнь, акрыла старым паўкажушкам, посцілкаю і яшчэ аборкаю навязала. Каб цяплей было, хутчэй укісла рошчына, раней замясіць можна было, раней выпечы. Субота сёння, у суботу яшчэ можна, а ў нядзелю — грэх. Ніхто ўжо ў сяле сам хлеба не пячэ, а Тарасіха не прызнае куплёніка. Свой, і толькі свой! У млыне ўжо ведаюць гэта. Тоўсты Раман-млынар не насміхаецца, а стараецца змалоць мякчэй, а не проста перадраць, як на вобмешку свінням. І то цяжка дагадзіць Тарасісе: кляне яна электрычнасць і тых, што разбурылі млын-вятрак. Хай бы стаяў, хай бы малоў. Мякчэйшая была мука, дальбог, і вольным духам-ветрам папахвала...

Рашчыніць-то рашчыніла, але праспала. Не раней устала, а пазней. Набралася ўчора ў бураках, як той Мотка... Тыя раніцы пры агні начыста ўходжвалася, пры агні снедала. Пачне шарэць, а яна ўжо шморг з хаты. А гэта ж вокны сінеюць, а яна вылежваецца, як гадкая нявестка!

Тарасіха адзявалася і гучна, як заўсёды, гаварыла сама з сабою. Бо яшчэ развучыцца, немкаю зробіцца — няма ж з кім.

Усунула ногі ў старыя буркі — у хаце толькі ў іх шлопаць,— прайшла да вушака, намацала ўключальнік. Святло балюча разанула па вачах, а вокны пацямнелі...

— Чаго ж гэта ён не званіў? І накруціла ж, здэцца, добра...

Узяла са стала будзільнік — «пеўня», павярнула лічбамі да лямпачкі: званковая стрэлка стаяла на пяці. Грукнула, ставячы, аб стол, і будзільнік затрымцеў, задрынкаў, ажно прасунуўся крыху па цыраце.

— Каб цябе ржа пабіла! Нораў свой паказвае...

Усунулася тварам у акно — і знямела, не дала сама сабе веры. Вобсас кінулася да другога, у мыцельніку. На двары ўсё збялела за ноч: і дол, і плот, і рабіна за плотам, і пругло, і калодзежны цэментавы круг. Мокры, мабыць, ляпаў снег, ліпкі.

— А-а, маці твая сена ела!..

Часам і добра, што больш нікога ў хаце няма. Бо хто вытрываў бы тое, што далей «загнула» Тарасіха?

Пра дзяжу забыла ўраз. І пра няпаленую печ... Укінула толькі карове сена, падаіла. Бегма прынесла малако ў хату, надушыла ў вядры ўчарашняй бульбы, размяшала з малаком і вадою — парасяці. Задохлік нейкі, выбракаваў калгас... Купіла дзеля смеху за два рублі — і нічога, стаў папраўляцца. Як выплюхнула яму паліўку ў карытца, выцерла аб загрывак руку. Кожны раз так рабіла, памацвала за карак. Правіцца! Як бегла зноў у хату, вядро ўскінула на дровы пад сцяну, ухапіла снегу. Адлежны, мяккі... Расцерла паміж далонямі — рукі загарэліся, пацякла вада.

Не да снедання... Апігушыла мо паўзбанка малака, адламала ў шафаўцы кавалак сыру, толькі ўчора з кліночка, выблытала з настольніка апошні акраец хлеба — і з хаты.

На двары спахапілася — чаму гэта ёй так халодна і мокра ў ногі?

— А каб ты запуставала, такая галава...

Яна была ў бурках! Тых самых, што ўссунула пашлопаць у хаце. Без галёшаў!.. І на двор бегала ў іх, па снезе, і ў хлеў лезла. Добра, што ў хляве суха, нанасіла з-пад гатара свежай тырсы. «З розуму выжыла, вірло старое...»

Калі яна, пераабуўшыся ў боты-гумоўкі, на хаду жуючы, зноў выйшла на двор, то пачула, што ёй горача. І не рабіла нічога, а здушнела. «Во, работніца...— дапякала сама сябе Тарасіха.— Во, гультайка...»

Снегу за ноч нападала на пядзю. Пад ім гразь крыху прыстыла, патужала, не пырскала ўжо з-пад ног. Харашыня стала, чысціня. І хоць цёмна яшчэ, а відаць, што паўз плот ужо нехта, па звычцы сцерагучыся, прайшоў. Свежыя сляды значны былі добра, іх нібы абрысавалі цёмнай каёмкай. Марозу ніяк няма, снег перад наскамі ботаў ссоўваецца плітамі, адвальваецца камякамі. Свежа і прэсна пахне познімі грыбамі падтаўстухамі.

Тарасіха моцна ўдыхае паветра, на хаду паварочваецца, шукае тварам ветру. Адтуль жа, здаецца, з Байнёва... А можа, і з Ванькоўшчыны, больш з захаду зайшоў... У голлі прысадаў улавіла ледзь чутны пошум. «Густы вецер... І зоркі сям-там праглядваюць. Нізкія і блішчаць, што памытыя... Не павінна быць марозу... Снег можа зноў пайсці ці дождж...» Тарасіха ўздыхае з палёгкаю: снег не самае страшнае. Абы не мароз! Пара такая, што і зіма можа легчы.

«М-мі-і...» — бы пытаецца, сумна цягне ў Міхалёвых двары карова. Выпусцілі пад калодзеж напіцца, а яна нічога не пазнае з-за снегу. Трэн-н! Трын-н! Тран-н! — зябка грыміць аб цэментавыя трубы вядро.

«Ой, і я ж сваю не паіла...— спахопліваецца Тарасіха і спыняецца.— Ат, выдзержыць, рэкардзістка бо такая... Не схопяць чэрці да вечара... Трэба было б мо не ў кантору барджэй перці... Мо яшчэ дома Мікітун». Але мясіла і мясіла цяжкімі літымі ботамі снег. Дыхала як ад сябе, з нейкім прысвістам ці сіпам. У грудзях дзерла і нудзіла, нібы добра не адкашлялася.

«Мазгавешка дурная... Каб яна ўжо адсохла мне ды адпала... Людзі хапаюць вазіць, здаваць, а я сяджу сабе, паскрэбваю ножычкам, як на заўтра трэба... Не растане больш, укуе, тады перагнуся, пацалую сама сябе...»

Мікітун быў у канторы. За сялом, дзе брыгадны двор, стаяла невялічкая хата пад шыферам. Два пакойчыкі ў хатцы, блізшы — для рахункаводаў, дальшы — Мікітуноў кабінет. У першым яшчэ нікога не было. Другі расчынены насцеж, адтуль вырываецца палоса святла. Там крычаў па тэлефоне Мікітун. Тэлефон правялі як стаў «праізвосцвенны ўчастак». А як была проста брыгада, то не было ні тэлефона, ні рахункаводаў. Тут і не сядзеў ніхто, часам толькі механізатары ці шафёры заходзілі пакурыць, пазубаскаліць.

—...А хіба вы самі не ведаеце, якая ў мяне тэхніка?! — крычаў Мікітун у трубку. Стаяў за сталом, наваліўшыся нізам жывата на краёчак, і гроб праваю рукою з твару валасы — угору ўсё, угору. Спружына-шнур ад зялёнага пляскатага тэлефона да зялёнай трубкі амаль распрасталася і дробненька дрыжала.— Што на хаду? «Беларус» на хаду... І гусенічны... «Таракан» толькі не... Што? У каробцы перадач паляцела нешта, яшчэ не глядзеў Толя...— Мікітун слізгануў позіркам па механіку. Малады намеснік па тэхніцы сядзеў з боку стала насуплена і сонна.— Так... Так... Не поняў! Не поняў, кажу! Радыё прачынаецца, мяшае...

Тарасіха спынілася ў дзвярах — мажная, грузнаватая, яна закрыла сабою амаль увесь праём. Насупіла бровы, уцэлілася вачыма ў твар Мікітуну. У яе яшчэ хапала духу памаўчаць, пакуль начальства занята з тэлефонам, гаворыць са старшынёй.

— Мы закрылі план па бураках! Амаль што!.. Не, ёсць і яшчэ, я ўчора праязджаў... Тон сто начышчана... А што я... Ага... А-а...— Мікітун разяўляў рот, удыхаў паветра з запасам, нібы збіраўся крыкнуць. Але крычала трубка, толькі што — не разабраць. І раптам частыя гудкі — пі, пі, пі... Мікітун адарваў трубку ад вуха, з неўразуменнем агледзеў яе, пакруціў і апусціўся на крэсла.— Во так... Давай — і ўсё! Арганізуй! Мабілізуй! Пажар! А хто пойдзе грэбсціся ў снезе? Каго я магу прымусіць? Пачакаць паўднёўку трэба, мо растане... Вечна на мне гужы абрываюцца!

Валасы ў яго зноў аб'ехалі на вушы і на твар зліплымі пасмамі, ажно зрабіўся пасярэдзіне галавы белы прадзелак, як у Багародзіцы. Мікітун маргаў на Тарасіху — адразу абодвума вачыма:

— Што вы хацелі?

— Машыну давай! Што, што...

— Нашто вам машына? Брыкету ж прывезлі.

— Які брыкет? Буракі вазіць. І людзей давай... Давялі, ліха вашай матары!

— Гэта я давёў? Выбірайце выражэнне. Я за Гасподзь Бога не адказваю.

— А картоплі — тожа Гасподзь Бог?

— Што картоплі? Што картоплі? — зачасціў Мікітун, заміргаў.— Сваяўрэменна рапартавалі з картоплямі. Усе выбралі! Да аднае соткі!

— Выбралі?! Ды там жа ў зямлі яшчэ столькі асталося... Памочнікаў, называецца, прывёз з горада. Прайшліся, як на прагулянцы, пазбіралі зверху большыя сабе ў мяшкі і павезлі. І грошы ім яшчэ плаціў, і кабана скарміў!

— Ну, вы... гэта... Выбірайце выражэнне! Уласць нават стаіць за тое, каб шэфы памагалі. Па сто семдзесят пяць цэнтнераў сабралі з гектара — на пяць больш, чым летась! — шмаргануў аберуч Мікітун валасы з твару, а яны зноў аб'ехалі.

— А ўрадзіла дзвесце семдзесят пяць! Што ты мне падморгваеш?

— Вы не на адчотны сход прыйшлі, каб выказвацца!

— Я і на адчотны дападу, не бойся! Язык мне не завяжаш... Ач ты яго! Планам хваліцца... Па бураках у яго не баліць душа, а па плане! — Тарасіха гаварыла да Толі, нібы вербавала яго ў саюзнікі. Але Толя ўсё яшчэ ніяк не мог адсоніцца, сутаргава пазяхаў. Таксама маладажон, як і Ільюша.

Мікітун заёрзаў за сталом, заляпаў сябе па кішэнях зморшчанага, нібы пабываў пад галавою, пінжака. Міргаў моцна, як хто насоўваў з ілба і са шчок скуру на вочы.

— Дай расчоску, бо ўздурнею! — выкінуў да Толі руку так, нібы хацеў ляснуць пад сківаіцу.

Толя нехаця разагнуўся, тромкнуў замком-маланкай сваёй цёмнай, падбітай аўчынкай курткі. Дастаў з-за пазухі расчоску... Мікітун ледзь не вырваў яе з Толевых рук і драпануў валасы ўгору — раз! раз! З ярасцю, нібы хацеў іх павыдзіраць з коранем.

— Душа не баліць! У вас адной баліць! — крычаў Мікітун.

Крычаць-то крычаў, але і сам адчуваў, што гэта так сабе — спектакль. Пацэліла Тарасіха акурат: ён якраз думаў, што і буракі «ўхапілі». А магло ж быць горш! Каб тады яшчэ, як першыя «матылькі» залёталі, легла зіма,— аго-го, што было б! А гэта ўжо дробязь асталася... Дзе п'юць, там і льюць... А гатовыя не цяпер, то ў чацвер выграбуць, завязуць. Нічога, калі і мароз трохі прыхопіць. І такія прымаў камбінат летась, пускаў адразу з плеч ды ў печ, каб не пагнілі. Праўда, плаціў амаль напалавіну менш...

А Тарасіха думала пра другое. Думала: калі няма ў чалавека глуздоў, то колькі ні вучы яго, на якія курсы ні пасылай — адзін толк. Мікітун мо ўжо робіць трэці заход: два разы быў брыгадзірам, два разы знімалі. Бадзяўся без партфеля, а потым паслалі яго на эканамічныя курсы, дзяўблі пра гаспадарчы разлік. Гэта перад тым як перайсці на «праізвосцвенныя ўчасткі». Зноў кіруе, але не куецца, а плешчацца ў яго.

— Дык даеш ты машыну ці не? І людзей давай, што я адна зраблю — усе буракі ляжаць. Нябось, сваякам усё пёр машыну, падхалімам!.. А я ў любімчыкі не пападу, язык дурны не пусціць,— зноў заладзіла Тарасіха.

— Якія сваякі?! Якія падхалімы?! Божа міласэрны...— Мікітун знясілена адкінуўся на спінку крэсла, звесіў набок галаву і нават вочы заплюшчыў. Адно што языка не вываліў. Адкінуўся назад да стала і жаласліва скрывіўся, угаворваючы, як малую: — Сеяць стараліся! Угнаенні вазіць! Вы разумееце гэта?!

— Разумею... Герой! І зімою гной можна вазіць, як дарога ўстановіцца.

— О божа...— дастаў Мікітун пакамечаную насоўку, цярнуў па лбе, цярнуў па патыліцы.— Бярыце... Вам трэба транспарт? Калі ласка! Бярыце Ілью — Толя яму скажа. Хоць на цэлы дзень. Каня бярыце... Толькі адчапіцеся! Пакіньце мяне жывога!!!

— Мог бы і трактар, і машыну даць. Колькі ўлезе ў трактарную скрыню, хіба не ведаеш? І людзей давай!

— Не магу я людзям загадваць пры такой сітуацыі. Тут можна толькі на совесь упіраць... А загадаць — сэрца не дазваляе. Гэта ў вас, кажуць, не сэрца, а... Сваякоў шукайце, мо хто паслухае...

Тарасіха крутнулася ісці, злавіла ручку дзвярэй і знарок з усёй сілы — грох! Як запячатала іх у кабінеце.

— О божа...— прастагнаў за дзвярыма Мікітун.

Каля ганка Тарасіха прыстаяла. Нейкія гукі — дзіўныя, ціхія — запынілі яе. Клёўк-клях... Цых-цёх... Са страхі капала. Ж-ж-ш-ш-с-с!..— зашоргала ўверсе, на шыферы, і яна махнулася назад, на ганак. Г-гух! — глуха гупнула ўніз цэлая гура снегу.

«Эге-ге, нядоўга ж ты паляжыш...» — зарадавалася Тарасіха і наддала ходу ад канторы.

Неба, здаецца, ужо шарэла, і на ім, як на экране, відаць было, як уздрыгваюць, выпростваюцца чорныя знізу галіны дрэў. Вызваляюцца ад снегу...

* * *

«Так, у кароўнік заскочыла... Падбяжыць братавая, падручылася... Падоіць кароў і падбяжыць... Што ж зробіш, калі непярэліўкі! Кандрату яшчэ сказаць — хай Ахламона запражэ, пасобіць... Маладых падварушу... І чорт з ім, з гэтым Мікітуном...»

Тарасіха грэбла і грэбла па снезе цяжкімі ботамі і чула, што за плячыма ў яе зноў макрэе сарочка. Набегалася...

Ні з таго ні з сяго ўспомнілася, як Мікітун калісь шукаў злодзея. Мо яшчэ ў першае сваё брыгадзірства, гадоў дваццаць назад. Нехта лён пакраў ноччу ў Парасчыным звяне, у братавай. Паднялі бабы са сцелішчаў, павязалі ў пукі, але не справіліся звезці повідну, пакінулі на заўтра. Глядзяць раніцаю — распалавініў нехта пукі, у два разы танчэйшыя сталі...

Пайшлі Мікітун з Параскаю па хатах шукаць. Да тых спачатку, хто свой лён сеяў пры сядзібе. Такім лягчэй красці, бо лягчэй і апраўдвацца. Як хто за руку вёў — зайшлі перш да Анці Курловічыхі. Пасаромелася звennявая на вышкі лезці глядзець, а Мікітун — не. І мо хіба Курловічыха забыла на Мікітунову звычку — маргаць? Плюсь, плюсь ён вачыма... А яна па-свойму зразумела. «Ага... Добра, брыгадзірка, добра...» — шэпча і хавае трасту, закідвае дошкамі, мётламі, лахманамі. Як закрычыць на яе Мікітун, як затупае! Ледзь не ўмлела жанчына. «Ты ў мяне загрыміш на пяць лет!» — Мікітун на яе. І «загрымела» б Анцечка, строга тады было. Ды Параска заступілася: дзеці ж малыя... Дык Мікітун увязаў ёй усё ў рэзгіны, мо паўвоза: «Нясі!» Удзень, па вуліцы! Пры народзе! Учарнела жанчына, пакуль занесла трасту ў адрыну. Колькі гадоў прайшло, а ўспомніць пра тое, дык ніякавее. «Хай бы,— кажа,— лепш мяне расстралялі на месцы, чым так...»

Братава хата — не тое што Тарасішына. У Тарасіхі старая, яшчэ бацькаўская асталася. У Кандрата — новая, вымураваная з белае цэглы. Веранда расфарбавана ў тры колеры. Ледзь не палавіну сцяны веранды займае акно. Раму ўжо так адмастачыў Кандрат — мудрэй, чым у царкве ці ў клубе. Маня, нявестка, павесіла і ў верандзе гардзіны.

Адчыніла Тарасіха веранду — дым, чад, пахне гарэлым салам. Тут у Кандрата газавая пліта з балонам. У многіх так — у верандах. Каля пліты Маня стаіць з нажом, у зялёным джэмперы, поверх тая хустка крыж-накрыж завязана, у якой і ў бураках была. Шыпіць сала на скаварадзе, булькоча бульба ў каструлі...

— Гаспадыня, агонь зменшы! Хто на такім агні сала пячэ? — не паздароўкалася нават Тарасіха, пастукала ботамі, абіваючы снег.

— Ой, а я і не ўмею... Змяншаю, а ён — хлоп! — і тухне.— Маня паспешліва варочае скваркі.

— Э-э...— падышла Тарасіха да пліты, пакруціла асцярожна венціль.— Я старая, і то ўмею. Картоплі гатовыя, кляяюць — не чуеш? Дома бацька? А дзе Ілья?

— Дома... А Ільюша мо яшчэ спіць. Кахы, кахы... Аж вочы выядае...

— Адзелася б лепш — гэта табе не лета. То лечыцца, то зноў калечыцца... Цыбулі пакрышы ў тук — я люблю з цыбуляю.

Зайшоўшы ў хату, Тарасіха бачыць: сядзіць Кандрат на кукішках каля печы, вылоўлівае ў цабэрку з бруднай вады дробную бульбу, накладвае ў вялізныя чыгуны. Чорныя, з абломанымі берагамі. Тарасіха была шырокая ў касці, а брат яшчэ здаравейшы і вышэйшы. Але не мог сагнуўшыся і мінуткі пастаяць — абмарачэнне брала.

— І жнец, і ў дуду ігрэц...— замест «дзень добры» сказала Тарасіха.

— Двое ж свіней ды парасяты... Наварыць жа трэба...— падымаецца Кандрат.— Ох, ажно цёмныя кругі ў вачах... І Парасцы ж хапае... Механізацыя называецца — рукамі дадойвай, па жалабах харчы разнось... Пакуль раздасць корм, паскідае нашлёпкі на транспарцёр... Прыйшоўшы, канчае ўжо печ паліць, абед варыць. А там зноў бяжыць... Садзіся — колькі пастаяць, столькі і пасядзець...

— Няма калі расседжвацца... Дзе той ваш маленькі, чаму ты яго кіем не ўспорваеш? — Тарасіха абыходзіць чыгуны і Кандрата, адхінае занавеску ў спальню.

Адтуль чуецца смачнае пазяханне і Ільюшаў голас:

— Што, цётачка, што, дарагая? Не спіцца вам нешта...

— А ты павазіў мне буракі, што спіцца? Абібочына... Снегам унь заваліла ўсё. Уставай, а то вазьму якую папруціну!

— Эх-ха, жыццё настала...— дурашліва ўздыхае Ільля.— Ноччу жонка пад бок штурхае, а раніцаю сваякі...

— Ой, хто цябе штурхае, што ты пляцеш?..— зачырванелася, зайшоўшы якраз са скавaрадою, Маня.

Чуваць, што Ільля стаў адзявацца — звініць спражка папругі, грукаюць боты.

Маня кладзе на стол драўляныя крыжыкі, ставіць скавараду з мачаннем. Хуценька завінулася — нясе і каструльку з бульбай. На скаварадзе шыпяць, варушацца паджоўклыя скрылёчкі цыбулі, шыбуе з каструлі, закручваецца віхрамі пара. Смачны пах жывасілам лезе ў нос, казыча.

— Так бы і сказалі, што снеданне гатова, а то буракі... Умх!..— з'яўляецца Ільля, уцягвае носам паветра. Ён танчэйшы ў касці, чым бацька ці Тарасіха, але высозны — пад столь.

— Вымахаў, на лес гледзячы...— нібы асуджальна, але з прыхаванай гордасцю гаворыць Кандрат і падхоплівае за вушка цэбар, каб вынесці на двор брудную ваду.

— Э, э, дайце вочы прамыць, а тады ўжо...— спыняе яго Ільля.

— Добрая дыёміна вырасла...— Тарасіха мачае бульбу ў тук, падзьмухвае на яе, з шумам удыхае ў сябе пару.— Сёння ты ў маім распараджэнні цэлы дзень...— гаворыць да Ільі, а той знарок моцна фыркае, не слухае.— І цябе, Кандратка, буду прасіць, і Маню... Парасцы я ўжо сказала... Запражэш Ахламона, мо падвозіць прыйдзецца... Не паліла я сёння ў печы, не да таго. А думала, што і хлеб выпеку...

Толькі Ільля прымасціўся да стала, як Тарасіха ўстала.

— Рана яшчэ, глядзі... Еш бяры, больш...— гаворыць Кандрат і таксама мые рукі.

— Здаецца, што рана... Развіднівае! Пабягу адкідваць снег, а вы таксама не баўцеся вельмі.

— Лёня, Лёня... Уставай, снеданне на стале! — чуваць, як будзіць Маня ў «зале» Ільюшавага малодшага брата — дзесяцікласніка.

Тарасіха ўзяла яшчэ адну бульбіну ў руку, перакінула ў другую і націснула ручку ў дзвярах...

* * *

Як ашуквае снег... Калі, здавалася, пачало світаць, а так і не павіднела больш.

Шэра і шэра...

Тарасіха праступе цераз тарфянік, мінае чужыя нормы. Буракі амаль павыкопвалі, толькі дзе-нідзе тырчаць прысыпаныя снегам копчыкі. Ішла-ішла — і мінула сваю норму. Толькі як зачарнеў, перабегшы ёй наўкасяк дарогу, канал, Тарасіха схамянулася, пачала азірацца ды прыглядацца.

«Ат-та-та. Чаго ж ты стала? Хай бы ж боўтнула!.. Паплавала б!.. Засляпіла бельмы і прэ...»

Няроўна ішла, укосікі, як страчыла няўмелая шваха. Пайшла назад ужо не па сваіх слядах, а правей. Як вярталася, то пазнала свае буракі хутчэй. З усходу копчыкі не так закіданы снегам, больш чарнеюць. Па два ўсё, па два... Копчык буракоў, копчык бацвіння... У людзей і бацвіння менш — пазабіралі на ферму. А ў яе нават нявырваныя буракі яшчэ ёсць, соткі тры-чатыры. Занесла снегам, а радкі можна пазнаць, як хто кепска паараў. Нават лісце сям-там цямнее, хоць і аблажыла яго, прыціснула мокрым снегам.

Намацала ботам рыдлёўку... Агрэбла снег з самага свежага копчыка — яго ўчора апошнім прыкрывала,— адкінула бацвінне. Халодныя буракі, што снег... Але не відаць, каб памерзлі. «Добра, што прайшлася ўчора, усе капцы панакрывала... Снег толькі счышчу, дагала не буду распранаць... Невядома ж, колькі ўдасца забраць...»

Неба пасвятлела больш, але пры зямлі трымаўся туман. Не такі, што сядзіш, як у мяшку, але ўсё роўна за якую паўсотню метраў усё расплываецца, размазваецца. У адным месцы штосьці варушылася — буйное, рыжае. Падумала спачатку, што гэта яшчэ нехта прыйшоў паглядзець, што рабіць з буракамі. І раптам тое жывое пачало кашляць, як бы давіцца: «Х-хыў... Х-хыў-у...»

Тарасіха дакумекала: карову хтосьці выпусціў пабадзяцца. Пастух жа сёння не будзе займаць... «От людзі ёсць. А як удавіцца бураком?»

Зноў, як і тады ў дождж, Тарасіха была адна на ўвесь тарфянік. Акрамя той каровы, нідзе не чуваць было ні шолаху, ні зыку. «А можна ж рады даваць буракам, снег жа не з марозам... Раздурэлі людзі, ох, раздурэлі...»

Але была Тарасіха адна ўсяго з гадзіну. Справілася пачысціць усе капцы, нават паспрабавала адкідваць снег — канаўкамі — з радоў нявыкапаных буракоў. Бацвінне адсякалася разам са снегам, ішло ў глум. «А-а, гары яно гарам... Каб хоць буракі ўратаваць... З тону яшчэ будзе...»

Потым тарфянік ажыў неяк разам і ўвесь. Заварушыліся, зацямнелі прывіды справа і злева, перакрыкваюцца, нукаюць на коней... У адным месцы туман гусцеў, цямнеў, браўся плямамі — і раптам праступілі конь і сані са скрыняй. Кандрат!.. Пад'ехаў збоку, кіраваў напрасткі, як і яна. Недзе старанна трахкацеў трактар, абзываліся машыны. Але колькі ні круціла Тарасіха галавою, колькі ні адкасвала з вуха хусткі, так і не пазнала, у якім баку. Гул сціхаў на хвіліну, па-качынаму крэкала ў каробках хуткасцяў, і зноў гудзела-выла, надрыўна і зацята. Прабуксоўваюць дзесьці машыны, як і тыя дні...

Раптам у тым баку, дзе сяло, пабольшалі гамана і смех, віск — з туману праступіла група жанчын. Ішлі гуртам, але па двое, неслі за вушкі вялізныя, што разносіць рэзку, карзіны.

«Глядзі ты, мо і дадому не заходзілі... А малахольныя ж! Дадумаліся, якія карзіны браць: гэта ж не мякіна — нагрузіш, то і з месца не ссунеш...»

— Ау, дзе вы тут?

— Прымайце работнікаў, у наймы прыйшлі!

— Ой, а тут жа няма яшчэ што грузіць!

— А во — сані... Дзядзька Кандрат, фуруйце бліжэй, пад буракі!

«Ну і Параска! Усіх падбіла... І Курловічыха прыйшла...» — Тарасіха ўцешліва глядзела на гаманкіх, дружных даярак, перадыхала, успёршыся на рыдлёўку. А тыя адразу прыхапіліся да капца, паляцела ў бакі бацвінне, замільгалі буракі — з кучы ды ў скрыню. Карзіны сталі непатрэбныя.

Трэск трактара пабольшаў, нібы прарваўся скрозь туман. Хутка вынырнуў трактар «Беларусь» з прычэпам. Ілья!..

— Э! Э! Не рабіце лішнюю работу! — яшчэ здалёк замахаў на даярак рукою.— Хрыстос што сказаў? Субота для чалавека, а не чалавек для суботы. Калі хочацца вам начаваць на балоце — калі ласка. А я тэлевізар хачу глядзець!

Ён заехаў вялікім паўкругам і падкаціў да капца з другога ад даярак боку. Тармазнуў рэзка, ажно прычэп ледзь не скокнуў на трактар. Курловічыха віскнула, адскочыла чым далей: «Вар'ят!» І адразу буракі загрукалі ў дно прычэпа, як у вялізны барабан.

— Памалей шпурляйце! Памалей, кажу,— буракі патаўчаце! — засварылася на даярак Тарасіха.

— Чакайце, я борт апушчу...— Ілья адчапіў і адкінуў борт, прайшоўся па слядах трактара і прычэпа. Не каляіны, а равы: і снег папрарэзвалі колы, і торф. Дно ў каляінах утрамбавалася, здаецца, добра, але Ілья памацаў абцасам і незадаволена гмыкнуў. Нешта яму не падабалася...

Бо і праўда: насмеліўся куды ехаць. Ці даўно буксавалі нават на поплаве? «Нагрузіцца, то можа засесці... Папагаруем тады...» — нервавалася Тарасіха.

— Не грукайце, ліха вашай ступе! — не вытрывала яна зноў.— А то папраганяю!

А на даярак напаў дурны смех. Адна вельмі сакатала — Лідачка-развядзёха: «Кэ-кэ-кэ-кэ!» Не даспадобы такія людзі Тарасісе: «Цьфу, пустальга! Уродзіцца цяля з лысінкаю, то з лысінкаю і здохне...»

Грузчыкаў хапала, і Тарасіха з Кандратам пачалі выкопваць астатнія буракі. Яна падкопвала — асцярожна, акуратна, а насіў у сані Кандрат. Надумалі перавезці іх дзе пад страху. Там, у зацішку, дацерабіць іх будзе лягчэй.

Ілья забраўся ў кузаў прычэпа, і даяркі больш не грукаталі буракамі, а падавалі яму па паўкарзіны. Ён подбежкам адцягваў іх або адносіў у дальнія куткі.

— Давай! Давай! Тэмп! Работа дурных любіць! — пакрыкваў ён зверху.— О-ёй, бураком у радыкуліт пацэлілі!..

Лідка, скажы проста, пры ўсіх: люблю! Не калеч жанатага чалавека!

— Трэба ты мне — бракус! — Лідачка шпурнула ў яго раз, і другі, але ўжо снежкамі.

— Эй, ты што цаляеш нейкімі спарышамі? На што намякаеш?

Ілья злаўчыўся — хап! Паднёс снежку да рота, нібы яблык,— глэм! Укусіў ці не ўкусіў — чорт яго ведае, але нешта смешна жаваў, нават за шчакою тырчала.

— Во-ой, ты б у артысты падаваўся!..— праспявала ад такога дзіва Курловічыха.

— Давайце! Цётачкі, бабачкі, мамачкі! Гэта вам не на кароўніку! Механізацыя тут адна: пуп!.. О!.. Оп-па!..

«І ў каго ён удаўся такі? Ну і мянташка... А Ліда зусім бяссовесная... Пры матцы залёты строіць...» — Тарасіха паглядала насуплена то на Ілью, то на Параску, то на Кандрата. Параска задумліва ўсміхалася сама сабе, Кандрат засяродзіўся на рабоце. «І калі ўжо Ілья пераменіцца? Мужчына ж такі-та... Кажуць, чалавек адразу сталее, як «свая вош укусіць», сваё кубло завядзецца... Але ж якое ў яго сваё кубло? За матчынай ды за жончынай спінамі... Без клопату галава...» — Тарасіха ўздыхае.

— Тата! Цётка! Што гэта вы надумалі! Нашто вам лішняя вазня? Абарочвайце назад сваю скрыню... Жменька буракоў асталася, а вас тут цэлая брыгада...— пакрычаў зверху Ілья.— Плантацыю можна спляжыць, пакуль я вярнуся са Слуцка.

«А і то праўда...» — Тарасіха з цікавасцю, нібы ўпершыню, паглядзела на пляменніка.

— Нажоў не бралі ж! Няма чым...— загаманілі жанчыны.

— Мама, лавіце складанчык! Астатнім я прывязу з другім рэйсам. Тэмп, цётачкі! Тэмп — рухавік прагрэсу!

«Няўрымсты... Толькі скрыню заляпалі гразёю...» — паглядзела Тарасіха на сані.

Больш на сані не грузілі. Кандрат складваў буракі роўненькай сціртай, вытаптаўшы пляцоўку на брудным снезе. Корань да карэньчыка, вяршок да вяршка...

Ілы падалі борт, каб зашчапіў,— пачалі ўжо скочвацца буракі. І ён замацаваў борт, скокнуў дадолу. Але грузіць больш не было чаго, куча скончылася.

— Паганяй да другое! Сам не марудзь! — закрычалі на яго.

А Ілья прысеў, стаў марудна церці рукі снегам, пазяхаць.

— Цётка, гэта праўда, што ў вас сэрца з другога боку? — спытаў так сабе, не глядзеў нават на Тарасіху. А мо хацеў выхваліцца перад даяркамі, як хлапчук,— во якая незвычайная ў яго цётка!

— Ах ты, гад печаны! — нібыта зазлавала Тарасіха, схапіла за націну бурак, шпурнула ў яго.

То стаялі даяркі, рукі — перад сабою, нібы ва ўрачоў перад аперацыяй. А тут ураз панагіналіся, ухапілі снегу. У Ілью паляцелі брудныя камякі-снежкі.

— А-ёй! Гарнітур святочны заплямíце! — асцяпнуў Ілья сваю зашмальцаваную ватоўку і кінуўся ў кабіну, адразу ўключыў хуткасць. А даяркі яшчэ і за трактарам прабеглі, шпурляючы снежкамі: бах! бах! бэх! На борце прычэпа асталіся снежна-вадзяністыя плямы.

«От неўдач... То ён разумны, растаропны, то бот дурны — плешча языком абы-што...— Тарасіха глядзела, як даяркі лупяць снежкамі па кабіне, не даюць Ілы вылезці.— А божухна, і Параска, маці называецца, а як малая ўсё роўна... Павар'яцелі, дальбог, павар'яцелі... Снег першы захмяліў — бывае...»

Тарасіха з Кандратам асталіся наводшыбе. Моўчкі падкопвала і падкопвала яна буракі — наманы амаль што. Як ні згрэбвай снег, саміх буракоў не відаць. Маўчаў і Кандрат... Роўныя гаваруны: могуць да вечара не абазвацца адно да аднаго.

— Маня што — не прыйдзе? — толькі і папытала Тарасіха.

— Чаму не... Прыйдзе мо... За Параску там уходжваецца.

— Не здагадаецца нажоў набраць.

І зноў маўчаць. Тарасіха думае пра Маніну прастуду, пра сваю хваробу. Хліпкі народ цяпер пайшоў — чуць што, ужо і кеўкае. А яна ніколі амаль не хварэла — па-сур'ёзнаму, каб узяло дык узяло... Адзін раз толькі было, што ў бальніцу завезлі. О, тады схапіла папраўдзе, каб трошкі, то і капутнула б...

Разбалеўся жывот сярэднячы, ажно «цыганскі пот» усю абсыпаў. Спачатку на чарэні грэла — дык горш. Намацала, сагнуўшыся ад болю, на шастку мяшэчак з бабоўнікам (нарвала на балоце летам). Скурчыўшыся, злезла, распаліла на камінку керагаз, напарыла той гаркаты ў вялікай конаўцы. Напілася адзін раз, а згадзіўшы — і другі. Не палепшала... А парашкоў не шукала, бо і звання іх у хаце не было. Не прызнавала яна «хіміі»...

Дзякуй ёй, надумала Параска забегчы раніцаю па дарозе з кароўніка: чаму гэта дым з коміна не ідзе? «Ой, не магу... Ратуй, Парасачка... Мо гаршчок пастаў на жывот...» — запрасіла яна. «Які гаршчок?! У цябе, глядзі, каб не апендзіцыт быў!» — не далася і гаварыць Параска.

Тады яшчэ не было ў цэнтры калгаса бальніцы. Выклікалі «хуткую дапамогу» са Слуцка, забралі яе... Казаў урач пасля: каб яшчэ якое паўгадзіны, то і аперацыя не памагла б. Як сліва быў гэты «апендзіцыт», пад нажом проста пэнкнуў. І дзе быў — з другога боку! Не абследавалі спачатку, канавалы, а давай патрашыць... Увесь жывот успаролі... Два тыдні трымалі яе ў бальніцы, баяліся якога ўскладнення.

І гэта ж тады знайшлі, што і сэрца ў яе не на месцы! Спачатку адзін урач паслухаў «светаскопам»: і седзячы, і на спіну клаў — не даваў сам сабе веры. А тады з усёй бальніцы набеглі, пазатыкалі гумовымі трубкамі вушы. «Не дыхайце!» — просяць. Слухалі і самі не дыхалі. А тады захакалі, як з-пад вады вынырнуўшы, замармыталі незразумелае: «Сітус інверсус! Стопрацэнтны сітус інверсус!» І на рэнтген павялі, як не пад канвоем, каб упэўніцца «аканчацельна». Ну але, інверсус гэты самы, з правага боку сэрца!

І так усе зарадаваліся, нібы які падарунак яна ім дарагі паднесла. А ёй без розніцы было — ці злева ў яе сэрца, ці справа. Яно не балела ёй, а раз не баліць, дык хіба прыслухаешся, дзе яно там тахкаціць? Як і няма яго зусім. Ніколі яна нічога «ад сэрца» і не піла, хоць другім і раіла, і давала пустырнік.

Смех... Пракцікантачкі тады дзве ў бальніцы сноўдаліся. Божухна, дзеці горкія яшчэ... Адно дзеўчанё нішто, а другое бледненькае, што вымаклае. Зайшлі раз у палату, мнуцца ў парозе, на яе глядзяць, як не моляць, каб яшчэ які цуд сатварыла. «Інверсус... Інверсус...» — шэпчуцца, а падысці духу не хапае. Зжалілася, падміргнула ім: «А хадзеце-ка нно сюды...» Расхляпешчыла сарочку... «Наце, паслухайце і вы...» Дык гэтак ужо дзякавалі ёй, ледзь у руку не цалавалі. У той, што белая была, ажно шчокі заружавелі, нібы паздаравела.

...Затрашчаў, бы рассыпаючыся на кавалкі, трактар, адагнаў успаміны. Ілья паехаў, нагрузіўся якраз... А справа, дзе метраў за сто праступала з туману машына, то звонка, то глуха грукала па дошках — бэм! бух!

Да Тарасіхі і Кандрата накіраваліся гурмою даяркі. Лідачка-развядзёха спрабавала зацягнуць «А я жыта не жала, у баразёнцы ляжала!», але ніхто яе не падтрымаў. Так і не паспелі яны памагчы церабіць: ад агародаў, уроссып, як танкі ў атаку, уз’язджалі на балота машыны. Дзве... Пяць... Восем!

— Ого-го! Ура-а! — закрычала Лідачка.

Старшыня, мабыць, нагнаў машын з іншых «праізвосцвенных участкаў». На двух грузавіках галёкалі старшакласнікі — паспелі па іх заехаць у школу.

Не згледзелі добра, з якой машыны вываліўся Мікітун, з якой — старшыня. Але адразу пачулі іх прыглушаную туманам, відаць, задаўненую спрэчку. «Як я буду расплачвацца з тымі ўчасткамі? У нас жа гаспадарчы разлік!» — сіліўся нешта даказаць Мікітун. «І ў другіх таксама разлік, не адзін ты такі герой!» — рэзаў яму старшыня. «Планам

не ўлічана такая помач!» — «І кепска, што не ўлічылі, кепскі план. На ходу будзем нікудышныя планы папраўляць!» — як адмахваўся ад яго старшыня. Рукі ў тумане выдавалі ўкарочанымі, як без кісцяў. Старшыня ішоў быстрым крокам упоперак нормаў, а Мікітун усё забягаў збоку, тупацеў, як певень каля курыцы.

— Сюды! Сюды машыну! — закрычалі ім даяркі, замахалі рукамі.

Начальства дайшло да Тарасішынай нормы. Старшыня крутнуў галавою ўправа-ўлева і паманіў рукою машыну — і раз, і другі. Паехалі ўперад самазвал і адзін грузавік з дзецьмі. Калі з машыны пасыпаліся школьнікі, Мікітун стаў тыцкаць у іх рукою, пералічваць — мо хацеў падзяліць пароўну да кожнай машыны ці баяўся, каб хаця Тарасісе не перадаць лішняга? Тлум, гам — як у школе на перапынку ці на кірмашы.

Неба над галовамі, недзе паўзверх туману, было без воблакаў. Там ваўсю свяціла сонца — нібы хто разапяў ружовую марлю. Здаецца, і ўнізе парадзеў туман, асеў, бо можна было бачыць улева ажно да грэблі. Толькі ўправа, пад чыгунку, куды было ў два разы далей, усё растушоўвалася ў тумане.

Калі ўрэшце прыйшла Маня, Тарасіха з Кандратам ужо канчалі выкопваць.

Давай нож... Во... А сама можаш часаць назад — хапае сёння без цябе! — сказала ёй Тарасіха.— Па двары вельмі не шастай з прастудай... І слухай яшчэ што, гэта ж я толькі прыдумалася... Заскоч да мяне, выкінь дзяжу ў сенцы... Забыла зусім, перакісне рошчына. Не ведаю, калі ўжо і спяку. Заўтра ж нядзеля — грэх... Ага: ключ за шалёўкаю намацаеш, справа. У вушаку сучок якраз наўпроці...

Маня закіравала ўсё-такі да даярак, памагла ім і дзецям нагрузіць грузавік і самазвал і толькі тады пайшла. Далёка ўжо ківалася Маня, каля самага сяла, як Тарасіха спахапілася: «Во даўбешка дубовая!.. Выправіла каго... Ёй жа цяпер няможна цяжкага падымаць!»

* * *

«Ну, і яшчэ адзін, пяты...» — Тарасіха асцярожненька падчапіла за бохан драўлянаю качаргою, падобнаю на рыбацкі боўт, памалу пасунула хлеб да сябе, пад чалеснікі. «Боўт» паставіла ў качарэжнік, угору папярэчынкай. Шосттронак жоўты і блішчыць, выслізгаўся рукамі за шмат гадоў. Ніколі гэтым «боўтам» Тарасіха не выгрэбвае ні попелу, ні жару — другі ёсць на попел.

Бохан паволі ўзяла пасудным ручніком, падзьмухала на ружавата-рудую скарынку з прысмаленымі трэшчынкамі па баках, прытуліла краем да грудзей. І чула, як праграваецяпло бохана глыбока, густа, нібы ўліваецца таемная сіла...

Пакуль брала, дзьмухала, вочы ацэньвалі: «Выпечаны!»; пальцы рук далікатна абмацвалі: «Выпечаны!» І нюхнула, вядома: пах тонкі, без гарэлінкі. І яшчэ раз пацягнула носам хлебную, якую ні з чым не параўнаеш, духмянасць і нават вочы прыплюшчыла, нібы смакавала. Прымешваецца да хлебнага паху трошкі аернага — закідвала сушанага аеру ў печ, пасадзіўшы хлеб, і трошкі кменнага, трошкі кляновага — самая крыха, для адцення. Бо трэба, каб свой, хлебны дух перамагаў усё. Непаўторны ён, хлебны дух, такі, што не дае забыцца на дом, на родны кут да скону. Тэрас, яе Тэрас, з-за свету, з лініі Манергейма ў Фінляндыі пісаў, што сніў перад боем сон. Здаецца, вымаюць яны з печы свежы хлеб, і папрасіўся ён у яе дастаць адзін бохан. І быццам дазволіла яна яму дастаць той бохан, а ён — шарах! — садраў верх, зняў скарынку, як шапку. Прачнуўся, пісаў, а вочы ў слязах, і шчака ўся мокрая, і на шапцы намерзлі, як пярліны, слёзы...

Апошненькае пісьмо ад Тэраса. Пазней ужо яно прыйшло — спачатку «звяшчэнне», адале пісьмо...

Тарасіха пераварочвае бохан ніжняй скарынкай угару, акуратненька саскрэбвае астаткі ломкіх, выпетралых ад гарачыні кляновых лістоў. Выскрэбвае і маленькія, бы падзялілі ўздоўж насенінкі ўкропу, зярняткі кмену. Яна не любіць, каб трапляў

кмен на зубы — забіваецца тады хлебны дух, церпкасць шчыпле за язык. А вось жа сыпле кожны раз: спачатку раскладвае на драўлянай лапаце тры кляновыя лісты, а паверсе — некалькі каліваў кмену.

Скрэб-скрэб, скрэб-скрэб... Знізу скарынка робіцца не гладкая, а як свежавырабленая аўчына. Яшчэ раз падзьмухала на бохан, палюбавалася — і паклала на лаву, у радок да тых чатырох, на чысты ручнік. І гэты, пяты бохан, як і тыя чатыры, змачыла зверху марлечкай, і хлеб закурыўся параю...

Загрэбла на сярэдзіну поду жар з ямкі, прыставіла бліжэй капусту са здорам, кашу — хай даправаюць — і засланіла печ.

Хлеб астываў, а Тарасіха прынесла з сянец назапашаных кляновых лістоў. Сабрала іх пасля першага марозіку — жоўтых, барвовых, залаціста-рудых, падсушыла прасам, каб захаваць іх колер.

Цяпер адсырэлі, трэба зноў падсушыць, а то ўчарнеюць...

У сенцах грукаюць дзверы, нехта доўга лапае рукамі па хатніх дзвярах, не намацае клямку. Тарасіха памкнулася ўжо насустрач, каб адчыніць. І тут кляцнуў слясак, дзверы з-пад самае рукі як бы праваліліся, і ў шчыліну пралезла Маня. Пад рукою яна трымала тры буханкі куплёнага хлеба.

— Во, каб трохі, то і за нос ухапіла б цябе,— сказала Тарасіха.— Я думала, ці не Насця Міхалёвых шкрабецца — хацела памагчы ўлезці. Усё прыходзіць адменьваць куплёнік на мой хлеб...

— Вой, цётухна... Гэта ж і я: ішла з магазіна, пачула, як у вас хлеб пахне з коміна, не вытрывала... Удаўся хоць?

— Не ведаю, гарачы ж яшчэ... Стукала ў спод, здаецца, выпекся.

— А я тады выношу дзяжу — пухкаціць... Ну, думаю, перакісла рошчына!

Тарасіха зноў узялася за прас.

— Ілья астаткі ўчора вазіў, апошні... Позна вярнуўся?

— Не ведаю, забыла папытаць. Я ж яго толькі сёння і бачыла — дзяжурыла...

— А-а, праўда ж... Ты нанач у бальніцу пайшла... Але была мо якая гаворка сёння, у нядзелю,— не казаў, колькі ў мяне ўсяго?

— Гэта буракоў? Казаў: дваццаць сем тон з гакам... Рэкорд, смяецца, паставілі...

— Уга, дзіва што рэкорд...

Тарасіха выцягнула з разеткі шнур ад праса, пачала складваць лісце ў старое рэшата. А Маня не спускала вачэй з круглых каравааў, яны нібы заварожвалі яе.

— Цётка, я вам пакіну гэтыя во, куплёныя... А дайце мне адзін бохан ваш...

— Мену яшчэ прыдумала! Астыне, то возьмеш — адзін, два... Колькі захочаш... Прыходзьце, як астыне... Ільюшу скажы, бацькам — і прыходзьце. Будзем каштаваць хлеб...— сказала Тарасіха.— Хаця я і сама зайду, старых угавару. Нядзеля ж сёння, можна і пасядзець як людзі...

Маня раптам моўчкі падышла да Тарасіхі, прыўзнялася на дыбачкі — цмок у шчаку! І за дзверы...

— Эт, лізуха...— дакорліва паківала галавою старая.— Жыва не будзе, каб не палізацца...— усміхнулася і дакранулася рукою да шчакі.

БАРЫС САЧАНКА

# Ваўчыца з Чортавай Ямы

*Палеская быль*

*Івану МЕЛЕЖУ*

## I

Потым, зноў і зноў успамінаючы той дзень і тое, што давялося неўзабаве перажыць, Іван не-не дый горка ўсміхаўся, ловячы сябе на думцы: а пачалося ж усё нібыта з радасці. Так-так, з радасці. Вялікай, нязнанай дасюль радасці. Тады ён, Іван, нарэшце вярнуўся дадому, у сваю вёску, вярнуўся з добрым рублём у кішэні, бо не спяшаўся пакідаць вайсковую часць, а, адслужыўшы сваё, на нейкі час астаўся яшчэ і звыш тэрміну; Ніна, якой ён пісаў з арміі ледзь не кожнага дня лісты і якую, здаецца, шчыра кахаў, сустрэла — быццам жаніха; Ніна падабалася вельмі ж ягонай маці, так што можна было і жаніцца. Ён, Іван, і жаніўся б, не чакаў бы восені, калі б... Калі б не хата. Неяк аж няёмка было прыводзіць у тую хату, дзе жыў ён, Іван, жыла маці, жонку, Ніну. Бо хата тая хоць і прасторная, не надта старая, але чамусьці асела, як не ўрасла ў зямлю; да таго ж сцяна ад вуліцы вывернулася, скасабочылася... І, перш чым жаніцца, Іван хацеў перасыпаць хату — даць ёй новы падмурак, падняць вянцы на два-тры, замяніць некаторыя струхлелыя, паедзеныя шашалем бярвенні, абамшыць, ашаляваць дошкамі, прарэзаць большыя вокны. Дый перакрыць заадно шыферам. Не адкладваючы ні на дзень, адразу ж пасля звароту ў вёску, зайшоў Іван у сельсавет параіцца, ці можна зрабіць усё тое, што ён надумаў. У сельсавеце якраз быў старшыня, незнаёмы Івану, чалавек прышлы, відаць, з адстаўнікоў, бо па-вайсковаму падцягнуты, строгі, і той, выслухаўшы Івана, сказаў:

«А чаму ж не, можна, вядома, можна, і не толькі можна, але і трэба...» Старшыня папрасіў, каб ён, Іван, напісаў заяву, выклаў у ёй, колькі чаго яму трэба дзеля таго, каб паднавіць, падцяпліць хату. І Іван, зноў жа не адкладваючы на потым, тут жа ў сельсавеце, прысеўшы за вольны стол, напісаў заяву. І... І не прайшло і паўмесяца, а каля Іванавай хаты ўжо ляжалі, сохлі на сонцы чэсанае жоўтае бярвенне, смалістыя хлёсткія латы, дошкі. Ляжалі ў двары, прыкрытыя зверху шумавіннем, і даволі ладныя стосікі шыферу, і не абы-якога, а фарбаванага, зелянковага колеру. Аставалася прывезці трохі моху, і можна было склікаць талаку. І аднаго дня — здаецца, то быў ці не панядзелак — Іван, усё яшчэ ў вайсковай форме — у гімнасцёрцы, галіфэ, у ботах-кірзачах, на галаве — пілотка,— узяўшы пад паху старэнькую посцілку (каб было чым выносіць надраны мох на сухое, пасля можна будзе папрасіць у калгасе падводу і прывезці яго на сваю сядзібу), падаўся ў лес.

Звычайна драць мох на якую-небудзь пабудову ў Панюках хадзілі за Качыны брод. Там, адразу ж за перамелам, пачыналася неабсяжная мокрая махавіна, якая ўся зарасла нізкім, чэзлым сасоннікам, багуннікам і буячнікам. Туды, у сасоннік, хадзілі з іхняй вёскі і па журавіны, калі тыя даспявалі ўвосень. З кошыкамі, а найчасцей з мяшкамі, бо журавін у сасонніку спела столькі, што можна было іх грэбці граблямі. Ды Івану ісці па мох за Качыны брод было не з рукі. І далекавата гэта, і мох там быў надта ж мокры. Перш чым класці ў сцены, яго трэба доўга сушыць — шукаць паляну, рассцілаць па траве. Добра, як будзе стаяць на пагодзе, сонца грэцьме. А калі задажджыць раптам? Давядзецца чакаць, бо сыры мох у сцяну класці — гэта ўсё адно што і зусім не класці. Высахне ён — і ў шчыліны між бярвенняў вецер свістаць будзе, зоры па начах лічыць можна... А зімою — дроў не набярэшся ў печы паліць, ад холаду месца сабе ў хаце не знойдзеш. Таму Іван і намысліў пашукаць дзе-небудзь у іншым месцы моху. Ну, хоць бы ў той самай Чортавай Яме. І блізка зусім ад хаты, і мох там

павінен быць не такі мокры, бо паасушвалі ж у тым баку балоты, авёс, проса на тарфяніках раскашуюцца.

Па разоры-сцежачцы Іван выйшаў на дарогу, што вяла да Чортавай Ямы, не спяшаючыся, спакваля пабрыў па ёй, дзівячыся, як навокал усё змянілася, перайначылася за тыя гады, што не быў ён дома,— проста не пазнаць вядомых змалку мясцін. Шыр, прастора, куды ні паглядзі — воку і то няма за што зачапіцца. А некалі ж, зусім яшчэ нядаўна, лазнякі, зараснікі былі скрозь, не прадрацца праз іх. Ды і дрыгва гібела ўсюды. Вясною, як снег пачне раставаць,— мора вады. Вада трохі спадала хіба толькі к лету, а ў зарасніках і выгарах гніла, плеснела круглы год. А што ўжо да камарэчы, гнюсу рознага — хмары віселі. У карчах і бураломе пладзіліся гадзюкі, вужы, мядзянкі; у балацявінах і ямінах — карасі, уюны; жаб і птушак было столькі, што яны аж глушылі сваімі галасамі кожнага, хто асмельваўся па якой-небудзь патрэбе наведаць тутэйшыя мясціны.

«Што ж,— падумаў Іван,— можа, і добра зрабілі, што асушылі, раскарчавалі ўсё наўкруга. А то ж, бывала, вецер адсюль на вёску падзьме — смурод, хоць нос затыкай. Ды і ад камарэчы, гнюсу ратунку ніякага не было. А ўжо як торф загарыцца...»

Іван згадаў — гэта ж перад самым тым, калі яму трэба было ісці ў армію, недзе ўжо ці не пад восень загарэліся былі балоты — не дзіва, суш усё лета стаяла, ні аднаго добрага дажджу не прайшло. Дым тады выядаў вочы, пяршыла ў горле. Ні працаваць у полі, ні быць у хаце. Спрабавалі калгасам хадзіць тушыць тарфянікі, але дзе ты іх атушыш. Курэе, курэе, дыміць, дыміць, а потым як шухне — дрэвы, кусты, стагі сена, як усё адно на той свет, у прорву правальваліся, полымя, іскры толькі ў самае неба шугануць. І зноў дыміць, дыміць, курэе, курэе... Усю зіму гарэлі балоты, толькі вясною, у разводдзе, перасталі дыміць... І ямы павыгаралі паўсюль такія глыбозныя, што жэрдкі ў лесе нельга было знайсці такой доўгай, якая б дно ў ямах тых дастала.

А цяпер ні ям, ні карчэўя, ні гушчэчы. Роўна, чыста, аж люба глядзець. І вады няма нідзе ніякай, хіба толькі ў канавах. Зусім інакшае, другое жыццё пачынаецца тут... І, мусіць, ён, Іван, усё ж правільна зрабіў, што не паехаў, як некаторыя, за свет шукаць лёгкага хлеба, а вярнуўся пасля службы ў арміі дадому, у сваю вёску. «Вось давяду да ладу хату, ажанюся, пайду працаваць у калгас. І маці будзе дагледжана, і ў мяне спакой на душы. У маці адпадзе патрэба пісаць мне слёзныя лісты, скардзіцца на сваю долю, а ў мяне — чытаць тыя лісты, думаць, як, чым супакоіць, абнадзеіць маці». Бо маці ў яго, Івана, не такая, як у іншых. Яна... Ды што казаць... Не пабаялася людскіх абгавораў, насмешак — нарадзіла яго, сына... Ад каго — ён, Іван, і сёння не ведае. І можа, яно і добра, што не ведае. Бо каб ведаў... Прыйшлося б прыглядацца да таго чалавека, чакаць ад яго нейкіх слоў, дабраты... А так... Так ён, Іван, адзін. Бязбацькавіч. Маці нарадзіла яго, выкарміла, выхавала. Не захацела векаваць у дзеўках, знайшла сабе дзіцятка... Яна ж не вінаватая, што была вайна, што вайна забрала на той свет многа-многа мужчын. І таго, каго маці кахала, таксама забрала... Што ж маці аставалася рабіць? Пакахаць другога, нарадзіць дзіця? Як там было ў маці — гэта не яго клопат. Важна, што маці нарадзіла яго, Івана, глядзела ўсе гады, як не глядзела нават самую сябе. І хіба ж ён, Іван, мае права кідаць у вёсцы адну маці, ехаць, як некаторыя, за свет і там жыць? Яна ж, маці, не кінула яго, калі ён нарадзіўся, не здала ў прыют... Не, хто б і што ні гаварыў, а ў дзяцей павінны быць свае абавязкі перад маці, як ёсць яны і ў маці перад сваімі дзецьмі...

Дарога — шырокая, добра ўезджаная, з дзвюма глыбокімі каляінамі-выбоінамі пасярэдзіне — збегла на масток і тут жа крута павярнула ўлева, да лесу — там, дзесьці аж ці не каля Віці, былі дзялянкі, і па гэтай дарозе ўсю восень і зіму леспрамгасаўскія машыны ўдзень і ўночы тралявалі на станцыю нарыхтаваныя бярвенне і дровы.

Іван, абапёршыся локцямі на цёплыя драўляныя парэнчы, пастаяў на мастку, паглядзеў на роўны, як струна, канал, па якім імкліва, нідзе не затрымліваючыся, бегла рыжая, бы густа заварапы чай, вада; потым спакваля перавёў вочы на лес, што зеляпеў цёмнаю сцяною за асушаным балотам,— і ўсё ж пайшоў па дарозе — да Чортавай Ямы па дарозе хоць і далей, але затое надзейней. Бо кіравацца напрасткі і няёмка — пасеяна ж усюды, каноплі вунь ледзь не па самыя пахі! — дый ліха ведае, як яно там, пры ўваходзе ў лес — а раптам макравата... І лазняк жа, алешнік — ці прадзярэшся... Заўважыў, што чым бліжэй да лесу, тым дарога цвярдзейшая, цубчэйшая — лес зберагае даўжэй вільгаць, дый зямлю карэнне аплятае, не дае ёй пыліцца. Нават раса дзе-нідзе блішчыць яшчэ ў лапушыстым лісці малачаю, хоць ужо і не рана, пад поўдзень падбіраецца, і сонца пячэ, аж смаліць.

«Калі такая пагода пастаіць з тыдзень, дык і бярвенне падсохне, і мох не трэба на паляну ці прагаліну выносіць. Дый талаку можна будзе хутчэй сабраць. Пагодаю — гэта не ў дождж, многа чаго за дзень паспец зрабіць можна,— думаў Іван.— Толькі... Давядзецца гарэлкі ў магазіне літраў колькі ўзяць. А на закуску... На закуску дзеля такой нагоды парсючка асвяжуем...»

Але, ступіўшы крокаў колькі, свежаваць парсючка Іван перадумаў. «Малаваты яшчэ. Хай трохі падрасце. А то... Толькі згуба, а не наедак... Дый вяселле ж спраўляць неўзабаве трэба будзе. Можа, лепей цялятка на талаку прырэзаць? Праўда, і яно малое, без цяляці карова малако ці будзе аддаваць? Хіба нічога не рэзаць, кансерваў у магазіне набраць ды на базар у Ельнікі з'ездзіць, мяса, каўбас трохі прыкупіць? Грошы на гэта... Але як жа іначай: хочаш хату перасыпаць — і каб з галавы і волас не ўпаў? Затое і парсючок, і цялятка астануцца. Цялятка за лета падрасце, можна ўвосень у калгас здаць ці чалавеку добраму на развод прадаць... А парсючок... Так таму і быць — парсючка асвяжуем на вяселле...»

У лесе — гонкім, меднастволым сасонніку, які то тут, то там зарос арэшнікам, арабіннікам,— Іван на хвіліну прыпыніўся, потым рашуча збочыў з наезджанай дарогі, папраставаў па мяккай, укрытай сухою рыжаю ігліцай і растапыранымі ад гарачыні і ад таго нязвыкла тоўстымі шышкамі парaслі. Парасля вельмі хутка збегла ў лагчыну, змянілася маладым калючым хвойнікам — боты шорстка зашасталі па жорсткім верасе. Запахла багуном — адразу церпка, густа: блізка быў мох, тая Чортава Яма, куды і кіраваўся Іван. Раней, да службы ў арміі, Іван неаднойчы бываў тут, у гэтым лесе — хадзіў і па арэхі, і па грыбы, і па ягады. Праўда, у сам мох забрыдаў рэдка — надта ж мокра было там, вада не высыхала ніколі, нават у самыя засушлівыя леты. Асабліва ў тым баку, дзе была глыбозная яма,— там, у той яме, казалі, жыў Чорт. Чорт той ані не шкодзіў, ніколі нікога не абрабаваў, не забіў, толькі палохаў людзей, калі блізка хто падыходзіў да яго жытла,— неяк дзіўна біў нечым, усё адно бы пранікам, па вадзе — аж рэха аддавалася — і хаваўся. Уся вёска верыла — у Чортавай Яме і праўда жыве Чорт, пакуль настаўнік іхняе школы Пятрусь Адамавіч неяк не прабраўся да Чортавай Ямы і не сфатаграфаваў «чорта». Іван трымаў у сваіх руках той здымак — на здымку быў відаць самы звычайны вусаты бабёр. «Дык вось каго прымала за чорта вёска»,— смяяўся разам з усімі вучнямі і ён, Іван, таксама тады яшчэ вучань. І на экскурсію — паглядзець на жывога «чорта» — таксама хадзіў разам з усімі вучнямі ў Чортаву Яму, хоць маці яго і не пускала, усяляк страшыла. «Чорт — на тое ж ён і чорт, каб перакінуцца сёння ў бабра, а заўтра ў барана, а паслязаўтра яшчэ ў каго... Шануйся, сынок, бо жартаваць з чортам... Ну яго, лепей быць далей ад ліха...» Але і спакуса — убачыць на свае вочы чорта-бабра — была надта ж вялікая, неадольная, і ён, Іван, хоць і халадзела ўсё ўсярэдзіне, асцярожна краўся ўслед за настаўнікам і іншымі вучнямі ад дрэва да дрэва, ад купіны да купіны, пакуль нарэшце не ўбачылі штосьці накшталт сухога

лаўжа, што падымаўся над вадою. «Гэта баброва хатка,— ціха прашаптаў Пятрусь Адамавіч.— А вунь і сам гаспадар гэтай хаткі»,— і паказаў рукою некуды ўбок. І Іван, павёўшы свае вочы за рукою настаўніка, раптам аж у зямлю ўрос — па вадзе плыло невялікае асінавае бярвенца, а разам з ім, тым бярвенцам, плыў, выставіўшы вусатую морду, і «чорт» — бабёр. Нехта з вучняў не вытрымаў, ці то ад здзіўлення, ці то ад страху айкнуў, хоць настаўнік перад гэтым і папярэджваў усіх маўчаць, ні ў якім выпадку не гаварыць ні слова. Чорт-бабёр нырнуў у ваду і, колькі яны, вучні, стаіўшыся, ні стаялі, колькі ні чакалі, больш не паказаўся на вочы.

«Цікава, ці жыве там, у той яме, бабёр цяпер, калі паасушвалі скрозь балоты? — падумаў Іван, кіруючыся бліжэй да моху.— Яно, вядома, добра, што балоты паасушвалі,— пабольшала поля, паменшала камарэчы, гнюсу, не засыпаюць цяпер ужо гэтак вочы, як засыпалі. Але ж... Але ж жыўнасці рознай... Няма ўжо гэтулькі, колькі было раней, ні качак, ні буслоў, ды і рыбы няма... І грыбы, кажуць, не растуць так, як раслі. Усяму жывому трэба вада. А яна якраз і адступіла, у канавах, каналах толькі асталася...»

Тоўстая, вывернутая з карэннем старадрэвіна перагарадзіла Івану дарогу. Ён паглядзеў на вяршыню, паглядзеў на камель, прыкінуў, як лепш абысці старадрэвіну: не, усё ж абыходзіць з камля будзе лацвей — там не так густа парос хвойнік, ды і галлё сухое не будзе блытацца пад нагамі. Зашастаў ботамі па верасе, беручыся бліжэй да вываратня,— ён, вываранень, падымаўся з хвойніку, быццам зроблены чалавекам курэнь-аднабочка. «Скажы ты, нават верас і мох не пасохлі,— глядзеў на вываранень, дзівячыся, Іван.— Як падняліся разам з карэннем і зямлёю, так і растуць. А можа...» Іван раптам разгубіўся, хвілін колькі не ведаў, што рабіць, не верыў вачам сваім — ля камля нешта бегала, варушылася жывое.

«Няўжо вожык?»

Падышоў бліжэй — не, не вожык. Хутчэй сабачаня. А можа, лісяня?

Нагнуўся, узяў цёпленькае, пухнаценькае, з чорнаю палосачкаю на спіне, бледна-жоўтае, з нашашэранай поўсцю на галаве, тупамордае звераня на руку, намагаючыся адгадаць, хто гэта ўсё ж — сабачаня ці лісяня. А мо ваўчаня? Малых ні лісянят, ні ваўчанят Іван ніколі не бачыў. Неяк, хоць і жыў у лесе, не давялося бачыць. Таму цяпер, трымаючы ў сваіх руках цёпленькі жывы клубочак і разглядаючы яго, Іван нічога пэўнага не мог сказаць — лісяня гэта ці ваўчаня, тым болей што звераня было зусім маленькае, нават вочкі ў яго добра яшчэ не прарэзаліся. Яно, звераня, тыцкалася халодным носікам у далонь, шукала чагось бяззубым ротам — ці не цыцкі. Злавіўшы палец, пачало прагна ссаць.

«Мабыць, гэта ўсё ж ваўчаня. Бо ліса наўрад ці вывела б тут сваіх дзяцей. Лісы жывуць у норах. А тут... Нават пасля асушэння макравата, сыра, норы пазалівала б вадой вясною. Хіба, можа, забрыло адкуль гэтае звераня сюды?»

Уважліва, прыглядаючыся да кожнага кусціка, кожнай купіны, акінуў вачыма лес наўкруг старадрэвіны, зазірнуў пад вываратень — пад вываратнем, у навісі моху і верасу, было лагво. Шырокае, намошчанае з галля і сухога сена. Вакол лагва бялелі, валяліся абгрызеныя косці, зусім яшчэ свежыя, з рэштакмі мяса,— па іх, гэтых касцях, поўзалі мурашкі, роіліся мухі. А ў лагве... У лагве варушыліся такія ж бездапаможныя, сляпыя, зусім кволыя зверанята...

«Лагво... Няйнакш воўчае... Колькі ж іх там, гэтых ваўчанят?..»

Працягнуў руку, дастаў яшчэ адно, потым другое, трэцяе, чацвёртае, пятае, шостае...

«Сем... Аж сем ваўчанят!»

Што з імі, ваўчанятамі, рабіць, Іван у тую хвіліну не думаў. Рабілася ўсё неяк само сабой — посцілка раптам аказалася разасланай, на яе і пасадзіў Іван усіх ваўчанят.

«А можа, іх не сем, а больш?»

Падлез пад вываратень, абшукаў, абмацаў рукою лагво — не, больш ваўчанят не было. Падняўся, звязаў посцілку

за ражкі, зрабіў нешта накшталт клунка і, не зайшоўшы нават у мох, не паглядзеўшы, ці можна там надраць сабе на хату моху (Іван зусім забыўся на гэта!), ад воўчага лагва адразу ж павярнуў назад, у вёску, нібыта дзеля гэтых ваўчанят ён і браўся сёння ў лес.

«Завязу ваўчанят у Ельнікі, здам. І звяруг аж сем зліквідую, і грошы атрымаю...»

Колькі плаціць дзяржава за кожнае злоўленае ваўчаня, Іван не ведаў. Ды і не грошы яго радавалі гэты раз, а радавала ўдача, тое, што яму шанцуе, як ніколі яшчэ не шанцавала.

«І Ніна не выходзіла за другога замуж, мяне чакала. І лесу далі перасыпаць хату. І бачыш — ваўчанят гэтых знайшоў, жывая капейка сама ў кішэню папрасілася»,— усміхаўся Іван, кіруючыся па дарозе назад у вёску, дадому.

Дома, у хаце, маці не было, і Іван, развязаўшы посцілку, нейкі час любаваўся ваўчанятамі — глядзеў, як яны нясмела, абнюхваючы кожную маснічыну, поўзалі па падлозе, а асвойтаўшыся, пачалі дурэць — куляліся, вурчалі, спрабавалі адно аднаго кусаць. Калі ваўчаняты пастамляліся і, як здалося Івану, захацелі есці, ён пайшоў у камору, узяў гладыш малака, наліў у сподачак. Тыцнуў адно, другое ваўчаня пыскаю ў малако. Ваўчаняты зафыркалі, потым язычкамі пачалі аблізваць пыскі. Пачакаўшы, калі ваўчаняты абліжуць з пысак малако, зноў патыцкаў іх пыскамі ў сподачак. Гэты раз ваўчаняты не фыркалі, а пачалі заўзята злізваць з пысак малако.

«Эге, ды вы як сабачаняты... Вас і да малака з-пад каровы можна прывучыць...» — зарадаваўся, быццам немаведама чаму, Іван.

...Калі вярнулася маці — хадзіла жаць цяляці траву,— яна, адчыніўшы ў хату дзверы, убачыла даволі нечаканае: пасярод хаты на падлозе разаслана посцілка, на посцілцы сядзіць сын, Іван, перад ім сподачак, у які Іван лье з гладыша малако. А вакол сподачка, прыпаўшы пыскамі да малака, валтузяцца... няўжо сабачаняты?

— Іван, каго гэта ты корміш? — выказала сваё здзіўленне як толькі магла ласкава маці.— Няўжо сабачанят?

— Ды не, мама, гэта ваўчаняты,— павярнуўся да маці тварам, усміхаючыся, адказаў Іван.

— Ваўчаняты? — яшчэ больш здзівілася маці.— Дзе ты іх узяў?

— У Чортавай Яме. Пайшоў туды, каб моху надраць на хату. А натрапіў на воўчае лагва, то і на мох забыўся...

— А божа ж ты мой,— перахрысцілася маці.— Гэта ж каб ваўчыца цябе заспела там, яна б парвала...

У вачах і ў голасе маці было столькі перажывання і страху, што Іван аж сцехануўся. Паставіў гладыш на падлогу, і яго, Івана, кінула раптам у пот.

«І праўда ж, як гэта я забыў зусім на ваўчыцу? Канечне, яна магла накінуцца на мяне! Асабліва калі я лёг на зямлю, палез пад вываracень шарыць рукою. І не абараніўся б — мэтлахі з мяне толькі б паляцелі! М-га-а!»

— Што ты з гэтымі ваўчанятамі рабіць будзеш? — пытала тым часам маці, усё яшчэ стоячы ў парозе і хрысцячыся.

— У Ельнікі завязу, дзяржаве здам...

Маці, пачуўшы сынавы словы, пакруціла галавою:

— Ой, глядзі, глядзі... Бо ваўчыца не даруе. Нікому не даруе. Яна будзе помсціць. І не толькі нам, а ўсяму сялу...

— Не бойся, мама.

— Я, сынок, не баюся. Але сяло, што скажа сяло?

— Нічога, мама, не скажа, акрамя хіба дзякуй. Як-ніяк, а семярым ваўкам амба. Бо пракарміць такую плойму... Плакалі б не толькі нашы Панюкі.

— У тым і штука, што воўк, дзе жыве, там не бярэ. За дзесяць, дваццаць вёрст бяжыць, а каля лагва свайго... Барані божа, ніколі нікога не зачэпіць. А цяпер...— Маці цяжка-цяжка ўздыхнула.

— Якая, мама, розніца, дзе воўк бярэ. Усё адно ён бярэ, прыносіць шкоду. Не нам, дык суседзям. І калі бачыш зладзюг — знішчай...

— Канечне, знішчаць ваўкоў трэба,— быццам згадзілася з сынам маці.— Але рабіць гэта трэба з розумам, па-людску. Можна было б і ваўчанят забраць, і старых ваўкоў перабіць.

— ?!

— Так-так, сынок.

Маці прашлэпала босымі, з сінімі вузламі вен на лытках нагамі па падлозе, стомлена села на лаву — толькі цяпер Іван убачыў, якая старая, нядошлая ўжо ў яго маці. За тыя гады, што не быў ён дома, распаўнела, ацяжэла. І твар увесь у маршчынах, і вочы пахаваліся ў вачніцах. І ўсё стогне — мусіць, нешта баліць у яе, ды яна не прызнаецца, не кажа пра гэта сыну.

— Так-так, сынок,— паўтарыла маці.— Помню, да вайны было. Хтось з нашае вёскі знайшоў лагва воўчае. То малых ваўчанят не браў, а паляўнічым сказаў пра гэта. Тыя сутак двое пільнавалі старых ваўкоў і ўсё ж прыпільнавалі — пастралялі ваўкоў ля лагва. А тады толькі ваўчанят пазабіралі. І табе, мабыць, трэба было не спяшацца, тое самае зрабіць.

Іван адчуваў, асабліва цяпер, пасля гаворкі з маці, што ён пагарачыўся, паспяшаўся,— ваўчанят ён мог забраць і па-другому, можа, нават так, як браў і той «хтось», пра каго ўспомніла маці. Але зробленае ўжо не пераробіш. І таму, каб хоць трохі супакоіць і сябе, і маці, сказаў рашуча:

— Кінь ты, мама, і мяне, і самую сябе палохаць. Усё будзе добра. А калі што якое — стрэльбаў цяпер хапае. Прыпільнуем і пазабіваем тых ваўкоў...

— Дай бог, сынок, чутае бачыць. Ты ж ведаеш — я ні табе, ні людзям ліха не жадаю...

І твар у маці раптам пасвятлеў, нібыта на яго ўпалі прамяні сонца.

— Глядзі ты,— сказала яна, не зводзячы вачэй з ваўчанят.— Гэта ж трэба — з такіх кволенькіх малятак такія ненажэры-зладзюгманы вырастаюць! Во воўчае кодла, во воўчая натура! — І ўсміхнулася. Усміхнулася хораша, ласкава.

Вестка, што Ганнін Іван прынёс з лесу аж сямёра ваўчанят, хутка распаўзлася па вёсцы. І к вечару ў Ганнінай хаце хто толькі не пабываў. Адны прыходзілі, бо ніколі не бачылі малых ваўчанят, то хацелі паглядзець — іншага такога выпадку можа і не надарыцца. Другія — не бачылі яшчэ пасля звароту з войска самога Івана, а тут і прычына быццам была, каб пабачыцца, пагаманіць. Былі і такія, што ішлі ў Ганніну хату папярэдзіць Івана і самую Ганну: асцерагаюцца хай — ваўкі не даруюць гібелі сваіх дзяцей, наведаюцца, абавязкова наведаюцца на селішча, то трэба па-належнаму падрыхтавацца і сустрэць непажаданых гасцей.

— Гэта ўжо такое воўчае адроддзе,— казалі яны.— Як толькі зачэпіш іхняе лагво — не абярэшся бяды.

Нехта ўспомніў, што ў суседняй вёсцы — Надлужжы — сёлета напрадвесні, перад тым як снегу растаць, забілі аднаго ваўка — лез у калгасную аўчарню.

— А вялізны ж ваўчуга быў! Кажуць, з добрае цяля...

Нінін бацька, Макар, таксама завітаў у хату да будучага зяця. Доўга сядзеў на лаве, смактаў самакрутку, пагладжваў сваю доўгую — лапатай,— амаль усю, да воласа, сівую бараду, глядзеў моўчкі на ваўчанят, якія паразбрыдаліся па хаце, поўзалі з кута ў кут, а потым, калі ўжо збіраўся адыходзіць, сказаў:

— Ліха ведае, як яно лепш трэба было зрабіць, але што ваўкоў ты раззлаваў, то гэта факт...

— Дык што, можа, мне і зусім браць ваўчанят не трэба было? — спытаў насцярожана Іван.

— Не, чаго ж, узяў ужо, дык узяў. Думаеш, каб я натрапіў на тое лагво, дык не забраў бы ваўчанят? Забраў бы. І кожны тое самае, што і ты, зрабіў бы.

А старшыня калгаса, той, што і да прызыву Івана ў армію ў іхнім калгасе за старшыню быў,— у ботах, цёмна-сінім галіфэ, белай кашулі наросхрыст, зусім яшчэ не стары, лёгкі і рухавы,— Павел Пятровіч Абадушка, які таксама, праязджаючы міма на «газіку», не змог, каб не забегчы ў хату, нават пахваліў Івана:

27. Зак. 1877

— Малайчына! Гэта ж каб павырасталі, колькі б бяды нарабілі! Гэткая плойма! Ага, гэткая плойма! На праўленні калгаса пастаўлю пытанне, каб прэмію табе даць. Ага, прэмію...

— Што вы, Павел Пятровіч, гэта ж выпадак,— засаромеўся, зніякавеў Іван.

— Хай сабе і выпадак, а сямі ваўкоў няма. Гэта нешта ды значыць! Ага, значыць! І не толькі для нашага калгаса, але і для іншых, суседніх. І падводу дам табе заўтра ваўкоў у Ельнікі завезці. Вось як развіднее, дык і прыходзь. Ага, прыходзь. І наогул прыходзь. Калі памагчы што трэба — паможам...

— Ды быццам памагаць нічога не трэба. Вось хіба з ваўкамі...

— Якімі ваўкамі? Гэтымі? — старшыня прабег па хаце, паказаў вачыма на ваўчанят.

— Ды не, старымі, бацькамі іхнімі. Напалохалі тут мяне, кажуць, ратунку ад іх не будзе. То калі што...

— Э-э, забудзь! — перапыніў Івана старшыня.— Калі што... Мы ж таксама не лыкам шытыя. Варту падвоім, бярданкі ды ружжы збяром з усяго сельсавета. Ага, збяром,— старшыня любіў паўтараць тыя словы, якія яму чамусьці найбольш падабаліся.— Так што не думай, прыходзь па каня. Ну і на працу ў калгас таксама прыходзь, чакаем... Тым часам і месца табе вызвалілася.

— Якое месца? — зацікавіўся, настрыўся Іван.

— Да арміі ты трактарыстам рабіў. Цяпер мяркуем брыгадзірам над усёй нашай механізацыяй паставіць. Ага, брыгадзірам!

— Ці спраўлюся я, Павел Пятровіч? — нясмела пацепнуў плячыма Іван.

— А чаму ж не, справішся. Ага, справішся. Ты хлопец упарты, свайго заўсёды дамагаўся. Дысцыплінку ведаеш. Дый вайсковая служба, думаю, сяму-таму цябе навучыла. Ага, навучыла. Так што мы чакаем, прыходзь,— хітравата, але зычліва падміргнуў, выходзячы з хаты, старшыня.

І назаўтра, раніцою, Іван пайшоў у калгасную кантору. Старшыня быў на ганку, падаў Івану руку, паказаў вачыма на ферму.

— Ідзі, брат, у нашу брахалаўку, вазьмі збрую, каня выберы і газуй у Ельнікі. Ага, газуй. Можна было б і машыну табе дзеля такога выпадку даць, але занятыя машыны сёння.

— Што вы, Павел Пятровіч, і на кані спраўлюся. Дзякуй! — сказаў, усміхаючыся, Іван.

— Дзякаваць потым будзеш, а цяпер бяры каня і едзь. Ага, едзь.

Ад канторы, якая мясцілася ў звычайнай сялянскай хаце непадалёку ад сельсавета, Іван папраставаў праз невялікі лужок да фермы, адзначаючы сам сабе, што за той час, калі не быў ён дома, тут асабліва нічога не змянілася. Хіба што пабудовы, здаецца, паменшалі, пачарнелі — Іван ведаў, што калгасную ферму будуюць новую, цагляную, і не ў іхняй вёсцы, а ў Макранах — там больш лугоў, пашаў. Гэтая ж старая іхняя ферма была пабудавана пасля вайны, прычым даволі ўдала — усе хлявы стаялі адзін пры адным, квадратам, утвараючы двор, пасярод якога вытыркалася тая «брахалаўка» — хатка,— там на ўбітых у сцены круках вісела вупраж, там у ранейшыя гады збіраліся ездавыя, каб прабавіць час, пакуль прыгоняць з пашы коней і можна будзе запрагацца, ехаць на працу. Цяпер коней у калгасе было ўсяго некалькі дзясяткаў, асноўную работу рабілі трактары і машыны. Таму ў пасядзельні, акрамя конюха — кульгавага, глухаватага Апанаса, нікога не было. І Іван, адчыніўшы дзверы і стаўшы на парозе, крыкнуў Апанасу, які сядзеў на шырокай лаве ля акна, латаў хамут:

— Дзень добры, дзядзька Апанас!

— Што? — спытаў дзядзька Апанас, адкладаючы ўбок хамут.

— Дзень добры, кажу. Мне трэба каня,— крыкнуў яшчэ мацней Іван.

— Каня? — перапытаў дзядзька Апанас і імкліва падняўся з лавы, замітусіўся, закульгікаў.— Казаў, казаў старшыня...

Ага, толькі якога табе каня даць? Найдзяк на ферме будзе заняты, Гітлер малако цялятам павязе... Хіба вазьмі Мацака?

— Давайце любога, мне ўсё адно,— сказаў Іван.

— Што, не хочаш Мацака? — падставіўшы да вуха руку, спытаў дзядзька Апанас.

— Ды не, мне ўсё адно,— крыкнуў Іван.

— Усё адно? Не, не кажы. На добрым кані яно і ехаць добра. Бо запражы якога нездаляку, вымучышся, жыццё праклянеш... Ну, калі на Мацаку паедзеш, то вось і збруя яго...

Дзядзька Апанас зняў з крука хамут, церассядзёлак, аброць, лейцы, падаў іх Івану.

— Нясі, а я тым часам са стайні Мацака табе выведу. Ён не на пашы сёння, я пакінуў яго, не выганяў у табун... І калёсы бяры навейшыя, вунь тыя, што ля аўчарні стаяць...

Іван, закінуўшы за плечы збрую, пайшоў па скапычаным, гнойным двары да аўчарні, знайшоў тыя «навейшыя калёсы». Паклаў на іх збрую, пачакаў, калі дзядзька Апанас выведзе са стайні Мацака.

Каня Мацака Іван не ведаў. І ўзрадаваўся, калі ўбачыў сівога, у яблыках, даволі рослага і гладкага каня, якога вёў, як заўсёды кульгаючы на левую нагу, за грыву дзядзька Апанас.

— Ён конь спакойны, ненатурлівы,— гаварыў нібыта сабе, нібыта Івану дзядзька Апанас.— І падганяць вельмі не трэба, сам ідзе, абы толькі лейцы ў руках трымаў, дарогу паказваў. А ты што, ваўчанят у Ельнікі павязеш?

— Ды ўжо ж, давядзецца,— выдыхнуў Іван.

— Вязі, вязі... Капейку, мабыць жа, ніштаватую аграбеш. Пашанцавала, можна сказаць, табе. Так ні за што ні пра што грошы ў рукі самі лезуць. Чаму ж іх не ўзяць, га? — усміхнуўся, паказаў свае гнілаватыя, жоўтыя зубы Апанас.

— Дзела, дзядзька, не ў грашах,— сказаў зноў гучна, каб пачуў Апанас, Іван.

— Яно я і сам панімаю, што не ў грашах,— згадзіўся з Іванам Апанас.— Але і грошы таксама нешта ды значаць, на дарозе яны не валяюцца...

Запрогшы ў калёсы Мацака, Іван гародамі, пазахлеўю, каб менш каго бачыць, пад'ехаў да свайго двара. Зайшоў у хату, звязаў зноў у вузел посцілку з ваўчанятамі, вынес і палажыў на воз. Мацак, мабыць, пачуўшы воўчы пах, навастрыў вушы, пырхнуў, паглядзеў на Івана вялікім зеленаватым вокам.

— Не бойся, гэтыя табе шкоды не зробяць,— сказаў Іван да каня і дабрадушна палэпаў яго далонню па крыжы.

На ганак, закрыўшы засланкаю печ — каб пашчасціла! — выйшла Іванава маці, з любасцю і журбою ў вачах паглядзела на сына. Уздыхнула, сказала са скрухай:

— Можа б, стрэльбу ў каго папрасіў, га, Іван? Ліха ведае, а раптам ваўкі па слядах за падводаю пабягуць? Хоць абараніцца будзе чым...

— Ой, мама, не палохай і самую сябе, і мяне,— засмяяўся Іван.

Але, падумаўшы, усё ж вярнуўся ў хату, узяў з-пад лавы сякеру, засунуў яе ў аглабцы ў сена. «Чорт яго ведае, у дарозе ці мала што можа здарыцца. Сякера не лішняю будзе».

Сеў сам на падводу, пацягнуў да сябе лейцы, сказаў на каня:

— Но-о, Мацачок, паехалі!

Конь скрануў з месца калёсы, вывез іх на дарогу — і колы мякка пакаціліся па сыпкім, сухім пяску.

Іван паглядзеў на неба, на сонца, што ўжо адарвалася ад лесу і падымалася ўгору, вышэй і вышэй, падумаў: «Да абеду, да самай спёкі, бадай што, буду ў Ельніках».

Мінуўшы ж вёску, поле і ўехаўшы ў лес, зноў пачаў перабіраць у памяці тое, пра што думаў найбольш апошнімі днямі, калі аставаўся адзін, сам-насам, чым жыў,— пра Ніну, якая неўзабаве павінна стаць яго жонкай, пра хату, якую ён днямі перасыпле, пра маці — ёй, старой, здаецца, што ён, Іван, не дарослы чалавек, а ўсё яшчэ дзіця... Малое, бездапаможнае дзіця...

## II

Іван, едучы па лесе, ці быў бы такі бесклапотна-спакойны, каб ведаў, што ўслед за ім, хаваючыся ў лазняках і зарасніках, крадзецца, бяжыць ваўчыца — маці семярых, забраных у яе, ваўчанят...

А між тым так яно і было — па дарозе, трасучыся і падскокваючы на каранях, кацілася падвода, а ўслед за ёю, не адстаючы ні на крок, непрыкметна бегла, кралася ваўчыца...

Наогул, калі быць шчырым, дык ёй, Падгалай, сёлета ані не шанцавала. Не шанцавала, здаралася, і раней, але каб так... Не, так не шанцавала ёй толькі сёлета...

А ўсё пачалося з таго, што яе, Падгалую, упадабаў Палена-Хвост. Ён, Палена-Хвост, і адбіў яе ў астатніх ваўкоў — двух самцоў, якія не захацелі яе, Падгалую, аддаваць без барацьбы, ён прыдушыў да смерці, яшчэ двух — да паўсмерці. Астатнія паразбягаліся, паўцякалі — хто куды. Палена-Хвост быў воўк дужы, горды, ён падабаўся Падгалай. Падабаўся, прынамсі, да таго часу, пакуль яны не пакінулі воўчую гайню і не асталіся жыць адны. Тады яна, Падгалая, спазнала, які Палена-Хвост самаўпэўнены: ён ніколі не лічыўся ні з чыімі жаданнямі, рабіў толькі тое, што падабалася, хацелася яму, аднаму яму. Да таго ж, як хутка пераканалася Падгалая, ён спадзяваўся ўсюды і ва ўсім на сваю сілу, розум жа меў недалёкі. Дзе можна было ўжыць хітрасць і дамагчыся свайго, ён ішоў напралом. Яму, трэба сказаць, шанцавала. Вядома, шанцавала да пары. Аднойчы, расхрабрыўшыся, ён у ідную, месячную ноч палез у аўчарню. Падгалая падказвала яму, што звычайна, дзе многа авечак, там ёсць вартаўнікі. І не проста вартаўнікі, а вартаўнікі з тымі палкамі, якія рыгаюць агнём і грымяць, бы перуны. Таму лепш знайсці такі хлеў, дзе дзвестры авечкі. І залезці ў такі хлеў лягчэй, і варты там няма ніякай. Але Палена-Хвост хіба калі каго слухаў, хіба калі з кім лічыўся? Яму куды важней было тое, што, дзе многа авечак, там можна выбраць тлусцейшае, маладзейшае

мяса. Бо Палена-Хвост нічога так не любіў, як смачна, да адвалу паесці. Яна, Падгалая, маліла, прасіла не ісці ў тую вялікую аўчарню, а калі і ісці, то хоць пачакаць, каб месяц схаваўся за хмару. Але дзе там! Палена-Хвост толькі кляцнуў зубамі і, нават не крадучыся, не прыпадаючы ўсім целам да снегу, горда, лёгка патрухаў да аўчарні. Яна, Падгалая, не паспяшалася за Палена-Хвастом, а адстала трохі, ішла паволі, прынюхваючыся, ці не пахне тою палкаю, што грыміць і рыгае агнём...

Палкаю тою пахла. Нават больш — неўзабаве яна, Падгалая, убачыла і таго, хто трымаў тую палку ў руках,— стаіўшыся, ён стаяў за вуглом аўчарні і не зводзіў вачэй з Палена-Хваста. Яна, Падгалая, кляцнула зубамі, ледзь чутна завыла, даючы тым самым зразумець Палену-Хвасту — яго бачаць, за ім сочаць, маўляў, не ідзі далей, паварочвай, пакуль не позна, назад, уцякай. Але Палена-Хвост, мусіць, не пачуў яе: ноздры яму — гэта напэўна — ужо казытаў пах авечага цяпла, і ён ішоў на гэты пах, чуючы толькі яго, больш нічога, нічога... Пах гэты п'яніў Палена-Хваста, прымушаў думаць не пра асцярогу, а пра той смак, які неўзабаве, вось-вось будзе ў яго роце... Вось Палена-Хвост падышоў да сцяны, грабянуў кіпцюрамі снег — намысліў, мусіць, падрывацца... І ў гэты час палка, якую трымаў у руках вартаўнік, рыгнула агнём. Перш чым яна, Падгалая, пачула той страшны гром і своеасаблівы пах, якім заўсёды пахне той агонь з палкі, яна ўбачыла, як адскочыў ад сцяны Палена-Хвост, як ён, ашчэрыўшы зубы, кінуўся на таго, у чыіх руках была тая палка...

«Уцякай, уцякай!» — як не крычала ўсё ўсярэдзіне ў яе, Падгалай.

Але хіба гэта мог пачуць у той момант Палена-Хвост? Ён, ашчэраны і, мусібыць, паранены, ішоў на таго, хто яго падсцярог, не даваў пасмакаваць авечага мяса.

Палка зноў рыгнула агнём. Палена-Хвост неяк раптоўна нібыта спатыкнуўся, яго павяло, павяло ўбок, ён на хвіліну прыпыніўся і... мякка асунуўся, лёг у снег...

Што было далей — яна, Падгалая, не бачыла, бо, павярнуўшыся, з усіх ног кінулася, пабегла назад, да лесу — той чалавек, у якога была тая страшная палка, якая рыгала агнём, мог пагнацца і за ёю, Падгалаю.

І тады б... Не-не, лепш не думаць, што было б тады...

У лесе яна, Падгалая, трохі апомніўшыся і супакоіўшыся, падумала, уцяміла — Палена-Хваста няма, яна зноў асталася адна. Тое, што Палена-Хваста няма, што ён загінуў проста ў яе на вачах, было не самае страшнае. Урэшце, усе рана ці позна паміраюць. Страшна было другое — ёй, Падгалай, давядзецца цяпер жыць адной, самой клапаціцца і пра яду, і пра лагво, і пра тых сваіх дзяцей, якіх насіла ўжо яна ў жываце.

І ніхто, ніхто ёй не паможа, бо яна адна... Адна-а!

Начэй колькі яна, Падгалая, тулялася як непрыкаяная па лесе. Недзе на сподзе душы жыла яшчэ, тлела надзея, што, можа, Палена-Хвост не загінуў, можа, здарыўся цуд — і ён, Палена-Хвост, вернецца ў лес, знойдзе яе і яны будуць зноў разам. Яна ведала: Палена-Хваста няма, яго забілі, яна гэта бачыла, а ўсё ж... А ўсё ж думала пра яго — як жывога, чакала, спадзявалася, верыла...

Мiналі, цяклі ночы і дні, Палена-Хвост не з'яўляўся. І разам з бегам часу адыходзіла, меркла надзея на лепшае ў Падгалай, хоць тады ёй неяк пашанцавала — залёгшы на заечых сцежках, яна прыпільнавала ладнаватага шарака і добра, са смакам паабедала. Але такая ўдача напаткала яе толькі адзін раз. Толькі адзін раз. Усе ж астатнія дні Падгалая проста галадала. Жудасна галадала, бадзяючыся з аднаго пералеску ў другі. Ела кару, парахню, бо ісці ў вёску баялася. Палка, якая рыгае агнём, магла адабраць жыццё і ў яе. А яна ж была не адна ўжо — у яе жываце былі дзеці. За іх, дзяцей, яна, Падгалая, больш за ўсё і баялася.

Аднойчы яна ўспомніла: недзе тут, поблізу, ёсць конскі могільнік, куды хадзілі, калі яна была яшчэ малая, усёй воўчай гайнёй есці падлу. Праўда, тады было больш усюды

коней і не-не дый здаралася такое, што як-небудзь нездаляка падыхаў і яго выцягвалі на могільнік. Дохлі коні асабліва часта напрадвесні. І не адны толькі коні дохлі, але дохлі і каровы — не хапала, мусіць, і ім яды, бо дохлыя коні і каровы былі надта ж худыя, косці ды скура. Але ў голад і тыя косці былі радасцю. Пагрызеш іх — і трывалей, цяплей у жываце, весялей на сэрцы. У апошнія гады коней паменела. Значна паменела. Што ж да кароў, то іх пабольшала, і яны не прападаюць прадвеснем. Нешта змянілася ў іх жыцці, бо каровы і вясною цяпер такія ж спраўныя і сытыя, як і ўвосень. Ім, значыцца, хапае яды. Ды і хлявы ў кароў не такія, як былі раней, а моцныя, цёплыя, нават з такім самым святлом, бы і ў хатах людзей. Есці падлу сярод ваўкоў не лічылася ніколі за гонар. Дужыя, мацёрыя нават гідзіліся запаскуджваць падлаю рот. Але ёй, Падгалай, што, што было рабіць, не падыхаць жа з голаду? І яна пайшла шукаць той конскі могільнік...

Як на тое, прадвесне выдалася снежнае. Снегу панамятала ўсюды цэлыя гурбы. Ногі грузлі па самы жывот, давялося ледзь не паўзці. Падгалая часта спынялася, адпачывала, праклінаючы беспрытульнае сваё жыццё і бадзянне ў пошуках яды. А тут яшчэ пасля адлігі ціскануў мароз і снег укрыўся цвёрдаю скарынкаю. Пад цяжарам цела скарынка ламалася, ногі правальваліся ў снег, і скарынка тая рэзала да крыві скуру. Было балюча нагам. І вельмі голадна. Голадна і неяк крыўдна, тужліва на сэрцы. Але яна, Падгалая, дабралася ўсё ж да могільніка — ён быў у маладым, рэдкім хвойніку, на ўзлеску. Амаль не здзівілася, убачыўшы стоптаны-ператоптаны снег. Ваўкі, асабліва напрадвесні, заўсёды наведваліся сюды, разграбалі кіпцюрамі снег і зямлю, адкопвалі падлу. Але, наеўшыся ўволю, пакідалі могільнік і, адышоўшыся, завальваліся ў мох ці ў снег спаць. Тое ж, што ўбачыла на могільніку Падгалая цяпер, напалохала яе. Нідзе не валялася ні кавалачка мяса, ні шкуры, ні нават хваста ці галавы. Усё чысценька падабралі, пажэрлі... Валялася на снезе толькі некалькі кастамах, ды і тыя так абгрызеныя,

28. Зак. 1877

абсмактаныя, што нават не пахлі ўжо мясам. Аблізаўшы адну, панюхаўшы другую, яна, Падгалая, села і завыла... Завыла жаласліва, крыўдліва, ледзь не заплакала...

Па небе плыў, амаль што бег месяц, была ноч, свяцілі то тут, то там, прарэзаўшыся праз рэдкія хмары, зоры. І было неяк надта ж няўтульна, холадна. Холадна і ў лесе, і на душы. І яшчэ — адзінока. Так адзінока, што хацелася выць. Выць і плакаць. Выць і плакаць доўга-доўга, бесперастанку, бясконца...

Потым, усяго праз які тыдзень ці два, падзьмуў паўднёвы вільготны вецер. Снег пачаў імкліва макрэць, асядаць, набракаць вадою. У небе ўсё часцей і часцей паказвалася сонца. Агаліліся, зачарнелі зямлёю спіны пагоркаў, а ў балацявінах і лагчынах забулькаталі ручаі, расплыліся лужыны. Прайшоў яшчэ нейкі час, і з выраю вярнуліся дзікія качкі, прыляцелі іншыя птушкі. Лес ажыў. Спярша дзенідзе, а потым усё гусцей і гусцей зазелянелі трава, голле дрэў. І яна, Падгалая, цяпер не-не дый ласавалася мясам. То схопіць якую-небудзь разяваку-птушку, то натрапіць на мышынае ці кацінае гняздо, то набрыдзе на ранні вывадак. Неяк, асмялеўшы, яна паспрабавала зрабіць налёт нават на поплаў, дзе непадалёку ад вёскі папасваліся свінні. Учапіўшыся зубамі ў гарляк ашалелага ад перапуду парсюка-асенчука, загнала яго ў алешнік і там распарола яму ікламі жывот. І ўжо ела мяса — колькі прымала душа. З'ела спачатку пячонку, лёгкія, сэрца, потым астатняе ела. Ела, не чуючы асаблівага смаку, аж пакуль не набіла сабе трыбух. На шчасце, прапажу парсюка ніхто адразу не агледзеў, бо і не было нікога з людзей на поплаве.

К вечару ў яе разбалеўся жывот. Яна была падумала: жывот баліць таму, што пераела,— не дзіва, умяць гэтулькі мяса! Паспрабавала адрыгваць кавалкі, але боль усё адно не мінаўся. І тады яна зразумела — боль зусім ад іншага. І ў тым, што яна не зразумела адразу, адкуль і які гэта боль у яе ў жываце, віною былі яе маладосць, нявопытнасць —

яна, Падгалая, упершыню ў сваім жыцці павінна была стаць маці. Ледзь дабрыла да таго месца, якое нагледзела ўжо раней, калі блукала па лесе ў пошуках хоць якой-небудзь яды. Месца гэтае выбрала яна таму, што блізка была вада,— а яна так неабходна малым дзецям, асабліва калі пачнуць падрастаць і будуць самі есці мяса. Не вадзіць жа дзяцей на вадапой за некалькі пераходаў. Дый месца тое было даволі скрытнае — пад вываратнем, у заглушы хвойніку, верасу і багуну. Тое, што блізка была там дарога, не палохала Падгалую — па дарозе часта бегалі, натужна равучы і смуродзячы дымам, нейкія дзіўныя пачвары. Што ж да людзей, дык яны хадзілі тут рэдка. У гэтым Падгалая паспела пераканацца, наведваючыся час ад часу пад выварацень. Дый месца гэтае нічым не прывабнае, мокрае, глухое і дзікае...

У тую ж ноч, нацягаўшы пад выварацень леташняй жухлай, сухой травы, дробнага ламачча і моху, Падгалая, курчачыся ад болю, нарадзіла сямёра ваўчанят...

З тыдзень яна, Падгалая, пралежала ў лагве, нікуды не адлучалася ні на хвіліну — саграваhа целам ваўчанят, карміла, паіла іх сваім малаком. Але хутка яе пачаў даймаць голад, яна адчула дзіўную млявасць ва ўсім целе, слабасць. Уваччу раптам цямнела, і яна правальвалася, быццам у прорву, у сон. Калі ж ачыналася, у галаве было мутарна. Падымалася на ногі, яе вяло ў бакі. Ды і не было малака, ваўчаняты злосна рвалі, цягалі цыцкі, хочучы насыціцца. І тады яна зразумела — ляжаць ёй у лагве, быць увесь час з дзецьмі нельга... Трэба кудысьці ісці, трэба шукаць хоць чагось паесці. Успомніўся зноў Палена-Хвост, яго бязглуздая смерць. «Жыў бы Палена-Хвост, не даводзілася б пакідаць на волю лёсу сваіх дзяцей. Прынёс бы паесці і мне, і дзецям... А так... Хіба ж я не перасцерагала яго, хіба ж не падказвала... Не, палез сослепу ў тую аўчарню, надта на сілу сваю спадзяваўся»,— каторы раз і аблаяла, і пашкадавала яна Палена-Хваста.

Спярша яна, Падгалая, не адыходзілася далёка ад вываратня. Адбяжыцца крокаў на колькі — і назад, да ваўчанят. «Як, як яны там, адны, без мяне?» Вернецца ў лагво, ляжа, сагрэе, дасць ваўчанятам патузаць сябе за цыцкі — і зноў падымаецца на ногі, зноў бяжыць. Нюхае, шукае, дзе б што схапіць, спажыць, каб не мучыў, не смактаў так голад. Ела, глытала, не вельмі разбіраючыся, усё, што траплялa на вочы,— парахню, птушыныя яйкі, мышэй... Неяк ёй згадаўся той парсюк, якога яна загнала ў алешнік і там асвежавала. І хоць гэта было не так і блізка ад лагва, яна ўсё ж пабегла. Пабегла не ўдзень — удзень пакідаць адных ваўчанят у лагве не асмелілася,— а ўвечары, калі прымеркла, пашарэла. Спачатку трухала па лесе, потым выскачыла на поле. Поле было засеяна жытам, жыта парасло даволі высокае і густое, і бегчы па ім было цяжка. Таму Падгалая збочыла ў лужок і пакралася да алешніку лужком. Было ўсюды ціха, цёпла і быццам трывожна. Перад поплавам Падгалая спынілася, чуйна панюхала паветра — не, здаецца, нідзе нікога няма, ніхто яе не падсцерагае. Шуснула ў алешнік, без асаблівай цяжкасці адшукала тое месца, дзе яна разарвала парсюка. Адшукала па паху, бо астаткі яе пачосткі загніліся і вельмі ж смярдзелі. Але Падгалая на гэта не зважала — ела, што трапляла ёй у рот. Нават кавалак сцегняка ўхапіла ў зубы і панесла з сабою. «Хай... Дзецям будзе чым забаўляцца...» Трухала — і дзівілася сама з сябе: ні трывогі ніякай на душы, ні боязі. «Вось што значыцца быць паеўшы,— зазначыла для сябе Падгалая.— Можа, і Палена-Хвост быў такі самаўпэўнены, бо ніколі не галадаў...»

Бегла Падгалая да сваіх дзяцей, і разам з ёю ў цішы ночы бег круглы, як разрэзаны кавун, месяц, беглі, мітусіліся зоры...

Ішлі дні, ваўчаняты дужэлі, падрасталі, у іх пачыналі праразацца вочы. І Падгалая, каб знайсці што паесці, усё далей і далей адбягала ад свайго лагва. Іншы раз ёй шанцавала, яна натрапляла на качыны ці гусіны вывадак. Тады,

наеўшыся ўволю, яна думала пра той час, калі падрастуць дзеці, калі яна павядзе іх на паляванне, будзе вучыць, як падпільноўваць жывёліну ці птушку і кідацца маланкай, хапаць зубамі. Бывалі дні, калі Падгалай не шанцавала, і тады думкі яе былі змрочныя, невясёлыя. Асабліва калі ліў, не перасціхаючы, дождж. Тады Падгалая зноў і зноў успамінала Палена-Хваста і кляла, папракала яго. «Можа, з тых ваўкоў, каго ён парваў, трапіўся б лепшы... Ва ўсякім разе, можа, не лез бы напралом, жыў бы, не аставалася б я адна з дзецьмі... А то і іх пільнуй, і яду шукай... Дык гэта ж ваўчаняты малыя... А як падрастуць, пачнуць есці мяса? Дзе я набяруся яго, каб пракарміць гэткую плойму? Тут каб самой пад'есці, бывае, цэлы дзень шастаеш па лесе... А то — яшчэ сем глотак, сем жыватоў...» Прыходзілі нават думкі — ці выкарміць яна адна сямёра ваўчанят, ці не падохнуць яны з голаду... Але міналіся дзень, ноч, ваўчыца знаходзіла што паесці, наядалася ўволю — і гэтыя думкі забываліся, адыходзілі, быццам іх і не было. Зноў яна думала пра той час, калі падрастуць ваўчаняты, калі яна прыйдзе ў гайню разам з імі, калі за яе зноў будуць кусацца і рваць адзін аднаго ваўкі-самцы. І зноў, пэўна ж, пераможа самы дужэйшы, і зноў забярэ яе, павядзе за сабой. «Толькі цяпер я буду не такая, як была, а разумнейшая, больш разважлівая, абачлівая. Буду не толькі самца слухацца, паддавацца цалкам яго волі і настрою, а дамагацца, каб і ён мяне ў сім-тым слухаўся... За лета я ад'емся, пасыцею, выліняю, буду зноў лёгкая і прывабная...»

Думкі-мары памагалі Падгалай жыць, расціць ваўчанят. Іншы раз, задумаўшыся, яна бегла і бегла, забываючы, куды яна выкіравалася і чаго. Так было і ў той ясны, сонечны дзень. Вярнуўшыся на світанні да ваўчанят, накарміўшы і сагрэўшы іх, яна падрамала трохі і сама. А потым, прачнуўшыся, успомніла, што, вандруючы аднаго дня па лесе, ля капы леташняга сена напаткала казу. Каза была тоўстая, непаваротлівая, яе можна было аж надта лёгка ўпаляваць. Але за казою яна, Падгалая, тады

не пагналася — была якраз наеўшыся, сытая. «А што, калі збегаць сёння да той капы сена?.. Можа, каза і цяпер там?..» І, як толькі ўзышло, прыгрэла сонейка, спала трохі раса, Падгалая была зноў на нагах — бегла да таго лужка, дзе напаткала аднойчы казу. Па дарозе трапіўся ёй на вочы заяц, і яна пагналася за ім. Заяц перахітрыў Падгалую, бег, бег — і раптам дзе і падзеўся. Знік, як усё адно ў ваду кануў. Як ні шукала яго ваўчыца, як ні прынюхвалася, хочучы зноў натрапіць на заечы след,— гэта ёй не ўдалося. Вярнулася на бор, прайшлася яшчэ раз па заечых слядах. І зноў іх згубіла. Раззлавалася, абабегла наўкруг мох, дзе, яна ведала, жылі бабры. Пачуўшы ўсплёскі, доўга ляжала ў кустах, чакала, што бабёр вось-вось вылезе на бераг, і тады б яна... Не, бабёр не вылез на бераг, а, пабоўтаўшыся, паплёхаўшыся ў вадзе, вярнуўся назад да свайго жытла. Стала зноў ціха-ціха — ці не ўклаўся бабёр спаць...

Падгалая яшчэ трохі паляжала, адчуваючы ўсім сваім целам прыемнасць сонечнага цяпла, і зноў паднялася на ногі, зноў пабегла.

«Ваўчанят да мяса прывучаць трэба. У вёску б наведацца. Там цяпер усялякага маладняку хапае. І цяляты, і ягняты, і парасяты, і гусяняты, і качаняты, і кураняты... Паганіся за чарадою — абавязкова нешта зловіш, нешта трапіць на зуб». Але не, яна галаву яшчэ мае... У вёску яна, вядома, пойдзе, ды не цяпер, не цяпер... Варта ёй зрабіць нешта не тое, нашкодзіць, і людзі пойдуць з сабакамі па яе слядах... Сама яна, можа, і ўратуецца як-небудзь. А ваўчаняты... Ваўчаняты загінуць. Гэта самае апошняе — ісці цяпер у вёску, ды яшчэ ў бліжэйшую. Але няхай, няхай... Вось падрастуць ваўчаняты, тады яна пойдзе, вядома, і ў вёску. Трэба ж ім, ваўчанятам, паказаць, як красці ў людзей жывёлу, трэба навучыць... Многаму трэба іх навучыць. Бо наперадзе... Наперадзе ў іх жыццё! Жыццё-ё!

Уявіла, як будзе ісці яна разам з ваўчанятамі ў вёску. Паперадзе, пэўна, будзе ісці яна сама, а па баках, ззаду, адстаўшы на які крок,— яны, яе дзеці. Дужыя, гладкія, вя-

лікія, амаль што дарослыя. Дарма што без бацькі, Палена-Хваста, а... У-у, пападзіся тады ім хто на дарозе, няхай карова, конь ці нават сам чалавек...

Аж кляцнула зубамі, завыла, уявіўшы, што будзе тады, калі яна ісціме з ваўчанятамі ў вёску і трапіцца хто-небудзь ім на дарозе. «Не я, не мы будзем уцякаць, а ён... Ды яшчэ як, як будзе ўцякаць! Не адзін жа воўк, не адна я, ваўчыца, а цэлая гайня!.. Ды мы гуртам усё адно дагонім яго. Не ўцячэ-э! Дагонім і абложым. Абавязкова абложым. Гэта не цяпер, калі я адна. Зусім, зусім адна...»

Так, думаючы то пра адно, то пра другое, Падгалая бегла і бегла па лесе. Пра казу, пра тое, што хацелася яе ўпаляваць, неяк само сабой забылася. Успомніла пра гэта, калі адбеглася даволі далёка ад таго лужка і капы сена, дзе бачыла казу. Вярнулася, прабегла па лужку, абнюхала траву. На траве знаць былі казіныя сляды, па паху Падгалая здагадалася, што каза папасвалася вось тут, на лузе, нядаўна. Можа, нават сёння раніцою. Узяўшы след, пабегла туды, куды вялі казіныя сляды. Мінула невялікі рэдзенькі лазнячок, алешнік, перабегла па арэшніку дубнячок і... і апынулася на лясной паляне. Пачула — нешта зашастала ў бліжэйшых кустах.

«Каза?!»

Шмыгнула туды, у тыя кусты. Сапраўды, у кустах арэшніку стаяла рыжая каза і аблізвала языком такое ж рыжае, як і сама, казлянятка, якое, падняўшы палахліва галаву, ляжала ў траве. «Ты глядзі, яна, аказваецца, паспела займець малое!» — узрадавалася, павесялела ваўчыца. Каза, мабыць, пачула нешта нядобрае, бо павярнула ў той бок, дзе была Падгалая, галаву, застрыгла вушамі. Устала на ногі і казлянятка. Яшчэ хвіліна — і каза, а ўслед за ёю і казлянятка кінуліся наўцёк. Іншым разам ваўчыца не пагналася б за казою, а залегла б вось тут, у кустах, ля паляны. Ведала — каза мае дурную звычку вяртацца на тое месца, дзе яе нехта спалохаў. Мусіць, звычайная цікаўнасць — паглядзець, хто ж яе прагнаў. Але цяпер Падгалая не стала

хавацца ў кустах і чакаць. Каза з малым казляняткам далёка не ўцячэ. А тым больш калі Падгалая за імі пагоніцца. Сама каза, можа, і ўцячэ. А казлянятка...

Падгалая кулём кінулася за казою. Замільгалі галінкі кустоў, дрэвы, высокая леташняя трава. Хвіліна, яшчэ хвіліна — і Падгалая пачула пах малака і цёплага жывога мяса. Каза прыпусціла з усіх ног, забылася і на казлянятка. А можа, і не забылася, ратавалася як магла сама. Казлянятка памкнулася за маці, але ў яго не было яшчэ сілы, дужасці, спрыту, і яно адстала. Падгалай нічога не аставалася, як дагнаць яго, зубамі ўпіцца ў горла, паваліць...

Прайшло вельмі мала часу, а Падгалая ўжо рвала маладое цельца, глытала яшчэ цёплае мяса. Глытала разам са скурай, поўсцю. Наглытаўшыся, наталіўшы голад, успомніла пра ваўчанят. «Пара, даўно пара іх прывучаць да мяса. Бо што ім адно малако? Дый... Не хапае яго ім на ўсіх. Вазьму астаткі ў зубы, завалаку да лагва. Бо пакідаць тут... Не, не варта пакідаць...»

Рэшткі, што асталіся ад казляняці, яна схапіла ў зубы і павалакла па траве. Ісці з рэшткамі казляняці ў зубах не так лёгка, як бегчы ўлегцы адной. Казляня чаплялася за траву, за кусты, даводзілася час ад часу спыняцца, адпачываць. Але Падгалая ўсё адно не кідала казляняці, цягнула, упарта цягнула яго за сабою...

Каля вываратня, пад якім было лагва, Падгалая спынілася, кінула казляня, насцярожылася — пахла чалавекам!

«Няўжо хто хадзіў тут? А можа, і цяпер ён...»

Адскочыла ў хвойнік, пастаяла там, прынюхваючыся яшчэ больш засяроджана, уважліва.

«Так, пахне чалавекам. Чаго ён тут быў, той чалавек, што прывяло яго сюды? Здаецца ж, я была такая асцярожная. Няўжо дзе памылілася, зрабіла тое, што не трэба было, не трэба было рабіць? А можа, чалавек забрыў сюды выпадкова?»

Шмыгнула пад вываратань і...

Не, яна не разгубілася, не заплакала, не ўбачыўшы ў лагве сваіх дзяцей. Не разгубілася, не заплакала, бо не паверыла, што ваўчанят пад вываратнем няма.

«Яны кудысь пахаваліся, пачуўшы поблізу чалавека. Можа, пазапаўзалі ў якую нару?»

Яна абабегла, абнюхала навокал дрэвы, кусты — ваўчанят не было.

«Няўжо той, хто хадзіў тут, знайшоў іх і забраў?..»

Усё яшчэ не верачы ў тое, пра што яна толькі што падумала, Падгалая пабегла па слядах таго чалавека, які хадзіў тут, ля вываратня, і які, можа, вельмі можа быць, забраў яе ваўчанят, дакараючы сябе, што сёння яна забавілася — захапілася паляваннем і доўга не вярталася да свайго лагва...

Не, чалавека, як ні высільвалася, ваўчыца не дагнала. Можа б, і дагнала, каб не збаялася бегчы па голым полі ў вёску. Але ж быў дзень, яе маглі ўбачыць людзі. І тады б... Рызыкаваць?.. Не, Падгалая не асмелілася на такое. Каб хоць не бачыла, як забівалі Палена-Хваста, можа б, і асмелілася... А так...

Вярнулася да лагва, яшчэ раз абабегла, абнюхала вываронень, старадрэвіну — ваўчанят нідзе не было.

«Значыцца, іх забраў, панёс некуды чалавек. Той чалавек, што хадзіў, быў тут...»

Пабегла зноў па слядах таго чалавека. І зноў, дабегшы да поля, вярнулася назад на ўзлесак. Не зводзячы вачэй з вёскі, Падгалая да самага змярку прасядзела ў зарасніках, мяняючы час ад часу сваю схованъ. Але нават калі і змерклася, жыццё ў вёсцы не аціхала. Кудысьці ехала, натужна равучы і свецячы сваімі жудасна-сляпучымі вачыма, тая смярдзючая пачвара, што ездзіла і праз лес; потым нехта спяваў, іграў гармонік. Ды Падгалая чакаць больш не магла, не хапіла цярпення — пакралася паціху па слядах таго чалавека, які быў ля вываратня і які — цяпер у гэтым яна была перакананая — забраў ваўчанят.

Перабегла поле, па сцежачцы цераз бульбу пашылася да агароджы. Знайшла дзірку ў плоце, уціснулася ў яе. Паціху дайшла да хаты — на шчасце, у двары не было сабакі. Сабакі былі ў суседніх дварах, яны гаўкалі, аж екаталі, ірваліся з ланцугоў. Але што зробіш — жаданне ведаць, дзе ваўчаняты, было мацней за страх.

Ваўчанят Падгалая хутка пачула — яны былі ў хаце, там, дзе жыў і сам чалавек. І жывыя. Жывыя! Ад радасці Падгалая кляцнула зубамі, завурчала. Ваўчаняты пачулі яе голас, завурчалі таксама. Яна ўлавіла нават іхнюю неспакойную, трывожную валтузню.

«Калі яны мяне чуюць, то, пэўна ж, чуе мяне і той чалавек!»

Адбегла ад хаты, схавалася за хлеў. У хляве затупацела, устаючы на ногі, карова, віскнула свінчо.

«Яшчэ, чаго добрага, гаспадар выйдзе на двор...»

Мітнулася далей ад хлява, пасядзела ў бульбе. Потым, калі ў вёсцы ўсё зусім аціхла, нават не гаўкалі сабакі, падкралася зноў да жылля чалавека, да той хаты, дзе былі цяпер яе дзеці — ваўчаняты. І зноў, пачуўшы іх неспакойную, трывожную валтузню, спалохалася, патрухала за хлеў, схавалася ў бульбу...

Перад світаннем, калі на ўсходзе пачало святлець неба, Падгалая, наблізіўшыся яшчэ раз да таго месца, адкуль чуваць была валтузня ваўчанят, адбеглася ад вёскі, вярнулася ў лес, да вываратня, у сваё лагва. Легла, але тут жа адразу зноў падхапілася на ногі — ляжаць адной у лагве было сумна — прывыкла яна ўжо быць з ваўчанятамі, варочаць то адно, то другое лапаю, кусаць нямоцна за вушы, куляцца разам з імі, тузацца. Без ваўчанят было маркотна, мутарна, няўтульна. Ды і малако распірала, аж паліла цыцкі. І Падгалая, пастаяўшы яшчэ хвілін колькі ў лагве, раптам успомніла той алешнік, дзе яна не так даўно асвежавала парсюка, і пабегла туды, у той алешнік. Чаму яна пабегла, што яе туды пацягнула — яна і сама не ведала.

Можа, пабегла таму, што ад алешніку блізка была вёска і тая хата, дзе цяпер ваўчаняты. А можа... Можа, вёў туды яе звярыны інстынкт.

Седзячы ў алешніку, яна чула, як да той хаты, дзе былі яе ваўчаняты, пад'ехала падвода. Потым, праз нейкі час, вынеслі з хаты ваўчанят. Ваўчаняты вурчалі, валтузіліся, чмыхалі... Усё гэта Падгалая добра чула. Чула і не абзывалася — баялася абзывацца. Яшчэ трохі спагадзя колы падводы пакаціліся па дарозе, выехалі на грэблю, пабеглі далей, далей — у лес. Пабегла ўслед за падводаю і яна, Падгалая. Не пры самай падводзе, а так, зводдалі, каб не бачыў яе чалавек, не чуў конь.

«Куды, куды вязуць маіх ваўчанят? Што, што з імі думаюць рабіць?» — мучылі Падгалую трывожныя думкі.

Пра тое, каб ратаваць ваўчанят, выбавіць іх з няволі, неяк не думалася. Не думалася, мабыць, таму, што яна, Падгалая, ведала — саўладаць з чалавекам, ды яшчэ калі ў таго чалавека ў руках вострая сталь ці тая палка, якая рыгае агнём, яшчэ ні аднаму ваўку не ўдавалася...

Дзень пагоднеў, падымалася вышэй і вышэй у неба сонца, пачынала прыпякаць. Дарога, мяккая, калясная, то віхляла па лесе, то выбягала на поле, і тады Падгалай даводзілася рабіць добрага кругаля хмызамі, каб дагнаць недзе зноў у лесе тую падводу, на якой везлі — куды, яна не ведала, не магла ведаць — ваўчанят. Хацелася есці, хацелася піць, малако агнём паліла цыцкі. Падгалая быццам забыла на ўсё гэта — бегла і бегла...

Ля вялізнага абсягу поля, на якім нешта расло, зелянела і за якім чуваць быў вялікі рух — там, мабыць, было незнаёмае яшчэ адно чалавечае паселішча,— Падгалая спынілася. Бегчы далей?.. Але як, як бегчы, калі блізка людзі, а навокал — ні кусціка, ні дрэўца: голае поле. «Хіба пасядзець, пачакаць?» Чаго сядзець, чаго чакаць, ваўчыца не ведала. Аднак жа хоць і не ведала, але, падцяўшы хвост, залегла ў кустах...

Паляжаць Падгалай доўга, да самага вечара, як спачатку яна меркавала, не ўдалося — неўзабаве, як толькі звярнула з паўдня сонца, сярод гурчання пачвар, тупату конскіх ног і ляскату мноства, вялікага мноства колаў падвод яна ўлавіла ляскат колаў той падводы, на якой не так даўно везлі кудысь яе ваўчанят. Ляскат колаў гэтай падводы яна не магла не вылучыць, не пазнаць, бо чула гэты ляскат доўга-доўга, аж цэлую, як здавалася, вечнасць, ён стаяў, застыў у яе вушах. Асабліва нейкае шорханне разпораз — ці не кола датыркалася да чагосьці сухога.

Падхапілася, пабегла — нібы ветрам яе здзьмула.

На падводзе не было ваўчанят... Гэта яна зразумела, пачула адразу ж...

«Дзе, дзе яны?»

Падгалая яшчэ некаторы час бегла за падводай — можа, памылілася, можа, ваўчаняты ўсё ж там, на падводзе?

Не, на падводзе ваўчанят не было.

«Дзе, дзе яны? І што, што рабіць мне, іх маці? Бегчы ўслед, туды, куды едзе падвода, ці астацца, сядзець тут, чакаць?»

Чаго сядзець, чаго чакаць — Падгалая не ведала, хоць і адчувала — трэба сядзець, трэба чакаць, нікуды, нікуды адсюль не бегчы.

Адстала ад падводы, вярнулася назад на ўзлесак...

Калі схавалася сонца, цемра, ноч ахінулі зямлю і патроху пачалі аціхаць людскі галас і рух, Падгалая выбегла на дарогу, патрухала, патрухала па ёй — патрухала туды, куды не так даўно везлі ваўчанят і дзе яны, ваўчаняты, мабыць, асталіся. Дарога была шырокая, каляіністая, па ёй хто толькі не ездзіў, не хадзіў. Самыя розныя сляды і пахі чуліся тут. Але паху ваўчанят, як ні намагалася Падгалая, не ўлавіла — няйнакш ён згубіўся, растварыўся ў іншых пахах, а мо і выветрыўся. Ды Падгалая ўсё адно не спынялася, трухала, трухала, пыліла і пыліла па дарозе. Вось ужо і гароды, канцавыя хлявы, хаты. Абабегла, чуйна абнюхала

іх — ці няма дзе-небудзь тут, у гэтых хлявах і хатах, ваўчанят — і папыліла, патрухала далей, далей. Здзівіла Падгалую, што і ўночы на вуліцах было светла, як удзень, што вуліцы не пясчаныя, парослыя травою, як у вёсках, а цвёрдыя, укладзеныя каменнем. Мусіць, па гэтых вуліцах надта шмат бегала тых смярдзючых пачвар, што іншы раз, страшэнна равучы, бегалі цераз лес, бо ўсюды вельмі ж імі пахла. Таму, можа, паху ваўчанят, як Падгалая ні прынюхвалася, пачуць ніяк не магла — ён згубіўся ў размаітых пахах вялікага людскога паселішча. І тады, страціўшы надзею і пачуць яго, Падгалая надумала не шукаць паху ваўчанят на дарозе, а абягаць людскія двары і абнюхваць іх. Двор за дваром, хату за хатай. Праўда, як хутка ваўчыца пераканалася, людскіх двароў і хат тут было многа, аж надта многа. Не ўсе хаты былі драўляныя. Сярод іх былі і мураваныя, высозныя. Хоць гэтыя хаты былі і не агароджаныя, пачуць што-небудзь тут не ўдавалася — надта ж тоўстыя, мабыць, былі сцены, дый людзі жылі высока ад зямлі. І ўсё ж Падгалая не мінала і такіх хат, аббягала, абнюхвала і іх. Разоў колькі яна нарывалася на сабак, тыя падымалі жудасны гвалт. Стаіўшыся, яна чакала, калі сабакі сціхнуць, потым бегла далей.

За ноч Падгалая абабегла шмат двароў, хат і вуліц, стамілася, ледзь ногі перастаўляла. Ды ваўчанят усё адно не знайшла.

«Можа, яны там, там!» — думала яна і бегла, бегла, далей і далей.

Але і там, у наступным двары, у наступнай хаце ваўчанят не было...

...На світанні Падгалая пакінула людское паселішча, вярнулася ў лес. Залегла там, у кустах, а як толькі зноў змерклася, насунулася ноч, пабегла назад, зноў у людское паселішча...

Гэты раз Падгалая была яшчэ смялейшая, пранікала туды, куды раней ніколі не асмелілася б пранікнуць,— ноч памагала ёй, як на тое, надышла навальніца, грымеў, аж калацілася ўсё навокал, раз-пораз гром, бліскала маланка, і ліў, ліў бы з вядра дождж. Але як ні старалася, як ні

ўлягала ваўчыца, як яна ні прынюхвалася да кожнага двара, кожнае хаты — ваўчанят сваіх так нідзе і не знайшла і ў гэтую ноч...

Мокрая, стомленая, раніцою вярнулася яна зноў у лес...

І зноў, калі змерклася, цемра ахінула зямлю, Падгалая пабегла ў людское паселішча...

І зноў гэтак жа, як і раней, раніцою ні з чым вярнулася ў лес...

На чацвёртыя ці пятыя суткі, ababегшы, абшастаўшы ўсе двары, абнюхаўшы ўсе хаты і хлявы, ледзь жывая ад стомы і голаду, ваўчыца зразумела нарэшце, што яна шукае ветру ў полі,— ваўчанят яе няма. Няма-а!.. А хоць дзе і ёсць яны, іх яна не знойдзе, не ўбачыць. Ніколі, ніколі ўжо не ўбачыць. Не ўбачыць такіх ласкавых, цёпленькіх, пухнаценькіх ваўчанятак...

...Ваўчыца гучна, са злосцю і крыўдаю кляцнула зубамі, і... слёзы, здаецца, самі паліліся з яе вачэй...

Яшчэ праз некаторы час, можа, праз дзень, а можа, праз два-тры, людзі бачылі гэтую ваўчыцу — яна то трухала кудысь па дарозе, то раптам сярод белага дня ўрывалася ў чараду авечак, кароў, а то і ў чый-небудзь хлеў... І што самае дзіўнае — ваўчыца была сама галодная, перахлябістая, худая, бы дошка, але нічога, ані нічога не ела. Толькі душыла... Душыла коней, кароў, авечак, свіней і так, нават не праглынуўшы, не спажыўшы і кавалка, пакідала... І тады ад хаты да хаты, ад вёскі да вёскі папаўзла чутка пра нейкую несамавітую, мусіць, кручаную ваўчыцу — «Рыжую смерць», якая нішчыць усё жывое, што толькі трапляе ёй на вочы. Людзі, напалоханыя, запрымеціўшы нешта падобнае на ваўчыцу, кідаліся наўцёкі — хто куды...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

У той дзень Іван прачнуўся рана. Прызнацца, ён збіраўся зусім не спаць. Надта ж нядобрыя, трывожныя чуткі

хадзілі апошнім часам у наваколлі пра нейкую несамавітую, кручаную ваўчыцу — «Рыжую смерць», якая давіла, душыла без разбору ўсё, што толькі трапляла ёй на вочы. Вядома, ніхто пэўна не мог сказаць, што гэта тая ваўчыца з Чортавай Ямы, у якой ён, Іван, забраў ваўчанят. Папершае, чаму ваўчыца адна, калі ваўкоў павінна быць двое? Па-другое, чаму ваўчыца лютуе ў Ельніках і каля Ельнікаў? Калі б гэта была тая ваўчыца з Чортавай Ямы, у якой ён, Іван, забраў пад вываратнем ваўчанят, то, напэўна, воўчую злосць адчула б на сабе найперш іхняя вёска, Панюкі. А то ж... Але тым не менш па начах Іван амаль не спаў. Звечара хадзіў па вёсцы з Нінаю, потым, правёўшы яе дахаты, вяртаўся дадому і сядзеў з сякераю ля свайго хлява, аж пакуль не пачынала світаць. Тады, толькі тады вяртаўся ў сваю хату, распранаўся і клаўся ў пасцель. Пра хату, пра тое, што пара яе перасыпаць, склікаць талаку, неяк не думалася.

Маці смяялася з Івана.

— Не мела баба клопату, дык купіла парася. Так і ў цябе. Не браў бы тых ваўчанят — і жыў бы анігадкі.

— Ды нельга было іх не браць! — апраўдваўся перад маці Іван.— І закон нават такі ёсць — калі хто знайшоў воўчае лагво, павінен знішчыць ваўчанят.

— Хто б ведаў, знайшоў ты тое лагво ці не знайшоў...

Іван не спаў, не спаў па начах дый не вытрымаў. Правёўшы з пагулянкі Ніну, пасядзеў нейкую гадзіну ля свайго хлява, паслухаў, як мірна жуе жвачку карова ды храпе ў свінушніку, наеўшыся бабоўніку, парсюк, і пайшоў у хату. «Спаць не буду, трохі хіба паляжу на пасцелі, хоць цела выпрастаю». Лёг на пасцель, замгнуў вочы... А расплюшчыў — у хаце светла, белы дзень у вокны глядзіцца. Апрануўся — і бягом на падворак.

Адчыніў вароты ў хлеў і аслупянеў: пасярод хлява ляжала, нямогла адкінуўшы галаву, акрываўленая, з вывернутым сінім трыбухом, карова, нежывая ўжо, халодная...

«А-а!» — застагнаў Іван.

Не помнячы, што ён робіць, ступіў крокаў колькі ў бок ад каровы, зазірнуў у загарадку, дзе днявала і начавала цяля. І яшчэ больш зжахнуўся — цяля ляжала таксама нежывое, з разарваным, акрываўленым горлам...

Сам не свой, павалокся Іван да свінушніка. Адчыняць дзверы, каб паглядзець, што ў свінушніку, не трэба было. І так усё было відаць — страха была прадраная, і праз дзірку Іван убачыў распластанага, ужо апруцянелага, парсюка...

Чорны, як ноч, вярнуўся Іван у хату. Маці, убачыўшы сына, спалохалася.

— Што? — спытала яна.

Іван нічога не адказаў.

І тады маці, прадчуваючы бяду, як ляжала ў адной начной кашулі ў пасцелі, не расчасаная, распатланая, усхапілася на ногі і пабегла басанож на падворак. Загаласіла, запрычытала праз якую хвіліну:

— А што ж гэта нарабі-ілася-я, а за што ж мяне так пакара-алі-і...

На крык маці збегліся ў двор людзі. Заходзілі ў хлеў, заглядвалі ў свінушнік. Айкалі, ахалі, уздыхалі, ішлі адчыняць свае хлявы, свае свінушнікі — можа, тое самае і там?

Прыехаў на сваім «газіку» старшыня, Павел Пятровіч Абадушка. Пахадзіў па двары, зазірнуў у хлеў, у свінушнік. Сказаў Івану і яго маці, Ганне:

— Не бядуйце! Выдзелім вам карову. Ага, выдзелім. І парсюка з калгаснай фермы дадзім. Ага, дадзім! А што да ваўкоў... Не жыць ім! Ага, не жыць! Сёння ж увесь калгас на ногі пастаўлю, ноч спаць не будзем! Не можа быць, каб мы не ўходалі. Ага, не можа быць!

Падгалую — «Рыжую смерць» — падпільнавалі і забілі тыдні праз два. Удзень, калі яна, пабываўшы ў многіх людскіх дварах і нарабіўшы там шкоды, кралася да калгаснай кашары. Худая, аблезлая, яна не ішла да кашары, а паўзла. Забіць яе было не цяжка, бо ваўчыца і бегаць,

відаць, ужо не магла ад слабасці. Тыя, хто забіваў ваўчыцу, расказвалі потым, што была яна страшная, лютая ў сваёй апантанасці і злосці. Вочы яе глядзелі холадна, рот быў ашчэраны, а іклы бялелі, пагрозліва блішчалі...

Вопытныя паляўнічыя сцвярджалі: ваўчыца нічога не ела з таго дня, як забралі ў яе ваўчанят. Толькі давіла, душыла жывёлу, ірвала ўсё, што трапляла на вочы...

## Вераніка

### 1

Нават ужо ў самалёце, які, імкліва набіраючы вышыню, падымаўся за аблокі, каб там, у неабсяжнай прасторы неба, легчы на свой курс, Глеб не быў яшчэ да канца ўпэўнены, ці правільна робіць, што ляціць туды, куды столькі гадоў не асмельваўся паказваць і носа. Вядома, нічога непапраўнага быццам не было, можна ж, не позна пакуль і назад вярнуцца, не рабіць, што надумаў. Скажам, пахадзіць, паблукаць па вуліцах і завулках, дзе хадзіў, блукаў некалі... А то і не хадзіць, не блукаць — адразу ж з аэрадрома паехаць у касу аэрапорта, узяць білет на зваротны рэйс. І забыць, не ўспамінаць больш ні горада сваёй маладосці, ні таго, што... Эх, каб можна было тое забыць, не ўспамінаць! Дык не ж, не забываецца, успамінаецца. Ды яшчэ як, як! І з цягам дзён, з гадамі ўсё часцей, вастрэй — за жывое бярэ, сэрца сціскае, аж трываць нельга. Дый думкі... Круцяцца, верцяцца, не даюць ні на чым іншым засяродзіцца. І выкінуць з галавы тое... Не, не ўдаецца, ніяк, ніяк не ўдаецца. Вось і цяпер, ледзь сцішыўся, вочы замгнуў, і...

...«Тое», што мучыла, пазбаўляла сну і спакою, пачалося даўно, вельмі даўно. Тады Глеб вучыўся ў інстытуце, жыў на прыватнай кватэры — наймаў пакойчык на ўскраіне

горада ў бадай што самай зялёнай і ціхай яго частцы — Сапяжанцы. Сапяжанка — звычайная вёска, але, растучы і пашыраючыся, горад паступова набліжаўся да яе, ды яшчэ не захапіў, не праглынуў. Таму ўклад жыцця тут аставаўся амаль ранейшы, вясковы. Людзі, хоць многія і працавалі на заводах і фабрыках,— ураблялі поле, гароды, трымалі кароў, свіней, качак, курэй, гусей і самі нават знешне мала былі падобны на гараджан.

Да Сапяжанкі падыходзіла, як бы агінала, апаясвала яе, шырокая рака, зарослая па баках аерам, невысокім купчастым лазняком, рачкаватымі, пахілымі да вады вербамі. Хата, дзе наймаў пакойчык Глеб, стаяла пры самым беразе, ля старога моста, які злучаў Сапяжанку з горадам. І ён засынаў і прачынаўся заўсёды пад тупат ног ці грукат колаў па гулкім драўляным насціле, у сухое надвор'е ядраным, у сырое — ціхім, глухім. Але не гэта, не гэта хвалявала яго, займала думкі. У хаце, за перагародкаю, зусім побач, у такім самым пакойчыку, што і ў яго, жыла Ліза. Хто яна была гаспадарам, Глеб не ведаў. І засынаючы і прачынаючыся, ён слухаў, лавіў кожны шолах з-за перагародкі: вось Ліза зайшла ў пакой, зняла з сябе плацце, патушыла агонь, хуценька лягла, упала на пасцель... Ці — вось яна прачнулася, апранаецца, кудысьці спяшаецца, ідзе, амаль што ляціць... Ліза таксама, як і ён, вучылася ў інстытуце, толькі не на настаўніка, а на медыка. З першых дзён, як пасяліўся Глеб у гэтай хаце, у яго завязаліся з Лізай нейкія незразумелыя, дзіўныя адносіны. Сустракаючыся, яны адно аднаму ўсміхаліся, перамірґваліся вачыма, але не гаварылі. Ледзь толькі ён спрабаваў нешта сказаць, Ліза прыкладвала да вуснаў палец і насцярожана, па-змоўніцку папярэджвала: «Ц-с!» І ўмомант знікала, уцякала. Глеб доўга не мог уцяміць, здагадацца, чаго Ліза баіцца, чаго асцерагаецца — загаварыць з ім і то не асмельваецца. Ды і хто яна гаспадарам? Быццам дачка, бо і гаспадыню, і гаспадара заве мамай і татам, і разам з тым... Высветлілася ўсё, як і многае іншае, потым, трохі спагадзя. Тады ж, у першыя дні,

як пасяліўся Глеб у хаце на беразе ракі ў Сапяжанцы, яны з Лізаю, сустракаючыся, толькі па-змоўніцку пераміргваліся ды, астаўшыся — ён у сваім пакойчыку, яна — у сваім, уяўлялі, слухалі, хто што робіць за перагародкаю. І, вядома ж, думалі адно пра аднаго — ён пра яе, Лізу, яна, як потым высветлілася,— таксама пра яго. Якая гэта была шчымліва-трапяткая і разам з тым светлая радасць — ляжаць і думаць, уяўляць усё, што толькі захочацца, пра тую, што зусім побач, за перагародкаю! Не думаць пра Лізу, не ўяўляць усяго, што толькі прыходзіла ў галаву, Глеб проста не мог. Ды, мабыць, і кожны, як яму тады здавалася, на яго месцы тое б рабіў. Бо Ліза была не проста дзяўчына, а прыгожая, такая, убачыўшы якую аднойчы, ніколі ўжо не забудзеш. Статная, з гордым, трошкі як бы смяшлівым паглядам вачэй, з якіх, здаецца, струменілася дабрыня і ласкавы спакой, з дзвюма доўгімі, тоўстымі пляцёнкамі светлых, амаль ільняных валасоў, якія Ліза любіла насіць спераду, на грудзях, што цнатліва выпіралі з-пад кофтачкі, яна, калі праходзіла міма, міжвольна абдавала незразумелым цяплом, прымушала павярнуцца да яе, нібы электрызавала вакол сябе паветра. Глеб, калі бачыў Лізу, нямеў, язык, здаецца, прысыхаў да нёба. А ўбачыўшы, не мог вачэй сваіх ужо адвесці. Бывае ж, здараецца такое, каб усё, усё, да драбніц, падабалася ў чалавеку, ні ў чым ён не знаходзіў заганы. Глебу падабалася і як Ліза смяялася — ціхенька, быццам квола, але шчыра, весела, як яна хадзіла — не хадзіла, а лётала, як яна, за што б не ўзялася, рабіла — вязала, лупіла бульбу, мыла посуд, прыбірала ў хаце... Бо рабіла ўсё гэта яна як бы гуляючы, заўсёды ў добрым настроі, з песнямі. Бы ўсё адно званочак — дзе была яна, там чуўся і яе галасок. І не толькі ў хаце, але з гарода, поля.

Ці не з месяц мінула, перш чым Глеб па-сапраўднаму пагаварыў з Лізаю. Помніцца, ён вяртаўся з заняткаў і дагнаў Лізу,— яна таксама вярталася з заняткаў, і ім акурат выпала разам ісці дадому. Глеб адразу ж, радуючыся выпадку, спытаў, чаму Ліза трымаецца неяк дзіўна, нават

у размову і то не ўступае. І пачуў тое, што прымусіла яго яшчэ мацней і па-асабліваму пакахаць Лізу. Выявілася: за знешняй весялосцю хавалася вялікая чалавечая трагедыя. І, можа, таму, што гэтая трагедыя насілася доўга ў душы, яна вылілася, быццам вада, калі здымаюць запруду,— бурна і ўся адразу. Не, не такая, звычайная, як ва ўсіх, была Ліза дачка ў даволі багатых і маўклівых гаспадароў. Хоць Ліза і называла гаспадара і гаспадыню «татам» і «мамай»,— не была яна ім роднаю. Сапраўдныя тата і мама яна не ведала дзе. Помніла толькі — жыла яна з татам і мамаю ў нейкай вялікай драўлянай хаце, якая стаяла не то ў лесе, не то ў парку. Неяк увечары на іх хату напалі невядомыя — на конях, з шаблямі, вінтоўкамі. Паставіўшы бацьку і маці да сцяны, яны доўга нешта патрабавалі. Тыя ці то таго не ведалі, ці не мелі, не маглі даць... І тады коннікі пагналі паперадзе сябе бацьку і маці, хоць яны і плакалі, прасілі пусціць, маўляў, у іх малое дзіця...

Яна, Ліза, ахопленая жахам, дачакалася, калі зніклі за дрэвамі коннікі, і таксама пакінула дамоўку, бо аставацца адна баялася. Ноч, дзень блукала па лесе, потым па полі, пакуль не прыбілася ў вёску. Але хто хацеў апекавацца чужым дзіцем? У кожнай хаце іх і сваіх хапала — як адчыніш дзверы — і за сталом, і на падлозе, і на печы поўна. А есці, карміць, адзяваць... Няма каму. Тады ж, як Ліза цяпер ведае, некалькі гадоў запар ішла вайна, потым была рэвалюцыя, яшчэ адна вайна, ужо грамадзянская... Прыняла да сябе Лізу жабрачка, цётка Анэта. З цёткаю Анэтаю — амаль голая і галодная, у пошуках хлеба Ліза пратупала, перамерала сваімі босымі нагамі не адну сотню кіламетраў, пакуль не прыбілася ў горад. Цётка Анэта была скупая і сквапная, ані не шкадавала павадырку — біла, цягала за косы, выпраўляла адну з працягнутаю рукою на базар. І калі Ліза не прыносіла таго, што цётка Анэта хацела, не карміла яе, выганяла на ўсю ноч куды вочы глядзяць. Тады ў горадзе шмат было беспрытульнікаў, і Ліза аднойчы не вярнулася да цёткі

Анэты — сама стала беспрытульніцай. Да самай глыбокай восені яна начавала дзе трапіць, кармілася чым бог пашле. Урэшце, знясіленая, хворая, ледзь жывая апынулася ў дзіцячым прытулку, адкуль яе і ўзялі да сябе на выхаванне бяздзетныя гаспадары — сённяшнія «тата» і «мама».

— Дзе ж падзеліся мае сапраўдныя тата і мама, хто яны,— я не ведаю,— гаварыла з сумам у голасе Ліза.— І шукаць іх, калі не помню нават прозвішча, як? Ды і дзе мы жылі, што за хата была ў нас — свая ці чужая? І хто былі тыя коннікі, што забралі і кудысьці пагналі бацьку і маці? Немцы? Палякі? Белыя? Чырвоныя? Зялёныя?

Закацілася за Сапяжанку, села сонца, цемра і змрок паволі ахутвалі горад, а Глеб і Ліза, ахопленыя нейкім новым, незразумелым пачуццём, ніяк ці то не асмельваліся, ці то баяліся пераходзіць мост праз раку, ступаць на яго. Набліжаліся, глядзелі адно на аднаго і зноў, зноў аддаляліся.

— А са мною чаму ты так дзіўна паводзіш? — пытаў — не мог утрымацца — у Лізы Глеб.

— Ой, што ты... І тата, і мама забаранілі мне. «Каб нічога ніякага! — такі іх наказ.— Вось закончыш вучобу, тады і жаніха табе пакажам. Мы яго падабралі ўжо».

— І што за жаніх, хто ён?

— Не ведаю,—ціснула плячыма, усміхалася Ліза.— Ды, шчыра кажучы, мяне гэта і не цікавіць. Мне б інстытут закончыць, паехаць адсюль.

— Куды?

— Куды заўгодна. Ох, як надакучыла, абрыдла быць дома і не дома, ва ўсім падпарадкоўвацца, слухацца, спяваць, смяяцца, калі плакаць, выць хочацца.

І на вачах у Лізы нагарнуліся слёзы, яна сапраўды раптам заплакала. Крыўдліва, наўзрыд...

Захоўваючы ў межах дамоўкі тыя ж, ранейшыя, адносіны, Глеб і Ліза пачалі ўсё часцей і часцей сустракацца — па дарозе на заняткі і дадому, у парку ці проста каля ракі, але так, каб не бачылі, нават не здагадваліся пра гэта гаспадары хаты, дзе яны жылі.

— Раней, да цябе, у нас дзяўчаты-студэнткі на кватэры былі,— расказвала Ліза.— Я з імі пасябравала. І бацькі мае... Папрасілі іх з хаты, маўляў, яны дрэнна ўплываюць. Узялі цяпер цябе, хлопца, але папярэдзілі — каб я з табою ні-ні, ніякіх адносін... Калі што заўважаць — адразу ж з кватэры цябе папросяць.

— Няўжо гэтым яны хочуць адгарадзіць цябе ад свету? Ды і хто яны, урэшце? — пытаў Глеб.— Колькі ні прыглядаюся, зразумець ніяк не магу.

— Звычайныя мяшчане. Каб ім добра было — і ўсё. А што дзе па-за межамі іхняга дома робіцца — іх не цікавіць. Ды яшчэ надта ж прагныя да пажывы. Раней усё гародніну вырошчвалі, на базары прадавалі. Радыску, салату, моркву, агуркі, памідоры... Мама цэлае лета прастойвала за прылаўкам... А цяпер іншым занялiся — свіней разводзяць, качак, гусей. І пакойчык вось здаюць, грошай мець больш хочуць.

— Мяшчане-то мяшчане, але ж цябе, бачыш, у інстытут аддалі, каб вучылася!

— А чаму аддалі — ты ведаеш? Каб свой хатні доктар быў, лячыў іх. Так яны і сказалі мне, калі ў інстытут пасылалі. «Вось вывучышся на доктара — і клопату ніякага мець не будзем. Калі што якое — дома свой доктар!» Але няхай, я людзей люблю і буду дапамагаць кожнаму. Можа, таму людзей люблю, што не хапала іх мне, расла ў адзіноце, яны, мае новыя бацькі, адгарадзілі мяне ад усіх і ўсяго. Як у турме якой... Ніхто ніколі ні да мяне не ходзіць, ні я да каго б там ні было не хаджу. Адна, увесь час адна... У іншых святы ёсць, дні нараджэння... А ў мяне... Адзін бясконцы будзень. Ох, як абрыдла мне гэта! Каб, здаецца, можна было, кінула б усё і пабегла куды вочы глядзяць. І разам з тым... Падумаю іншы раз... Усё ж узялі мяне яны для нечага, кармілі, даглядалі, адзявалі, значыцца, на штосьці спадзяваліся. Хаця... І ката ж, сабаку іншы раз некаторыя бяруць, важдаюцца, даглядаюць, як дзіця...

Жывучы ў адной хаце, Глеб пачаў пільней прыглядацца да гаспадара і гаспадыні. Гаспадар — Пятро Трахімавіч —

быў з выгляду няўклюдны, з немалым жыватом і таўсматым, адутлаватым, трохі як бы жаночым, тварам. Ён, калі ні прыйдзеш, поркаўся з нейкімі не вельмі чыстымі вёдрамі, цабрамі, ражкамі,— мыў, тоўк бульбу, нешта мясіў, насіў у хлеў, карміў свіней, гусей, качак. Гаспадыня — Марына Міканораўна — не па гадах вяртлявая, відаць было, што працаваць асабліва не любіла, брудную і цяжкую работу спіхвала на мужа, сама ж дома стыкалася рэдка, бегала ці то па магазінах, ці так дзе і пастрэльвала вачыма за мужчынамі, кожнага праводзіла паглядам, хто ёй чым-небудзь падабаўся, нават не прапускала ніколі, каб не звярнуць увагі і на яго, Глеба. Вельмі можа быць, што яна разлічвала на нешта, калі яго, плячыстага і з выгляду не па гадах сталага, брала да сябе на кватэру.

— А што, мамка твая, відаць, падгульвае, рожкі татку стаўляе? — аднойчы не вытрымаў, спытаў Глеб у Лізы.

— Было,— заўсміхалася Ліза.— З кватарантам адным... Татка раней часу дадому вярнуўся... З таго часу дзяўчат толькі на кватэру бралі. А цяпер... Бачыш, мне сурова наказалі, каб я нічога ніякага з кватарантам не мела.

— Разумею,— заўсміхаўся ён, Глеб.

— О, каб ведаў хто-небудзь з іх, што мы сустракаемся, што ў нас...— яна не асмелілася сказаць, а мо і сама яшчэ не ведала, што ў іх з Глебам.— Яны б... Ні дня не трымалі цябе на кватэры, папрасілі б адразу ж вызваліць пакой.

— Думаеш, вельмі б напалохалі? — смяяўся, рагатаў Глеб.— Кватэр у горадзе хапае, абы грошы. І з табою лягчэй было б сустракацца. Магла б і да мяне прыходзіць...

— А ты... Перайдзі на другую кватэру! — загарэлася, натхніла Ліза Глеба.— О, як бы добра было, як бы я хацела таго! Уяўляеш, не дадому спяшацца, а да цябе! І не баяцца, што хтосьці нас убачыць, маці ці бацьку скажа! А то я... Не ведаю, як ты, а я... Трываць больш не магу... Адзіны чалавек, з кім і пабыць, і пагаварыць хочацца... Блізка, побач... А нельга!

Ліза прыхінулася да Глеба і змоўкла, задумалася...

І Глеб паслухаўся Лізы, перабраўся жыць з Сапяжанкі ў зусім іншы раён горада. Праўда, за пакойчык, таксама ў драўляным доме, давялося плаціць амаль удвая даражэй, але затое якое цікавае, напоўненае дасюль нязведаным і шчаслівае было жыццё там! Не жыццё, а казка. Зіма, вясна прамінулі як адзін дзень. Было, што Ліза прыбягала ледзь світала, было — уцякала з лекцый, было — спяшалася пасля заняткаў не дадому, а да яго ў пакойчык, дзе ён, як змовіліся, нецярпліва чакаў яе. Разам яны елі, што паспяваў прыгатаваць ці купіць ён, пілі чай і... Гаварылі, гаварылі. Гаварылі пра ўсё, што толькі іх хвалявала, цікавіла. Успаміналі маленства і дзяцінства, як хто і дзе жыў, школу, настаўнікаў, не забывалі і выкладчыкаў, студэнтаў, з якімі вучыліся і практыкаваліся, тое, чым жыла краіна і свет. Іх, як усіх тады, асабліва турбавала адно — будзе вайна з Гітлерам ці не будзе. Мяркуючы па тым, што рабілася ў Еўропе, як фашысты захоплівалі, паглыналі краіну за краінай, можна было здагадацца — нічым не задаволяцца яны, нападуць на нас... І гэта прыдавала спатканням, сустрэчам нейкае асаблівае хваляванне, не толькі таемнасць, але як бы і трывогу. Можа, таму так хутка і здарылася тое, чаго і Глеб, і Ліза хацелі, да чаго імкнуліся, што непазбежна павінна было адбыцца. І яны... Не, не разгубіліся, а... Жылі як муж і жонка. Глеб першы адчуў, што ўсё зайшло далёка, і аднойчы прапанаваў Лізе пайсці ў загс і аформіць тое, што ў іх было.

— Ой, што ты! — замахала рукамі Ліза.— Дай інстытут закончыць. Бо і дома ў мяне... Ды і ў інстытуце... Ніхто ж са студэнтаў не жэніцца, замуж не выходзіць.

— Ды яно быццам...— няёмка пачуў сябе Глеб.— Нядобра гэта. Жывём як муж з жонкаю і не жанатыя...

— Ведаю, ведаю...— чырванела Ліза,— І ўсё ж давай пачакаем...

— Чаго чакаць? Мы кахаем адзін аднаго, нам удваіх добра. А тое, што ў цябе дома... Ці што мы студэнты... Неяк усё ўляжацца, прывыкнецца...

— Яно так. І ўсё ж... Давай не будзем спяшацца. Пакуль можна, пакуль нічога ніякага, пажывём як ёсць. Тым больш што лепш, як цяпер, ці будзе хоць калі нам...

Ліза тулілася да яго, Глеба, цалавала... І ён... Хоць і не згаджаўся, але змаўкаў, спыняў размову.

З Лізаю яму было добра. Навошта ж, каб ёй з ім было горш.

Не думаў Глеб, не ўяўляў нават, як не думала, не ўяўляла і Ліза, што іхняя казка, іхняе шчасце так нечакана і хутка абарвуцца.

У той чэрвеньскі дзень, калі на краіну і народ абрынулася страшнае — вайна,— Глеб не быў у горадзе — паехаў да бацькоў у сваю родную вёску, што была на Палессі. Захапіў з сабою падручнікі, канспекты, каб падрыхтавацца да здачы чарговага экзамену — і паехаў. І пра вайну, што яна пачалася, пачуў толькі на другі дзень. Адразу ж развітаўся з бацькам і маці, сабраўся ў дарогу. Але, як выявілася хутка, дабрацца да горада, дзе вучыўся, было амаль немагчыма. Дый вайскоўаабавязаны ён і павінен быў не ў горад дабірацца, а ў бліжэйшы ваенкамат, што Глеб, вядома, і зрабіў. Разам з іншымі, такімі ж, як і сам, навабранцамі, ён адступаў, потым, стаўшы вопытным байцом, наступаў... Вайну закончыў у Берліне, афіцэрам. Быў тры разы паранены...

Хоць і думаў, успамінаў усюды, куды б ні закінуў лёс, Лізу, але дзе яна, што з ёю — нічога ані не ведаў. Лісты, што слаў ён у горад, дзе вучыўся, дзе жыла Ліза, вярталіся з прыпіскаю — «няма адрасата...».

Горад, дзе вучыўся, дзе сустрэўся і спазнаў радасць з Лізаю, наведаў адразу ж пасля Перамогі. Яго не пазнаць было, можна нават сказаць, таго горада, які ведаў ён, Глеб, не было зусім — гэтак ён быў разбураны, знішчаны. Усюды, куды ні паглядзі, куды ні кінь вока — груды цэглы, разваліны дамоў, арматура, галавешкі... Нават такія

29. Зак. 1877

ўскраіны, як Сапяжанка, і то не ацалелі. Згарэла тая хата, дзе жыла Ліза і дзе пазнаёміўся з ёю, кватараваў ён, Глеб, згарэў мост праз раку, згарэла ўсё, нават вербы, лазняк паабапал ракі... Паблукаўшы па ўжо расчышчаных, месцамі нават трохі як бы абжытых вуліцах, папытаўшы ў самых розных людзей, ці жыве дзе-небудзь Ліза, ці жывуць, асталіся яе бацькі, і не атрымаўшы таго адказу, які хацеў пачуць, паехаў з горада. Нялёгкія думкі апанавалі яго. Вайна ёсць вайна. Не ва ўсіх усё добра. Адны загінулі самі, а ў другіх... Так, мабыць, як у яго. Загінулі бацька, маці. Загінула, па ўсім відаць, і Ліза...

Арміі ён не пакінуў — прывык да яе за вайну. Як афіцэр служыў нейкі час на Далёкім Усходзе, потым у Прыбалтыцы, пад Масквою. Жаніўся, жонка нарадзіла чацвёра сыноў...

Ліза не загінула, не — была жывая. І ўвесь час, як потым даведаўся Глеб, шукала яго. Шукала ў тым горадзе, дзе яна вырасла і дзе сустрэла сваё каханне, шукала ў вёсцы, дзе нарадзіўся сам Глеб і жылі некалі яго бацькі, шукала ўсюды, дзе толькі можна было. І знайшла, калі ён служыў пад Масквою... Ліст, які Глеб атрымаў, узрушыў яго. Не толькі тым, што Ліза была жывая, але... У Лізы расла дзяўчынка, Вераніка, і гэтая дзяўчынка была яго дачка. Шмат нацярпелася Ліза, каб астацца жыць самой і выратаваць Вераніку. Цяжарная, уцякла з горада, некалькі гадоў была ў эвакуацыі. Вярнулася дадому толькі ў пяцідзясятых гадах, бо не адпускалі адтуль, дзе працавала яна ў шпіталі... Замуж не выходзіла, чакала Глеба. Верыла, што ён не загінуў, жыве. І, бачыш, не ашукалася, так яно і ёсць...

Доўга насіў у кішэні ліст ад Лізы ён, Глеб, не ведаючы, што адказаць. Прызнацца ва ўсім шчыра, што ён жаніўся, у яго ёсць дзеці, ці... Паехаць да Лізы, расказаць, растлумачыць, як і што... Акрамя кахання, былі і пэўныя абавязкі, І перад Лізаю, Веранікаю, і перад жонкаю, сынамі... Самыя

супярэчлівыя думкі лезлі ў галаву. І што рабіць — ён не ведаў, разгубіўся...

Адказаў на ліст праз некалькі дзён і начэй, якія правёў у бессані і роздуме. Выказаў радасць, што Ліза жывая, паведаміў пра сябе — хто ён цяпер, якая ў яго сям'я, колькі дзяцей. Успомніў, як прыязджаў пасля вайны ў горад, шукаў яе, Лізу. І не знайшоўшы, падумаўшы, што яе няма на гэтым свеце, жаніўся. Ён не пытаў у Лізы парады, што яму далей рабіць, як быць, ён толькі ўсё гэта *паведаміў*...

Адказ не прымусіў доўга чакаць. Ліза нічога не патрабавала, нічога не прасіла — яна проста рада была, што Глеб жывы, што ён знайшоўся. «Я ўсякаму табе была б рада, які б ты і хто б ні быў. Бо ты — Глеб, той, каго я кахала, кахаю і буду кахаць да самай смерці. Ты ў мяне адзіны, каму я аддала сваю душу і сэрца. І калі б трэба было — дзеля цябе аддала б, не задумваючыся ні на хвіліну, жыццё...» Там жа, у тым самым лісце, Ліза прапаноўвала сустрэцца. «Калі ты не можаш прыехаць, я да цябе сама прыеду,— пісала яна.— Паведамі толькі, калі гэта лепш зрабіць...»

Ён зноў не меў ні сну, ні спакою некалькі дзён і начэй. Вядома, сустрэцца трэба было б — столькі ж гадоў не бачыліся! Ды і... Пры сустрэчы многае высветлілася б, ясней бы стала, як далей жыць і што рабіць. І разам з тым... Глеб баяўся гэтай сустрэчы. А што, калі Ліза... І ён не ўстаіць, перацягне яна яго да сябе... Што тады рабіць з жонкаю, сынамі?.. Пакідаць, разводзіцца?.. А сустрэцца, каб парваць з Лізаю... Сказаць, што ён не збіраецца разводзіцца, не думае кідаць сям'ю... Таксама ж...

Так і не адбылося той сустрэчы. І быццам прычыны на тое былі — неўзабаве тую часць, дзе служыў Глеб, перакінулі ў Венгрыю, потым у Германію. Адтуль, ужо як спецыяліста, яго накіравалі ў адну з дружалюбных арабскіх краін...

Перапіска з Лізай амаль спынілася. Віншавалі адзін аднаго са святамі, коратка паведамлялі, што ў каго новага. Пра тое, каб сустрэцца, пабачыцца, неяк ужо і не заводзілі размовы. Ды быццам і не было як — увесь час ён за мяжою, калі і прыязджаў на радзіму, дык на некалькі дзён і то па заданні. Праўда, Ліза ніколі не забывала паведаміць яму ўсё пра Вераніку. І з гэтых, хоць і скупых, але рэгулярных паведамленняў, Глеб ведаў, што Вераніка скончыла на выдатна школу, паступіла ў медыцынскі інстытут і працуе ўжо ў той самай клініцы, што і яе маці. Выйшла Вераніка і замуж — за медыка, кандыдата навук Уладзіміра Ігнатавіча. І цяпер яна не Вярсоцкая, не яго, Глеба Іванавіча, носіць прозвішча, а мужава — Давыдзенка. Жывуць дружна, разам з ёю, Лізаю, у іх нарадзіўся сынок, так што Ліза віншавала з гэтай падзеяй і яго, дзеда.

Атрымаўшы пенсію, Глеб пасяліўся пад Масквою, на радзіме жонкі, дзе жылі яе бацькі, яшчэ нейкі час працаваў, спярша ў вучылішчы, потым у школе. Але думкі пра Лізу, Вераніку не пакідалі — увесь час і ўсюды праследавалі яго. Быццам цяжар нейкі ляжаў на душы, мучыў, гнёў. Усё ж не так, як, мусіць, трэба было, паступіў ён, Глеб. Нават не сустрэўся, не пабачыўся. Няхай тады нібы прычыны аб'ектыўныя былі — за мяжою быў, у арміі служыў... А цяпер, калі на радзіме, пад Масквою... Ды і вольны ж — на пенсіі, можна сказаць...

Напісаў Лізе пра сваё жаданне.

І Ліза адразу ж адклікнулася: «Прыязджай. У любы час прыязджай!..»

І зноў Глеб не адзін дзень, не адну ноч не спаў — думаў. Што скажа жонка, калі даведаецца, куды ён едзе? Хоць і расказаў жонцы ўсё, ведала яна і пра Лізу, і пра Вераніку, а ўсё ж... Ды і сама Ліза што скажа, як прыме яго? Мінула ж, прайшло столькі гадоў! А дачка, Вераніка... Ды і зяць — невядомы Уладзімір Ігнатавіч Давыдзенка?..

Тады, як Вераніка малая была, клопату і ўвагі патрабавала,— не ехаў. А цяпер, калі ўсё ў яе на лад пайшло, вырасла яна, сям'ю сваю займела, бачыш... Бацька знайшоўся, у госці едзе... Сустракай, радуйся...

І ўсё ж Глеб асмеліўся на гэтую паездку — аднойчы, не сказаўшы жонцы, куды едзе,— правільней, сказаўшы, што едзе на некалькі сутак па справах у Маскву,— купіў білет на самалёт і паляцеў у той горад, дзе прайшла яго маладосць, дзе жыла Ліза і Вераніка...

«Што будзе, тое будзе. Але сустрэнуся, пабачуся. І з Лізаю, і з Веранікай. Нямалады я ўжо чалавек, колькі мне жыць асталося... Ціск у апошні час падняўся, бяссонніца па начах мучыць. Ды і сэрца пабальваць пачало... Яшчэ, чаго добрага, памрэш, і так і не сустрэнешся, не пабачышся ні з Лізаю, ні з Веранікаю...» — падумаў ён.

**2**

Уладзімір Ігнатавіч заканчваў працу, калі яго паклікалі да тэлефона.

— Валодзя, гэта ты? — пачуў ён у трубцы знаёмы голас жонкі, Веранікі.— Прыязджай хутчэй дадому!

— Што здарылася? — ёкнула сэрца ў Уладзіміра Ігнатавіча, не так ад таго, што сказала жонка, як ад яе голасу — ціхага і нейкага быццам спалоханага, таямнічага.

— Ды нічога асаблівага... Бацька прыехаў...

— Які бацька?

— Хі-хі,— хіхікнула Вераніка.— Ды мой... Помніш, я табе расказвала... У маці каханне было... Да вайны...

— І што ён робіць, гэты твой бацька?

— Сядзяць з мамаю за сталом, частуюцца... Успамінаюць сваё, даўняе... Пра сябе расказваюць адно аднаму...

— А ты?

— З пакоя ў пакой хаджу, ніяк супакоіцца не магу. Дый не ведаю, як называць яго... Незнаёмыя ж мы, першы раз бачу... Вось табе вырашыла пазваніць. Можа, прыедзеш

раней, то ўдваіх... Бо я... Разгубілася, саўладаць з сабою не магу. З аднаго боку, быццам і бацька, а з другога... Калі ты бацька, дык чаму раней не ехаў, як малая была, як мне трэба быў... А цяпер, калі сама замужам, сына амаль дарослага маю...

— М-м, падумаць трэба,— засоп у трубку Уладзімір Ігнатавіч.— Можа, мне і не варта дадому ехаць, бачыць таго твайго бацьку...

— Што ты, Валодзечка! Маці пра цябе так добра расказвае, які ты ў нас малайчына. І не з'явіцца, не паказацца на вочы, нават не пазнаёміцца?

— А чаму ён не з'явіўся, не паказаўся на вочы, нават не пазнаёміўся, як я замуж цябе браў, вяселле ў нас было?

— Дык ён жа за мяжою быў!

— Хоць бы тэлеграму прыслаў, павіншаваў... Ды і прыехаць мог. Не тады, дык перад гэтым ці пасля... А з табою як ён паступіў? Не, не бацька гэта... Чужы чалавек. І мне, і табе.

— Валодзечка, не злуйся. Я сама не свая... Падыду, пагляджу на маці, на яго... Маці быццам радая... А я... Сама не ведаю, плакаць хочацца...

— Паплач. А я... Пазваню табе яшчэ...

— А не прыедзеш?

— Пакуль я не магу — заняты.

І паклаў трубку.

Уладзімір Ігнатавіч вырас у вёсцы, у вялікай — аж адзінаццаць душ! — сям'і. Бацька і маці ў яго былі патомныя сяляне. І змалку ён сам быў прывучаны і да працы, і да ўсяго таго, на чым трымаецца сям'я: павагі да бацькі і маці, моцных, непарушных, амаль дамастроеўскіх правіл ва ўсім. І ён проста не разумеў, не мог звыкнуцца з тым, што потым убачыў — як некаторыя кідалі жонак, ды яшчэ з дзецьмі, ішлі жыць да другіх. Не мог ён без спачування, спагады глядзець на дзяцей, якія раслі без бацькі ці маці. Ды калі б у яго, Уладзіміра Ігнатавіча, забраў хто бацьку ці маці, кім бы ён вырас? Гэта ж недаатрымае колькі чаго дзіця, калі

яно расце без бацькі ці маці. Бо дзіця ад маці бярэ адно, а ад бацькі — іншае. А так... Гармоніі ніякай няма. Праўда, калі ён пазнаёміўся, а потым і ўзяў замуж Вераніку, якая вырасла без бацькі, ён крыху супакоіўся, змяніў свае адносіны да ранейшых перакананняў. Можна, аказваецца, і без бацькі чалавекам вырасці, усё залежыць і ад самога сябе, і ад маці. Ды і ад абставін, у якіх чалавек выхоўваецца. Але ж... Даравацъ тым бацькам, якія кідаюць дзяцей, думаюць перш за ўсё не пра іх, а пра сябе... Не, не мог!

І таму да паведамлення Веранікі, што прыехаў яе бацька, аднёсся не так, як, мусіць, аднёсся б іншы. Можа б, той і ўзрадаваўся, кінуў бы працу, паспяшаўся б дадому. Як жа — падзея такая! Столькі год пражылі і не бачылі чалавека, якому абавязаны — Вераніка жыццём, ён — тым шчасцем, якое падараваў лёс, даўшы ў жонкі Вераніку. Тым больш што калі прыязджалі з вёскі яго бацькі — маці, бацька ці хто-небудзь з братоў, сясцёр, Вераніка радая была, сустракала іх як родных, нічога дзеля іх не шкадавала.

Паклаўшы трубку на тэлефонны апарат, Уладзімір Ігнатавіч пастаяў, падумаў, правільна ён зрабіў ці не, што не адклікнуўся на просьбу Веранікі, не паехаў дадому, потым паволі, у одуме, пайшоў па калідоры. Куды — і сам не ведаў. Урэшце, апынуўшыся ля акна, адчыніў яго, закурыў.

Акно выходзіла ў невялікі сквер, засаджаны ліпамі, таполямі, каштанамі. Якраз была вясна, цёплы, нават трохі парны надвячорак, і па алеях і дарожках прагульваліся, сядзелі на лаўках хворыя і тыя, хто прыйшоў іх праведаць. Надвор'е спрыяла — свяціла яшчэ даволі яркае майскае сонца, і дрэвы, здаецца, на вачах зелянелі, апраналіся ў свой густы летні ўбор. Пахла маладой клейкай лістотай, крычалі, аж глушылі ўсё наваколле, радуючыся цяплу і сонцу, птушкі — шпакі, вераб'і, гракі...

І чым больш стаяў Уладзімір Ігнатавіч ля акна, тым больш пераконваўся: ён зрабіў правільна, што не паехаў дадому. І будзе яшчэ больш правільна, калі ён і наогул

не паедзе, не ўбачыць таго бацькі, не пазнаёміцца з ім. Няхай той невядомы чалавек, хоць на старасці, перад смерцю адчуе, што ён не такі, як усе, што некалі ён зрабіў тое, што яму не даравалі і не даруюць ніколі. Калі забыла свае крыўды, свае слёзы Лізавета Пятроўна, забыла Вераніка — бацька ўсё ж! — дык... Ён, зяць, па-мужчынску пакарае яго — не прыйдзе дадому, не з'явіцца, аж пакуль той не вызваліць кватэры, не паедзе з горада. Урэшце, ён, зяць, мае на гэта права. Не хацеў пазнаёміцца раней — не трэба і цяпер! Вучыць трэба некаторых, каб ведалі, помнілі, хто яны.

Зачыніў акно. Рашуча, як ніколі, пакрочыў звыклаю, амаль салдацкаю паходкаю на вуліцу...

Вераніцы пазваніў апоўначы, сказаў, каб не чакала яго сёння, ён не прыйдзе дадому.

— Дзе ты? — са слязьмі ў голасе спытала Вераніка.

— Я ля ракі... у парку...— сказаў ён.— Помніш алею, дзе я ўпершыню цябе ўбачыў, пазнаёміўся...

— Што ты там робіш?

— Гуляю, думаю.

— А дадому калі вернешся?

— Тады, як паедзе, выберацца гэты твой... бацька. Так можаш яму і сказаць.

— Валодзечка, нікуды не ідзі, мяне пачакай. А то я... Як непрыкаяная...

Вераніка апранулася хутка і ціха, непрыкметна, нічога нікому не сказаўшы, вышмыгнула за дзверы, пайшла з кватэры...

Праз тыдзень атрымалі тэлеграму: «ПАМЁР БАЦЬКА ГЛЕБ ІВАНАВІЧ ВЯРСОЦКІ ПАХАВАННЕ ЗАЎТРА А ТРЭЦЯЙ ГАДЗІНЕ ДНЯ».

Прычыну смерці не высвятлялі, і на пахаванне ніхто, нават Лізавета Пятроўна, не паехаў...

## Тыя

*Фантастычнае апавяданне*

Чаму раптам захацелася мне расказаць пра гэта? І сама не ведаю. Толькі... Рупіць і рупіць. Адчуванне такое, быццам падганяе хто, пад локаць штурхае, на вуха шэпча: «Ну, не марудзь, пішы...»

І я, не ў змозе супраціўляцца, пішу...

...Тады, у той вечар, я сядзела ў парку пад старымі таполямі ля вадаспаду, слухала шум вады, глядзела на зоры, што высыпалі густа, як ніколі, і думала пра тое, што займала ў апошнія дні мяне больш і больш,— пра неапазнаныя лятучыя аб'екты, што з'яўляюцца то тут, то там у небе, пра сляды, што пакінулі ў самых нечаканых месцах на Зямлі іншапланецяне... І не заўважыла, як падышоў да мяне незнаёмы чалавек — прыкладна маіх год, у меру рослы, у меру плячысты, з спакойнымі, разумнымі вачыма, мужным, хударлявым тварам і сцятымі, вельмі ж валявымі губамі — якраз такі, якія мне падабаюцца, якога быццам стварыла маё ўяўленне, калі я марыла, каго б магла пакахаць і за каго выйсці замуж,— і спытаў, ці можна яму прысесці, таксама паслухаць шум вадаспаду. Я, ні слова не кажучы, моўчкі пасунулася на край, дала яму месца.

— Аднак вы смелая,— сказаў незнаёмец.— У такі позні час адна ў парку...

— А які цяпер час? — спытала, як бы апамятаўшыся, я.

— Другая гадзіна ночы...

— Ой, і праўда ж,— спахапілася я, што заседзелася.— Заўтра ж на працу...

Я паднялася, каб пайсці. І трэба ж — акурат на набярэжную, куды мне трэба было кіравацца, вывалілася аднекуль вялікая, шумная кампанія падлеткаў. Я ўявіла на хвіліну, што яны могуць са мною зрабіць, калі траплю ім на вочы,— адна, у бязлюдным, амаль неасветленым парку,— і ад страху міжвольна сцепанулася.

30. Зак. 1877

— Можна, я правяду вас? — паслужліва прапанаваў, быццам прачытаўшы мае думкі, незнаёмец.

Я паглядзела на яго больш уважліва — здаецца, нічога такога не было ў ім, каб баяцца,— і кіўнула галавою, згадзілася. І мы — я і незнаёмец,— не падымаючы адно на аднаго вачэй, паволі пайшлі насустрач шумнай кампаніі. Як толькі мы наблізіліся да падлеткаў, адзін з іх, расхрыстаны, кудлаты, убачыўшы мяне, закрычаў:

— Хлопцы, і шукаць нікога не трэба! Адной на ўсіх хопіць!

Мой праважаты імгненна змяніўся з твару. І не паспела я згледзець, як ён апынуўся ля крыкуна. Схапіў яго загрудкі, калатнуў, ды так, што аж нешта ў кішэнях у таго зазвінела — няйнакш манеты.

— Ану, смаркач,— прашыпеў ён,— прабачэння прасі!

І той, даволі рослы і, па ўсім відаць, дужы, спартыўнага складу, падлетак нейк ураз зніякавеў.

— Я пажартаваў,— залапатаў, вінавата заўсміхаўся ён.— Даруйце, перапіў...

Незнаёмец адпусціў крыкуна, вярнуўся да мяне. Я, каб не выглядаць выпадковай сустрэчнай, узяла яго пад руку, і мы пайшлі, не азіраючыся на кампанію. Кампанія таксама,— а было падлеткаў чалавек з дзесяць,— прысаромленая, пайшла сваёй дарогай.

— Які вы смелы! — выказала незнаёмцу ўголас я сваё захапленне. (Прызнаюся, я марыла менавіта пра такога чалавека, калі думала, хто будзе ў мяне муж.)

— Ніякай смеласці тут няма,— сказаў незнаёмец.— Проста не люблю дрэні, не люблю, калі язык лішне распускаюць, п'яныя ці цвярозыя. Дарэчы, мяне завуць Анатоль Іванавіч, Толя...

— А мяне... Каця,— чамусьці засаромелася я.

— Ну вось, мы і пазнаёміліся,— як бы з палёгкай уздыхнуў Анатоль Іванавіч.— А то, на выпадак чаго, нават як зваць адно аднаго, не ведалі... Вы дзе жывяце? — спытаў ён, калі мы выйшлі з парку.

— Ды зусім блізка. Вунь там, у тым доме,— паказала я на дзевяціпавярховы дом, што бялеў па другі бок вуліцы.

— Адна?

— Так, адна... А што?

Анатоль Іванавіч збянтэжыўся, але на хвіліну, толькі на адну хвіліну.

— Гэта я... На ўсякі выпадак... І што — адгадаў? — усміхнуўся ён.

— Адгадалі,— усміхнулася і я.

Не, мне падабаўся гэты незнаёмец, што падсеў да мяне так нечакана на лаўку ў парку і назваўся Анатолем Іванавічам. І ад п'янай кампаніі падлеткаў абараніў, і... Прыемна было разам з ім дадому ісці. Асабліва калі пад руку я яго трымала — быццам з самым дарагім, блізкім чалавекам ішла. І расставацца... Не, не хацелася мне, ані не хацелася расставацца.

— Выбачайце, я затрымала вас... І паслухаць шум вадаспаду... не дала...— прашаптала, павінавацілася я.

— Нічога, другі раз паслухаю... А што да затрымкі, дык я... Нікуды не спяшаюся.

— Вам што — хіба заўтра на працу не трэба?

— Я ў адпачынку.

— І нікуды не едзеце, у горадзе будзеце?

— Пагляджу, падумаю. Адпачынак мой толькі пачынаецца... Заўтра першы дзень.

— А вы... Пуцёвак ніякіх нікуды не бралі?

— Можа, яшчэ вазьму, паеду куды-небудзь. Гэта не ад аднаго мяне залежыць.

— А ад каго? Вы што — жанаты, сям'ю маеце? Ці, можа, маці, бацька старыя, нямоглыя?

— Не, я гэтакі ж адзінокі, як і вы.

Зноў я здзівілася, аж плячыма павяла.

— Адкуль вы ведаеце, што я адзінокая?

— Не ведаю, а здагадваюся,— усміхнуўся Анатоль Іванавіч.— Калі б вы былі не адзінокая, не сядзелі б так позна на лаўцы ў парку. А каб і сядзелі, дык не адна...

Была, была логіка ў разважаннях Анатоля Іванавіча. Разумны, здагадлівы ён. І лішняга нічога сабе не дазваляў.

Паводзіў, словам, не так, як іншыя мужчыны і хлопцы — не лез абдымацца, цалавацца, хоць быццам я першая ўзяла яго пад руку, вяла побач з сабою, і мне гэта падабалася. І не толькі гэта — сам Анатоль Іванавіч падабаўся. Інтэлігентны, далікатны, выхаваны. І разам з тым... Рашучы, смелы. «Такі ў крыўду нікога не дасць,— падумала я.— Вось бы бліжэй з ім пазнаёміцца... А потым... І замуж за такога выйсці». Анатоль Іванавіч быццам здагадаўся, пра што я думаю, пачуў мяне.

— Дык што, заўтра зноў сустрэнемся? — сказаў ён, правёўшы мяне ў пад'езд дома, дзе я жыла, і выклікаўшы ліфт.

— Дзе? — прашаптала я, ласкава акінуўшы вачыма Анатоля Іванавіча.

— Там жа, ля вадаспаду, на лаўцы...

Прыйшоў ліфт, і я ўскочыла ў яго, забыўшыся пажадаць Анатолю Іванавічу добрай ночы і падзякаваць... За ўсё, усё падзякаваць...

Назаўтра, ледзь змерклася, я заспяшалася ў парк. На маё шчасце, тая, як я яе называла, «мая» лаўка, што стаяла пад старымі таполямі і на якой я заўсёды сядзела, калі прыходзіла да вадаспаду, была незанятая. І я, апусціўшыся на тое самае месца, што і ўчора, калі да мяне падышоў Анатоль Іванавіч, зноў, слухаючы, як мерна і быццам з сумам падае з вышыні плаціны вада, думала пра розныя касмічныя цуды, пра іншапланецян... Цікава, няўжо гэта праўда, што пішуць некаторыя вучоныя? Загадкавыя малюнкі і надпісы на вечках саркафагаў, што знойдзены ў самых розных месцах? Сляды гіганцкага касмічнага аэрадрома Наска? Намаляваныя — ну рыхтык касманаўты — у шлемах, з антэнамі — у пячорах, царквах, на скалах — людзі і разам з тым быццам не людзі? Дый гэтыя лятучыя неапазнаныя аб'екты — «талерачкі», што час ад часу з'яўляюцца ў небе,— іх бачаць лётчыкі і пастухі, жыхары вёсак і гарадоў? Больш таго — «талерачкі» гэтыя садзяцца

на Зямлю, з іх выходзяць жывыя істоты, абмацваюць глебу, збіраюць каменні, ірвуць траву і ламаюць голле — няйнакш вывучаюць. І людзей, што здараюцца паблізу, з сабой забіраюць. Адных вяртаюць назад на Зямлю, а іншых... Цікава, няўжо самі тыя людзі на Зямлю вяртацца не хочуць? Ці іх... Не выпускаюць?..

Я падняла вочы, паглядзела на неба, на зоры, што іскрыліся, гарэлі ў небе. Іх, як мне здалося, было больш, чым нават учора,— тысячы, мільёны, мільярды...

«А што,— падумала я,— чаму гэта на адной нашай Зямлі жыццё магчыма, а на іншых планетах немагчыма? Тыя выключныя ўмовы, што стварыліся для нараджэння і існавання жыцця, маглі ўзнікнуць і ў іншых месцах. А калі так, то жыццё існуе і яшчэ дзесьці. І, можа, яно там на больш высокім узроўні развіцця. І калі мы толькі пачынаем асвойваць космас, то тыя, больш развітыя істоты, даўно яго асвоілі. І лятаюць да нас на Зямлю... Ды і ляталі... Вось чаму і сляды ранейшых прылётаў іншапланецян цяпер вучоныя ў самых розных месцах знаходзяць. А тое, што ў кантакты яны вельмі ж асцярожна з чалавекам уступаюць, дык гэта і не дзіўна... І мовы, відаць, не ведаюць, бо і не адна ж мова ў нас, а сотні... Дый хвароб нашых зямных, мікробаў баяцца... А можа, ім і не трэба асабліва ў кантакты ўступаць, тэхніка, навука развіта так, што і без кантактаў усё бачаць і ведаюць...

Словам, задумалася я над рознымі касмічнымі праблемамі і зноў не заўважыла, калі да лаўкі падышоў Анатоль Іванавіч,— у новым, яшчэ больш элегантным, як учора, касцюме, белай, накрухмаленай кашулі, з «матылём» замест гальштука на шыі.

— Я вам не перашкодзіў? — спытаў ціха, амаль шэптам Анатоль Іванавіч.

— Ой, што вы,— узрадавалася я.— Сядайце, разам паслухаем шум вадаспаду. Ды і пагаворым...

— Пра што? — неяк загадкава спытаў Анатоль Іванавіч.— Пра космас, іншапланецян?

І ўсміхнуўся, мабыць, убачыўшы, як мяне ўсю перасмыкнула — адкуль ён ведае, што мяне цікавіць, займае мае думкі?

— Зноў вы спытаеце, чаму я ведаю, пра што вы думаеце, пра што пагаварыць хочаце? Не здзіўляйцеся, космас хвалюе, займае цяпер не адных вас. Чаму? І пішуць пра гэта шмат, ды і... Быццам разняволіўся чалавек, крылы ў яго выраслі, увесь у палёце... Раней ён бачыў толькі тое, што ў яго пад нагамі было. Зямлю сваю бачыў. А цяпер, калі спадарожнікі розныя лётаюць, касманаўты, Месяц, планеты Марс і Венеру асвойваем... Думкі многіх скіраваны ў космас. Чалавеку, бачыце, няўтульна стала на Зямлі, цесна, адзінока, ён захацеў «общения» з іншымі жывымі істотамі, шматвяковы сум па іншых разумных жывых істотах раптам адчуўся з небывалай сілай... Яно і не дзіва. Раней чалавек верыў у Бога, у нячыстую сілу, баяўся іх... А цяпер ведае: няма Бога, няма нячыстай сілы... Усё матэрыяльна, ясна, ніякіх загадкавых з'яў... А калі нешта нейкае загадкавае з'яўляецца час ад часу, ён імкнецца пазнаць, вытлумачыць, навукова абгрунтаваць... Зямля асвоена, вось і імкнецца чалавек у космас, каб асвоіць і яго. І не без поспеху — за якіх некалькі дзесяткаў год зроблена многае. Інстытуты цэлыя, лабараторыі менавіта на гэта працуюць. І як, як, скажу вам, працуюць! Ніхто нічога не шкадуе — ні грошай, ні іншых сродкаў... На што-небудзь больш надзённае не хапае, а на космас... Усяго, усяго хапае... І вынікі... Вынікі, як вам вядома, ёсць... І яны будуць куды большыя, калі толькі сілы і розум усяго чалавецтва накіраваць на гэта — на асваенне космасу.

— Дык і трэба гэта зрабіць,— не ўтрымалася, падказала я.

— Хэ,— засмяяўся Анатоль Іванавіч.— Так не адна вы, а многія кажуць. І не толькі кажуць, а і хочуць. Але ж... Вы, пэўна, ведаеце, што ёсць сіла і антысіла, прыцягненне і адштурхоўванне, дабро і зло, любоў і нянавісць, жыццё і смерць... Вы калі-небудзь думалі пра гэта — чаму так?

— Не,— прызналася я.

— А вы падумайце. Можа, усё гэта знарок зроблена, з пэўным, так сказаць, сэнсам. Можа, каб чалавек у штосьці верыў і разам з тым баяўся? Вялікая сіла — вера. Але не меншая сіла і страх. І заўважце — заўсёды нехта прыдумваў на чалавека новую бяду, як толькі ён пазбаўляўся ранейшай, што яго мучыла. Ды і... Ураганы, землятрусы, вывяржэнне вулканаў, войны... Асабліва войны. Калі ў даўнія часы ваявалі чалавек з чалавекам, то потым пачалі ваяваць сям'я з сям'ёю, род з родам, паселішча з паселішчам, горад з горадам, княства з княствам, народ з народам, дзяржава з дзяржавай... А цяпер... Сусветныя войны. Пагражае ўжо ўсім нам атам і вадарод, знішчэнне цывілізацыі, нагул усяго жывога на Зямлі і нават самой Зямлі... Што, усё гэта, думаеце, выпадкова? А можа, ёсць сіла, якая кіруе ўсімі дзеяннямі чалавека, не дае яму разняволіцца цалкам, аб'яднацца з усімі? Чалавек прыдумвае адно, а сіла тая — зусім адваротнае... Раней усё добрае, казалі, тварыў Бог, а нялюдскае, злое — чорт... Цяпер па-іншаму гэта называюць, але сутнасць адна — як толькі нешта прыдумае добрае чалавек, адразу ж быццам супрацьяддзе знаходзіцца. Прыклады? Вам прывесці прыклады?

— Не трэба,— адмоўна хітнула я галавою.— І так даволі. Дый сама я магу прывесці вам прыклады. Скажам, з тымі ж хваробамі. Як толькі адну людзі пачынаюць лячыць, новая, яшчэ больш страшная, узнікае. Але не пра гэта я хачу зараз гаварыць. Скажыце — няўжо і далей усё так будзе, як было?

— Што вы маеце на ўвазе?

— Ну, што ўсё тое самае будзе, што і было раней, толькі быццам у новых формах?

— Вядома. Інакш... Як толькі знікне сіла, знікне і антысіла, а значыцца, знікне і чалавек, жыццё. А так у змаганні, у барацьбе, яно і развіваецца, ад ніжэйшага да больш дасканалага, якаснага... Вы, відаць, чыталі ці чулі пра Вавілонскую вежу, як будавалі яе... Калі падняліся надта

высока, адбылося між людзьмі неразуменне адзін аднаго. Запомніце — так будзе і далей. І тое, што цяпер... Між ЗША і нашай краінай, краінамі сацыялізму і капіталізму... Паверце мне, не захочуць дапусціць, каб была поўная згода, узаемаразуменне між гэтымі краінамі.

— Хто не захоча? — міжволі вырвалася ў мяне.

— Ну, тая сіла, ці, правільней, сілы, бо яны выступаюць у розных абліччах. Сутнасць жа іх адна — ім трэба трымаць чалавецтва ў пакоры, не даць людзям аб'яднацца, не даць, каб яны мірна жылі, думалі пра тое, пра што ім нельга думаць.

— Вы пачалі гаварыць трохі загадкава, я не ўсё разумею. Можна — ясней? — папрасіла я.

— Ясней? Што ж,— усміхнуўся неяк аж надта дабрадушна Анатоль Іванавіч,— давайце вернемся да таго, з чаго мы пачалі,— з космасу, з іншапланецян... Калі вы верыце ў тое, што Зямлю наведвалі і наведваюць цяпер час ад часу іншапланецяне, дык вы думаеце — з якой мэтай яны гэта робяць? Паглядзець на Зямлю, на людзей, і ўсё? О не! У іх ёсць мэты куды больш важныя. Ды і чалавек сам ці зямное стварэнне? А можа, ён прывезены з іншых планет? Ці бывалі вы калі-небудзь у лабараторыях вучоных — скажам, біёлагаў, батанікаў, хімікаў? Дарэчы, вы хто па прафесіі?

— Я... У бібліятэцы працую... Новыя кнігі, што паступаюць, апрацоўваю... Нумары стаўлю, картачкі запаўняю...

— А-а, цяпер я разумею, чаму вы чытаеце, не прапускаеце нічога, што пра космас пішуць. Дык паслухайце мяне, таварыш Каця. Вучоныя ў лабараторыях разводзяць у колбах розныя мікробы і мікраарганізмы, як, скажам, людзі на фермах — кароў, свіней, курэй... А ці не здаецца вам, што і нас, людзей, нехта гэтак жа разводзіць на Зямлі? І над намі, людзьмі, таксама праводзіць розныя эксперыменты, вопыты?

— Пра гэта я не думала,— чамусьці спалохалася, аж сцепанулася я.

— А вы падумайце. Падумайце і яшчэ пра адно — ці не тыя ж іншапланецяне гэта робяць?

— Навошта ім гэта?

— А гэта ўжо іншая справа, мы не можам пра тое меркаваць, як не могуць меркаваць і мікробы, навошта іх разводзяць вучоныя. Мэта, вядома, ёсць, але мы яе не ведаем, не здольны пакуль што ведаць — вось у чым загвоздка. І робіцца ўсё, каб гэтага мы і не ведалі. Можа, дзеля вопыту, эксперыменту якога... А можа — тыя разводзяць нас і дзеля іншага, скажам, як мы разводзім кароў, свіней, птушак розных... І не цела ім наша трэба, а інфармацыя, вопыт, веды нашы? Бо ўсё ж у чалавеку так зроблена, каб працавала на набыццё вопыту, інфармацыі, ведаў. І калі чалавек памірае, не можа быць, каб набытае за жыццё проста так гінула. Прырода вельмі эканомная, і каб тое, дзеля чаго жыў, уласна, чалавек, знікала разам з яго смерцю?.. Не думаю. Раней казалі: калі чалавек памірае, астаецца жыць яго душа. У індусаў — душа пераходзіць жыць у іншыя жывыя істоты, у іншых народаў — яна раствараецца ці ляціць на неба. А можа, гэта... вопыт, інфармацыя, веды ўлятучваюцца? Жывёла, птушкі ды і мы не ядзім усё, што расце на зямлі, як правіла, выбіраем зярняткі. А можа, і самае каштоўнае і ў нас — тыя ж зярняткі — інфармацыя, вопыт, веды паступаюць кудысьці, хто іх збірае ці харчуецца імі, га?

— А створанае чалавецтвам — адкрыцці розныя, кнігі, кіно, тэатр, радыё, тэлебачанне? — задумалася я.

— Гэта дробязі, яны даюцца чалавеку, каб ён бавіў час, трохі весялей жыў, не думаў пра сваю смерць. Бо калі і гэта ў чалавека забраць — надта ж сумна будзе яму жыць, смерці чакаць. Ды і часу будзе шмат, каб думаць. А робіцца ж усё, каб чалавек менш думаў якраз пра незямное і больш — пра зямное.

— Паслухаеш вас...— паглядзела я з недаверам на Анатоля Іванавіча.— Дык і жыць не захочацца.

— Зямным — так. Але ж ёсць жыццё — вы верыце ў тое — не зямное. Вось бы туды як-небудзь пранікнуць, паглядзець, што там. Ды і на Зямлю, на людзей паглядзець як бы збоку, га? Што, можа, скажаце, не хочацца таго? І не толькі вам гэта

хочацца. А многім. Таму і касмічныя караблі будуюць, таму і палёты ў космас пачалі...

— І што, тое, што вы сказалі... Ну, на Зямлю, людзей як бы збоку паглядзець... Магчыма?

— Не ўсім. Адным магчыма, другім не. Некаторыя ж... І цяпер гэта могуць зрабіць.

— Як? — Я аж з лаўкі падхапілася.— Хто гэтыя некаторыя? І вы... Што вы пра іх ведаеце? Ды і... Хто вы?

— Вам заўтра на працу рана ісці,— напомніў Анатоль Іванавіч, таксама падымаючыся з лаўкі.— Таму... Спынім на гэтым сёння размову, адкладзем на другі раз.

— На калі? — спытала я.

— На калі хочаце.

— А вы не едзеце нікуды з горада?

— Пакуль не.

— Тады... Давайце заўтра сустрэнемся. Тут жа,— сказала, прапанавала я.

— Добра, заўтра дык заўтра...

Анатоль Іванавіч узяў мяне пад руку, зноў правёў да таго дома, дзе я жыла, упусціў у ліфт і... Мы расталіся.

Назаўтра, як толькі змерклася, я зноў заспяшалася ў парк. Анатоль Іванавіч гэты раз апярэдзіў мяне — ён ужо сядзеў, над нечым глыбока задумаўшыся, на лаўцы пад старымі таполямі, калі я прыйшла на набярэжную. Зноў было цудоўнае цёплае надвор'е, выплыў месяц, ды і зоры надта ж густа высыпалі — быў жнівень месяц, а ў жніўні, як вядома, заўсёды ярка свецяць зоры. І многа іх — быццам усё неба імі вышыта, праколата, расквечана.

— Пра што вы задумаліся? — спытала я, набліжаючыся да лаўкі, дзе сядзеў Анатоль Іванавіч.

— Ды ўсё пра тое ж,— усміхнуўся, як мне здалося, трохі стомлена Анатоль Іванавіч.— Вы задалі мне ўчора некалькі пытанняў, на якія я вам не адказаў, бо пазнавата было. Ды і... Не ведаю, ці варта вас спакушаць далей гэтымі... Іншапланецянамі... Можа, лепш з вамі павесці размову пра больш зямное, патрэбнае вам. Вы ж...— паглядзеў ён на

мяне,— такая маладая, прыгожая... Вам радавацца, жыць зямным трэба...

— Але я не знаходжу радасці ў зямным,— прызналася я.— Начальніца ў мяне... Вы б ведалі, якая мегера. Ад мужчын, з якімі я сустракалася, на кіламетр нясе цыгарэтамі, гарэлкаю... І кожны глядзіць на цябе, каб хутчэй... Словам, узяць, што яму трэба. Ды і ў магазінах, на вуліцы, у кіно... Не тое... Раздражняюся толькі, злую... Ніхто мяне не разумее...

— А тыя, іншапланецяне, думаеце, зразумеюць?

— Не ведаю. Але... Хацелася б, каб зразумелі. Бо тут, на Зямлі... Мяне некаторыя дзівачкай называюць. Увесь час я адна, з кнігамі, картачкамі... Уся і радасць, што на лаўцы вось тут, ля вадаспаду, пасяджу. Ды цяпер вось з вамі душу адводжу...

— Ну, калі так... Але ж,— задумаўся на хвіліну Анатоль Іванавіч,— я мушу вас папярэдзіць... Ва ўсякім выпадку, з майго боку было б злачынствам, каб я гэта не зрабіў... Словам, тыя, хто ўступае ў зносіны з іншапланецянамі, космасам, парываюць сувязь з Зямлёй, ім на Зямлі няма чаго ўжо рабіць, нецікава... Гэта лішнія людзі тут, усё зямное іх не хвалюе...

— Я, здаецца, вам казала ўжо, што мяне і цяпер мала што цікавіць і хвалюе. Пра космас жа, іншапланецян я магу чытаць і думаць, правільней, мроіць гадзінамі, суткамі,— прызналася я.

— Што ж, тады... Давядзецца мне скарыстаць свае сувязі, да сяго-таго пад'ехаць, з сім-тым пагаварыць,— Анатоль Іванавіч памаўчаў, падняў вочы, паглядзеў неяк загадкава і сумна-сумна на мяне.— У вас круціцца на языку, зноў вы хочаце запытаць, хто я? — сказаў ён з усмешкаю.

— Так, вы адгадалі мае думкі,— кіўнула я галавою.

— Я ўчора абяцаў вам адказаць на ваша пытанне. І адкажу. Выбачайце, што адкажу не адным словам. Справа ў тым, што я хачу, каб вы мяне зразумелі. Дык вось,

паслухайце... Я вам гаварыў, што тыя, хто над намі, у чыёй поўнай уладзе мы,— помніце, як мікробы ў колбе! — зацікаўлены трымаць нас у поўнай пакоры, каб мы рабілі толькі тое, што ім трэба. А мы, людзі, імкнёмся да самастойнасці, бунтуем, выходзім з падпарадкавання. І каб такое не здаралася, а калі і здаралася, дык не часта, яны, *тыя*, умешваюцца ў наша жыццё, некаторых *мецяць*... І гэтыя, *мечаныя*, быццам *іхнія* людзі — пранікаюць у лабараторыі вучоных. Ды і ў іншыя арганізацыі, установы... Словам, усюды, дзе ёсць нейкія чалавечыя згуртаванні. Іх задача — не даваць, каб сярод людзей быў лад, мір, была згода, сварыць, натраўляць адзін на аднаго, зрываць тое, што задумана, падбухторваць дурняў супраць разумных... Раней казалі: чорт, нячысцік у яго ўсяліўся ці — чорт, нячысцік паблытаў... І недалёка ад ісціны былі, бо гэты самы чорт ці нячысцік усяляецца то ў аднаго, то ў другога, ён то сварыць, то мірыць, пакуль не дамагаецца таго, што *тым* трэба... Ды гэта — папраўкі па ходзе, карэктывы, што ўносяць тыя, што над намі... А ёсць жа сярод людзей *мечаныя*, у задачу якіх уваходзіць увесь час зрываць усё, што мяркуецца ці плануецца іншымі, шкодзіць, сварыць. Няшчасныя гэта людзі! І галоўнае — яны самі не разумеюць, хто яны, чаму такія. Адны называюць іх зайздроснікамі, другія — няўжыўчывымі характарамі ці проста паганымі людзьмі... А гэта — *мечаныя*, праз каго *тыя*, што над намі, праводзяць свае ідэі, свае планы...

— І вы з гэтых, *мечаных*? — не вытрымала, перапыніла я Анатоля Іванавіча, скарыстаўшы невялікую паўзу.

— Не,— адмоўна пакруціў галавою Анатоль Іванавіч.— Правільней, я таксама *мечаны*, але *мечаны* не так, як тыя, а па-асабліваму. Задача ў мяне іншая. Дый... Усведамляю, ведаю я на багата больш, чым некаторыя. Я... Народжаны ці, правільней будзе сказаць, створаны дзеля таго, каб трымаць сувязь з тымі, хто над намі.

— І як вы гэта робіце? — зацікавілася, аж з лаўкі паднялася, на якую была села, я.— Раскажыце...

— Прыкладна гэтак, як па рацыі, па радыё... Толькі мікрафона ніякага не трэба... Я выходжу на сувязь, і *тыя* выходзяць...

— І што вам гавораць, на мове якой?

— Усё, што хочаш. І на той мове, якую я ведаю...

— Цікава! — аж успляснула я рукамі.— І вы іх бачылі, ну *тых*, што над намі?..

— Некалькі разоў.

— Якія яны з сябе?

— Розныя. Яны могуць прымаць любое аблічча, якое ім захочацца. Звычайнае, чалавечае, ці ў выглядзе не існуючых на Зямлі стварэнняў альбо яшчэ каго. Найчасцей жа — іх ніхто не бачыць, хоць яны і побач. Справа ў тым, што *тыя* добра ведаюць магчымасці нашага зроку і напоўніцу выкарыстоўваюць гэта. А зрок наш не такі і дасканалы. Мы не ўсё бачым, што ёсць на зямлі і ў небе, а толькі невялікую частачку... Ды і слых наш не ўсё чуе... Таму, калі трэба, *тыя* з намі, каля нас, але мы іх не чуем і не бачым... Дарэчы, абмежаванні ў нас не толькі ў зроку і слыху, але ва ўсім, і ў розуме таксама. І далей гэтых абмежавальнікаў... Словам, як кажуць, вышэй сябе не падскочыш... Але людзі ёсць людзі, яны не могуць да чагосьці не імкнуцца, ім усё новае ды новае падавай... І абмежавальнікі даводзіцца адсоўваць. Праўда, прырода чалавека быццам не мяняецца, усё робіцца праз прыборы. Каб пашырыць зрокавае ўяўленне, прыдумалі тэлескоп і мікраскоп, для перадачы інфармацыі — пісьмо, радыё, тэлебачанне... Каб хуткасць руху павялічыць — машыны, цягнікі, самалёты... Але ўсё гэта — дазволена *тымі*... Яно, паколькі не біялагічнае, а механічнае, вельмі лёгка, калі трэба, знішчаецца. Дый магчымасці ў механіцы невялікія. Справа іншая — біялогія. Але туды... *Тыя* не пускаюць і, трэба думаць,— не пусцяць. Там яны гаспадары... Што ж да ўсяго астатняга... То жыць жа чалавеку трэба, трэба карміцца, размнажацца. І дзеля гэтага... Розныя адкрыцці робяцца, правільней, бачнасць адкрыццяў... Што есці, чым абагравацца, што надзець

на сябе, як хутчэй куды дабрацца, чым цікавей і весялей прабавіць час... Словам, гэта сфера самаабслугоўвання, і яна ўдасканальваецца. Што ж да ўсяго астатняга... Там табу накладзена. І за гэтым пільна сочыцца, каб яно не парушалася. Інакш людзі выйдуць з падпарадкавання, іх давядзецца ці знішчаць усіх да аднаго, ці... Невядома, што з імі тады рабіць. Вось цяпер у нас два лагеры — сацыялістычны і капіталістычны, у кожнага атамная і вадародная зброя... У Бога і чорта не верыце, не баіцеся іх, паверце ў рэальную сілу — атамную і вадародную...

— І, вы думаеце, зброю гэтую прыменяць? — спытала я.

— На жаль, я таксама не ўсё ведаю. Усё залежыць, якія вопыты над намі *тыя* праводзяць. Калі яны запланавалі гэта зрабіць, дык зробяць. Калі ж не, толькі для страху, каб у пакоры, боязі чалавецтва трымаць, то... Ды, як кажуць, пажывём — пабачым... Мусіць, інакш кіраваць намі, людзьмі, нельга. Калі ўсе ў згодзе, ладком, мірненька, спакойненька... Не ведаю, да чаго б гэта прывяло. А так — усюды барацьба, змаганне. Бедныя — супраць багатых, дурныя — супраць разумных, падначаленыя — супраць начальства, невукі — супраць вучоных... Тут тое самае, што і ў прыродзе: на тое ж і шчупак, каб карась не драмаў. Сіла — антысіла, прыцягненне і адштурхоўванне, дабро і зло, любоў і нянавісць, жыццё і смерць... І няма нідзе спакою, міру. Ідзе ўсюды барацьба... Яна забірае час і энергію, не дае думаць ні пра што іншае, як толькі пра існаванне — выжыць бы, не даць, каб цябе стапталі, забілі! А гэта якраз тое, што і трэба *тым*...

— Вы так адкрыта пра ўсё гаворыце,— сцепанулася як ад холаду я.— А што калі *тыя* вас пачуюць?

— Яны ведаюць, што я пра іх думаю, ведаюць, што я не задаволены той роляй, якая мне вызначана. І некалькі разоў папярэджвалі...

— І вы?

— Што я? Не сам жа я сябе ствараў, а яны мяне стварылі. Якога хацелі, няхай такога і маюць, церпяць. Дый... Што мне пагражае? Смерць. Дык я і так ведаю, без іх, што

памерці мне давядзецца. А калі... Гэта не мае значэння. Ва ўсякім разе для мяне.

— І для мяне таксама,— прызналася я.— Вось толькі б з імі, *тымі*, як вы іх называеце, звязацца.

— Добра, я звяжу вас,— паабяцаў Анатоль Іванавіч.

— Калі?

— Сам не ведаю. У мяне цяпер, я казаў вам, адпачынак.

— І ад іх,— паказала я няпэўна ў неба,— таксама?

— На жаль, не,— пакруціў галавою Анатоль Іванавіч.— Ад іх адпачынку няма. І не будзе. Ніколі і нідзе. Хіба, можа, на тым свеце.

— А ён, той свет, ёсць?

— Гэтак жа, як у зерня, якое мы мелем на хлеб, ці ў той жывёліны, якую мы забіваем на свой харч...

І Анатоль Іванавіч падняўся раптам з лаўкі, узяў мяне пад руку, сказаў:

— Пойдземце дадому, вам заўтра трэба на працу. Ды і ў мяне... Справы. А што да таго, каб вас звязаць з *тымі*... То я... Звяжу. Як толькі яны пераканаюцца, што вы гатовы іх пачуць, яны пададуць сігнал...

— Як я яго пазнаю?

— Пазнаеце,— яшчэ больш сумна, але ўпэўнена адказаў Анатоль Іванавіч і больш не прамовіў ні слова — моўчкі давёў мяне да дома, дзе я жыла, і гэтак жа моўчкі, нічога не сказаўшы, расстаўся, знік з пад'езда, як толькі схавалася, зайшла я ў выкліканы ім ліфт...

І вось я жыву які ўжо год, чакаю таго абяцанага сігналу. А яго няма і няма. І Анатоль Іванавіч дзе падзеўся — не прыходзіць, хоць я па-ранейшаму штовечар спяшаюся ў парк, сяджу на лаўцы пад старымі таполямі ля вадаспаду. Няўжо ён забыўся на мяне? А мо... Слова не стрымаў, не сказаў нікому пра мяне, не звязаў па нейкай прычыне з *тымі*?.. Ці... і самога яго жывога няма, адпомсцілі яму *тыя* за яго вальнадумства і размовы пра незямное, відаць, не толькі са мной адной?.. А мо ўсё гэта няпраўда, лухта, няма нідзе ніякіх *тых*?..

## Горкая радасць вяртання

### I

Шасцідзесяцігоддзе Івана Кузьміча Адамейкі спраўлялі ў рэстаране. І па тым, хто прыйшоў на юбілей і што гаварылася ў тостах, можна было меркаваць — становішча ў Івана Кузьміча цвёрдае і непахіснае, быць яму доўга яшчэ на сваёй пасадзе.

Аднак і сам Іван Кузьміч, ды і многія з тых, каму выпаў гонар сядзець у той вечар за сталом у рэстаране ў надта ж шаноўнай кампаніі і хто па-сапраўднаму шчыра зайздросціў юбіляру — які ён уплывовы, аўтарытэтны і зусім не стары, рухавы — не скажаш, што яму шэсцьдзясят! — памыліліся. Нешта ці не праз тыдзень пасля трыумфу — а інакш і нельга было назваць гэты юбілей — Івана Кузьміча выклікаў непасрэдны яго начальнік і з нейкай ненатуральнай саладжавай усмешкай і вельмі празрыстымі намёкамі пачаў размову пра здароўе, пра тое, як неабходна яго берагчы, асабліва ў паважаным узросце, і як добра наогул нідзе не працаваць, жыць без усякіх лішніх клопатаў, а потым раптам, павярнуўшыся тварам да Івана Кузьміча, прапанаваў, каб не марудзіў, афармляў як мага хутчэй паперы на пенсію. Апошняе было поўнай нечаканасцю для Івана Кузьміча, ён аж не вытрымаў, падняўся з крэсла, у якім сядзеў насупраць непасрэднага свайго начальніка.

— А там,— паказаў ён рукою ўгору,— як на гэта паглядзяць?

— На што — «на гэта»? — спытаў непасрэдны начальнік — чалавек увогуле мяккі, памяркоўны.

— Ну, што на пенсію я...— ледзь вымавіў ад хвалявання Іван Кузьміч.

— Ухвальна, станоўча.

І, перагнуўшыся праз шырокі паліраваны стол, які быў спрэс завалены паперамі, даверліва, нібыта па-сяброўску, зашаптаў:

— Дарэчы, каб ты ведаў, адтуль і каманда паступіла... Ну, сам разумееш, вызваліць цябе ад пасады, на пенсію паслаць... Можа, кагосьці трэба ўладкаваць... Так што...

Іван Кузьміч больш не садзіўся ў крэсла, а пастаяўшы, быццам у одуме, угнуў у плечы галаву і, ні слова не кажучы, моўчкі падаўся прэч з кабінета. Было, як ніколі, крыўдна, аж у вушах зазвінела, слёзы, здаецца, з вачэй пырснулі... Так шчыраваў, працаваў, як вол, нічога ані не шкадаваў, ні здароўя, ні часу, дбаў толькі пра справу... І вось, бачыш,— аціналі, аддзячылі...

Не помніў, як і да сябе ў кабінет вярнуўся, зноў у крэсла, звыклае, наседжанае гадамі, апусціўся. Паглядзеў на паперы, што акуратна ляжалі і злева, і справа на стале і патрабавалі то ўзгаднення, то проста подпісу, і адсунуў іх далей. «Няхай іншы ўжо ўзгадняе, падпісвае. А я...»

Падняўся з-за стала, паволі прайшоўся па кабінеце, Усё тут было знаёмае, сваё. Вокны, што выходзілі ва ўтульны гарадскі скверык; стол, за якім працаваў, і стол, за якім сядзелі тыя, каго выклікаў на розныя нарады і пасяджэнні; паркетная падлога, засланая зялёнай, з чырвонымі палосамі па краях, мяккай варсістай дарожкай; шафы — яны стаялі ўзбоч сцен — там бялелі, жаўцелі папкі з рознымі дакументамі; падстаўкі з тэлефоннымі апаратамі і шклянкамі, вадою ў графінчыку; тэлевізар, радыёпрыёмнік... Усё патрэбнае, нічога лішняга... На працягу многіх гадоў яно верна, надзейна служыла яму... А цяпер... Будзе служыць іншаму, хто прыйдзе сюды, зойме яго месца... Можа, нават таму, хто ніколі не прыяў, вёў розныя падкопы...

Аж сцехануўся — не па сабе зрабілася.

«Трэба ж, каб так... А я марыў... Пра што толькі не марыў! І пра пасаду новую, вышэйшую, і пра кабінет прастарнейшы, і пра магчымасці больш уплываць на ход розных спраў і падзей... А яно вунь як павярнулася! І тое, што меў, адбіраюць...»

На хвіліну ўявілася — ён бяжыць, бяжыць, а яму — пута на ногі, і ён... падае, ляціць потырч носам у пясок.

«За што, за што? І каб жа сілы не было, здароўе не дазваляла... А то ж... Можа, кагосьці трэба ўладкаваць... Дык... Толькі з-за таго, што кагосьці трэба ўладкаваць... мяне, вопытнага, з такой практыкай і ведамі, у каршэнь?..»

«Табе ж шэсцьдзясят...» — падказала нейкая быццам палахлівая думка.

«Ну дык і што?»

«На пенсію пара. Стары ты!»

«Стары... Няўжо і праўда я стары?»

Стаяў нейкі час як сам не свой, думаў над тым, што хтосьці быццам падказаў, напомніў, сіліўся зразумець, усвядоміць тое.

«Ну, вядома ж, не малады... Але стары?..»

«Шэсцьдзясят ёсць шэсцьдзясят»,— напамінаў, аглавушваў хтосьці нябачны.

«Таксама нібыта праўда. Шэсцьдзясят — гэта не трыццаць, не сорак і нават не пяцьдзясят...»

Зрабіў крок, другі — і зноў спыніўся. Глыбокі, як вечнасць, одум ахапіў раптам.

«І калі, калі мінулі тыя гады? Здаецца ж, і не жыў яшчэ, збіраўся толькі жыць... Усё праца і праца. Адно не паспее скончыцца, новае пачынаецца. Паездкі розныя, нарады... Не жыццё, а быццам адзін суцэльны бясконцы дзень. Асабліва як на пасаду вылучылі... Ды і раней, таксама... А цяпер... На пенсію... А на пенсіі што? Есці, спаць? О не, гэта не мне... Што заўгодна, толькі не гэта...»

Кінуўся як апантаны да тэлефона, трубку зняў... І застыў у нерашучасці...

«Званіць?.. Але каму?.. Хто абароніць, заступіцца, хто не дасць, каб мяне вызвалілі ад пасады, хто паможа?.. Васіль Пятровіч?.. Але ж і ён ужо — лічы — пенсіянер... Пятро Адамавіч?.. Не, гэты не паможа, хутчэй парадуецца, пасмяецца... Трахім Трахімавіч?.. Ён сам ужо даўно без улады, хоць быццам яшчэ і пры пасадзе... Антон Мікалаевіч?.. Не, гэты пра сябе толькі дбае, сабе б толькі добра было. А астатнім... Што яму да ўсіх астатніх... Нават пальцам не паварушыць...»

Сядзеў, перабіраў у думках усіх сваіх уплывовых знаёмых Іван Кузьміч і не ведаў, не знаходзіў тых, хто б памог, хто б за яго заступіўся. Ды і прызнавацца, што вызваляюць ад пасады, прапаноўваюць пайсці на пенсію... Не хацелася, ой як не хацелася. Толькі прызнайся, скажы каму аднаму — увесь горад ведаць будзе...

«Можа, не па тэлефоне... Машыну выклікаць ды паехаць... Але да каго, да каго ехаць, хто зразумее мяне, як сябе, хто маё гора прыме, як сваё?.. Ды нават калі і знойдзецца такі, хто зразумее мяне, як сябе, хто маё гора прыме, як сваё, ці асмеліцца ён з кім-небудзь гаварыць, абараняць, заступацца, асабліва калі даведаецца, што каманда зверху паступіла, месца трэба вызваліць, каб некага ўладкаваць?.. Хто той, каго трэба ўладкаваць?.. Можа, паніжаюць... А можа, павышаюць?.. І ў яго... Такая сіла, такія сувязі, што любы здасца, любы спасуе — не абароніць, нават каб і хацеў...»

Палажыў тэлефонную трубку на апарат, зноў падняўся з крэсла, захадзіў сюд-туд па кабінеце.

## II

Так і не пазваніў у той дзень каму б там ні было Іван Кузьміч, так ні да каго і не паехаў, нікому ні ў чым не прызнаўся, не папрасіў памагчы. Тое ж было і назаўтра, паслязаўтра... Знешне ні ў паводзінах Івана Кузьміча, ні ў ладзе жыцця быццам нічога не змянілася. Раніцою, як і заўсёды, як гэта было гадамі, прыязджала да самага пад'езда блакітная «Волга», забірала, вязла ў тую ўстанову, дзе працаваў, увечары прывозіла зноў дадому. Дома Іван Кузьміч чытаў газеты, глядзеў тэлевізар — праграму «Час» (цікава было ведаць, дзе што дзеецца на свеце, дый каго ўзнагародзілі ці на якую новую пасаду прызначылі), потым піў чай, клаўся спаць. На працы таксама ён, як і раней, падпісваў розныя паперы, званіў па тэлефонах, узгадняў, даваў распараджэнні — словам, кіраваў. Але саслужбоўцы нібыта пра штосьці ўжо

ведалі, здагадваліся, бо былі ці занадта ласкавыя з ім, ці то кпліва-смяшлівыя і ўсё пра нешта між сабою шапталіся, няйнакш абмяркоўвалі, паведамлялі тым, хто яшчэ не ведаў, што Іван Кузьміч... Словам, нядоўга яму быць на пасадзе, апошнія, можна сказаць, дзянёчкі кіруе, апошнія аддае распараджэнні, апошнія падпісвае паперы, усё апошняе тут, ва ўстанове, робіць. Бачыў аднойчы Іван Кузьміч, як ляцела, падаючы, падстрэленая птушка — качка. Здаецца, і крыламі яшчэ махала, і кудысьці быццам імкнулася, ляцела, а ўжо і сама яна, і лёт былі не тыя, не тыя...

Такой падстрэленай птушкай адчуваў сябе ўсе гэтыя дні Іван Кузьміч. Ляцеў, падаў і — галоўнае — не ведаў, што яму рабіць далей, як спыніць свой лёт, сваё падзенне. Усе рухі, воля былі як паралізаваны.

«Ну, на месяц, ну, няхай у лепшым выпадку на год мяне затрымаюць на пасадзе, абароняць,— думаў Іван Кузьміч.— А там, там... Усё адно пакідаць жа службу давядзецца, вечна на ёй не будзеш... Рана ці позна трэба на пенсію ісці. І, можа, лепш не супрацiўляцца, а адразу ж, як прапанавалі, і выправіцца. Калі я дужы яшчэ, не хварэю...»

«Але што, што на той пенсіі рабіць?» — спыняла кожны раз яго думка.

У тыя дні і ўспомніў Іван Кузьміч сваё мінулае, дзяцінства сваё басаногае, вясковае ўспомніў. Як прачынаўся сярод ночы ад крыку пеўняў, як ляжаў у пасцелі і слухаў пераліву самых розных галасоў — і свайго рослага, з высокай шыяй і доўгім жарым хвастом пеюна, і іншых, суседскіх, усёй вёскі... А потым, ужо на світанні, трубіла пастухова труба, рыкалі каровы... Бразгалі, плюхалі на дно калодзежаў цяжкія, акутыя меддзю, драўляныя вёдры, брахалі, аж заліваліся, сабакі... Вішчалі галодныя пасля ночы свінні, гагаталі гусі і качкі, кудахталі куры... Шчабяталі ластаўкі, ціўкалі, здаецца, пад самымі вокнамі, вераб'і... А то чамусьці ўспаміналася, як касілі на балоце сена. У лапцях, па калена ў вадзе. Бацька з касою паперадзе, а ён, Іван, трохі збоку, след у след за бацькам. Каса-літоўка брала

траву добра, аж выядала. Жжык-жжык-жжык... Спыняліся, мянташкай па лязе касы — шах-шах! — і зноў — жжык-жжык-жжык... Праз дзень-два пракосы пераварочвалі і, калі яны падсыхалі, ссоўвалі, зграбалі ў копы. Адзёнак з лазняку бацька масціў, і зносілі да яго копы, складвалі стог... Сенакос канчаўся, жніво надыходзіла. Першы звычайна паспяваў ячмень. За ім — жыта, проса, авёс. Жалі, касілі ўсёю вёскаю, гуртам. Круцілі тугія перавяслы, вязалі снапы. Снапы зносілі, ставілі ў бабкі. Потым вазілі вазамі на ток. Што адразу ж малацілі, а што пакідалі і на пасля, калі зіма прыйдзе, рабіць не будзе чаго. Бо ўлетку, да самай глыбокай восені,— няўпраўка. Не паспееш з жнівом скончыць — лён трэба браць, каноплі. А там, глядзіш, і на бульбе гіч пачарнела, зжоўкла — капаць трэба бульбу. Каня ў плуг — і... І падворваць, і выбіраць, і на воз грузіць, і вазіць, і сушыць... Важданіны з бульбай да самых халадоў хапала, бо яе трэба і перабраць, і ў капцы закапаць. Ды так, каб і не згніла, і не змерзла. За бульбаю — буракі, капуста... Капусту зразалі ўжо ў маразы, і яна аж рыпела і сакаўная-сакаўная была. Прывозілі качаны, скідвалі ў камору, у сенцы. І тады збіралася жаночая талака, пачыналася шаткаванне. Скраблі моркву, рэзалі, крышылі на дробныя кавалачкі, сыпалі ўкроп, соль, тапталі ў бочкі. І, разгарачаныя працаю, вясёлыя маладзіцы, быццам пахваляючыся адна перад адною, хрупасцелі тугімі, крохкімі храпкамі, смяяліся, жартавалі — давольныя жыццём, сваім лёсам, усім тым, што лета дало, а найбольш — ураджаем. А потым, неўзабаве, пара і кабана свежаваць надыходзіла. Швайкай яму пад левую лапатку, і, калі ён знемагаў, падсцілалі салому, клалі на яе кабана, саломай — залацістай, шапаткой — накрывалі яго і падпальвалі, раскладвалі цэлае вогнішча — смалілі. І ўжо жоўценькага, абскрэбенага нажамі, мылі на дварэ — аж пара з яго валам валіла. Ну а пасля... Уносілі, як бога, на руках у хату, браліся разбіраць. Сала — доўгія белыя палосы — складвалі ў адно месца, мяса — у другое. Асобна клаліся і галава, ногі, вушы, хвост... А тым часам палілася

ў печы, ставілася поўная патэльня свежыны, і ўжо сквірчэлі, напаўняючы хату самымі размаітымі смачнымі пахамі, аж у носе казытала, слінкі цяклі,— шкваркі... Ці на гарышча хто-небудзь лазіў, прыносіў адтуль — такіх увосень кіслых, аж у рот не ўзяць, а цяпер, у мароз, смачных — за вушы не адцягнеш — журавін ці ле́скавых яблык...

Згадваліся і тыя балоты, што распасціраліся, век векавалі навокал вёскі. Вясною іх залівала вада. Ды так, што з вёскі выйсці нікуды нельга. Хіба толькі на чоўне можна было перапраўіцца на сухое. Дзікія качкі, кнігаўкі, буслы, журавы... А камароў, аваднёў, машкары — цэлыя хмары! І паратунку ад іх нідзе нікому — ні жывёле, ні чалавеку. Раскладвалі курадым, укрывалі цела чым толькі можна. Ды камары, авадні, мошкі знаходзяць усё адно, дзе ўкусіць, і кусалі, кусалі... А жаб колькі! Па вечарах такія, бывала, канцэрты наладжвалі, што аж у вушах глухла. А ўжо што да вужоў, гадзюк, чарапах, мядзянак розных... Кроку не ступіш, каб на іх не патрапіць. І ўюноў, рыбы... Вось як спадзе трохі вада, бяры комлю — і гайда лавіць... Лотаць зацвіце — аж жаўцеюць балоты. А потым іншыя краскі — люцікі, зязюлькі, пеўнікі, галкі... К восені балоты жухлі і рыжэлі. Падаў снег, але ў балоты ўсё адно не ўлезці — рэдка калі яны замярзалі. Часцей жа багна аставалася багнай на ўсю зіму. У сухія ж гады, калі вада спадала, балоты гарэлі. Дым аж вочы выядаў, засцілаў усё навокал густою павалокаю, асядаў у горле. І тушыць балоты ніхто нават не спрабаваў — не атушыш. Ямы па некалькі метраў у глыбіню выгаралі, дрэвы — бярозы, вольхі, сосны — усё адно што ў прорву падалі. Іскры толькі ўгору фантанам пыхнуць — і ўсё. Тут стаяла купка дрэў — тут яе няма. Людзі, жывёла аж знебываліся, месца сабе нідзе не знаходзілі...

«Цікава, што цяпер там? Я ж, як паехаў з вёскі, так і не наведваўся. Ды і што мне там было рабіць?»

«Як гэта што? — не згадзілася з ім нейкая ўпартая думка.— Хоць на могілках пабываць, пастаяць ля магілы бацькі і маці, пакланіцца... Можа ж, не праз каго ж небудзь, а праз цябе пайшлі яны раней часу на той свет...»

Згадалася, згадалася і тое. Ён, Іван, камсамолец быў. І заядлы. Школу, дзявяты клас, канчаў, пра інстытут марыў. А тут... Немцы прыйшлі. Ні дня не стаў чакаць — у лес, у партызаны, падаўся. Відаць, хтосьці з вяскоўцаў яго бачыў, калі ён уночы да бацькоў з лесу прыходзіў, торбу з харчамі браў. І выдаў немцам. Тыя і ўзялі бацьку, маці. Патрымалі нешта ці не з тыдзень у мястэчку ў камендатуры, а потым прывезлі назад у вёску і...

«Трэба было хоць помнікі на магілах паставіць,— папракнуў сябе Іван Кузьміч.— А то... Сын, называецца... Ды і сястра ж родная, Агапа, у вёсцы жыве...»

Быццам да раны дакранаўся Іван Кузьміч, калі ўспамінаў Агапу. Жыла яна ў той самай вёсцы, Ліпаўцы, дзе і нарадзілася, дзе і ён, Іван Кузьміч, некалі жыў. Жыла адна, бо дзеці — сын і дачка — паехалі з вёскі. Завербаваліся і паехалі. Сын ажаніўся, дачка выйшла замуж. І жылі далёка, аж на Сахаліне. Агапа ж асталася дома, у вёсцы. Рабіла ў калгасе, ела хлеб з працы рук сваіх. Зрэдку яму, брату, пісьмы пісала. А то і пасылачку іншы раз прысылала, найчасцей, калі кабана біла — некалькі штыглікаў сала, каўбаску дамашнюю, кавалачак крывянкі і каўбушка. А збоку, у мяшэчак асобны,— гарбузікаў насыпле...

«Свая, родная,— думаў у такія хвіліны ён, Іван.— І не-не дый успамяне брата...»

І расчульваўся тады, на крыўду, што насіў, быццам камень, на сястру, забываўся — папракнула яна некалі, сцебанула, бы трапкачом па вачах, што ён, Іван, вінаваты ў смерці бацькі і маці: каб, маўляў, не ён, не яго партызанства, жылі б бацька і маці, не расстралялі б іх немцы...

І ў тым, што не наведваўся ў вёску ён, Іван, вінавата была, вядома ж, і яна, Агапа. Не хацелася сустракацца з ёю, чуць папрокі...

«Але цяпер... І Агапа, і я не тыя ўжо... Дый боль... Не той... Задаўніўся, прытупіўся...— падумаў Іван Кузьміч.— І мне... Паехаць трэба ў вёску... Паглядзець, што там... У Агапы пабываць, на магілах бацькі і маці... Ды, можа... Калі што якое...

І пажыць. Няхай тут выслужваюцца, адзін перад адным шчыруюць, паперы розныя пішуць, засядаюць, а я... Пажыву, як некалі, даўным-даўно ў маленстве, у дзяцінстве жыў... І мяне ніхто бачыць не будзе, і я таксама нікога бачыць не буду. Вось як аформлю, атрымаю пенсію, дык і паеду, ні дня ў горадзе не буду»,— сказаў сабе, вырашыў Іван Кузьміч.

**III**

Пенсію аформілі хутка, праз які месяц. І ўжо ў першай палове мая, перад самым Днём Перамогі, арганізавалі Івану Кузьмічу афіцыйныя провады — паставілі на стол кветкі, адкаркавалі бутэльку шампанскага, сказалі на развітанне некалькі прамоў («як усе яго любілі і як яго ўсім не будзе хапаць»), падарылі чыгуннага каня і транзістарны радыёпрыёмнік («каб здаровы і дужы быў, як конь; і каб надта не сумаваў — калі што, слухаў радыё») — і... апошні раз завезла Івана Кузьміча службовая «Волга» дахаты.

Нялёгка ўсё гэта было перажыць Івану Кузьмічу. Суцяшала хіба толькі адно — у кішэні ляжаў білет на звычайны рэйсавы міжгародні аўтобус — ён, гэты аўтобус, павінен быў давезці Івана Кузьміча да мястэчка, ад якога было кіламетраў васямнаццаць да роднай Ліпаўкі.

«Паеду пагляджу, што там і як,— думаў Іван Кузьміч.— Калі ўмовы нішто сабе, то вярнуся, захаплю самае неабходнае ды і жыць астануся ў Ліпаўцы. Вясною, улетку буду памагаць сеяць, касіць, убіраць, малаціць, а зімою — дровы сячы, на паляванне хадзіць... Са знаёмымі сустрэнуся, хоць нагаваруся. Жылі ж неяк людзі там, у вёсцы, поле ўраблялі, хлеб сеялі, дзяцей гадавалі. Цікава, хто чаго дамогся, да старасці з чым прыйшоў? Ды і вёска, Ліпаўка, як цяпер выглядае, што там змянілася? Не адзін жа дзясятак гадоў мінуў з таго дня, як быў я там...»

Згадвалася — і неаднойчы — паездка тая... Ён, Іван, звольнены ў запас, яшчэ ў афіцэрскай форме, пры пагонах, падацца не ведаў куды — толькі што закончылася

вайна, амаль чатыры гады ён праваяваў, то ў партызанах, то ў рэгулярнай арміі, аж да Германіі, Берліна, дайшоў. Спецыяльнасці ніякай ён не меў, тое, што вучыў некалі ў школе, амаль забылася, выветрылася. Праўда, нешта і набылося, што можна, відаць, назваць жыццёвым вопытам. Куды ж тады было яму ехаць, як не ў сваю родную вёску, да свайго кубла. Да мястэчка, Ельнікаў, сяктак дабраўся дзе цягніком, дзе на спадарожных машынах, фурманках. А з Ельнікаў да Ліпаўкі ўжо дабіраўся пешкі. Ды хадзіць яму было не прывыкаць — не такія адлегласці перамерваў нагамі, асабліва як у партызанах быў, на розныя заданні аж у суседнія вобласці забрыдаў. Ішоў ён, Іван, тады па дарозе ў родную вёску і аж не верыў, што ўсюды цішыня тут стаіць, вайна скончылася. А цішыня сапраўды была рэдкая, гаючая. Толькі птушкі спявалі ды дрэвы, што скрозь паўз дарогу густа, сцяною, стаялі — дубы, бярозы, ясені, сосны,— шумелі. І... грыбы — баравікі — то тут, то там сядзелі. Усе як на падбор, моцныя, тугія — ні чарвяточынкі нідзе. Споднюю кашулю з сябе ён, Іван, тады зняў і поўную назбіраў баравікоў. Не хочучы, бо нават з дарогі нідзе не зварачаў, а браў толькі тыя, што паўзбоч сядзелі і якіх проста грэх было не ўзяць...

Вёска сустрэла Івана радасна. У бацькоўскую хату, дзе жыла сястра, Агапа, і куды ён завітаў — дзверы проста не зачыняліся, ішлі і ішлі людзі. Усіх цікавіла — і дзе ён быў, як ваяваў, і ці не паранены, а найперш, што больш за ўсё клапаціла кожнага — гэта ці знаёмых каго сустракаў, ці ведае што-небудзь пра каго з іх.

Агапа таксама была рада, што брат жывы, здаровы з вайны вярнуўся. Грыбоў насмажыла, нават бутэльку самагонкі знайшла, на стол паставіла. І ўсё расказвала, расказвала, як яна хавалася, баялася, каб і яе немцы гэтак жа не застрэлілі, як і бацьку, маці...

Схадзіў тады ён, Іван, і на могілкі, ля крыжоў, што на магілах бацькі і маці яшчэ не зусім пачарнелі, галаву апусціўшы, пастаяў. Не ўтрымаўся, нават слязу скупую, мужчынскую, пусціў, заплакаў...

31. Зак. 1877

— Раней трэба было пра бацькоў думаць,— сказала, кінула як папрок тады сястра, Агапа.— А цяпер... З таго свету іх не вернеш...

Разумеў, усё разумеў Іван. І ўсё ж... Пакрыўдзілі яго, за жывое кранулі тыя словы. Падумаў: лепш не жыць, не быць у вёсцы, з'ехаць адсюль куды-небудзь... Бо і магілы гэтыя... І Агапа... Хочаш не хочаш, а напамінаць, заўсёды будуць напамінаць пра бацьку і маці, іх такую раннюю і недарэчную смерць...

І з'ехаў. Якраз тады ішло будаўніцтва двух вялікіх заводаў у Мінску, ён, Іван, прачытаў пра гэта ў газетах і...

Уладкаваўся на будоўлю, у вячэрнюю школу, каб веды ўзнавіць, паступіў. Потым, завочна,— і ў інстытут. Працаваў і вучыўся. А там неўзабаве і на іншую працу, па спецыяльнасці, перайшоў. Жаніўся. І хоць пісала сястра, Агапа, з вёскі пісьмы, прасіла, каб прыехаў,— не ехаў ён, Іван. І часу не вельмі было, ды і не цягнула дамоўка. Не хацелася раны вярэдзіць, тое, што некалі здарылася, зноў успамінаць... Сястра, Агапа, праўда, сама разы два-тры да яго прыязджала. І калі замуж выйшла, і яшчэ неяк. Але і ў яе жыццё не лепшым чынам пайшло — муж, Стась, пажыўшы гадоў з сем, пакінуў яе з двума дзецьмі, сам некуды з'ехаў. А потым і дзеці павырасталі і таксама паз'язджалі з вёскі. Адна зноў Агапа асталася. Пісала неяк, што жыве не горш ад астатніх людзей. І прасіла, прасіла, каб ён, брат, прыехаў пабачыцца, пагаварыць...

Але ён, Іван, не ехаў...

«Здзівіцца Агапа, калі ў хату да яе як снег на галаву звалюся,— думаў Іван.— Вачам сваім не паверыць...»

## IV

Зборы ў дарогу занялі няшмат часу. За якога паўдня Іван Кузьміч і купіў, што трэба, і чамадан спакаваў. Ды так, што нават жонка ні пра што не здагадалася. Падумала, няйнакш,— муж у нейкую чарговую камандзіроўку

едзе. Гаварыць жа, што ён, Іван Кузьміч, ужо не працуе, не хацелася.

«Няхай, само сабой усё стане вядома,— падумаў Іван Кузьміч.— Бо інакш...»

Не, не было ў Івана Кузьміча тых адносін з жонкаю, якія ў іншых бываюць, не была жонка яму сябрам і самым блізкім, дарагім чалавекам, даўно не гарнулася ў яго да яе душа. Можа, таму так і аддаваўся ўвесь без астатку ён працы, бо шчасця, радасці дома не меў. А пачыналася ж усё быццам добра, лепш і не трэба... Потым ужо, калі дачка, Іна, у іх нарадзілася, даведаўся Іван Кузьміч, што жонка яго, Надзя... жыла ўжо з мужчынам. І не з кім-небудзь — з прыслужнікам фашысцкіх акупацыйных улад... Нібыта баялася, каб на работы ў Нямеччыну не вывезлі. А тым часам... Хто ведае, як там і што было... Хацеў адразу ж кінуць яе, развесціся. Але дзіця, дачушка Іна, стрымала. Надта ж маленькая, кволенькая была яна і да бацькі лесцілася, з рук не злазіла. «Ладна,— падумаў тады Іван Кузьміч,— падгадую трохі малую, тады Надзю кіну». Але... Так і не кінуў. Сынок, Паўлік, нарадзіўся, і зноў, ужо да сына, прыкіпела ў Івана Кузьміча душа. Пагадаваў, паставіў на ногі, усё, што трэба, здаецца, дзецям даў. Дачка замуж выйшла, сын жаніўся. Але радасці, шчасця ў хату не прынеслі. Сын амаль спіўся, ні жонкі, ні дзяцей не глядзеў. І хоць ён, Іван Кузьміч, памог сыну займець асобную кватэру, не ўжыўся той з сям'ёю, да бацькі назад вярнуўся. І дачка не ўжылася са сваім мужам. Нарадзіла малое, а потым і яшчэ адно... Ад каго другое — не сказала. Так і жывуць усе ў яго кватэры. Сын п'е, а дачка... Прыводзіць да сябе мужчын, начуе з імі... І слова супраць не скажы — жонка на абарону сына, дачкі зверам кідаецца... І раней, з тых дзён, як даведаўся ён, Іван Кузьміч, што Надзя жыла да яго з некім, ды яшчэ з прыслужнікам акупацыйных улад, і, выходзячы замуж, не прызналася яму ў гэтым, не было асаблівай блізкасці, быццам уракнуў яго хто, чужая, зусім чужая яна яму стала. А цяпер — і пагатоў. Не, не, знешне нібыта

ўсё прыстойна было. Сям'я як сям'я. Толькі Іван Кузьміч усё больш і больш замыкаўся ў сабе, у працу з галавою закопваўся. І аддаляўся, аддаляўся ад Надзі. А потым, калі ўбачыў, што і дзеці не ў яго ўдаліся, не па яго слядах пайшлі,— і ад дзяцей. Не цягнула, не вабіла Івана Кузьміча сям'я. Таму і заседжваўся на працы пазней за іншых. Вернецца дадому, тэлевізар паглядзіць, чай пап'е — і спаць. А ледзь раніца — зноў на працу. Адпачываць таксама Іван Кузьміч ніколі разам з жонкаю, а тым больш з дзецьмі, не ездзіў. Ім асобна пуцёўку прасіў, сабе — асобна. Бо жонка, дзеці раздражнялі яго, надакучалі. А так, адзін, ён сапраўды адпачываў, гаіўся душою...

«Хто яго ведае,— думаў іншы раз Іван Кузьміч.— Каб Надзя не падманула мяне, не было ў яе таго прыслужніка... Можа б, па-іншаму ўсё ў сям'і склалася. А так... Ды што шкадаваць таго, чаго няма і што, як бы ні хацеў, ужо не паправіш, не вернеш. Ніколі, ніколі не вернеш...»

І цяпер, збіраючыся да сястры ў вёску, зноў пашкадаваў Іван Кузьміч, што ў яго дома, у сям'і, ладу, шчырасці, даверу няма. Гаварыць, што на пенсію выправілі, куды ехаць сабраўся, і то... Быццам чужыя мы людзі. Ды дзе там чужыя... І сярод чужых шчырасць, давер бываюць, а то... Нібыта варожасць якая, злосць. Сказанае нават мімаходзь слова раздражняе. Добра, што кватэра вялікая. Кожны пакой свой мае. Прабяжыць па калідоры, куды трэба — на кухню, у ванну ці ў туалет,— і хаваецца, як у нару, у свой пакой. І калі хто на калідоры ці на кухні — другі не спяшаецца ісці, чакае, каб не сустракацца.

«Ну і сямейка,— не-не дый круціў галавою Іван Кузьміч.— Няхай ужо са мною ні ў каго злагады няма, але ж і між імі самімі — жонкаю, дачкою, сынам... Бы каты з сабакамі жывуць. Гыр ды гыр...»

Шкадаваў, неаднойчы шкадаваў Іван Кузьміч, што ў свой час не развёўся з Надзяю. І яна не мучылася б, ды і ён сам... І дзеці... Іх, дзяцей, найбольш шкада было. «У нас з Надзяю хоць бачнасць сям'і ёсць, а ў іх... і таго няма».

Спрабаваў ушчуваць і дачку, і сына Іван Кузьміч, гаварыць, што не так, як трэба, яны жывуць.

— А вы... Нібы вы з мамаю жывяце так, як трэба? — кідалі папрок яму і сын, Павел, і дачка, Іна.

Угінаў галаву ў плечы Іван Кузьміч і хаваўся ў сваім пакоі. Праўда, усё праўда...

І рабіць што далей — не ведаў, ані не ведаў Іван Кузьміч. Так і да пенсіі, бачыш, дажыў... А цяпер... Што цяпер?..

**V**

Увечары, на заходзе сонца, выклікаў Іван Кузьміч таксі, паехаў на вакзал. Аўтобус, нарыхтаваны ў дарогу, ужо стаяў на пляцоўцы. І Іван Кузьміч, пагрузіўшы чамадан у багажны адсек, зайшоў у салон, знайшоў сваё месца — яно было якраз у сярэдзіне, ля акна,— сеў. І стомлена зажмурыў вочы — чамусьці ўспомнілася, як ездзіў аўтобусамі, калі закончыў інстытут, у розныя камандзіроўкі — амаль штотыдзень. І часцей за ўсё на Палессе — у Лунінец, Пінск, Давыд-Гарадок... Бо тыя, з кім ён працаваў, не рупіліся надта ездзіць, часцей выпраўлялі ў дарогу яго, маладога спецыяліста. Ён не адмаўляўся, асабліва калі з жонкаю нелады пайшлі. Новыя мясціны, новыя ўражанні... Яны неяк па-іншаму настрайвалі, прымушалі больш аптымістычна глядзець на жыццё, нават на адносіны ў сям'і... Сустрэчы з людзьмі, прынамсі, пераконвалі Івана Кузьміча ў адным — кожны жыве не так, як хоча, а як у яго атрымліваецца, складваецца. А што ўжо да сем'яў... Рэдка можна сустрэць тых, хто задаволены — муж жонкаю, а жонка мужам. І не ўсе спяшаюцца разводзіцца, большасць жывуць. Сварацца, не гавораць адно з адным па тыдні-два, нават, здараецца, б'юцца, а ўсё ж трымаюцца адно аднаго. То дзеці, то кватэра, то яшчэ што-небудзь не даюць сям'і распадацца...

«І ў мяне тое самае,— думаў тады Іван Кузьміч.— Каб раней я пра Надзю праўду ведаў... А цяпер, калі дзеці, кватэра... Ды і ці лепшая новая жонка трапіцца? А раптам гуляць з іншымі пачне ці яшчэ што-небудзь зробіць такое, што...»

І не кідаў Іван Кузьміч Надзю, жыў з ёю.

«А можа, трэба было не шкадаваць нікога — ні дзяцей, ні Надзі? — падумаў цяпер, седзячы ў аўтобусе, Іван Кузьміч.— Можа б, з новаю жонкаю інакш у мяне ўсё склалася? Не чужыя б мы былі. Пайшоў бы на пенсію і жыў бы як чалавек. А так...»

Расплюшчыў вочы — аўтобус быў ужо амаль запоўнены. Знайшоўся і той, хто павінен сядзець побач — ім аказаўся малады рослы хлопец, з выгляду спартсмен — у няновых, паношаных, выцертых да белага на каленях і ззаду джынсах, моднай вельветавай куртачцы. Ён, відаць, быў стомлены, здарожаны, бо, як толькі апусціўся на сваё месца, так і адкінуў спінку крэсла, смачна разявіў рот — няйнакш, задрамаў ці заснуў.

Аўтобус скрануўся, выруліў на шырокі праспект і, набіраючы хуткасць, памчаў па асветленым ужо электрычнымі агнямі горадзе, кіруючыся на Магілёўскую шашу.

Іван Кузьміч паглядзеў на пасажыра, што, разявіўшы рот, мерна пасапваў носам, спаў побач, і сам адкінуў спінку крэсла.

«І мне, мабыць, трэба падрамаць,— падумаў.— Дарога ж няблізкая. Ноч усю ехаць давядзецца».

Заплюшчыў вочы... І... убачыў сябе ў маленькім чысценькім і вельмі ўтульным пакойчыку, у ложку, на мяккіх пуховых падушках. Побач жа, прыпаўшы да яго ўсім сваім гарачым целам, ляжыць...

«Чакай, дзе гэта я? І хто, хто са мною?» — быццам імкнуўся затрымаць сон, сіліўся нешта яшчэ зразумець Іван Кузьміч.

«Ды гэта я?... Надзя... Навальніца надышла...»

«А-а!» — здагадаўся, успомніў пра ўсё Іван Кузьміч.

Было, было такое — праводзіў ён Надзю да яе хаты на Старажоўку. А навальніца і нахапіла іх знянацку. Такі лівень лінуў, што схавацца не было дзе. І Надзя запрасіла яго зайсці ў хату, перачакаць навальніцу. Ускочылі ў сенечкі, нырнулі ў цемры ў нейкі пакойчык, як потым высветлілася,

Надзін. І сядзелі там, мілаваліся, цалаваліся. А потым Надзя і пасцель паслала, бо навальніца і не збіралася аціхаць — ліў як з вядра дождж, бліскалі раз-пораз, асвятляючы ўсё навокал, маланкі, бухаў, грымеў, аж неба расколвалася, гром. І яны з Надзяю ляжалі ў ложку, упершыню разам у пасцелі, і было, як ніколі, добра... Асабліва калі Надзя прыхінулася ўсім сваім гарачым целам, пачала прагна, жадобна цалаваць...

Паплыло, паплыло, бы ў тумане, усё перад вачыма...

**VI**

Дарожны сон, ды яшчэ ў аўтобусе,— неспакойны. І Іван Кузьміч разоў колькі прачынаўся, то пры святле, у нейкіх гарадах, то проста цёмначы дзе-небудзь у полі ці ў лесе. Спахапліва расплюшчваў вочы, непаразумела лыпаў, сілячыся даўмецца: дзе ён і што з ім? — і зноў паступова супакойваўся, сцішваўся і засынаў. Канчаткова ж абудзіўся, пазбыўся ліпкай павалокі сну ўжо на світанні, калі, адагнаўшы суцінкі, пачало паказвацца з-за лесу сонца — маладое і зыркае. Ехалі якраз па полі, зялёным, укрытым густою — аж шызаю ад расы — азімінаю. Дзесьці ўдалечы мільганула вёска — з настаўбурчанымі ў неба жураўлямі калодзежаў, антэнамі тэлевізараў, чырвонымі камінамі і стрэхамі хат. Было ўжо, мусіць, Палессе, бо вынырнула раптам нешта зусім нечаканае — сталёвая вышка, а каля яе штосьці таксама сталёвае — быццам вялізныя вагі: нешта там то падымалася, то апускалася. «Ды гэта ж нафту тут здабываюць!» — успомніў Іван Кузьміч і прыпаў бліжэй да запацелага акна, каб лепш разгледзець. Але не паспеў — аўтобус ускочыў у дарожную абсаду, а потым неўзабаве і ў лес. Замільгалі дубы, ясені, клёны, сосны, бярозы, асіннік, грабняк, арэшнік... Такіх змешаных, густых лясоў няма ў Беларусі нідзе, толькі хіба на Палессі. І Іван Кузьміч згадаў, што і вырас ён у такім лесе — хадзіў і па ягады, і па грыбы, і па арэхі... Ды і партызаніў таксама ў такіх

вось лясах. Зімою халаднавата, галаднавата было. Затое летам, увосень і яды хапала, ды і не баяліся куды б там ні было хадзіць. Нават у вёскі. Ды і на дарогах ні немцам, ні паліцаям патолі не давалі. Як толькі хто-небудзь едзе ці ідзе — затрымлівалі ці агонь адкрывалі. І калі блакада пачыналася ці аблога — не хваляваліся вельмі: ведалі, што не зловяць, уцякуць. Раз, праўда, і ім не пашанцавала — самі на нямецкую засаду напароліся. Проста пры выхадзе з лесу. Шэсць партызан тады не вярнуліся з задання... І сярод іх Коля Дзямідчык, лепшы сябра. З ім ён, Іван, і ў школе за адной партай сядзеў, з ім разам і ў камсамол уступаў, і ў партызаны ў лес пайшоў...

«Я вунь колькі гадоў яшчэ жыву, жаніўся, дзяцей выгадаваў, а ён... У зямлі... Даўно, даўно ў зямлі,— падумаў Іван Кузьміч.— І нават не ведаю, дзе пахаваны. Казалі, быццам забралі немцы тады забітых, кудысьці павезлі з сабою. А куды — ніхто так і не даведаўся. Не да таго было — блакада пачалася. Кінулі тады на партызан немцы і танкі, і самалёты. З мінамётаў, гармат абстрэльвалі. Давялося аж у суседнюю вобласць адступаць...»

Уявілася тое — як ішлі, абчапляныя рознай амуніцыяй, амаль без прывалаў, і днём і ноччу па дарогах, а найчасцей — без дарог, па лясах і балотах. Ён, Іван, тады, як на бяду, прастудзіўся, пал пачаўся. Ды такі, што на нагах стаяць не мог, падаў. Асабліва ўвечары і пад раніцу. Давялося на падводу прасіцца, ехаць разам з параненымі...

«Малады быў,— успомніў сябе таго, ранейшага, Іван Кузьміч.— Ні пра што іншае не думаў, толькі пра адно — немцаў бы, фашысцкую погань з зямлі сваёй прагнаць...»

Калі вызваленне прыйшло, разгубіўся, рабіць не ведаў што. І ад радасці, што немцаў прагналі, жыць астаўся, і так... Адвык жа за вайну што б там ні было рабіць. Ды доўга пагуляць не давялося — у армію, на фронт забралі. Не, перш чым на фронт, вучылішча скончыў, афіцэрам стаў. Артылерыстам. І ўжо з баямі, па Беларусі, Польшчы аж да Германіі, Берліна...

«Некаторым бы з цяперашніх маладых ды ранніх тое перажыць, што мне, ды і ўсім з майго пакалення,— думаў неаднойчы ён, Іван Кузьміч, гледзячы і на сына свайго, Паўла, ды і на іншых.— Можа б, цанілі тое, што маюць, што мы, не шкадуючы сябе, здабылі, не марнавалі б гэтак, як марнуюць, сваё жыццё. Хто ў гарэлцы топіцца, а хто кар'еру цярэбіць. І дзе толькі навучыліся такому — ведаюць, каму пакланіцца, услужыць, каго пры кім абляяць, дзе як выступіць, а на каго і ананімку напісаць... Глядзіш — дарога і свабодная, можна імчаць наперад. Вось і мяне,— дакрануўся да свайго, балючага, Іван Кузьміч.— І не агледзеўся, як сапхнулі. Быццам пыл, непатрэбшчыну якую змялі...»

Зноў — які ўжо раз! — калі ўспамінаў, што з ім зрабілі, гарачынёю, быццам варам, абдало — скруха, крыўда агарнулі.

«Мог жа яшчэ гадоў колькі папрацаваць! А так... І заняцца чым — не ведаю. Быццам і тады, як партызанка скончылася, на фронт не бралі... Дык тады вайна ішла, ворага трэба было дабіваць. І я ведаў — не сёння, дык заўтра паклічуць, зноў зброю ў рукі дадуць. А цяпер... Што чакае мяне цяпер?»

Павёў вачыма вакол сябе. Пасажыры ў большасці папрачыналіся. Хто пазяхаў, хто праціраў рукою вочы. Сусед па сядзенні таксама ўжо не спаў. Дастаўшы з кішэні кашалёк, непрыкметна пералічваў грошы — пяцёркі, траячкі, рублі.

— З самай Варкуты еду,— павярнуўшыся раптам да Івана Кузьміча, сказаў хлопец.

— З Варкуты? — здзівіўся, і непадробна, Іван Кузьміч.

— Ага. А яшчэ раней у Казахстане на цаліне быў я, на БАМе,— ахвотна расказваў, быццам знаёмаму, хлопец.

— Чаго гэта цябе так па свеце носіць? — не мог, каб не запытаць, Іван Кузьміч.— Што, доўгага рубля шукаеш?

— Маці мне тое самае кажа,— засмяяўся дабрадушна, шчыра на ўсе свае роўныя, белыя зубы хлопец.— Але ў мяне ўсё іначай. На свет хацеў пагледзець, пападарожнічаць. А што да грошай, дык іх проста так, за

прыгожыя вочкі, нідзе не даюць. Мазалём, гарбом, зарабляць іх трэба!

— І куды ж ты цяпер едзеш?

— Дадому, у вёску сваю. Напісала маці пісьмо, што ў нас ужо не калгас, а саўгас... Дый... Калі шчыра казаць, абрыдла валачыцца па свеце... Час пра аселасць, сям'ю падумаць... Карані свае, дзе зазямліцца...

— А сам адкуль ты, дзе нарадзіўся?

— Ды я... З Ліпаўкі. Вёска такая ёсць у Ельніцкім раёне.

— З Ліпаўкі? — зноў непадробна здзівіўся Іван Кузьміч.— Чый жа ты будзеш?

— Наталлі Расамахавай. А вы што? Хіба Ліпаўку веведаеце? — паглядзеў больш уважліва на Івана Кузьміча хлопец.

— Не толькі ведаю — я сам родам адтуль,— прызнаўся Іван Кузьміч.

— Нешта я вас не помню,— не спускаў вачэй з Івана Кузьміча хлопец.

— Не помніш, кажаш? — сумна пахітаў галавою Іван Кузьміч.— І я, брат, таксама многага не помню. Нават калі ты сказаў, чый ты, не магу ўявіць, хто такая Наталля Расамахава, дзе яна жыла, хто яе бацька.

— Даўно, мусіць, не былі ў Ліпаўцы?

— Даўно. Лічы, з самай вайны.

— Так далёка жылі, што нельга было прыехаць?

— Ды не, блізка я жыў, у Мінску.

— А-а, дык вы, відаць, Адамейкаў Іван. Так-так, цяпер ясна,— усё не спускаў і не спускаў вачэй з Івана Кузьміча, глядзеў і глядзеў яму ў твар хлопец.— А ведаеце, чаму я здагадаўся?

— Ну?

— Я ў сястры вашай Агапы некалькі разоў быў. Як у школе яшчэ вучыўся. Мы музей захацелі ў школе арганізаваць. Ага, пра самых вядомых людзей нашай вёскі. Хто калгас пачынаў, хто ваяваў, партызаніў, хто ў начальства якое выбіўся. Дык я да сястры вашай хадзіў, каб яна

здымак ваш дала, расказала што-кольвек пра вас. А потым і пісьмо вам пісаў...

Успомніў, згадаў Іван Кузьміч — і праўда было такое пісьмо яму. І падпісаў яго — «вучань шостага класа Васіль Караед».

— Дык гэта ты і будзеш той Васіль Караед?

— Ага, а па-вулічнаму нас яшчэ Расамахі завуць...

Не, як ні сіліў сваю памяць Іван Кузьміч, не мог, ніяк не мог успомніць, хто такая Наталля Расамахава, бо было гэтых самых Караедаў-Расамах амаль палова Ліпаўкі.

— А як там сястра мая, Агапа, жыве? — спытаў урэшце Іван Кузьміч.

— Цяпер-то і я не вельмі ведаю. Больш як тры гады дома не быў! А раней... Соткі сеяла, гаспадарку глядзела. А ўсё астатняе... Словам, жыла...

Аўтобус павярнуў направа, і Іван Кузьміч убачыў, што ўязджаюць яны, мяркуючы па надпісе, што мільгануў каля дарогі,— у мястэчка, Ельнікі. Толькі ж з якога гэта боку?.. Цагляныя, на тры, чатыры паверхі дамы, шырокая асфальтаванка, плітачныя тратуары, узбоч якіх раскашуюцца зялёныя рослыя таполі... Не, усяго гэтага не было раней у Ельніках. Няўжо тут усё так змянілася?

— Не пазнаць — Ельнікі гэта ці не Ельнікі? — не то спытаў, не то ўсклікнуў Іван Кузьміч.

— І Ліпаўкі нашай не пазнаеце,— засмяяўся Васіль Караед.— Там жа таксама — пісала маці мне — камяніцы пабудавалі. І балоты паасушалі...

— А як нам з Ельнікаў туды дабірацца?

— Дабяромся,— махнуў рукою Васіль.— Аўтобус тры разы на дзень ходзіць. Сядзем ды паедзем.

Зноў прынік да акна Іван Кузьміч, хацеў хоць што-небудзь пазнаць з тых ранейшых драўляных Ельнікаў, якія ведаў з даваенных і пасляваенных гадоў. І як ні сіліўся, як ні глядзеў, нічога ані не пазнаваў. Ні тых ранейшых крывых, вузкіх, з драўлянымі тратуарамі паўзбоч вуліц і вулачак, ні крытых гонтаю і саломаю хат, што, здавалася, аж паўрасталі

ў зямлю, ні гразі, лужын вады, што былі ледзь не на кожным кроку. Усюды чысціня, акуратныя, гожыя цагляныя домікі, плітачныя тратуары, асфальт...

«Глядзі, як усё тут змянілася!»

І быццам неспакой пачаў ахапляць Івана Кузьміча, калі ўсплылі раптам у памяці словы аднавяскоўца-спадарожніка, Васіля Караеда, якія ён так, нібы між іншым, сказаў: «І Ліпаўкі нашай не пазнаеце... Там жа таксама камяніцы пабудавалі...»

**VII**

Так, Васіль Караед казаў праўду — не пазнаў Іван Кузьміч сваёй Ліпаўкі. Ды і не толькі Ліпаўкі — лясоў, балот, палёў не пазнаваў. Быццам не ў родны, а зусім у незнаёмы край прыехаў. Дарогі і то, здаецца, ляжалі не там, дзе раней.

Шырока адкрытымі вачыма глядзеў Іван Кузьміч яшчэ з акна аўтобуса, як толькі выехалі з Ельнікаў, на асушаныя прасторы балот, што перасякаліся то тут, то там прамымі, як стрэлы, каналамі, на шлюзы, што былі збудаваны, каб затрымліваць, калі трэба, ваду, на рэдкія чубкі лесу — пералескі, што дзе-нідзе зелянелі і ў якія на нейкі час уязджалі аўтобусам, каб неўзабаве зноў выскачыць на асушаныя прасторы балот.

Дарога, асфальтаваная, таксама прамая, як струна, рассякала балоты і лясы па нейкіх раней няходжаных, нават невядомых мясцінах. А можа, ён, Іван Кузьміч, проста іх не пазнаваў? Бо, здаецца ж, не было ў лесе тых мясцін, дзе ні хадзіў бы ён, дзе ні таптаў бы сваімі нагамі сцежак. І ў дзяцінстве, ды і ў партызанах. Бывала, забрыдаў у такія нетры, у такую заглуш, што выбрацца не ведаў як. І ўсё ж выбіраўся, калі і блудзіў, то нядоўга. Нешта заўсёды пазнаваў — ці дарогу, ці дрэва, ці брод. І здагадваўся, дзе ён, куды ісці далей, каб трапіць дадому ці ў тое месца, куды наважыўся, куды трэба было. Лес жа быў свой, вядомы змалку.

«А цяпер... Быццам чужы, усё тут мне чужое,— думаў са страхам Іван Кузьміч.— А я ж еду сюды, як дадому, каб тут жыць, забыцца на ўсё, што звязана з горадам, з маёй службай, жыццём там...»

У вёсцы, калі вылез з аўтобуса, таксама зусім разгубіўся Іван Кузьміч, проста ісці не ведаў куды. Бо і тут усё было не так, як ён пакінуў. Замест былой вуліцы, у якой грузлі ў пяску па калені ногі,— асфальт, плітачныя тратуары паўзбоч. І дамы цагляныя, двухпавярховыя. З шырокімі, светлымі вокнамі, балконамі. Удалечы, бы ўсё адно мінарэты, блішчэлі на сонцы сянажныя вежы. Толькі недзе збоку, у лагчынцы, стаяла некалькі драўляных хатак — там, няйнакш, старая вёска была, танула ў зеляніне садоў.

Выручылі Івана Кузьміча людзі, што тоўпіліся на аўтобусным прыпынку, а найперш — Васіль Караед. Бачачы, як разгубіўся Іван Кузьміч, ён першы і запытаў у людзей, дзе зараз жыве Адамейкава Агапа. Выявілася — у новым цагляным доме, у новай кватэры. Нумар дома і кватэры людзі назвалі.

Ён, Васіль Караед, і правёў Івана Кузьміча да таго дома, той кватэры, дзе жыла Агапа. Нават чамадан паднёс.

Агапа адразу ж адчыніла дзверы, як толькі ў іх пастукаліся. І не пазнала брата. Ды і ён, Іван Кузьміч, не пазнаў сястры. Стаялі нейкі час адно супраць аднаго і глядзелі ва ўсе вочы — ён на яе, яна — на яго, і...

— Не пазнаеш? — першы сказаў Іван Кузьміч.

— Іван? — ускрыкнула Агапа.

І ў наступную хвіліну кінулася да яго, прыпала да грудзей, заплакала.

— А я думала, ужо і не пабачу цябе,— пачала яна ледзь не галасіць, выціраючы хусткаю слёзы.— Аж ты сам прыехаў. Ды яшчэ ў такі дзень...

— А які сёння дзень? — непаразумела глядзеў на Агапу Іван Кузьміч.

— Як ета які? Сёння ж Радаўніца...

Успомніў Іван Кузьміч — было некалі такое свята, калі людзі ўсёю вёскаю хадзілі на могілкі, і старыя, і малыя, быццам продкаў сваіх наведаць. З гарэлкаю-медавухаю — сытою, з фарбаванымі яйкамі, іншай, якая толькі была ў хаце, ядою. Рассцілалі проста на магілах абрусы, выкладвалі на іх яду, рассаджваліся наўкруг — як зручней — самі. І пачыналіся памінкі. Налівалі кожнаму, хто быў на тым свеце, па чарцы. Не забывалі пры гэтым і на сябе — выпівалі за супакой душы. Закусвалі самі, клалі закуску і таму, за чый супакой душы выпілі. І свята тое называлася Радаўніца. Але каб спраўлялася яно і цяпер... Не ведаў пра гэта Іван Кузьміч.

— А што, гэтую самую Радаўніцу і цяпер спраўляюць? — спытаў Іван Кузьміч у Агапы, ніяк не могучы паверыць, Агапа гэта перад ім ці не Агапа — надта ж яна старая, маршчакаватая, чужая, ані не падобная на тую Агапу, якую ён ведаў, з якою некалі рос у адной хаце, еў з адной міскі...

— А як жа! Адусюль, дзе б хто ні быў, дадому прыязджаюць. Некаторыя на дзень-два раней, каб магілкі паправіць, агароджу пафарбаваць. Кветкі, вянкі прывозяць. Вось пойдзем паглядзіш.

— Але ж я...— разгубіўся Іван Кузьміч.— Не ведаў... Не збіраўся...

— Нічога,— супакоіла яго Агапа.— Сходзіш сёння, заўтра не трэба будзе ісці. Ды ў парозе не стой, праходзь...

Ступіў Іван Кузьміч крок-два наперад і ўбачыў, што асабліва праходзіць няма куды: кватэра — звычайная аднапакаёўка. Калідорчык невялікі, вузенькі: злева — куханька, справа — туалет. Пакой, праўда, немалы і светлы, з двума вокнамі, пафарбаванай у чырвоны колер падлогай — ён прама, за шклянымі дзвярыма.

— Не цесна тут табе? — спытаў Іван Кузьміч у сястры.

— Не, я ж адна, месца хапае,— адказала Агапа, праводзячы брата далей на хату.

— І што, усе ў вас у новыя, цагляныя, кватэры перабіраюцца?

— Хто не хоча, той у сваіх хатах жыве,— патлумачыла брату сястра.— Але я... Пакуль карову, свіней трымала, то ў сваёй хаце жыла. А цяпер... На ўсім гатовым, як і ў горадзе. Ні пра дровы, ні пра ваду клапаціцца не трэба. Ды і сена, пракорм свінням...

— І сотак не сееш?

— Не, чаму ж. Сёе-тое сею. І гарод, і бульбу саджу... А ты... Як ты жывеш?

— Ды нічога,— не стаў удавацца ў падрабязнасці Іван Кузьміч.— На пенсію вось выйшаў,— прызнаўся ён сястры.

— І добрую ж табе хоць пенсію далі? — зацікавілася Агапа.

— Ніштаватую, жыць можна.

— Ну і хвала богу. Ды не стой, сядай дзе-небудзь.

Іван Кузьміч прайшоў у пакой, уважліва агледзеў яго. У пакоі стаяў вялікі самаробны стол, засланы белым палатняным абрусам. На ім — тэлевізар, праўда, нейкай застарэлай маркі, з маленькім, быццам цацачным, экранам. Быў у пакоі і ложак, было і некалькі табурэтаў, таксама самаробных. Вокны, завешаныя белымі фіранкамі, выходзілі ў гарод, дзе на градах паўзыходзілі ўжо, зелянелі роўнымі радочкамі цыбуля, часнок, морква...

Сеўшы на табурэт, Іван Кузьміч пачаў распакоўваць чамадан, даставаць адтуль тое, што купіў сястры,— цёплую ваўняную хустку, матэрыял, з якога можна пашыць сукню, ды і харчы розныя — кансервы, цукеркі, сухарыкі, сушкі, пячэнне. Убачыўшы ўсё гэта, Агапа ўсклікнула:

— Навошта ты ета купляў? Толькі грошы выкінуў.

— Не з голымі ж рукамі ехаць,— сказаў Іван Кузьміч.— Ды і грошы тыя... Усё адно разыдуцца...

— Яно-то так. Але калі іх няма...

— Дык табе ж, можа, дзеці трохі памагаюць? — паглядзеў на сястру, ніяк не могучы супакоіцца, прывыкнуць да яе, такой, якой яна стала, Іван Кузьміч.

— Дзеці? Ого, відаць, не дачакаемся мы таго, каб дзеці памагалі. Наадварот, чакаюць, каб ты ім памог. Бывала, як свіней трымала яшчэ, заб'ю ды ў пасылачкі ўсё і запакую, сабе крошачкі не пакіну. Атрымаюць, з'ядзяць — і ўсё. А ў цябе як дзеці?

— Хваліцца таксама няма чым,— прызнаўся Іван Кузьміч.

— Нешта і ты, значыцца, недагледзеў. Хай то мае, дык яны ў вёсцы раслі, без бацькі... Хаця... Вунь у іншых і без бацькі, а такія ж дабрэнныя павырасталі, бацькоў сваіх глядзяць, вёскі не цураюцца. І самі сюды прыязджаюць, і грошы бацькам шлюць. Жывуць, як і ў даўнія часы, адной сям'ёй. Што ў каго ёсць, тым і дзеляцца. Дык твае ж хоць дома, разам з табою. А мае ж... Заехалі аж на край свету. Ні да іх не дабрацца, ні яны вось каторы год носа не кажуць. Нават якія яны ўжо — забывацца пачынаю...

Агапа скрывілася, пусціла слязу.

— Прыедуць, то і не пазнаю, як во цябе не пазнала... Трэба ж, каб зусім на дамоўку забыў — не ехаў.

— Усё часу не было,— вінавата апусціў у падлогу вочы Іван Кузьміч.

— Часу, кажуць, і памерці не будзе. Але іншыя людзі і час знаходзяць, каб пабачыцца, у госці адзін да аднаго з'ездзіць. А ў нас усё не так, як у добрых людзей.

— Дык ты б прыехала калі да мяне,— папракнуў сястру Іван Кузьміч.

— Я прыязджала. Але што мне ў цябе ў горадзе рабіць? Ты на працы, а я сядзі, як дурань, цэлы дзень у сценах. Ды і дзеці ў мяне. Думаеш, лёгка было іх на ногі паставіць? Ды адной, ніхто ж ніадкуль нічым не памагаў... І часы былі... Робіш, робіш, а давядзецца атрымліваць за працу сваю, то і няма чаго. Ета не цяпер... Хаця...

Пастаяла, уздыхнула і сказала раптам:

— Ведаеш, Іван, што я думаю... Можа б, каб жылі нашы маці і бацька, не застрэлілі іх немцы, і ў цябе, і ў мяне дзеці не такія б павырасталі, радасць, шчасце і сабе, і нам бы, і людзям прыносілі.

— Чаму ты так думаеш? — насцярожыўся, падняў вышэй галаву Іван Кузьміч.

— Ды таму, што дзеці бачылі б, як мы сваімі бацькамі апякуемся, вучыліся б у нас. А так...

— Дык маглі ж добраму і ў іншых навучыцца. Не абавязкова ў сваёй сям'і,— быццам запярэчыў, праўда, нясмела Іван Кузьміч..

— У іншых — ета ў іншых. А ў сваіх — ета ў сваіх. Ды і мы з табою не лепшы прыклад дзецям падавалі. Родныя брат з сястрою, а жывём, як чужыя. Ні ў госці адно да аднаго, ні пісем... Твае дзеці не ведаюць маіх, а мае — тваіх...

Праўду, горкую праўду казала Агапа. Хоць, можа, і перабольшвала. Хаця... Хто ведае, можа, і не перабольшвала. Жылі б бацька і маці, не пазабівалі б іх немцы, відаць, па-іншаму і ў яго, Івана, жыццё б склалася, і ў яе, Агапы. Была б бацькоўская хата, быў бы абавязак перад бацькамі. Ды і не паехаў бы, мусіць, ён, Іван, з вёскі пасля вайны, жыў бы тут. А калі і паехаў бы, вяртаўся б час ад часу дадому, у родны куток. І раны не было б у душы, не балела б, не напаміналa б — гэта ж праз цябе, цябе бацька і маці не жывуць, раней часу ў магілу леглі... І сястра, Агапа... Не сыпала б соль на раны, не папракала б... А то... Праз столькі гадоў сустрэліся — і зноў, зноў не стрымалася, напомніла... Гэтак жа, як і тады, калі з вайны, з фронту, вярнуўся... Не зажывае, бачыш, і ў яе рана, крывавіць...

— Але ж ты гэта ведаеш,— зажмурыўшы вочы, як ад болю, пакруціў галавою Іван Кузьміч,— я не хацеў, каб немцы бацьку і маці застрэлілі...

— Я ета ведаю. Ды і... Цяжка мне пра тое меркаваць. І ўсё ж... Здаецца іншы раз — трэба было табе быць больш асцярожным, абачлівым, каб меней хто ведаў, што ў лесе ты, у партызанах.

— Лёгка сёння гаварыць,— ужо быццам са злосцю сказаў Іван Кузьміч.— А тады... Калі ў лесе... Па тыдні, а то і пабольш, галодны, макавага зерня ў роце не было...

— Не трэба было ісці ў лес.

32. Зак. 1877

— Як гэта не трэба было ісці ў лес? Ды яны, немцы, мяне б забілі. Ды нават калі б і не забілі... Не мог, не мог я не ісці ў лес. Погань фашысцкая зямлю топча, розныя здраднікі, ахвосце зброю ў рукі пабрала, з людзей здзекуюцца — і цярпець?..

Нейкі час і Агапа, і ён, Іван Кузьміч, маўчалі.

— Не вернеш таго,— першая парушыла маўчанне Агапа.— Няхай, як было, так было. Добра, што не забыў на мяне, прыехаў. Давай перакусім, што я на снеданне зварыла, ды на могілкі пойдзем.

— Але ж я...— зноў завагаўся Іван Кузьміч.— Не збіраўся сёння вось так з дарогі... Ды і... Ці ёмка мне?

— Як ета — «ці ёмка»? Пабываць на магілах сваіх бацькоў, дзе не быў столькі гадоў?..

— Каб не на Радаўніцу...

— Якая розніца калі? А ўрэшце, як сам ведаеш...

— Не, чаго ж,— здаўся Іван Кузьміч.— Сходзім. Толькі як магілы там? Ці хоць дагледжаны?

— Во пойдзем, то ўсё на свае вочы пабачыш. Давай снедаць,— ужо ледзь не падагнала Агапа Івана Кузьміча.

Падняўся з табурэта Іван Кузьміч, пайшоў услед за Агапай на кухню.

## VIII

Напамінак пра бацьку і маці зноў балюча крануў Івана Кузьміча, крамсануў па самым сэрцы. Аказваецца, не забылася, нічога не забылася. І Агапа ўсё помніць, ды і людзі ж, напэўна, таксама... І што не ён, Іван, вінаваты ў смерці бацькоў, а немцы, чужынцы, тыя, хто прыйшоў сюды, каб пакарыць, заваяваць край, пра гэта... Быццам і гаварыць няёмка, няёмка даказваць, пераконваць каго б там ні было, бо гэта ж і так ясна як божы дзень, хоць прычынай для расстрэлу быў і ён, Іван... Не пайшоў бы ён у лес, у партызаны, не бачылі б яго, як ён краўся з лесу ці ў лес,— і, можа б, па-іншаму ўсё склалася, жылі б бацька

і маці, не расстралялі б іх... Шмат, шмат разоў пра ўсё гэта думаў Іван Кузьміч. І тады, у лесе, як немцы расстралялі бацьку і маці, і потым, ужо на фронце, ды і жывучы ў горадзе... І адна з прычын, чаму не ехаў так доўга ў вёску, былі тыя ж бацька і маці. Ведаў — не вытрымае сястра, Агапа, зноў пра ўсё скажа, папракне... Цяпер ужо нават нібыта і ў тым, што дзеці выраслі не такія, як у людзей, зноў жа вайна вінавата, гэта значыцца ён, Іван. А ён жа думаў, што ў сястры жыць астанецца, тут, у вёсцы, знойдзе сабе прытулак і занятак пасля выхаду на пенсію. Аж... І вёскі ўжо той, ранейшай, да якой змалку прывык, няма, і палёў, лясоў, балот тых... Ды і бацька, маці зноў... Бы ўсё адно пракляў яго хто, наканаванне якое. Там, у горадзе, хоць не ведае пра гэта ніхто, не напамінае пра балючае. А тут... Трэба ж падгадаць так, якраз на Радаўніцу сюды прыехаць... І не пайсці на магілкі, і пайсці...

І пакуль снедаў Іван Кузьміч — сёрбаў, не чуючы вельмі смаку, звараны на газавай пліце, засквараны салам з цыбуляй, картапляны булён, піў чай,— а потым, узяўшы з рук у сястры палатняную торбачку з бутэлькай фруктовага віна і рознымі пачастункамі (сярод іх былі і тыя, што прывёз ён з горада), ішоў, браўся па палявой дарозе да могілак — яны былі на пясчанай, парослай хвойнікам выспе,— маўчаў, толькі думаў, перабіраў у памяці тое, што адбылося больш за сорак гадоў таму назад...

...Тады, у тую ноч, ён, Іван, прыйшоў у вёску рана, як толькі патухлі ў вокнах агні. Прыйшоў адзін, як і заўсёды, як і ўсе рабілі, бо паказвацца на вочы чужым ніхто не хацеў — усе хлопцы былі свае, з адной вёскі, і зайсці ў хату да каго б там ні было — гэта значыла выдаць сябе. А выдаваць сябе баяліся — ведалі, што ў такіх выпадках робяць немцы. Таму хадзілі ў вёску па адным і па чарзе. Якраз у тую ноч выпала ісці па харчы яму, Івану. І ён пайшоў, праўдзівей, папоўз, пагрэбаўся па снезе, гурбах, што панамятала ледзь не па самыя пахі, асабліва ў полі. Сяк-так

дабраўся да бацькоўскае хаты, пастукаў у акно. Тры разы, як было і ўмоўлена.

Сенцы адчыніў сам бацька. Ён тыдняў колькі перад гэтым вярнуўся з палону. Неяк пашанцавала ўцячы. І цяпер ён адсыпаўся, ад'ядаўся.

— Што ў вас? — спытаў па звычцы ён, Іван, у бацькі, як толькі пераступіў парог сенцаў.— Немцаў няма?

— Немцаў няма, але паліцыі наехала,— ціха, таямніча шапнуў бацька.— Прасіліся і да нас у хату начаваць.

— А вы?

— Што мы? Ведалі ж: не сёння-заўтра ты павінен з лесу прыйсці.

— І дзе яны спыніліся?

— У воласці, у школе. А чалавек колькі і па хатах.

Ён, Іван, разгубіўся, не ведаў, што яму рабіць.

— Можа, мне... Не рызыкаваць? Пакуль нічога ніякага, дык назад, у лес? — спытаў не то сам у сябе, не то ў бацькі.

— Хто яго ведае, як яно лепш. На ўсякі выпадак торбу мы з маці табе сабралі.

— То я, можа, вазьму яе — і назад, у лес?

— А адзежу памяняць, пераадзецца? Ды і капусты гарачай пасярбаў бы...

— Няхай, іншым разам...

Ён, Іван, быццам нешта прадчуваў. Бо нават калі, пачуўшы ў сенцах сцішаную размову, злезла з печы маці — яна хварэла, адагравалася на чаране — і выбегла, нізашто не згадзіўся заходзіць у хату. Узваліў на плечы торбу і як не бягом кінуўся за хлеў, а потым, па снезе, па гурбах — і ў лес.

І, як пасля выявілася, добра зрабіў, што ў час селішча пакінуў, не бавіўся там вельмі. Бо не паспеў бацька і распрануцца, спаць легчы, як у хату ўваліліся паліцаі.Ператрэслі ўсё чысценька, нават у пограб, запаліўшы ліхтар, злазілі, на гарышча, схадзілі ў камору і ў хлеў. І, не знайшоўшы, каго шукалі, бацьку, маці арыштавалі, павялі з сабою...

Не думаў тады ён, Іван, што яго наведванне тым скончыцца...

«Немцы застрашыць людзей хацелі, каб ніхто ні прытулку, ні харчоў, ні адзення не даваў партызанам. Таму і лютавалі... І памагчы бацьку, маці? Як можна было памагчы, калі партызан жменька адна ў лесе была, ды і не ў кожнага ж вінтоўка...— думаў цяпер, кіруючыся да могілак, Іван Кузьміч.— І трэба ж, якраз мне ў тую ноч у вёску ісці выпала. Каб хто-небудзь іншы...»

«З іншым, з яго бацькамі, тое было б...»

«А можа, і не было б, можа, абышлося б як-небудзь...»

«Не, не магло так абысціся... Калі наехалі ў вёску паліцаі, то... Прычына ж была... Проста так ні немцы, ні паліцаі не ездзілі...»

«Гм, цікава, выдаў мяне тады хто-небудзь ці выпадкова? А можа, даўно сачылі... За мною, маімі бацькамі?»

«Каму якая выгада ад таго? Проста так, без выгады... Звычайна нічога не робіцца...»

«Бывае, што і проста так, выпадак... А можа, і не? Ці мала хто на бацьку, маці зуб меў? Дый на мяне... Разбярыся, што ў каго ў думках ці на душы? Факт жа астаецца фактам — і бацьку, і маці немцы... Э, ды што ўспамінаць... Прывезлі ў вёску, сабралі людзей да сельсавета-воласці, аб'явілі, што бацька і маці памагалі партызанам, ды і сынпартызан у іх,— і расстралялі... Там жа, ля сельсавета-воласці...»

...— Ты была на пляцы, калі бацьку, маці стралялі? — спытаў Іван Кузьміч, павярнуўшыся тварам да сястры, якая, паволі перастаўляючы ногі, грэбалася па пяску побач з ім, намагаючыся не адстаць, і ад таго задыхалася.

Сястра, Агапа, спалохана ўскінула на брата вочы, спынілася.

— Не, не была,— ледзь чутна вымавіла яна.— А чаму раптам ты ўспомніў тое, чаму пытаеш?

— Нічога,— апусціў долу вочы Іван Кузьміч.

— Я, як бацьку і маці забралі, сышла з дому. У стагах сена, на лузе, хавалася,— расказвала Агапа.— Амаль зіму ўсю. А потым ужо к вясне ў вёску прыбілася, зноў пачала ў хаце сваёй жыць. І то — напачатку — начавала толькі. А ледзь днела — уцякала... Баялася, што, калі мяне зловяць, таксама застрэляць... Як і бацьку, маці, як і ўсіх стралялі, хто з партызанамі сувязь меў...

Іх дагналі нейкія незнаёмыя людзі, цэлая, відаць, сям'я — стары з сівою, як не да пояса, акуратна расчасанаю, раскошнаю барадою; старая з кіёчкам — пры белым вышываным фартушку, у андараку і ў лутовых лапцях; маладзейшыя, мужчыны і жанчыны, дзеці. Усе па-святочнаму прыбраныя, паднядзеленыя, з сумачкамі, карзінкамі, вузельчыкамі, з якіх вытыркаліся рыльцы бутэлек,— няйнакш, яны таксама, як і Агапа, як і Іван Кузьміч, як і іншыя, што відаць былі тут і там па дарозе, кіраваліся да могілак. Параўняўшыся з Агапаю і з Іванам Кузьмічом, стары і старая як бы сумеліся. Але хутка ўзялі сябе ў рукі, павіталіся. На іх «дабрыдзень» Агапа і Іван Кузьміч адказалі сваім: «Дзень добры!»

— Хто гэта такія? — спытаў Іван Кузьміч у Агапы, калі людзі трохі адышліся.

— Няўжо не пазнаў? — здзівілася Агапа.— Ета ж Царукі. Сам стары Антон з Антоніхаю і іхнія сыны, нявесткі, унукі...

Царукі калісьці, да вайны, жылі ў суседзях з імі, Адамейкамі. Жылі не сказаць каб дружна. Сварыліся часта і па дробязях — то куры ў гарод уб'юцца, то за мяжу — чамусьці кожнаму здавалася, што хтосьці лішнюю баразну захапіў у суседа. Царукі ні пры Саветах, ні пры немцах нікуды наперад вельмі не лезлі, сядзелі ціха, як мыш пад венікам. Але ўладу паважалі — выконвалі яе распараджэнні. І жылі не горш за іншых, ва ўсякім выпадку, у няміласць ніколі не пападалі. І Іван Кузьміч, думаючы, хто высачыў яго тады, калі прыходзіў з лесу дадому па

харчы, хто выдаў бацьку і маці немцам, чамусьці не-не дый успамінаў, засяроджваўся на Царуках.

— Табе не здаецца, што гэта яны высачылі, калі я з лесу прыходзіў, паліцаям перадалі? — спытаў у сястры, Агапы, Іван Кузьміч.

— Хто ведае,— паціснула плячыма Агапа.— Можа, і яны. Але... Не злавіў за руку — не кажы злодзей.

— Ды яно быццам так. І ўсё ж... Не дае мне гэта спакою. Колькі жыву, усё думаю і думаю, хто мяне ў тую ноч ці яшчэ раней мог бачыць. І чамусьці кожны раз, калі думаю пра гэта, на памяць Царукі прыходзяць. Больш, здаецца, ніхто выдаць не мог...

— Можа, так, а можа, і не,— уздыхнула Агапа.— Таго, што было, не вернеш. Ды і не праверыш нідзе. Забывацца на тое ўжо трэба. Хутка самім на той свет...

Пайшлі далей ужо моўчкі, кожны думаючы пра сваё...

## IX

На могілках было ўжо даволі людна, калі прыйшлі туды Агапа і Іван Кузьміч. Тут і там чулася гамана, сцішаная і нібыта насцярожаная, якая зрэдку перапынялася, заглушалася плачам, галашэннем. Усюды між соснаў і сасонак снавалі мужчыны, жанчыны, дзеці — усе паднядзеленыя, прыбраныя, як на свята. Іван Кузьміч заўважыў — могілкі за час, што ён не быў, выраслі амаль удвая. Крыжы стаялі ўжо не толькі на выспе, але і наўкруг яе, там, дзе калісьці было поле, а цяпер зелянеў малады, густы хвойнік. Прычым у хвойніку дзе-нідзе замест крыжоў бялелі, шарэлі, зробленыя з цэменту і камення, помнікі. Некаторыя магілы былі агароджаны — дзе дошкамі, штакетам, а дзе і прантамі з жалеза. Кідаліся ў вочы і партрэты, надпісы — прозвішчы, імёны, гады нараджэння і смерці нябожчыкаў. Раней, можа, таму, што большасць людзей у вёсцы не ўмелі ні чытаць, ні пісаць, ніхто не рабіў на крыжах ніякіх надпісаў, запаміналі тых, хто ляжаў у магілах, і так. Не

было ніякіх надпісаў і на груба — тапаром — абчасаных дубовых крыжах, што былі калісьці ў вайну пастаўлены на магілах бацькі і маці Івана Кузьміча і Агапы. І цяпер, калі б не Агапа, Іван Кузьміч нізашто не знайшоў бы, не адшукаў бы іх магіл. Помніў толькі — пахаваны бацька і маці на ўскрайку могілак, пад невысокаю калматаю сасонкаю. Але дзе гэта — пазнаць, здагадацца цяпер ніяк, ніяк не мог. І таму, пакорна апусціўшы галаву, паволі ішоў за Агапаю. А яна, мусіць, на могілках бывала нярэдка, бо дарогу да сваіх бацькоў ведала, бралася некуды ў сярэдзіну, у стары сасоннік, дзе і людзей было менш, і, здаецца, крыжоў, помнікаў не так багата. Агапа была засяроджаная ў сабе, нейкая быццам нават урачыстая, ні пра што і ні з кім не гаварыла, толькі, праўда, калі бачыла, сустракала знаёмыя твары, ківала галавою, віталася. Ківаў галавою, вітаўся з сім-тым, хоць і не ведаў, не мог сказаць, з кім, бо не пазнаваў, і ён, Іван Кузьміч.

«А ўсё ж нядрэнны гэта звычай — хадзіць на могілкі, наведваць продкаў,— думаў Іван Кузьміч.— Хоць нябожчыкам нібыта і ўсё адно, ходзіць да іх хто ці не ходзіць, а ўсё ж... Быццам і не забыты яны, помняць пра іх... Сваякі ж, некалі адна сям'я была... І хоць раз у год зноў пабыць разам, многае ўспомніць, нагадаць... Падумаць, што і ты не вечны, прыйдзе час, калі і цябе не будзе, памрэш, далучышся да тых, хто даўно ўжо там, у зямлі... З чым ты туды прыйдзеш, як паглядзіш у вочы тым, з кім сустракаўся і, магчыма, сустрэнешся зноў там, на тым свеце?..»

Адчуў — аж перасмыкнула ўсяго, дрыжыкі ахапілі.

«Не думаў я пра гэта, ніколі не думаў. Жыў, быццам у паветры на крылах ляцеў. Праца, паездкі розныя, жонка, дзеці... А пра бацьку, маці, што мёртвыя яны, у магілах ляжаць... Не думалася неяк.... Ды і пра сястру, Агапу, тых людзей, разам з якімі вырас, некалі жыў... Пра вёску сваю, той куточак зямлі, адкуль пайшоў у свет, таксама... Нібыта і не было іх у мяне... А яны ж, усё тое... Было! Ёсць!»

Агапа, а разам з ёю і ён, Іван Кузьміч, дайшлі да двух гарбячкоў зямлі, што ледзь-ледзь прыпадымаліся, нічым не агароджаныя, затравелыя, з падгнілымі, парослымі ўжо мохам крыжамі, якія былі перавязаны новымі вышыванымі палатнянымі ручнікамі. Агапа пачала нешта шаптаць, махаць перад сабою рукою,— няйнакш, хрысціцца. Вычакаўшы якую хвіліну, Іван Кузьміч спытаўся:

— Гэта магілы бацькі і маці?

— Умгу,— кіўнула, скончыўшы хрысціцца, Агапа.— Трэба было б і крыжы новыя паставіць, і агарадзіць... Ды я адна, няма мне каму памагчы. Думала, дзеці памогуць. Дык не — з'ехалі...

— Добра, я сам гэта зраблю,— сказаў Іван Кузьміч.— Вось паеду ў горад, помнікі закажу. І агароджу.

— Даўно трэба было ета зрабіць. А то перад людзьмі сорамна. Быццам бацькі нашы горшыя за ўсіх людзей...

Зноў праўду, горкую праўду казала сястра. І Іван Кузьміч, апусціўшы галаву, глядзеў то на адзін, то на другі гарбячок і думаў, чаму ён раней, некалькі гадоў таму назад, не прыехаў сюды, не пабываў у вёсцы і на могілках, не паглядзеў, што тут і як. Гэта ж... Не, не, няма, няма і не можа быць — ніякага апраўдання! Бацькі з-за яго... А ён...

Сціснула сэрца, стала, як ніколі, сорамна, аж, здаецца, гарачыня да твару зноў прыліла.

«Іншы на маім месцы даўно б помнікі паставіў, ды такія, што... А я... Баяўся, нехта мяне ў нечым папракне, віну мне прыпіша. А віна... Як бы я ні апраўдваўся, чым бы ні прыкрываўся, а ўсё ж... Не наведваўся б дадому, яны б... І цяпер, напэўна, яшчэ жылі б... Як жывуць тыя ж Царукі...»

Аж сцехануўся, успомніўшы зноў былых суседзяў.

«Няўжо яны выдалі бацьку і маці? — падумаў Іван Кузьміч.— Хоць ні бацьку, ні маці з таго свету не вернеш, а ўсё ж... Ведаць гэта не шкодзіла б, трэба было б...»

Агапа між тым моўчкі, ні слова не кажучы, узяла з рук у Івана Кузьміча торбачку, дастала з яе абрус, паслала на магілы. Не спяшаючыся, пачала выкладваць прыпасы —

33. Зак. 1877

загорнутыя ў палатняны ручнічок, яшчэ цёплыя, аладкі, яечню, пафарбаваныя ў чырвоны колер яйкі, сала, каўбасу, хлеб... Выняла з торбачкі, паставіла проста на траву і бутэльку фруктовага, купленага ў магазіне, віна, дзве гранёныя шклянкі. Села сама і паказала рукою, каб сядаў насупраць бліжэй да абруса і ён, Іван.

— Хоць раз ды разам, як людзі, ля магіл бацькоў пасядзім,— прамовіла яна.— Можа, болей і не давядзецца.

— Гэта чаму ж не давядзецца? — падняў вочы на сястру, паглядзеў Іван Кузьміч.

— Паедзеш ты... А ці прыедзеш яшчэ калі... Ды і не маладыя мы самі ўжо... Не ведаю, як у вас у горадзе, а ў нас нешта паміраць сталі часта людзі. Бач,— паказала яна рукою на крыжы, што былі ў маладым хвойніку,— колькі памерла. Уся, лічы, даўняя вёска сюды перабралася... І нам пара...

— Не варта спяшацца, пажыць яшчэ трэба,— не згадзіўся з Агапаю Іван Кузьміч.

— Смерць не пытае, што трэба, а чаго не трэба. Прыходзіць — і давай, збірайся. Ні дня, ні хвіліны не хоча чакаць.

— Яно-то так. Але ж... Не ўсё, здаецца, яшчэ зроблена.

— Ніколі ўсяго не зробіш. Пакуль жывеш — усё трэба, трэба. А памрэш — нічога не трэба. Ды і з сабою на той свет што забярэш... Ты думаеш, бацьку, маці пажыць не хацелася? А ўжо бачыш — сорак гадоў як на тым свеце!

— Тады вайна была. А цяпер... Не тое.

— Вядома, бальніцы, лечаць людзей... Але калі прычэпіцца якая напасць... Ды няхай, не будзем пра ета. Адкаркоўвай бутэльку, ды бацьку, маці нальем віна... І самі вып'ем... За супакой іх душы. Ды і за прыезд твой... Дзякуй, што не забыў, наведаўся...

Іван Кузьміч узяў бутэльку, адкаркаваў яе. Наліў віна трохі ў адну шклянку, трохі — у другую. Агапа, зноў пашаптаўшы нейкую малітву, нагнулася над магілай, выліла з шклянкі віно проста на траву, пад крыж.

— Ета бацьку,— сказала яна.— А цяпер маці...

І прарабіла ўсё тое самае, толькі ўжо над магілай маці.

Потым, не спяшаючыся, палажыла на магілы бацьку і маці па чырвоным яйку, па лустачцы хлеба, скрыліку сала. І па сушцы, сухарыку, цукерцы, якія прывёз як гасцінцы Іван Кузьміч з горада сястры. І толькі пасля ўсяго гэтага зноў павярнулася да Івана Кузьміча, сказала:

— А цяпер давай і самі...

Іван Кузьміч паслухмяна наліў зноў у шклянкі віна, падаў адну сястры, другую ўзяў сабе.

— Ну што ж, браток,— паглядзела Агапа на брата тужлівымі вачыма.— І за супакой душы бацькі і маці, і за твой прыезд!..

І паднесла да рота шклянку, адпіла з яе як не палову. Іван Кузьміч таксама паднёс да рота шклянку, паспрабаваў на смак фруктовага віна, якога дагэтуль ніколі не піў. Яно было салодкае, прытарна пахла яблыкамі. Але, перасіліўшы сябе, Іван Кузьміч глытнуў разоў колькі. Скрывіўся, адставіў недапітую шклянку.

— Чаму ж ты так? — папракнула Івана Кузьміча Агапа.— Што, хіба ты не п'еш?

— Не, не п'ю,— адмоўна захітаў галавою Іван Кузьміч.— Хіба што на святы. Ды і то не такое віно...

— А ў нас ета самае лепшае пітво. Як прывязуць у магазін, чэргі выстрайваюцца, скрынкамі бяруць. А некаторыя, каб з бутэлькамі неваждацца, проста ў магазіне ў трохлітровыя слоікі выліваюць. І п'юць больш за самагонку. А што — віно салодкае... Бяры што-небудзь, закусвай...

Іван Кузьміч нагнуўся, узяў з абруса лустачку хлеба, скрылік сала. Укусіўшы таго і другога, пачаў жаваць, з цікавасцю разглядаючы, што робіцца навокал на могілках. Хоць і не быў яшчэ час абедаць, але ўсюды ля магіл утвараліся кампаніі — рассцілалі ручнікі, абрусы, выкладвалі з торбачак, сумак, вузельчыкаў хто што захапіў, прынёс з дому, рассаджваліся каля яды. Разлівалі ў чаркі, шклянкі гарэлку, віно, частавалі нябожчыкаў, частаваліся і самі.

Плач, галашэнне паступова сціхалі. Чуліся ўжо тут і там смех, нейкія не зусім зразумелыя выкрыкі.

— Раней, бывала, поп каля магіл хадзіў, свянціў,— успомніла чамусьці Агапа.— А цяпер як хто... Адны раней, другія — пазней...

— А ты што, у Бога верыш? — спытаў у Агапы Іван Кузьміч.

— Ды яно як табе і сказаць,— памялася Агапа.— Ведаеш, адна я жыву. І пагаварыць іншы раз няма з кім... А Бог... Як бы ўвесь час са мною... У любы час і пагаварыць можна, і паспавядацца, і пажаліцца, папрасіць... Не, без Бога цяжка. Калі вера ў Бога была, менш паскудства рознага рабілася. А цяпер... Матчына малако на губах не абсохла, а ён мацюкаецца. Не паважае ні старых, ні малых... Ніхто нікога не баіцца, што хоча, тое і робіць. А віно, самагонка етыя... Клаўка Панцюхова дзіця нарадзіла невядома ад каго... Трое сутак п'яная валялася, дзіця з голаду і памерла... Не, такога раней у нас не было. Дзе ж ета відана, каб дзеці бацькоў адцурваліся, гадамі жылі і не ўспаміналі?.. Пры жывых бацьках жывыя дзеці... Не, раней кары Божай людзі баяліся...

— І раней усякае было, толькі мы пра тое не ведаем,— не згадзіўся з Агапаю Іван Кузьміч.

— Не, такога, як цяпер, не было! — рашуча захітала галавою Агапа.— Раней вёска жыла сама сабою, усе свае тут былі, ведалі адзін аднаго. А цяпер панаехала розных з усяго белага свету. Ні іх ніхто не ведае, ні яны нікога. Бывала, што такое замок, у нас не чулі. А цяпер не замкні толькі хату... А ўжо пра разводы, дык і не чулі... А то... Сыдуцца — і разбегліся... Зноў сыходзяцца і зноў разбягаюцца... Дзяцей абы ад каго раджаюць, аборты робяць... Цьфу, як падумаеш! У горадзе і то, мусіць, няма таго.

— Рознае і ў горадзе ёсць,— задумаўся над тым, што пачуў, Іван Кузьміч.— І было.

— Можа, у горадзе і было. А ў вёсцы не, не было таго, што ёсць. Асушэнне ета... Поля больш стала, ураджаі леп-

шыя, машыны, дарогі... А што да ўсяго астатняга... Дзе ета відана, каб бабы нароўні з мужчынамі шлі? Нап'ецца ды дзень у разоры і праспіць. Грошы людзям за працу далі, а навучыць, як з тымі грашыма абыходзіцца, ніхто не падумаў. Прапіваюцца тыя грошы. Колькі з адной толькі нашай вёскі лячылася людзей ад етай самай выпіўкі. І мужчыны, і жанчыны. Прыязджаюць, нейкі час трымаюцца, а потым зноў піць пачынаюць... Раней і на Радаўніцу ніхто не напіваўся. Пілі так, па прычыне... І то — чарачку, дзве... А цяпер... І сюды, на могілкі, прыходзяць, каб напіцца, быццам на свята якое... Во паглядзі, паглядзі, што робіцца...

Іван Кузьміч не ахвотнік быў назіраць за людзьмі, за тым, дзе хто і што робіць. Але тут, на могілках, усё на вачах было, нідзе нішто не схавана, і хочаш не хочаш, а відаць было, як людзі і сядзелі, і елі, і пілі. Калі б не магілы, не крыжы, не помнікі, дык можна было б падумаць, што гэта ніякая не Радаўніца, не памінкі нябожчыкаў, а звычайная маёўка, выезд на нейкае свята на прыроду, бо тут і там сядзелі кампаніі, рагаталі, смяяліся. І ў руках кожны трымаў то чарку, то закуску.

— Ета ж толькі пачатак... А праз гадзіну-дзве што тут будзе рабіцца! Свае яшчэ як свае, а прыезджыя...

— Адкуль яны ў вас? — пацікавіўся Іван Кузьміч.

— Ды з усяго, можна сказаць, свету. Як выганяць каго адкуль, дык і шукае, дзе б нічога не рабіць, а грошы палучаць, жыць лёгка, на дурнічку. Пачулі, што саўгас у нас, што рабочыя рукі трэба,— і едуць. Толькі ж і тут вельмі такія не затрымліваюцца, раскусваюць іх, бачаць, хто яны. І таксама праганяюць, у іншае месца яны некуды едуць.

— Можа, гэта часовае? Усталюецца ўсё — і не будзе такога.

— Дай бог. Бо ета ж аж жыць не хочацца, калі такое бачыш. Ды ты еш, еш... І выпі. Усё адно з могілак дадому нічога несці нельга.

— Чаму гэта?

— Хто яго ведае. Звычай такі. Не мы яго прыдумалі, не нам і парушаць.

Агапа зноў узяла ў рукі сваю шклянку, прыгубіла яе. Выпіў глыток віна яшчэ і Іван Кузьміч. Узяў зноў кавалачак хлеба, каўбасы, пачаў закусваць.

— Яешню, яйкі бяры. Ды і аладкі,— сказала да брата Агапа.— Не саромейся, еш... Ты ж з дарогі. Ці хоць надоўга прыехаў?

— І сам не ведаю,— паціснуў плячыма Іван Кузьміч.— Ехаў, дык быццам надоўга. А пабыў вось, на вёску паглядзеў, з табою пагаварыў...

— І што? — падняла вочы, паглядзела на брата Агапа.

— Бачыш,— пачаў паволі, разважліва Іван Кузьміч.— Я даўнюю нашу вёску ведаю. Успомніў, як некалі было... І захацелася зноў усяго таго. А прыехаў — няма старой нашай Ліпаўкі, нічога таго даўняга, звыклага няма. Ні самой вёскі, ні балот, ні лясоў, ні палёў... Ды і людзей. Я нікога ўжо не ведаю, не пазнаю, і мяне таксама. Чужы я тут чалавек...

— Трэба было часцей прыязджаць, то не быў бы чужы. А што да людзей... Многіх і я ўжо не пазнаю. Вёска вялікая, моладзь расце. Жэняцца, дзяцей нараджаюць. А чые яны, тыя дзеці,— не ведаеш, каб і хацеў. Ды і чужых з усяго свету панаехала...

— У аўтобусе па дарозе ў Ліпаўку я пазнаёміўся з Васілём Караедам, сынам Наталлі Расамахавай. Як я ні намагаўся ўспомніць, чый гэта хлопец, дзе жылі Расамахі... І не ўспомніў.

— Цю,— пахітала галавою Агапа.— Расамахі да вайны жылі насупраць нас, праз вуліцу. І Наталля... Таварышкавала з Лідаю... А Ліду ты ж некалі з пагулянак праводзіў...

Успомніў, цяпер успомніў Іван Кузьміч... Ды і як такое забыць! Гэта ж была неразлучная чацвёрка — Наталля і Коля Дзямідчык, Ліда і ён, Іван. Усюды, асабліва на пагулянках, былі разам. Ні ён, Іван, без Ліды, ні Коля Дзямідчык

без Наталлі не ўяўлялі свайго жыцця. Ды пэўна ж і яны — Ліда без яго, Івана, а Наталля без Колі...

— Як жыццё склалася ў іх... У Наталлі, Ліды? — спытаў, паслабляючы на шыі гальштук — горача, душна стала раптам яму.

— Наталля замуж за нейкага прыезджага выйшла... Кінуў ён яе. Ну а Ліда... Увесь век адна жыве...

— Чаму ж гэта яна так?

— Хто яе ведае. Выходзіць замуж абы за каго не захацела. Ды і раджаць абы ад каго таксама... Цябе яна, мусіць, кахала...

«І каб выйшла за мяне замуж, каб я з ёй жаніўся... Можа б, і яна, і я шчаслівыя былі»,— падумаў Іван Кузьміч, успамінаючы, уяўляючы Ліду — стройную, светлавалосую, з вялікімі блакітнымі вачыма і вясёлаю, радаснаю ўсмешкаю на твары... Тую, якую ён ведаў...

— Дзе цяпер Ліда жыве?

— Ды тут, у Ліпаўцы. На старым сваім селішчы. Карову, свіней трымае. Калі ні ўбачыць мяне, пра цябе ўсё распытвае...

«Трэба з ёй сустрэцца, пагаварыць,— сказаў сабе, як не загадаў, Іван Кузьміч.— Гэта ж... Каб не паехаў я з вёскі... А так... І яна, і я...»

На могілках між тым рабілася ўсё больш гармідарна, тлумна. Адусюль чуліся п'яныя выкрыкі, смех, рогат. Хтосьці нават зацягнуў песню...

— Пачынаецца,— уздыхнула Агапа.— Сябе не паважаюць, дык хоць бы месца, нябожчыкаў паважалі. Дык не ж... Абы да гарэлкі дарвецца — нап'ецца. А тады... Брыдка і глядзець, і слухаць...

— Можа, хопіць нам тут сядзець, пойдзем? — паглядзеў на сястру Іван Кузьміч.

— Рана яшчэ. Ды і няёмка ж першым могілкі пакідаць. А табе... Столькі гадоў не быў тут — і бягом бегчы?.. Не спяшайся. Тут жа людзі. І мёртвыя, і жывыя... Ета ж тут амаль Ліпаўка ўся наша. І тая, што некалі была, і новая,

цяперашняя... Можаш прайсціся, паглядзець. Хто на етым яшчэ свеце, хто на тым ужо...

— Каб жа я помніў каго, пазнаў! А то ж... Прозвішча, нават твар быццам знаёмы, а сказаць, хто гэта... Не бяруся.

— І ў мяне такое бывае. Старасць — не радасць... Раскажы, як ты там, у горадзе, жывеш?

— Ды быццам расказваць няма асабліва чаго. Я на пенсію, казаў ужо табе, пайшоў... Жонка... яна нідзе і не працавала, дома ўвесь час. А дзеці... Таксама... Словам, хваліцца вельмі няма чым...

— І ўсе дома, у адной хаце разам з табою жывуць?

— А дзе ім дзецца? Плошча дазваляе. Ды і дзеці не чужыя, а свае.

— Нясоладка табе,— пашкадавала брата Агапа.— Мне таксама нясоладка, бо адна. А табе — што ўсе разам...

Некаторыя ўжо не сядзелі ля магіл, а ўставалі, хадзілі. І па адным, і па двое, па трое. Глядзелі, дзе хто пахаваны, які пастаўлены каму помнік ці крыж, як абгароджана, дагледжана чыя магіла. Далучаліся да той ці іншай кампаніі, віталіся, выпівалі чарку і ішлі далей. І да Агапы, Івана Кузьміча некалькі чалавек наблізіліся, але, пастаяўшы збоку, падысці не асмельваліся — ці то бачылі, што выпіць асабліва няма чаго, ці то Івана Кузьміча саромеліся, не пазнавалі. І ўсё ж адзін — плячысты, нізкарослы, як корч, і быццам не п'яны,— асмеліўся, не падышоў, а нібыта падкраўся.

— Не пазнаеш мяне? — спытаў ён, гледзячы проста ў вочы Івану Кузьмічу.

— Не,— шчыра прызнаўся Іван Кузьміч.

— А я цябе пазнаў. Ды і як не пазнаць — мы з табой у партызанах разам былі.

— Міхась?

— Ну, вядома ж!

Падняўся Іван Кузьміч, абняў Міхася за плечы. І праўда, як можна забыцца, не пазнаць! З ім, Міхасём, ды яшчэ Колем Дзямідчыкам некалі ён, Іван, і ў школу разам хадзіў, і ў лес па грыбы і ягады, разам і партызаніў...

— Як ты жывеш? — спытаў Іван Кузьміч.— Раскажы...

— Лепш за ўсіх,— весела адказаў Міхась.— Усё жыццё за плугам, за бараною прахадзіў. Парадак дома, парадак і за домам... І ў дастатку — адных пчол і то вуллёў з семдзесят. Так што заходзь, госцем будзеш...

— Абавязкова зайду,— паабяцаў Іван Кузьміч.

Падышло і яшчэ некалькі чалавек. Хоць Іван Кузьміч напачатку іх і не пазнаваў, але потым быццам павалока з вачэй спадала, успамінаў былых сваіх аднавяскоўцаў, а то і сяброў. І гаварыў з імі, распытваў пра іх жыццё-быццё, сам пра сябе тое-сёе расказваў. На радасці, што сустрэліся, выпівалі, хадзілі гуртам ад кампаніі да кампаніі, набліжаліся да магіл былых сваіх таварышаў, стаялі, успаміналі... І хоць Іван Кузьміч і не ахвотнік да выпіўкі быў, а ўсё ж назбіраўся, прыгубляючы то тут, то там чарку, то за сустрэчу, то за супакой душы. І бачыў, адчуваў Іван Кузьміч, што яго не забылі ў Ліпаўцы, помняць. І рады, шчыра рады, што прыехаў, прыйшоў сёння разам з усімі на могілкі. І ён, Іван Кузьміч, таксама быў рады, забыўся на ўсе свае нялёгкія думкі і крыўды. Не, не ўсё яшчэ страчана! Іван Кузьміч зноў быццам стаў тым, кім і быў,— звычайным чалавекам, такім, якімі былі на могілках у той дзень усе.

## Маргарыта Мікалаеўна Хлопчык

Пра яе хадзілі ў горадзе розныя, самыя супярэчлівыя размовы. Асабліва — як паводзіла сябе ў часе вайны — у нямецка-фашысцкую акупацыю.

— О, якая мужная, смелая і знаходлівая гэта была падпольшчыца! — выказвалі захапленне адны.— Не шкадавала нічога дзеля перамогі, кожны дзень, кожную хвіліну рызыкавала жыццём. Каб не такія, як яна, няхутка б мы прагналі са сваёй зямлі немцаў...

— Цьфу, брыдота,— пляваліся другія.— Як такую шкуру зямля носіць? І выкруцілася ж, не пасадзілі. Хай бы згніла, як іншыя, у турме...

І калі хто-небудзь спрабаваў абараніць жанчыну, не даць налюдна ганьбіць, на яго накідваліся, быццам звяры, з усіх бакоў:

— Не ведаеш, дык маўчы. Бо я... Сама, сама, на свае вочы бачыла. З немцамі, афіцар'ём, шкура, гуляла. І калі аднаго з іх, самага каханага, партызаны забілі, дык яна... Цьфу, аж успамінаць не хочацца. На дамавіну ўпала, рукамі, быццам жывога, абхапіла і галасіла, крычала, бы вар'ятка, на ўсе могілкі... Ледзь адвалаклі... А ты...

І, пагардліва акінуўшы вачамі абаронцу, адварочваліся, адыходзілі, аж кулакі сціскалі ад гневу і злосці...

Выпала так, што мне давялося пазнаёміцца з гэтай жанчынай. А потым і даволі блізка сысціся, стаць адным з тых нешматлікіх людзей, хто бываў у яе дома, сядзеў за філіжанкаю кавы, слухаў — і неаднойчы — яе ўспаміны пра мінулае, у тым ліку і пра жыццё, барацьбу падпольшчыкаў у акупацыю. Але раскажу пра ўсё падрабязна. Мы, вучні дзявятага класа, на чале з нашым настаўнікам, выкладчыкам гісторыі, надумалі стварыць краязнаўчы музей. Вядома, адно з галоўных месцаў у музеі павінны былі заняць матэрыялы, так ці інакш звязаныя з Айчыннай вайной. Камандзір партызанскага атрада, што дзейнічаў у нашай мясцовасці, жыў на Украіне, пад Кіевам. І калі мы звярнуліся да яго з лістом, ён параіў звязацца з Маргарытай Мікалаеўнай Хлопчык. «Яна ведае на багата больш усяго і лепш за мяне,— пісаў былы камандзір партызанскага атрада.— Па-першае, яна мясцовая, падругое, амаль усю акупацыю была ў горадзе, ні на дзень не пакідала яго...»

Калі мы, вучні, пачалі высвятляць, хто такая Маргарыта Мікалаеўна Хлопчык, дык выявілася: гэта і ёсць тая жанчына, пра якую хадзілі ў нашым горадзе розныя, самыя супярэчлівыя размовы. Яшчэ раз напісалі былому

камандзіру партызанскага атрада. Але ён рассеяў усякія нашы сумненні, запэўніў, што жанчыне гэтай — Маргарыце Мікалаеўне — можна верыць, як сабе. «У самыя цяжкія хвіліны яна выручала нас, рабіла ўсё, што было ў сілах, дзеля перамогі. Гэта адна з самых непахісных гераінь вайны, чалавек рэдкай сумленнасці і мужнасці. А тое, што пра яе ходзяць розныя плёткі — не надавайце ім значэння. Больш таго — пастарайцеся іх развеяць, каб перамагла праўда. Калі не верыце мне, звярніцеся да дакументаў. І тых, што мы здалі ў архіў адразу ж пасля вызвалення, і іншых, якія, вядома ж, захаваліся. Але, паўтараю: Маргарыта Мікалаеўна — крыштальна чысты, сумленны чалавек, сапраўдная гераіня вайны. Такімі людзьмі трэба ганарыцца, браць з іх прыклад...»

Не верыць камандзіру партызанскага атрада... Ды яшчэ, калі ён спасылаецца на дакументы, якія здаў у архіў адразу ж пасля вызвалення... І я, спярша з вучнямі-аднакласнікамі, а потым усё часцей і часцей і адзін, пачаў заходзіць да Маргарыты Мікалаеўны. Жыла яна непадалёку ад нашай школы, у старым цагляным доме, які неяк ацалеў у вайну, займала невялікі, з густам абстаўлены пакойчык у агульнай, з доўгім, амаль бясконцым, калідорам, кватэры. Жыла адна — ні дзяцей, ні мужа ў Маргарыты Мікалаеўны не было. Не было, як сама яна прызналася, у яе нікога і з родзічаў — усе — бацька, маці, дзве сястры і брат — загінулі, калі нямецкія карнікі палілі вёску, дзе яны жылі і дзе нарадзілася сама Маргарыта Мікалаеўна.

— І здарылася гэта на другі год акупацыі, увосень,— расказвала Маргарыта Мікалаеўна.— Карнікі некуды ехалі і спыніліся пераначаваць. На іх і напалі партызаны... Бой быў жорсткі, адчайны. Семдзесят шэсць карнікаў загінула ў тым баі. Былі, вядома, ахвяры і сярод партызан, вяскоўцаў... Але якія — мала хто ведае, бо як толькі партызаны адступілі, немцы акружылі вёску і ўсіх да аднаго жыхароў знішчылі. Каго застрэлілі, каго спалілі... І раней я ненавідзела прышэльцаў. Можаце ўявіць, як зненавідзела

я іх пасля ўсяго таго, што здарылася, што зрабілі яны з маімі бацькам, маці, сёстрамі, братам, іншымі людзьмі, самой нашай вёскай...

Тая даверлівасць, амаль інтым, якія ўсталяваліся ў нашых адносінах, калі мы, вучні дзявятага класа, упершыню пераступілі парог гэтай кватэры, захоўваліся і далей, калі прыходзіў я да Маргарыты Мікалаеўны — і будучы студэнтам, і потым, закончыўшы вучобу. Адзінота, ды і хвароба, якая амаль не дазваляла Маргарыце Мікалаеўне паказвацца на людзі, па ўсёй верагоднасці, давалі пра сябе знаць, і жанчына была рада кожнаму чалавеку, хто наведваўся да яе. І асабліва — маладым, хто многага не ведаў, і яна, былая падпольшчыца, магла расказаць, зацікавіць тым, чым жыла сама. А жыла яна, як неўзабаве я пераканаўся, вайною. Надта ж жорстка абышлася яна, праклятая, з Маргарытай Мікалаеўнай, праехалася бязлітаснымі сталёвымі коламі, пакарала, як рэдка каго. Мала што бацьку, маці, дзве меншыя сястры і брата забрала, скалечыла яе самую, дык яшчэ... Эх, была, была крыўда ў Маргарыты Мікалаеўны на многае і многіх, а найперш — на сваіх жа людзей, тых, хто жыў разам, побач з ёю, у адным горадзе.

— Не дзеля каго ж я ўсё, што магла рабіла, а дзеля іх. Каб шчаслівыя былі яны, гора не ведалі. І каб зямлю нашу, бацькаўшчыну вораг-акупант не таптаў. І мяне... Не зразумелі. Многія-многія не зразумелі,— з крыўдай у голасе гаварыла, прызнавалася Маргарыта Мікалаеўна.— Ды каб жа толькі не зразумелі! А то ж... Быццам нават помсціць пачалі. Брыдкія, злосныя плёткі пра мяне некаторыя распускаюць. Відаць, у сім-тым я і сама вінавата, трэба было быць больш абачлівай, больш думаць пра сябе... А я... Ні пра што іншае тады не думала... Ворагу больш бы нашкодзіць, прагнаць хутчэй з нашай зямлі, адпомсціць за слёзы і кроў... Ды і думаць асабліва не было калі, трэба было дзейнічаць. Кожная нерашучасць, марудлівасць, замінка маглі прывесці да правалу, смерці соцень людзей...

Ды дзе соцень — тысяч! І адна, адна я сярод ворагаў была. Ні параіцца з кім, ні расказаць, што на душы. І лёс не толькі мой, а многіх вырашаўся як бач, у адну хвіліну. Слова не тое ці дзеянне — крок адзін! — і ўсё... Ух, і цяпер як успомню — дрыжыкі бяруць!..

Маргарыта Мікалаеўна і сапраўды сцinduction;

— Дзіўна, але тады ні жаху, ні страху не было. Быў нейкі халодны, дакладны разлік. І ніякай нерашучасці, разгубленасці. Быццам прадумана ўсё да канца было. Прычым — на розныя выпадкі жыцця. Так, і толькі так. Дрыжыкі пачыналіся пасля, калі самае страшнае і жахлівае аставалася ззаду. Іншы раз аж ванітавала. Ці то ад перажыванняў, напружання, ці то так ад чаго. Апаноўваў, ні на чым не даваў засяродзіцца одум: «Што я зрабіла? І ці так, тое?»

— Вы ў нямецкай камендатуры машыністкай працавалі? — неяк спытаў я пра тое, што ведаў, але не ад самой Маргарыты Мікалаеўны, а ад людзей.

— Ага. Машыністкай-перакладчыцай. Я ж даволі нядрэнна ведаю нямецкую мову. Адкуль? Ды, можна сказаць, са школы. Вучыла мяне нямецкай мове настаўніца, сама немка, з Паволжа. Там некалі шмат немцаў жыло. Нават аўтаномная нямецкая рэспубліка была. Дарэчы, яна, тая настаўніца, мяне і працаваць у камендатуру парэкамендавала. Праз мяне праходзілі самыя розныя сакрэтныя дакументы. Я іх перадрукоўвала, некаторыя перакладала...

— І самае каштоўнае, патрэбнае — перадавалі ў лес, партызанам? — пытаў я.

— Так.

— Раскажыце, як гэта вы рабілі?

— Звычайна. Сёе-тое запаміналa, сёе-тое непрыкметна перапісвала, асабліва лічбы. Капірку пакідала, а ўжо дома з капіркі копію здымала...

— Вас што, хіба не правяралі?

— Ого, ды яшчэ як правяралі! Пералічвалі кожную старoначку паперы, кожны лісток капіркі. І калі нешта важнае друкавала — не адыходзілі, каб лішняга экзэмпляра не зрабіла, не вынесла з камендатуры. Ды і так сачылі. Нават калі па патрэбе ў туалет хадзіла... Даводзілася рызыкаваць, хітраваць, шукаць розныя спосабы. То памылку быццам незнарок зробіш і яшчэ раз перадрукуеш, каб лепш запомніць, то экзэмпляр капіркі непрыкметна кудынебудзь засунеш, схаваеш. Словам, як магла, так і выкручвалася, лавіла кожны момант, каб нічога вельмі важнага міма маіх вачэй і вушэй не прайшло, каб запомніць, захапіць з сабою тое, што можа зацікавіць, спатрэбіцца тым, хто ў лесе...

— І гэтак — два гады!

— Нават больш. Калі дакладна — восемсот адзінаццаць дзён! Сорак шэсць сутак я выкідваю, бо не працавала ў камендатуры, а сядзела ў турме.

— За што?

— Ды за афіцэра таго, эсэсаўца Эрыха, якога я забіла і якога мне і цяпер некаторыя ў каханкі прыпісваюць. Эх, ведалі б яны, як ненавідзела я гэтага самага Эрыха, як сапсаваў ён мне жыццё! І тады там, у камендатуры, і потым... Гэта ж праз яго мяне ў турму ўкінулі, скалечылі, ледзь на той свет не адправілі...

Маргарыта Мікалаеўна задумалася, галаву апусціла, відаць, успамінаючы тое, даўняе...

— А падрабязней расказаць не можаце? — прасіў я.

— Што расказваць? Я гаварыла: тады, у тых умовах, думаць асабліва не было калі, трэба было дзейнічаць. Дзейнічаць хутка, імгненна. І я дзейнічала. Зноў жа — не дзеля сябе шчыравала, а дзеля справы. І афіцэр гэты, Эрых... Нечакана ўзнік на маёй дарозе. Ён працаваў у сакрэтным аддзеле, часта прыносіў перадрукаваць ці перакласці той ці іншы дакумент. І стаяў за спіною, дыхаў у шыю, як тады мне здавалася, назіраў, сачыў, каб я не зрабіла для сябе лішні экзэмпляр, не пакінула копіі... Я, вядома ж, хвалявалася,

чырванела, гублялася — дакументы, што прыносіў Эрых, былі заўсёды важныя, якраз тыя, якія трэба было перадаць тым, хто ў лесе. Ён жа, Эрых, як цяпер я разумею, думаў пра іншае. І, відаць, з майго хвалявання рабіў свае вывады. Не выключана, вельмі магчыма, што я яму падабалася — была я тады маладая, і хоць трымалася смела, незалежна, але ў душы была сарамяжлівая, палахлівая. Кожны мой погляд, кожны рух ён разумеў па-свойму: значыцца, не раўнадушная да яго, калі так рэагую на словы, жарты, усмешкі. А я... Думала пра іншае — як бы той ці іншы дакумент займець, запомніць ці копію з яго сабе пакінуць. Ды так усё зрабіць, каб Эрых не заўважыў, не выкрыў. І калі аднойчы ён сустрэў мяне на вуліцы — я вярталася з працы — і пайшоў побач, быццам праводзіць, мне здалося: ён нешта падазронае ўлавіў у маіх паводзінах і хоча праверыць. Трымалася я з ім карэктна, не давала ніякіх падстаў ні для флірту, ні для чаго іншага. І ён, Эрых, трымаўся са мною таксама гэтак жа карэктна, не даючы ніякіх намёкаў ці падстаў меркаваць, чаго ён мяне праводзіць, ідзе побач. Ноч, вядома, тую я не спала, думала, што значаць гэтыя «праводзіны». Нават на сувязь са сваімі не выйшла, не перадала таго, што за дзень сабрала. Гэта занепакоіла тых, з кім я мела сувязь. Калі ўранні ішла на працу, адна з жанчын, незнаёмая мне, але яўна з падпольшчыц, нават спыніла, спыталі, чаму не наведала Насці. Насця — гэта было імя жанчыны, у якой я штодзень купляла малако і якой перадавала разам з грашыма тое, што трэба было перадаць тым, хто быў у лесе. «Сёння пабуду»,— паабяцала я. Але і ў той дзень, ды і назаўтра, напаслязаўтра я не змагла пабыць у Насці, бо зноў і зноў, калі ўвечары выходзіла з камендатуры і кіравалася дадому, мяне чакаў Эрых і праводзіў да самага дома, дзе жыла. І я баялася, думала — за мною сочаць. І Эрых гэты праводзіць мяне знарок, каб куды-небудзь не ўцякла. І калі ён адыходзіць, пакідае мяне, то за мною

нехта іншы сочыць. Выдаваць сябе, ды і тых, з кім мела сувязь... Не, трэба было чакаць, цярпліва чакаць, што будзе далей... Партызаны прывыклі мець ад мяне звесткі, без іх яны былі ў няведанні, дзе што робіцца. І яны пайшлі зноў самі на сувязь са мною — Насця прынесла малако мне дадому. Я перадала ўсё, што ў мяне было. Сказала і пра Эрыха, пра сваю занепакоенасць — не проста так, ад няма чаго рабіць, ён, фашыст, кожны вечар чакае мяне, праводзіць дахаты. З лесу паведамілі: удакладняць, чаму Эрых праводзіць мяне, і калі што — папярэдзяць, дадуць знаць. Мне ж паступіў загад — рабіць выгляд, што ён, Эрых, падабаецца, нераўнадушная я да яго. І старацца «вывуджваць» з яго ўсё, што можна...

Маргарыта Мікалаеўна зноў памаўчала, нібы засяродзілася на нечым сваім. А можа, прыйшла ёй у галаву нейкая нечаканая, новая думка, якая раней ніколі не прыходзіла. І спыніла яе разважанні, яе расказ.

— Тое, што цяпер некаторыя называюць «каханнем», цягнулася тры месяцы,— як бы ўздыхнула раптам Маргарыта Мікалаеўна.— Эрых штовечар праводзіў мяне дахаты, і гэта бачылі людзі. Больш таго, ён пачаў заходзіць і да мяне на кватэру. Я доўга гэтаму супраціўлялася, зноў жа, паведамляла ў лес. І зноў з лесу прыходзіў загад: рабіць усё магчымае, каб мяне ні ў чым не западозрылі, каб я працавала ў камендатуры. І я рабіла... Ведалі б тыя, хто распускае плёткі, як ненавідзела я акупантаў. Эрых не быў выключэннем. Але я і сама ўсведамляла,— неабходны тым, хто ў лесе, звесткі, што прыносіла з камендатуры. Ды з часам сёе-тое навучылася «вывуджваць» і з Эрыха... І дзеля гэтага, толькі дзеля гэтага цярпела «заляцанні» эсэсаўца-гітлераўца. Але ўсяму, як вядома, бывае канец. І калі Эрых пачаў дамагацца... Словам, я папрасілася ў тых, хто быў у лесе,— усё, больш не магу працаваць у камендатуры, больш не магу цярпець «заляцанняў» Эрыха. З лесу паступіў зноў той жа загад — рабі што

заўгодна, але камендатуры не пакідай... І я... Надумала забіць Эрыха. І калі ён пачаў усё больш настойліва дамагацца мяне, я сказала сабе: лепш смерць, чым гэта...

У мяне быў пісталет, я насіла яго з сабою. І аднойчы ўвечары, зразумеўшы, што Эрых гэты раз не пакіне мяне так, як пакідаў раней, а будзе яшчэ больш рашуча, настойліва дамагацца свайго, я забіла яго. Як — і сама дасюль не ўсвядомлю. Помню, адстала, быццам панчоху паправіць, выхапіла пісталет і стрэліла і раз, і два, і тры яму ў спіну. І адчайна закрычаўшы: «Партызаны! Партызаны!» — кінулася назад, у камендатуру. Выгляд у тую хвіліну ў мяне быў, вядома, страшны. Я ж, як-ніяк, забіла эсэсаўца. Ды дзе... У самім іхнім логаве — горадзе... Пісталет, з якім не расставалася і з якога забіла Эрыха, я ўсё ж здагадалася адкінуць ад сябе, шпурнуць у чыйсьці агарод...

Ніхто з немцаў не спрабаваў мяне супакоіць. Наадварот, тут жа арыштавалі, агледзелі сумачку, абмацалі мяне ўсю і пагналі ў турму. Але і там я іграла сваю ролю — забілі майго каханага, і я крычала, прасіла даць хоць з ім развітацца. І гэтак усюды, куды мяне ні вадзілі, што ў мяне ні пыталі, Не ведаю, што падзейнічала на немцаў — мая апантанасць ці... Можа, праверыць хацелі, хто я. Ва ўсякім выпадку, калі прывялі пад аховай на могілкі, я, бачачы, як насцярожана на мяне ўсе ўставіліся вачыма, чакаючы, што буду рабіць, вырашыла сыграць сваю ролю да канца — падышла да дамавіны і ўпала на калені, загаласіла, закрычала... Відаць, і слёзы, і крык мой здаліся многім непрытворнымі. А можа, так яно і было — я ж столькі ўсяго перажыла на допытах і ў турме! Чым толькі мне не пагражалі, як не катавалі — патрабавалі, каб прызналася, хто я... Дый заданне ў мяне ж было — не пакідаць камендатуры, працаваць там... І я, наіўная, яшчэ спадзявалася веру немцаў вярнуць. Можа, выпусцяць яны мяне, зноў дазволяць працаваць у камендатуры...

Не, нічога я так і не дамаглася, а ў вачах сваіх людзей з таго часу я «шкура», «нямецкая падкладка»... З могілак мяне пагналі зноў у турму. І пачалі яшчэ часцей вадзіць на допыты, яшчэ адчайней біць, патрабаваць прызнання... Урэшце, мяне вырашылі расстраляць...

— І далей, што было далей? — вырвалася ў мяне міжвольна, як бы падагнаў я Маргарыту Мікалаеўну.

— Далей... Помню, як вязлі разам з іншымі асуджанымі на смерць, у кузаве абцягнутай зверху брызентам машыны, помню, як ставілі ля выкапанай загадзя ямы, у нейкім густым змрочным хвойніку, помню, як пачуўся першы залп... Астатняе... Цемра...

— Вас адкапаў хто ці самі выбраліся з ямы?

— Выбралася сама. Але калі і як — не помню. І паўзла... Мяне падабралі... Аж тры кулі прашылі маё цела. Але я, як бачыце, асталася жыць... Вызваленне прыйшло, дык я ў горад вярнулася, канчатковага разгрому фашыстаў пачала, як і ўсе тады, чакаць. Каханы ў мяне быў, жаніцца са мной збіраўся. Яшчэ перад вайною. То і яго чакала. А ён нават не захацеў і сустрэцца са мной...

— Чаму?

— Ды, мусіць, усё таму ж — расказалі, пачуў ён, як я «з немцамі, афіцар'ём, гуляла», як на могілках на калені падала, галасіла перад вылюдкам тым, якога я ненавідзела і якога сама застрэліла... Значыцца, падумаў, як і іншыя, што сапраўды я закахалася ў Эрыха, жыць без яго не магла...

— Трэба было вам нешта зрабіць, каб спыніць гэтыя размовы і плёткі, каб ведалі, усе ведалі, хто вы такая, як і што з немцам, афіцэрам тым, у вас было,— сказаў, параіў я.

— Хм,— ухмыльнулася Маргарыта Мікалаеўна.— Лёгка сказаць... А зрабіць... Што можна ў маіх умовах, у маім становішчы зрабіць? Дый...— махнула яна нарэшце рашуча рукою.— Спярша мяне гэта непакоіла, злавала. Ну а потым... Прывыкла. Галоўнае, перад самім сабою быць

чыстым, ні ў чым не вінаватым. А ўсё астатняе... Гаварыце, думайце, што каму хочацца...

— Але ж гэта...

— Разумею. Толькі ж і я... Гордая. Што каму даказваць? Сведак жа не было. Калі каханы, той, хто мяне больш за ўсіх ведаў, дзеля каго аднаго берагла сябе, чакала, як Бога, і той... Плёткам паверыў...

І не ўтрымалася — усхліпнула, заплакала Маргарыта Мікалаеўна.

— Можа, вам варта было паехаць з горада, жыць у іншым месцы,— зноў набраўся смеласці, пачаў раіць я.

— Паехаць? А куды? Ды і чаго? — падняла на мяне вочы — заплаканыя, з кропелькамі слёз на вейках Маргарыта Мікалаеўна. І тут жа, не чакаючы майго адказу, адказала сама.— Няхай едуць тыя, хто распускае плёткі. А мне... Няма чаго адсюль ехаць. Я сумленна пражыла жыццё, віны ў мяне ні перад кім няма. Дый магілы бацькі, маці, сясцёр, брата тут... Чаго ж мне ад іх уцякаць, ехаць, куды б там ні было?.. І тут неяк дажыву свой век, спадзяюся, ён у мяне будзе нядоўгі...

— Кіньце вы,— спрабаваў я адагнаць нядобрыя думкі.— Вам жыць ды жыць...

— Сябе і сваё здароўе я ведаю,— сумна паківала галавою, нявесела ўсміхнулася Маргарыта Мікалаеўна.— Дый... Э-э... Я ж... Баліць усё ў мяне... Ды і тут,— паказала яна на сэрца,— смыліць, смыліць...

...Стаю ля невысокага, зробленага з чорнага, як ноч, мармуру, помніка, што ўзвышаецца на магіле Маргарыты Мікалаеўны Хлопчык. Цяпер не адзін я, а многія ведаюць: усё, пра што гаварыла, у чым прызнавалася Маргарыта Мікалаеўна, праўда. І ў гэтым пераканалі не толькі мяне, а і іншых людзей і былыя кіраўнікі партызанскага руху, і дакументы, што захаваліся ў архіве — нашы, савецкія, і тыя, што былі ўзяты ў нямецкай камендатуры. Пра Маргарыту Мікалаеўну Хлопчык, яе гераічнае, самаахвярнае

жыццё, змаганне з ворагам пісалі нашы газеты. На жаль, гэтых публікацый пра сябе яна не дачакалася... І разам з сумнымі думкамі тут, ля магілы, усплываюць і тыя словы, што чуў я некалі ад самой Маргарыты Мікалаеўны: «Галоўнае, перад самім сабою быць чыстым, ні ў чым не вінаватым». У іх, гэтых словах, і супакаенне, і гордасць за сябе, сваё пражытае не марна жыццё...

## Змест


**ВЯЧАСЛАЎ АДАМЧЫК**

Раяль з адламаным вечкам . . . . . 5
Маці . . . . . 15
Салодкія яблыкі . . . . . 17
Дзікі голуб . . . . . 29
Кароль Нябожа . . . . . 55
Хата . . . . . 72
Там, на хутары . . . . . 87
Урок арыфметыкі . . . . . 102
Сонечны зайчык . . . . . 115

**ВАЛЯНЦІНА КОЎТУН**

Вядзьмар . . . . . 122
Лес . . . . . 142
Чужая . . . . . 163
Стары бубен . . . . . 177
Малінавае шчасце . . . . . 189
Калінавая гронка залатая . . . . . 209

**ІВАН МЕЛЕЖ**

У завіруху . . . . . 219
Ноччу . . . . . 228
Такі кароткі водпуск . . . . . 234
Адна . . . . . 242
Незнаёмы . . . . . 261
Таварышы . . . . . 269
На рацэ . . . . . 295

**ПАВЕЛ МІСЬКО**

Вераб'іная ноч (Цётка Броня) . . . . . 308
Не поле перайсці . . . . . 314
Амяла на бярозе . . . . . 321
Гусі мае, лебедзі... . . . . . 333
Сітус інверсус . . . . . 376

**БАРЫС САЧАНКА**

Ваўчыца з Чортавай Ямы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 406
Вераніка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 441
Тыя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 457
Фантастычнае апавяданне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 457
Горкая радасць вяртання . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 472
Маргарыта Мікалаеўна Хлопчык . . . . . . . . . . . . . . . . 513

**Раяль з адламаным вечкам** : апавяданні / уклад.
Р28 Аксана Спрынчан.— Мінск : Мастацкая літаратура, 2016.— 526 с. (Бібліятэка выбраных твораў).

ISBN 978-985-1723-3.

У кнігу ўваходзяць выбраныя апавяданні Вячаслава Адамчыка, Валянціны Коўтун, Івана Мележа, Паўла Місько і Барыса Сачанкі, якія карыстаюцца нязменнай папулярнасцю чытачоў бібліятэк.

**УДК 821.161.3-32**
**ББК 84(4Беи)-44**

Літаратурна-мастацкае выданне

БІБЛІЯТЭКА ВЫБРАНЫХ ТВОРАЎ

РАЯЛЬ З АДЛАМАНЫМ ВЕЧКАМ

*Апавяданні*

Укладальніца
Спрынчан Аксана Вадзімаўна

Рэдактар *А. В. Малішэўская*
Мастацкі рэдактар *М. Ю. Дайлідаў*
Тэхнічны рэдактар *Т. І. Прышчэпава*
Стылістычныя рэдактары *Ю. В. Тыркіч, І. Э. Зельгіс*

Падпісана да друку 05.07.2016. Фармат $60 \times 84\,^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Гарнітура Pragmatica C. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 26,14. Ул.-выд. арк. 30,69.
Тыраж 1000 экз. Заказ 1877.

Выдавецкае рэспубліканскае ўнітарнае
прадпрыемства «Мастацкая літаратура»
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных
выданняў № 1/5 ад 09.07.2013.
Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск.
www.mastlit.by; e-mail: mail@mastlit.by

ААТ «Друкарня «Перамога».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных
выданняў № 2/38 ад 29.01.2014.
Вул. У. Таўлая, 11, 222310, Маладзечна.



ISBN 978-985-02-1723-3

# РАЯЛЬ З АДЛАМАНЫМ ВЕЧКАМ

Бібліятэка выбраных твораў